**Іван Шамякін**
**Сэрца на далоні**
**Раман**

**1**

Доктар Яраш стаяў на даху веранды і свістаў, залажыўшы пальцы ў рот. Свістаў так, што здавалася, з дубоў пасыплецца лісце. У блакітнай бездані неба ўзнімалася чарада чаграшоў. Галубы кружылі над дачай. У «мікалаеўскіх чырвоных» гарэлі крылы. Раптам чараду быццам знесла ветрам: міг - і яна апынулася далёка над борам. І доктар ледзь не паляцеў следам за ёю. Ступіў на самы край даху. Пад яго цяжкім целам натужліва рыпнулі слупы веранды, забрынчалі шыбы. Ён хваляваўся, як хлапчук. Сонца, што ўзнялося над борам, біла праменнямі ў твар, сляпіла. Яраш засланяўся ад яго не далоняй, а неяк па-дзіцячы, локцем. З другога канца веранды стаяў яго сын Віктар, ростам траха не з бацьку, але худы, танклявы, даўганогі. Ён сачыў за галубамі ў палявы бінокль.
Ля калодзежа сядзелі на лаўцы жанчыны. Іх цікавілі не галубы, а галубятнікі.
- Смешна. Як дзіця. Цэлы дзень можа ганяць галубоў, - быццам з дакорам, але ў той жа час з замілаваннем да мужа сказала Галіна Адамаўна.
- А я люблю людзей, якія могуць вось так захапляцца, - адказала Валянціна Андрэеўна, не зводзячы вачэй з Яраша.
- О, я прыраўную, Валя!
Сказала жартам і сама ж адчула, як трывожна ёкнула сэрца. Зачырванелася.
Валянціна Андрэеўна ўбачыла гэтую чырвань на яе шчоках і адвярнулася ад веранды: яна добра ведала сваю сяброўку, яе хваравітую падазронасць.
- Было б да каго, Галя. Я ўжо старая баба. Бачыш, расплылася як. Гэта мне трэба раўнаваць. Мой Кірыла штодзень ставіць цябе ў прыклад. Глядзі, кажа, як Галіна ўмее сачыць за сабою, стройная, як у дваццаць год.
- Тоўстыя заўжды зайздросцяць тонкім, - засмяялася Галіна Адамаўна, задаволеная, што яе хваляць.
З другой палавіны дома выйшла дачка Шыковічаў Іра, апранутая па-святочнаму - у яркую раскляшоную спадніцу, у белую кофтачку, белыя басаножкі. Гэтае лёгкае адзенне пасавала і да яе стройнай постаці, і да вясёлай летняй раніцы.
Іра паправіла акуляры і таксама пачала ўглядацца ў неба. Галубінай чарады яна не ўбачыла сваімі блізарукімі вачамі і, зняважліва зморшчыўшы нос, сказала:
- Яны даўно ўжо ў горадзе, вашы галубы.
- Не каркай! - кінуў з даху Віктар.
Гэта быў першы гон прывезеных з горада на дачу галубоў, і бацька з сынам моцна перажывалі - ці вернуцца яны?
Але як ні быў заняты Антон Кузьміч галубамі, ён не пакінуў без увагі сынавы словы.
- Э-э, браце мой! Ты як размаўляеш з дзяўчынай? Яна ж на пяць год старэйшая за цябе. А ты ёй - «не каркай!». Жах!
Валянціна Андрэеўна заступілася за хлопца:
- Не вялікая пані. Як яна, так і да яе. Мы тут усе на «ты». Адна сям'я.
Дзяўчына з іранічнай усмешкай зірнула на маці і пайшла па сцежцы да раўчака, што працякаў метраў за сорак ад дачы. Здалёк паклікала:
- Наташка! Хадзем на луг!
Дванаццацігадовая дачка Ярашаў сядзела на падаконніку, звесіўшы ногі на двор, і чытала, абыякавая да галубоў, да якіх учора яшчэ выяўляла інтарэс і, магчыма, зацікавіцца заўтра. Але сёння ёй было не да галубоў. Усю раніцу чытала яна «Прыгоды Гекльберы Фіна» і ўвесь час рагатала, стукаючы ад захаплення пяткамі па сцяне. Запрашэння Ірынага яна не пачула.
Галіна Адамаўна сказала:
- Наташа, цябе клічуць.

Дзяўчынка не адгукнулася.
- Наташка!
- Га!
- Схадзіце з Ірай на луг і нарвіце шчаўя.
- О божа! - цяжка ўздыхнула малая. - Што за жыццё на гэтай дачы! Старонкі не дадуць прачытаць чалавеку.
Жанчыны засмяяліся.
- Наталка! - гукнуў Яраш. - Не бурчы, свякруха. Каціся абаранкам на луг. Цябе галубы баяцца.
- Жыцця няма ад вашых галубоў. - Наташа перакінула ногі цераз падаконнік і знікла ў пакоі, Віктар паведаміў між тым:
- Ляцяць!
- Дзе?! Дзе? - затупаў па даху Яраш, ажно задрыжаў увесь дом, выхапіў у сына бінокль, радасна загудзеў: - Ага, ляцяць! Вяртаюцца. А што я вам казаў? Малаверы! - папракаў ён немаведама каго, бо ніхто нічога не казаў, калі не лічыць кароткай Ірынай заўвагі.
Чарада галубоў пранеслася над соснамі, нізка абляцела вакол дома, памкнулася на вышкі, дзе была галубятня, і, спуджаная Ярашавым свістам, зноў узвілася ўгару.
Галіна Адамаўна, па-дзявочы стройная, млява пацягнулася, закінуўшы голыя рукі за галаву.
- А хораша тут. Я даўно так не адпачывала.
- Хораша, калі гасцей няма. Кожны дзень госці. Абрыдла. Кірыла бясконца каго-небудзь запрашае. Яму сумна без гасцей. А мне гатуй ды талеркі мый цэлы дзень. Антон! - гукнула Валянціна Андрэеўна Яраша. - Рыбу лавіць пойдзем?
У Галіны зноў загарэліся шчокі. Яна баялася гэтых паходаў мужа і суседкі з вудамі да ракі, дзе густыя лугавыя зараснікі, хоць яны яшчэ ніколі не заставаліся там адзін на адзін, з імі заўсёды ішлі або Віця, або Наташа, або Іра, ці часцей усе трое. Сама яна знарок не хадзіла, каб не падумалі, што не давярае ці пільнуе. Не, ёй вельмі і шчыра хацелася быць такой, як муж, - ён ва ўсім верыць ёй, як Шыковіч, абыякавы да таго, куды і з кім ідзе яго жонка, як Валянціна. Хочацца... Але яна не можа. Яна пакутуе. І, магчыма, не столькі ад самой рэўнасці, колькі ад сораму за яе і за сябе, што яна вось такая - не як другія. Але каб ён быў не такі, яе Антон. Можа, тысячны раз яна палюбавалася яго асілкавай постаццю, што ўся імкнецца ў неба за галубамі, яго дужымі голымі рукамі, шырокім і мужным тварам, валасамі каштанавага колеру... Яна не ведае больш прыгожых валасоў. Дурні тыя, хто кажа, што доктар Яраш трохі рудаваты. Каб яны прыгледзеліся бліжэй, каб маглі пагладзіць гэтыя мяккія валасы, пачуць, як яны пахнуць, прытуліць гэтую разумную галаву да грудзей... Вось так... Яна мысленна абняла мужа. І тут жа адчула пякучы боль ад думкі, што калі-небудзь другая, чужая жанчына абнімала яго. Закружылася галава. Як праз сон да яе даляталі словы суседкі:
- Раніцай пытаю: «Прызнайся, Кірыла, каго на сёння запрасіў?» - «Нікога», - кажа. А па вачах бачу, што маніць. Уцяку на луг на цэлы дзень. Няхай сам частуе... Што з табой, Галя? Ты нездарова?
- Не. Нічога. - Галіна Адамаўна бадзёра падхапілася і засмяялася, але смех гэты гучаў дзіўна.
Яраш адарваўся ад галубоў, глянуў уніз на жонку.
- Галка! Што здарылася?
- Нічога. Вунь хто падбіраецца да вашых галубоў, - яна паказала ў неба над лугам.
Там, у вышыні, павольна кружыў коршак.
- Віця! Пакараць агрэсара. Збіць, як Паўэрса.
Бацька і сын з аднолькавым спрытам саскочылі ўніз. Віктар на міг заглянуў у пакой і выбег адтуль са стрэльбай. Хлопцу толькі нядаўна дазволілі карыстацца ёй, і ён рады быў кожнаму выпадку, каб паказаць свой паляўнічы талент. Пераламаўшы доўгае цела, траха не датыкаючыся носам да зямлі, ён смешна сігаў да раўчака, збіраючыся па зарасніку дабрацца непрыкметна да таго месца, над якім кружыў коршак. Галіна Адамаўна крыкнула:
- Віця, асцярожна! Там недзе Іра...
Яраш глядзеў услед сыну і бязгучна смяяўся. Смяялася яго цела, перапоўненае здароўем і бадзёрасцю.
Галубы ўпалі ўніз. Ці то яны адчулі небяспеку, ці, можа, убачылі, што гаспадары нарэшце пакінулі свой пост і нішто не перашкаджае заляцець у галубятню. Але яны не заляцелі адразу на

гарышча, а ўсёй чарадой, шумна захлопаўшы крыламі, уселіся на парэнчы балкона, што быў зроблены над верандай з другога боку гэтага доўгага дома.
З акна паддашка высунулася лабастая галава з лысінамі-затокамі, што глыбока ўрэзаліся ў доўгія, крыху кучаравыя і моцна ўскудлачаныя белыя валасы.
- Што ў вас за гармідар такі? -хмура спытаў Шыковіч, бліснуўшы залатым зубам. - Не даяце чалавеку папрацаваць спакойна.
- Ты, Кірыла, як Наташка, - засмяялася Валянціна Андрэеўна. -Усю раніцу я хадзіла на пальчыках. Не можам жа мы хадзіць так цэлы дзень.
- Сёння нядзеля, Кірыла Васільевіч. Трэба адпачываць, - сказала Галіна Адамаўна.
Яраш хітра сажмурыўся:
- Нешта ў цябе вочы заспаныя. Няўжо ад працы?
Галава Шыковіча схавалася. Яраш і жанчыны засмяяліся. Але праз момант Шыковіч з'явіўся на балконе ў зялёна-карычневай паласатай піжаме. Пужнуў галубоў:
- Кыш, чэрці! Ужо напэцкалі, - і да Яраша: - Я табе дам - «вочы заспаныя». Эскулап ты беспардонны! Гэта ж не твая работа! Выразаў сляпую кішку, і больш ніякага клопату, ідзі ганяй галубоў.
- Няшчаснае чалавецтва! Як яно збяднее, калі не пачытае твайго артыкула. Ці, можа, свет перавернецца дагары нагамі?
- Цяпер яны доўга будуць шпіляць адзін аднаго. Хадзем купацца, Галя.
- Наташка, купацца хочаш?
Дзяўчынка выглянула з акна, крыкнула:
- Чаго хачу - таго хачу! Тут жаданні нашы, мамачка, заўсёды супадаюць. - Яна выскачыла праз тое ж адчыненае акно з ручніком і кнігай у руках.
У кустах бухнуў стрэл.
Коршак спакойна праплыў над сядзібай. Усе правялі яго вачамі. Яраш пашкадаваў:
- Прамазаў Віктар.
- Насыпце яму солі на хвост, - хмыкнуў Шыковіч з вышыні.
- Я цябе, малавера пузатага, зараз скіну з тваёй галубятні!
Адыходзячы, жанчыны пачулі, як пад цяжкімі крокамі Яраша застагналі новыя ўсходцы, што вялі на гарышча, дзе Шыковіч абсталяваў сабе кабінет. Потым, азірнуўшыся, яны ўбачылі, што кароткі Шыковіч дрыгае ў паветры нагамі, падняты дужым Ярашам.
- Пусці, чорт! Косці паломіш. Во лапы! Клешчы! Табе не хірургам трэба быць, а кавалём. Першы раз у жыцці бачу такога лекара... Адчапіся!
Задыхаўшыся, Шыковіч выслізнуў з Ярашавых рук і адкаціўся на другі бок балкона.
- Валя прасіла штодзень размінаць цябе. Глядзі, у цябе адразу знік заспаны выгляд.
- Валя выдумае! А сама лянуецца зарадку рабіць. Я хоць штораніцы паўгадзіны... нагамі дрыгаю...
- Вось іменна, дрыгаеш. Мала карысці ад тваёй зарадкі.
Яраш наблізіўся і стаў поплеч, ён быў вышэйшы на цэлую галаву. У горадзе, калі яны гулялі разам, на іх з усмешкамі азіраліся, а сябры жартавалі з іх і расказвалі анекдоты. Але гэта не шкодзіла іх дружбе.
Хвіліну яны моўчкі глядзелі на луг, дзе паміж кустоў мільгалі стракатыя халаты іх жонак і Наташы. Жанчыны ішлі да дубоў, за якімі іскрылася тысячамі сонцаў даўгаватае люстра вады. Гэта старыца ракі. Самой ракі не відаць, у незапомныя часы яна адступіла ад лесу на добры кіламетр. Відзён толькі чырвоны слуп ліхтара на беразе.
Луг не роўны і не гладкі, ён перарэзаны старыцамі-раўчакамі, канавамі, берагі якіх зараслі лазняком, на ўзгорках стаяць дубы, у зарэчнай далечы сінее лес, злева з-за хмызнякоў выглядаюць стрэхі хат. Але ўсё адно нідзе, нават у самым шырокім полі, няма такога адчування прасторы і неабсяжнасці, як тут, асабліва калі глядзець вось з такой вышыні. Дзіўна, што неба тут таксама здаецца вышэй, чым дзе ў іншым месцы. І бачыш усё адразу: зялёную зямлю і блакітнае неба. І ваду. Няхай мала яе, але яна адлюстроўвае ўсё - неба і дубы. А павярніся назад і ўбачыш яшчэ адно дзіва прыроды - лес. Цудоўны бор - сасна ў сасну - абступаў невялікую абжытую паляну. Злева, бліжэй да ручая, што аддзяляў лес ад лугу, сосны саступалі месца дубам-асілкам, якіх нямнога засталося ў нашых лясах. Каля самага бору туліліся старыя будынкі лясніцтва - кантора, хаты ляснічага, лесніка, канюшня.

Адзінокая дача - гэта вялікая і крыху нязграбная будыніна з рознымі па форме верандамі, з мансардай толькі ў адной палавіне - збудавана на мяжы лесу і лугу, пад дубамі. Шыковіч выхваляўся, што месца выбраў ён, забываючыся, што Яраш ведаў гэтую мясціну яшчэ з партызанскіх часоў.
Шыковіч стаў на пальчыкі, пацягнуўся, падняўшы рукі, глыбока ўдыхнуў паветра. Яму хацелася сказаць каторы раз:
«Эх, які маляўнічы куток! Рыўера! Ухвалі мой густ ты, эскулап!» Але на гэты раз ён знайшоў іншую форму:
- Здаецца, што тут нават паветра больш, чым дзе... Якое неба! А?
- Больш кіслароду.
- Для мяне - паветра, для цябе - кісларод. Гэта ж табе не кіслародная палатка. Мне здорава спіцца тут, - Шыковіч весела засмяяўся. - У цябе вострае вока. Я такі праўда задрамаў над сваім артыкулам.
- А мы ўсю раніцу хадзілі на пальчыках. Кірыла творыць, - іранічна пасміхнуўся Яраш.
- Гэта ты хадзіў на пальчыках, хлус няшчасны? Свістаў, як Салавей-разбойнік. Ты пісаў калі-небудзь публіцыстычныя артыкулы?
- Не, дзякуй Богу.
- То-та. Гэта пакута. Асабліва на заказаную тэму. Скажы, у цябе было, калі ты хочаш зрабіць лепш, адчуваеш, што можаш зрабіць, а не выходзіць? Атрымліваецца нейкая жвачка. Нудная жвачка.
- Калі пісаў дысертацыю, было. У рабоце - не. Жвачка ў нашай рабоце - барані божа!
Шыковіч на нейкі момант сур'ёзна задумаўся.
- Я разумею. Відаць, чым больш адказнасці, тым работа цікавей.
- Хіба ты пішаш без адказнасці?
- Чорт яго ведае. Часам мне здаецца, з малой адказнасцю. - І раптам крыкнуў: - Бачыш?
- Што?
- Вясёлка! Маленькая вясёлка каля дуба. Відаць, Наташа пырскае пад берагам. Іх не відаць, а вясёлка ззяе. Хораша! Ці не пайсці і нам пакупацца? - І сам сабе рашуча адказаў: - Не! Трэба дапісаць гэты злашчасны артыкул. Жывіцкі спусціць з мяне тры скуры, калі заўтра не здам.
Аднак замест таго каб пайсці працаваць, Шыковіч адышоў ад парэнчаў і паваліўся ў шэзлонг, з асалодай пацягнуўся, выставіўшы з-пад піжамных штаноў валасатыя ногі. Заплюшчыў вочы і сказаў:
- Трэба пісаць. А то ж мае быць яшчэ выпіўка. Я запрасіў у госці Гукана.
Яраш зарагатаў. Сябра паглядзеў на яго з няўцямным здзіўленнем.
- Я толькі што чуў, як Валя скардзілася, што няма ніводнага дня, каб ты не запрасіў гасцей.
- А-а.
- Ты ставіш жонку ў цяжкае становішча. Запрасіў - і маўчыш.
- Маўчу. Бо, па-першае, люблю экспромты. А па-другое, маю правіла: лепш выслухаць жончыну мараль пазней, чым раней. Няхай думае, што чалавек заглянуў выпадкова, і ўсё абыдзецца ціха.
- На д'ябла табе Гукан?
- Навошта мне Гукан? - Шыковіч прыўзняўся на руках, з натугай выбраўся з глыбокага шэзлонга, чартыхнуўся, падышоў да Яраша, які спакойна сядзеў на парэнчах і глядзеў на бор.
- Даўно не гутарыў з ім душэўна. Год шэсць ужо. Цікава, ведаеш... Як ён змяніўся? У які бок? Адбыліся такія падзеі! Пераварот у мазгах, у сэрцах. А як ён? Ён, брат, з цвердалобых. Цікава, як ён ставіцца да сваёй кнігі. Да нашай кнігі, якую мы разам пісалі. Ён - аўтар, я - літапрацоўшчык. Я, напрыклад, многага не пашкадаваў перакрэсліць з таго, што пісаў тады. І гэтую кніжачку мне хочацца ператрэсці грунтоўна. Але трэба ведаць, як глядзіць ён, аўтар. Калі трымаецца тых жа поглядаў на падполле - да ліха! Я, апрацоўшчык, разграмлю яго.
- Ого! - іранічна выгукнуў Яраш, не адрываючы позірку ад верхавін сосен. - А ці не будзе гэта смеласцю п'янага зайца, Кірыла?
Ад піжамы Шыковіча адляцеў гузік і пакаціўся па падлозе. Расхінуўшы піжаму, заклаўшы пад яе, за спіну, рукі, ваяўніча выставіўшы пукаты жывот, Шыковіч змерваў магутную постаць сябра знішчальным позіркам.
- Каб я цябе менш ведаў, я даў бы табе па мордзе за такія словы! У розных ролях мне давялося быць, але ў ролі п'янага зайца я ніколі не быў! І не буду! Май на ўвазе! Цяпер, калі я ведаю ў

дзесяць разоў больш, чым дзесяць год назад, калі пісалася кніга, мяне абурае тая ацэнка, якую дае падполлю Гукан. Ты глядзі, што выходзіць. Выходзіць, што да яго, Гуканавага, прыходу ў горад партыйнага падполля не было... Ніякай арганізацыі... Ён не ўспамінае нават людзей, якія загінулі. І якія жывуць... Цябе...
Твар у Яраша змяніўся: зніклі складкі іранічнай усмешкі каля рота, спакой, задаволенасць, з'явіліся спахмурнеласць і пакута, быццам чалавеку штосьці забалела раптам. Ён ціха сказаў:
- Мая роля ў падполлі другарадная. А што да іншых... Калі забыліся тады, то ці варта варушыць гэта цяпер? Праз семнаццаць год! Варушыць мёртвых?
Калі Шыковіч, увогуле спакойны чалавек, абураўся, ён пачынаў махаць рукамі і крычаць.
- Антон! Мне сорамна чуць гэта ад цябе! Такія мёртвыя не паміраюць! Яны павінны жыць, стаяць у адным страі з намі! І змагацца! Не было герояў безыменных!.. Гэта сказаў чалавек, які сам аддаў жыццё. Ты забыўся? - Шыковіч ірвануўся ў адчыненыя дзверы і праз момант вярнуўся з кніжкай у руках. - Вось... «Цярпліва збірайце сведчанні аб тых, хто загінуў за сябе і за вас...» Фучык! За сябе і за нас! А ты - «не трэба варушыць мёртвых». Камусьці, мабыць, хочацца, каб мёртвыя маўчалі. Але ты... Навошта табе?
- Я не люблю ўспамінаць сваю падпольную дзейнасць, ты ведаеш. На маю долю выпадала самае цяжкае.
Яраш адвярнуўся, упёрся рукамі ў парэнчы так, што пабялелі костачкі пальцаў, і глядзеў на луг. Пад дубамі, па беразе старыцы хадзіла жанчына ў купальным касцюме. «Валя ці Галя?» - падумаў ён, стараючыся пазнаць. І адчуў нейкі дзіўны прыліў вялікай любві і замілаванасці да жонкі, да дзяцей, да сям'і Шыковіча - да ўсіх добрых людзей і да гэтай цудоўнай прыроды, да зямлі і да неба. Да ўсяго на свеце. Чалавек ён быў сентыментальны, і ад гэтай замілаванасці вочы яго сталі вільготныя. Каб схаваць сваю слабасць, не паварочваючыся, сказаў сурова:
- А папрокаў такіх мне не кідай! Я тых людзей не забываю.
Шыковіч узяў яго за плячо і прымусіў павярнуцца.
- Не забываеш? - спытаў мякка і раптам груба адштурхнуў ад сябе і зноў закрычаў: - А што ты зрабіў, каб подзвіг іх стаў вядомы?! Каб расказаць пра іх Віктару, Ірыне, Наташы? Новаму пакаленню?
- Не кожны ўмее расказваць.
- Ты ўмееш! Але табе перашкаджае твая хірургія.
- Ну-у, ведаеш...
- У цябе гуманная прафесія. Ты збаўляеш людзей ад пакут. І табе здаецца, што гэтым ты ўзводзіш помнік сваім сябрам.
- Але. Няхай гэта банальна, па-газетнаму... Але ўрэшце нашы добрыя справы... Сапраўды, толькі яны могуць стаць помнікам.
- Добрыя справы часам рухаюцца нашым эгаізмам і самалюбствам. Я хацеў хутчэй закончыць аповесць і адмахваўся нават ад таго, каб напісаць фельетон у газету і памагчы людзям... А ў цябе адна дысертацыя, цяпер - другая... Аперацыі... Справы добрыя ўсе... І ты выдумаў сабе філасофію... За яе лёгка схавацца. Працуеш ты - дай бог кожнаму. Але падумай, як было б крыўдна і несправядліва, каб, напрыклад, гісторыя абароны Брэсцкай крэпасці так і засталася пахаванай пад яе руінамі...
Шыковіч неяк дзіўна, бокам, адкаціўся да дзвярэй, стаў у іх вузкім праёме, упёршыся локцямі ў вушакі. Ён гарэў жаданнем паспрачацца. І не дзеля таго, каб нешта даказаць свайму апаненту, а хутчэй, каб зарадзіць, распаліць самога сябе. Ён чакаў, што адкажа Яраш. Але Яраш адчуваў праўду ў яго словах, хоць з нечым і не згаджаўся. Ды гэтае «нешта» нялёгка было яму адразу выказаць, бо ўвогуле ён не любіў і не ўмеў спрачацца.
Ён сказаў пасля паўзы:
- Я першы напісаў, што не згодны з вашай кнігай.
- А пасля - у кусты? Так? - саркастычна прыжмурыў свае маленькія вочкі Шыковіч.
Яраш глыбока ўдыхнуў паветра і рушыў да яго.
- Не будзь, Кірыла, як кажа мая Наташка, разумны задам. Я вось што скажу табе, - ён узяўся левай рукой за адчыненыя дзверы. - Калі гэтага гарэння ў цябе не на адзін дзень, калі ты сур'ёзна хочаш заняцца нашым падполлем, вось табе мая рука. - Шыковіч пацiснуў працягнутую руку. - А калі ты паклікаў Гукана, каб паказаць перад ім сілу «вызваленага негра», папсаваць старому чалавеку нервы, я ў такой гульні не ўдзельнічаю. Нягледзячы на яго кнігу, я паважаю Гукана.

Чалавек ваяваў добра і папрацаваў - дай бог кожнаму, як ты кажаш. Ідзі пішы свой артыкул. - Яраш жартаўліва ўпіхнуў сябра ў пакой.

**2**

Гукан на абед не прыехаў.

Кірыла, шумны з раніцы, вясёлы і лагодны пасля заканчэння свайго артыкула, пачаў хмурнець і злавацца. Знарок сказаў жонцы, што запрасіў у госці старшыню гарсавета.

Валянціна Андрэеўна надзвычай тонка адчувала мужаў настрой, а таму не ўпікнула ніводным словам.

- Калі ласка. Абед у нас з Галяй добры. Пачакаем.

Кірыла паглядзеў на гадзіннік, яму хацелася есці, можа, таму і злаваўся. Пайшоў да Яраша, які ляжаў каля ручая пад дубам і чытаў часопіс на ангельскай мове.

- Хам.

- Хто? - Ярашу чамусьці зрабілася смешна, і ён закрыў твар далонямі.

- Калі я быў патрэбны яму, тады ён знаходзіў мяне ўсюды. Я знарок прасіў у рэдактара камандзіроўкі ў самыя далёкія куткі. Ён адклікаў назад і яшчэ папракаў, што я не маю партыйнага сумлення. «Гэта не мая кніжка. Гэта партыйнае даручэнне. І мне, і табе». Вось як!

- Юпітэр, ты злуеш... І паўтараю: не падабаецца мне твой намер. Запрасіць чалавека, каб...

- Дальбог, а запрашаў шчыра. І пагутарыць хачу шчыра. Нарэшце, чаму ты думаеш, што за гэтыя гады погляды яго не змяніліся? Усё змянілася.

- А калі шчыра, то цярпліва чакай і, як добры гаспадар, выбач. Мала чаго мог затрымацца чалавек. Ты сам не такі ўжо акуратны.

- Есці хачу.

- Табе карысна пагаладаць.

Кірыла лёг на спіну, палажыўшы рукі пад галаву, смачна пацягнуўся. Доўга ўглядаўся ў лісце дуба. У яго гушчары шасталі, церушылі мохам нейкія птушкі, але ён ніяк не мог убачыць іх і са смуткам падумаў, што слабее зрок. Непрыкметна прыходзіць старасць. Хацелася пафіласофстваваць на гэтую тэму. Але Яраш уважліва чытаў. Кірыла паглядзеў на сябра і не адважыўся перашкаджаць. Жыла ў ім павага да людзей, якія чытаюць на замежнай мове. Павага і зайздрасць. Ён шкадаваў, што быў гультаём і не вывучыў ніводнай мовы. Праўда, тут жа знаходзіў апраўданне: яго пакаленню было не да таго. А хіба Яраш не з яго пакалення?

Неяк Яраш сказаў, што не позна запоўніць гэты прабел цяпер. Не позна! Куды к чорту! Няма калі пачытаць на роднай мове, не тое што вучыць чужую.

А неба... неба якое сёння! Яснае, яно ніколі, аднак, не бывае аднолькавым, мае тысячы адценняў. І адценні гэтыя мяняюцца на вачах. Вось як цяпер. І хмаркі-аўчынкі заўсёды розныя - па форме, па абрысах. Гэтая, што плыве над лясніцтвам, падобна на... На што? На прычоску Элы, машыністкі рэдакцыі. Кірыла сумна ўсміхнуўся: ён не вельмі багаты на метафары і параўнанні. Заўсёды пакутліва шукаць іх, каб былі трапныя, арыгінальныя. Ён вінаваціць газету - яна засушыла. Нават доўга любавацца небам ён ужо не можа, стамляецца. Натура яго прагне дзейнасці, хоць якой-небудзь.

- Доктар Яраш! У машыне ў мяне ёсць бутэлька каньяку... Давай расціснем. Употай. А за абедам, на здзіўленне сваім «Богам падараваным», будзем піць адно кісленькае віно.

Яраш засмяяўся:

- У цябе авантурны характар, Кірыла.

Абедалі разам, за агульным сталом, як рабілі часта, на верандзе ў Ярашаў, бо ў такі час дня там быў цень. Толькі Іра за стол не прыйшла.

- Яна перакусіла, - адказала Валянціна Андрэеўна на мужава запытанне.

Кірыла абурыўся. Яго злавала стаўленне дачкі да іх калектыву. Ён знарок будаваў дачу разам з Ярашам, каб лягчэй было змагацца «з сямейным эгаізмам», а галоўнае - з індывідуалізмам дзяцей. Праявы такога індывідуалізму насцярожваюць, хоць выяўляецца ён у дачкі і сына супрацьлегла, па-рознаму.

- Гэтая твая неарганізаванасць корміць іх эгаізм, - папракнуў Шыковіч жонку. - Але, ты яго падаграваеш! Што ім да другіх, да парадку! Парадак - гэта для бацькоў. А для іх - анархія. Захацела - паела, і бывайце здаровы. Ніякіх турбот. Мама нагатавала, мама і талеркі памые...

Галіна Адамаўна не баялася дрэннага ўплыву дзяцей Шыковічаў, старэйшых па ўзросту, на яе Віктара і Наташу. Але не любіла, калі пры малых залішне многа гаварылі пра эгаізм і ўвогуле пра

выхаванне. Ёй заўсёды не падабаліся па сутнасці сваёй правільныя, глыбакадумныя разважанні Шыковіча ў прысутнасці дзяцей. Яна лічыла, што выхаванне - такі хітры механізм, які павінен быць заўсёды схаваны і разам з тым ні на міг не спыняцца, не грымець, не ляскаць, не дыміць, не чадзіць, але працаваць бездакзна. Яна сказала, як бы між іншым, раскладаючы відэльцы і нажы:
- А ты паказвай прыклад.
І быццам кальнула Кірылу відэльцам у бок. Ён з грукатам ад'ехаў на крэсле ад стала, усхапіўся.
- Не, ты слухай... Выходзіць, ва ўсім вінаваты я! У чым, хацеў бы я, каб мне растлумачылі. Што я - труцень, лежабок, спекулянт, злодзей? Чорт вазьмі! Я працую дзень і ноч. Сумленна, шчыра. Не крыўлю душою. Не краду. Што можа ўкрасці пісьменнік? Рэдка нават падхалімнічаю.
- Але - бывае? - з іроніяй спытаў Яраш, адкаркоўваючы бутэльку віна.
- Часцей перад жонкай.
- А як жа... Нешта я не адчуваю, - адгукнулася Валянціна Андрэеўна з крыўдай за дзяцей, з пакоя, дзе праціpала кілішкі.
- Не, без жартаў... «Паказвай прыклад». У чым, дарагая Галіна Адамаўна? Хто скажа, што я даю благія прыклады? Што ўрэшце галоўнае ў фармаванні чалавека? Праца. Я працую. І ты працуеш! - крыкнуў ён жонцы. - Дык чаму нашы дзеці не навучыліся працаваць? Чаму растуць эгаістамі? Вось што мяне хвалюе...
- Твае дзеці не горшыя за іншых, - сказала гэта Валянціна Андрэеўна з крыўдай за дзяцей, з'явіўшыся на парозе з кілішкамі і шклянкамі ў руках.
- Не горшыя... Супакоіла. Вось так заўсёды сваёй неразумнай любоўю ты разбураеш тое, што я ствараю.
- Няпраўда. Пры дзецях я ніколі не пярэчу. Але ты часцей гаворыш гэта мне, чым ім.
- Словы нічога не значаць, - зноў жа нібы так сабе, між іншым, кінула Галіна Адамаўна.
Шыковіч узмахнуў рукамі, як ястраб крыламі.
- Вось табе, калі ласка! А я, дурань, усё жыццё верыў у вялікую сілу слова. Жыў за слова, карміў дзяцей...
Наўрад ці чула Галіна Адамаўна, яна пайшла на кухню па стравы. Кірылу даўно ўжо злаваў гэты яе спакой. Ён добра ведаў, што яна зусім не такая спакойная, што яна ў дзесяць разоў больш нервовая, чым яго жонка. Неўраўнаважаная, раўнівая... А вось у размове з ім, асабліва калі размова пераходзіць у спрэчку, трымаецца заўсёды як каралева: з вышыні кідае бясспрэчныя ісціны. Яна пайшла - і Кірылу расхацелася шумець і спрачацца. Цяпер толькі ён прыкмеціў, які доўгі, нязграбны Віктар. Кожны раз, калі пры ім дарослыя пачыналі гаварыць пра выхаванне дзяцей, ён саромеўся, чырванеў, губляўся, быццам размовы такія абражалі хлопца. Наадварот, Наташа слухала іх, разявіўшы рот. І цяпер яна сядзела на ўсходцах ганка, глядзела ў кніжку, а вухам лавіла кожнае слова дарослых. Ёй вельмі хацелася, каб выказаўся яе тата. Яна была ўлюбёна ў свайго бацьку. Але яго, здаецца, цікавіў адзін стол: як заўсёды, ён наводзіў на ім парадак і прыгажосць. Ні мама, ні цётка Валя не ўмеюць гэта рабіць лепш за яго.
Калі Галіна вярнулася і паставіла на стол талеркі са смажанымі лісічкамі і салату са свежых гуркоў, Кірыла сказаў памяркоўна, прымірэнча:
- Я толькі адзін магу зрабіць вывад: залішне многа выгод даём мы дзецям. Відаць, трэба даваць менш. Як мой бацька нам...
Тут не вытрымала Наташа:
- Няпраўда, дзядзька Кірыла! Дзецям трэба даваць усё! На тое яны дзеці.
Усе засмяяліся з яе непасрэднасці.
- Давайце за стол, філосафы, - запрасіла Валянціна Андрэеўна.
Пасля абеду нахмарыла. Неяк непрыкметна і хутка зацягнула неба высокая лёгкая воблачнасць. Але па-ранейшаму было бязветрана; хмары не прынеслі свежасці, яны апусцілі на зямлю млявую парнасць. Замерлі дрэвы, нават трапяткая асіна над ручаём сцішылася. Заснула на раскладушцы Наташа, упусціўшы на траву кнігу і звесіўшы руку.
Кірыла, стомлены абедам, драмаў у шэзлонгу, праз сон кідаючы асобныя словы ў размову жанчын і Яраша, часам неўпапад. Гэта іх смяшыла. Смех будзіў знясіленага чалавека, ён расплюшчваў вочы, пагражаў пальцам, мармытаў:
- Як Бог пакараў Хама, што смяяўся з соннага... ага? - І галава яго зноў падала на грудзі.
- Парыць на дождж. Будзе брацца рыба, - сказаў Яраш і пайшоў з Віктарам збіраць рыбацкія прылады.

Збіраў знарок доўга, каб даць сябру крыху падрамаць. А потым нарабіў грукату на верандзе, закрычаў:
- Кірыла! Даволі дрыхнуць! Хадзем вудзіць.
Шыковіч у адказ уцягнуў у шэзлонг ногі і павярнуўся на бок. Але Валянціна Андрэеўна са смехам перакуліла шэзлонг, выкінуўшы мужа на зямлю.
- Ідзі, ідзі. Няма чаго пуза гадаваць. Цягні яго, Антон.
Сухое сена (на ўзгорку ляжалі першыя пакосы) разлівала далёка навокал не толькі густы водар, які п'яніў, але і асаблівую цяплынь, якая ўзнімала настрой, будзіла фантазію, уяўленні і ўспаміны маленства. Млявасць была ад нечага іншага, можа, ад тонкага водару кветак у нізінах ці едкага паху выкінутых на бераг водарасцяў, ілу і малюскаў.
Нерухомае возера-старыца нібы застыла, ашклела, люстра яго з незвычайнай яскравасцю адбівала такія ж нерухомыя хмары і дубы. Толькі каля травяністага берага нябачныя мошкі ці вадзяныя жукі чарцілі на гэтай гладзі адмысловыя іерогліфы. Рыба лягла на дно - ніводнага ўсплёску. Пакуль Віктар не разбудзіў цішу і гладзь блешняй спінінга. І адразу возера ажыло: разышліся кругі, быццам несучы сігналы небяспекі; з травы вылецела качка, кракнула і ўпала ў лазняках; пад абрывам плёснула, нібы кінулі вялікі камень.
- Шчупак! Тата, бачыў, які шчупак? - азартна крыкнуў Віктар і пачаў кідаць у тое месца блешню. Калі круціў катушку, дзіўна пераламваў сваю доўгую нязграбную постаць, здавалася, што вудзільна пратыкала яго худы жывот наскрозь.
Мужчыны пастаялі, паглядзелі. Шыковіч прапанаваў тут жа і павудзіць - ленаваўся ісці далей, ён абліваўся потам.
- Гэтая лужына як заварожана... Браканьерамі... Колькі яны выцягваюць сеткамі рыбы! А я на вуду і спінінг не ўзяў ніводнай маляўкі, - сказаў Яраш.
І яны рушылі далей. Адзін Віктар застаўся ганяцца з блешняй за няўлоўным шчупаком.
Рака дыхнула вільготнай свежасцю і прахаладай. Пахла дажджом. Набліжэнне яго заўсёды выразней адчуваецца каля ракі. Недарма ў народзе кажуць: рэкі прыцягваюць дождж. Рэкі і лес. Але рыбаловам здалося, што сама рака цягнецца, узнімаецца ўсёй сваёй вільгаццю насустрач далёкаму дажджу.
Яраш умеў не толькі любавацца прыродай, ён заўсёды стараўся ўспомніць ці выявіць законы яе з'яў. Шыковіч, нягледзячы на сваю прафесію, не любіў глыбока пранікаць у сутнасць гэтых з'яў. У хвіліны адпачынку ён як бы выключаў свой розум, даючы поўную волю пачуццям. Апынуўшыся на высокім беразе над вірыстай плынню, ён узмахнуў рукамі, быццам жадаючы паляцець, прагна ўдыхнуў рачную прахалоду і ад захаплення галёкнуў:
- О-го-го! Хараство-о-о! - і сеў на спаленую жорсткую траву, звесіўшы з абрыву ногі. - Нікуды далей не іду. Вось тут маё месца. - Кінуў уніз вуду і сам з'ехаў на спіне па пясчаным адхоне; каля самай вады, на мокрым пяску, не сеў, а лёг, раскінуўшы, як забіты, рукі і ногі.
Яраш, пасміхаючыся з яго дзівацтваў, ледзь пераканаў, што тут рыба не бярэцца і сядзець на гэтым месцы - марна траціць час. А вось ён ведае мясціну, дзе акуні самі лезуць на кручок.
Сцежка вяла праз густы лазняк, што парос на пясчаных наносах. Лазіны сцёбалі па твары, па руках. Кірыла лаяўся:
- Ты, эскулап, знарок мяне цягаеш па гэтым гушчары. Каб я больш нагінаўся. Цябе Валя падкупіла? Прызнайся.
Яраш смяяўся, ідучы наперадзе. Выйшлі з лазнякоў. Яраш спыніўся і расчаравана свіснуў.
- Захапіў нейкі тып наша месца.
Бераг тут паніжаўся. Наперадзе працякала лугавая крынічка: яна жывіла сенажаць, даўжэй трымаючы разліў, а таму і ўлетку, калі на сухадолах пабляклі ўжо фарбы, пойма яе вабіла вока веснавой свежасцю. Каля лазнякоў, дзе спыніліся крыху расчараваны Яраш і абыякавы Шыковіч, над негустым разнатраўем ужо ўзвышаліся мяцёлкі цімафееўкі і лісахвосту, кастрыцы і шчаўя. І толькі зязюліны слёзы ды смолка яшчэ рассыпалі свае дробныя яркія кветкі. А там, ніжэй, усё яшчэ цвіло, кожная травінка; жоўтыя, чырвоныя, ліловыя, васількова-сінія, блакітныя кветкі, зліваючыся ў дзівосны вясёлкавы колер, закрывалі яркую зелень травы.
І там, на мысе, дзе ручай уліваўся ў раку, пад вярбой сядзеў той, што захапіў улюбёнае месца Яраша.
Доктар хацеў было ўжо вярнуцца назад, у лазнякі, але Шыковіч угледзеўся і здзіўлена выгукнуў:
- Фу, чорт! Калі ты не заўважаў у мяне галюцынацый, то гэта - сам Гукан. Далібог, ён!

Яны наблізіліся. Сапраўды, гэта быў ён - старшыня гарсавета Гукан. Шыковіч прывітаўся. Гукан адказаў няўважліва, як малазнаёмым, цалкам прыкаваны ўвагай да паплаўка. Вуд у яго было некалькі. Адно бамбукавае вудзільна ён трымаў у руках, другія былі ўтыркнуты ў гліністы бераг. Ён стаяў, шырока расставіўшы свае доўгія ногі, нахіліўшыся над самым абрывам. З худым аскетычным тварам, глыбокімі вачамі і густымі сівымі брывамі, ён нагадваў у профіль ястраба, які выглядваў здабычу, здавалася, на самым дне ракі. Апрануты Гукан быў звычайна для летняга дня і рыбнай лоўлі - у белы палатняны касцюм. Але адразу кідалася ў вочы некаторая старамоднасць у гэтым касцюме, нібы ён быў пашыты гадоў трыццаць назад. Пінжак зроблены ў форме фрэнча, з хлясцікам, з вялікімі нагруднымі кішэнямі, моцна адтапыранымі, і яшчэ большымі бакавымі, таксама нечым напакаванымі. (Можа, гэта і зручна для рыбалова - такое мноства кішэняў.) Яшчэ больш старамодна выглядала шапка... Зашмальцаваная, скамечаная наперадзе над казырком, абвіслая ззаду, яна неяк смешна маладзіла гаспадара, робячы яго падобным на купецкага прыказчыка.
Яраш зазірнуў у гумавае вядзерца, што стаяла ззаду рыбалова, убачыў, што яно амаль поўнае рыбы, і адчуў павагу да чалавека, які ўмее вудзіць; не тое што другія - абы час загубіць. Доктар паважаў усялякае ўменне.
Шыковіч разглядаў Гукана з іранічнай усмешкай: ён упершыню бачыць яго ў такой форме і ролі.
Толькі падсекшы і выкінуўшы на траву трапяткога акунька, Гукан павярнуўся да іх і працягнуў руку.
- Што гэта вы, Сямён Парфёнавіч! Мы вас чакаем, - выказаў крыўду Шыковіч, хоць цяпер яго чамусьці мала кранула тое, што Гукан не прыехаў.
- Прабач, Кірыла... Не ўтрымаўся ад спакусы. Калі нашаму брату ўдаецца выбрацца на лона прыроды. Вось і думаю: палаўлю і з'яўлюся ў госці са сваёй юшкай. Чакай.
Нырнуў паплавок адной з вуд. Гукан спрытна скочыў да вудзільна і выкінуў срэбна-белую плотку... Яраш зняў яе з кручка. Кідаючы ў вядзерца, спытаў:
- Гумай не пахне?
- Не. Праверана.
- То, можа, час ужо варыць юшку? - прапанаваў Шыковіч.
- Ты бачыў, як бярэцца? Павудзім, доктар? - звярнуўся Гукан да Яраша, мабыць, адчуўшы ў ім аднадумца, недарма кажуць: «Рыбак рыбака бачыць здаляка».
- Безумоўна, павудзім! - падтрымаў Яраш. Скінуўшы тапкі, падкасаўшы штаны, ён пайшоў цераз ручай. - Я далей.
Гукан ацаніў яго рыбацкую далікатнасць. Паглядзеў услед, сказаў:
- Зайздрошчу гэтаму чалавеку. Волат. - Уздыхнуў: - Няроўна дзеліць маці-прырода.
- Ды і няроўна, каб ёй пуста было, - згадзіўся Кірыла, разматваючы леску.
Ён прымасціўся тут жа, крокаў за дзесяць ад Гукана, хоць таму гэта не вельмі спадабалася. Сеў на абрыве, звесіў ногі да вады, насадзіў чарвяка, напляваў на яго, нацягнуў леску, сагнуўшы вудзільна, і адпусціў: кручок і груз паляцелі далёка ў раку, але плынь хутка знесла паплавок да берага. А Гуканавы паплаўкі, наадварот, цягне на сярэдзіну. Нечаканыя павароты робіць плынь! Шыковіч прасачыў, як праплыў кусцік травы, паразважаў у думках над тайнамі ракі, зразумеў урэшце, чаму Гукан заняў гэтае месца: зліваюцца два струмені - ракі і ручая, рыба любіць такія куткі. Яго месца - ужо не тое. Але не стаў шукаць другога. Тут хораша сядзець на мяккай траве. Вада блізка, хоць апускай у яе прахалоду ногі. Дзіўнае журчанне. Кірыла ўпершыню чуе такое. Быццам вада бяжыць па звонкай металічнай трубе. Чаму гэта? Адкуль? Струмень б'е ў бераг? Але бераг тут мяккі. Ён услухаўся, угледзеўся. Ды думкі расплываюцца, нельга засяродзіцца. Напльвае ўсё адразу. Ластаўкі чэрцяць крыламі ваду. Лятаюць каля самых ног. Можа, гняздо ў абрыве? Пахнуць травы. Ластаўкі не парушаюць спакой, а водар ап'яняе. Асільвае стома. Хочацца спаць. Чырвоны паплавок лёгка гойдаецца, але не нырае. А ў Гукана нырае. Той раз-пораз падсякае. І ўжо колькі разоў у паветры мільгалі рыбкі, трапяталіся ў траве.
«Драбязу бярэ. Можна і з вудай браканьерыць. Трэба сказаць яму». Але не сказаў, паленаваўся. Хацелася паваліцца ў траву і глядзець у неба, дзе гусцеюць перыстыя аблокі. Сонца яшчэ прабівае іх, але расплылося, як... яйка на скавародцы. Чужы стары вобраз. Ліха з імі, з гэтымі вобразамі. Зноў дасціпныя крытыкі будуць лавіць у яго блохі. Алах з імі! Не кожны піша метафарамі. Цяжка чмякнула нешта ў траве збоку.
- Глядзі! - Гукан трымаў у руцэ вялікага акуня, і твар яго ззяў ад шчасця.

Шыковіч засмяяўся. Успомнілася французская кінакамедыя, эпізод, дзе ў спаборніцтве рыбаловаў рыба бралася толькі на кручок браканьера - героя фільма.
Кірылу заўсёды смяшыла наіўнасць, хлуслівасць і радасць рыбакоў і паляўнічых. Паважаныя сур'ёзныя людзі, узяўшы вуду і стрэльбу, ператвараюцца ў дзяцей і мюнхгаўзенаў. Між тым Гукан дастаў з кішэні прыладу накшталт маленькага пісталета, выцягнуў з дула стужку рулеткі і змераў даўжыню акуня. А пасля гэтай жа прыладай зважыў рыбіну. Кірыла глядзеў на яго ўжо без іроніі, без смеху, а з нейкім нават захапленнем: «Ух, чорт! Вось гэта акуратнасць!» Твар Гуканаў, які быў расплыўся ад усмешкі, зноў выцягнуўся, калі ён сказаў:
- Восемсот грамаў. Думаў, больш будзе.
Але ўвогуле яго, відаць, задаволіла рыбацкая ўдача. Ён раптам сеў пад вярбой. Дзіўна сеў, высока, на ўзровень падбародка, падняўшы вострыя калені. На правае калена палажыў вудзільна. Шыковіч убачыў, што вакол паплаўка ходзяць акунькі, і залюбаваўся іх гульнёй.
- Чым, інжынер чалавечых душ, думаеш парадаваць у бліжэйшы час?
Кірыла не любіў ні гэтага звароту, які замусолілі да агіднасці, ні гэтага шаблоннага пытання. Але адчуў, што Гукан мімаволі зрабіў добрую зачэпку для размовы, дзеля якой і запрашаў яго.
- Хачу вярнуцца да падполля. - Ён знарок не паварочваўся, але ўсё адно адчуваў на сабе доўгі пільны позірк старшыні гарсавета.
- Зноў вайна. Шаснаццаць год будуем. Гарады вунь якія збудавалі. Дзеці выраслі, што нарадзіліся пасля вайны. Глянеш навокал - дух займае. Вось-вось савецкі чалавек на Месяц ступіць. А ваш брат усё ваюе. Назад, браткі, глядзіце. Не ўмееце глядзець наперад!
- Справядлівы папрок, Сямён Парфёнавіч! - бадзёра падтрымаў Шыковіч. - Але кожны піша пра тое, што яго хвалюе.
- Раман? - спытаў Гукан пасля доўгага маўчання.
- Дакументальная аповесць.
- Дакументальная? Пісана-перапісана...
- Не так ужо многа, Сямён Парфёнавіч. Пра наш горад адна ваша кніга. Ды і колькі там пра падполле! Мімаходзь. Я хачу заглянуць глыбей... Разабрацца...
- Разбіраўся гарком.
- Правільна. Але мне, напрыклад, шмат што няясна. Асабліва ў першым перыядзе. Да таго ж згадзіцеся, што цяпер мы на многія рэчы глядзім другімі вачамі.
- Хочаш, значыцца, прарэвізаваць рашэнне гаркома. - Гукан не спытаў, а як бы канстатаваў факт, з іроніяй у голасе, у якой бадай што прагучала пагроза.
Шыковіч каўзануўся па траве і моцна ляснуў вудзільнам па вадзе. Ён зразумеў, што Гукан не адступіць ні ад аднаго сказа, палажэння сваёй кнігі, напісанай яго, Кірылавай, рукой. Апанавала злосць.
«Чаму ты так упарта трымаешся за тое, супраць чаго выступаюць многія? Чаму ты лічыш, што адзін ты сказаў ісціну ў апошняй інстанцыі? Рашэнне гаркома!.. Ты быў сакратаром і рыхтаваў гэтае рашэнне, паўтарыўшы тое, што раней напісаў у кнізе. А людзі - удзельнікі - пратэстуюць!..»
Кірыла аберуч сціснуў вудзільна, быццам яно магло зацягнуць яго немаведама куды. Ён баяўся, як бы не выбухнула гэтая злосць. Разумеў, што сварыцца цяпер з Гуканам неразумна і недарэчна. Памог яму саўладаць са сваімі пачуццямі сам Гукан. Той падняўся на ногі, зноў нахіліўся над ракой, і збоку здавалася, што, акрамя паплаўкоў і рыбы, нічога больш не хвалюе і не цікавіць яго. Кірыла агледзеў доўгую постаць, спакойны аскетычны твар і, адчуваючы, што патухае агонь, нязлосна вылаяўся ў думках:
«Актор, чортава жардзіна! Я дорага заплаціў бы, каб даведацца, пра што ты думаеш».
Яны доўга маўчалі.
Нарэшце, чапляючы новага чарвяка, Гукан сказаў:
- Гэта цябе Яраш падбівае на падполле? Раю не вельмі давяраць яму. Анархіст.
- Яраш - анархіст? - Кірылу стала чамусьці весела. - Больш дысцыплінаванага чалавека я не ведаю.
- Розная бывае дысцыпліна. Безумоўна, ён выконваў адказныя заданні. Але гэта была, так сказаць, не галоўная лінія нашай барацьбы. І яго трымалі ўбаку. Таму ў яго склалася дзіўнае ўяўленне аб падполлі. У нашай кнізе, канешне, не ўсе факты і людзі названы... Але я і не ставіў такой мэты...
«Кніга наша, а мэта твая», - засек у думках Кірыла.

- Мы далі агульную ацэнку... А Яраш хацеў перакрэсліць усё, бо не назвалі яго... Помніш яго пісьмо?..
Шыковіч успомніў сваё першае знаёмства з Ярашам, як, атрымаўшы пісьмо, знайшоў маладога лекара. І той расказваў пра сваіх сяброў-падпольшчыкаў з болем, з крыўдай.
Не, Яраш пісаў тады не з-за сябе! У гэтым Кірыла цвёрда пераканаўся. Але мае рацыю і Гукан: у Яраша ў той час сапраўды было блытанае ўяўленне аб агульнай карціне падпольнай барацьбы ў горадзе.
Адначасова Кірыла прыгадаў сённяшнюю размову з сябрам, яго словы пра тое, што ці варта варушыць мёртвых і падзеі даўно мінулых дзён. Нават Яраш, нястрымны і нястомны Яраш, пачаў вось як разважаць! Што гэта - старасць? Дача, галубы, рыба...
А можа, сапраўды, гэта не тое, самае галоўнае, што патрэбна цяпер народу?
У Шыковіча нярэдка ўзнікалі такія сумненні ў актуальнасці сваіх творчых задум. Гэта цяжкія сумненні, яны часта выклікалі дэпрэсію, абыякавасць, застой. Кірыла баяўся іх. Таму яму больш не хацелася ні «мацаць» Гукана, ні ўвогуле прадаўжаць размову пра гэта. Трэба пераключыцца на штосьці іншае!
Яму пашанцавала: нырнуў паплавок, ён падсек і выкінуў ніштаватага язя. Яго ўдача падагрэла рыбацкі азарт Гукана, бо язя той не ўзяў ніводнага. Сямён Парфёнавіч сеў бліжэй і пачаў расказваць пра звычаі рыб. Расказваў падрабязна, хоць вельмі манатонна. Кірыла маўчаў. Глядзеў, як гойдаецца паплавок, слухаў журчанне вады, крыкі ластавак. Мацней пахла дажджом. Усё гэта супакоіла і зноў расслабіла мозг, цела. Рака закалыхвала...
Раптам Гукан пачуў, як збоку ад яго штосьці цяжкае плюхнула ў ваду. Падумаў, абваліўся бераг. Глянуў - няма Шыковіча. Міма яго вуд плыў па рацэ саламяны капялюш. Сямён Парфёнавіч спалохана падскочыў. Але тут жа, пад абрывам, вынырнула галава...
- За вудзільна! Хапайся за вудзільна! - закрычаў Гукан.
Шыковіч схапіўся за вудзільна і, фыркаючы, адплёўваючы ваду, вылез на бераг. А капялюш паплыў па цячэнню далей - у мора.
- Што здарылася?
- Задрамаў, - адказаў Шыковіч, круцячы галавою, каб выліць ваду з вушэй.
- Задрамаў? - Гукан так зарагатаў, што ластаўкі спалохана кінуліся за раку, далей ад такога грому.
Шыковічу ніколі не давялося чуць, каб суровы, скупы на словы і ўсмешкі старшыня так рагатаў. Ён ніяк не мог супакоіцца, выціраў слёзы, гладзіў худы жывот і зноў заліваўся. Яго рогат устрывожыў Яраша. Той кінуў вуды і вылез з лазняку, каб паглядзець, што здарылася.
**3**
Звычайна Гукан прыходзіў у выканком за паўгадзіны, а то і больш да пачатку работы. Гэта было зручна. Па-першае, дысцыплінавала падначаленых, хоць, калі сакратарка паспрабавала прыходзіць раней за яго, ён забараніў ёй рабіць гэта. Яна павінна з'яўляцца без пяці дзевяць, не раней і не пазней. Гукан любіў парадак і ўмеў яго падтрымліваць.
Па-другое, такім чынам яму ўдавалася абмінуць большасць кватэрных прасіцеляў, якія падпільноўвалі штодня. Нарэшце, у пустым, добра праветраным кабінеце, у вокны якога лезлі галіны каштанаў, хораша думалася і была магчымасць найлепшым чынам спланаваць свой рабочы дзень.
Гукан умеў гэта рабіць, не як другія кіраўнікі, і меў волю выконваць такія аднадзённыя планы.
У панядзелак Сямён Парфёнавіч заспаў. Гэта яго злавала і смяшыла, калі ён таропка ішоў па абмытых дажджом вуліцах. Такога з ім не здаралася ўжо год дваццаць - каб ён праспаў. Без будзільніка, без староннняй дапамогі ён мог дакладна ў назначаны час усхапіцца на ногі. А тут раптам праспаў да палавіны дзевятай. Вінаваты ўчарашні адпачынак.
«А ўрэшце, гэта няблага, што арганізм яшчэ здольны атрымліваць такую зарадку і гэтак выключацца», - разважаў ён ідучы.
Успамінаў учарашні дзень. Многа было прыемнага. Асабліва рыбалка. Рэдка каму шанцуе так. І дождж, які захапіў іх на лузе. А потым, як ён гатаваў разам з дзвюма далікатнымі ўважлівымі жанчынамі юшку, пакуль гаспадары ездзілі ў вёску ў краму, і рагатаў, расказваючы ім, як зваліўся ў раку Кірыла Шыковіч. Жанчыны таксама смяяліся, хоць Ярашава жонка сказала, што Кірыла мог зрабіць гэта знарок - для смеху.
У прыёмнай ужо чакалі людзі. Чалавек дзесяць. Гукан прывітаўся. Яго адразу абкружылі.
- Таварыш старшыня!

- Сямён Парфёнавіч!
- Таварыш Гукан!
Ён спыніўся сярод пакоя, узвышаючыся над самым рослым з наведвальнікаў. Зняў габардзінавую кепку, выцер складзенай у чатыры столкі хусцінкай лоб і шыю. Агледзеў прысутных, жадаючы адгадаць, хто з чым.
- Чакайце. Можаце лічыць мяне бюракратам, кім хочаце, але давайце адразу высветлім нашы ўзаемаадносіны. Заяўляю рашуча: па кватэрных пытаннях не прымаю. У пятніцу прыёмны дзень, калі ласка, прашу.
- Я два месяцы не магу трапіць да вас! - злосна крыкнула маладая жанчына ў простай сукенцы з бледным стомленым тварам.
- Магло быць, - спакойна згадзіўся Гукан. - Справы і выезды двойчы сарвалі мне прыёмны дзень. Прымалі мае намеснікі.
- А я хачу да вас!
- Нэла, - звярнуўся Гукан да сакратаркі, - была гэтая грамадзянка на прыёмах?
Маленькая чорненькая Нэла заружавелася, нясмела і няўпэўнена адказала:
- Была.
- Запішыце яе на пятніцу першай на чаргу. - І ласкава звярнуўся да жанчыны: - Чакаю вас роўна ў дзевяць.
Жанчына збянтэжылася. Старшыня добра ведаў вось такіх, раззлаваных, якія ішлі з яўным намерам пакрычаць, пасварыцца, і ўмеў улагодзіць іх ці хаця б збіць ваяўнічы запал.
Жанчына пераключылася на Нэлу, каб тая не забылася запісаць яе першай.
- Вы, таварыш маёр, наконт дарогі? - Твар Гукана ўміг пасуравеў, вочы зрабіліся калючымі і глядзелі не на маёра, а міма, як бы шукалі кагосьці другога. - Дарогу міма школы-інтэрната закрываем. Вы хочаце, каб дзеці глыталі пыл і газы ад вашых машын? Не будзе! Вам далі праезд, прывядзіце яго ў парадак.
- Мост.
Гукан раздражнёна звярнуўся да ўсіх:
- Мост цераз канаву - казе пераскочыць. Праблема, бачыце! Што ж мне дзяцей пасласць, каб збудавалі вам гэты мост? Пасаромеліся б гаварыць. Такая часць!..
Чалавекі два з наведвальнікаў засмяяліся.
- Таварыш Гукан!
- Не рабіце сакрэтаў там, дзе іх няма. Увесь горад ведае вашу часць, дзе вы стаіце і кудой вы ездзіце. Усё! Ёсць рашэнне выканкома!
Гукан крута павярнуўся да трэцяга наведвальніка, інтэлігентнага чалавека ў акулярах.
- Вы?
- Я, уласна кажучы, таксама...
- Дамовіліся. У пятніцу.
- У вас што?
- Я наконт інтэрната...
- Да Кушнера. Няхай дае прапановы.
Гукан шукаў вачамі наведвальніка, у якога магла б быць такая справа, каб усе зразумелі: так, гэта першачарговая і важна, мы можам і пачакаць.
Яго позірк спыніўся на зусім маладым чалавеку, амаль юнаку, модна апранутым: светлы касцюм, карычневая сарочка, вузенькі гальштук. Ён стаяў збоку, слухаў размову старшыні гарсавета з наведвальнікамі, і ў вачах яго, крыху блізарукіх, прыжмураных, свяцілася іранічная ўсмешка.
У такіх, што не лезуць назойліва наперад, не заглядваюць ліслівa ў вочы і не вельмі нават дамагаюцца прыёму, - у іх бываюць самыя цікавыя справы.
- А вы, таварыш? - цераз галовы другіх звярнуўся да яго Гукан.
- Я? - паказаў на сябе пальцам юнак і як бы здзівіўся. - Я хачу прапанаваць новую планіроўку мікрараёна на Выселках. - І ён падняў скрутак ватманскай паперы.
- О! - узрадаваўся Гукан, у сваю чаргу паказаўшы пальцам на хлопца. - З гэтага мы і пачнем! Бо гэта на сённяшні дзень самае галоўнае. Прашу вас.
І наведвальнікі моўчкі і пачціва расступіліся, вызваліўшы старшыню са свайго кола і даючы дарогу да дзвярэй кабінета маладому архітэктару.

У прыёмнай было ўжо душна. А ў кабінеце - цудоўны вільготны халадок; зачыніш за сабой дзверы і быццам трапляеш у другі свет. Вокны выходзілі на паўночны бок, на ціхую вуліцу. Гукан кіўнуў на доўгі стол.
- Вось тут рассцілайце свае чарцяжы. Замест кнопак вось гэта, - ён падняў адзін з круглых падшыпнікаў, якія стосам ляжалі на краі стала.
Пакуль наведвальнік разгортваў свае праекты, Гукан павесіў у куце на вешалку кепку, заглянуў у настольны каляндар - якія справы чакаюць сёння? Потым падышоў да адчыненага акна і доўга любаваўся на каштан. З таго часу, калі загарэліся белыя свечкі квецені, ён з цікавасцю сачыў, як завязваліся, развіваліся і як цяпер растуць плады каштана, маленькія, яшчэ зялёныя, з ледзь прыкметнай насечкай. Сямён Парфёнавіч глядзеў на іх па некалькі разоў на дзень. Гэта супакойвала, давала адпачынак нервам. Хораша настройвала.
Але, разглядаючы каштаны, ён раптам адчуў трывогу ў душы. Чаму? Ад чаго?
Нібы спалохаўшыся, што гэтую трывогу можа пачуць старонні чалавек, старшыня хутка павярнуўся да яго.
- Ну, што ў вас?
- Вось тут...
- Нічога не тлумачце. Я сам... Я, малады чалавек, зубы з'еў на гэтых планіроўках. Так... Так... Гэта ў вас што?
- Сад для дзяцей. З усім комплексам...
- Так... Цікава. Цікава...
Ён ступіў да другога ліста, да трэцяга. Праект яму спадабаўся. Планіроўка мікрараёна, архітэктура яго не былі падобны на ўсё тое, што яму паказвалі дагэтуль. Абком і гарком паставілі задачу - зрабіць мікраraён найпрыгажэйшым у горадзе, самым сучасным па архітэктурным вырашэнні, і некалькі бяскрылых праектаў ужо былі адхілены. А ў гэтага, здаецца, нешта ёсць.
Гукан падышоў да століка, на якім стаялі тры тэлефонныя апараты, патэлефанаваў спачатку галоўнаму архітэктару горада Гамбіцкаму, потым свайму намесніку Кушнеру, які займаўся будаўніцтвам. Папрасіў іх зайсці. Кладучы слухаўку, спытаў:
- Як ваша прозвішча? Хто вы?
- Маё? - зноў-такі нібы здзівіўся хлопец і ўсміхнуўся, мабыць, падумаў: «Нарэшце вы здагадаліся спытаць пра гэта». - Я студэнт Ленінградскага архітэктурнага. Дыпламант. Гэта мой дыпломны праект. Я вырас на Выселках.
- О, брат, гэта ўжо цэлая тэма для рамана! Ведаеш, у нас мясцовы пісьменнік ёсць - Шыковіч?
- Ведаю. Я ў школе яшчэ калі вучыўся, ён у нас выступаў.
- Але... Яго хлебам не кармі, а дай пагаварыць.
І прыгадалася, як учора Шыковіч ледзь не сапсаваў дзень. Хораша было пасля рыбалкі сядзець на верандзе, слухаць, як шуміць дождж і лес. Ён, Гукан, і жанчыны пілі шампанскае, Шыковіч і Яраш - каньяк. Чорт яго пацягнуў за язык выказацца супраць культу асобы (цяпер Гукан нават не помніў, чаму пачаў гаварыць пра гэта). Вось тады Шыковіч і разышоўся. Прыгадаў, як Гукан, будучы сакратаром гаркома, прымушаў яго пісаць пісьмы Сталіну. «Сабраўся які сход, актыў - давай Шыковіча, каб ён напісаў прыгожа, паэтычна. Дзе яны, нашы пісьмы, Сямён? Давай калі-небудзь пачытаем! І некаторыя мясціны з нашай кнігі, з першага выдання. Хочаш, пачытаю зараз?»
Жонка і Яраш рашуча супакоілі шумнага гаспадара. Праўда, ён тут жа павярнуў усё на жарт і нават, здаецца, неяк папрасіў у яго, Гукана, прабачэння. Сямёна Парфёнавіча не пакрыўдзіла п'яная балбатня і напамінак пра яго даўнюю дзейнасць. Не ён адзін так рабіў. Такі быў час. Уразіла іншае: фамільярнасць, з якой Шыковіч казаў гэта. Ён тады ж падумаў, што заўсёды меў рацыю, калі вельмі асцярожна прымаў запрашэнні. Нельга адказнаму работніку хадзіць у госці! Людзі хутка губляюць дыстанцыю.
Цяпер, адганяючы непажаданы ўспамін, ён падумаў інакш, больш злосна: «Зазнаўся, няшчасны пісака... Расперазаўся».
Першы ўкаціўся ў кабінет Гамбіцкі, нізкі, тоўсты, з галавой-шарам, бліскучым, аж шызым ад частага галення. Ён хадзіў, быццам сапраўды катаўся на роліках, хутка, бясшумна. Старшыні архітэктар моцна пацісну руку. Маладому калегу свайму кіўнуў галавой, прывітаўся здалёк:
- Прывет, Кухараў. Ты ўсё-такі вырашыў патурбаваць Сямёна Парфёнавіча? Ах, моладзь, моладзь!

- І правільна зрабіў, што патурбаваў. Цікавы праект, - сказаў Гукан.
Гамбіцкі пільна паглядзеў на старшыню: сур'ёзна ён кажа, шчыра ці з іроніяй, з падэсцю?
- Цікавы. Але не нашы ўплывы, Сямён Парфёнавіч. Не наш стыль, форма. Заходнія.
- А што, па-вашаму, на Захадзе ў архітэктуры няма нічога цікавага? - спытаў Кухараў.
- Не. Чаму? Ёсць арыгінальныя рашэнні. Вельмі своеасаблівыя. Але ў нас не тыя задачы, дарагі мой калега, разумееце?
- А па-мойму, галоўная задача, каб было прыгожа, менш каштавала і людзям было зручна жыць. А вы проста кансерватар!
Шызы шар Гамбіцкага пачырванеў, загарэліся маленькія вушы, як два пялёсткі. Гукан засмяяўся.
- О! А вы малады, ды ранні. Зубасты. Гэта добра, - і раптам на твар яго як бы ўпаў цень і замарозіў рысы. - Але паважайце нас, старых. Мы з Феліксам Янавічам узарвалі заводы ў сорак першым. Мы збудавалі горад нанова. Хіба кепска збудавалі?
Гамбіцкі, сентыментальны чалавек, непрыкметна прамакнуў насоўкай вочы і надзеў акуляры.
- Увогуле - нічога.
- Увогуле! Вы чулі? Увогуле! - плаксіва выкрыкнуў архітэктар.
- Добра збудавалі! - сурова і рашуча сказаў Гукан.
- Добра, - з ледзь прыкметнай усмешкай згадзіўся Кухараў. - Я паважаю старэйшых. Яны вучаць мяне. Але, Фелікс Янавіч... вы кажаце: другія задачы. На Захадзе - Чэхаславакія і ГДР з іх высокай будаўнічай культурай. Хіба ў іх не тыя ж самыя задачы?
- Вось гэта правільна! - З Гуканавага твару, надзвычай багатага на пераліва ценяў і святла, напалавіну сышоў цень - з верхняй часткі, з вачэй. У кабінет увайшоў Кушнер, чалавек з маладжавым прыемным тварам, з пустым правым рукавом. Падаў усім левую руку і без лішніх слоў пачаў разглядаць праект, пераходзячы ад аднаго ліста да другога.
- Ну як, будаўнік? - спытаў Гукан, назіраючы за намеснікам з хітрай усмешкай.
- Ліха яго ведае! Для мяне гэта цёмны лес. Я пакуль на натуры не пабачу, не магу зразумець, дзе добра, а дзе дрэнна, - шчыра і проста прызнаўся Кушнер.
Гамбіцкі хмыкнуў. Гукан паківаў галавой. Яго даўно перастала ўжо здзіўляць шчырасць намесніка, яго незвычайная самакрытычнасць. Пра сябе і пра другіх ён гаварыў толькі праўду, якой бы яна ні была. Чаго не разумеў, не ведаў, не саромеўся прызнацца ні начальству, ні падначаленым. За гэта яго і паважалі і не любілі.
- А мне гэтая планіроўка падабаецца. - Гукан пастукаў пальцамі па першым аркушы. - Разгледзь, Гамбіцкі, там са сваімі... Сур'ёзна. Па дэталях... Памажыце таварышу... Кухараву.
- Калі Гамбіцкаму не падабаецца, ён пахавае без доўгіх надмагільных прамоў, - кінуў Кушнер.
- Іван Фёдаравіч! - пакрыўдзіўся архітэктар.
- А мы вынесем усе праекты на выканком, у тым ліку і гэты... Абмяркуем з удзелам грамадскасці. Выселкі павінны быць прыгажэйшым раёнам! - заключыў Гукан.
У Кухарава пры гэтых словах бліснулі вочы, і ён горача падзякаваў старшыні гарсавета. Яму, магчыма, больш, чым каму другому, хацелася, каб Выселкі сталі прыгажэйшым раёнам. Калі, скруціўшы чарцяжы, Кухараў выйшаў, Гукан кіўнуў услед:
- Бачылі, якая моладзь расце.
- Прабіўная, - адказаў Гамбіцкі.
- Адукаваная, - уздыхнуў Кушнер.
Гукан пайшоў за свой стол, сеў у крэсла, перагарнуў паперы, выбіраючы, якой заняцца ў першую чаргу. Спытаў:
- Як выхадны правялі?
- Ездзіў дзяцей праведаць у лагер. Сустрэў хлопцаў з завода. Ехалі назад - заехалі ў чайную ў Вярбовічах. І, канешне, выпілі. Ды што пілі! Піва і нейкае пладовае віно. Пойла. Хто ў нас толькі выпускае такую дрэнь? Бр-р, брыдота! Лепш ужо гарэлку піць, - смешна зморшчыўся Кушнер; нават свае чалавечыя слабасці ён ніколі не хаваў, расказваў пра іх проста і шчыра.
Гамбіцкі хмыкнуў, ён ніяк не мог звыкнуцца з гэтай святой прастатой намесніка.
- А я працаваў. Нам, творчым работнікам, няма калі і адпачыць.
Гукан і Кушнер не паверылі, што архітэктар сапраўды працаваў, але змаўчалі.
Гукан сказаў:
- А я так хораша парыбаліў. Каля Дзятлава. На такую мясціну натрапіў... Акуні, дурні, аднаго возьмеш, вядзеш, другія следам ідуць, гатовы на бераг выскачыць. Кілаграмы чатыры нацягаў. А

пасля насмяшыў мяне адзін дзівак. - Сямён Парфёнавіч адкінуўся на спінку крэсла і весела засмяяўся. - Далібог, даўно ўжо не смяяўся так. Шыковіч. Яны там у лясніцтве дачу сабе адгрохалі. З Ярашам. Хароміна! Жывуць, як паны. Дык вось... Прыйшоў Шыковіч на бераг. П'яненькі, безумоўна. Сеў на абрыве. Бубніў, бубніў нешта. І раптам - боўць. У раку! Я гляджу - адзін капялюш плыве. Ледзь я выцягнуў яго. Задрамаў, аказваецца, чалавек. Ха-ха-ха...
Ніколі яшчэ Гукан не смяяўся так на службе. Ва ўсякім разе, Гамбіцкі не чуў, а таму ў першы момант нават разгубіўся. І толькі крыху пазней, калі старшыня выціраў хусцінкай вочы, архітэктар захліпаў смехам дробным, перарывістым. Кушнер не засмяяўся зусім. Яму чамусьці не спадабалася гэтая весялосць, і ён сказаў:
- Я ніколі не бачыў Шыковіча п'яным.
І гэтым асек Гуканаў смех. Старшыня ўміг замкнуўся: патушыў вочы, сцяў вусны. Нахіліўся над сталом, прыгладзіў рэдкія сівыя валасы.
- Ну, будзем працаваць!
Гамбіцкі выкаціўся.
Кушнер падышоў да акна і, выглядаючы на вуліцу, сарваў каштанавы ліст.
Старшыня ўзлаваўся:
- Колькі разоў я прасіў цябе: не чапай лісця. Дурная звычка! Гэтак ты за лета ўвесь каштан абскубеш.
- Увесь не дастану.
Сямён Парфёнавіч кіпеў. Больш чым за год сумеснай працы ён ніяк не мог зразумець: сапраўды гэты чалавек заўсёды кажа тое, што думае, ці часам робіць гэта дзеля таго, каб паздзекавацца з другіх? Вось як цяпер: «Увесь не дастану».
- Калі намеснік старшыні гарсавета будзе так скубці зялёныя насаджэнні, не ведаю, калі мы выканаем рашэнне абкома...
Кушнер засмяяўся:
- Будзем мець апраўданне: усю зеляніну папсаваў Кушнер.
Гукан не адказаў. Схіліўшы галаву набок, пачаў пісаць рэзалюцыю на нейкай паперы. І Кушнер зноў выказаў тое, што падумаў:
- Мне здаецца, Шыковіч не насмяшыў цябе, а сапсаваў настрой. Чым?
Гукан падняўся, цяжка, па-старэчаму абапіраючыся на стол рукамі. Папрасіў падкрэслена ветліва:
- Іван Фёдаравіч, давай зоймемся справамі.
Кушнер усміхнуўся і бадзёра пайшоў да дзвярэй, кінуўшы на хаду:
- Я еду на будоўлю школы-інтэрната.
Калі за ім зачыніліся дзверы, Сямён Парфёнавіч нервова прайшоўся па кабінеце, спыніўся перад акном, палюбаваўся на каштан, каб супакоіцца. Лісце хутка абсыхала, падымала вострыя зубчыкі ўгору, мяняла колер з ярка-зялёнага на зялёна-матавы. Дзесьці ў верхавіне шамацелі нябачныя птушкі. Усё, як заўсёды, як учора, пазаўчора. А спакой не прыходзіў. Зноў з'явілася трывога ў душы.
«Шыковіч не насмяшыў цябе, а сапсаваў настрой. Чым?» Сапраўды, чым? Калі не лічыць крыху шумнай размовы аб культе асобы, Шыковіч паводзіў сябе карэктна і гасцінна. Увогуле ўсё з учарашняга дня падабаецца. І цяпер у вушах стаіць шум дажджу. А ў вачах - струмені вады, што льюцца са страхі. Усярэдку дачы моцна пахне свежаю сасной, апетытнай юшкай і смажанай рыбай...
Што яшчэ гаварыў Шыковіч? Ага, кароткая размова на беразе аб падполлі, да якой ён потым не вярнуўся нават тады, калі падвыпіў. Што ён сказаў? «Хачу пісаць аповесць. Дакументальную. Глянуць глыбей. Разабрацца». У чым? У чым ён хоча разабрацца? Безумоўна, штурхае яго на гэта Яраш. Ну што ж, няхай разбіраецца. Магчыма, яму, Гукану, трымацца за ацэнку, якую ён даў падполлю дзесяць год назад, і не вельмі трэба цяпер. Упартасць, нязгода з іншымі поглядамі была б незразумелай... А ўвогуле, каб яго воля, ён не дазволіў бы кожнаму пісаку корпацца ў мінулым. Не твая гэта справа. Пішы пра тое, што бачыш вакол сябе. Быў ты на фронце - пішы пра фронт. А я кіраваў падполлем - я і напісаў пра падполле.
А ўрэшце, усё гэта глупства. Не ў характары Шыковіча заглядваць вельмі глыбока. Не хопіць пораху.

«Я ведаю, якая ў цябе глыбіня, хапаеш адны вярхі. Табе здаецца, што гэта ты напісаў за мяне кніжку. Няўдзячны чалавек. Што б ты напісаў без маёй партызанскай дзейнасці, без маіх матэрыялаў і расказаў? Гультай. Я цябе сілком садзіў за рабочы стол. Мая кніжка памагла табе стаць на ногі. Не забывай гэтага!»
Непрыкметна агульныя думкі набылі канкрэтную форму - водпаведзі Шыковічу, успамін пра якога чамусьці раздражняў. Праўда, Сямён Парфёнавіч стараўся захаваць аб'ектыўнасць. Ён, напрыклад, упікнуў самога сябе за тое, што ў апошнія гады як бы забыўся на чалавека, які памог яму. «Пісьменнікі - народ самалюбівы, трэба было яго прыласкаць». Але такая аб'ектыўнасць мала памагала. Чым больш ён думаў, тым больш расла злосць на гэтага чалавека. «Бач, раскрычаўся! Пісьмы яго прымушалі пісаць!.. Перапрацаваўся... Зазнаўся - вось у чым бяда».
Гукан не пачуў нават, калі ў кабінет увайшоў сакратар выканкома Гарусевіч. Гэты малады чалавек, надзвычай акуратны ва ўсім - у адзенні, у справах, у захаванні рэжыму жыцця, заўсёды з'яўляўся і знікаў бясшумна, як цень. Нават Гукан, сам педант у жыцці і рабоце, здзіўляўся, адкуль у гэтага вясковага хлопца такая звышакуратнасць. Ідзе самае бурнае пасяджэнне, вырашаюцца важнейшыя пытанні, а ён, Гарусевіч, калі наступае пэўны час, бясшумна знікае і, як стала вядома, у сябе ў кабінеце выпівае шклянку баржому і з'ядае бутэрброд, які прыносіць на службу ў кішэні.
Сакратар пачціва кашлянуў.
Гукан нервова ўздрыгнуў, павярнуўся. Ён крыху спалохаўся, бо ведаў, што ў апошні час у яго з'явілася старэчая слабасць - разважаць з самім сабой уголас.
- Як гэта вы заходзіце? Дзверы на ўвесь будынак скрыпяць. Адзін вы ўмееце адчыніць іх бясшумна.
- Вы глыбока задумаліся, Сямён Парфёнавіч. - Гарусевіч спачувальна ўздыхнуў. - Справы.
Гукан пільна агледзеў яго. Як заўсёды, гарнітур быццам толькі што з-пад праса, чаравікі - з-пад аксаміткі чысцільшчыка. І здавалася, гэтай жа аксаміткай надраены шчокі пасля галення. Гукан непрыязна падумаў:
«Убачыць бы хоць раз цябе непаголеным».
Вярнуўшыся за стол, коратка спытаў:
- Што там у нас?
Гарусевіч сеў у крэсла і пачаў даваць паперы на подпіс.
- Пісьмо ў Савет Міністраў аб дадатковых асігнаваннях на будаўніцтва прадуктовых крамаў... Згодна пастановы сесіі...
Гукан зняў з пяра пазногцямі парушынку, акуратна падпісаў і прамакнуў.
- Запіска ў абком аб стварэнні новых паркаў.
Падпісаў размашыста, не чытаючы.
- Адказ у рэдакцыю аб непарадках у пахавальным бюро і на могілках...
- Непарадкі на могілках!.. - Старшыня сумна паківаў галавой. - Чым толькі нам, Кандрат Пятровіч, не прыходзіцца займацца!
- Але, - зноў спачувальна ўздыхнуў Гарусевіч.
Гукан прачытаў адказ і не падпісаў - палажыў убок.
- А тут нам пішуць. Канадскія турысты выказваюць падзяку за гасціннасць. Група балтыйскіх матросаў хваліць наш горад, і асабліва рэстаран.
- Ну, гэта гумарысты, чортавы дзеці. Горад як горад. А рэстаран - дрэнь. Трэба нам паслухаць трэст сталовых і рэстаранаў. - І нечакана спытаў: - Вы бываеце ў рэстаране?
Гарусевіч збянтэжана пачырванеў.
- Не. Што вы, Сямён Парфёнавіч! Праўда, калі працаваў яшчэ ў аддзеле культуры, разы два акцёры тэатра зацягнулі...
Гукан, які любіў свайго сакратара за акуратнасць у рабоце, паглядзеў на яго ў гэты раз зняважліва.
- Чаму гэта ў нас лічаць крамолай, калі чалавек зайшоў у рэстаран? А калі я проста хачу паабедаць культурна?
- Вельмі правільна, Сямён Парфёнавіч! - узрадавана падтрымаў Гарусевіч.
Гукан стомлена пазяхнуў.
- Што там яшчэ?
Сакратар падаў цэлы стос сашчэпленых аркушаў з надрукаваным на машынцы тэкстам.

- Запіска старшыні камісіі па ахове здароўя аб стане бальніц у горадзе і наогул аб усёй нашай медыцыне. І скажу вам, Сямён Парфёнавіч, па-мойму, неаб'ектыўна. Адно адмоўнае бачыць доктар...
- Яраш?
- Яраш. Калі ён пашле гэта вышэй - чакай камісіі.
- Ну, камісій нам баяцца няма чаго. Добра. Я пачытаю. - Гукан ляпнуў па паперы далоняй.
Але чытаць не стаў. Калі сакратар выйшаў, ён зноў падышоў да акна і загледзеўся на свой каштан. Знізу, з вуліцы, далятаў гоман людзей, шыпенне шын на нагрэтым асфальце. Праз лісце каштана прасвечвалася неба, яснае, спякотнае, як і многа дзён ужо. Гукану зноў успомнілася ўчарашняя дача. Ён адчуў сябе стомленым і падумаў, што было б хораша хоць тыдзень адпачыць у такім вось ціхім, лясным, лугавым кутку, каб не ехаць ні на якія курорты, дзе спёка і поўна народу. Могуць людзі арганізаваць сабе адпачынак! А вось ён усё жыццё працуе, хвалюецца. Шыковіч цяпер ляжыць пад соснамі ў гамаку і фантазіруе. Ніхто да яго не просіцца на прыём, не патрабуе выканання плана будаўніцтва. І Яраш... Не, Яраш на рабоце. У хірурга, безумоўна, работы хапае, нічога не скажаш, хворыя не могуць чакаць.
Але навошта яму чарніць тое, чаму аддалі столькі сілы і здароўя і ён, Гукан, і сам Яраш?
Старшыня не ведаў, што напісана ў запісцы, і чытаць яе цяпер не хацеў - баяўся, што яшчэ больш сапсуе настрой. Падумаў, чаму Яраш учора ніводнага слова не сказаў пра гэтую запіску. З-за далікатнасці, каб не турбаваць госця службовымі справамі? Ці, можа, гэта хітры план, разведка праціўніка, на якога рыхтуецца наступ з усіх бакоў? Кніжка, ацэнка падполля, бальніцы... Але чаму гэты наступ яны вырашылі пачаць цяпер? Можа, прачулі што? Ці атрымалі моцную падтрымку? Ад каго? І раптам Сямён Парфёнавіч успомніў. Сакратар гаркома Тарасаў неяк у гутарцы сказаў, што да вайны ён і Шыковіч працавалі ў адным раёне. Вунь яно што! Старыя сябры. Але не падобна, каб Тарасаў мог займацца такімі інтрыгамі. Ды і навошта яму? Працуюць яны мірна і дружна, без канфліктаў.
А нарэшце, чаму яму здаецца, што запіска Яраша - нейкі падкоп пад яго, старшыню гарсавета? Яраш з суровай крытыкай выступаў на сесіі яшчэ гады два назад. І крытыка гэтая была на карысць: міністэрства праявіла большую ўвагу. Адкрыты новыя паліклінікі. Будуецца бальніца.
Усё-такі каштан супакоіў. Гукан пасмяяўся са сваёй трывогі і вярнуўся да стала. Няма калі займацца аналізам пачуццяў! Ішоў звычайны рабочы дзень старшыні гарсавета. Тэлефонныя званкі. Наведвальнікі. Паперы. Лівень папер. Недзе ўжо ў сярэдзіне дня пазваніў намеснік старшыні аблвыканкома Мухля. Высвятляў дэталі пераносу гарадской мяжы. Горад рос. Пад канец доўгай тэлефоннай размовы Гукан спытаў між іншым:
- Слухай, Пятро Макаравіч, хто ў нас назірае за будаўніцтвам прыватных дач? Я ведаю, што я займаюся там, дзе адведзены былі ўчасткі пад такое будаўніцтва. У Загайным. І там парушэнняў колькі хочаш. Але там усё-такі ёсць нейкі нагляд... А я маю на ўвазе дачы дзікія, што растуць у другіх месцах як грыбы. Дзе? Ты сам добра ведаеш дзе. Не ведаеш? Рэдка, значыцца, аб'язджаеш свае ўладанні. Што б рабілася ў горадзе, каб я гэтак не ведаў, дзе што будуецца. Анархія! Не хвалюся. У Дзятлаўскім лясніцтве бачыў, якая хароміна вырасла? Але, Яраша і Шыковіча. Я ж не кажу, што ім не трэба дача. Няхай адпачываюць на здароўе. Хлопцы сапраўды добрыя. Здольныя. Але хто ім адводзіў участак? Лясгас? Райвыканком? А маюць яны права? Глядзі, брат. Ведаеш, як цяпер прэса выступае супраць прыватнай уласнасці? Каб нас з табой не пагладзілі... Людзі яны разумныя. Але я не сказаў бы, што вельмі разумна з іх боку будаваць такія харомы сярод лесу. Не адзін дзесятак кубаметраў. Мая сяброўская парада табе - пацікаўся. Пацікавішся? Вось-вось... Каб не было нечаканасцей... Ну, прывет!
Скончыўшы размову, Гукан задаволена пацёр рукі, падышоў да акна, зноў палюбаваўся на свой каштан. Ужо і праз густое лісце ў кабінет дыхаў спякотны летні дзень.
**4**
Яраш сядзеў у ардынатарскай і паліў. Ён стаміўся. Тры гадзіны каля аперацыйнага стала. Дзве цяжкія аперацыі. Асабліва стаміла апошняя - на дзіцяці.
Аперацыі на дзецях заўсёды стамлялі яго. Колькі год практыкі, слава лепшага хірурга вобласці, а хваляваўся ён сёння, як студэнт.
Попел ад папяросы ўпаў на халат. І адразу ж спрытная рука нячутна падставіла попельніцу. Яраш падняў галаву і з удзячнасцю зірнуў на аперацыйную сястру. Ён ведаў, што гэтая дзяўчына ўлюбёна ў яго. І ён таксама любіў яе: Маша, нягледзячы на сваю маладосць, была лепшай

аперацыйнай сястрой з усіх, з якімі яму даводзілася калі-небудзь працаваць. Яна разумела не толькі кожнае яго слова, але кожны рух, жэст. Варухнулася яго левае брыво - і яна ведала, які інструмент трэба падаць. Збегліся зморшчынкі на пераносіцы - і Маша папраўляла асістэнта. Яна ўмела так прамакнуць пот на яго лбе і скронях, што ні на секунду, ні на міг не адрывала ад хворага, не перашкаджала аперацыі. Яна ўсё ўмела і ўсё ведала.
«Залатая сястра», - сказаў неяк Яраш. Лекары прынялі гэта як жарт: Маша была рыжая, і не проста рыжая, а ўся агніста-чырвоная. Чырвоныя косы, бровы, нейкія залацістыя рудзінкі абсыпалі нос, шчокі, рукі. Тады Ярашу стала шкада яе. Яму заўсёды было шкада непрыгожых жанчын. І ён больш ніколі не казаў «залатая сястра», нават завочна. У добрым настроі ён казаў пра яе: «Мой хірургічны геній».
Маша скінула касынку і гэтак жа спрытна, умела, як і працавала, папраўляла валасы. І раптам Яраш убачыў, упершыню за два гады, што яна прыгожая. Стройная, высокая; капа яе валасоў на фоне акна гарэла, як жар. З узнятымі рукамі яна як бы цягнулася ўгору, і здавалася, вось-вось узнімецца і паляціць на нейкую іншую планету, з якой яна і з'явілася, гэтая дзівосная жанчына.
У доктара ў апошнія гады частая з'ява - такія вось нечаканыя адкрыцці прыгожага. Так, напрыклад, зусім нядаўна ён адкрыў хараство васільеўскага «Мокрага лугу», які раней бачыў многа разоў і ніяк не мог зразумець, чым карціна адрозніваецца ад звычайных падобных пейзажаў, якія пішуць іх абласныя мастакі. Яшчэ раней ён гэтак жа адкрыў «Вішнёвы сад». У маладосці некалі не даседзеў на спектаклі да канца.
Маша ўбачыла, адчула, што ён глядзіць на яе, як на жанчыну, і ўся ўстрапянулася, спалоханая і ўзрадаваная. Так і застыла з паднятымі рукамі. Не, яна не проста была ўлюбёна ў гэтага дужага, разумнага, таленавітага чалавека. Яна кахала яго, глыбока, тайна, безнадзейна. І вось наступіў момант, можа, адзіны і непаўторны, калі і ён пачуў токі гэтага кахання.
Позіркі іх сустрэліся. У Машы спынілася сэрца. Яраш адчуў адказнасць за кожны свой рух у гэты міг. Ён умеў валодаць сваімі пачуццямі. Патушыў недакураную папяросу (паліў ён цяпер толькі пасля цяжкіх аперацый), адкінуўся на спінку канапы і сказаў проста, даверліва:
- Стаміўся я, Маша...
Яна выдыхнула паветра, апусціла рукі і... зрабілася зямной. Але што гэта? Вочы... Яе залатыя вочы раптам адплылі некуды, на іх месцы закалыхаліся зялёныя хвалі мора. Ён ніколі не бачыў у яе праяў сентыментальнасці, яна заўсёды была строгая і маласлоўная. Што ж яе кранула так? Радасць душэўнай блізасці? Ці крушэнне апошняй надзеі? Ён падняўся, падышоў, лёгка абняў за плечы - так ён рабіў часта, гэткі амаль несвядомы сяброўска-паблажлівы жэст старэйшага - і пачуў, як дробна дрыжаць яе плечы. Ён сказаў:
- Не трэба, Маша. Мы з вамі добрыя сябры. Мы застанемся сябрамі, праўда?
Яна ўсміхнулася з удзячнасцю, прыгнулася, каб вызваліць плячо з-пад яго рукі, і пайшла да дзвярэй.
Яраш сеў і запаліў другую папяросу.
Хвілін праз колькі Маша з'явілася ў дзвярах і звычайным голасам напомніла:
- У чатыры ў вас кансультацыя ў трэцяй бальніцы.
Яна была не толькі лепшай аперацыйнай сястрой, але і яго добраахвотным сакратаром - заўсёды ўсё помніла.
- Дзякуй, Маша. - Ён уздыхнуў і зноў чамусьці паўтарыў: - Стаміўся я сёння.
Яраш не любіў трэцяй бальніцы з-за галоўнага лекара яе Тамары Гаецкай. Да вайны яны разам вучыліся ў медвучылішчы. Разам паступалі ў інстытут. І ўжо тады Тамара заляцалася да яго. Але вайна іх разлучыла. Тамара паспела эвакуіравацца, скончыла інстытут, была на фронце. Вярнулася ў родны горад і адразу заняла кіруючую пасаду ў аддзеле аховы здароўя. Лекар яна была бяздарны, але арганізатар неблагі, а галоўнае, мела вялікую прабіўную сілу - да ўсіх дайсці, усё дастаць, знайсці... Яраша яна таксама адразу знайшла. І вельмі хацела прыгрэць, прысвоіць. Але ён быў непахісны і цвёрды. Што яна ні рабіла, на якія хітрыкі ні ішла, ён толькі ў адным не вытрымаў - разы два прыняў яе матэрыяльную дапамогу. Яму было дужа цяжка, пакуль канчаў інстытут, бо малы Тарас хоць і знаходзіўся ў цёткі Любы, але быў яго сынам, і ён лічыў сваім абавязкам штомесячна высылаць на ўтрыманне хлопца. Тамара гэта ведала і ўмела памагчы тактоўна і хітра.
А калі ён ажаніўся з Галінай, Тамара проста ашалела. Можна сказаць, што яна паставіла сабе за жыццёвую мэту: спакусіць яго, зрабіць палюбоўнікам. І вось ужо пятнаццаць год дамагаецца

гэтай мэты, не грэбуючы нічым. Сама даўно ўжо замужам, мае сына і ўсё адно ніяк не ўтаймуецца. Прыстае нахабна, цынічна - на людзях, на нарадах, сходах. Заляцаецца ў прысутнасці Галіны і свайго мужа. Гэтыя яе заляцанні, званкі на дом, запрашэнні давялі Галіну да хваробы, бо рэўнасць яе набыла паталагічны характар, стала псіхозам. Антону, гордаму волату, колькі разоў прыходзілася ўніжана пераконваць жонку, што ён ніколі нават не дакрануўся да гэтай жанчыны, акрамя звычайнага прывітальнага поціску рукі - як з усімі людзьмі. Галіна люта, не па-чалавечаму ненавідзела Гаецкую.
Неяк, калі яны добра пасябравалі, Яраш паскардзіўся Шыковічам, як адна дурніца атручвае яму жыццё і сямейнае шчасце. Кірыла сказаў тады не то жартам, не то сур'ёзна:
- А ведаеш, я на тваім месцы паказаў бы ёй сваю мужчынскую сілу. І, запэўняю цябе, яна адразу б сціхла. Зрабіла б гэта глыбокай тайнай. Беспамылковы псіхалагічны ход.
Яраша ўразіла, што Кірыла мог сказаць так пры жонцы. Што было б, каб ён сказаў гэта пры Галіне! А Валя засмяялася, ляпнула мужа далоняй па лысіне і сказала:
- Каб яна была ў цябе, гэтая сіла.
Галіна ў сваю чаргу скардзілася Валі, і разумная, аб'ектыўная настаўніца больш паверыла ёй - такая ўжо жаночая псіхалогія.
...Яраш не даехаў да бальніцы. Ён рабіў так часта, каб потым непрыкметна праскочыць прахадную і цераз скверык, абышоўшы галоўны корпус, трапіць у хірургічны. Так ён пазбягаў сустрэчы з Тамарай Аляксандраўнай, якая яўна падпільноўвала яго са свайго кабінета. Праўда, яна часта з'яўлялася ў аддзяленне, але там, пры хворых, мусіла паводзіць сябе стрымана і карэктна. Ярашу былі агідныя ўласныя манеўры. Ён даўно адмовіўся б ад кансультацый у гэтай бальніцы, але аддзяленнем тут загадваў здольны малады хірург Майзіс. Яраш любіў гэтага хлопца і не мог адмовіць яму ў дапамозе. Увогуле, ён стараўся зрабіць усё, каб яго малодшыя калегі як мага менш рабілі памылак.
На гэты раз праскочыць непрыкметна не ўдалося: у прахадной затрымала калгасніца з трохгадовым сынам. Хлопчыку пры нараджэнні няўмелая акушэрка вывіхнула ножкі. Яраш тут жа на лавачцы ў скверыку паглядзеў малога.
- О, цераз паўгода будзе танцаваць!
Маладая маці залілася слязамі ад шчасця.
- Я напішу вам запіску, каб Мішу паклалі ў маё аддзяленне. Ах, шкада, што я адпусціў машыну!
- Ой, доктар, што вы! Я данясу.
- Далёка. Горача.
- Хіба нам прывыкаць! Абы выпрасталі яго ножкі. Сыночак, родненькі, скажы дзякуй.
Хлопчык смела і вельмі сур'ёзна, як дарослы, сказаў:
- Дзякуй, дзядзя.
- О, ты, брат, герой!
- Ён усё пытае: мама, ці буду і я бегаць, як Лёнька? Старэйшы наш. Будзеш, сыначка, будзеш бегаць!
Яраш напісаў запіску.
І тут з'явілася яна, Тамара Аляксандраўна. Падплыла па чорнай асфальтавай дарожцы, быццам статуя, уся
асляпляльна белая: белыя басаножкі, белы халат, белыя валасы, твар нібы вымыты малаком, толькі бровы ды вейкі крыху падчорнены ды нафарбаваны губы. Яна невысокая, сярэдне для сваіх год распаўнелая, пышнагрудая - па-свойму прыгожая. Многім мужчынам яна падабалася. Гаецкая ведала гэта, і тым больш яе прыводзіла ў шаленства поўная няўвага таго, хто даўно падабаўся ёй.
- Прафесар Яраш, што за прыватная кансультацыя? У маёй клініцы?
Калгасніца спалохалася белай доктаркі.
- Сынок мой, доктарка. Ножкі ў яго... А тут сястра з нашай вёскі... Прыязджай, кажа, мы папросім доктара...
Яраш, нічога не адказаўшы, пачаў тлумачыць жанчыне, як праехаць у іх бальніцу.
- Палажыце яго ў нас, - кіўнула на малога Тамара Аляксандраўна.
- Дзякую, - адказаў Яраш. - Я хачу даць цікавую аперацыю нашаму артапеду. Я сам буду асісціраваць яму...

Гаецкая пры хворых заўсёды казала яму «прафесар» і рабіла гэта без іроніі. Для простых людзей доктар - любы лекар, а Яраш - кандыдат навук, славуты хірург, трэба ж неяк адрозніць яго ад звычайных лекараў. Ды і самой ёй было прыемна называць яго прафесарам, узвысіць над другімі лекарамі.
- А ты добрая сёння, - з іроніяй сказаў Яраш Тамары Аляксандраўне, калі калгасніца, сто разоў падзякаваўшы, пайшла.
- Я заўсёды добрая. - Яна расплылася ва ўсмешцы.
Ярашу здалося, што гэтая цукровая жанчына вось-вось растане пад яркімі праменнямі чэрвеньскага сонца.
- Для сябе. Ты заўсёды добрая для сябе. А ведаеш, як называецца такая дабрыня?
Яна перасмыкнула падфарбаванымі вуснамі, але змаўчала. Ведала: калі пачаць пікіравацца, ён нагаворыць непрыемнасцей. Ласкава прапанавала:
- Зайдзі да мяне, Антон. Я напаю цябе вадой. Толькі што прынеслі сіфон. І сіроп ёсць.
Ён пазбягаў заходзіць у яе кабінет, але яму хацелася піць, і ён ведаў, што для сябе гэтая жанчына ўмела стварыць камфорт.
Яна пасадзіла яго ў мяккае крэсла каля пісьмовага стала; крэсла было глыбокае, зручнае, а льняны чахол вільготны і халаднаваты. Сама пайшла за цыратавую зялёную занавеску, што адгароджвала ўмывальнік, і вярнулася з запацелым сіфонам, бутэлькай сіропу і шклянкамі.
Яраш памацаў сіфон і свіснуў. Падняўся, зазірнуў за занавеску, засмяяўся:
- Быў я ў міністра, у прэзідэнта акадэміі. Усё бачыў, але халадзільнік у кабінеце... Ты геній, Тамара!
- Ён часова ў мяне, у лабараторыі рамонт.
Яна наліла ў шклянкі вады, пасля сіропу, памяшала лыжачкай, працягнула адну шклянку Ярашу. Блакітныя вочы яе зрабіліся вішнёвымі, калі пачала піць. Адпівала маленькімі глыткамі і не зводзіла позірку з госця.
Яраш не сеў, адышоў да акна і прагна выпіў халодную смачную ваду. Яна наліла яшчэ.
- Даўно я з табой не выпівала. Вып'ем хоць вады. Запрасіў бы на дачу. Кажуць, жывеш, як на небе.
- У госці запрашаюць сяброў сям'і.
- А хіба я не сябра твой? Лепшага ў цябе няма.
Непрыкметна яна апынулася зусім блізка ад яго.
- Не прытварайся, Тамара, мы не маленькія. Ты добра ведаеш, як цябе «любіць» Галіна. А мне спакой жонкі даражэй за ўсё.
- Яна робіцца мяшчанкай, твая Галіна. - Дзіўна мяняўся колер яе вачэй у залежнасці ад настрою, як у кошкі, у той міг яны сыпанулі нейкія шэрыя іскры.
- Чорт яго ведае, цяжка сказаць, у чым яно праяўляецца ў наш час, мяшчанства.
Яна падплыла так блізка, што Яраш, здавалася, адчуў гарачыню яе паружавелага твару і ўбачыў, што вочы яе сталі масляністыя. Ён адступіў у кут паміж сталом і сцяной. Яна горача дыхала яму ў твар.
- Чаму ты пазбягаеш мяне? Я люблю цябе.
- Я гэта чуў, Тамара. Многа разоў. Пусці.
- Люблю і жадаю... Пацалуй мяне. Адзін раз. Шкада табе?
Жанчына траціла ўсякую прыстойнасць.
Ніколі яшчэ пры ўсёй сваёй нахабнасці ёй не ўдавалася паставіць Яраша ў такое недарэчнае становішча. Загнаны ў кут, прыціснуты да сцяны, ён не ведаў, што рабіць, як вызваліцца. Піхнуць яе? Паслаць да д'ябла? І раптам... дзве дэталі кінуліся ў вочы: занавескі, што закрывалі толькі ніжнюю палавіну акна, і тое, што яна, мабыць, забыўшыся, усё яшчэ трымае шклянку з вадой у руцэ. Яраш нечакана падхапіў яе пад пахі, рыўком падняў высока ўгору і... паставіў на пісьмовы стол. Няхай хто-небудзь з персаналу ўбачыць праз акно свайго галоўнага лекара на стале са шклянкай, напоўненай невядомай вішнёвай вадкасцю!
Тамара Аляксандраўна ўсяго чакала ад гэтага чалавека - абразлівых слоў, пагрозы, нават штуршка... Але такога ўчынку не чакала. Разгубілася. На нейкі міг белай статуяй застыла на стале.
Яраш паспеў адысці да дзвярэй і ўзяць капялюш. Нарэшце яна саскочыла на падлогу, гопнула, аж забрынчалі шыбы. Засмяялася:

- А ты робішся жартаўніком. Прагрэс!
Твар яе гарэў. Але ўсё адно яна пайшла следам за ім. У калідоры ён пачуў ззаду стук яе абцасаў і ўзлаваўся. Разбэшчаная баба! Як можна такому чалавеку даручыць кіраваць бальніцай? Ён не выйшаў адразу на двор, а знарок пайшоў у тэрапеўтычнае аддзяленне. У доўгім паўцёмным калідоры на ложках ляжалі хворыя. У той бальніцы, дзе Яраш загадваў аддзяленнем, такой з'явы даўно ўжо не было: хворыя ў калідорах не ляжалі, усё навокал ззяла чысцінёй. Таму выгляд гэтай бальніцы яго заўсёды раздражняў, аб непарадках тут пісаў ён у сваёй запісцы выканкому гарсавета. Але ў злосці, у гневе ён быў такі ж нястрыманы, як Гаецкая ў страсці. Не зважаючы на хворых, на персанал, ён загрымеў на ўвесь корпус:
- Калі тут нарэшце будзе падобна на бальніцу? Што гэта такое?
Тамара Аляксандраўна дагнала яго, сціснула локаць:
- Антон!
- Клініка! Памыйная яма, а не клініка! - не сціхаў ён.
Тады і яна загаварыла ўголас, хітра адводзячы ўдар:
- Нам не даюць столькі грошай, колькі вам, прафесар. Пахадайнічайце за нас. Вы старшыня камісіі гарсавета.
- На халадзільнік у цябе знайшліся грошы!
Але калідор скончыўся, і яны выйшлі на двор. Пад яркім сонцам, дзе навокал усё ззяла і зелянела, гнеў Яраша растаў. Ён глянуў на сваю спакусніцу і ўбачыў, што яна, зажмурыўшыся ад сонца, усміхаецца па-ранейшаму ласкава, закахана.
«Чортава баба! З яе што з гуся вада. Чым жа цябе дапячы?»
І раптам успомніў... Сказаў спакойна, з усмешкай, быццам між іншым, мірна ідучы побач з ёй па асфальтавай дарожцы:
- У рэдакцыю прыйшло пісьмо... Мне Шыковіч расказаў. Распісваюць добрыя людзі, як ты выкарыстоўваеш санітарную машыну. На Ўкраіну - па вішні, з раніцы - на рынак, увечары - у лес. А лекары неадкладнай ходзяць пехатой. Я кажу яму: калі пра Гаецкую, то можна пісаць без праверкі. Усё правільна, ручаюся галавой. Цяпер я падкіну яму факт з халадзільнікам... Сенсацыйны фельетон будзе!
Яна спынілася. Ён па інерцыі зрабіў крокі два і павярнуўся. Яна застыла ў дзіўна нязграбнай позе, нахіліўшыся набок, бо трапіла адной нагой у канаўку для сцёку вады. Твар яе, што хвіліну назад палаў, пабялеў, ноздры непрыгожа раздуліся.
Яраш адчуў, што ў ім загучала вясёлая лёгкая музыка. Нарэшце ён знайшоў, чым дапячы ёй. Яна адказала пагрозліва, холадна - ніколі яшчэ не гаварыла з ім такім тонам:
- З'явіцца фельетон, я табе да смерці не дарую. - І, не развітаўшыся, павярнулася і пайшла назад.
Ярашу раптам захацелася гарэзліва, па-хлапечы свіснуць ёй услед.
Майзіс, маленькі, кучаравы, у вялікіх чорных акулярах, сустрэўшы яго на ганку аддзялення, сказаў:
- У вас сёння, калега, добры настрой.
- А хіба вы бачылі калі-небудзь мяне ў дрэнным настроі?
- Не. Але часам чалавек бывае залішне задумлівы. Ён уважлівы ў працы, але не бачыць харaства вакол сябе.
Яраш засмяяўся:
- Майзіс, ведаеце што? Прыязджайце да мяне на дачу. Я пакажу вам такое хараство, якога вы, гараджанін, зроду не бачылі.
Але, пракансультаваўшы колькі хворых, Яраш зноў адчуў сябе стомленым. З ім рэдка гэта здаралася.
- Відаць, зноў будзе навальніца. Хочацца спаць, - сказаў ён Майзісу, пазяхнуўшы, калі яны пераходзілі з палаты ў палату. - Апошні?
- У мяне апошні. Ды вельмі прасіла хворая з тэрапіі, каб вы паглядзелі яе. Асабіста вас просіць, Антон Кузьміч. Па-мойму, цікавы выпадак. Мітральны стэноз. Згодна апераравацца.
Яраш паглядзеў на гадзіннік, уздыхнуў:
- Ах, Майзіс, Майзіс, карыстаецеся вы маёй слабасцю.
- Што зробіш, Антон Кузьміч. Такая наша прафесія.
- Але, брат, прафесія наша цяжкая. Нічога не скажаш.

Прыгадаўшы аддзяленне, куды яму належала ісці, і галоўнага лекара, Яраш зноў адчуў злосць. Беспарадак, бруд не толькі ў бальніцах, але і ў другіх месцах, яго, звычайна спакойнага, прыводзілі ў лютасць. Можа, праз гэта пра яго хадзілі легенды. Расказвалі, напрыклад, што ён пабіў лекара сельскай бальніцы, якую правяраў, аддаў пад суд хірурга, які апырываў п'яны, што ён у часе сваіх аперацый мацюкаецца на асістэнтаў і сясцёр. Усё гэта, безумоўна, выдумкі. Лекара ён завёз у райком, хірургу толькі пагразіў судом, а мацюкнуўся адзіны раз на асістэнта, які зрабіў памылку. Гэтыя выдумкі таксама злавалі Яраша; ён бадай пакутаваў, калі бачыў, што маладыя лекары баяцца яго і праяўляюць залішнюю пачцівасць, быццам ён сапраўды сівагаловы прафесар, сусветнае свяціла.
Па дарозе ў тэрапеўтычнае аддзяленне ён сказаў Майзісу:
- У Гаецкай у кабінеце халадзільнік. А шторы? Бачыце якія? Побач з такім аддзяленнем!
Майзіс падняў галаву, і з яго акуляраў выскачылі асляпляльныя зайчыкі. Усмешка варухнула тоўстыя вусны.
- У нас яе завуць «царыца Тамара».
- Бо вы бяззубыя тут, як малюскі. Прапясочылі б гэтую «царыцу» на партыйным сходзе.
- Для гэтага патрэбна прынцыповасць доктара Яраша.
- Не падхалімнічайце, Майзіс.
Маладзенькая лекарка, якая вяла хворую, сустрэла іх у калідоры і адразу разгубілася - пачырванела, пачала заікацца, называла Яраша «прафесарам». Ён не ўзлаваўся на гэтае дзяўчо. Але, баючыся, што ўсё разам - яе пачцівасць, выгляд аддзялення, успамін пра Тамару - можа даць недзе гнеўную ўспышку, Яраш нахмурыўся, апусціў галаву, выключыў увагу (ён умеў гэта рабіць), каб менш бачыць і чуць.
Яны ўвайшлі ў палату, дзе стаяла штук сем ложкаў, паміж імі было цесна праходзіць. Як ні хацеў Яраш, усё адно ўбачыў усё адразу: ложкі, сцены, пацямнелыя ад старасці залатаныя навалачкі, прасціны, ручнікі, абшарпаныя тумбачкі і хворых - хто як глядзіць на яго: з цікавасцю, абыякава ці хоча папрасіць: «Доктар, паглядзіце і мяне».
- Вось наша хворая, - сказала лекарка, спыніўшыся каля ложка ў кутку, і, спахапіўшыся, падала Ярашу табурэт.
Хворая як хворая. Такіх ён бачыў сотні. Маленькая жанчына, такая худая, што здавалася, пад коўдрай - пустата. А на падушцы спакутаваны твар з яркімі прыкметамі яе хваробы: крыху збляклая ўжо сінюшнасць губ, крылляў носа. А шчокі заружавелі. Хвалюецца. І вочы... Якія вочы! І як яны глядзяць! Чаго толькі не бачыў за сваё жыццё і лекарскую практыку Яраш, але такія вось вочы яго заўсёды выводзілі з раўнавагі. Яны прасілі, малілі, выказвалі надзею, страх - усю бясконцую гаму пачуццяў чалавека, які прагне жыць.
Сядаючы на табурэт, ён падумаў, што ў большасці такіх цяжкахворых жанчын прыгожыя валасы. Ад кантрастнасці, відаць. У гэтай вунь таксама якія цудоўныя - светла-залацістая пышная карона. Каб не сустракацца позіркам з хворай, Яраш разглядаў свае вялікія, адбеленыя спіртамі і эфірамі пальцы і слухаў даклад лекара. У яго ўжо выпрацавалася прафесійная звычка: чуць і фіксаваць у памяці толькі тое, што патрэбна яму як кансультанту. Усё іншае, у тым ліку прозвішча і імя, ён высвятляў пасля, калі сам пачынаў аглядаць хворага. Але паведамленне лекара аб тым, што хворая перанесла першую атаку рэўматызму ў нямецкім лагеры, узварухнула яго. Ён глянуў на гэтую маленькую жанчыну з цікавасцю і жалем, сустрэў яе вочы, поўныя дзівоснага агню і малення, падумаў:
«Вось яна, вайна. Збудаваны гарады. А сэрцы людзей... Сэрцы ранены». Ён падумаў пра сэрцы не наогул. Не. Як лекар, уявіў канкрэтнае маленькае сэрца, у якім развіўся парок. Лекар расказвала, у якім стане хворая паступіла ў бальніцу:
- Ацёчнасць ніжніх канечнасцей... Рэзка павялічана пячонка...
- Калі паступіла? - спытаў Яраш.
- Два тыдні назад. - Лекар збянтэжылася, забылася, на чым яе перапынілі.
- Гаварыце, гаварыце. - І зноў збоку здавалася, што кансультанта цікавяць толькі ўласныя рукі.
- Быў праведзены курс лячэння...
І раптам у аднатонны даклад, перасыпаны лацінскімі словамі, уварваўся шэпт:
- Кузьма...
Яраш нават спачатку не звярнуў увагі.
- Антон Кузьміч, - гучна паправіў Майзіс, які стаяў за спіной у Яраша.

Тады Яраш рэзка падняў галаву, паглядзеў на хворую. Яна ўсміхнулася вінавата і зноў нясмела прашаптала ўжо другое імя:
- Віктар...
Яраш адчуў, што праз рукі яго быццам прапусцілі электрычны ток, закалола ў кончыкі пальцаў: ён пачуў свае падпольныя клічкі.
У яго былі надзвычай чуткія пальцы, паталагічна чуткія, нават уласныя эмоцыі ён перш за ўсё адчуваў пальцамі. Вось так заколе - значыцца, злосць, радасць, здзіўленне.
Ён пазнаў гэтую жанчыну. Але не верыў вачам.
Хіба ўваскрасаюць мёртвыя? Колькі прайшло год! Дзе яна была дагэтуль?
Ён павольна падняўся з табурэта.
Лекар са страхам глядзела на сваю пацыентку: што тая трызніць?
Майзіс лёгка свіснуў: ён быў рамантык, любіў прыгодніцкія кнігі, фільмы, нечаканыя сустрэчы людзей.
Хворая супакоіла свайго лекара простым і ясным запытаннем:
- Не пазнаяце, Антон Кузьміч?
Яраш умеў стрымліваць свае пачуцці ў любых абставінах. Але тут не стрымаўся.
- Зося? - прашаптаў ён так, што ўздрыгнула лекар, прыўзняліся на локцях хворыя, а Майзіс у захапленні пацёр рукі.
- Зося! - паўтарыў ён гучней і, высокі, мажны, схіліўся над ложкам, як бы хочучы загарадзіць яе ад чужых вачэй, ад хвароб, ад усіх навал. Узяў тонкія, схудалыя рукі ў свае мяккія шырокія далоні, асцярожна сціснуў. - Адкуль вы з'явіліся, Зося?
А ў дзверы ўжо заглядвалі сёстры, хворыя, і ўсё аддзяленне загудзела, як разварушаны вулей.
**5**
На супынцы таксі каля вакзала адзін з шафёраў ветліва запрасіў Яраша:
- Калі ласка, доктар, у маю машыну.
- У Дзятлаўскае лясніцтва. Ведаеце?
- Ведаю. Наш брат усё мусіць ведаць.
«Волга» рванула з месца, Яраш па інерцыі адкінуўся на спінку і гэтак застыў. Мільгалі вулічныя ліхтары, вітрыны, сігналы сустрэчных машын. Ён заплюшчыў вочы, але не адчуў асалоды адпачынку. Дзень скончаны. Незвычайны дзень. Яраш жыў уражаннямі ад сустрэчы з чалавекам, якога васемнаццаць год лічыў мёртвым. «Вось сюжэт для Кірылы». Ён хацеў надаць думкам іншы кірунак, абстрагавацца і супакоіцца. Але дарэмна. Супакоіцца не так проста.
Зося папрасіла, каб ён аперыраваў яе. І не сказала, як многія іншыя: «Лепш памерці, чым так пакутаваць». Не. Яна верыць, што ён здолее ўратаваць яе.
Калі тая аперацыя! Праз месяц... І ці можна яе ўвогуле аперыраваць? Гэта яшчэ пакажуць даследаванні. А ён ужо хвалюецца. Хвалюецца, бадай, мацней, чым перад сваёй першай самастойнай аперацыяй. Уяўляе яе сэрца, бачыць, як на макеце, звужэнне левай перадсардэчна-страўнікавай шчыліны... Недастатковасць клапана... Мозг пачынае напружана працаваць. Ідзе аперацыя. Ён уважліва і прыдзірліва прасочвае ўвесь ход яе, ад падрыхтоўкі хворай да...
Раскрывае грудзі... Бярэ сэрца... Вось яно...
Машына рэзка спынілася. Яраш расплюшчыў вочы. Стаялі перад закрытым шлагбаўмам каля чыгуначнага пераезду на ўскраіне горада.
«Усяго праехалі?» - здзівіўся ён.
Прайшло некалькі хвілін, а ён траха не скончыў такую аперацыю, на якую патрэбны гадзіны.
- Задрамалі, Антон Кузьміч? - спытаў шафёр.
Дзесьці збоку пыхкаў паравоз. Затрубіў у ражок стрэлачнік.
Яраш зазірнуў шафёру ў твар, асветлены слабым водбліскам прыбораў і чырвоным ліхтаром шлагбаўма. Не, гэтага чалавека ён не лячыў, памяць у яго на твары добрая. Шафёр, зразумеўшы, што доктар хоча пазнаць яго, растлумачыў:
- Вы ўратавалі майго сына, Антон Кузьміч. На ўсё жыццё вам удзячны. Маці штодня ўспамінае. Хацą б ты, кажа, павазіў доктара. Скажыце, і я кожны дзень буду вазіць вас.
- Хабар? - усміхнуўся Яраш.
- Які хабар, доктар? - пакрыўдзіўся шафёр. - Хабар даюць за цёмныя дзялы. А тут - жыццё сына...

Прайшоў нядоўгі таварны састаў. Старэнькі паравоз сыпануў у начное неба жменю іскраў. Але яны не сталі зоркамі - упалі назад на зямлю і патухлі.
Павольна падымаўся шлагбаўм. У нейкі міг замест чырвонага ліхтара загарэўся зялёны. Яраша заўсёды здзіўляла гэтая няхітрая механіка.
Машына кінула на пераезд сноп кароткага святла. Заблішчалі рэйкі. Вартаўнік пагразіў пальцам. За пераездам фары выхапілі з ночы больш доўгі кавалак чорнай шашы.
Яраш глянуў убок і ўбачыў зоркі. Іх было мала, і яны плылі над чорным лесам, які заўсёды ўначы чамусьці здаваўся горнай градой - з вяршынямі, доламі, цяснінамі. А ўдзень гэта была зусім роўная сцяна лесу за кіламетр ад дарогі. Там, наперадзе, лес падступіць да самай шашы, і тады знікне гэтая ілюзія. Антон Кузьміч ніяк не мог растлумачыць прычыны такога зрокавага падману.
Усё гэта - супынка, размова з шафёрам, зоркі, лес - адцягнула думкі ад Зосі. Праўда, ненадоўга. Хутка ён пачаў зноў думаць пра яе, але ўжо інакш. Прыгадаў, як зноў, другі раз за дзень, сутыкнуўся з Тамарай. Яна раптам запярэчыла супраць пераводу Зосі ў тую клініку, дзе пастаянна працаваў Яраш. Калі ён пайшоў, каб растлумачыць ёй, што мае сам аперыраваць хворую і таму зручней, каб яна была пад яго штодзённым наглядам, Тамара са здзекам спытала:
- Гэта тваё падпольнае каханне?
Антон не вытрываў і вылаяўся груба і злосна. Гаецкая спалохалася, адразу афарміла перавод.
Калі Яраш пазваніў у рэдакцыю Шыковічу, што мусіць затрымацца, той сказаў:
- Хрэн з табой. Сядзі каля сваіх хворых хоць тыдзень. А я млею ад духаты.
Ён доўга сядзеў каля сваёй хворай. Зося глядзела на яго і хораша ўсміхалася, шчаслівая і збянтэжана.
- Дзе вы былі ўвесь гэты час?
- Апошнія тры гады тут, у нашым горадзе.
- І не ведалі пра мяне?
- Ведала. Бачыла колькі разоў.
- Бачылі? І не маглі прыйсці?
- Я маленькі чалавек, Антон Кузьміч. Прыёмшчыца арцелі кравецкай на Выселках.
- Ды якое мае значэнне, кім вы працавалі! Глупства! Сорамна падпольшчыцы дзяліць людзей на маленькіх і вялікіх.
- Якая я падпольшчыца! Я дачка доктара Савіча. - Вочы Зосі напоўніліся слязамі.
- Ну, не трэба! Калі ласка! Ніякіх хваляванняў і ніякіх расказаў! Аб усім пагаворым пасля. - Ён падняўся, каб пайсці.
Яна папрасіла нясмела, сарамліва:
- Пасядзіце яшчэ трошкі, Антон Кузьміч. Хлопчык гэты, Тарас, жывы?
- Хлопчык! Хлопчык гэты ў арміі адслужыў. На заводзе робіць...
- Я шукала яго. - Яна як бы вінавата прасіла прабачэння за тое, што не здолела знайсці дзіця.
- Пасля, пасля. Не хвалюйце сябе ніякімі ўспамінамі.
Сёстры і санітаркі хадзілі на пальчыках і гаварылі шэптам. У іх былі спалоханыя твары. Яраша абурыла гэта, але ён змаўчаў. Прымусіў сябе маўчаць. Што б яны падумалі, каб ён, звычайна ветлівы і далікатны з малодшым персаналам, раптам накрычаў на іх?
Цяпер, у машыне, ён падумаў, што трэба заўтра ж пра ўсё расказаць Машы і папрасіць, каб яна ўзяла шэфства над Зосяй. Не медыцынскае. Чалавечае.
Таксі звярнула з шашы ў лес. У святле фар дрэвы здаюцца дэкаратыўна нежывымі і ў той жа час фантастычна прыгожымі. Праплываюць застылыя ствалы з нерухомым белым лісцем. Быццам на міг з'яўляюцца на свет з дагістарычнай цемры і зноў знікаюць назаўсёды. Цені бягуць наперадзе, пераганяючы святло, доўгія і вузкія - блізка і шырокія - удалі. А з бакоў - чарната. А ўгары - цемра: зноў не відаць зорак.
Яраш надзвычай любіў начную язду па лесе. Часта прасіў Шыковіча паездзіць. Той не разумеў яго захаплення. Яраш злаваўся: «Які ты, да д'ябла, пісьменнік, калі не адчуваеш такой прыгажосці? Ты паглядзі на гэтыя сосны! Які ў іх колер? А цені? З чым ты параўнаеш іх? Паспрабуй напісаць гэта рэалістычным пэндзлем. Памрэш - не напішаш. Тут, брат, трэба нейкі асобы, умоўны прыём».
«Хірург-абстракцыяніст! - хмыкаў Шыковіч. - Навіна! Дзіва дзіўнае!»
Шафёр таксі, напэўна, хацеў у знак удзячнасці давезці свайго пасажыра як мага хутчэй і імчаў па карэннях і ямах, не шкадуючы машыны.

Яраш папрасіў:
- Цішэй, калі ласка. Можна?
- Можна! - Шафёр адразу збавіў хуткасць. - Я думаў, вы спяшаецеся.
- Не. Я люблю паглядзець на лес.
- О, лясок тут добры! Каб такіх сосен на дом.
- Што было ў вашага сына?
- Пералом пазваночніка. На будаўніцтве, ведаеце. Няшчасны выпадак.
- А-а, помню.
Шафёра ўзрадавала, што доктар помніў яго сына. Як бы пакрыўджаны за хабар, ён праз усю дарогу маўчаў. Гзта яму, відаць, нялёгка давалася, бо калі прарваўся, то пачаў паспешліва і мнагаслоўна расказваць пра сына, пра сябе, пра ўсю сваю сям'ю.
Яраш слухаў і не чуў. Глядзеў на лес і думаў. Як у святле фар выплывалі з цемры дрэвы, так і з ночы памяці выплывалі эпізоды жыцця, далёкія і блізкія, з падполля і з сённяшняга дня.
Да дачы ён не даехаў. Спыніўся каля канторы лясніцтва, сілком усунуў таксісту грошы і пайшоў пехатой.
Свяцілася толькі адно акно - на паддашку ў Шыковіча.
«Трэба адвучыць яго ад начной працы, - падумаў Антон Кузьміч пра сябра і тут жа пра жонку з пяшчотай: - Спіць Галка. Тут добра спіцца».
Шкада было будзіць яе. Калі пад нагамі піснулі ўсходцы ганка, ён пагразіў ім пальцам: «Цыц!» Потым доўга стаяў нерухома, слухаючы начную цішыню.
Не паднімалася рука, каб ціхенька, адным пальцам, пастукаць у шыбіну веранды. Ён быў упэўнены, што дзверы зачынены. Але паспрабаваў асцярожна націснуць на ручку - і дзверы лёгка адчыніліся. Белая, як прывід, постаць стаяла ў адным кроку ад парога. Навучаны шматгадовым вопытам, Яраш усё зразумеў і ўміг мабілізаваў свой спакой і вытрымку.
- Што, баішся заходзіць? Сорамна? - не сказала, а прашыпела Галіна і тут жа сарвалася: - Не заходзь у дом, дзе спяць дзеці! Бессаромныя твае вочы!
- Галка! - Ён зрабіў крок, ён прасіў, маліў яе ласкавым іменем, каб яна не рабіла шуму: побач людзі, дзеці.
- Не падыходзь! Не датыкайся да мяне! Брудны тып!
- Галя! Выслухай! - не папрасіў, патрабаваў Антон.
- Што мне слухаць? Мне ўсё сказаў чалавек. «Ён заняты на кансультацыі...» Да дванаццаці ночы! Не першы раз ты «кансультуеш» яе... да позняй ночы! Крывасмок! Колькі ты выпіў маёй крыві! Не падыходзь!
Але сама кінулася да яго і пачала ярасна калаціць маленькімі кулачкамі ў магутныя грудзі.
- Паразіт! Я ненавіджу цябе! Не дакранайся да мяне! Усё! Усё, усё!.. Заўтра, заўтра!.. Зараз жа, зараз!.. Забіраю дзяцей... І ўсё. Жыві са сваёй шлюхай! Але я не дам вам жыцця. Не дам! Не чакай. Не!
- Галя! - Ён адступіў на крок і паспрабаваў засланіцца ад яе ўдараў партфелем, які ўсё яшчэ трымаў у руцэ. Але яна выхапіла партфель і моцна стукнула ім па галаве, па твары. Гэта яго ўзарвала. Так жонка не паводзіла сябе ўжо колькі год. Узмахам рукі Антон выбіў у яе партфель, а самую схапіў у абдымкі, лёгка падняў, заціснуўшы рукі, каб не драпалася. А каб не крычала, моцна, да болю, прыпаў вуснамі да яе вуснаў. Яна білася, трапяталася, як рыба, дрыгала ў паветры нагамі, намагаючыся вырвацца. Але дарэмна. Ён насіў яе па прасторнай верандзе, быццам закалыхваў, як малую, і праз сціснутыя вусны шаптаў:
- Дурная. Дурная. Дурная...
І яна сціхла. Быццам самлела. Нерухомая, зрабілася цяжкай. Ён адняў вусны - яна не закрычала, нават не папрасіла: «Пусці». Ён ведаў з мінулага, што найпрасцейшы і хутчэйшы сродак пamірыцца - гэта паказаць ёй, што нідзе ён не растраціў сваю сілу. Магчыма, Галіна чакала гэтага. Яму стала агідна, балюча і крыўдна. Прыгадалася, з якой прычыны ён затрымаўся, з якімі пачуццямі ехаў дадому. І раптам - такая сустрэча. Антон груба, як мяшок, кінуў жонку на шырокую тахту (яны спалі тут жа, на верандзе). Душыў гальштук. Ён сарваў гальштук і шыбануў цераз стол, у кут. Туды ж паляцеў пінжак і капялюш. У змроку яснай ночы Галіна бачыла гэтыя рэзкія рухі і, адчуўшы навальніцу, маўчала. Яна тонка ўмела адчуваць настрой мужа. Агонь рэўнасці, які яна распаліла, уяўляючы, як мужа, яе мужа, абдымае, цалуе гэтая распуслівая Тамара, - гэты агонь патухаў. Яна амаль гатова была папрасіць прабачэння. Але Антонавы

мяккасць і адыходлівасць прывучылі яе да таго, што яна ніколі не рабіла першага кроку да прымірэння. Акрамя таго, вельмі свежымі яшчэ былі пакуты, якія яна перажыла за тры гадзіны - з таго часу, калі Кірыла прыехаў адзін і сказаў, што Антон затрымаўся на нейкай неадкладнай кансультацыі ў трэцяй клініцы. Колькі яна патраціла сілы, каб ні словам, ні рухам не выдаць сябе перад Шыковічамі. Як на злосць, Валянціна Андрэеўна не адступала ад яе ўвесь вечар, расказвала розныя вясёлыя здарэнні. Можа, знарок. Думка, што нехта чужы, збоку, бачыў і здагадваўся, што рабілася ў яе сэрцы, была самай цяжкай. Ужо за адно гэта сваё ўніжэнне яна мае права не даравацъ Антону ці, ва ўсякім разе, не ісці першай на прымірэнне. Ён гучна пракаўтнуў горкі і салёны камяк і амаль застагнаў:
- Божа мой!
Галіне стала шкада яго: такі дужы, вялікі, мужны, ён застагнаў. Хваля пяшчоты заліла яе добрае сэрца. Каб ён наблізіўся да тахты, яна прыцягнула б яго да сябе, прыласкала. Але ён хадзіў па верандзе, спатыкнуўся на партфель, злосна піхнуў яго нагой. Пад яго цяжкімі крокамі новыя маснічыны не скрыпелі, а гудзелі. У рамах брынчалі шыбы. Можна было б сказаць яму: «Не хадзі. Пабудзіш дзяцей» - і гэта, напэўна, стала б крокам да прымірэння. Але, акрамя ўсяго іншага, яе распірала дурная жаночая цікаўнасць: што скажа ён у апраўданне? Ён нічога не сказаў яшчэ.
Ён паўтарыў:
- Божа мой! - і, памаўчаўшы, пачаў кідаць словы, як каменні: - Якое дзікунства! Уявіць цяжка... Пражыць з чалавекам шаснаццаць год, выгадаваць дзяцей... І не верыць яму ні на крупінку, ні на залатнік. Бясконца лічыць падлюгам, здольным на любую агіднасць. Бясконца падазраваць... Раўнаваць чорт ведае да каго... Зразумей, ты не дурная жанчына. Урэшце, у такой атмасферы нельга жыць. Нельга дыхаць. Чорт вазьмі!
Словы гэтыя абражалі Галіну Адамаўну. Абражалі сваёй праўдай. Але, так жыць нельга! Ды і не жывуць яны так, яны жывуць хораша і шчыра. А ад гэтых прыступаў рэўнасці яна сама пакутуе ў сто разоў горш. Ён павінен быў зразумець гэта і рабіць так, каб не было ніякіх прычын. Ён павінен шкадаваць яе. А ён вось як лічыць - што яна атручвае яму жыццё, што яна пачвара нейкая.
Галіна заплакала горка, надрыўна.
- Вядома, я дурная... Дзікунка. Не даю табе жыць. Ты вялікі вучоны. А я? Кухарка твая, служанка... Нянька тваіх дзяцей. За імі, за тваёй шырокай спіной ды за гнілымі зубамі пацыентаў я нічога не бачу. Я свету не бачу...
Чым больш яна гаварыла, тым больш пераконвала сябе, што яна вялікая пакутніца, і, заходзячыся ад жалю, курчылася ад рыданняў.
«Ды няпраўда гэта! Хлусіш ты! - хацелася крыкнуць Ярашу. - Хіба ты жывеш горш за іншых? Хіба я не стараюся зрабіць тваё жыццё прыгожым і поўным? Ты сама выдумляеш сабе пакуты». Але ён умеў стрымлівацца. Ён добра ведаў жонку, яе хваробу, у якой, магчыма, больш за ўсё вінавата тая, да каго яна раўнуе. Ён пераключыў сваю злосць на Тамару. Падумаў: як правучыць гэту разбэшчаную бабу? Спыніўся каля тахты. Плечы Галіны сутаргава ўздрыгвалі. І ў яго дрогнула сэрца - стала шкада жонкі. Сапраўды, шмат у чым яна няшчасная. Але хіба ёсць у гэтым яго віна? Можа, не так горача ўжо кахаў ён яе, але кахаў, разважліва, спакойна, разумна, шанаваў, асцерагаў ад жыццёвых нягод, дамагаўся, каб была дружба і вера. Чаму ж яна не верыць яму, найбліжэйшаму чалавеку? Хіба не крыўдна гэта?
Ён прысеў на тахту, асцярожна дакрануўся да яе пляча, гарачага і праз шоўк сарочкі.
- Галя!
Яна ўсхліпнула гучней.
- Добра. Я бяру свае словы назад. Даруй. Але будзь жа і ты аб'ектыўнай. Мы ж культурныя людзі. І нам не па дваццаць год, каб сустракаць адно аднаго кулакамі... Ды і ў дваццаць... Ты прыніжаеш у першую чаргу самую сябе, сваю чалавечую годнасць. Няўжо нельга было спытаць спакойна: дзе ты затрымаўся? І я адказаў бы табе. Я адказаў бы, - ён падняўся і ўсхвалявана прайшоў па верандзе, - што ў мяне незвычайны дзень... Я сустрэў чалавека, які ратаваў мяне ад смерці і якога я лічыў мёртвым. Помніш, я расказваў табе? Дачка доктара Савіча. Ты не ўяўляеш...
Муж расказваў у першыя гады сумеснага жыцця мноства розных гісторый са сваёй дзейнасці падпольшчыка. Галіна нават употай сумнявалася ў верагоднасці некаторых з іх. І большасць гэтых гісторый яна ўжо забылася, бо ў апошнія гады Антон рэдка ўспамінаў сваё падполле. Тым

больш яна забыла прозвішчы людзей, пра якіх ён расказваў, якія былі яго таварышамі па барацьбе ці ворагамі. Але незнаёмую ёй Зосю Савіч яна помніла. Помніла, як тая ратавала Антона. І вось гэтая жанчына, пра якую ён успамінаў асабліва цёпла, з'явілася. Адкуль? Сустрэліся яны выпадкова ці яна шукала Яраша? Галіна Адамаўна забылася на сваю крыўду, на рэўнасць да Тамары. Іншае насцярожыла яе. Павярнулася на бок, тварам да мужа. Ён зразумеў гэта так, што жонка зацікавілася, яшчэ больш палагаднеў і пачаў расказваць падрабязна:
- Майзіс папрасіў мяне пракансультаваць хворую. Мітральны стэноз. Сама хворая прасіла. Я прыйшоў у палату... І раптам хворая шэпча: «Віктар». Маю падпольную клічку. Уяўляеш? Не, ты падумай толькі. Васемнаццаць год я лічыў чалавека мёртвым. І вось... Яна не ўсё расказала мне... Але я здагадваюся, што яна перажыла. Чатыры гады, як яна ў нашым горадзе... і пазбягала сустракацца. Дачка доктара Савіча. Гэтым сказана шмат што. Але чаму дачка павінна адказваць за бацьку, калі нават той і сапраўды быў ворагам? Я перавёў яе ў нашу клініку. Гэта заняло час. Яна чула пра мае аперацыі і просіць аперыраваць яе. Буду аперыраваць! Здаецца, супрацьпаказанняў няма. Трэццяя стадыя па Бакулеву.
Галіна з палёгкай уздыхнула.
У яе была дзіўная рыса, выпрацаваная ўласнымі адчуваннямі лекара. Ніколі яна не раўнавала мужа да яго пацыентак. Многія з тых, каго ён лячыў, аперыраваў, запрашалі яго пасля ў госці, і яна смела адпускала яго аднаго. Пацыенткі ў яе вачах пераставалі быць жанчынамі небяспечнымі. А таму мужава паведамленне аб тым, што Савіч цяжкахворая і ён будзе яе аперыраваць, адразу супакоіла Галіну Адамаўну. Яна нават страціла цікавасць да падзеі, якая яўна ўсхвалявала Антона. Цяпер яна адчула сваю віну перад ім, і ёй хацелася хутчэй загладзіць яе. Яна ціха паклікала, перапыніўшы яго расказ:
- Хадзі сюды, Антон.
Ён змоўк, пастаяў звіліну каля стала, як бы раздумваючы - ісці ці не ісці. Наблізіўся нерашуча.
Яна пацягнула яго за руку, пасадзіла на тахту, прыпала да рукі вуснамі.
- Даруй мне, Антоша. Я дурная. Слабая і дурная жанчына.
Яго заўсёды кранала, калі Галіна вось так прасіла прабачэння, ён губляўся, як юнак перад чужой жанчынай, і не ведаў, што адказваць.
- Нічога, нічога. Добра. Я не злуюся. Чаго не бывае ў жыцці. Я ведаю тваю недарэчную рэўнасць.
- Ты слаўны, разумны. Я люблю цябе.
- І я люблю цябе. - Ён пацалаваў яе мокрую, салёную шчаку, вочы, вусны.
Яна абвіла яго шыю гарачымі рукамі і ап'яніла знаёмай цеплынёй, пахам рэчкі, водарам лугу.
- Чакай, я раздзенуся.
Антон уміг скінуў свой лёгкі касцюм і, кладучыся, пацалаваў жончыны калені. У Галіны прыгожыя ногі, і ён любіў іх цалаваць...
Пасля такой нервовай успышкі, прымірэння і блізасці Галіна засынала адразу і спала моцна.
Яраш у тую ноч не мог заснуць. Перад вачамі стаяла Зося. Якія толькі думкі, уяўленні не лезлі ў галаву.
Урэшце ён не вытрымаў: ціха падняўся і, захапіўшы касцюм, выйшаў на двор.
Ноч стаяла ціхая, бязросная і духмяная. Адспявалі ўжо салаўі. Не прачнуліся яшчэ раннія птушкі. Было гадзіны дзве. Лес навокал здаваўся высачэзнай крапасной сцяной, якая абкружала гэты маленькі свет з адзіным домам, у верхнім акне якога гарэла святло. З гэтай крэпасці вялі ў прастор толькі адны вароты на луг: прасвет паміж дубамі і вольхамі, што раслі ўздоўж ручая. Але сёння і гэтыя вароты былі зачынены: над лугам неба цёмнае, яно злілося з зямлёй, кустамі і дрэвамі. Адзінокія цьмяныя зоркі віселі над лесам, як далёкія сігнальныя ліхтары вялікага свету.
За старыцай «драў дранку» дзяркач. Жалобна крыкнула нейкая птушка, можа, трапіла ў зубы драпежніку. Недзе далёка закугакала сава. Ярашу яе крык здаўся плачам дзіцяці, якое заблудзілася ў начным лесе. Ён таксама адчуў адзіноту і смутак. Захацелася да святла, да людзей - у вялікі свет. Прымірэнне з жонкай раней заўсёды прыносіла радасць і заспакаенне. Ад сённяшняга прымірэння застаўся на душы непрыемны асадак. Яна робіць трагедыю з таго, што ён затрымаўся на нейкія дзве-тры гадзіны. Смешна!.. Калі жыве яшчэ ў памяці вялікая трагедыя вайны... Калі трагічны лёс асобных людзей, што пачаўся тады, прадаўжаецца сёння... Праз два-тры тыдні ён ускрые грудную клетку, дабярэцца да сэрца жанчыны, спакутаванай і мужнай. Па-сапраўднаму мужнай. Хто ведае, чым скончыцца гэтая аперацыя...
Яраш адышоў на колькі крокаў ад дома і ўбачыў у акне схіленую галаву Шыковіча. Кірыла пісаў.

Яраш падняў гнілушку, што свяцілася пад нагамі, і кінуў у акно.
Шыковіч высунуўся і пагразіў кулаком, прашыпеў:
- Вар'ят. Спалохаў.
- Хадзем пагуляем.
- Доктар! Ты гуляеш у дзве гадзіны? Прагрэс! Іду. Да д'ябла фельетон! - уміг спусціўшыся з «куратніка», як ён называў мансарду, на зямлю, Кірыла гаварыў пра сваю працу: - Які я фельетаніст! Я лірык. Мне заўсёды не па сабе, калі я раблю чалавеку непрыемнасць, калі нават я і ўпэўнены, што чалавек гэты дрэнь. Адзін стары дурань кінуў старую жонку і сышоўся з маладой. Я гаварыў са старой. Крыклівая, грубая баба. Але і маладая - дрэнь... Чакай. А ты не будзеш чытаць мне мараль, што карысна рана лажыцца і рана ўставаць? Не есці мяса і не піць гарэлкі?
- Не бойся. Ты прасіў мяне падрабязна расказаць табе пра падполле. Маю жаданне расказаць сёе-тое.
- Во-о! Гэта размова! Але што гэта цябе прарвала? То двух слоў не выцягнеш, то раптам сярод ночы...
- Толькі не перапыняй сваімі дурацкімі рэплікамі.
- Усё. Маўчу як рыба.

**РАСКАЗ АНТОНА ЯРАША**

Павел пазваніў па тэлефоне. Гэта было ў суботу, у канцы жніўня. Ці, можа, у пачатку верасня. Добра помню адно: мы толькі што прачыталі ў газеце, што нямецкія войскі ўварваліся ў Сталінград. Праўда, нават хлуслівы нацыяналістычны лісток не паведамляў наперад, як рабіў часта, што горад заняты «непераможнай арміяй фюрэра». Пісалі, што ідуць жорсткія баі. Але колькі гарадоў было занята перад гэтым! Помню, добра помню, што боль... той невыказны і неапісаны боль, які адчувалі мы, калі здаваўся наш горад, быў самы моцны. Як ні за адзін горад. Ці таму, што гэта горад з такой гісторыяй. Ці таму, што вораг на Волзе!.. Волга! Маленькія стратэгі, мы ўсе ўскладвалі тады вялікія надзеі на шырокія водныя рубяжы. Боль гэты выліўся ў злосць. Не ведаю, што адчувалі другія. У пажарную падбіраліся людзі надзейныя ў адносінах да «новага парадку», амаль гэтак жа, як у паліцыю: усялякі зброд, крымінальнікі. Але помню, што «калегі мае» таксама ў той дзень былі чамусьці злосныя. Мы сварыліся. Мацюкаліся так, што чырванелі сцены. Ні раней, ні пазней за ўсё сваё жыццё я нідзе не чуў, каб людзі так мацюкаліся. Я не адставаў ад іншых. І мне нават цяпер агідна ўспамінаць тую сваю фальклорную красамоўнасць. З-за частых пажараў паламаўся графік дзяжурства, і мы добрых гадзіны дзве высвятлялі, чыя ж чарга: хто недапрацаваў, а хто перапрацаваў у мінулы тыдзень. Чамусьці ў тую ноч ніхто не хацеў дзяжурыць. Начальнік наш - брандмайстар Хіндэль, «свой немец» (ён і да вайны працаваў у нашай пажарнай) - затыкаў далонямі вушы і прасіў стомлена, жаласліва:
«Маен гот! Маен го-от! Няма на вас Бога. Пасаромеліся б маіх сівых валасоў». І раптам зрываўся і сам пачынаў крычаць і мацюкацца: «Сціхніце вы, дзіравыя шлангі! Мяшкі з пяском! Абгарэлыя панчохі! Каб на вас...»
Ён быў мяккі, слабахарактарны чалавек, і яго ніхто не баяўся. Баяліся «сапраўднага немца» Лотке, які займаў пасаду механіка, але ўсюды сунуў свой нос, як і належала агенту гестапа. Каб ён з'явіўся, сварка адразу сціхла б і дзяжурыў бы той, каму Хіндэль сказаў. Ён сказаў Гвоздзіку, быў у нас такі п'янчужка. Той ківаў на мяне, да яго далучыліся яшчэ двое-трое. Я паслаў іх... Другая частка маіх калег падтрымлівала мяне. Хлопцы паважалі мяне за сілу. На пажарах я часам працаваў за трох. Дзе сапраўды трэба было тушыць агонь. Помню - такія дробязі запамінаюцца - тэлефон не званіў, а слаба брынчаў, як бляшанка. Але Хіндэль уздрыгнуў. Ён баяўся гарадскога тэлефона. Смела, адразу ён браў слухаўку толькі аднаго апарата, які званіў гучна і рэзка, - дзяжурны з вышкі паведамляў аб пажары. Хіндэль працягнуў руку і застыў, чакаючы, што званок сціхне і яшчэ адна непрыемнасць міне яго. Але тэлефон не сціхаў. І брандмайстар мусіў падняць слухаўку.
«Каго? Кузьму Кляшча? - Хіндэль паглядзеў на мяне, аднак слухаўку не перадаў, ён заўсёды насцярожваўся, калі звانілі каму-небудзь з яго падначаленых, праяўляў празмерную пільнасць. - А хто пытае? Павел Харытонавіч? А навошта вам Клешч? Хто ён вам? Друг, зямляк, сваяк? Адкуль вы звоніце? З управы?»
Я падышоў і бесцырымонна забраў з яго рук слухаўку. Тэлефон працаваў пагана, голас як з таго свету, але я пазнаў Паўла. Ён запрашаў на вечар да сябе. На імяніны. Будзе што выпіць. З вёскі прывезлі самагонку. Я перапытаў:

«Колькі? Тры пляшкі? Усяго? На чацвярых? Ну, мне гэта - што сабаку муха».
Пажарнікі заржалі. І тут я ўбачыў Лотке. Нізкі, крываногі, як стары кавалерыст, у чорнай зашмальцаванай скуранoй тужурцы, у акулярах з нейкімі зеленаватымі шкламі, ён стаяў на парозе і слухаў. Уважліва слухаў. Я яшчэ раз пераканаўся, што ён ведае расейскую мову. Але за тры месяцы, як я ў пажарнай, ён ні разу не выдаў сябе. Слухаць слухае, быццам хоча ўнікнуць у музыку чужых слоў. А потым усё перапытвае па-нямецку. Ён выдатна іграў сваю ролю. Гэтак жа, як і я. За год акупацыі я папоўніў сваё веданне нямецкай мовы так, як не папоўніў бы, каб скончыў яшчэ тры інстытуты. Але ў гэтай кампаніі я гаварыў дзесятак хадавых перакручаных слоў, не больш.
Гвоздзік, відаць, спадзеючыся, што яго падтрымае Лотке, пачаў ныць:
«Ён самагонку будзе піць, а я за яго дзяжур. Не буду!»
Лотке спытаў у Хіндэля: пра што спрачаюцца? Той растлумачыў не вельмі далікатна, але з нямецкай дакладнасцю. Я ніяк не мог уцяміць тады іх узаемаадносін. Ды і дагэтуль не разумею, няўжо Хіндэль не здагадваўся, хто такі Лотке, і не ведаў, што механік гаворыць па-расейску не горш за яго, «фольксдойчэ»?
«Чыя чарга дзяжурыць?» - спытаў Лотке.
Хвіліну назад Хіндэль схіляўся, што дзяжурыць павінен Гвоздзік. А тут раптам цвёрда сказаў:
«Дзяжурыць будзе Клешч! - і сурова загадаў мне па-расейску: - Дзяжурыць пойдзеш ты!»
Я замаліў:
«Пан начальнік, - у прысутнасці Лотке ўсе мы цвёрда трымаліся субардынацыі, дысцыпліны, - вы ж самі чулі, што мяне толькі што запрасілі на імяніны і я даў згоду. Што падумае чалавек? Лепшы сябра. Прашу вас».
«Адпусціце яго», - кінуў Лотке, не гледзячы ні на мяне, ні на Хіндэля.
Начальнік закіпеў.
«Гэта не пажарная каманда, - выдавіў ён па-нямецку, потым крыкнуў па-расейску: - А банда п'яніц! Ці тое было...» - Пэўна, ён хацеў сказаць: «Ці тое было пры Саветах!», але ўспомніў і асекся.
Лотке сказаў:
«Вы стары асёл, Хіндэль».
«Добра, добра. Няхай будзе Гвоздзік. Гвоздзік!»
Той ускочыў, як падменены:
«Слухаюся, пан начальнік!»
А Лотке зноў сказаў спакойна, без злосці, без націску:
«Вы стары баран, Хіндэль», - і пайшоў з дзяжуркі.
Гвоздзік мацюкнуўся. Хіндэль суміраваў па-нямецку:
«Я стары асёл і стары баран», - і вылаяўся па-расейску.
Я змаўчаў, бо мне гэтая кароткая размова і заступніцтва механіка не падабаліся больш, чым каму другому. Дзіўныя прафесіі меў я ў акупацыі! Першую выбраў сам - грузчыка: трэба было рабіць, каб жыць. Там я звязаўся з падпольшчыкамі. Пасля ўзрыву эшалона з авіябомбамі давялося хавацца. Схавалі мяне хлопцы дасціпна: уладкавалі ў нямецкі шпіталь вартаўніком у трупярню. «Начальнік морга», як здзекліва называлі мяне самі немцы. З мёртвымі фашыстамі я абыходзіўся далікатна і любоўна. Гэта забаўляла і страшыла жывых. Яны любаваліся маёй фізічнай сілай і цешыліся з маёй дурноты. Я добра-такі іграў прыдуркаватага здаравяка, які мог выпіць дзве шклянкі чыстага спірту і з'есці пяць шпітальных абедаў. Але нават у мяне, студэнта-медыка, будучага хірурга, не вытрымалі нервы. Звычайнаму чалавеку звыкнуцца з мёртвымі... Я папрасіў Паўла знайсці мне новую работу. І што, ты думаеш, ён прапанаваў мне неўзабаве? Асенізацыйны абоз. Не смейся. Я не прызнаюся дзецям, што працаваў залатаром. Вядома, я абразіўся. Але Павел даказаў мне, што начныя паездкі, начны пропуск, найлепшая магчымасць перавозак небяспечнага грузу - гэта зусім нядрэнна для маёй галоўнай прафесіі - падпольшчыка. Сапраўды, хутка я сам пераканаўся, што новая праца мая была шмат у чым зручная. Галоўнае, амаль не трэба было вытыркацца на людзі ўдзень у звычайным выглядзе. Мой рост, мая постаць - залішне прыкметныя, а горад наш у акупацыю быў не вельмі густанаселены. Зручнасць была, нарэшце, у тым, што побач са мной працавалі тупыя, абмежаваныя людзі, поўныя крэціны. Наўрад каму прыйшло б у галаву засылаць у такую ўстанову шпіка. А калі я рабіў вылазку ўдзень зусім у новай ролі (у рэдакцыю, напрыклад, калі атрымаў заданне выканаць прысуд над Хмарай, я

прыходзіў як паэт, прыносіў чужыя вершы - любоўную лірыку), то амаль быў упэўнены, што не сустрэнуся са сваімі калегамі па начной рабоце. Многа правалаў было выпадковых. Сустрэнецца добры чалавек, але плясне ўголас сапраўднае прозвішча, стары адрас ці яшчэ што - і гатова, правал.
Карацей кажучы, калі месяцы праз тры Павел прапанаваў мне работу чыстую - у пажарнай, я не вельмі каб узрадаваўся. Але гарком вырашыў (так перадаў Павел) «наблізіць мяне да паліцыі», і я пайшоў на гэтае «збліжэнне». Я - салдат. Новая работа не спадабалася з першых дзён. Не сама работа. А гэты Лотке, наш маўклівы механік. Я раскусіў яго адразу, адчуў хітрага ворага і ўпачатку занерваваўся. За цэлы год мне нідзе яшчэ не прыйшлося працаваць пад штодзённым наглядам агента гестапа. Я выказаў сваю трывогу Паўлу. Ён усміхнуўся і адказаў:
«Я думаў, у цябе больш вопыту. Усе мы так працуем. Думаеш, мне ва ўправе лягчэй? Дакажы яму сваю лаяльнасць».
І я па сваёй маладосці, не вельмі разумнай смеласці пачаў азартную гульню: давесці, каб Лотке самавыкрыўся. Я адзін з усяе каманды не баяўся Лотке. Лаяў у яго прысутнасці, называў «нямецкім казлом», казаў, што механік з яго, як з г... куля. Ён рабіў выгляд, што нічога не разумее. Але калі гэты ж паскудны Гвоздзік, дробны шпіёнчык, перадаў яму праз Хіндэля, як я лаюся, Лотке зрэагаваў. Неяк пастукаў пальцам па лбе і сказаў лагодна:
«Вялікая і дурная галава. Ты можаш лаяць мяне, але калі ты будзеш абражаць нямецкую нацыю, - вочы яго пры гэтым нядобра бліснулі, - ты пазнаеш яе сілу».
Хіндэль пераклаў і ад сябе злосна папярэдзіў:
«Калі ты не заткнеш свой дзіравы шланг, я заткну яго сам. Так заткну, што ты да смерці не пырснеш».
Тады я пайшоў на «прымірэнне»: запрасіў Лотке выпіць з намі (хлопцы раздабылі спірту). Але механік ветліва адмовіўся, памацаўшы свой худы жывот:
«Кранк».
«Ну і хрэн з табой. Нам больш застанецца», - сказаў я.
Ён запытаў у перакладчыцы, што я сказаў. Яна пераклала:
«Клешч сказаў, што вельмі шкада, што пан механік не можа з імі выпіць чарку віна».
Гэтае няшчаснае дзяўчо баялася аднолькава і Лотке і нас. Перакладала яна архідрэнна, але ганарылася сваім веданнем нямецкай мовы. Я падумаў: як бы яна здзівілася, каб раптам я пачаў рэзаць па-нямецку ў дзесяць разоў лепш за яе ці Лотке гэтак жа па-расейску. Мяне забаўляла такая гульня. Лотке пацмокаў і пацвердзіў:
«Але, шкада. Я таксама шкадую».
Актор быў, падла.
Адна акалічнасць бянтэжыла мяне: ні разу я не ўбачыў, каб Лотке шпіёніў за мной у нерабочы час. Ён вось так нечакана з'яўляўся ў дзяжурцы, на вышцы, хадзіў па пятах у часе пажараў. Але ні разу не вынырнуў на нашай ускраіне, дзе я кватараваў, не трапіў на вочы ў другім месцы. У мяне нават часам узнікала думка: а ці не перабольшаны мае падазрэнні?
Аднак на сустрэчу з Паўлам у той вечар я не пайшоў. Па дарозе дадому заглянуў каля Сеннага рынку да вядомай спекулянткі самагонам і... «напіўся». Выпіў адну шклянку, а ішоў далей і... мераў вуліцу, заводзіў гутаркі з хлапчукамі. Гаспадыня мая, добрая і ціхая мяшчанка, з тых, што ўсё жыццё жывуць з гароду. Ёй тады было год сорак, ужо сын служыў у арміі... Але жанчына ёсць жанчына... Яна кахала мяне, і ёй вельмі хацелася прыручыць назаўсёды такога хлопца. Хто я ў сапраўднасці, яна, безумоўна, не ведала, але гатова была за мяне каму хочаш выдрапаць вочы. Даглядала і асцерагала, як малога. Гэта была адзіная жанчына, з якой я жыў да таго, як ажаніўся. Можаш паверыць?
Яраш звярнуўся з пытаннем, і Шыковіч парушыў сваё абяцанне маўчаць, адказаў з уласцівай яму жартаўлівай лёгкасцю:
- Ты ў гэтым перада мною не апраўдвайся. Перад Галяй апраўдвайся.
- Перад Галяй, - задумліва паўтарыў Яраш і змоўк.
Яму зноў зрабілася балюча і прыкра. Прыгадалася недарэчная сцэна рэўнасці. І, бадай, ніколі ён яшчэ не думаў пра сваю жонку так жорстка і непачціва, як падумаў у тую хвіліну. Вось яна спіць, заспакоеная і задаволеная. А ён не можа заснуць.
Пакуль ён расказваў, а Шыковіч моўчкі слухаў, яны прайшлі колькі разоў па сцежцы да ручая, а потым пайшлі ўздоўж ручая пад дубы. Дубоў тут была вузкая дзялянка, далей пачынаўся бор. І

восьтут на мяжы гаю і бору было ў іх абжытае месца, дзе яны амаль штовечар палілі касцёр. Яны любілі агонь. Усе любілі - дзеці, жонкі. Часам пяклі бульбу ў прысаку і сала на ражне. Яраш, гаспадарлівы чалавек, нават змайстраваў тут лавачку.
Яны даўно ўжо стаялі каля свайго старога вогнішча. На зямлі чарнела куча сухога галля. Было такое правіла: удзень дзеці збіралі дровы, увечары палілі. Але ў мінулы вечар, відаць, касцёр не палілі: не было «бога агню» - Яраша.
У часе паўзы Антон сеў на сваю лавачку, а Шыковіч апусціўся на калені, чыркнуў запалку. Весела затрашчала сухое галлё. Водбліскі ўпалі на дрэвы, пазалацілі сосны і пасерабрылі дубы. На зямлю ляглі няроўныя цені. А за мяжой святла яшчэ больш згусцілася цемра.
Не ўпершыню начны агонь заварожваў Яраша. Хацелася глядзець, як гуляе, пераліваецца полымя, і маўчаць. Цяпер жаданне памаўчаць зрабілася асабліва моцнае. Ён падумаў, што дарэмна паклікаў Кірылу. Трэба было прыйсці сюды аднаму і запаліць гэты цудадзейны агонь. І, напэўна, да раніцы ўсё прыйшло б у норму.
Шыковіч адсунуўся ад агню і лёг на вытаптанай зямлі. Інтуітыўна ён адчуваў настрой сябра і, верны слову, цярпліва чакаў.
- Ты ведаеш, гэтая жанчына жыве і цяпер. Усё там жа на Падгорнай, у сваім доме. Калі пасля вызвалення я прыйшоў да яе, яна ўжо ведала, хто я. І ў яе не было ніякіх прэтэнзій, толькі павага і... збянтэжанасць. Вярнуўся яе сын, інвалід, без рукі. Яна жыла радасцю, што сын жывы. Знаёмячы нас, яна сказала, што я вядомы кіраўнік падполля і што яна таксама аказвала маленькую дапамогу падпольшчыкам. І вельмі была рада, калі я пацвердзіў гэта. Ёй хацелася, каб сын, франтавік, быў найлепшай думкі пра сваю маці... Я расказаў Галі пра гэтую жанчыну яшчэ да таго, як мы пажаніліся. Тады яна змаўчала і сказала, што ўсё разумее... А цяпер упікае.
Шыковіч зразумеў, што ў Антона адбылася сур'ёзная сутычка з жонкай. Але няўжо дзеля таго, каб выказаць гэты свой боль і крыўду, ён рабіў такі доўгі ўступ і экскурс у далёкае мінулае? Не. Безумоўна, ён мае расказаць нешта большае. Шыковіч сказаў жартам:
- Здаецца, ты робіш лірычнае адступленне ад сюжэтнай лініі.
- Але, - адразу згадзіўся Яраш і на момант задумаўся, мабыць, успамінаючы, дзе ён адхіліўся. - Лізавета Пятроўна, жанчына гэта, гаспадыня мая... яна, мабыць, адчувала нешта і баялася за мяне... А таму любіла, калі я прыходзіў, як пажарнік, як служачы сур'ёзнай і патрэбнай установы, падвыпіўшы. Але я ніколі яшчэ не прыходзіў вось так - «у дым». Яна смяялася, раздзяваючы мяне, ласкава лаяла... Напаіла квасам. Памыла ногі... Я гэта добра помню... Мне было няёмка і сорамна. Але я іграў ролю п'янага. Трэба было апраўдаць, чаму я не пайшоў на імяніны. Трэба было праверыць гаспадыню. Жыло ў мяне нейкае інтуітыўнае, падказанае бог ведае якім пачуццём адчуванне, што менавіта ў гэты вечар я выкрыю Лотке, даведаюся, хто мой «прыліпала». Упершыню ў той дзень з'явілася падазрэнне, што памочнікам Лотке з'яўляецца гаспадыня... Я «захроп» на ўвесь дом, а сам уважліва слухаў. І хутка пачуў:
«Можна да вас?»
«Калі ласка».
«Кватарант дома?»
«Дома».
«Дзе?»
«Спіць».
«Спіць? Так рана спіць? Ай-яй...»
«Выпіў чалавек».
«Выпіў? Няўжо выпіў? Ай-яй... Так выпіў, што зваліўся з ног? Такі дуб. Ай-яй».
«Гэтая зараза любога зваліць з ног».
«Можа, можа».
І, мабыць, не паверыўшы гаспадыні, што я дома, чалавек з тоненькім, далікатным галаском зазірнуў у мой пакой.
«Ай-яй, храпе на ўсе застаўкі».
Я не верыў сваім вушам. З месяц назад пасяліўся гэты пажылы ўжо, гадоў пад пяцьдзесят, чалавек у доме насупраць, цераз вуліцу. Назар Авяр'янавіч Дымар. Яго шмат хто ведаў. Закройшчык, працаваў да вайны ў цэнтральным атэлье. А ў акупацыі трымаў маленькую майстэрню тыпу «амерыканкі»: «Рамонт верхняй вопраткі. Хутка. Танна». У яго быў свой дом у раёне таварнай станцыі. Але згарэў, калі нашы самалёты бамбілі скапленне ваенных эшалонаў.

Пры бамбёжцы загінула жонка. Так ён расказваў мне і ўсім на вуліцы. Мы з ім амаль штодзённа сустракаліся. Сядзелі на лавачцы каля яго кватэры. Да гэтага пажару ён не паліў. А цяпер пачаў. Прызнаваўся, што і да чаркі цягне. Расказваў пра жонку - плакаў. Але нашых не вінаваціў. Уздыхаў: «Вайна. Што зробіш. На вайне няма вінаватых». Гэтай філасофіі ён прытрымліваўся ў разважаннях на многія тэмы, звязаныя з вайной, з дзейнасцю гітлераўцаў. Я разумеў яго: асцярожнасць. А я - чалавек, блізкі да паліцыі. Мне нават здалося, што ён сувязны нейкай падпольнай групы; для гэтай мэты і майстэрня арганізавана. І вось гэты чалавек з'явіўся ў такі вечар, каб праверыць, дзе я. Заглядвае ў пакой. Раней ён ніколі не заходзіў да мяне вось так, папросту. Куды знікла яго далікатнасць. Гаспадыня запытала, навошта я яму.
«Табачку хацеў пазычыць, цэлы дзень не паліў. Ажно вушы напухлі».
Няўжо ён? Ці гэта выпадковасць? Стары чалавек. Акуратны. Спакойны. Я ляжаў і ўспамінаў, аналізаваў усе сустрэчы і размовы з ім. Прыгадалася, што разы два я сустракаў яго нечакана на далёкіх ускраінных вуліцах. Але ці мала спраў магло быць у краўца, які паўжыцця працаваў тут і ведаў паўгорада людзей... Праз гадзіну ён з'явіўся зноў.
«Спіць усё яшчэ?»
«Спіць».
«Ай-яй... А я думаў, прачнуўся. У мяне сотачка спірту ёсць. Пахмяліцца пасля такога перабору - найлепшае лякарства. Асабліва чысты спірт. Адразу здымае боль галавы».
І зноў заглянуў у мой пакой.
Цяпер, бадай што, можна было не сумнявацца. Шпіён нерваваўся: я збіў яго з панталыку. Ён яўна не выконваў нейкага вельмі пэўнага задання. Ох і ўзлаваўся я на яго, на гэтага старога здрадніка! Рукі свярбелі - устаць і прыдушыць, як паганага шчанюка. Няма нічога больш агіднага за здрадніка і шпіёна. Але мая злосць была падвоеная: як магло здарыцца, што я з першага дня раскусіў мацёрага агента СД Лотке і больш за месяц вадзіў за сабой такога нікчэмнага «прыліпалу»? Але самае дзіўнае, ведаеш што? Гаспадыня мая, расказаўшы раніцай, як двойчы прыходзіў Назар Авяр'янавіч, нечакана заключыла: «Не падабаецца мне, Кузя, гэты чалавек».
З Паўлам я сустрэўся на другі дзень, у нядзелю. Не вельмі ўпэўнены, што Лотке не ведаў, ад каго я атрымаў запрашэнне на імяніны, я не пайшоў да яго на кватэру, хоць належным чынам і застрахаваў сябе і ад краўца і ад любых другіх «хвастоў». Я пайшоў на Балотную да цёткі Любы, каб гэтая «пранырлівая гандлярка» схадзіла на Каштанавую да Паўла і звяла нас. І там сустрэў Паўла. Ён прыйшоў туды з тым жа намерам - выклікаць мяне.
Як заўсёды, ён быў інтэлігентна апрануты - у капелюшы, у добрым касцюме, у гальштуку. Паліў цыгарэты. Як належала работніку ўправы. У любых абставінах ён трымаўся надзвычай спакойна і ўпэўнена і не надта асцярожна. Часам нават парушаў тыя правілы канспірацыі, якія сам устанаўліваў. Неяк на зборы нашай пяцёркі мы сказалі яму пра гэта. Ён адказаў, што ў падпольнай рабоце нельга вынайсці правілаў, прыгодных на ўсе выпадкі, што часам людзей выдае звышасцярожнасць.
Павел спытаў, чаму я не прыйшоў учора. Я расказаў пра «велікадушнасць» Лотке. Павел усміхнуўся, здалося мне, крыху зняважліва.
«Асцярожны ты хлопец. Доўга жыць будзеш...»
Закрануты, я ўспыхнуў, пачаў апраўдвацца:
«Ты сам вучыў нас... Не думай, што я спалохаўся».
Ён ласкава абняў мяне за плечы. Мы стаялі ў зацянёным пакоі, акно якога выходзіла ў сад. Вялікі куст бэзу, яшчэ зялёны і густы, засланяў гэтае акно. Помню, што дзень быў хмурны і ветраны. Наступала восень.
Павел сказаў:
«Дзівак. Хто можа падумаць, што ты баязлівец! Ты правільна зрабіў. Тым, што не прыйшоў, ты насцярожыў нас. Мы своечасова разышліся. Была аблава. У горадзе пачаліся арышты. Трэба быць, як ніколі, пільным».
Тады я расказаў пра краўца.
Павел нахмурыўся.
«А вось гэта горш, - сказаў ён. - Калі твая здагадка пацвердзіцца, прыйдзецца спусціцца табе з пажарнай каланчы. Шкада. Зручнае месца. Хораша відна, дзе трэба паліць. Краўца праверым. Я сёння ж дам заданне хлопцам. Сам нічога не рабі. Вадзі яго за нос. Табе ёсць іншае заданне. Ваенны савет вынес прысуд Лучынскаму, начальніку гарадской паліцыі, здрадніку Радзімы. - Ён

адступіў у глыб пакоя, да ложка, і з гневам дадаў: - Пёс гэты вельмі актыўны. Залішне здагадваецца пра тое, да чаго гестапа не дапяла б. Падумай, як гэта зрабіць найлепшым чынам».
Пра дзейнасць Лучынскага я сам збіраў звесткі. П'яныя паліцаі расказвалі пра садызм свайго начальніка. І я люта ненавідзеў гэтага чалавека. У мяне даўно гарэла жаданне стукнуць яго. Таму, атрымаўшы заданне, я адразу задумаўся: у галаве закруціліся магчымыя варыянты аперацыі, планы яе - як, дзе...
Я глядзеў у акно і думаў. І раптам:
«Антон».
Прызнаюся, я ўздрыгнуў, бо даўно ўжо не чуў свайго сапраўднага імя.
Павел сядзеў на нізкім табурэціку і, схіліўшы галаву, разглядаў кляймо фабрыкі на падкладцы капелюша.
«Масква, - сказаў ён, ласкава пагладзіўшы пабляклы велюр. - Аня купляла». І ўздыхнуў. Я падумаў, што мне здалося, што ён паклікаў. Але праз момант, не ўзнімаючы галавы, ён паўтарыў: «Антон! Калі здарыцца што са мной і Кацяй, не пакінь Тарасіка. Прытулі».
У мяне перахапіла дыханне і голас. Пакуль я сабраўся з думкамі, каб нешта адказаць, Павел падняўся і працягнуў руку:
«Бывай. У мяне многа спраў сёння. Выпрацуеш план - звяжыся са мной. Падвернецца пад руку - дзейнічай самастойна. Але без рызыкі. І напэўна!»
Я так і не паспеў нічога сказаць яму наконт сына.
Мабыць, углыбіўшыся ва ўспаміны, Яраш змоўк. Кірыла падняўся, сабраў галавешкі і кінуў іх у жар. Зноў затрашчаў вясёлы агеньчык. Асвяціў схіленую доктараву постаць.
Шыковічу закарцела здагадацца, чаму раптам Антону сярод ночы захацелася так падрабязна расказаць пра сваё падполле. Звычайна, калі яго прасілі, ён расказваў неахвотна і скупа. Нават пасля таго, калі ён, Шыковіч, зацікавіўся падполлем і пачаў збіраць матэрыял, сябра яго ні разу яшчэ не расшчодрыўся на такі вось расказ. Так зрэдку кідаў некалькі мазкоў, эпізодаў, дэталей, і то часцей дзецям - Віцю, Іры, Славіку - з педагагічнай мэтай: вось так ішло змаганне за жыццё, якое вы маеце.
Шыковіч, як губка, упітваў гэтыя эпізоды, дэталі. Ён знарок не патрабаваў спецыяльнага расказу, каб не збіцца на біяграфію толькі аднаго чалавека. Чэрпаў матэрыял з іншых крыніц, а Яраша як бы трымаў у рэзерве. Ён пачаў збіраць матэрыял для аповесці, але хутка пераканаўся, што пра падполле іх горада трэба сказаць нейкае новае слова ў нарысавым жанры. Таму ў апошні час больш цікавіўся дакументамі. Яму крыху не падабалася, што Яраш выбраў для расказу такі час і месца, калі нічога нельга занатаваць. А на сваю памяць у сорак пяць год ён не вельмі ўжо спадзяваўся.
Але пры ўсёй сяброўскай блізкасці ён не адважваўся што-небудзь сказаць, няхай і жартам, з гэтай прычыны, адчуваючы, што Антона па-сапраўднаму нешта ўсхвалявала. Каб перапыніць паўзу, Шыковіч сказаў:
- Зямля дыша цеплынёй. Лажыся. Не шкадуй касцюма.
Яраш абышоў вогнішча і лёг з другога боку. Разам з дымам кастра патхнула добрай папяросай. І яму таксама захацелася запаліць. Ён кінуў паліць год шэсць таму. Толькі пасля цяжкіх аперацый яго цягнула запаліць. А так - не. А тут раптам ажно засмактала ў грудзях, перасохла ў роце. Але ён напружыў волю і не папрасіў у Шыковіча папяросы. Каўтнуў горкую сліну.
- Дні праз тры цётка Люба паведаміла мне, што Павел арыштаваны. Каб ты ведаў, што я перажыў. Які боль! І страх. І разгубленасць. Не было Паўла. У каго спытаць парады, што рабіць? Гестапа лёгка можа дакапацца, што мы трымалі сувязь. Уцякаць? Але ўцячы - гэта, напэўна, выдаць сябе. І тады ўжо не будзе ніякай магчымасці выканаць заданне гаркома. І Паўлаву просьбу. Дзе Тарасік? Што з ім?
Цётка Люба паведаміла мне пра арышт на рынку, калі я купляў у яе піражкі. Аглушаны, спалоханы (мне не сорамна прызнацца - дрогнула сэрца, чаго там таіцца), я не паспеў спытаць пра Кацю, Тарасіка. Ды і нельга было гутарыць доўга. Якая можа быць гаворка паміж гандляркай і пакупніком! Навокал шпікі.
Пасля дзяжурства я пайшоў да цёткі Любы на кватэру. Яна спалохалася:
«У суседнім доме засада. Арыштаваны стары рабочы друкарні і яго жонка».
Люба праслязілася, гэтая «жанчына-камень», як мы называлі яе. Скардзіцца:

«Я два гады з суседкай не размаўляла. Яна маіх курэй атруціла. Жылі як ворагі. І не ведалі, што адну справу робім. Божа мой. Можа, на смерць людзей павезлі. Што яны падумаюць пра мяне? І цяпер... Цяжкая мая доля... Жандара-фрыца і «бобіка», што сядзяць там, я самагонкай пачаставала, піражкамі. Каб другімі вачамі глядзелі на мой дом. Але як затое зірнула на мяне суседка з таго боку! Чаго добрага, падумаюць людзі, што гэта я выдала Рамана Ціханавіча».
Скажу табе, страшная рэч у такіх абставінах - падазронасць. Мне і цяпер сорамна, што я падумаў у той міг: «А можа, праўда гэтая гандлярка - правакатарка?»
Цётка Люба нібы пачула мой душэўны шэпт, бо адразу высушыла вочы. Выставіла на стол пляшку.
Я спытаў пра Паўлаву сям'ю.
«Кацю арыштавалі разам з братам. Куды дзяваўся хлопчык, невядома. У кватэры наш чалавек быў - няма. Там усё разрабавана. Заўтра суседзяў абыдзем. Няўжо і дзіця забралі, ірады?»
Жанчына сказала гэтыя словы так, што знікла мая падазронасць. Не, такая жанчына ніколі не здрадзіць! Ні мужу, ні дому, ні справе. Ні тым больш Айчыне.
Магчыма, з-за пошукаў дзіцяці і новых сувязей я не спяшаўся з выкананнем задання. Бо ведаў: пасля такой акцыі, калі застануся жывым, мне прыйдзецца пакінуць горад. Як жа я знайду Паўлавага сына? Безумоўна, былі і другія прычыны. Не было з кім параіцца. Не трапляў зручны выпадак. А пасля Лучынскі некуды паехаў. Казалі - у Варшаву. Вопыт пераймаць, ці што. Знік і Лотке. Хіндэль сказаў, што ў механіка захварэла маці і ён паехаў на пабыўку ў Нямеччыну. Але дні праз два адзін з пажарнікаў убачыў Лотке каля казармы зондэркаманды, што размяшчалася ў Бярозках, дзе цяпер туберкулёзная бальніца. Ясна: агент выконваў іншае заданне. У горадзе ішлі арышты. Мне ніяк не ўдавалася звязацца з кім-небудзь з кіраўнікоў падполля, сябрамі гаркома. Настрой у мяне быў цяжкі, жахлівы. Я зразумеў, што пры ўсёй незвычайнасці заданняў, якія мне давялося выконваць, падпольшчык я малавопытны і слаба загартаваны. Маладому, самаўпэўненаму, мне адзін час здавалася, што я ўсё магу, што я ледзь не галоўная фігура ў падполлі. Цяпер жа разумеў: усё, што я зрабіў, гэта заслуга тых, хто нябачна, асцярожна і мудра кіраваў дзейнасцю такіх, як я. І тое, што я на волі, таксама іх заслуга, хоць самі яны, магчыма, у кіпцюрах гестапа.
За тыя дні я стаў другім чалавекам. За тыя два тыдні. З дня арышту Паўла прайшло роўна два тыдні. Калі чакаеш нечага незвычайнага, жывеш у напружанасці, запамінаецца кожны дзень. Гэта адбылося васемнаццатага верасня. Я змяніўся з начнога дзяжурства на каланчы. Ноч і раніца былі ясныя і халодныя. Па-асенняму. Помню, я моцна акалеў. Ніколі не быў прыхільнікам выпіўкі, але ў тую раніцу мне хацелася хутчэй сагрэць душу і цела. Ведаючы, што ласкавая гаспадыня з-пад зямлі дабудзе для мяне чарку, а цёплая пасцеля само сабой чакае, я спяшаўся дадому. Але пры выхадзе з пажарнай мяне затрымалі гестапаўцы. Не, не арыштавалі. А ветліва папрасілі вярнуцца назад. Яны ўмелі быць ветлівымі ў такія моманты, гэтыя звяры.
У людзей, якія ішлі на работу, яны правяралі дакументы, але дазвалялі прайсці. Чаму не выпускалі нас? Мы населі на Хіндэля (ён, як заўсёды, з'явіўся на службу раней за ўсіх), няхай пойдзе высветліць. Стары немец вярнуўся спалоханы, усхваляваны і на наша запытанне адказаў крыкам і лаянкай:
«Той, хто хоча ўсё ведаць, нядоўга жыве ў наш час...»
Невядома, ад чаго ён нас перасцерагаў. Чаму не сказаў праўду? Гестапа не рабіла сакрэту. Наадварот, як мы зразумелі пасля, яны хацелі, каб сабралася больш людзей. Відаць, не спадзяваліся на добраахвотны збор. Ты помніш, да вайны пажарная была на плошчы. Не толькі з каланчы, але і з вокнаў другога паверха, дзе змяшчалася дзяжурка, плошча была як на далоні.
І мы ўбачылі... Я першы ўбачыў... Прыйшлі грузавікі, доўгія, як лесавозы. І салдаты-сапёры пачалі згружаць... Я не адразу зразумеў, што гэта. Нехта іншы з пажарнікаў глянуў у акно і ахнуў: «Шыбеніцы!»
Але, гэта былі шыбеніцы. З нямецкай акуратнасцю зробленыя недзе ў майстэрні, трывалыя, нават пафарбаваныя ў нейкі брудна-шэры колер. Масавая вытворчасць! Салдаты хутка і ўмела ламалі брук і закапвалі іх у зямлю. У адзін рад - ад увахода ў парк да царквы. На аднолькавай адлегласці. Рабілі яны хутка і спрытна, можна было падумаць, што гэта іх штодзённая работа. Я зразумеў... здагадка гэтая абпаліла мозг. Павесяць падпольшчыкаў... Маіх таварышаў, кіраўнікоў... Магчыма, Паўла. Што я мог зрабіць, каб ратаваць іх?

Яраш змоўк. Астывала вогнішча. Шыковіч часта і шумна дыхаў. Праз тоўстыя камлі дубоў пачаў прасвечвацца белы луг. Сонна адгукаліся першыя птушкі. Дзесьці далёка-далёка за ракой спявалі пеўні.
- Я не ўмею і не люблю расказваць пра гэта. У мяне няма слоў. Яны здаюцца мне абразлівымі, звычайныя словы. Я не маю права расказваць спакойна. Але, бачыш, расказваю. Прайшлі гады... Я добра ведаю фізіялогію, вучэнне Паўлава... Але калі адзін хворы неяк пачаў даказваць мне, што мозг можа згарэць ад думак, я паверыў яму. Бо помню, як стаяў тыя дзве гадзіны, учапіўшыся рукамі ў падаконнік. Каб прысутнічаў Лотке, я, безумоўна, выдаў бы сябе. Як толькі не згарэў мой мозг ад тысячы планаў выратавання асуджаных! Яны мяняліся з маланкавай хуткасцю. Першыя здаваліся рэальнымі. Я паміраў, але выратоўваў таварышаў. Але па меры таго як разгортваліся падзеі на плошчы, я бачыў, пераконваўся: памру - і нічога не зраблю. О, яны ўмелі застрахаваць сябе ад любых нечаканасцей у часе пакарання нашых людзей! Машына іх дзейнічала безадказна.
Шыбеніц паставілі чатырнаццаць. Калі сапёры скончылі сваю працу, у кузаў машыны забраўся тоўсты фашыст у форме жандармерыі. Грузавік ціха і плаўна падыходзіў да шыбеніцы, вельмі дакладна спыняўся, і кат замацоўваў вяроўку. Петлі былі загадзя завязаны з двух бакоў. Ён хутка накідваў малую пятлю на перакладзіну і, каб зацiснуць і... праверыць трываласць, хапаўся за вялікую пятлю рукамі і павісаў над кузавам. Усе рухі ката былі разлічаныя, дакладныя, ніводнага лішняга, як на канвеернай лініі. І гэта было жудасна.
Кадры мяняліся... Грузавікі з сапёрамі адышлі. На нейкі момант плошча апусцела. А потым з вуліцы, якая называлася пры іх Паркавай, выехаў узвод матацыклістаў. Яны разгарнуліся за шыбеніцамі і накіравалі кулямёты на парк, на царкву і на Савецкую вуліцу. Праз хвіліну па Гандлёвай прайшлі два бронетранспарцёры. Яны сталі ў супрацьлеглых баках плошчы, і іх буйнакаліберныя кулямёты пагражалі руінам цэнтра горада і нашай пажарнай. Кулямётчык глядзеў на мяне. Я бачыў яго вочы, маладыя, насцярожаныя, пільныя.
Прагрукатала па бруку зондэркаманда.
Карнікі ўтварылі першы ланцуг вакол шыбеніц. Воддаль, таксама ланцугом, стала паліцыя ўнутранага парадку - «бобікі». Яны ж выконвалі другую ганебную місію: зганялі народ. Праўда, першыя з'явіліся добраахвотнікі, тыя, хто хацеў выслужыцца перад акупантамі. Яны прыходзілі па адным, па два, нясмела аглядаючыся, не давяраючы адзін аднаму, цiснуліся бліжэй да паліцыі, але стаялі асобнымі кучкамі. Потым паліцаі прыгналі рабочых станкабудаўнічага завода і друкарні. Рабочыя адразу зліліся ў адну групу. Сталі яны каля самай пажарнай сцяны, наблізіўшыся да бронетранспарцёра. Паліцыя адціснула рабочых, а бронетранспарцёр адсунуўся заднім ходам бліжэй да шыбеніц, і кулямёт, які глядзеў на мяне, быў скіраваны на рабочых. Жанчынам, якіх паліцаі прыгналі з другога боку, не дазволілі зліцца з рабочымі. Іх паставілі асобна.
Сабралі чалавек пяцьсот.
Здаецца, дурны і подлы Гвоздзік крыкнуў у дзяжурцы: «Хлопцы! Лезем на каланчу! Камуністаў будуць вешаць».
«Але, на каланчу! Адтуль відней», - падумаў я, не ведаючы, які чарговы план з'явіцца там, у вышыні. Усе мае планы рушыліся. Што можна зрабіць аднаму супраць матацыклістаў, бронетранспарцёраў, сотні гестапаўцаў? Але я ўсё яшчэ спадзяваўся, што з'явіцца нейкі асаблівы план. Каб там, на каланчы, стаяў кулямёт, як на вышцы каля паліцэйскай управы! А то ў мяне не было нават пісталета.
Каля лесвіцы мяне затрымаў Хіндэль.
«На каланчы гестапа», - ціха сказаў ён і, узяўшы за локаць, павёў у свой кабінет. Мы сталі ўдвух, беларус і немец, каля адчыненага акна і моўчкі глядзелі на плошчу, на злавесныя шыбеніцы, на якіх вецер гойдаў вяроўкі, на гестапаўцаў і на натоўп. Што адчуваў Хіндэль у той час? І ўвогуле, што за чалавек ён быў?
Прыехала «высокае начальства» - фельдкамендант Шміт, начальнік СД штурмбанфюрэр Бругер, афіцэры гестапа і СС. Следам за імі лакеі - бургамістр Цішчанка, начальнік паліцыі Лучынскі, іншыя здраднікі. Я шмат каго з іх добра ведаў. У мае падпольныя абавязкі ўваходзіла вывучэнне ворагаў.
І вось... Недзе ўнізе на Савецкай непрыемна зараўла сірэна. Два вялікія чорныя фургоны, за імі грузавік з эсэсаўцамі хутка выехалі на плошчу і, крута павярнуўшыся, спыніліся каля першай

шыбеніцы. Гестапаўцы саскочылі з машыны, адчынілі дзверы фургонаў, па двое залезлі ўсяродак і пачалі выкідваць асуджаных. Так выштурхоўвалі спакутаваных людзей, што колькі чалавек не ўтрымаліся на нагах і ўпалі на брук.
Хіндэль прашаптаў па-нямецку:
«Нельга біць асуджаных. Сволачы!»
Здалёк яны былі падобны адзін на аднаго, нашы таварышы. Асабліва мужчыны. З чорнымі ад катаванняў тварамі, ускудлачанымі валасамі, у падраных сарочках, са звязанымі за спіной рукамі, босыя... Але ўсё адно я адразу пазнаў Паўла. Ён выскачыў з фургона не першы. Але адразу прайшоў наперад і стаў побач з чалавекам з белай галавой. Гэтага чалавека я таксама пазнаў. Разы два сустракаў у Паўла. З тых, каго я ведаў, ён быў, бадай што, самы старэйшы, выглядаў за паўсотню год. Але, знаёмячыся, назваў сябе, як юнак, сур'ёзна, без усмешкі: «Саша». Так да яго звяртаўся і Павел. У часе сустрэч чалавек гэты больш маўчаў і слухаў, што казалі другія. Але па тым, як ён слухаў, я адразу зразумеў, што гэта адзін з кіраўнікоў падполля. Калі пасля я запытаў у Паўла, хто такі Саша, той адказаў з хітрай усмешкай:
«Саша. Пакуль што проста Саша».
Тады нават крыху пакрыўдзіла, што мне, падпольшчыку, які выканаў ужо не адно баявое заданне, не давяраюць. Але канспірацыя ёсць канспірацыя, гэта я разумеў. І ўсё-такі цяпер мне шкада, што я так мала ведаў Аляксандра Якаўлевіча Дубецкага - другога сакратара гаркома. Ды і другіх таксама... Тады там, у пажарнай, помню, балюча было, што я не ведаю нават прозвішчаў сваіх таварышаў. Не, я ўсё яшчэ ліхаманкава думаў, як памагчы ім, перашкодзіць пакаранню. Няхай бы лепш і я і яны, асуджаныя, загінулі ад куль, у барацьбе, чым на шыбеніцах. Але што я мог зрабіць? Адзін мой рух - і мяне знішчылі б. Вязняў было больш чым чатырнаццаць. Я палічыў - дваццаць тры чалавекі. Шэсць жанчын... Але, жанчын было шэсць. Яны трымаліся разам, у цэнтры групы.
Фургоны адышлі. На іх месца стаў грузавік з адкінутымі бартамі, з прымацаванымі ззаду ўсходцамі. Па ўсходцах гэтых у кузаў падняліся два чалавекі - тоўсты гестапавец-кат, які вешаў вяроўкі, і малады фашыст у форме армейскага афіцэра. Юрыст. Ён пачаў чытаць прыгавор крыклівым голасам. Але дрэнна ён вывучыў расейскую мову, каверкаў словы, і толькі асобныя з іх я разбіраў. Звычайнае фашысцкае абвінавачванне ў бандытызме, забастоўках, дыверсіях. І раптам... усё гэтае з нямецкай дакладнасцю адрэпетаванае прадстаўленне было паламана. Звонкі і ясны жаночы голас заглушыў словы прыгавору песняй. Якой песняй! Той, якую я спяваў дагэтуль толькі аднойчы, шэптам, на кватэры ў Паўла. І слоў яшчэ ўсіх не ведаў. Але музыка яе жыла ў маім мозгу, у сэрцы.

Пусть ярость благородная

Вскипает, как волна,
Идет война народная,
Священная война.
Шыковіч адчуў нешта накшталт прыступу астмы: з шумам выдыхнуў паветра.
Яраш на момант змоўк, падняўся з зямлі і, стоячы, паўтарыў словы песні, ціха, пранікліва:
- «Идет война народная, священная война». І песню падхапілі ўсе асуджаныя. Матыў яе, без слоў, перакінуўся ў натоўп рабочых. Начальнік СД закрычаў, адарваўся ад світы, падбег да асуджаных, пагражаючы пісталетам. Гестапаўцы прыкладамі аўтаматаў глушылі песню. Бронетранспарцёр пасунуўся на рабочых, ледзь не задавіўшы паліцаяў. Даў чаргу кулямёт. Кулі прасвісталі каля нашага акна. Хіндэль баязліва адсунуўся за сцяну. А я глядзеў... Я глядзеў... Знік з кузава «пракурор». Застаўся адзін кат. І вось гестапаўцы за рукі паднялі туды першага асуджанага. Яны спяшаліся. Яны білі яго. Білі Паўла. Гэта быў ён. Павел не ішоў пакорліва. Ён так ірвануўся, што два дужыя гестапаўцы зваліліся з кузава на зямлю. Павел закрычаў у натоўп:
«Таварышы! Браты нашы і сёстры! Адпомсціце за нас! Біце праклятых фашыстаў! Каб духу іх не было на нашай зямлі. Мы паміраем з верай у перамогу! За Радзіму! За партыю нашу! За народ!»
Не ўсё, безумоўна, удалося яму сказаць. Яны білі яго, шматгалосым гоманам глушылі яго словы. Але ён крыкнуў менавіта гэтыя словы. Я пачуў іх сэрцам. І яшчэ ўбачыў, як да машыны падбег Лучынскі, доўгі, сутулы. Гэты панок, подлы нацыяналіст, заўсёды хадзіў з нагайкай. Войт, прыслужнік. Ён ударыў гэтай нагайкай Паўла па твары. Заварушыўся натоўп. Загаласілі

жанчыны. Я не помню, што я зрабіў: застагнаў, заскрыгатаў зубамі?.. Але Хіндэль схапіў мяне за руку і пацягнуў ад акна.
«Адыдзі! Дурань! Ідыёт! Ты чуеш? Пачуюць». Ён лаяўся па-расейску, па-нямецку, у яго выцягнуўся, пабялеў твар і дзіўна трэслася барада. Я адпіхнуў яго. Але ў гэты міг, калі я адвярнуўся, Паўла павесілі. Машына адышла, і цела яго сутаргава курчылася ў паветры.
Павел! Паша! Друг ты мой дарагі! Ні да каго, здаецца, я не меў такой любові, як да цябе, вясёлы, ясны, сардэчны чалавек. Жудасна захаладала ў мяне ўсярэдзіне. Быццам спынілася кроў. І астылі думкі. Яны сталі цвярозыя, халодныя, жорсткія. І адразу прыйшло непахіснае рашэнне. Цяпер я ведаў, што мне рабіць. Я не выратую вас цяпер, сябры мае, бо адзін, без зброі, перад такой зграяй ашалелых ад крыві сабак. Але я буду помсціць. Помсціць! І першая кара будзе таму, каму вы калектыўна вынеслі прысуд. Лучынскі памрэ сёння!»
«Сёння!» Відаць, я падумаў уголас, бо Хіндэль спытаў:
«Што «сёння»?»
Я не адказаў. Яму зрабілася блага. Ён пачаў ванітаваць, узваліўшыся на пісьмовы стол. Я застаўся каля акна адзін. Вось ужо павесілі другога чалавека. Трэцяй была дзяўчына. Партызанская сувязная Надзя Кузьменка. Пасля я даведаўся: яе арыштавалі на дарозе, знайшоўшы ў кошыку пад грыбамі міну. Яна крычала праклянцці катам. Натоўп маўчаў. Натоўп, напэўна, застыў, як і я. Кожны чалавек у гэты міг да нечага рыхтаваў сябе. Прымаў рашэнне.
Здавалася, што жудасная машына карнікаў запрацавала без перашкод, па дэталёва прадуманаму д'ябальскаму плану. Чарговую ахвяру дужыя гестапаўцы хапалі пад рукі, падымалі ў кузаў. Грузавік падыходзіў пад шыбеніцу. Кат ускідваў пятлю на шыю. Машына адыходзіла, паварочвалася. Хутка. Спрытна. Механізавана. Начальства і варта заспакоіліся. Адзін з афіцэраў пачаў рабіць фотаздымкі.
І раптам адбылося нечаканае. І для нас і для фашыстаў. На царкве зазванілі званы. Вось на гэтай царкве, што на плошчы.
Я не адразу зразумеў. Падумаў, што арганізавалі яны. Ды не! Гэта не быў пахавальны бом. Не фарс. Не! На ўсё наваколле загучаў грозны заклік. Званы зазванілі так, як званілі яны адвечна, калі ішла бяда - нашэсце ворага, навадненне, пажар. Званы клікалі:
«Падымайся, народ! Падымайся, народ!»
І людзі паднялі галовы. Натоўп як бы вырас. А каты спалохана замітусіліся. Нешта крычалі Бругер і Шміт. Лучынскі кінуўся да царквы. За ім гестапаўцы. З бронетранспарцёра пачалі біць з кулямёта па званіцы.
А званы ўсё клікалі: «Падымайся, народ! Падымайся, народ!»
Не ведаю... І цяпер не ведаю, праз гэта ці так было задумана... Але пакаранне спынілі. Павесілі адзінаццаць. Тры шыбеніцы засталіся пустыя. Астатніх арыштаваных адвезлі назад у турму. Большасць з іх у хуткім часе расстралялі.
Калі чалавека, які званіў, забілі, званы доўга яшчэ грозна гудзелі, так моцна ён расхістаў іх. Чалавеку было семдзесят шэсць год. Стары, глухі, адзінокі званар. Кузьма Ягоравіч Сарока. Як ён трапіў на званіцу? Знарок? Выпадкова? Але безумоўна адно: убачыў ён адтуль, як караюць прышэльцы нашых людзей, і не вытрываў. Ведаў, што ідзе на смерць. Пайшоў. Без страху. Па тым, як яны стралялі там, на званіцы, і як пачалі сціхаць бомы, я зразумеў, што чалавека забілі. Але зразумеў другое, галоўнае - што ён свядома ішоў на гэта. Помню, я пашкадаваў, што гэты невядомы змагар не зацягнуў туды кулямёт. Адных званоў мала. У мяне, па крайняй меры, будзе пісталет і граната. Але яны былі схаваны на кватэры.
Калі плошча апусцела, я пайшоў на кватэру. Па горадзе ўсюды патрулі паліцыі і гестапа. Яны тройчы спынялі мяне і правяралі дакументы.
Ліза кінулася насустрач, устрывожаная і радасная:
«Я ўсе вочы праглядзела. Чаму так позна? Кажуць, людзей вешалі?»
У гэты момант, упершыню за той дзень, апанавала слабасць. Самлелі ногі. Я знясілена апусціўся на канапу, відаць, збялеў.
«Што з табой?»
«Павесілі Паўла», - сказаў я і... заплакаў.
Яна ведала Паўла, ён заходзіў раней, і ёй падабалася, што я сябрую з такім чалавекам, інтэлігентным, разумным, служачым управы.

Цяжка сказаць, чаму я давёрыўся ёй у той момант. Бываюць душэўныя рухі, якія немагчыма растлумачыць.
Жанчына ў той міг, відаць, шмат што зразумела, бо заціснула рот далонямі. Потым глянула ў вокны, зачыніла на кручок дзверы. І ні пра што больш не запытала. Знікла, напэўна, яе надзея зрабіць мяне мужам. І яна адразу пастарэла, асунулася, шчыра засмуцілася, калі я адмовіўся ад снедання. Я таксама больш нічога не тлумачыў ёй. Надзеў лепшы касцюм, дастаў з тайніка пісталет і гранату.
Яна спытала:
«Ты больш не вернешся?»
«Не ведаю».
Я адказаў шчыра. Хіба я мог ведаць, што са мной будзе?
Яна пацалавала мяне.
«Будзь асцярожны, Кузя. Ведай, табе ёсць куды вярнуцца».
План быў просты. Усё робіцца простым, калі чалавек перастае думаць пра сябе, пра жыццё... Калі галоўнае - дасягненне мэты.
Паліцыя размяшчалася ў асобным двухпавярховым будынку насупраць управы. Я мог пайсці проста туды. Але я пайшоў на плошчу, пустую і жудасную ў той дзень. Вецер, халодны асенні вецер пагойдваў целы павешаных і вяроўкі на трох шыбеніцах. Для каго яны пакінуты? Не, мяне жывым фашысты не возьмуць! Я развітаўся з таварышамі. Стаў насупраць Паўла, крокаў за дваццаць, бліжэй вартавы не падпусціў. На Паўлаву шыю была накінута яшчэ адна пятля - павешана дошчачка з надпісам: «Я кіраваў бандай, якая забівала нямецкіх салдат». Надзі Кузьменка яны напісалі:
«Я ўзрывала нямецкія эшалоны».
Увогуле, яны пускалі паглядзець на вісельнікаў, для гэтага пакараных пакінулі на шыбеніцах - каб устрашыць гараджан. Але я стаяў, мабыць, занадта доўга. Бо вартавы раптам пагразіў мне аўтаматам і закрычаў, каб я праходзіў. Чаго добрага, яшчэ стрэліць. Што ім значыла забіць аднаго чалавека! А мне паміраць так недарэчна нельга! Таму я паслухмяна пайшоў, развітаўшыся з Паўлам, з таварышамі, якіх я не ведаў пры жыцці, але смерць іх зрадніла нас.
Вартавы паліцай ведаў мяне. Я сказаў яму, што хачу паступіць да іх на службу. Ён узрадаваўся:
«Давай. Такія хлопцы нам цяпер во як патрэбны!»
«Начальнік у сябе?»
«Толькі што прайшоў».
Але сакратарка-перакладчыца затрымала мяне. Гэтую асобу я таксама ведаў: Павел хадзіў з ёй нават разы два ў кіно, каб выведаць, чым яна дыхае. І заключыў: «Дрэнь поўная». Яна сказала, што ў спадара Лучынскага важная нарада і наўрад ці прыме ён мяне. Я адказаў, што ў мяне пільная справа.
«Якая?»
«Хачу паступіць у паліцыю».
Яна паглядзела на мяне зацікаўлена і больш прыветліва.
«О,тады пачакайце».
Здраднікам падабалася, калі іх большала. Магчыма, кожнага з іх цешыла думка: «Не я адзін».
Сакратарка была стройная брунетка, гадоў дваццаці пяці, але са стомленым ад бяссонных начэй тварам распусніцы. Ды, мабыць, траплялі ёй у апошні час мужчыны падношаныя, тыпу Лучынскага. Бо калі яна бліжэй агледзела мяне і падумала, што я буду служыць побач, у яе юрліва заблішчалі вочы. Яна пачала заляцацца. Мне зрабілася агідна. Я думаў пра помсту, ішоў на смерць, а тут трэба было «сушыць зубы», гаварыць чорт ведае пра што. Хацелася стукнуць яе з пісталета, а потым тых, усіх, што за дзвярамі, абабітымі жоўтым дэрмацінам. Сакратарка сказала мне, хто там: «Заступца і следчы».
Не, раней трэба іх. У мяне не хапала сілы чакаць. Я падняўся і наблізіўся да дзвярэй. Але яна загарадзіла дарогу. Аўчарка пільна сцерагла свайго гаспадара.
«О, ты нецярплівы. Але начальнік не любіць. Май на ўвазе».
Яна наступала на мяне і адціскала ад дзвярэй. На маё шчасце, халуі хутка выйшлі. Яны шапталі нешта адзін аднаму на вуха і задаволена ўсміхаліся. Лысы намеснік начальніка паліцыі Левашоў ушчыпнуў сакратарку за мяккае месца, кіўнуў на мяне:
«Ці не хахаля ты такога знайшла, Мура? У гэтага ёсць брандспойт».

Яны цынічна зарагаталі.
«Нахабнікі», - сказала яна ўслед ім, як бы апраўдваючыся перада мной.
І пайшла ў кабінет, каб далажыць пра мяне. Выйшла не хутка ці, можа, мне так здалося - цягнуліся хвіліны. Помню, што я раптам захваляваўся, пачуў, як грукае сэрца. Яшчэ міг, адзін міг - і я адпомшчу за Паўла, за таварышаў. Дзверы адчыніліся. Яна, Мура, сказала: «Прахадзі» і прапусціла мяне. Я зачыніў за сабой дзверы асцярожна, быццам яны былі з танюсенькага шкла. Ступаў па дывановай дарожцы на пальчыках, пачціва і ціха, каб не спужаць звера. Круціў у руках шапку. Лучынскі глянуў насцярожана, трымаючы руку пад сталом, можа, на кнопцы званка ці на пісталеце. Але пазнаў мяне (ён інспектаваў пажарную і разоў колькі з'яўляўся на пажары) і заспакоіўся. Паклаў абедзве рукі на паліраваны стол двухметровай даўжыні, як бы абняў гэты сімвал сваёй улады. Выпрастаўся ў высокім крэсле. Сядзеў, як на троне. Яны ўсе ігралі, гэтыя мізэрныя пустыя людзі, здраднікі, уяўлялі сябе фюрэрамі і былі такімі ж бяздарнымі акторамі, як і Гітлер.
Я спыніўся крокі за тры ад стала ў пачцівай паставе. Я загадваў сабе: «Не выдаць... Ніводным рухам не выдаць сябе!» Хоць і марудзіць нельга было: мог зайсці хто-небудзь з паліцаяў.
«Дык, кажаш, хочаш перайсці ў паліцыю? Чаму? Пажарная - тая ж паліцыя. І нам патрэбны там адданыя людзі».
«Хачу помсціць за бацькоў, пан начальнік»,
Кузьма Клешч - сын раскулачанага, у паліцыі былі мае анкеты.
Лучынскі крыва ўсміхнуўся:
«Мы нікому не помсцім. Мы будуем новую Беларусь».
Пры гэтых словах ён адсунуў нагайку, якая ляжала на стале, каля правай рукі.
Я меўся застрэліць яго ва ўпор, а таму глядзеў толькі на вузкі твар, на лоб у кароне прыгожых пасівелых валасоў. Я цэліўся, выбіраючы момант. І раптам нагайка... Тая, якой ён ударыў Паўла. Адной гэтай дэталі было даволі, каб маланкава змяніўся план. Я скочыў да стала. Я кінуў цераз стол усю сілу свайго цела. Каб ён не паспеў націснуць кнопку, ударыў кулаком у пераносіцу. Ударыў так, што пасля ў мяне было запаленне надкосніцы ўказальнага пальца. Я схапіў нагайку, накінуў скураную пляцёнку яму на шыю і што ёсць сілы рвануў за канцы - за тоўсты, абглянцаваны, з раменьчыкам, і тонкі, з мяцёлкай калючых дроцікаў. Хруснулі шыйныя храшчы. Спадар Лучынскі вываліў ненатуральна доўгі язык. Вылезлі з арбіт вочы... Я падсунуў крэсла да сцяны, каб цела не ўпала і не нарабіла грукату. Было брыдка і пагана: ніколі яшчэ не выконваў прысуд такім чынам. Звычайна страляў ці кідаў гранату... Але ўсведамленне, што я выканаў справядлівы прысуд, адплаціў за смерць таварышаў у дзень іх пакарання, дало новыя сілы, новы імпульс жыцця і барацьбы. Не, цяпер не хацелася паміраць! Я скочыў да дзвярэй: ці не ідзе хто? За шчыльнымі дзвярамі прыглушана стукала машынка. Ціха. Вярнуўся да стала і на нейкім нямецкім цыркуляры буйна напісаў:
«Гэта першы акт помсты за павешаных. Дрыжыце, каты! Смерць здраднікам!»
Выйшаўшы, зачыніў дзверы за сабой гэтак жа ціха і асцярожна, як і тады, калі заходзіў у кабінет. Мура ўсміхнулася мне:
«Дамовіўся?»
«Ага».
«Да нас ці на ўчастак?»
«Да вас. Да заўтра».
«Да заўтра», - задаволена развіталася яна.
Але ў доўгім і пустым калідоры з'явілася жаданне пабегчы. Я ледзь стрымаў сябе. Дайшоў да лесвіцы, учапіўся рукой у поручні і зноў-такі прымусіў сябе сысці з другога паверха не спяшаючыся. Вартавы таксама спытаў:
«Узяў?»
«Але».
«З цябе - куш. Пакуль што цыгарэту».
Я памацаў пісталет і гранату. Цыгарэт не было.
«Аддаў Муры», - прыгадалася, што яна паліла, калі я выходзіў.
«Ого, хутка ты знаёмішся, - зарагатаў вартавы. - Але заўтра з пустымі кішэнямі не прыходзіць, у нас свае законы».
«Ведаю».

А сам лавіў кожны гук - ці няма трывогі?
Па вуліцы я пайшоў шпарка. Накіраваўся на Савецкую. Спадзяваўся, што на цэнтральнай будуць людзі і я схаваюся сярод іх і здолею перабрацца ў Залінейны раён. А там - некалькі явак. Я паспеў выйсці на Савецкую. Але ў той дзень яна была бязлюдная. Рэдкія прахожыя, і то, відаць, большасць - агенты ў цывільным.
І тут мяне дагнала трывога. Гукі яе даляцелі не з паліцыі - з гестапа, ажно з Паркавай. Зараўлі сірэны і маторы, загаўкалі аўчаркі. Вуліца ўміг яшчэ больш апусцела. Нават агенты, відаць, кінуліся да тэлефонаў, каб даведацца, што здарылася, атрымаць указанні. Я не паскорыў хаду, каб не выдаць сябе. Але імкнуўся хутчэй дасягнуць разбуранага бамбардзіроўкай квартала, каб схавацца ў руінах. І раптам - бываюць жа стрэчы! - насустрач Лотке. У вопратцы рабочага. Я зрабіў выгляд, што не пазнаў яго, і прайшоў міма. Але інстынкт вопытнага агента і, безумоўна, падазронасць, якую ён меў да мяне ўвесь час, прымусілі яго дзейнічаць.
«Стой! Руки вверх!» - У гэты раз ён крыкнуў на чысцейшай расейскай мове.
Я павярнуўся... Падняў рукі. Але з правай вылецела лімонка. Я паспеў убачыць, як Лотке кінуўся ў акно майстэрні па рамонту гадзіннікаў. Раней чым грымнуў выбух, дзынкнула вітрыннае шкло. Я схаваўся ад узрыву ў нішы замураваных дзвярэй. А потым кінуўся ўніз, звярнуў у першы праезд і пайшоў па задворках. Я ішоў назад, паўз двор управы, амаль паўз самую паліцыю, дзе стаяў гоман галасоў. Па шуму матораў, брэху сабак лёгка было здагадацца, што гестапаўцы абкружаюць кварталы па той бок Савецкай, кварталы руін. І, аднак, я шкадаваў, што не перасек галоўную магістраль. Там быў увесь горад, разбураны і цэлы. Там жылі нашы людзі, адтуль быў выхад у поле, у лес. А тут я быў заціснуты ў невялікім раёне паміж цэнтральнай вуліцай, якую цяпер ужо не перайсці, і ракой, за якую таксама не перабрацца. Уздоўж вуліцы - управа, паліцыя, правей - казармы зондэркаманды, над ракой - элеватар, прыстань са складамі, на беразе - вартавыя вышкі, агнявыя кропкі. І паміж гэтым - некалькі ціхіх вуліц, да якіх не дайшоў пажар і дзе заставаліся жыць нашы людзі. Нашы... А ці ўсе нашы? Гэта своеасаблівы раён. Дарэвалюцыйнай забудовы. Сяліліся тут пры цару галоўным чынам чыноўнікі. Пасля рэвалюцыі шмат якія дамы былі нацыяналізаваны, сталі камунальнымі. Але больш за ўсё эвакуіравалася ў пачатку вайны менавіта з гэтых камунальных кватэр. Рабочыя, савецкія служачыя. А хто застаўся... Не ўсе яны, відаць, нашы. Акрамя таго, я ведаў, што тут кватаруе многа немцаў - афіцэры, камерсанты. Праўда, была ў мяне перавага: я выдатна ведаў гэты раён, не толькі кожны завулак, але кожны дом і сад. Я жыў тут, калі вучыўся ў медвучылішчы.
У адзін міг я ўзважыў усе мінусы і плюсы. Тут жа выявіў яшчэ адзін мінус: я быў ранены. Асколкам уласнай гранаты. Ніша не схавала мяне ўсяго, і асколак пацэліў у нагу, вось сюды... Я нават намацаў яго. Штаніна набрыняла крывёю. Рана няцяжкая. Але па крывавым следзе лёгка ідуць аўчаркі. Таму я мусіў спусціцца ў склеп разбуранай крамы, падраць споднюю кашулю і перавязаць нагу. Патраціў некалькі хвілін. За гэты час пачалі абкружаць раён узрыву. Цяпер ужо не толькі шум матацыклаў, але і нямецкія каманды даляталі да мяне. Мабыць, упэўненыя, што я нікуды не дзенуся, немцы, здавалася, не вельмі ўжо спяшаліся.
У невялікіх руінах таго раёна схавацца нельга, я добра разумеў. Трэба выходзіць. І я выйшаў у Пушкінскі завулак, рушыў да ракі. Схаваць могуць толькі людзі, савецкія людзі. Я зазіраў у вокны драўляных дамоў. Я ведаў гэтыя дамы, але не ведаў людзей. Жыдоўская сям'я, дзе я кватараваў, эвакуіравалася. Другіх знаёмых тут не было. Якія знаёмыя ў студэнта!
Прайшла міма добра апранутая жанчына, агледзела мяне залішне зацікаўлена. Што прыцягнула яе ўвагу? Я намагаўся не кульгаць, закрываў рукой прабітую палу пінжака. З двара выбег афіцэр, на хаду зашпіляючы гузікі. Я сціснуў ручку пісталета. Але немец не зачапіў мяне, глянуў абыякава і пабег у бок цэнтра. Мабыць, яго выклікалі па трывозе.
Я звярнуў у вузкі безыменны завулак, па якім некалі хадзіў да ракі. Можа, і цяпер спусціцца да ракі і паспрабаваць пераплыць яе? Але на тым беразе бязлесны луг. Кожны, хто з'яўляецца там, бярэцца на мушкі кулямётаў. Не, ратунак можа быць толькі ў адным з гэтых дамоў. Але ў якім? Аўчаркі брахалі ўжо недзе каля ўправы. Калі натрапілі на след, яны будуць тут цераз дзве-тры хвіліны. Нельга марудзіць.
Я азірнуўся і... убачыў дом, у які мяне пацягнула нейкае асаблівае чуццё. У такія моманты з'яўляецца інтуіцыя, якая вядзе беспамылкова. Дом гэты стаяў не ў рад з іншымі дамамі, а ў глыбіні добрага саду. Прыгожы асабняк. Аднойчы я быў у гэтым доме. Прыходзіў здаваць экзамен гаспадару яго доктару Савічу.

- Савіч? Той Савіч? - не вытрымаў і выказаў сваё здзіўленне Шыковіч.
- Але. Той Савіч, пра якога Гукан з тваёй дапамогай піша, як пра здрадніка. Той Савіч, які супрацоўнічаў з немцамі, узначальваў аддзел управы і якому фашысты арганізавалі пышнае пахаванне.
- Тысяча і адна ноч. І ты пайшоў у гэты дом?
- Але. Сігануў цераз паркан, пераканаўшыся, што завулак пусты. Безумоўна, я рызыкаваў. Я ведаў, хто такі Савіч. Больш таго, я ведаў, што ў доме кватаруе лекар нямецкага шпіталя. Што ж... паміраць, дык з музыкай, чорт вазьмі! Я ішоў ужо ў той дзень раз на смерць. Яна дала адтэрміноўку. І калі не было іншага выйсця, калі любы варыянт даваў яшчэ менш шанцаў... Але, акрамя ўсяго, была нейкая інтуіцыя... Была вера ў гэтага чалавека. У Сцяпана Савіча. Я ведаў не Савіча-здрадніка, а Савіча-лекара, буйнейшага інфекцыяніста, бясстрашнага чалавека, які за сорак год лекарскай дзейнасці патушыў дзесяткі эпідэмій. Яго паважалі ў горадзе. Няўжо такі чалавек мог прадацца?
Зваліўшыся ў чужы сад, як з неба, я спалохаў мілую істоту. Яна карміла трусікаў. Клеткі з трусамі стаялі паўз паркан у два паверхі. Я пазнаў дзяўчыну. Дачка Савіча. Калі мы прыходзілі да хворага доктара здаваць экзамен па інфекцыйных хваробах, яна, падлетак, школьніца, падавала нам чай. Доктар, знаёмячы нас з ёй, сказаў: «Гэта мая гаспадыня». Але імя яе за тры гады я, безумоўна, забыўся.
Яна войкнула, а потым сурова спытала:
«Што вам трэба? Хто вы?»
«Цішэй! - шыкнуў я. - Я друг тых, каго сёння павесілі».
«Павесілі? А каго павесілі?»
Я ўзлаваўся. Калі ідзе такая вайна, калі штохвіліны гінуць людзі, жывуць, аказваецца, вось і так: за высокім парканам, у добрым садзе, кормяць трусікаў... Жаруць трусяціну... І не ведаюць, што робіцца навокал.
«Людзей, якія не сагнулі спіны. Чуеце? Аблава! Схавайце мяне!» Узлаваны, я не прасіў - загадваў. І яна зразумела. Схапіла мяне за руку і шпарка пабегла да дома. У калідоры спынілася, задыханая, узбуджаная.
«Куды ж вас схаваць? Пад кухняй ёсць пограб. Хочаце туды?»
Я паверыў у яе шчырасць і цалкам даверыўся ёй. Але на парозе кухні яна спынілася. Перадумала.
«Не, у пограб дрэнна. На другім паверсе пакоі нямецкага лекара пана Грота, ён кватаруе ў нас. Я зачыню вас у яго пакоях. Добра? »
Я згадзіўся і на гэта. Яна збегала некуды, вярнулася з ключамі. Мы падняліся ў мансарду, у добра абстаўленыя пакоі. Пакідаючы мяне, яна ўсміхнулася ласкава і разгублена.
«Ключа ў мяне няма. Няхай шукаюць Грота. У тым пакоі за шафай дзверы на гарышча. А там у нас чорт нагу зламае».
Я падзякаваў. Яна зачыніла дзверы на ключ. Але праз хвіліну вярнулася і прашаптала ў замочную шчыліну:
«Слухайце, вы... Як вас? Калі яны ўсё-такі ўварвуцца сюды, вы будзеце страляць?»
«Буду!» - цвёрда і бязлітасна адказаў я.
«У шафе ў Грота стаіць аўтамат».
О, дзяўчо гэтае было не з баязлівых! Дарэмна я ўпачатку блага падумаў пра яе. З той хвіліны я адчуў да яе павагу. Безумоўна, учынкі яе ў той міг маглі быць не ад свядомага пераканання, а ад жадання рамантыкі, што ўласціва такому ўзросту. Але было бясспрэчна - чалавек наш, сумленны. Інтуіцыя не падвяла. І гэта радавала.
У завулак яны ўскочылі ў той жа міг, як я застаўся адзін у шыкоўнай кватэры нямецкага афіцэра. Я ўбачыў іх праз акно. Гестапаўцаў з сабакамі і паліцаяў. Але я перабольшваў ролю аўчарак. Не такія яны ўжо разумныя і не такі ўжо ў іх тонкі нюх, як пра гэта расказвалі легенды. Звычайныя сабакі. Усе тры чамусьці кінуліся ў адзін двор. Безумоўна, следам за імі туды ўскочыла ўся зграя гестапаўцаў і паліцаяў. Пачаўся вобыск. Пошукі ў тым доме занялі хвілін дзесяць. Потым з'явілася тая модна апранутая жанчына, якую я сустрэў. Я пазнаў яе нават з такой адлегласці. Яна паказала гестапаўцам на гэты безыменны завулак. У мяне ёкнула сэрца. Няўжо яна бачыла, як я пераскочыў цераз паркан?

Гестапаўцы кінуліся сюды. Я заглянуў у шафу. Сапраўды, там стаяў аўтамат. Я не адважыўся набліжацца да акна, каб сачыць за імі. Маглі ўбачыць. Але вось сабакі загаўкалі, заскуголілі каля таго месца, дзе я пераскочыў паркан. Значыцца, напалі на след. Я дастаў аўтамат.
І раптам у садзе пачаўся дзікі вэрхал: вой, брэх, піск, крык. Я жахнуўся. Няўжо яны кінуліся на маю ўратавальніцу? Яна датыкалася да мяне, брала за руку. Забыўшыся на небяспеку, я наблізіўся да акна. І ўбачыў: аўчаркі рвалі трусоў.
Ты ведаеш, што зрабіла гэтае дзяўчо? Не кожны вопытны падпольшчык мог бы дадумацца. Яны выпусціла трусоў. Больш таго, яна забіла аднаго і кінула на сцежку каля таго месца, дзе я пералез паркан. Раз'юшаныя, галодныя сабакі, учуўшы пах крыві, ашалелі. Гестапаўцы не маглі іх стрымаць. Дзве аўчаркі пераскочылі паркан і, убачыўшы трусоў, пагналіся за імі.
А ў фортку грукалі гестапаўцы.
Гаспадыня спалоханым голасам крычала з ганка:
«Я баюся вашых сабак! Я баюся вашых сабак!»
Відаць, нехта з гестапаўцаў пералез і адчыніў калітку.
Тады яна закрычала абурана: «Панове! Панове! Што вы робіце? Гэта трусы пана Грота! Хірурга шпіталя пана Грота. Яго трусы. Божа мой! Што мне скажа пан Грот?»
Сабак нарэшце ўгаманілі. Цяпер яны толькі гырчалі, даядаючы трусяціну.
Яе спыталі ветліва:
«Скажыце, фрэйлейн, сюды ніхто не заходзіў?»
Яна ўсхліпнула:
«Трусы пана Грота! Гэта дом доктара Савіча. І ў нас кватаруе пан Грот, хірург шпіталя».
Гестапавец ці, магчыма, паліцай паўтарыў пытанне па-расейску.
«У нас заўсёды зачынена фортка. Тату пагражаюць, што яго заб'юць за тое, што ён служыць у немцаў. Я казала яму: навошта яму служыць? Ён мог прымаць хворых дома, як доктар Грайпінер. У Грайпінера хутка будзе свая клініка. А тату сапраўды могуць забіць. Няшчасныя трусікі!.. Што скажа пан Грот?»
Яна іграла наіўную дурную дзяўчынку. Але гестапаўцам не было калі слухаць яе балбатню. Старэйшы закамандаваў:
«Пашукаць!»
Яны зайшлі ў дом. Сабакі не пайшлі, бо іх цікавілі больш трусы, а не мой след. Ды і ад следу, як я пасля даведаўся, нічога не засталося. Гэтая дзяўчынка зрабіла яшчэ адзін надзіва хітры ход: яна паспела працерці ганак і падлогу ў калідоры растворам фармаліну.
З пакояў першага паверха далятаў да мяне гул галасоў, але слоў нельга было разабраць. Потым я пачуў іх крокі на лесвіцы. І яе голас:
«Там жыве пан Грот. Але ён не пакідае ключа. Ён не верыць, што я магу ўпільнаваць дом. Вы можаце, безумоўна, паламаць дзверы. Вы падушылі яго трусікаў. Але што скажа пан Грот? Ведаеце, давайце лепш я пазваню яму, няхай ён прывязе ключы. Ён хутка, у яго свая машына. Тады вы самі растлумачыце яму, што гэта вашы сабакі падушылі яго трусоў. Каб ён не думаў, што я не ўпільнавала».
«Ну і знайшоў сабе трашчотку гэты Грот», - сказаў адзін гестапавец, націскаючы на ручку дзвярэй.
Другі, недзе ўнізе, засмяяўся:
«А так яна нічога. Маладзенькая. Ножкі стройныя».
Відаць, глядзеў, нахабнік, на яе ногі знізу. Крокі пачалі спускацца, аддаляцца. І ўсё звінеў яе галасок. Яна ўсё яшчэ нешта гаварыла пра свайго тату, пра пана Грота і пра трусоў. Я пачуў шум машыны. Потым падрабязны даклад аб пошуках нейкаму начальніку. Магчыма, што гэта быў сам Бругер. Выслухаўшы, ён рэзюмаваў:
«Ідыёты! Перавярнуць дагары ўвесь раён, але знайсці гэтую сволач! Вось яго фатаграфія».
Працавалі яны аператыўна, нічога не скажаш: менш як за гадзіну пасля здарэння была размножана мая фатаграфія.
Я чакаў: будуць яны «пераварочваць» дом Савіча ці не? Прызнаюся, у той міг мне не хацелася страляць у іх ні з пісталета, ні з аўтамата. Я разумеў, якую небяспеку наклікаў бы ўзброеным супраціўленнем на гэтую мілую «трашчотку». Пры ўсёй суровасці і бязлітаснасці таго дня мне да болю стала шкада яе. Ёй трэба жыць! Трэба жыць... каб прынесці камусьці многа радасці.

Нам пашанцавала: у дом яны больш не вярнуліся. Бругер верыў доктару Савічу. «Пераварочвалі» суседнія дамы.
Праз некаторы час яна зайшла да мяне. Ціхенька адчыніла дзверы, моўчкі прайшла да канапы, зморана села, выцерла далоняй лоб. Але вочы яе блішчалі радасна і ўзбуджана.
«Ух, здаецца, мінула. Як я баялася! Ох, каб вы ведалі, як я баялася. Цяпер я ведаю, што такое «душа ў пятках». Яна скінула басаножку і памацала сваю пятку; гэта было наіўна і смешна, і яна сама засмяялася: «А хораша я вадзіла іх за нос. Вы чулі? З мяне магла б выйсці актрыса. Да вайны я хадзіла ў драмстудыю пры клубе чыгуначнікаў».
І яна ўздыхнула, успомніўшы той дарагі даваенны час.
Я спытаў, як яе імя.
«Софа... Мама звала - Соня, а тата і цётка - Зося. Мама мая на дваццаць гадоў маладзей за тату, і яе забралі ў армію, мама - хірург. У нашу армію, - з гонарам падкрэсліла дзяўчына і тут жа ўздыхнула. - А тата працуе ў немцаў. Парадокс. Праўда? Цёця Марына памерла два месяцы назад. Пасварылася з татам, а ў яе хворае сэрца. Тата вельмі перажывае цяпер. А што гэта я, тата, тата... А вы, мража, не ведаеце, хто мой тата... Гэта - доктар Савіч. Вы гараджанін? У горадзе яго многія ведаюць».
Я адказаў, што ведаю Сцяпана Андрэевіча, ён вучыў мяне.
Гэта яе проста ашаламіла. Яна падскочыла, наблізілася і пільна ўгледзелася ў мой твар.
«Божа мой! Цяпер я, здаецца, успамінаю. Вы прыходзілі да таты здаваць экзамены, калі яго аперыравалі з прычыны тромбафлебіту».
І раптам стала задумліва-сур'ёзнай. Спытала:
«Скажыце, вы ведалі, што тата працуе ў немцаў?»
«Ведаў».
«Ведалі і прыйшлі ў наш дом?»
«Ведаў і прыйшоў, бо ўпэўнены, што доктар Савіч не прадасць мяне».
Яна доўга глядзела мне ў вочы, а потым нахілілася і... пацалавала ў шчаку. Пацалавала не па-дзявочы, сарамліва ці гарэзліва, а па-даросламу, сур'ёзна, з удзячнасцю.
Мая першая падпольная клічка была «Віктар», і я чамусьці сказаў яе, а не сапраўднае імя, хоць пасля зразумеў, што гэта недарэчна, непатрэбна і няшчыра перад Зосяй.
«Дзякую вам, Віктар. Цяпер вы мне брат. І я вас схаваю, як брата. Так схаваю, што фрыцы за сто год не знойдуць. Хадземце. А то праз гадзіну прыйдзе Грот. Ён дакладны».
Тады я спытаў:
«Думаю, у доме, дзе жывуць два лекары, знойдзецца скальпель і пінцэт?»
«Скальпель? Навошта вам скальпель?»
«У бядры маім сядзіць асколак гранаты».
Вельмі магчыма, што толькі ў той міг яна адчула ўсю сур'ёзнасць барацьбы, свайго мімавольнага ўступлення ў гэтую барацьбу, небяспекі, якая цяпер пагражала ёй, бацьку. Трусы, фармалін, балбатня з гестапаўцамі - усё гэта, відаць, рабілася ў парыве, у захапленні незвычайнасцю, усё гэта была амаль гульня ў хованкі маладога здаровага хлопца. А тут яна зразумела. І разгубілася, спалохалася, замітусілася.
«Што ж рабіць? Хадземце ў бацькаў кабінет, там усё ёсць. Не, не... Нельга. Могуць прыйсці. Давайце сюды... на гару. Аўтамат паставім на месца... Вось так... Крыві не накапала?» - агледзела падлогу. Потым адчыніла невялічкія сцянныя дзверы, і мы апынуліся ў каморы, завешанай вопраткай. Дзесяткі паліто, касцюмаў, плащцяў. Нешта зашыта ў прасціны, мабыць, футры. Пахла нафталінам.
«Багата жыве доктар Савіч. Шкада дабра, таму і да немцаў падаўся», - падумаў я нядобразычліва.
Мы падлезлі пад вопратку і яшчэ праз меншыя дзверкі выйшлі на гарышча - вузкі тунель паміж сцяной мансарды і дахам. Аднекуль здалёк цадзілася святло, і было відаць, што тут сапраўды «чорт зламае нагу». Старыя крэслы, карціны, дываны, верстакі, рыбацкія сеткі, мяшкі, посуд - усё гэта было нагрувашчана абы-як. Мы ледзь прабраліся. Нават паўзлі праз нейкую шчыліну. Гэта быў праход пад выступам акна. Такім чынам мы перабраліся на другі бок, за глухую сцяну мансарды, дзе было больш прасторна і светла.
Тут на старым матрацы Зося зрабіла мне прытулак. Праз другі ход, праз люк у столі над кухняй, яна прынесла прасціну, падушку, коўдру, інструменты, бінты, вату, ёд.

І я зрабіў сабе аперацыю - дастаў асколак. З яе дапамогай. Перад гэтым мы паспрачаліся. Я лічыў сябе ўжо закончаным медыкам. Медтэхнікум, як тады называлі, курс інстытута... Ва ўсякім разе, даўно ўжо пазбавіўся фальшывай сарамлівасці, калі што тычылася хваробы. Але, ведаеш, перад гэтай дзяўчынкай мне стала сорамна агаляць сябе. Я папрасіў яе адысці. Яна запярэчыла.
«Я ніколі не хацела быць лекарам. Але я дачка лекараў», - сказала яна рашуча.
І такі добра памагла мне. Ва ўсякім разе, крыві не баялася і павязку зрабіла прафесійна.
А потым прыйшоў Грот. Мы пачулі, як ляпнулі за сцяной дзверы. Зося нырнула ў люк. Цяжкія крокі. Іх галасы, яго і яе. Словы глухлі ў сцяне. Пра што яны гаварылі? Я ненавідзеў немца двайной нянавісцю: і за тое, што ён афіцэр гітлераўскай арміі, і за тое, што адарваў Зосю і не дае ёй з'явіцца сюды. Аднаму мне было цяжка. Вечарэла. Узняўся вецер. Стары бляшаны дах грымеў на тысячу ладоў. А мне здавалася, што над горадам ідзе страляніна, што крычаць жанчыны, дзеці. Уявіліся павешаныя, так, як ні разу яшчэ за гэты доўгі і страшны дзень. Вецер гойдае іх целы. Счарнелыя твары. Счарнелы твар Паўла. Той жывы, ясны твар, па якім заўсёды гуляла ўсмешка, то гарэзлівая, вясёлая, то хітрая, то сумная. Ён стаяў перада мной жывы і прасіў: «Антоша, калі са мной што здарыцца, не забудзь Тарасіка». Я не знайшоў Тарасіка. І мне хацелася раўці ад крыўды і болю.
Пачуўся глухі барытон Савіча. Недзе ўнізе. Туды ж спусціўся немец. Галасы сціхлі. Напэўна, селі вячэраць. У светлай сталовай, за круглы стол, накрыты белым абрусам. Упершыню я ўспомніў, што цэлыя суткі нічога не еў. Але есці не хацелася. Гудзела ў галаве. Хто такі Савіч? Зося горача падзякавала, калі я сказаў, што ўпэўнены, што доктар Савіч не прадасць мяне. Але яна не сказала: прыйдзе тата і зробіць вам аперацыю, не павяла ў бацькаў кабінет. Чаму? Ці скажа яна яму пра мяне?
Тысячы думак адразу. Яны палілі мозг. Я адчуваў, што пачынаецца гарачка. Калі страчу прытомнасць, пачну трызніць - выдам сябе, выдам яе... І я напружваў усе сілы...
Сцямнела. А вецер не сціхаў. Асенні. Халодны. Злы. І я такі праваліўся ў жудасную яму. Там, клубком сплёўшыся, качаліся ваўкадавы. Гледзячы на іх, іржалі эсэсаўцы, і морды ў іх таксама сабачыя. Раптам Лучынскі страшэннай доўгай рукой, як у Вія, паказаў на мяне: «Вось ён!» Я ўцякаў. А яны гналіся за мной. З надзвычайнай лёгкасцю я скакаў цераз парканы, цераз дамы нават. А яны не адставалі. У мяне калаціласяа сэрца. Вось-вось дагоняць.
Апрытомнеў я ад дотыку да твару халоднай мяккай далоні і шэпту над вухам:
«Родненькі мой! Што з табой? Гарачка? На, выпі вось гэта. І з'еш».
У поўнай цемры дзяўчына сунула мне цёплую пляшку. Памагла падняць галаву. Я выпіў салодкую вадкасць, ад якой пахла парэчкамі і вермутам. Яна падбадзёрвала:
«Пі, пі. Ты стагнаў. Не трэба стагнаць. Нельга. Каб я магла застацца тут з табой! Я пільнавала б цябе. З'еш вось гэта».
У руцэ маёй апынуўся кавалак мяса, відаць, трусяціны.
«Яны селі гуляць у шахматы, бацька і Грот. Абодва нечым усхваляваны, нешта хаваюць ад мяне. А я - ад іх. Каб мне застацца з табой, Віктар. Я пільнавала б цябе».
Пітво і ежа падмацавалі. Я зразумеў, чаго яна баіцца. Прыйшлося заспакоіць яе, што я не буду больш стагнаць і крычаць:
«Гэта ў сне. Больш спаць не буду».
Яна бясшумна знікла. Але пакінула мне сілу і заспакоенасць. Цяпер я адчуваў яе прысутнасць, яе клопат. І мне не было страшна ў цемры, пад дахам, які гудзеў і ляскатаў. Каб толькі не залішні быў яе клопат, а то якраз яна, а не я, можа праваліць нас. Цяпер ужо я думаў не пра сябе - пра нас. Мне сапраўды стала лепш. Ва ўсякім разе, прытомнасць больш не траціў.
Недзе апоўначы пайшоў дождж. Тысячы малаткоў загрукалі па блясе. Потым па маёй галаве. Аглушылі. І я праваліўся ў пустую яму, дзе не было ні сабак, ні гестапаўцаў.
Прачнуўся, калі развіднела. Адчуванне ранішняе - здаровае. Нават нага не вельмі балела. Больш балеў палец на руцэ, і я доўга не мог успомніць - ад чаго. У думках - цішыня. І на двары ціха. Ляпнула фортка. Галасы. Нехта пайшоў. Хутка з'явілася Зося. Прынесла сняданак - кашу, малако, яблыкі. Смачна і многа. Была яна засяроджаная, сур'ёзная, не такая гаварлівая, як учора. Паведаміла з болем і смуткам:
«Яны павесілі адзінаццаць чалавек. На плошчы. Якое зверства! А нашы задушылі начальніка паліцыі», - і таксама з болем.
«Сабаку - сабачая смерць», - не вытрымаў я.

Яна глянула на мяне і... здагадалася:
«Ах! Гэта - вы?!»
Цяжка зразумець, чаго больш было ў яе воклічы: здзіўлення, захаплення, інтэлігенцкай грэблівасці ці страху? Я спалохаўся, што цяпер гэтае аранжарэйнае дзіця будзе баяцца мяне. Страшна стане ёй заставацца адзін на адзін з чалавекам, які можа вось так проста задушыць другога.
«Я выканаў прыгавор народа. Гэтаму гаду даўно быў вынесены прысуд. У мяне не было другой зброі...»
Гэта было як апраўданне, і самому мне стала непрыемна. Чаму я апраўдваюся? Не, яна зразумела. Уздыхнула цяжка і сказала:
«Я хачу ненавідзець іх, як вы. Хачу і не магу. Грот добры чалавек. Культурны, ветлівы».
Яна меркавала аб фашыстах па адным нямецкім лекары.
«Для таго каб ненавідзець іх так, трэба ўбачыць тое, што бачыў я!» - і горача пачаў расказваць ёй пра расстрэл ваеннапалонных у кар'ерах цагельнага завода, пра катаванні нашых людзей у сутарэннях гестапа, пра жудасці жыдоўскага гета, пра зверскае забойства дзевяцігадовага хлопчыка, майго суседа, віна якога заключалася ў тым, што, гуляючы на вуліцы, ён напісаў на снезе слова «Гітлер»... І пра барацьбу, якую вялі армія, народ, партызаны. Пра падполле ў горадзе. Пра Паула. Як крычаў ён да людзей апошнія словы перад карай. Не, яна жыла не так ужо ізалявана. Многія факты даходзілі да яе. Але паводзіны бацькі, якога яна любіла і з маленства верыла кожнаму слову яго і ўчынку... А потым гэты Грот. Ён хітра капаў на дзявочы розум. Быццам асуджаў жорсткасці ўлад. Але тут жа апраўдваў іх тым, што нібыта з нашага боку вайна вядзецца антыгуманна, у парушэнне ўсіх канвенцый. Факты фанатычнага забойства нямецкіх салдат і чыноўнікаў вымушаюць улады да такой жорсткасці. Вайна ёсць вайна. А вось каб наш народ скарыўся, яны, немцы, рабілі б толькі адно: неслі б сваю высокую культуру. Ён многа і часта казаў ёй пра вялікую культурную місію нямецкай нацыі.
Паслухаўшы Зосю, я зразумеў, што не такі ўжо ён бяскрыўдны, хірург Грот. Шмат у чым ён страшнейшы за тых, што страляюць і вешаюць. Розніца хіба ў тым, што ён проста разумнейшы за іх. Юная чыстая душа рвалася да змагання, а яе хітра скоўвалі ланцугамі хлуслівых слоў і перакананняў. Ператварылі ў чысценькую культурную кухарку. Хацелі, каб у будучым яна ведала толькі тры «К»: кірхен, кюхе, кіндэр. Яны даручылі ёй усю гаспадарку, каб у яе не заставалася часу на што другое. У доме мог быць дзяншчык, работніца. Не, яна гаспадарыла адна. Грот і бацька памагалі ёй. Ну, Грота я разумеў. За год пабачыў усялякіх фашыстаў. Але Савіч... той Савіч, які ўсё жыццё смела змагаўся з эпідэміямі... Навошта яму завязваць вочы ўласнай дачцэ? Добра, што яна вось такая выйшла з савецкага жыцця, са школы. Без бунту, без шуму, аднак ірвала ўсе іх путы.
«Якая была б падпольшчыца!» - падумаў я, калі яна між іншым расказала пра трусоў і фармалін.
Мы з ёй гутарылі гадзіны дзве. Потым яна спахапілася: «Ой, трэба ж абед гатаваць!» Савіч і Грот з'яўляліся на абед роўна ў гадзіну дня. З нямецкай дакладнасцю.
Пасля абеду мы гутарылі зноў. Шэптам, безумоўна. Яна нахілялася да мяне, і я адчуваў яе гарачае дыханне. І мне было хораша...
На трэці дзень раніцай мяне наведаў сам гаспадар.
- Савіч? - зноў перапытаў здзіўлены Шыковіч.
- Савіч. Ён з'явіўся нечакана. І не праз люк. Відаць, яму цяжка было падымацца па крутой лесвіцы. А адтуль, з пакояў Грота. Я пачуў чужыя крокі і схапіўся за пісталет. Ён прадугледзеў гэта. Сказаў з-за вугла: «Не ўздумайце страляць. У мяне мірны намер». Я схаваў пісталет пад коўдру, але не выпускаў з рукі.
Савіч наблізіўся. Сівы, ссутулены, стары. Зусім сівы. З белай-белай галавой. У часе акупацыі я стараўся не трапіць яму на вочы, каб ён не пазнаў свайго былога студэнта. Зрэдку бачыў здалёк. Як ён змяніўся! Куды дзеўся той стройны рухавы жыццярадасны мужчына, якога мы любілі ў тэхнікуме, нягледзячы на яго патрабавальнасць. «Навошта такому старому працаваць у немцаў, ды яшчэ ўзначальваць аддзел аховы здароўя? Чыё здароўе ён ахоўвае? Сваё ўласнае не мог захаваць», - саркастычна падумаў я.
На гарышчы быў паўзмрок. Але Савіч адразу пазнаў мяне.
«Антон Яраш?»
Цудоўная памяць!

«Чакай. Чакай. Высокі. Бландзін. Дык гэта ты - Лучынскага? - хваравіта гэтак зморшчыўся. - Непрыгожы акт».
Мяне ўзарвала:.
«А вешаць людзей на плошчы - прыгожы акт? А што варты нейкі халуй у параўнанні з тымі людзьмі?!»
«Цішэй ты! Гром! - прашаптаў ён. - Не аднаго сябе ставіш пад удар. Не забывай».
Я адразу прыкусіў язык.
Ён сеў на матрац, памацаў сухой далоняй мой лоб.
«Паранены? Зося бінты цягае».
«Паранены», - прызнаўся я.
«Пакажы».
Разбінтаваў. Агледзеў рану.
«Хто аперыраваў?»
«Сам. З дапамогай Зосі».
«Агідная дзяўчынка! Труса забіць не можа. Крыві баіцца. Ну што ж... Гангрэны няма. Праз тыдзень будзеш танцаваць. Калі-небудзь станеш добрым хірургам».
У той міг я адчуў да яго сімпатыю. Не, чорт вазьмі, усё-такі гэта яшчэ той Савіч, якога я ведаў! І ў мяне мімаволі вырвалася:
«Дзякую, Сцяпан Андрэевіч!»
«Няма завошта мне дзякаваць, - незадаволена прабурчаў ён. - Зосі дзякуй». І, памаўчаўшы, сказаў сурова, выціснуўшы па адным слове: «Ты вось што... Ляжы... тут... Ціха ляжы... Але крый божа... кранеш... Зосю...»
Я не адразу нават зразумеў, што значыцца «кранеш». А зразумеў - задыхнуўся ад абразы і абурэння:
«Што ж, я, па-вашаму, фашыст?»
Ён паляпаў мяне па шчацэ.
«Ну, ну... Не крыўдуй. Я сам некалі малады быў».
«Маладосць ад маладосці розніцца».
Савіч стоена ўздыхнуў:
«Але... Цяжкая ў вас маладосць. Ну, будзь здароў. І будзьце асцярожныя...»
І пайшоў. Яшчэ больш, здавалася, згорбіўся. А праз колькі хвілін з'явілася Зося. Шчаслівая, але ў слязах. Кінулася ў парыве да мяне, абняла, пацалавала.
«Віктар, даражэнькі, ты ведаеш... - Зноў на «ты», як у тую, першую, ноч. - Ты ведаеш... Ён нічога не сказаў. Прытуліў мяне да сябе... Пацалаваў. І заплакаў. Тата заплакаў. Божа мой! І толькі ўвесь час паўтараў: «Будзьце асцярожныя! Будзьце асцярожныя!»
Яны не прыкмецілі, як развіднела. Быў канец чэрвеня, самая кароткая ноч. Прачыналіся птушкі, напаўнялі гоманам лес. А два чалавекі жылі ў мінулым, у іншай ночы, далёкай і страшнай. Толькі калі над дубамі са свістам праляцелі дзве качкі, гучна шлёпнуліся ў старыцу і кракнулі, Яраш, перапыніўшы расказ, падняў галаву. Здзівіўся:
- Раніца? Ну вось, па сутнасці, усё, што мне хацелася расказаць табе. Пра ўсё іншае як-небудзь пасля.
Шыковіч маўчаў - пераварваў тое, што пачуў. Гатовы сюжэт. Гатовыя вобразы. Але спачатку трэба выясніць, хто ж такі Савіч.
Стомлены Яраш сядзеў на лавачцы і слухаў раніцу.
Нарэшце Шыковіч адчуў, што яму холадна на зямлі. Самлелі нага і рука. Падняўся, пацягнуўся.
- Ну, брат, даў ты харч майму склератычнаму мозгу. Але скажы шчыра, Антон, чаму ты расказаў усё гэта? Маўчаў, маўчаў і раптам - бух, адразу, у адну ноч... Сярод ночы...
- Чаму я расказаў? - Яраш як бы задумаўся на хвіліну. - Учора я спаткаў Зосю.
- Савіч?! - Кірыла пераскочыў вогнішча. - Дзе? Чакай. Ты ж казаў, што дачка Савіча загінула.
- Так я думаў семнаццаць год.
- Ну і ну! Дзе ты яе спаткаў?
- У бальніцы.
- Хворая? Чакай. Калі хавалі Савіча?
- У маі сорак трэцяга.
- З верасня да мая яна павінна была даведацца, хто ж яе бацька. Трэба распытаць яе.

- Ніякіх роспытаў. Да аперацыі. Я буду аперыраваць яе. Набыты парок...
- Сэрца? - Кірыла свіснуў. - А раптам зарэжаш?
Яраш уздрыгнуў і адказаў жорстка, злосна:
- Дурань! Я нікога не рэжу. Я лячу. - І, напэўна, адчуўшы, што сказаў груба, прапанаваў па-сяброўску цёпла: - Хадзем на луг. Сустрэнем сонца.

**6**

Славік Шыковіч стаяў на прывакзальнай плошчы з дзвюма дзяўчынамі, размаляванымі пад кінаактрыс: стракатыя спаднічкі-парасоны, адмыслова вымеражаваныя кофтачкі, прычоскі «я ў мамы дурачка». Абедзве рудзенькія, вымытыя хной. Славік круціў у руках ланцужок з ключамі ад аўтамашыны і нешта расказваў, але не вельмі вясёлае. Хіхікала і то, відаць, больш з ветлівасці адна дзяўчына. Другая пазяхала і зіркала ў бакі: шукала некага другога. Славік адчуваў, што крыніца яго дасціпнасці высыхае, і злаваўся. Было душна і сумна. Хацелася пайсці ў рэстаран. Але грошай - ні капейкі. Нават не было на аўтобус, каб паехаць на дачу да бацькоў. Ды і сумна там, на дачы. Усе захапляюцца: «Ах, які лес! Які луг! Рака!» А яму сумна. Ну, добра, у рацэ можна пакупацца. А далей што? Злосны ён на бацькоў. Сёння асабліва. Збудавалі дачу, напіхалі панчоху грошай... А ён працуе і мусіць харчавацца ў рабочай сталоўцы. Крыўдна, што і маці цяпер ва ўсім згаджаецца з бацькам. Нічым яе не разжаласціш.
Сумна. Трэба неяк адкруціцца ад гэтых вясталак. І раптам Славік убачыў Тараса. Пазнаў цераз плошчу. Той стаяў на супынцы загарадных аўтобусаў збоку вялікай чаргі.
- Ша, лэдзі! Бачу аднаго прадстаўніка будучага грамадства. Пайду раздабуду на сённяшні дзень. Чакайце.
Ён пашыбаваў цераз плошчу, не звяртаючы ўвагі на машыны.
- Хэло, містэр Ганчароў, - шумна прывітаўся Славік.
- Здароў, таварыш Шыковіч. - Тарас усміхнуўся, як усміхаюцца дарослыя, назіраючы забаўкі дзяцей.
Калгасніцы з чаргі зацікаўлена і зняважліва глядзелі на хлопца ў вузенькіх штоніках, стракатай кашулі, з матузкамі на шыі, сцягнутымі бляшкай.
Славік трохі сумеўся ад гэтых позіркаў. Недурны хлопец, ён адразу адчуў, што тут не месца для крыўляння і галёкання. Загаварыў проста, грубавата. Паказаў на турысцкі мяшок, што стаяў каля ног у Тараса.
- Куды з такім «гумном»?
- Да сваіх.
- Клапатлівы сын паважаных бацькоў.
Старая жанчына не вытрымала:
- Па табе хлопчык, відаць, што ты такога «гумна» не павязеш сваім бацькам.
- Твайго Яраша возіць мой бохан на машыне. І яны не прыязджаюць пустымі.
Па чарзе пракаціўся шэпт:
«Яраша? Якога Яраша? Таго? Доктара? Сын? Каторы?»
Славік узяў Тараса пад руку, кіўком галавы запрашаючы адысці. Тарас папрасіў жанчын папільнаваць мяшок і чаргу.
Не надта блізка знаёмы яны. Калі пасябравалі сем'і, Тарас быў у арміі. Вярнуўся - пайшоў на завод. Славік у гэты час канчаў дзесяты клас. Толькі вось на дачы пазнаёміліся больш-менш. А таму Славіку пры ўсёй яго бесцырымоннасці нялёгка было папрасіць грошай у гэтага спакойнага, старэйшага па ўзросту хлопца.
Тарас дастаў пачак «Беламора», прапанаваў запаліць.
- О, ты глядзі! Не ведаў, што сябры камбрыгад паляць.
Ведаў. Усё ведаў. Але за жарцікі лягчэй схаваць сваю збянтэжанасць.
- А што мы, незямныя? - Тарас пстрыкнуў перад Славікавым тварам запальнічкай, даючы прыпаліць.
- А скажы шчыра, сумна ў такой брыгадзе?
- Дзіўныя ў цябе ўяўленні, работнік тэлестудыі. Чаму сумна? Сумна хараша працаваць?
- Не жыве ж чалавек адной працай! А гэты рэгламент... Не выпі, не запалі, не вылайся, не прыцісні дзяўчыну... Мы здымалі для хронікі брыгаду на швейнай. Манахіні. Далібог. У кожным пакоі абавязацельствы вісяць. Наведваць тэхвучобу, хадзіць у кіно, у музеі. У якія музеі, калі ў

нас адзін, краязнаўчы? Чытаць газеты... Узорна прыбіраць у пакоі... Не хапала толькі - чысціць зубы... Нудна!
- Не ведаю, што там, на швейнай. А ў нас брыгада - што трэба. І адпачываем мы весялей за другіх.
- Але ж выпіць - ні-ні?
- Калі ёсць прычына...
- Ну-у? Можна, значыцца? Прыма. А ў рэстаран можаш пайсці?
- А хіба ў рэстаране толькі п'юць? Можна паабедаць.
- Геніяльная мысля! Культурна паабедаць! Ты ведаеш, я галодны, як дыназаўр. Раніцай як напіўся чаю...
Тарас сумеўся. Хацелася хутчэй да сваіх. За тыдзень ён засумаваў па Віцю, Наташы, па бацьку, па Галіне Адамаўне. Яраша і цяпер, дарослы, Тарас клікаў бацькам. Жонку яго як адмовіўся назваць мамай у першы дзень яе з'яўлення шаснаццаць год назад, так ніколі і не называў. Але любіў, як маці. З гадамі мацней адчуваў удзячнасць, што яны выхавалі яго вось такім... Вось такім - таварыскім хлопцам, калектывістам. Калі Слава сапраўды галодны, не можа ён, Тарас, маючы грошы, не накарміць яго. Праўда, чамусьці той пачаў не з абеду, а з выпіўкі... Тарас ненавідзеў гэтых васемнаццацігадовых наведвальнікаў рэстаранаў, што п'юць за бацькавы грошы. Але ніхто не казаў, што Слава такі. Ды і Шыковіч не такі, каб даваць волю і лішнія грошы. Можа, наадварот, празмерная строгасць бацькоў давяла, што ў сына няма на абед.
Тарас перавёў позірк з правага крыла вакзала, дзе размяшчаўся рэстаран, на чаргу.
Славік хмыкнуў.
- Баішся?
- Чаго?
- Убачыць хто з завода - распішуць заўтра на ўсіх сценах... Закрычаць з трыбун. Брыгадзір Тарас Ганчароў...
- Глупства.
- То чаму ты азіраешся? Баішся зайсці ў рэстаран, каб паабедаць за сумленна запрацаваныя грошы? Ох, жыццё!
Тарас добра разумеў, што Славік знарок падбівае яго, цешыўся з такой наіўнасці і дараваў: на якія хітрыкі не ідзе галодны чалавек!
- Прапушчу чаргу, калі я потым дабяруся да сваіх?
- У гэты аўтобус ты ўсё адно не ўваб'ешся. А ўлезеш - патрушчаць рэбры.
- Ну добра. Пайшлі.
Тарас вярнуўся да чаргі, узяў свой рукзак. Але ўжо праз хвіліну пашкадаваў, што згадзіўся. Слава не пайшоў проста да рэстарана, а павярнуў да клуба. Наблізіўшыся, спытаў:
- Бачыш, стаяць? Шык! Мае знаёмыя. Возьмем?
Крыкліва апранутыя дзяўчаты не спадабаліся Тарасу, хоць да любога адзення ён ставіўся даволі прымірэнча. Слова вырвалася само, можа, не зусім нават тое, якое патрэбна было сказаць:
- Вульгарныя.
Славік засмяяўся і, не дайшоўшы да дзяўчат, крыкнуў ім:
- Лэдзі! Тарас кажа, што вы вульгарныя. Гуд бай! - і павярнуў у бок вакзала.
- Хамло твой Тарас! І ты разам з ім! - крыкнула адна з дзяўчат.
Кроў ударыла ў галаву так, што зазвінела ў вушах. Тарас пачырванеў, потым пабялеў. Ніколі ён не паводзіў сябе так з дзяўчатамі. І ніколі не трапляў у такое скандальнае становішча. Здавалася, уся плошча глядзіць на іх. Міліцыянер падыдзе зараз... Спытае... Варта паслаць да д'ябла гэтага бессаромнага шчанюка з яго рэстаранам!.. Але яшчэ і гэты крыкне што ўслед. А як вярнуцца цяпер у чаргу? Акрамя ўсяго, нечым ён прыцягвае да сябе, гэты Славік. Хочацца пазнаць яго лепш.
Вось як ён спакойна нейтралізаваў выкрык дзяўчыны:
- Мяшчанкі. Адкуль выплывае столькі дрэні?
«Але навошта ты водзішся з гэтай дрэнню?» Тарас ішоў злосны і зацікаўлены.
Селі за столік каля акна. На першым пуці стаяў дальні цягнік. На пероне - бегатня, крыкі. Каля буфетаў тоўпіліся пасажыры. А сталы пустыя.
Славік грэбліва змахнуў крошкі, завярнуў рог запэцканага абруса.
- Думаеш, тут можна культурна паабедаць? Шыш.

Тут, у рэстаране, ён пераўтварыўся: стаў сур'ёзны і паважны. Кіўком пальца паклікаў афіцыянтку і, пакуль тая без спеху падыходзіла, разгарнуў цяжкую, зашмальцаваную, з пабляклым золатам літар дэрмацінавую вокладку, у якой быў укладзены адзін лісток меню.
- Пачнём, Валя...
Дзяўчына, выцягнуўшы кніжачку і агрызак карандаша, перасмыкнулася:.
- Усім вам сніцца Валя.
- Ах, Марынка? Прабач, Марына. - Усмешка і тут жа суровасць. - Пачнём, Марына, з таго, што... заменім абрус! Што гэта за ануча? Сорам. Рэстаран называецца. Май на ўвазе, гэта - Тарас Ганчароў.
Дзяўчына глянула на Тараса і паслухмяна пачала збіраць са стала келіхі і шклянкі. Тараса абурыў тон, якім Славік размаўляў з ёй. «Скажы, калі ласка, які Сціва Аблонскі! А пры чым тут маё імя? Не, не таму, што галодны, цягнуў ты ў рэстаран. Парысавацца захацеў. Здзівіць мяне. Хлапчук».
Калі дзяўчына пабегла па чысты абрус, ён сказаў узлавана:
- Слухай. Калі ты будзеш вось так, я пайду. Не люблю гэтых рэстаранных конікаў.
- А што? - здавалася, зусім шчыра здзівіўся Славік. - Няхай думае, што ты чэмпіён. Яны любяць чэмпіёнаў. Лепш абслужыць.
Ён вывучаў меню. Моршчыўся, круціў галавой.
- Адна свініна ды рыбныя кансервы.
- А табе вустрыц захацелася?
Славік зразумеў іронію, і яму не спадабалася яна. Бліснуў вачамі.
- Хаця б чалавечага мяса. - І засмяяўся са свайго недарэчнага жарту. - Вустрыцы! Гурка свежага няма. А на рынку іх поўна ўжо.
- На рынку ёсць, - згадзіўся Тарас. - Я вось вязу.
- Сур'ёзна? Кладзі на стол. А то Яраш плюс Шыковічы ўсё з'ядуць. Калгасам жывуць. І апетыт у іх там...
- Няёмка.
- Усё ёмка. Давай сюды!
Ён сапраўды гіпнатызаваў сваёй здзіўляючай незалежнасцю. Ён амаль загадваў. Тарас у душы пратэставаў, але падпарадкаваўся. Развязаў мяшок і падаў паўдзесятка маладзенькіх зялёных гурочкаў.
Славік перадаў іх афіцыянтцы, якая засцяліла чысты абрус, паставіла чаркі, з усмешкай слухаючы іх размову.
- Марына! Памыць. Але не рэзаць. А то кухар палавіну сажрэ. Цэленькія. Аздобіць цыбулькай. Асобна смятану. Колькі? Шклянку смятаны. Дырэктару скажы: няхай пасыпле галаву попелам. Ад ганьбы, што наведвальнікі прыходзяць са сваімі гуркамі. Вось так, - зняважлівым рухам ён шыбнуў на акно меню, як непатрэбную рэч. - Адбіўныя.
- Колькі?
- Дзесяць. Восем з'ясі сама, - ён жартаваў груба, панура, без усмешкі, і гэта таксама абурала Тараса. - Каньяку трыста.
- Толькі па сто.
- Толькі? А ты зрабі па трыста. Вады далі. І закон не парушаны. І мы задаволены.
Афіцыянтка засмяялася і пайшла.
Паводзіны Славіка і абуралі, і забаўлялі.
«Аблонскі! Далібог жа. Вось тып. Хаця б спытаў, ці ёсць у мяне грошы на каньяк».
- Ты чуў? Толькі па сто.
- Правільна. Трэба змагацца...
- З чым? Кінь. Усё гэта ханжаства дзядзькоў, якія п'юць дома.
- Ну, ведаеш, дай волю такім, як ты... Наліжуцца.
- Наліжуся. Бо не выхавана культура піцця. У Парыжы дзесяць тысяч кафэ - і п'яных няма.
- Хто табе сказаў?
- Чытаў. А ў нас тры рэстараны. А налізваюцца штовечар.
«Ах, вось дзе тваё нутро вылазіць. Рэстаранаў мала. У Парыж табе хочацца», - з пагардай падумаў Тарас, але з-за далікатнасці сказаў больш мякка:
- Хто налізваецца? Хто за бацькавы грошы п'е. А калі чалавек мазалём зарабляе... Я не бачыў сярод рабочага класа...

- Кінь. - Вочы Славіка непрыгожа і злосна звузіліся, ён натапырыўся і стаў падобны на маленькага драпежніка са сваімі каротка падстрыжанымі, непакорлівымі валасамі. - І потым не рабі хоць ты гэтага ідыёцкага дзялення: ты - клас, а я - не клас. А я хто? Я таксама зарабляю свае пяцьдзесят шэсць рублёў. І адрозніваюся ад цябе адным... Табе ўсё падабаецца, ты ўсім задаволены... А я крытыкую ўсё...
- Вось іменна, усё.
- Не лаві на слове. Гагарын паляцеў - я на галаве хадзіў на студыі. Ад захаплення. Крытыкую тое, што не падабаецца мне.
- Дрэннае і я крытыкую. Толькі не ў рэстаранах.
- А дзе? На сходзе? Не люблю сходаў.
Тарас адкінуў далікатнасць, спытаў з'едліва:
- А што ты любіш, парыжскія кафэ?
Славік, разявіўшы рот, змоўк. Паглядзеў на Тараса так, быццам убачыў упершыню.
- Ты ведаеш, што за такія словы б'юць па мордзе?
- Заела?
- Але чорт з табой. Слухай крамольныя думкі далей. Не люблю, калі атлусцелыя дзядзькі пачынаюць мяне вучыць...
Тараса пачала раздражняць Славікава прэтэнзія на глыбакадумнасць і разважлівасць. Ён адчуваў, што гэта нават не перакананні, а проста так - модная гульня. Эклектычны набор чужых думак. Тарасу не хацелася тут, у рэстаране, пачынаць сур'ёзную спрэчку, і ён стрымліваў сябе. Але тое, што сказаў Славік пра настаўнікаў, яго проста-такі ўзарвала.
- Хто гэта «атлусцелыя дзядзькі»? Бацька твой, Яраш атлусцелы?.. Майго бацьку фашысты павесілі. Ён таксама не прыдатны табе ў настаўнікі? Ты...
Тарас гаварыў горача, усхвалявана, хоць і не на поўны голас. Але словы яго, відаць, пачулі многія. На іх пачалі звяртаць увагу. Першы гэта прыкмеціў Славік. Азірнуўся насцярожана, прашаптаў добразычліва:
- Цішэй.
Тарас схамянуўся.
Па радыё абвясцілі, што да адыходу хуткага цягніка «Кіеў - Ленінград» засталася адна хвіліна. Пасажыры паспешліва пакідалі залу рэстарана. На пероне жаночы голас прасіў: «Бора, пішы! Кожны дзень пішы!» Другі, мужчынскі: «Мама, пацалуй Аньку за мяне!»
Тарас глядзеў за акно, на зялёны вагон з шырокімі вокнамі. У адным акне - дзявочы твар, прыгожы і сумны. Тарасу стала шкада яе:
«Чаму яна такая сумная? Не трэба, слаўная дзяўчына. Жыццё прыгожае. І ў ім многа радасці. Каб я мог падараваць табе радасць...»
Вагон ціха паплыў. Дзяўчына сустрэлася з яго позіркам. Ён усміхнуўся ёй і развітальна памахаў рукой. Яму таксама зрабілася трошкі сумна. Плылі вагоны. Вокны. Твары. Многа твараў. Усё хутчэй, хутчэй... А ён, заварожаны, бачыў усё той жа дзявочы твар. Ён быў летуценнік і фантазёр - уяўляў будучую сустрэчу з незнаёмкай. Калі нарэшце Славік адарваў яго ад акна, Тарас убачыў, што на стале стаіць графінчык з каньяком, гуркі, бутэлька нарзану.
- Пра што задумаўся, маэстра?
- Ды вось думаю, чаму ў разумных бацькоў растуць такія дзеці?..
- Дурныя, хочаш сказаць? І маеш на ўвазе мяне? Добра. Вып'ем і паразважаем на гэтую тэму.
Славік звыкла прыгожым рухам наліў у чаркі, падсунуў Тарасу гуркі. Узняў сваю чарку, прыжмурыўшы вочы, палюбаваўся на бурштынавую вадкасць.
- Будзь здароў, камбрыгадзір! - і, не чокнуўшыся, асушыў чарку да дна. Гурок узяў рукой і смачна захрумстаў. Усё ў яго выходзіла вельмі натуральна.
Тарас выпіў паўчаркі, разрэзаў гурок тупым нажом, пасыпаў солі - па-дамашняму, грунтоўна. І, аднак, сам адчуваў сваю нязграбнасць у параўнанні са Славікам. Рукі, такія хуткія і ўмелыя на зборцы машын, тут як бы выйшлі з-пад улады. Гэта трохі выбівала з каляіны. Глушыла дасціпнасць у адказах на лёгкую балбатню Славіка. А той зноў наліў сабе да ўзроўню - колькі засталося ў Тараса, але не выпіў. Заціснуў чарку ў далоні, нахіліўся над сталом. Шчокі яго заружавеліся, вочы сталі масляністыя і больш шырокія, а то ён усё прыжмурваў іх. Голас панізіў да шэпту:

- А ты лічыш, мае бацькі разумныя? А я думаю, каб гэта было так, яны сумелі б выхаваць мяне інакш. Думаеш, лёгка мне, што я боўтаюся цяпер?..
Тараса здзівіла і насцярожыла такая нечаканая самакрытычнасць. Шчыра гэта ці зноў пазёрства?
- Сын журналіста, пісьменніка. Паважанага ў горадзе чалавека. Хоць кім паважанага? Чуў у чарзе? Ведаюць Яраша, і ніхто не ведае Шыковіча. Хто чытае сумныя фельетоны і нарысы! Але я рос пад бацькавай славай, як пад парасонам. Бохан прыходзіў у школу, выступаў - вучні раўлі ад захаплення. А я задзіраў нос: ні ў каго няма такога таты!.. Усё мне было дазволена. Тут ужо маці старалася што ёсць сілы, каб я купаўся, як той сыр у масле. А потым раптам ажылі бацькы прынцыповасці. У першую чаргу - у бохана.
- Пасаромейся! - не вытрымаў Тарас. - Дзе ты выкапаў такое дзікае слова?
Славік усміхнуўся, пакруціў галавой:
- Маралісты вы ўсе, - і выплеснуў у рот каньяк. - Ну, у таты, у папы. У радзіцеля. Як хочаш... дык вось... Другія плявалі на прынцыповасць, на мараль і паўладкоўвалі свае чады ў інстытут. А мой: «Пойдзеш на завод». Не хачу на завод. Хачу на тэлестудыю. Буду рыхтавацца ў кінаінстытут. Тут, безумоўна, мама на дапамогу: «Можа, у хлопчыка талент». І бацька адступае. Перад талентам. І лёгка ўладжвае хлопчыка на тэлестудыю. І вось ён асістэнт апаратара. Як гучыць! А-а? У непісьменных дурніц галава пачынае кружыцца, калі пачуюць такую прафесію. А асістэнт перастаўляе лямпы, чысціць камеры... Пільнуе бацькаву кватэру... І харчуецца ў сталоўцы. На большае не хапае... А бацька не дае. Усё тыя ж бацькы прынцыповасці... А сябра камбрыгады Ганчароў называе гэта праявай вялікага розуму.
- А ты хацеў бы, каб табе адвальвалі па тысячы.
- Чаго я хацеў бы? - Славік даліў Тарасаву чарку, наліў сабе, адрэзаў кавалак адбіўной. - Віп'ю за цябе. Ты шчаслівы чалавек. У цябе многа жаданняў. - Выпіў. - А я... я нічога не хачу. Адзінае хіба - у космас куды-небудзь паляцець.
- Туды дурняў не пускаюць.
- Дзякую за даведку. Мне нават у інстытут расхацелася. Які ў мяне талент! А рамеснікаў хапае без мяне. З людзей, якіх лічаць таленавітымі, я паважаю толькі двух - твайго прыёмнага і нашага сталяра дзядзьку Атроха. Яраш можа вытрыбушыць чалавека, і той застанецца жывы. Гэта нешта значыць. А што вунь мой татулька... Напускае на сябе скромнасць: адзін сядзіць на перыферыі. А лічыць сябе, безумоўна, лепшым за сталічных. А я пачаў чытаць яго апошнюю аповесць і заснуў на семнаццатай старонцы. Калгас. Даяркі. Па-мойму, калі ты ўжо ўзяўся пісаць, дык пішы, як Рэмарк...
- Па-твойму, вышэй за Рэмарка няма пісьменнікаў?
- Ведаю. Ведаю. Талстой. Чэхаў... Колас. - Славік узлаваўся чамусьці. - Яны набілі мне аскоміну ў школе.
- Ты ж ніколі іх сур'ёзна не чытаў.
- А навошта?
- Што ж цябе ў Рэмарка захапіла? Кальвадос?
- Што?
Але гэты юны нігіліст добра засвоіў галоўны сакрэт абароны. Успомніўшы, што такое кальвадос, тыркнуў у Тарасавы грудзі пальцам:
- Вось дзе ваша ханжаства. Самі чытаеце пад коўдрай... Глытаеце... Смакуеце... А потым робіце посныя фізіяноміі. «Рэмаркізм заражае моладзь». Ты сур'ёзна думаеш, што я магу нечым заразіцца?
Гэта ўжо было падобна на п'яны выклік, і Тарас, замест адказу, паклікаў афіцыянтку, каб разлічыцца.
- Закажы нашага кальвадоса, - прымірэнча сказаў Славік.
- Не. Мне трэба ехаць.
- Ну чорт з табой.
Тарасу спадабалася такая падзяка за пачастунак, і ён весела засмяяўся. Усё-такі ён цікавы хлопец, гэты Славік. Але ў галаве яго - куча смецця.
Наташка радасна крыкнула:
- Мама! Тарас прыехаў! - кінулася насустрач брату, павісла на шыі, пацалавала. І адскочыла, здзіўленая. Нахмурылася. І тут жа выдала: - Мама! Тарас п'яны.
- Што ты выдумала. Які я п'яны?

- Але выпіў.
- Выпіў, - з вінаватай усмешкай прызнаўся Тарас, вітаючыся з жанчынамі.
Галіна Адамаўна ласкава і дакорліва паківала галавой:
- Тарас!
Валянціна Андрэеўна, любуючыся хлопцам, сказала:
- Што вы апякаеце яго, як маленькага? Ах, які страх, чарку ўзяў рабочы чалавек! Мала якая прычына магла быць.
- Я Славіка сустрэў. І ён зацягнуў мяне ў рэстаран.
Усмешка знікла з твару жанчыны.
- Славік зацягнуў? - І ў голасе яе прагучала недаверлівасць. - Як магло здарыцца, што мой сын зацягнуў цябе, старэйшага на пяць год?
- Сказаў, што галодны, з раніцы нічога не еў. А па-мойму, схлусіў. У рэстаране ён часты госць. Усіх афіцыянтак ведае.
- Афіцыянтак? - Валянціна Андрэеўна адразу змянілася з твару. Не, не пабялела і не пачырванела. А неяк стала непадобнай на самую сябе, заўсёды добрую, вясёлую. Нешта жорсткае, калючае з'явілася ў яе твары. Можа, адчуўшы гэта, яна вінавата ўсміхнулася, прыгладзіла валасы на скронях. Нічога не стала распытваць. Сказала: - Адбіваецца хлопец ад рук. Трэба прасачыць.
Яна была аб'ектыўны і разумны педагог. Але ў першую чаргу - маці. Як педагог паверыла Тарасу. Як маці адчула непрыязь да яго. Яна заўсёды любавалася прыёмным сынам Яраша, ставіла ў прыклад сваім дзецям. А цяпер падумала: «Грубаваты хлопец, недалікатны. Таварыскай салідарнасці не мае. Калі ўжо разам былі, прамаўчы».
Несвядомы парыў мацярынскай душы: пачула дрэннае пра сына - хочацца, каб і на другіх былі плямы.
Хутка Валянціна Андрэеўна выдумала нейкую прычыну і пайшла ў хату.
Галіна Адамаўна, якая адчула гэтую змену ў настроі сяброўкі, з дакорам сказала Тарасу:
- Нядобра так... Трэба разумець, што маці чуць такое балюча. Ты мог бы і памаўчаць.
- Ды нельга маўчаць, Галіна Адамаўна! - запярэчыў Тарас. - Каб вы ведалі, як ён паводзіў сябе і якую лухту гарадзіў. Ва ўсім расчараваўся, усё яму абрыдла, усё не падабаецца. А мы будзем глядзець і маўчаць? У нас часта так робяць. Ад бацькоў хаваць, ад грамадскасці... Пакуль чалавек не апынецца ў балоце. Тады будзем ахаць. Не. Я знарок. Яшчэ Кірылу Васільевічу скажу. Няхай ён пацікавіцца, чым там камсамол займаецца на студыі.
- А сам піў з ім, - усё яшчэ хмурылася Наташа.
- Не сунь носа ў мужчынскія справы! - асек яе Віця.
- Фу, мужчыны! - зняважліва фыркнула дзяўчынка і паскакала на адной назе да ручая.
- Піў я дарэмна, - разважліва згадзіўся Тарас, звяртаючыся да Галіны Адамаўны. - Але каб вы бачылі, як ён умее заказваць. Сціва Аблонскі! Калі ён схлусіў, што ў яго ні капейкі грошай, баюся, што наліжацца. І, чаго добрага, накуралесіць.
Выпіўшы з Тарасам дзве трэці ад заказаных трохсот грамаў, Славік хадзіў і шукаў, за чый кошт пажывіцца яшчэ. І знайшоў у парку. Адзін графаман страшэнна хацеў надрукавацца ў газеце. Ведаючы, што лёс яго вершаў залежыць ад кансультацыі Шыковіча, ён настойліва шукаў сцежку да яго «чэрствага сэрца». Падвярнуўся сын Шыковіча. Што ж, можна паспрабаваць зрабіць і такі ход, тым больш што хлапчына працуе на тэлестудыі: там таксама можа спатрэбіцца пратэкцыя.
Працу сваю малады Шыковіч любіў. Але пасля таго як высмеяў сваё асістэнцтва перад Тарасам, пасада сапраўды здалася яму мізэрнай і смешнай. Падвыпіўшы, ён вырашыў на работу не ісці. Адбудзецца перадача і без яго.
Пасля шчодрага пачастунку графамана ў Славіка пачало дваіцца ў вачах. Насупраць сядзелі два «вялікія паэты». Падавалі дзве «каралевы» з каронамі на галаве. А міма адкрытай пляцоўкі летняга рэстарана хадзіла то двое, то цэлы атрад дружыннікаў. Славік баяўся дружыннікаў больш, чым міліцыі.
Прыйшло ў галаву, што яны пільнуюць яго. Таму ў хвіліну прасвятлення ён уцёк ад «вялікага паэта», які ўвесь вечар чытаў вершы. Нырнуў у кусты, выйшаў цераз глухія вароты з парку і з найлепшым намерам - пільнаваць кватэру, каб не залезлі зладзеі, - ішоў дадому. Але, на няшчасце, кватэра яго была побач з гатэлем.
У гэты абласны горад не так часта заязджаюць замежныя турысты. Але ў той летні вечар спыніліся праездам з поўдня ў Ленінград ангельскія студэнты. На дзвюх вялікіх старамодных

машынах. Машыны сабралі цэлы натоўп зявак. Славік, безумоўна, адразу далучыўся да іх. П'янаму, калі ён даведаўся, што гэта ангельскія студэнты, страшэнна захацелася абмеркаваць з імі некаторыя міжнародныя праблемы. Пайшоў шукаць гасцей. Яны вячэралі ў рэстаране. Славіка не пусцілі туды. Гэта яшчэ больш распаліла, раззлавала яго, умацавала рашучасць дабрацца да турыстаў любым чынам. Ён пралез у рэстаран праз кухню, ведаў усе хады і выхады - жыў побач, часам, па даручэнню маці, купляў абеды на дом.
Ён шумна прывітаў ангельцаў. Тыя ўзрадаваліся выпадку пазнаёміцца з савецкім юнаком і запрасілі яго к сталу. Але ангельскую мову Славік вучыў - абы выцягнуць на тройку. Ды і тое, што вывучыў, за год забыўся. Вымаўленне ў яго было жахлівае. Запас слоў бедны. Ды яшчэ да таго ж ап'яненне. Хацеў сказаць адно, а выходзіла зусім другое, супрацьлеглае. Пры ўсёй сваёй стрыманасці і паважнасці ангельцы не вытрымалі. Моладзь ёсць моладзь. Спачатку - ветлівы смех, потым - выбухі рогату. Гэты рогат абразіў Славіка. Ён хоча пагутарыць зусім сур'ёзна, даведацца, напрыклад, што яны думаюць пра вайну і мір, а яны - вось як, рагочуць... Чакайце ж! І Славік перайшоў на родную мову:
- Чаму ржаце, як шатландскія жарабцы? Чэрці рыжыя! Шпіёніць прыехалі? Куды атамную бомбу скінуць? Дык мы на вас дзесяць скінем! І ад вашага задрыпанага вострава не застанецца мокрага месца!
Па-ангельску ангельцы не разумелі, па-расейску зразумелі. Усхапіліся ўсе адразу. Не столькі ад абурэння, колькі ад нечаканасці, ад боязі скандалу. Абурыліся наведвальнікі. Усхадзілася ўся прыслуга рэстарана. Ветліва, пад ручкі, вывелі Славіка з гатэля і перадалі дружыннікам. Тыя не былі такімі ветлівымі і, калі Славік пачаў куралесіць, далі кухталёў.
Прачнуўся хлопец у працвярэзніку. Балела галава і ўсё цела. Прыгадаў, што натварыў, і адразу ўявіў маці, як яна будзе перажываць. І хацелася яму... не, не памерці, а збегчы на край свету. Але яго нікуды не пусцілі. Павялі ў народны суд. Вось тут Славіку хацелася памерці. Суддзя - іх знаёмая, Зоя Цімафееўна. Жылі ў адным доме. У госці прыходзіла, у лес разам ездзілі. Славік глядзеў на яе з надзеяй, з маленнем: злітуйся, усё жыццё буду дзякаваць.
Але поўная, з шырокім добрым тварам жанчына толькі на нейкі момант глыбока задумалася. А потым без лішніх роспытаў і натацый прачытала прыгавор: дзесяць сутак.
**7**
Гукану далажыў пра выпадак з Шыковічам-малодшым начальнік міліцыі. Старшыня выканкома выслухаў спакойна, як быццам нават без цікавасці. Цяжка ўздыхнуў пад канец: што толькі ні валіцца на яго палыселую галаву, усім трэба займацца. Спытаў філасофскі разважліва:
- Скажы мне, Сізоненка, хто вінаваты, што растуць вось такія?..
Падпалкоўнік чвэрць стагоддзя праслужыў у міліцыі і навучыўся з незвычайнай праніклівасцю адгадваць, які адказ патрэбны начальству ў той ці іншы момант. Толькі з Гуканам у яго гэта не выходзіла. Гукана немагчыма было раскусіць. Пры суровасці на твары ён нечакана выяўляўся добрым і ласкавым, калі пачынаў нешта вырашаць. І наадварот, пры знешняй весялосці і ветлівасці аказваўся дужа круты.
Сізоненка ўспомніў, што сустрэў яго старшыня жартам. Але ад міліцэйскіх спраў твар яго ўсё больш і больш выцягваўся, некуды ў падброўе схаваліся зеленаватыя вочы. Спытаў ён, не ўзнімаючы галавы ад папер. Таму Сізоненка пачаў манеўраваць:
- Усе патроху.
- Хто?
- Школа. Камсамол. Мы.
- Хто «мы»?
- Міліцыя, я маю на ўвазе. Не праводзім прафілактычных мер... Лібералънічаем.
- А бацькі? - Гукан узняў галаву.
Сізоненка ўпотай назваў сябе дурнем: заняўся самакрытыкай, чурбан! А патрэбны зусім просты адказ.
- Бацькі - гэта само сабой... У першую чаргу, безумоўна, бацькі.
- Правільна. У першую чаргу, - згадзіўся Гукан.
І больш ні слова пра гэта. Былі другія справы.
Але калі начальнік міліцыі пайшоў, Сямён Парфёнавіч падняўся з-за стала, на сярэдзіне кабінета смачна пацягнуўся і бадзёра прысеў разы два, узмахваючы рукамі. Ён нярэдка рабіў такую размінку, але тэмп яе заўсёды залежаў ад настрою: чым вышэй настрой - тым хутчэй рухі. Потым

падышоў да акна, палюбаваўся на свае каштаны. Цудоўныя каштаны! Толькі гэты аднарукі «прынцыпал» на злосць яму, Гукану, шморгае лісце. Цэлую галіну абарваў. Двойчы ўжо яны пасварыліся з-за каштана. Але гэтаму ўпартаму д'яблу лепш нічога не казаць. Вось жа даў бог намесніка. І за яго гарой Тарасаў.
«Разумны ты чалавек, Сяргей Сяргеевіч, але не на тых людзей арыентуешся».
Гукан падышоў да тэлефона і набраў нумар сакратара гаркома.
- Адзін? - Яны ўжо бачыліся сёння.
- Калі я бываю адзін. Асвета вось сядзіць. Думаем разам. Сядзім і думаем. А работа стаіць, - як заўсёды, з гумарам адказаў Тарасаў.
- Ты чуў, што натварыў сын Шыковіча? Чорт ведае што! Міжнародны скандал.
Тарасаву за дзве гадзіны працы ўжо трэці чалавек расказваў пра гэты выпадак. Скажы, калі ласка, якая падзея дня! І вось тут, у званку Гукана, ён адчуў некаторае нездаровае смакаванне факта. Зразумеў, каб гэта быў любы малады шалапут, наўрад ці надавалі б гэтаму столькі ўвагі. Але сын Шыковіча... Таму сакратар адказаў зноў-такі з гумарам:
- Міжнародны, кажаш? Няўжо можа быць разрыў дыпламатычных адносін?
Гукан асекся. Непрыязна падумаў: «На жартачкі збівае. Выгарадзіць хоча».
- Ты не жартуй. Факт непрыемны.
- А я што кажу, радасны?
- Пагражаць атамнай бомбай гасцям! Што яны падумаюць пра нас?
- Калі ворагі, дык яны даўно ўжо думаюць... А калі сябры, то адзін дурань...
- Не. Па закону аб забароне прапаганды вайны трэба сукінага сына судзіць...
- Вось як! - Тарасаў як бы здзівіўся. - Думаю, нікога яшчэ не судзілі па гэтаму закону. Не будзем і мы шукаць у сябе падпальшчыкаў вайны. Згодзен?
Гукан сам зразумеў, што сказаў глупства. Але гэтая манера сакратара, гэты яго няўлоўны гумар - «Згодзен?» - не першы раз ужо выводзілі Сямёна Парфёнавіча з сябе. На дзесяць год малодшы, а размаўляе з ім, старым чалавекам, вопытным работнікам, як з малым.
- Хопіць гэтаму «падпальшчыку» дзесяць сутак. Няхай падмяце дарожкі ў парку. А то яны засмечаны ў цябе. Брыдка хадзіць.
«У мяне. Усё ў мяне. А ў цябе што?» - зноў раздражнёна падумаў Гукан і выказаў сваю думку больш катэгарычна:
- Няма адказнасці ў бацькоў...
- Вось гэта правільна! - адгукнуўся ў слухаўку Тарасаў. - Бацькі ў нас выхаваннем займаюцца мала.
- Шыковіч прэтэндуе на ролю выхаваценя мас, а ўласнага сына распусціў. Мнагавата мае грошай. Машына. Дача...
А вось гэта Тарасаву не падабалася. Безумоўна, бацька адказвае. Але калі з асобных фактаў пачыналі выводзіць тэорыю, што, маўляў, усе пачварныя з'явы толькі ў асяроддзі дзяцей забяспечаных бацькоў, што ва ўсім вінаваты дабрабыт, - гэта абурала Сяргея Сяргеевіча. Выходзіць, толькі ў беднасці і жабрацтве можна правільна выхоўваць. Глупства!
- Шыковіч палучае ў рэдакцыі столькі ж, колькі ўсе. Па штатнаму расписанню, - холадна адказаў сакратар.
Гукан змаўчаў. Успомніў, як аднойчы ў прыватнай гутарцы Тарасаў сказаў усё з той жа сваёй хітрынкай:
«Ты ж не адмаўляешся ад ганарару за сваю кнігу, хоць пісаў яе не ты?»
Цяпер Сямён Парфёнавіч падумаў:
«Ясна. Стаіць за Шыковіча. Як я не ведаў дагэтуль, што яны так спаяны».
Паспрабаваў змякчыць, каб Тарасаў не падумаў, што ён хоча ўтапіць свайго сааўтара:
- Хоць, безумоўна, за такімі шалапутамі хіба ўсочыш. Добра, што мае ў вайну выраслі. У эвакуацыі. Уведалі і цану хлебу і цану капейкі.
Тарасаў весела крыкнуў у слухаўку:
- Нешта ты, Сямён Парфёнавіч, хістаешся сёння. То валіш усё на бацькоў, то зусім здымаеш з іх віну. Не, бацькоў мы паслухаем. Я ўжо сказаў: сабраць па гораду ўсе падобныя факты паводзін дзяцей камуністаў. І ўсіх бацькоў на адно з чарговых бюро гаркома. У мяне - людзі.
Вось і зразумей яго, гэтага Тарасава!

А бацькі яшчэ нічога не ведалі. Валянціна Андрэеўна засталася на дачы, а Кірыла з самай раніцы забраўся ў партархіў. Пасля Ярашавага расказу жаданне заняцца падполлем, разабрацца ва ўсім аб'ектыўна і напісаць дакументальную кнігу пабольшала. Быў ён часам ленаватым, часам рабіў з халадком, асабліва ў журналістыцы. Але ўжо калі загараўся тэмай, то працаваў як апантаны, па шаснаццаць гадзін у дзень. «Працую, як Бальзак», - жартаўліва хваліўся ён у такія моманты блізкім. Так ён працаваў апошні тыдзень. З раніцы - у архіве, у другой палавіне дня - у рэдакцыі, увечары - дома, прыводзіў у парадак тое, што ўдалося здабыць у архіве. А матэрыялаў там было - непачаты край. Найцікавейшых дакументаў. За шаснаццаць год яны не ўсе нават сістэматызаваны. Штат архіва невялікі, а дакументаў - вагон. Начальнік - стары камуніст Сыраквашка Міна Азаравіч, у мінулым дырэктар музея - больш цікавіўся архівамі грамадзянскай вайны, калі ён сам быў малады і партызаніў на Палессі. Пісаў нейкія ўспаміны. Айчынная вайна ад яго была далей. Па рашэнню абкома ён разам з экспанатамі музея эвакуіраваўся ў самым пачатку яе. Лёс занёс яго ажно ў Новасібірск, дзе яму даручылі ахову эвакуіраваных з Ленінграда партыйных дакументаў.

З'яўленне ў архіве пісьменніка разварушыла маленькага сівага дзядулю. Міна Азаравіч быццам скінуў са сваіх сямідзесяці год пару дзесяткаў. Шмат што з таго, што расказваў пра падполле іх горада Шыковіч, яму, безумоўна, было вядома. Але той добры дзесятак вялікіх пытальнікаў, якія паставіў новы даследчык, запалілі старога архіварыуса. Сапраўды, гэта цікава - адказаць хоць на частку такіх пытанняў. Чаго варта, напрыклад, канчаткова вырашыць, хто ж такі Савіч, якога, між іншым, Сыраквашка добра ведаў - доктар некалі перадаў музею карціну Айвазоўскага.

І начальнік архіва шчыра памагаў Шыковічу ў пошуках.

За першы тыдзень Кірыла перачытаў гару папер, але высветліў нямнога з таго, чаго не ведаў раней. Расшыфраваў толькі адно - склад першага падпольнага гаркома. Спіса нідзе не было, але пры дэталёвым аналізе дакументаў таго часу і ўспамінаў удзельнікаў, напісаных неўзабаве пасля вайны, гэта ўдалося ўстанавіць. Гукан у сваёй кнізе яўна наблытаў: назваў імёны людзей, якіх у той час нават не было ў горадзе. Тут яму даказаць няцяжка. Хоць увогуле чалавек ён упарты. Але нічога, разбярэцца гарком ці абком.

Напярэдадні, разбіраючы матэрыялы партызанскай брыгады «Смерць фашызму», з якой падпольшчыкі трымалі найбольш цесную сувязь, Шыковіч натрапіў на цікавы дакумент. Дзіўны дакумент. Лісток з вучнёўскага сшытка ў касую лінейку. На ім размашыстым почыркам напісана:

«Учора пахавалі таварышаў, якія загінулі ў баі за станцыю.

Няўдача за няўдачай. Настрой у атрадзе цяжкі. Звесткі з Вялікай зямлі таксама не суцяшальныя. Чым падняць настрой людзей?

Сёння з'явіўся таварыш з групы НКВД. Правал у горадзе. Накрылі рацыю, двух арыштавалі. Л. выратаваўся выпадкова. Баюся за Доктара, яны трымалі з ім сувязь.

Папрасі Марусю, каб схадзіла ў горад».

І ўсё. Ні даты, ні подпісу. Што гэта? Пісьмо некаму ці ўрывак з дзённіка? Калі слова «папрасі» напісана правільна, - пісьмо. Але ўвогуле больш падобна на дзённікавы запіс. Магчыма, чалавек у спешцы не дапісаў «ць» - «папрасіць». Але гэта не галоўнае. Не гэта надзвычай зацікавіла і ўсхвалявала Шыковіча. Пісьмаў падобных і дзённікаў партызанскіх ён перачытаў мноства. Адзін сказ прымусіў яго выдзеліць гэты дакумент з усіх іншых: «Баюся за Доктара, яны трымалі з ім сувязь». Доктар - з вялікай літары. Хто ён, гэты Доктар? Сапраўдны доктар ці гэта падпольная клічка? Каб устанавіць ісціну, трэба ведаць, хто і калі пісаў пісьмо ці дзённік.

Шыковіч працаваў у сховішчы, якое змяшчалася ў склепах былога аддзялення банка. Пrasторныя сухія склепы. У першы пасляваенны год камсамольцы разабралі банкаўскія руіны і са старой цэглы на месцы трохпавярховага будынка змуравалі невялікі аднапавярховы асабняк. Рэканструкцыя горада не кранула яго, бо стаяў ён у глыбіні двара, пасярод квартала. Наперадзе вырас чатырохпавярховы дом. А гэты белы домік стаяў у абкружэнні таполяў. Пасаджаныя ў сорак пятым годзе, яны разрасліся ў густы цяністы сквер і ўсё навокал засыпалі пухам квецені.

Шыковіч пайшоў да Сыраквашкі. Праз акно ўбачыў: стары ў белай кашулі сядзеў за сталом і, паглыблены ў працэс творчасці, пісаў, па-дзіцячы высалапіўшы кончык языка. Зрэдку нешта шаптаў. Кірыла любіў назіраць людзей, калі яны заставаліся самі з сабой. Чалавек у такім стане часта ператвараецца ў дзіця, нават тады, калі заняты сур'ёзнай працай. Шкада было турбаваць гэтага добрага дзядулю. Тым больш што Шыковіч за тыдзень ужо вывучыў: раней чым дазволіць

зайсці, Сыраквашка схавае ў шуфляду свой рукапіс, быццам ёсць нешта злачыннае ў тым, што ён піша. Сустрэне нахмураны, незадаволены.
Так і здарылася.
- Што ў вас там яшчэ? - буркнуў загадчык архіва, зачыняючы шуфляду на ключ.
- Міна Азаравіч, скажыце, калі ласка, якая ў вас сістэма падбору дакументаў? Вось на гэтым некалькі нумароў. А ці не сказана дзе-небудзь у вопісу, хто пісаў гэты дакумент? Чаму ён трапіў у гэтую папку, а не ў якую-небудзь другую?
Сыраквашка ўзяў папку, прачытаў напісанае і лёгка свіснуў, ён адразу зразумеў, чаму Шыковіча зацікавіла гэтая маленькая паперка.
- Тут яна, брат, ляжала першапачаткова, тут мы яе і пакінулі. А хто яе пісаў - гэта трэба ўстанавіць.
- Як?
- Самы просты спосаб - па почырку. Шукай гэты ж почырк.
Шыковіч спусціўся ў сховішча і перагартаў усе дакументы брыгады - перапісаныя ад рукі зводкі Саўінфармбюро, загады, рапарты, радыёграмы, данясенні сувязных, «баявыя лісткі», пісьмы, нават інтымныя. Такога почырку больш не сустрэлася. Ён пакінуў архіў расчараваны.
А калі прыйшоў сёння раніцай, Сыраквашка сустрэў яго ў скверыку. У старога быў таямніча-задаволены выгляд. Але сказаў ён толькі ў сваім кабінеце:
- А ў мяне для вас ёсць падаруначак, Кірыла Васільевіч. Я, здаецца, устанавіў, хто пісаў той дакуменцік. Пракоп Варава, першы камісар атрада імя Чапаева.
Шыковіч зразумеў, што заразіў загадчыка архіва сваімі пошукамі, што Сыраквашка стаў яго лепшым памочнікам. Нялёгка было ў сотні папак адшукаць другую паперку, напісаную тым жа почыркам. Мабыць, да позняй ночы сядзеў чалавек у сховішчы, слепячы пры электрасвятле стомленыя слабыя вочы. Але калі Шыковіч горача падзякаваў яму, Міна Азаравіч збянтэжыўся, як дзяўчына.
- Што вы, Кірыла Васільевіч! Мой абавязак. Агульная справа. Вам трэба дзякаваць, што ўзяліся за такую працу.
«Дзіўнае пакаленне! - падумаў Шыковіч, любуючыся на старога камуніста. - Якая адданасць справе! Я ўчора ўвечары купаўся, лавіў рыбу, а ён вось сядзеў, шукаў...» - і яму нават зрабілася ніякавата.
Вараву Шыковіч помніў па кнізе Гукана. Там яму адводзілася некалькі старонак як аднаму з арганізатараў партызанскага атрада імя Чапаева, які потым вырас у праслаўленую брыгаду. Гэта быў цікавы чалавек. Дырэктар кандытарскай фабрыкі, ён яшчэ да акупацыі мясцовасці пайшоў у лес, стварыў атрад. Камандаванне атрадам Варава пасля перадаў маёру-акружэнцу, а сам застаўся камісарам. Дык вунь з кім звязаны гэты таямнічы Доктар! Чапаеўцы базіраваліся няблізка, кіламетраў за семдзесят ад горада, у Клімаўскім лесе. У розныя бакі і па розных лініях ішлі сувязі падпольшчыкаў з партызанамі.
Шыковіч з нецярплівасцю чалавека, які вось-вось дасягне мэты, пачаў праглядаць дакументы гэтай брыгады. Чытаў, захапляўся: якая крыніца сюжэтаў! Якія характары вырысоўваюцца з гэтых скупых звестак аб людзях! Але дзіўна - пра сувязі з людзьмі горада часта ўспаміналася, аднак ніводнага канкрэтнага дакумента няма, не называецца ніводнае сапраўднае імя. Пра Доктара даследчык знайшоў яшчэ адзін толькі ўспамін. Цікавы і арыгінальны. У расшыфраванай запісцы ўсё той жа сувязной Марусі. Яе рукой было напісана:
«Добры дзень, цётка Параска!
Паведамляю, што яйкі твае 43 штукі, 4 кг парэчкі, 1 кг масла, 2 літры смятаны я прадала. Узяла 180 марак, на нашы грошы гэта 1800 рублёў. Купіла 7 кавалкаў мыла і 3 катушкі нітак. Бульбу 12 кг аддала дзядзьку Карнею, ён паабяцаў пашыць табе сак. Кланяецца ён усім нашым нізка, а таксама цётка Наста. Яна хворая, у яе грыжа. Будуць рабіць аперацыю. Дзядзька прыедзе на тым тыдні, у сераду. Мяне з работы не адпускаюць да 24.
Цалую. Твая пляменніца Маруся».
Унізе гэтай пажаўцелай пакамечанай паперкі рукой Варавы напісаны спачатку лічбы:
«34, 14, 82, 08, 37, 21,
42-17, 9, 81, 93.

Доктар перадаў: шаснаццаць чалавек вывезены за горад у сераду. Сустракайце ў лесе каля Карнееўкі, суправаджае Насця. Разведчыкаў расстралялі. Вечная слава вам, дарагія мае хлопчыкі!»
Шыковіч убачыў па літарах, як задрыжала рука мужнага, энергічнага, вынаходлівага чалавека - Варавы, калі ён пісаў гэтыя апошнія словы, што выніклі не з кода, а вырваліся з сэрца: «Вечная слава вам, дарагія мае хлопчыкі!»
Такой была барацьба, пра якую мы пачынаем забываць!
Асцярожнасць, хітрыя коды, ключы да якіх наўрад хто знойдзе цяпер... І ўсё адно правалы, смерці. Вораг быў таксама хітры і каварны. Але нішто не магло зламаць такіх, як Варава, як Маруся. Загінулі разведчыкі - на іх месца пайшлі Маруся і Насця!
«Абавязкова напішу пра іх», - вырашыў Шыковіч, седзячы ў задуме над гэтым дакументам.
Але хто яны, гэтыя дзяўчаты? Жывыя ці загінулі? І хто такі Доктар? Адно чапляецца за другое. Але няма ні пачатку, ні канца. Трэба шукаць! Аднак дакументы далі ў гэтым сэнсе нямнога. Яшчэ адна запіска Варавы:
«Сяргей! Скажы Камарэнку, гэтаму чортаваму эскулапу, што, калі ён не аддасць Люцікаву частку тых нямецкіх лякарстваў, якія прыслаў «Хірург», я яго расстраляю за невыкананне загаду. Жыла ён, індывідуаліст, сукін сын!»
Лякарствы, якія прыслаў «Хірург»... Не Доктар, а «Хірург». Але словы «доктар» Варава двойчы напісаў без двукосся, а «хірург» узяў у двукоссе. А калі меркаваць па ўсім іншым, камісар атрада быў акуратны і даволі пісьменны чалавек. Дык як гэта зразумець, чаму ён па-рознаму пісаў падпольныя клічкі? Вельмі можа быць, што маецца на ўвазе адзін і той жа чалавек. Але Доктар - гэта для яго, Варавы, для Марусі, для вузкага кола тых, хто ведаў асабіста і трымаў сувязь з падпольшчыкам. «Хірург» - для ўсіх другіх, напрыклад для лекара атрада Камарэнкі. Лякарствы мог прыслаць, безумоўна, толькі лекар ці аптэкар.
Ад доўгага чытання і напружаных думак у Шыковіча забалела галава. Не, даволі дакументаў! Гэта не яго стыхія. Трэба шукаць жывых чапаеўцаў, яны скажуць больш. Ён выпісаў з дакументаў дзесяткі прозвішчаў. Дзе гэтыя людзі? Варава загінуў у верасні сорак другога... Красянкоў, камандзір атрада, быў адкліканы ў Маскву. У папцы ёсць радыёграма Цэнтральнага партызанскага штаба. Дзе ён цяпер? Другіх чапаеўцаў ён, Шыковіч, не ведае. Як не ведае! А Гукан? Праўда, Сямён Парфёнавіч прыйшоў туды значна пазней, у пачатку сорак трэцяга, калі ўжо была сфармавана брыгада. Але камісар мусіць ведаць пра тыя сувязі, якія наладжваліся атрадамі, што склалі брыгаду! Чаму ж Гукан нічога не расказаў яму, калі яны працавалі разам, ні пра Доктара, ні пра «Хірурга», ні пра Марусю? І нічога не напісаў у сваёй кнізе. Малазначныя факты? Можа, толькі яму, Шыковічу, чалавеку з фантазіяй, яны здаюцца цяпер незвычайнымі. А можа, тады, дзесяць год назад, не пра ўсё можна было пісаць? Ва ўсякім разе, як бы там ні было, а трэба пачынаць з Гукана. Пагутарыць шчыра, па-сяброўску. Выказаць свае сумненні і здагадкі. Папрасіць парады. Урэшце, ён разумны чалавек і сам, напэўна, добра разумее, што ў кнізе яго многа недакладнасцей, прабелаў і што любая добрасумленная праца цяпер, пасля XX з'езда партыі, больш аб'ектыўна асвятліць той ці іншы бок усенароднай барацьбы з фашызмам.
Будучы чалавекам нецярплівым, Шыковіч адразу ж з архіва накіраваўся ў гарсавет. У прыёмнай Гукана, як заўсёды, было многа людзей. Гарадскія работнікі. Усе па неадкладных справах. Большасць Шыковіча ведалі, прывіталіся ветліва, але кожны ў душы стаіў незадавальненне яго прыходам: пісьменнік, які дапамог Гукану напісаць кніжку, работнік рэдакцыі, ён меў маральнае права пайсці без чаргі. Яны не пярэчылі супраць гэтага яго права, але нікому не хацелася сядзець у прыёмнай. Шыковіч і меўся з ходу праскочыць у кабінет, але новая сакратарка затрымала яго:
- У Сямёна Парфёнавіча нарада гандлёвых работнікаў.
- Ух, гэтыя гандляры! Толькі бясконца засядаюць. А гандляваць не ўмеюць.
Супраць гандляроў, якія занадта доўга радзіліся, настроены былі ўсе. Нехта прыгадаў фельетон Шыковіча аб адным старшыні райспажыўсаюза. Дырэктар піўзавода пачаў падкідваць фельетаністу факты. Але Кірылу гэта не цікавіла, ён жыў вобразамі падпольшчыкаў, людзьмі, якія паўсталі з дакументаў.
Дзяўчо, што сядзела на варце дзвярэй, было зусім маладзенькае. Новенькая. Шыковіч падумаў пра яе з непрыяззю: «Прымасцілася, каб адпрацаваць свае два гады. На завод не пайшла, чортава лялька».
І сярдзіта спытаў:

- Колькі іх там?
- Каго? Таварышаў з упраўлення гандлю? Трое.
- Дык якая гэта нарада! Ідзі ты, галубка, спытай у мэра, доўга нам чакаць? Скажы, Шыковіч пытае.
Пачуўшы знаёмае прозвішча, дзяўчынка з цікавасцю паглядзела на Кірылу і паслухмяна нырнула ў будку: кабінет, каб не пранікаў гук, адгароджаны ад прыёмнай адмысловым збудаваннем, якое нагадвае кабіну на міжгародняй тэлефоннай станцыі.
Неўзабаве адзін за адным, усе з тоўстымі папкамі, з будкі гэтай вываліліся кіраўнікі гарадскога гандлю. Следам за імі з'явіўся сам Гукан. Стаў у дзвярах, высокі, у ботах, галіфэ, але ў добра скроеным пінжаку, пры гальштуку. Наведвальнікі падняліся: ці не думае старшыня ісці куды?
- Кірыла Васільевіч, у цябе доўгая справа? А то бачыш, колькі народу чакае.
- Ды я хацеў параіцца па адным пытанні.
Гукан быў упэўнены, што Шыковіч прыйшоў з-за сына, хоць не разумеў, чым ён мог памагчы. Вызваліць з-пад арышту - не яго кампетэнцыя. Ага, параіцца хоча. Было б несумленна ў такі час адмовіць яму ў сяброўскай парадзе ці прымусіць чакаць, пакуль ён, Гукан, будзе займацца справамі горада.
- Ну што ж, давай заходзь. Прабачце, таварышы, - звярнуўся старшыня да іншых.
- Калі ласка, Сямён Парфёнавіч, - адказаў за ўсіх адзін.
Каб надаць гутарцы сяброўска-інтымны характар, Гукан сеў не за свой рабочы стол, а з краю доўгага стала для пасяджэнняў, насупраць адчыненага акна, за якім ласкава шапталіся каштаны. Яго адразу насцярожыў выгляд Шыковіча. Не падобны чалавек на засмучанага, расстроенага бацьку. Неяк зусім інакш узрушаны, ажно вочы блішчаць.
Кірыла выцягнуў з бакавой кішэні паперкі - копіі, якія спісаў з архіўных дакументаў, разгладзіў іх на стале і, яшчэ нават не прысеўшы, спытаў:
- Сямён Парфёнавіч, вы добра ведалі Вараву?
Гукан адчуў нешта накшталт таго, што адчувае пасажыр, калі самалёт правальваецца ў паветраную яму.
«Што гэта ён? Заходзіць здалёк?»
- Якога? Таго?
- А хіба ёсць яшчэ які Варава?
- Не. Але прозвішча не такое ўжо рэдкае. Пракопа я ведаў. Да вайны яшчэ.
- Цікавы чалавек быў. Праўда?
Цяпер усю ўвагу Гукана прыцягвалі паперкі, якія Шыковіч усё яшчэ асцярожна разгладжваў. Не, гэта не старыя дакументы. Чысцюткая, дабротная папера, стандартныя аркушы, на якіх пішуць у рэдакцыю.
- Цікавы. Ты што, забыў? Я ж расказваў табе, калі...
Ён хацеў сказаць: «Калі мы пісалі кнігу» - і чамусьці не сказаў, асекся.
- У вайну вы сустракаліся з ім?
- Аднойчы. На пасяджэнні абкома.
- Але пасля вы былі камісарам брыгады, якая вырасла з атрада Чапаева...
- У брыгаду ўвайшло чатыры атрады і спецгрупа.
- Але штаб брыгады павінен быў ведаць пра тыя сувязі, якія наладжвалі атрады. Сямён Парфёнавіч, што вы можаце сказаць пра гэтыя вось дакументы? Я знайшоў іх у партархіве. Арыгіналы напісаны Варавам.
Гукан узяў паперы, і яны затрымцелі ў яго руцэ.
«Хвалюецца стары», - адзначыў Шыковіч з павагай да чалавека, якога ўсхваляваў напамінак пра загінуўшага таварыша. Гукан падняўся і пайшоў да рабочага стала. Узяў там акуляры. Вярнуўся, сеў і доўга чытаў тры кароткія запіскі.
- Хто такія Доктар, «Хірург», Маруся, Насця? Вось што мяне цікавіць. - Шыковіч ішоў, збіраючыся перадаць расказ Яраша, асабліва тую частку, што тычылася Савіча. Сказаць, што жывая дачка доктара.
Гукан адарваўся ад папер, пранікліва паглядзеў на пісьменніка праз акуляры, потым паверх іх. Пакачаў галавой, уздыхнуў.
- Не помню, брат. Марусь сувязных у нас быў добры дзесятак. Каторая з іх? Бачыш, што я табе скажу, Кірыла Васільевіч. Варава быў цікавы чалавек. Але ў яго было многа дзівацтваў. Не ў

дакор нябожчыку. Была ў яго схільнасць да розных прыгод, часам проста-такі авантурнага характару. Помню, яго на абкоме яшчэ прабіралі за нейкую рызыкоўную аперацыю. Ён стварыў такую заблытаную агентуру, навыдумляў столькі самадзейных кодаў і шыфровак, што пасля мы не маглі разабрацца, што да чаго. І разам з тым, я табе скажу, быў даверлівы, як дзіця. Яго агенты потым правальвалі нашых людзей. Ды і сам ён загінуў праз гэтую сваю залішнюю даверлівасць. Хацеў прыручыць ваўка. Пайшоў на сустрэчу з начальнікам паліцыі. А той гад замест трох чалавек аховы, як дамовіліся, узяў трыццаць. Зрабіў засаду. Яны ўжо сышліся, пачалі гутарыць, як іх абкружылі. І Пракоп, каб не трапіць у іх лапы, узарваў гранату. У кішэні. Самога насмерць. Начальніку паліцыі адарвала нагу...
Пра гэта Шыковіч ведаў. І пісаў. Нічога новага і нічога такога... зняважлівага для кагосьці Гукан не сказаў. Аб'ектыўная спакойная ацэнка людзей і фактаў, якія сталі ўжо гісторыяй. Але, відаць, менавіта праз тое, што Гукан гаварыў пра Вараву, пра невядомых падпольшчыкаў і сувязных, як пра нейкіх далёкіх гістарычных асоб, а ён, Кірыла, апошні тыдзень жыў з імі, як з блізкімі і дарагімі людзьмі, Шыковічу расхацелася расказваць пра Савіча і Зосю. Забіраючы ад Сямёна Парфёнавіча паперы, ён таксама ўздыхнуў:
- Нялёгка, відаць, дакапацца цяпер да ісціны.
Гукан зняў акуляры, праціраў пальцамі вочы, быццам вельмі стаміў іх, прачытаўшы тры запіскі. Спытаў:
- Дык, значыцца, сядзіш у архіве?
- Сяджу.
- Такіх дробных загадак там многа. І ўвогуле, Кірыла Васільевіч, - Гукан ускінуў галаву, усміхнуўся, - няўжо цябе не хвалююць праблемы сённяшняга дня, што ты залез у склеп да Сыраквашкі? Такія падзеі! Да з'езда ідзём. Ды да якога з'езда! Чытаеш - дух займае.
- А гэтыя праблемы, - Кірыла ляпнуў па згорнутых копіях, - па-вашаму, трэба пахаваць назаўсёды? - У голасе яго прагучала раздражнёнасць.
Старшыня чамусьці адразу ўспомніў пра ўчынак сына гэтага дапытлівага даследчыка партызанскіх архіваў. «Навошта чалавек прытвараецца, што яго больш за ўсё цікавіць сёння Варава, доктар і справы падпольшчыкаў?»
- Чаму пахаваць? Няхай капаюцца гісторыкі, іх хлеб. А ў нас з табой даволі надзённых задач. Заняўся б ты сынам лепш. Во праблема!..
- А што з маім сынам?
- Як што? Ты не ведаеш? Ай-вой-вой! Вось табе і на! Бачыш, да чаго давёў архіў. Дарожкі ў парку падмятае твой сын.
Шыковіч хацеў падняцца і не здолеў: невядомая сіла прыціснула яго назад да крэсла. Ён адразу зразумеў, што значыцца «падмятае дарожкі». У той час калі ён з чыстымі думкамі і імкненнямі робіць святую справу - уваскрашае справу герояў, што загінулі за гэты вось ясны мірны дзень, сын, яго любімы сын, учыніў нешта бруднае, недастойнае. У першы міг з'явілася адчуванне, быццам на галаву вылілі памыі, не, пляснулі нечым смярдзючым, слізкім, гідкім.
Гукан зразумеў, што ўдарыў у самае балючае месца. Ён не зларадпічаў, у яго таксама ёсць сыны, праўда, ужо самастойныя людзі. Паспрабаваў нават змякчыць:
- Але, падносяць нам дзеці сюрпрызы. Дзіўнае пакаленне расце...
Ён падняўся і адышоў да акна, глядзеў на каштаны. Яшчэ нешта гаварыў. Шыковіч не чуў. Следам за тым агідным адчуваннем пачала расці злосць. На Славіка. На Гукана. На Валю: яна больш за ўсё патурала капрызам дзяцей. На сябе: бязвольны чалавек, уласнага сына не мог выхаваць! Гукан папрасіў прабачэння і сеў за рабочы стол. Націснуў кнопку званка. Сказаў дзяўчыне, якая з'явілася ў адзін міг:
- Хто там па чарзе? Прасі.
Шыковіч падняўся і, не развітваючыся, пайшоў да дзвярэй.
- Заходзь, Кірыла Васільевіч. Я, можа, успомню прозвішчы сувязных. Маруся, кажаш? Пазваню Ткачуку, начштаба нашаму...
На вуліцы, пад каштанамі, Кірыла адчуў, што ўдарыла ў пот. Пацяклі раўчакі за каўнер, залівала вочы. Ніколі не было ў яго такой патлівасці. І дзень нядушны. На сонца раз-пораз наплываюць хмаркі. Вецярок.
Кірыла дастаў насоўку і пачаў старанна выцірацца. Нейкі прахожы з усмешкай спытаў:
- Парылі, таварыш?

Не адразу дайшоў да сэнсу гэтых слоў. А калі дайшоў, Шыковіч кінуўся прэч ад дзвярэй гарсавета. Але на скрыжаванні вуліц спыніўся. Куды ісці? Нейкае своеасаблівае, бадай што незнаёмае пачуццё пацягнула ў парк.
«Пагляджу, ці ўмееш ты хоць падмятаць, сабачы сын. Рос як у Бога за пазухай. А вылупіўся на свет божы і не можаш кроку зрабіць па-чалавечаму... Як ты глянеш мне ў вочы? Я не скажу табе ні слова. Стану і буду глядзець... Падмятай!.. Падмятай!..»
Каля цэнтральнага ўвахода сляпіў вочы касцёр вялікай клумбы. За ёй - кветкавы дыван, перарэзаны чырвонай дарожкай з цаглянай крошкі. На гэтай дарожцы бабулі чамусьці любяць катаць каляскі з дзецьмі. Магчыма, пад гэтае шарханне шын па дробнай цэгле дзеці хараша спяць. Ці, можа, і малых і старых ап'яняе пах кветак? Маладыя маці, наадварот, забіраюцца глыбей, у цень, ці сядзяць каля фантана. Да глыбінь гэтага вялікага старога парку гарадскія ўлады ніяк не дабяруцца. Іх за гэта крытыкавалі. А Шыковіч заўсёды лічыў, што так лепш. Пачнуць добраўпарадкаваць - сапсуюць усю дзікую непаўторную прыгажосць. Ён асабліва любіў глухія куткі за сажалкай. Але наўрад ці будуць падмятаць там. Таму ён спачатку абышоў усе дарожкі паблізу, у культурнай частцы парку. Гулялі дзеці, драмалі на лавачках з газетамі на каленях пенсіянеры. Маладыя мамы чыталі тоўстыя раманы. Бабулі вязалі шарсцяныя чулкі. Дзіўна. Хвіліны ўтрапення, разгубленасці мінулі, і ён усё вострa прыкмячаў, усё фіксаваў у памяці. Нават злосць знікла. З'явілася нешта зусім іншае. Хацелася сустрэць сына, і расла боязь гэтай сустрэчы. На вузкім мосце цераз роў ён спыніўся. Падумаў, што было б, каб з такой вышыні скочыць у зялёную ваду сажалкі, дзе цьмяна адлюстроўваюцца неба і старыя дрэвы, парэнчы моста і горда выгнутыя шыі лебедзяў.
Шыковіч любіў глядзець з вышыні на гэтых дзіўных птушак. Якая пастава! Плывуць - не варухнуць ніводнай пер'інай, як мармуровыя. Гэтая іх паважнасць часта супакойвала. Але сёння - не. Усхваляванасць расла. І боязь. Ён амаль прымусіў сябе пайсці далей па густа зацененай дарожцы. Толькі абышоўшы і гэтую палавіну парку і не сустрэўшы нікога, акрамя дзвюх пар закаханых студэнтаў, Шыковіч з палёгкай уздыхнуў. Зразумеў, недарэчна шукаць сына тут; і добра, што ён не ўбачыў Славіка з мятлой у руках, пад вартай міліцыянера. Цяжка ўявіць, якое ўражанне гэта магло б зрабіць на яго ды на таго шалапута таксама. Невядома, ці ўдалося б яму стрымацца і нічога не сказаць. Нельга, нарэшце, рабіць з арышту Славіка трагедыю. Зарабіў - няхай панясе кару. Што ён, аднак, натварыў? У рэдакцыі, напэўна, ведаюць.
У новым будынку трымаўся халадок і панавала цішыня. Нават не чуваць было звыклага стуку машынкі. Бухгалтары, машыністкі і кур'еры абедалі, як ніхто, дакладна ў пэўны час. Але ў гэты летні дзень нават сакратары рэдакцыі не заседжваліся ў кабінетах. Калі толькі рабілася газета?
Шыковіч падняўся на другі паверх, заглянуў у прыёмную рэдактара, у кабінет намесніка. Пуста. Зайшоў у свой пакой; загадчык аддзела таксама, відаць, абедаў. На яго стале ляжаў рукапіс, рэцэнзія на прэм'еру абласнога тэатра, якая адбылася месяцы два назад: «Новы спектакль». Кірыла злосна закрэсліў гэты недарэчны загаловак. І пачаў правіць тэкст, хоць гэта была зусім не яго работа. Не пакідаў жывога месца. Работа захапіла. Замест правільнай, але прэснай жвачкі выходзіла жывое, дасціпнае, едкае слова пра няўдалы спектакль. Ён быў добры чалавек, да таго ж ведаў, як нялёгка даецца ў мастацтве ўдача. Ніхто не ставіць сабе мэту зрабіць дрэнна. Ён не любіў пісаць адмоўныя рэцэнзіі. І ненавідзеў людзей, якія радаваліся няўдачы ў другіх, смакавалі правалы спектакляў і кніг. А тут раптам, забыўшыся на ўласныя перакананні, пісаў надзвычай бязлітасны водгук і, можа, упершыню рабіў гэта з задавальненнем.
У дзверы заглянуў Адам Рагойша, загадчык прамысловага аддзела, нізенькі чалавек з мясістым носам, шырокім ілбом і дзіўнай лысінай: звужанай наперадзе і шырокай на макаўцы, зверху гэтая лысіна нагадвала па форме і па ружовасці чырву.
- Ты тут? - спытаў Рагойша, уваходзячы.
- Не, мяне няма.
Шыковіч не любіў гэтага чалавека. Не любіў за яго зайздроснасць. Рагойша зайздросціў усім. Яму, Шыковічу, за тое, што ён мае права не сядзець у рэдакцыі, а пісаць нарысы і фельетоны дома, ды яшчэ на дачы.
«Дай мне такія ўмовы, і я напішу не горш. Кожны напіша».
Зайздросціў загадчыку сельгасаддзела Лапіцкаму, што ў таго пяцёра дзяцей, а ён, Рагойша, бяздзетны. Прыдзірліва, як следчы, аглядаў кожную новую сукенку і кофтачку карэктаркі Маі Гутар. Падазрона шаптаў: «Адкуль гэта яна бярэ? За свой заробак?» Яго чамусьці многія баяліся,

нават рэдактар. Рагойша нямала пастараўся, каб нагнаць страху і на Шыковіча. Кірыла неяк у кампаніі пагразіўся, што зробіць Рагойшу персанажам сатырычнай аповесці, нават прозвішча не зменіць. Рагойшу гэта перадалі, і з таго часу ён пачаў шукаць дружбы.
Непрыязны адказ на недарэчнае пытанне сваё Рагойша прыняў як жарт. Засмяяўся. Сеўшы насупраць, глянуў у рукапіс, які правіў Шыковіч, здзіўлена свіснуў:
- Вось аўтара гэтага сапраўды няма. Ні рожак, ні ножак не засталося. Хто пісаў?
- Я.
- Сам сябе так правіш? - шчыра здзівіўся Рагойша. - Ну-у? Здорава! - І пажартаваў: - Талстой. Толькі не Леў.
Але, відаць, усумніўшыся, пацягнуўся да перагорнутых выпраўленых старонак, каб глянуць на тытульную. Кірыла прыціснуў старонкі локцем. Аўтарам рэцэнзіі была супрацоўніца рэдакцыі, да якой Рагойша ставіўся не надта прыязна. І Шыковіч не хацеў даваць яму лішні козыр супраць гэтай жанчыны. Рука Рагойшы застыла на стале, пальцы ляглі на рукапіс. Пасінела ружовая піка лысіны - абразіўся чалавек, што Шыковіч, не жадаючы паказаць рукапіс, як бы выказвае яму недавер. Але Рагойша знайшоў выйсце з няёмкага становішча. У левай руцэ ён трымаў кніжку. І тут жа паклаў яе на стол. Гэта была аповесць Шыковіча, што нядаўна выйшла з друку. Кірылу здзівіла такая нечаканка. Ён адарваўся ад рукапісу і пільна пагледзеў у лупатыя, як у хворага на зоб, вочы Рагойшы. Вочы былі халодныя, а твар разрыхліўся ад усмешкі.
- Вось купіў. Надпішы на памяць. Сам не здагадаешся падараваць.
Кірыла ведаў, што ў дадатак да ўсіх іншых сваіх якасцей загадчык прамысловага аддзела яшчэ і скупы, кнігі купляе рэдка. А таму той факт, што ён купіў яго аповесць, прыемна ўразіў і нават закрануў аўтарскае самалюбства. Кірыла адразу падабрэў. Узяў кніжку, задумаўся, што напісаць, каб не шаблоннае.
- Колькі ганарару адхапіў?
- Тры.
- На новыя? Ого! Куды ты дзяваць іх будзеш?
- Палавіну табе аддам.
І дзіўна, гэты, здавалася б, зусім нявінны жарт пакрыўдзіў Рагойшу. Ён усхапіўся з крэсла, тоўсты нос яго і вушы пабурэлі. Злосна кінуў:
- Сынку свайму аддай. Яму на рэстараны трэба.
Не, не абразіла і не пакрыўдзіла гэта Шыковіча, а неяк балюча ўкалола. Ён раптам зразумеў, што зайздросны і крывадушны чалавек гэты зайшоў зусім не за тым, каб атрымаць аўтограф, што ў душы ён радуецца непрыемнасці са Славікам. Абурэнне яго было дзіўнае - ціхае. Няхай бы ён лепш закрычаў, вылаяўся. Пры сваёй флегматычнасці ён зрэдку-такі ўзрываўся і мог моцна крычаць, гэта ў рэдакцыі ведалі. Дык не ж, ён зрабіў нешта зусім нечаканае і для самога сябе, і для Рагойшы, для ўсіх. Спакойна ўстаў з-за стала, падышоў да загадчыка аддзела, узяў за каўнер паласатага пінжака, падвёў яго, страшэнна ашаломленага, да дзвярэй, ударам нагі шырока адчыніў іх і выкінуў Рагойшу ў калідор, як непатрэбную рэч. Зачыніў дзверы і зноў-такі даволі спакойна вярнуўся да стала. Ціхае кіпенне ўсярэдзіне пачало хутка ўтаймоўвацца. Прыгадаўшы, які ў Рагойшы зрабіўся твар, калі ён узяў яго за каўнер, Кірыла нават засмяяўся.
Хутка яго паклікалі да рэдактара. У доўгім і вузкім кабінеце акрамя рэдактара сядзеў дырэктар тэлестудыі Аляксей Тукала, стары прыяцель Шыковіча, некалі разам пачыналі пісаць, разам працавалі многа год. Кірыла ўзрадаваўся, што размова будзе не адзін на адзін і што нарэшце ён зможа высветліць віну сына. Тукала, напэўна ж, усё ведае.
Шыковіч, як звычайна, весела прывітаўся. Але тое, што Аляксей, працягваючы руку, афіцыйна-ветліва прыўзняўся, насцярожыла яго.
Няўжо Алёша Тукала падкрэслівае дыстанцыю паміж сабой і ім, Шыковічам? Смешна.
Не таму, што сумеўся, а знарок, каб пагледзець, што ж будзе далей, Кірыла напусціў на сябе выгляд вінаватага - не павітаўся з рэдактарам за руку, ціха сеў насупраць Тукалы, панурыў галаву: вось я, карайце! Але бачыў, што і дырэктар студыі і рэдактар разглядаюць яго з павышанай цікавасцю.
«Алёшу ўразіла мая новая якасць - уменне выкідваць з кабінета дурняў», - падумаў весела.
Жывіцкі - прынцыповы кіраўнік і ўвогуле добрай душы чалавек. Ён цаніў людзей, якія ўмеюць пісаць, абараняў кожнага здольнага журналіста. Шыковічам жа проста ганарыўся - не кожная

газета мае такога нарысіста і фельетаніста. Ніколі ў адносінах да яго не выяўляў сваю рэдактарскую ўладу. Таму і размову гэтую яму пачаць было нялёгка.
- Кірыла Васільевіч, скажы, калі ласка, што ў вас адбылося. Рагойша тут дакрычаўся да сардэчнага прыступу. Лекара выклікалі. Заявіў, што пойдзе ў гарком...
- Няхай ідзе...
Мяккасць і асцярожнасць, з якой Жывіцкі пачаў сваю прамову, адразу зрабілі Кірылу сур'ёзным і злосным. Злосным на Рагойшу. Дзіўна, да слоў рэдактара ён не адчуваў гэтай злосці.
- Не, ты чакай... З крыку Рагойшы я нічога не зразумеў. Растлумач ты хоць, што ў вас адбылося.
- Нічога не адбылося. Ён папракнуў мяне за сына. Я не ведаю яшчэ, што там натварыў мой сын. Але калоць мне вочы сынам я нікому не дазволю! - цвёрда папярэдзіў ён, чамусьці звяртаючыся да Тукалы.
Той як бы ўздрыгнуў, узняў галаву ад паперы, на якой рысаваў тоўстым сінім алоўкам кароткіх смешных чалавечкаў, пільна паглядзеў на Шыковіча праз вялікія люстраныя акуляры, у якіх адбіваліся вокны і дрэвы на вуліцы, сказаў:
- Але, накуралесіў твой Уладзіслаў.
- Што ён зрабіў?
- Напіўся. Прыставаў да ангельскіх турыстаў. Чаго ты лезеш да чужаземцаў? Што табе трэба ад іх? Раскрычаўся, што скіне на Ангельшчыну бомбу. Скажы, калі ласка, камандуючы ракетнымі войскамі! - абурана перасмыкнуў Тукала плячамі.
- Усяго? - мімаволі вырвалася ў Кірылы, бо сапраўды ён адчуў палёгку, даведаўшыся дакладна, што ўчыніў сын.
- «Уся-го»?! - Тукала падхапіўся, загрымеўшы крэслам, абурана кінуў аловак, і шасціграннік пакаціўся па доўгім стале з дробным стукам, але не ўпаў на падлогу, спыніўся на самым краі. - «Усяго»! Ты чуў, Станіслаў Іванавіч? З яго гэтага мала! Табе хацелася, каб ён перавярнуў рэстаран дагары нагамі ці забіў каго?..
Шыковіча напачатку мала закрануў крык Тукалы. Ён прасачыў, як каціўся аловак, і сур'ёзна зацікавіўся, якая перашкода спыніла яго на самым краі стала. Сказаў лагодна:
- Не крычы, Аляксей.
Але той ужо ўзрушана хадзіў па кабінеце, зняўшы акуляры (мабыць, баяўся, што яны зваляцца) і размахваючы імі.
- «Усяго»! Вось так мы выхоўваем моладзь! Пішам адно... Шумім пра высокія матэрыі... А ўласныя дзеці...
У гэты міг, мабыць ад Тукалавых крокаў, аловак зваліўся.
Шыковіч перавёў позірк на свайго ўгневанага сябра, на яго маладжавы, заўсёды як бы загарэлы хударлявы твар з радзімай плямкай на левай шчацэ, на прыгожую кучаравую шавялюру. Потым глянуў на рэдактара, які слухаў з сумным і збянтэжаным выразам на змораным твары, убачыў яго парадзелыя светлыя валасы, вялікія залысіны. І чамусьці ўспомніў, што ўсе яны равеснікі, рэдактар нават на год маладзейшы. Але лепш за ўсіх выглядае Тукала, здаецца, якім быў гадоў дваццаць назад, такім і застаўся, нават ніводнай сівай павуцінкі ў валасах. Падумаў непрыязна: «Умее сябе берагчы, чорт».
А Тукала ўсё больш разыходзіўся:
- ...Канешне, калі бацька будзе выкідваць з кабінета людзей, то сыну ёсць з каго ўзяць прыклад... Калі бацька сабе дазваляе...
Рэдактар зморшчыўся, быццам яму наступілі на мазоль, і папрасіў:
- Аляксей Рыгоравіч!.. Пагаворым спакойна.
Тукала на момант асекся. Шыковіч глядзеў на яго цяпер так, быццам не пазнаваў старога сябра, з якім з'еў не адзін пуд солі. Сказаў з глыбока затоенай іроніяй:
- Значыцца, ты, Алёша, рашыў навучыць мяне, як выхоўваць дзяцей? Давай, давай...
Гэта быў тонкі намёк на тое, што Тукала некалі пакінуў першую жонку з дзіцем. Ён зразумеў гэты намёк і закіпеў яшчэ горш. Але голас панізіўся:
- Я не думаю цябе вучыць. Але калі ты лічыш, што з цябе мала таго, што зрабіў твой сын, то з мяне гэтага - вось так. - Ён правёў далоняй па шыі. - Я не буду трымаць у сябе хуліганаў.
Ах, вось яно што! Нарэшце Шыковічу ўсё стала ясна: Тукалу цяжка было паведаміць аб рашэнні звольніць Славіка, а таму ён гэтак і нерваваўся.
«Баязлівец! Атрымаў цёплую пасаду і забываеш, што ёсць звычайныя чалавечыя адносіны».

Раптам стала шкада сына: нельга караць двойчы за адну і тую ж віну. Знявага да Тукалы расла, як снежны камяк. Кірыла адчуў нават страх: не сарвацца б зноў. Падняўся, засунуў рукі ў кішэні, ступіў бліжэй да рэдактара - пад яго спакой.
- Страхуешся? - спытаў знешне спакойна, але з'едліва.
- Мне няма чаго страхавацца! - ужо без нервовасці, паважна адказаў Тукала, надзеючы акуляры.
- Лягчэй за ўсё выкінуць чалавека з калектыву, - уздыхнуў Жывіцкі. - Ніколі не спяшайся...
- А што яму да чалавека!..
- Няхай пра такога чалавека падумае ў першую чаргу бацька!.. А калі бацька апраўдвае... Калі бацька паказвае прыклад... А потым ходзіць прасіць за сына... шукае яму цёплага месца...
Гэта быў подлы ўдар. Шыковіча перасмыкнула ўсяго. Ён не верыў сваім вушам. Няўжо гэта кажа Алёша Тукала, якога яшчэ тыдзень назад ён запрашаў да сябе ў госці? Слізняк!
Халодная разважлівая злосць апанавала Кірылу. Цяпер ён рабіў усё свядома, з разлікам.
Сумна паківаў галавой.
- Столькі год я з табой сябраваў і не ведаў, што ты такая дрэнь.
Эх, як Тукала зноў падскочыў.
- Чуеце?.. Станіслаў Іванавіч!
- Хлопцы, як вам не сорамна, - паспрабаваў прымірыць рэдактар.
- Цяпер разумею, што не зусім таго, каго трэба, я выкінуў за дзверы. Вось каго трэба! І не за дзверы. За акно. Дазволь, Станіслаў Іванавіч? - І Кірыла пайшоў, каб абысці доўгі стол.
Тукала хутка адступіў за рэдактарскі стол. Спалатнелы, стаў побач з Жывіцкім, які таксама насцярожана падняўся.
Шыковічу стала смешна. Ён дайшоў да краю стала, хмыкнуў і накіраваўся да выхаду. Калі дзверы за ім зачыніліся, Тукала выхапіў хусцінку і пачаў выціраць успацелыя рукі і лоб.
- Ты бачыў? Зазнаўся! Напісаў дзве бяздарныя кніжачкі і гэтак зазнаўся! Як псуе слава! Жах!
Жывіцкі засмяяўся.
Не разумеючы прычыны яго смеху, Тукала пачаў развіваць цэлую тэорыю наконт славы і зазнайства.

**8**

Яраш абсталёўваў аперацыйную навейшай апаратурай. Рэканструкцыі яго неаднойчы прыводзілі ў жах аддзел аховы здароўя. Але няўмольныя вартавыя фінансаў не маглі ўстаяць перад яго хірургічным аўтарытэтам. Патрыёты горада, яны таксама ганарыліся славай хірургічнага аддзялення бальніцы, якое лічылася лепшым у рэспубліцы. Аперацыйная прывяла ў захапленне дэлегацыю чэшскіх лекараў, якіх нялёгка здзівіць медыцынскай тэхнікай. А Яраш усё адно быў незадаволены: ёсць апаратура лепшая. Пераабсталяванне ён планаваў даўно. Многія з патрэбных апаратаў былі набыты загадзя. Але ўстаноўку іх адцягваў: па-першае, шмат чаго не хапала, па-другое, ён спадзяваўся, што пад канец года галоўны лекар і аддзел будуць больш шчодрымі.
І раптам ён пачаў работу па пераабсталяванню нечакана. Сам працаваў з манцёрамі і мантажнікамі вечарамі. Плаціў ім прэміяльныя са сваёй кішэні. За гэтае дзівацтва яму ўжо неяк раней наківалі на партбюро. З тым жа, што ён часта працуе не толькі з манцёрамі, але і са сталярамі, з паркетчыкамі, у клініцы звыкліся. Добрыя душы тлумачылі, што Ярашу проста няма куды дзяваць сілу і энергію, злыя - што такім чынам ён хоча павялічыць сваю папулярнасць.
Каб яму сказаў хто, што ўсё гэта робіцца так тэрмінова з-за адной хворай, ён, напэўна, пачаў бы аспрэчваць, можа, нават з абурэннем. Не, апаратура ўдасканальваецца не для адной хворай! Для ўсіх. Але ён разумеў, што было б няпраўдай адмаўляць, што гэта ўваходзіць у падрыхтоўку да аперацыі Зосі Савіч. Ён зрабіў сотні розных аперацый, нямала ўжо і такіх - на сэрцы. Але бадай ні да адной не рыхтаваўся з такой стараннасцю і адказнасцю. Як да найвышэйшага экзамену. Тут усё павінна быць узважана і ўлічана. Каб ніякай выпадковасці. Яго апраўдаюць усе, што б ні здарылася. Але сам ён не даруе сабе, калі гэтая спакутаваная жанчына скончыць сваё жыццё на аперацыйным стале. Неяк уначы ён увесь захаладаў ад такой думкі, гэтак жа, як некалі, калі цяжка хварэў Віця і ён, хірург Яраш, страціўшы веру ў медыцыну, раптам падумаў, што сын можа памерці. З'ўлялася думка: а можа, запрасіць каго-небудзь з калег з Масквы, з Кіева? Да яго прыедуць. Рэдка які хірург бярэцца аперыраваць блізкага чалавека. Блізкага... А гэтую дзяўчынку ён ведаў роўна восем сутак, бачыў, размаўляў, калі яна прыносіла яму ежу на гару, дзе і ўдзень панаваў паўзмрок. Ён амаль не ведае (можа, толькі здагадваецца), як яна жыла васемнаццаць год

свайго жыцця. І ўсё-такі яна была блізкім чалавекам. Ні адзін хворы ці хворая не жылі так у яго сэрцы, у думках.
Пакуль што Яраш аддаў яе тэрапеўтам, каб падлячылі, паназіралі, зрабілі ўсе кардыяграмы, здымкі і аналізы. Сам заходзіў рэдка, раз у тры дні, на кароткі час, як лекар. Гэта не збліжала, наадварот, аддаляла іх. Калі ў дзень сустрэчы ён казаў ёй «ты», то цяпер звяртаўся на «вы», як належыць лекару да хворай. На такое аддаленне ён пайшоў свядома. У той жа час папрасіў Машу, каб тая наведвалася да Зосі. Ён сказаў пра гэта аперацыйнай сястры чамусьці крыху збянтэжана:
- Маша, ёсць у мяне да вас просьба...
Яна адразу насцярожылася.
- Калі ласка, Антон Кузьміч. - І падняла свае тонкія рукі, каб паправіць бялюткі чэпчык на высокай дзівосна залатой кукле валасоў. Ён даўно заўважыў, што яна заўсёды слухае вось так - з паднятымі рукамі.
- У тэрапіі ляжыць хворая Соф'я Савіч. Нам з вамі, здаецца, прыйдзецца аперыраваць яе. Я хацеў бы, каб вы наведваліся да яе. Не як сястра. Як добры друг. Разумееце? Жанчына гэтая пражыла цяжкае жыццё.
Яраш адчуваў, што, выказаўшы такую просьбу, ён абавязаны растлумачыць Машы, хто ж такая Савіч. Але што сказаць?
Што Зося ратавала яго ад смерці? Чамусьці не хацелася, каб да аперацыі пра гэта даведаліся ў бальніцы. Ён добра ведаў, што, бадай, няма большых легендатворцаў і аматараў сенсацый, як лекары і сёстры.
Падумаўшы пра легенды, ён сказаў пра другое:
- Вы ведаеце, Маша, я не люблю казак. Але ёй расказвайце пра мяне любыя легенды.
Сястра застыла, як манекен, зграбная і халодная; яна заўсёды астывала, калі чаго не разумела. Ён растлумачыў:
- Пра маю хірургічную славу. Псіхічная падрыхтоўка.
Маша ўсміхнулася проста і цёпла, здавалася, што ўсміхнуўся не толькі яе твар, вусны, а ўся постаць - ад залатых валасоў да бронзавых ад загару стройных ног.
- Цяжка расказаць больш, чым вы заслугоўваеце, Антон Кузьміч.
- Не будзем гаварыць адно аднаму кампліментаў, Маша. Нам не патрэбна псіхічная падрыхтоўка.
Жарт гэты збянтэжыў дзяўчыну.
Дні праз два Маша зайшла да яго ў кабінет у той час, калі ён адпачываў паміж дзвюма складанымі аперацыямі. Яна не магла не ведаць, што хвіліны такога адпачынку былі свяшчэннымі. Як добры актор настройвае сябе на іншае псіхалагічнае гучанне ў другой дзеі, так ён настройваў сябе на другую аперацыю. Сядзеў у мяккім крэсле, скінуўшы чаравікі, паклаўшы ногі на другое крэсла, і паліў. І вельмі не любіў, калі хто-небудзь заходзіў, перашкаджаў адпачынку. Пра гэта ў аддзяленні ведалі.
На стук у дзверы адказаў незадаволена:
- Хто там? - і скамячыў цыгарэту.
- Я.
Ён здзівіўся, убачыўшы Машу. Яна ўвайшла, нясмелая і надзіва збянтэжаная. Куды падзеліся яе разлічаныя, да ненатуральнасці артыстычныя рухі! Спынілася каля дзвярэй, трымалася за ручку, як бы рыхтуючыся ўцякаць. Выраз твару быў вінаваты.
Яраш хутка сунуў ногі ў чаравікі.
- Што здарылася, Маша?
- Я дрэнная сядзелка, Антон Кузьміч, - сказала яна так, як магла б сказаць тады, калі ён выказваў сваю просьбу, каб мела намер адмовіцца. - Мы не разумеем адна адну. Яна, Савіч, адносіцца да мяне з дзіўнай падазронасцю...
- З падазронасцю? - перапытаў Яраш.
- Можа, не тое слова я сказала. Але... дзіўная яна. Пра такіх у нас кажуць: нелюдзімая.
- Нелюдзімая? - з суровым дакорам перапытаў ён і гэтай суровасцю зусім збянтэжыў дзяўчыну. Але тут жа мякка прапанаваў: - Сядайце, Маша, - і паказаў на тое мяккае крэсла, у якім толькі што сядзеў сам.

Яна нясмела села. Як тая вясковая дзяўчынка, што ўпершыню трапіла да суровага і бязлітаснага прафесара. Яраш не пазнаваў сваю маўклівую, але надзвычай упэўненую, спакойную, гордую аперацыйную сястру.
- Яна нічога не расказала вам пра сваё жыццё?
- Не, нічога.
- Вы чулі што-небудзь пра доктара Савіча?
Маша паківала галавой - не.
Цяпер Яраш зразумеў, чаму яна прыйшла вось так і такая: хацела, каб ён расказаў ёй пра хворую, тады толькі яна можа выканаць яго просьбу. Ён узлёг на стол сваім магутным целам і такім чынам даверліва наблізіўся да яе.
- Скажыце, Маша, а вы да каго-небудзь адносіліся з падазронасцю?
- Я? Калі бачыла, што перада мной хлус, няшчыры чалавек... Але гэта не тая падазронасць! - Тут яна застыла ў сваёй звыклай паставе - не зразумела яго.
- Скажыце, а вы ніколі не баяліся людзей, Маша?
Яна ўсміхнулася, але ўсмешка не растапіла халоднага неразумення і не зварухнула застылыя рысы твару.
- У школе я баялася нашага гісторыка. Мне дрэнна давалася гісторыя.
Ярашу здалося, што пра гісторыю яна выдумала знарок, надаўшы словам хітры і тонкі сэнс. Ён не здзівіўся, бо заўсёды лічыў яе разумнай і дасціпнай. Закрыўшы далонямі вочы, задумаўся: як расказаць ёй пра Зосю?
У часе гэтай паўзы Маша спытала ва ўпор:
- Хто яна вам, гэтая Савіч?
Антон Кузьміч хутка адняў ад твару рукі.
- Вы маглі б, Маша, спытаць пра гэта адразу. Я сказаў бы вам. Зося Савіч ратавала мяне ў падполлі ад смерці.
- Вас? - Маша здзівілася, устрапянулася і адразу стала звычайная: сур'ёзная, але чуткая, як сейсмограф. Магчыма, нейкі момант яна не давала веры, што тая худзенькая, маленькая, спакутаваная - скура ды косці - нелюдзімая жанчынка ратавала такога асілка.
Яраш, зразумеўшы гэта, сказаў:
- Яна мужная дзяўчына. І ў яе цяжкі лёс. Смерць бацькі, загадкавая смерць. Нямецкі канцлагер. Сібір... Хвароба. - Ён падняўся, вялікі, крыху ўсхваляваны, выйшаў з-за стала. - Я хацеў, Маша, каб вы растапілі лёд у яе душы.
Пільна назіраючы за ім, Маша нейкі час яшчэ сядзела. А потым падхапілася, збянтэжаная: ніколі яна не садзілася, калі доктар Яраш стаяў. Цяпер ёй было сорамна і за тое, што яна не здолела нават шчыра пагаварыць з Савіч, і за тое, што вось так настойліва дамагалася тлумачэння ад Антона Кузьміча. Што ён можа падумаць? Але яна не стала прасіць прабачэння і не стала запэўняць, што цяпер пастараецца ўсё зрабіць, каб хворая не адчувала адзіноту. А зусім нечакана папрасіла пра другое:
- Антон Кузьміч, раскажыце пра гэта на нашым камсамольскім сходзе.
- Пра што?
- Пра сваю работу ў падполлі. Пра тых людзей... Пра Савіч...
Яраша трохі здзівіў такі нечаканы паварот. Ён пільна ўгледзеўся ў яе вочы-азёры з залатымі берагамі: сур'ёзна яна ці зноў з іроніяй, помсцячы, што ён нічога не расказаў адразу? Не, сястра прасіла сур'ёзна. І яго хораша кранула такая яе сур'ёзнасць.
Калі яна выйшла, Антон Кузьміч зноў сеў у крэсла, зноў запаліў (другую цыгарэту!) і доўга думаў. Пра лёс Зосі. Пра пакаленне, якое не ведае падазронасці і нічога не баіцца... Але што ён, Яраш, ведае пра гэтае пакаленне? Належаць да яго Тарас і Маша... Але ёсць і Славік Шыковіч... Як і чым жыве Маша? Тарас? Што хвалюе Славіка? Як далёка ён, нядаўні камсамолец Яраш, адышоў ад гэтага пакалення! Калі быў апошні раз на камсамольскім сходзе? Год дзесяць ужо, не менш, публічна не расказваў пра падполле. Чаму? А раней, калі часам выступаў, ці расказаў хоць раз пра Зосю Савіч? Не, так, між іншым, зрэдку ўспамінаў дзяўчыну, якая памагла ўратавацца. Цяпер яму стала сорамна і агідна. Няўжо і ён баяўся? У падполлі не баяўся сто разоў ісці на смерць, а тут...
Адразу пасля вайны адчуваў маральны абавязак перад памяццю таварышаў, якія загінулі, напісаць пра іх барацьбу. Не напісаў. Пісаў дысертацыі. Кандыдацкую, пасля доктарскую (якую

збіраецца абараняць). Гэтым апраўдваўся перад сваім сумленнем. А потым увогуле падполле пачало здавацца далёкай гісторыяй, да таго ж вельмі заблытанай людзьмі і часам. Ён не зразумеў нават адразу жадання Шыковіча вярнуцца да гэтай гісторыі, ператрусіць яе, перагледзець. Яму здавалася, каму гэта патрэбна цяпер? І вось уваскрэсла з мёртвых Зося Савіч... Ужо тады, у тую ноч, калі расказваў пра яе Шыковічу, ён, Яраш, зразумеў, што гэта патрэбна людзям, патрэбна новаму пакаленню - Тарасу, Славіку, Віцю, Наташы. Пасля размовы з Машай, пасля яе нечаканай просьбы расказаць пра ўсё на камсамольскім сходзе ён пераканаўся ў гэтым цвёрда і непарушна.
Асноўныя работы ў аперацыйнай былі закончаны. Апошнія дні порkаліся з тэлевізійнай апаратурай. Яраша доўга не задавальняла яркасць адбітка на экране, і ён выгнаў з інжынера, з рабочых і з самога сябе сем патоў, пакуль дамогся, каб дарагая навінка гэтая давала належны эфект і карысць.
Калі тэхнікі пайшлі «замочваць» добрую справу за яго прэміяльныя, Яраш застаўся адзін. Ён яшчэ раз агледзеў сваю гаспадарку, якой употай ганарыўся. Усюды - нікеляваная сталь: безліч бліскучых інструментаў у шкляных шафах, дэталі апаратаў. Сталь, якая ў разумных руках хірурга прыносіць людзям ратунак, жыццё. О, ён ведаў вартасць сталі!
Але не дзеля таго, каб лішні раз агледзець аперацыйную, ён застаўся. Хацелася самому, без спецыялістаў, праверыць тэлеапаратуру. Быў у яго непахісны закон - усё ўмець рабіць самому.
Ён палажыў на аперацыйны стол разгорнуты падручнік па анатоміі, навёў на старонку тэлевізійную пушку, якая была ўманціравана ў бясценевую лямпу. Націснуў кнопкі. Засвяціўся экран, задрыжалі на момант звілістыя ніткі кадраў. А потым застыў павялічаны адбітак каленнага сустава. Ён гартаў старонкі і бачыў на экране свае рукі. Чалавеку старонняму магло б здацца, што ён забаўляецца, як дзіця, цешыцца новай цацкай, назначэнне якой у аперацыйнай не кожнаму лёгка зразумець. На экране з'явілася сэрца. Яраш перастаў гартаць старонкі падручніка, выпраставўся і ўважліва пачаў разглядаць адбітак, быццам убачыў гэтае дзіва першы раз у жыцці. У той міг ён падумаў пра Зосю. І яго ўласнае сэрца дало пачуць сябе. Такія нечаканыя штуршкі ён адчуваў ужо некалькі разоў. Няўжо гэта боязь будучай аперацыі?
Яраш выключыў устаноўку і бясценевыя лямпы і адышоў да шырачэзнага - на ўсю сцяну - акна. Вечарэла. Сад пакрыўся ценем ад будынкаў. Сонца заходзіла з другога боку, за бальнічнымі карпусамі. Адзіны промень яго прабіўся паміж муроў і асвяціў верхавіны таполяў, маладых, але самых высокіх дрэў. Яраш прыгадаў, што таполевая алея гэтая была пасаджана ў вясну Перамогі. І вунь якія вымахалі дрэвы! У садзе гулялі хворыя. Адны сядзелі, другія хадзілі. Санітарка ў белым халаце гушкала дзіця, загорнутае ў такі ж шэры бальнічны халат, якія былі і на дарослых. Яраш ненавідзеў форму і колер гэтых халатаў і ўжо колькі год вёў вайну, каб замяніць іх. З ім згаджаліся, а пасля - ён ведаў - кпілі, ацэньваючы яго дамаганні як дзівацтва таленавітага чалавека, які ва ўсім хоча быць арыгінальным.
Амаль пад самым акном аперацыйнай пад яблыняй сядзелі трое маладых людзей: адзін у бальнічным халаце з падвязанай рукой, двое ў майках. Хлопцы разлівалі віно. Хворы быў яго, Ярашаў, рабочы-будаўнік з пераломам рукі. Але як трапілі сюды ў такі час наведвальнікі?
«Хаця б схаваліся. А то расселіся на вачах усёй бальніцы. Вось жа лайдакі!» - з нязлосным дакорам падумаў хірург. Ён мог адчыніць акно і накрычаць на хлопцаў. Але замест гэтага далікатна адступіў у глыб аперацыйнай, каб не спугнуць іх. І самому яму захацелася хутчэй апынуцца на дачы. Сесці вось так на траву, каля свайго ўлюбёнага вогнішча. А потым ляжаць, глядзець у неба і слухаць крыху блытаныя, але цікавыя развагі Шыковіча пра палітыку, мараль і літаратуру. Пра адно толькі падумаў з непрыемнасцю: зноў трэба тлумачыць Галіне, дзе так затрымаўся. Але не ўзлаваўся на жонку, а пашкадаваў яе: яна варта жалю за сваю неразумную рэўнасць.
Павярнуўся, каб пайсці, і ў адчыненых шкляных дзвярах убачыў Машу. Яго трохі спалохала, што сястра магла доўга назіраць за ім. І ён спытаў амаль груба:
- Што вы робіце тут у такі час? - Але спахапіўся і пажартаваў: - Вашы равесніцы даўно танцуюць.
- Я была ў Зосі. - Вочы яе дзіўна бліснулі. - Яна расказвала, як ратавала вас... І пра сябе.
Яраш падумаў: а ці правільна ён робіць, што ні пра што не распытвае ў Зосі? А раптам... Не, не! Ён рашуча адганяў гэтую думку. Таму і не распытвае і рэдка пакуль што наведваецца, бо хоча пераканаць у першую чаргу яе (ды і сябе таксама!), што аперацыя гэтая звычайная і ўсё скончыцца найлепшым чынам.

«Што яна расказвала пра сябе?» - хацелася яму спытаць у Машы. Але нешта стрымала яго.
- Значыцца, больш яна не адносіцца да вас з падазронасцю?
- Мне здаецца, мы пасябравалі.
- Дзякую, Маша.
- Няма за што, Антон Кузьміч. - Яна апусціла вочы, сказала: - Яна пыталася, ці знаёма я з Тарасам, - і раптам папрасіла: - Пазнаёмце мяне з Тарасам.
Цяжка не здзіўляцца - такія нечаканыя паведамленні і просьбы ў гэтай дзяўчыны. Але гэтая просьба Ярашу спадабалася.
- Прыязджайце ў нядзелю да нас на дачу. Пазваніце раніцай доктару Майзісу, у яго свая машына. Я запрашаў яго.
- Дзякую, Антон Кузьміч. Я магу ісці?
- Калі ласка, Маша...
Нейкі момант ён стаяў у аперацыйнай, слухаючы, як недзе далёка ляпаюць дзверы. Потым рушыў у калідор, на хаду развязваючы нарукаўныя матузкі халата. Перад сваім кабінетам спыніўся, хвіліну пастаяў у задуме і... хутка пайшоў па доўгім калідоры, завязваючы матузкі.
У тэрапеўтычным аддзяленні ён пачуў, як адна дзяжурная сястра спалохана крыкнула другой:
- Яраш! - І забегалі, замітусіліся. Ён ніколі не мог зразумець, чаму ў другіх аддзяленнях і клініках яго гэтак баяцца.
Зося, у адной сарочцы, доўгай, пацямнелай ад часу і мыцця, сядзела каля акна і ела чарэшню, выплёўваючы костачкі на газету. Убачыўшы яго, яна войкнула, засаромелася, закрыла рукамі грудзі. Ад яе сарамлівасці і яму зрабілася ніякавата. Год пятнаццаць ужо ён не адчуваў нічога падобнага, заходзячы да хворых і застаючы іх у любым выглядзе. Ды і ўвогуле з ім было гэта толькі аднойчы: калі нарадзіўся іх першынец Віктар і ён, студэнт-выпускнік, наведаўся ў палату, дзе ляжалі парадзіхі.
«Што ты закрываешся? - падумаў ён пра Зосю. - Столькі разоў я цябе аглядаў, выслухоўваў... Буду трымаць у руках тваё сэрца...»
Прывітаўся да ўсіх. У адзін позірк убачыў, што і другія жанчыны накрываюцца коўдрамі, зашпільваюць халаты, прычэсваюць валасы. Іх было ў палаце шэсць чалавек. Дзіўная жаночая псіхалогія! Сарамлівасць іх залежыць ад часу і абставін.
Яраш спытаў у Зосі, як пытаюць усе лекары ў сваіх пацыентаў:
- Як мы адчуваем сябе?
- Добра, - нясмела адказала яна і ўсё яшчэ закрывала грудзі і хавала пад табурэт свае босыя ногі.
Ён узяў на ложку стракаты халат і падаў ёй. Яна хуценька накінула яго, зашпілілася.
- Лажыцеся, - сказаў ён.
Узрадаваная, яна даволі рухава нырнула пад коўдру. Ён узяў табурэт, на якім яна сядзела каля акна, сеў побач.
- Гуляем?
- Мне дазволілі ўставаць, - прыдушаным і спалоханым голасам адказала Зося.
- Ёй дазволілі, - пацвердзіла суседка.
Яраш адгарнуў коўдру і агледзеў ногі хворай, памацаў іх. Ацёк знік. Зусім звычайная жаночая нага - і па колеру і па форме. І твар змяніўся за два тыдні, якія Зося знаходзіцца ў іх бальніцы. Твар памаладзеў, папрыгажэў. Цяпер Яраш лёгка пазнаваў рысы той Зосі, якая некалі смела і дзёрзка схавала яго. Але яму хацелася ўбачыць рысы і таго ж характару. Няхай бы бліснула хоць адна іскра яе дзёрзкасці, рашучасці, весялосці, дасціпнасці, хітрасці! Не, усё задушана, нават хітрасць. Адно хіба свяцілася ў яе вачах - захапленне ім, Ярашам. Але і яно было зусім інакшае, чым тады, нейкае па-рабску пакорлівае.
Хворыя, якія маглі хадзіць, па адной далікатна пакідалі палату: яны шмат што ўжо ведалі. Толькі новая старая, адчуўшы, што гэта «важны доктар», папрасіла:
- Доктар, паглядзіце і мяне.
Ды засталася дзяўчына з прыроджаным парокам сэрца, якую Яраш таксама меўся аперыраваць, хоць згоды яе яшчэ не пыталі, але яна, відаць, адчувала ці чула размовы і кожны раз глядзела на яго з панічным страхам.
З'явілася дзяжурная лекар, ужо заспаная.
- Я вам не патрэбна, Антон Кузьміч?
- Не. Толькі не спіце, калі ласка, так рана. Няёмка, ведаеце... Дзесяць гадзін.

Маладая лекарка «правалілася» скрозь падлогу.
- Дык як самаадчуванне, Соф'я Сцяпанаўна? - ужо зусім не як лекар, хоць і лічыў у гэты момант пульс, а як добры сябра спытаў Яраш, інтымна, даверліва. Гэтая даверлівасць перадалася і ёй.
- З мая сорак трэцяга я ніколі не адчувала сябе лепш, - сказала яна амаль шэптам, але так, што ў Яраша здавіла горла.
Васемнаццаць год фізічных і душэўных пакут! У парыве пяшчоты і спачування ён лёгка сціснуў яе руку, сухую і гарачую. Ад маленькай ласкі такой вочы яе сталі вільготныя. Ён глядзеў у іх бяздонне праз малюсенькія шарыкі плафонаў. Яму не хацелася, каб яна заплакала, і ён падбадзёрыў яе добрай усмешкай і словамі, якія гаварыў многім хворым, але з той розніцай, што ёй ён зноў сказаў «ты» - як блізкаму чалавеку:
- Ты будзеш адчуваць сябе зусім добра. Як усе здаровыя людзі. Можаш паверыць мне.
- Я сто разоў памірала... І, бачыце, не памерла... Бо хачу жыць. Я веру вам.
Яна так вымавіла «хачу жыць» - з працягам, з націскам, што Яраш скалануўся. Дзіўна, але менавіта ў гэтых словах ён нарэшце адчуў характар той Зосі. Сапраўды, дзіўна. Тая Зося ніколі не сказала б такіх слоў.
Тая сказала: «Калі яны ўсё-такі ўварвуцца сюды, вы будзеце страляць?»
«Буду».
«У шафе ў Грота стаіць аўтамат».
І хоць бы задрыжаў голас. Нібы паведаміла, што ў шафе стаіць варэнне.
Незразумела, чаму ў памяці Яраша бліснуў гэты эпізод і гэтыя словы. І невядома, па якіх лагічных законах ён звязаў іх з тым, што яна сказала цяпер, праз васемнаццаць год пакутлівага існавання на мяжы жыцця і смерці.
Яна спытала:
- Вы таксама дзяжурыце?
- Не. Я працаваў.
- Аперацыя?
- Не. Я рамантаваў адзін прыбор.
- Сам?
- З электраманцёрамі.
- Вы ўсё ўмееце! - І, о дзіва, захапленне ў яе вачах ён убачыў таксама ўжо другое, амаль такое ж, што і тады, калі яна даведалася, хто ён.
- Усё ўмець у наш час немагчыма.
- А я нічога не ўмею, - уздыхнула яна.
- Вам здаецца так. Пражыць такое жыццё...
- Хіба я жыла!
- Прафесію можна набыць.
- У трыццаць шэсць год?
- Хіба гэта многа?
- Я ўмею трохі шыць. Там я шыла. Але не люблю. Гэта цяжка і нецікава. Каб вы ведалі, якая пакутлівая работа - прыёмшчыца кравецкай арцелі. Людзі жорсткія і грубыя.
- Людзей кепска абслугоўваюць. Я не думаю, што ў вашым атэлье добра шылі.
- Дрэнна. Але падымаць крык з-за няправільна прышытага гузіка.
- Гузік можа сапсаваць чалавеку настрой.
Яна крыва ўсміхнулася.
- Тады, - ён зразумеў сам - у падполлі, - вам мог сапсаваць настрой гузік?
- Кожны час мае свае законы і нормы.
- Людзі пачынаюць патрабаваць замнога ўвагі...
- Па-мойму, гэта натуральна. Бяда ў іншым, што яе мала яшчэ ў нас, узаемнай увагі. У грамадстве, дзе чалавек чалавеку брат...
- Брат? - Зося, як бы спалохаўшыся, сцерла хусцінкай з вуснаў скептычную ўсмешку і сказала мякка, ласкава: - У вас добрае сэрца, Антон Кузьміч, - пэўна, каб такім чынам скончыць гэтую маленькую філасофскую спрэчку.
Яраш разумеў яе. Занадта многа людзі прынеслі ёй гора і пакут. Яе шчасце, што яна зусім не страціла веры ў жыццё і ў людзей, верыць яшчэ, што побач са злоснымі ёсць людзі добрыя.

Нейкі момант яны маўчалі. Яраш, магчыма, упершыню за ўсю сваю практыку адчуў некаторую няёмкасць каля ложка хворай. Можа, таму, што без пэўнай мэты ён ніколі так доўга не заседжваўся. У яго і цяпер была мэта, але зусім не прафесійная.
Даследаванні і здагадкі Шыковіча, нечаканая сустрэча з Зосяй не толькі распалілі і яго цікавасць да справы доктара Савіча, больш таго - ён адчуў сябе вінаватым, што нічога не зрабіў дагэтуль. Цяпер яму хацелася ўсяляк дапамагчы Кірылу. Той, нецярплівы, гарачы ў рабоце, дамагаўся сустрэчы з Зосяй. Ён, Яраш, як хірург і як псіхолаг, ашчаджаў хворае сэрца пацыенткі і асцерагаў яе ад цяжкіх успамінаў. Таму і цяпер яму нялёгка было падвесці размову да ўспамінаў пра яе бацьку.
Зося, напэўна, сама адчула няёмкасць зацяглай паўзы. Яна сказала:
- Ад мяне толькі што пайшла Маша. Мы доўга гутарылі.
- Я рады, што вы пасябравалі.
- Яна цікавая. Спачатку мне здалося, што яна іграе... А ў жыцці нельга іграць! Некалі, яшчэ ў школе, я хацела стаць актрысай. І таксама іграла выдуманую ролю. Дома, на вуліцы, у гасцях - усюды... Смешна і наіўна.
- Чаму смешна? Маладыя ўсе рамантыкі. Вунь мае дзеці, Тарас, Віця... Якія ў іх мары і жаданні! І я не сказаў бы, што гэта ігра.
- Дзе ён быў тады, Тарас?
- Яго схавалі добрыя людзі. Суседзі.
- Я шукала яго.
- Я ведаю. Мне казала цётка Люба.
- Яна не паверыла мне.
- Не крыўдуйце на яе. Яна была залаты чалавек і найлепшая канспіратарка.
- Яна загінула?
- Не, памерла год назад.
Зося памаўчала, як бы ўшаноўваючы памяць чалавека, з якім лёс звёў яе на кароткі міг.
- Як мне хацелася знайсці яго, гэтага хлопчыка! Я не проста помніла вашу просьбу. Я доўга жыла ёй. Для мяне гэта было першае баявое заданне падпольшчыкаў. І мне хацелася хутчэй выканаць яго. Але бацька... Вы ведаеце, як ён асцерагаў мяне. Навошта ён так асцерагаў? Дзіўны чалавек!.. Употай ад яго я пайшла да цёткі Любы. Сказала пароль. Усё, як вы гаварылі. Яна адказала не зусім так, але пусціла ў дом. Я сказала, што вы прасілі даведацца, ці вядома ёй што-небудзь пра сына Паўла Ганчарова. Яна адказала дзіўна і незразумела: «Перадайце Віцю, што дзядзька Рыгор запрашае на заручыны Веты. У суботу пад вечар». Я сказала, што перадаць нічога не магу, бо вас перапраўлі ў лес. «Да каго?» - спытала цётка Люба. Я не ведала, да каго. Тады, відаць, у яе ўзнікла падазронасць. Яна больш нічога не спытала пра вас. Але калі я зноў паўтарыла сваё пытанне пра Тараса, яна адказала, што нічога невядома. Мяне пакрыўдзіла, што яна такая абыякавая і да лёсу дзіцяці і наогул... Хаця б пацікавілася, хто я і што я. Не, нішто, здавалася, яе не цікавіла. Праўда, паводзіла я сябе неразумна і няўмела. Цётка Люба ўсё-такі спытала, як маё імя. Я адказала, што Вольга. Чаму Вольга і навошта мне было падпольнае імя - сама не разумею. Мабыць, ад жадання сыграць ролю падпольшчыцы.
На другі дзень я пайшла на Каштанавую, дзе жыў Павел. Там я таксама надзівачыла. Ведаеце, што зрабіла? Я - сястра Паўлавай жонкі, шукала іх, жывых. Людзі, якія жылі ў тым доме, збянтэжана пацiскалі плячамі: яны тут нядаўна і нікога не ведаюць. Заплаканая, я паказвала пісьмо, якое сама напісала: «Яны жылі тут, вось адрас. Што ж мне рабіць? Я прыехала ажно з Харкава». Хадзіла па суседзях. Адны рабілі выгляд, што нічога не ведаюць. Другія не таілі сваю падазронасць. Але потым дзве старыя жанчыны, мабыць, паверылі мне і сказалі страшную праўду. Я плакала шчыра. «А хлопчык? Дзе хлопчык? Тарасік». - «Кажуць людзі, у нямецкім дзіцячым доме», - паведамілі старыя. У той вечар я спытала ў бацькі, ці ёсць у горадзе дзіцячыя дамы. «Навошта табе?» Я расказала яму пра вашу просьбу і як я шукала малога. Бацьку гэта спалохала. Ён сярдзіта сказаў, што я загублю і сябе і яго сваімі неразумнымі ўчынкамі. Тады я сказала яму, што больш не буду вартаваць дом і смажыць Гроту трусяціну. «Трэба жыць і змагацца, як ён», - кіўнула я ўгору, маючы на ўвазе вас, Антон Кузьміч. «Ён салдат, - сказаў бацька, - а мы з табой цывільныя людзі, я - стары лекар, ты - дзяўчынка, дзіця». Я сказала яму тады многа тых слоў, якія пачула ад вас. Бацька мусіў здацца. Толькі папрасіў, каб я нічога сама не рабіла, пра ўсё даведаецца ён.

Праз тыдзень, можа, не помню, бацька сказаў, што я магу наведаць дзіцячы дом у Высокай Будзе, гэта кіламетраў пятнаццаць ад горада.
- Я ведаю. Там і цяпер дзіцячы дом, - кіўнуў Яраш.
- Жонка бургамістра Цішчанкі, старая набожная баба, замольваючы грахі свайго мужа, займалася дабрачыннасцю - апекавала сірот. Мы паехалі з ёй на машыне бургамістра. Дзень, помню, быў халодны, дажджлівы. Гэта ж была ўжо позняя восень. А яны, дзеці, худыя, сінія, амаль усе без верхняй вопраткі, у адных падраных сарочачках, абступілі нашу машыну. Маленькая дзяўчынка адразу пацягнула мяне за рукаў і папрасіла: «Цётачка, дайце кавалачак хлеба». У мяне не было хлеба, я нічога не ўзяла, бо не думала, што дзеці там такія галодныя. У дзіцячым доме! Яна, бургамістарша, прывезла нейкія пернікі, нейкае адзенне, магчыма, нарабаванае ў другіх такіх жа дзяцей.
«Дайце ім, Анісся Паўлаўна», - папрасіла я. Старая ханжа, звычайна слязлівая і чуллівая, там трымалася важнай дамай. «Усё трэба рабіць па парадку, мілая. Арганізавана!» Не адразу дзеці знайшлі свайго «пана шэфа». Стары, непаголены, пакамечаны і п'янаваты чалавек, дырэктар ці начальнік, не ведаю, як ён у іх называўся, сустрэў нас не вельмі ветліва. Дзіўна, што і дзеці толькі ўпачатку праявілі цікавасць, а потым старэйшыя пайшлі ў лес па дровы. Я адстала ад патранесы і начальніка, запытала жанчыну, работніцу дома, ці ёсць тут хлопчык Тарас Ганчароў. «Не, у нас ёсць Косця Ганчароў. Ваня, пакліч Косцю». З'явіўся худы цыбаты хлопчык гадоў дзевяці. Не, Тараса ў іх не было. І ўвогуле дзеці такога ўзросту да іх больш не паступалі. Толькі старэйшыя. Можа, гэтая жанчына паспела перадаць нашу размову дырэктару. Але ён дзіўна даверыўся мне. Пакуль бургамістарша раздавала свае гасцінцы, ён стаяў са мной побач і шаптаў:
«Слухайце, не трэба нам дабрачыннасці. Нічога нам не трэба. Нас корміць насельніцтва. Мы самі сябе кормім. Але няхай яны не забіраюць дзяцей. Навошта яны забіраюць дзяцей? Учора пяць хлопчыкаў і пяць дзяўчынак. Куды? Для ўсынаўлення. Хто іх усынаўляе? Дзе? Я павінен ведаць. Я адказваю за дзяцей. Не забірайце маіх дзяцей!»
Гэта быў крык душы чалавека, які падазраваў нешта нядобрае. Калі я расказала пра ўсё бацьку, яго таксама вельмі ўстрывожыла такая скарга дырэктара дзіцячага дома. Пасля я даведалася: ад дзяцей бралі кроў... іх вывозілі ў Германію і малых анямечвалі.
- Нямкамі рабілі? Ой, горачка ж якое! - у вялікай скрусе ківала галавой старая, якая дагэтуль слухала моўчкі.
- Я там, у іх, усё пра Тараса думала: дзе ён? Што з ім?
- І не знайшлі хлопчыка? - бабуля, мабыць, не ўсё зразумела з іх размовы.
- Знайшоўся, - адказаў старой Яраш.
- Дзе ж ён цяпер? - Цікаўнасць гаманкой старой расла, яна як бы ўзнагароджвала сябе за многа хвілін пачцівага маўчання.
- Гэта мой сын.
- Праўда? А божачка! - шчыра здзівілася і ўзрадавалася бабуля. - Няхай жа яму Бог здароўечка дае. Вялікі ўжо?
- У арміі адслужыў. Я заўтра вас пагляджу, бабуля. Добра? - звыкла развязваючы завязкі на рукаве халата, сказаў Яраш.
- Добра, доктар. Цяпер вы частым госцем будзеце ў нас.
Зося зморана і ўсё яшчэ вінавата ўсміхалася.
Дзяўчына на ложку каля акна, здалося Ярашу, упершыню глядзела на яго без страху.
Ён падняўся. Залішне заседзеўся. Стаміў, расхваляваў хворую. Вунь як блішчаць яе вочы. Трымае недзе ў калідоры другіх. Ва ўсім патрэбна разумнае пачуццё меры.
Яму не хацелася напамінаць ёй пра бацьку. Але Шыковіч не даваў спакою. Урэшце, яна сама колькі разоў успомніла бацьку.
Яраш спытаў:
- Скажыце, Соф'я Сцяпанаўна, вы помніце каго-небудзь з інфекцыйнай бальніцы, з кім працаваў ваш бацька... Хто хадзіў да вас...
Яна на хвіліну задумалася.
- Я помню сястру... Клаўдзю... Іванаўну, здаецца. Яшчэ была лекар Вакулава. І лекар Ліберман. Але Лібермана яны загналі ў гета. У акупацыі заходзіла да нас толькі гэтая сястра. Як жа гэта яе прозвішча? - Зося зморшчыла лоб.
- Не трэба ўспамінаць. Пасля, - мякка папрасіў Яраш. - Дзякую вам.

- Завошта? - здзівілася яна.
- Добрай ночы, - пажадаў ён усім адразу і пайшоў да дзвярэй.

**9**

Майзіс з жонкай і Маша прыехалі раней за ўсіх. Яшчэ ў цяні пад вольхамі не апала раса. Яшчэ спалі дзеці Яраша і Шыковіч, які працаваў да дня. А гаспадыні ўжо поркаліся на летняй кухні, пад стрэшкай. Ім памагаў Тарас. Распаліў агонь пад самаробнай плітой, прынёс сталы, дровы і прадукты. Хлопец шукаў сабе работу.
Раніца была надзіва - сонечная, звонкая, з лугу патыхала вільготным халадком, а бор дыхаў неастылай цеплынёй учарашняга дня. Нерухомая ўрачыстасць сосен зноў прадвяшчала спёку. А можа, навальніцу. Дажджу прасілі і людзі і дрэвы. Што б ні здарылася наперадзе за доўгі летні дзень, але раніца такая, што дзіця: прыносіць усмешку і радасць.
Жанчыны гатавалі з добрым настроем. Праўда, паскардзіліся на свой нялёгкі дачны лёс: зноў госці!
- Шыковіч мой нешта астыў, мала каго ўжо запрашае, - зазначыла Валянціна Андрэеўна.
- Затое Антон загарэўся.
- Сёння, Галіна Адамаўна, больш гасцей маіх, - адгукнуўся Тарас. - Але сваіх я магу прыняць на лузе. Акрамя вады і прасторы, ім нічога не трэба.
- Як не сорамна, Тарас! Тваім гасцям мы заўсёды рады.
Галіна Адамаўна казала шчыра. Больш трывожылі яе госці мужа, правільней кажучы, адна госця - Маша. Яна бачыла дзяўчыну разы два ў бальніцы, даўно, можа, год назад. Чаму раптам Антону ўздумалася запрасіць яе? Хіба мала калег-лекараў? Майзіс, напрыклад, - гэта зразумела.
Але трывога яе знікла, калі Майзісы знянацку падкацілі на сваім чырвоным запыленым «Масквічы» і Галіна Адамаўна ўбачыла Машу. Дзяўчына здавалася ёй не толькі нецікавай, але нават вульгарнай. Да ненатуральнасці вогненна-рудая, яна, як бы кідаючы выклік людзям звычайным, і плацце надзела дзіўнае па колеру і па фасону: чырвона-жоўтае, з малюнкам кляновага лісця; лёгкая тканіна, здавалася, не кроілася, не шылася, а сцягвалася ніткамі на самой дзяўчыне - па форме яе постаці. Галіне Адамаўне нават стала весела, калі яна ўбачыла, што Тарас разглядае госцю, як нейкае дзіва.
Яраш чытаў замежны часопіс па хірургіі і выйшаў у піжаме. Ён таксама здзівіўся і сумеўся. Папрасіў прабачэння. Збянтэжыў Майзісаў. Маленькая, чорненькая, нафарбаваная і завітая, як лялька, Даная Вітальеўна ў апраўданне пачала нападаць на мужа:
- Вы ведаеце, Антон Кузьміч, Міхал Евелевіч фанатык. Калі яму нешта ўлезла ў галаву, ён не дасць спакою ні сабе, ні людзям. Бачыце, захацелася чалавеку стаць рыбаком. Антон Кузьміч вучыць яго хірургіі. Дык ён павінен яшчэ навучыць цябе лавіць рыбу. Ах, Міша! Прабачце, Антон Кузьміч...
- Не, не прабачаю. Дамаўляліся ў шэсць, а цяпер дзевяць. Які з вас рыбалоў? Соня!
Яраш жартаваў, а сам пазіраў на Машу, якая з дзіцячым захапленнем разглядала ўсё навокал.
Валянціна Андрэеўна прашаптала сяброўцы:
- Арыгінальная асоба.
Яраш нарэшце ўспомніў, з якой мэтай напрасілася ў госці Маша.
- Тарас! Дзе Тарас? Маша прыехала, каб пазнаёміцца з табой.
Тарас мусіў вылезці са свайго ўкрыцця і таксама збянтэжыўся, бо быў у майцы, у пакамечаных парусінавых штанах і босы. Не, не ўласны выгляд яго збянтэжыў. Нешта другое.
Майзіс працягнуў яму руку проста, па-мужчынску, яго жонка абыякава, без цікаўнасці: у яе свая філасофія - падабацца перш за ўсё гаспадыні. А гэтая вогненная чарадзейка раптам застыла ўся як бы ў непаразуменні, а потым сказала, здалося Тарасу, з расчараваннем:
- Вось вы які! А я думала, вы, як Антон Кузьміч.
Гэта не спадабалася Галіне Адамаўне: чаму ёй хочацца, каб усе былі падобны на Антона Кузьміча?
Калі праз пяць хвілін сабраліся рыбаліць, Яраш спытаў у сына:
- Тарас, ідзеш з намі?
- Не, я застануся, памагу жанчынам.
Тады і «модніца» звярнулася да гаспадынь:
- Дазвольце і мне застацца на кухні.

З-за цікаўнасці - «А што ты ўмееш рабіць, галубка?» - Валянціна Андрэеўна тут жа згадзілася, каб Маша памагла ім.
Яна надзела фартушок, спрытна і прыгожа завязала на галаву касыначку і неяк адразу ператварылася ў простую, сціплую і надзіва дамавітую маладую гаспадыньку. Такое нечаканае ператварэнне ажно спалохала Галіну Адамаўну. А калі Маша пачала раіць, якія закускі можна згатаваць з тых прадуктаў, якія Тарас выцягнуў з пограба, Валянціну Андрэеўну здзівілі яе кулінарныя веды. А жонка Яраша ўсё больш насцярожвалася. Але чым мацней яна настройвала сябе супраць дзяўчыны, тым больш тая падабалася ёй. Калі прыгледзелася, то колер плацця не здаваўся цяпер вульгарным, ён добра пасаваў да чырвоных валасоў. Ды і фасон не такі ўжо стыльны - проста з густам скроены. Першая гэта адзначыла Валянціна Андрэеўна, якая лепш за яе разумела моды.
- Хто вам шыў, Маша?
- Не паверыце, самая маладая краўчыха. Я хадзіла ў палац чыгуначнікаў на курсы кройкі і шыцця і там пазнаёмілася з адной дзяўчынкай. Гарбаценькая, ведаеце, а такая здольная. Наша выкладчыца ледзь не лопнула ад зайздрасці, калі Геня пашыла дыпломнае плацце.
Маша засмяялася. І Валянціна Андрэеўна засмяялася. І Тарас. Цяпер ён зусім інакшымі вачамі глядзеў на дзяўчыну - зацікаўлена і прыязна. Галіне Адамаўне і гэта не спадабалася.
«Аціраешся каля бабскіх спадніц, - падумала яна пра Тараса. - Вельмі нам патрэбны такі памочнік! І што ты робіш? Тарашчыш вочы?.. Пасаромеўся б, брыгадзір камбрыгады».
Але сама яна мімаволі любавалася, як Маша гатуе салату. Па-першае, па свайму адменнаму рэцэпту, а па-другое, так спрытна валодае нажом, лыжкай, што той кухар вышэйшага класа. З той хіба розніцай, што ў яе ў сто разоў больш артыстычныя рухі, здаецца, не гуркі крышыць, а іграе на невядомым інструменце. І кубікі гуркоў у яе роўненькія, прыгожанькія, такія ў іх, старых гаспадынь, не атрымліваліся.
«Калі яна з гэтакай артыстычнасцю працуе ў аперацыйнай, недарма яе Антон так хваліць», - падумала Галіна Адамаўна прыязна, але тут жа адчула, як нядобра ёкнула сэрца. Спытала:
- Дзе вы навучыліся так кулінарнічаць?
- А я да курсаў медсясцёр служыла хатняй работніцай. У палкоўніка.
- Вы... хатняй работніцай?
- Чаму вы здзівіліся? Нас у мамы пяцёра засталося, калі бацька загінуў. Двое малодшыя за мяне. А калгас тады ў нас быў...
Па яе тону здагадаліся, які быў у іх калгас. А яна нібы засаромелася гэтага прызнання, як бы ў тым, што калгас быў бедны, ёсць і яе віна.
Глянула на Галіну Адамаўну, потым на Шыковічыху, якая гатавала фарш для катлет, а сказала Тарасу, па-праўляючы касынку:
- Цяпер у нас саўгас. Тарас, вам няма чаго рабіць, навастрыце нож. Тупы.
Тарас, пачырванеўшы, кінуўся шукаць асялок.
Валянціна Андрэеўна зноў засмяялася. Ёй падабалася гэтая дзяўчына, асабліва пасля такой біяграфічнай даведкі. Яна любіла вось такіх - настойлівых у дасягненні жыццёвай мэты. Маша таксама адчула сімпатыю да гэтай поўнай, гаваркой, па ўсім відаць, добрай жанчыны. Тонкая натура, яна адчула і насцярожанасць, з якой ставілася да яе жонка Антона Кузьміча. І прычыну зразумела. Не абразілася, не пакрыўдзілася, але здзівілася, што ў самой яе таксама з'явіўся пэўны халадок у адносінах да Галіны Адамаўны. Розумам прымушала сябе палюбіць яе, але сэрца не слухалася такога загаду. Сэрца цягнулася да шчырай, ласкавай Валянціны Андрэеўны. Яны хораша гутарылі. Маша з гумарам расказвала пра сваю службу хатняй работніцай, пра сям'ю палкоўніка, пра яго жонку, былую сялянку, пра яе смешнае імкненне быць арыстакраткай.
Усё, напэўна, ішло добра... Але прачнулася Іра (у сям'і Шыковічаў адна маці ўставала рана). У халаце, з ручніком, заспаная і хмурая, з'явілася яна пад паветкай, каб нешта запытаць у маці. Здзівілася, угледзеўшы Машу. Іх пазнаёмілі. Маша ўбачыла праз шкельцы яе акуляраў, што Іра глядзіць на яе зняважліва і насмешліва: «Адкуль ты такая спрытная ўзялася?» Гэта закранула Машына самалюбства.
«Няхай жонка Яраша глядзіць на мяне, як хоча. Яна старэйшая ўдвая. А ты, дурная авечка, чаму працягваеш мне руку, быццам робіш вялікую ласку? Не міргай сваімі блізарукімі вачамі. Я ўсё бачу».
Яна дэманстратыўна адвярнулася да Тараса. Сказала яму:

- А я ведаю, як вас ратавалі ў вайну. Як шукалі...
- Мяне?
Іра хмыкнула.
- У вайну ён пешшу пад стол хадзіў.
Маша не адказала ёй. Яна спытала ў крыху здзіўленага Тараса:
- А вы не помніце? Нічагусенькі? А я помню, як праводзілі тату на вайну. Мне ішоў чацвёрты год. Перад вачамі стаіць, як тата плакаў. Твару не помню, што плакаў - помню. Трымаў мяне на руках і плакаў. А я выцірала яму слёзы.
Расчырванелы Тарас сядзеў на зямлі і разбіваў качаргой у печы галавешкі. Водсвет жару залаціў яго белыя валасы. Іра ўсміхнулася, падумаўшы: «Тарас парыжэў ад гэтай рыжай. Сапраўды, адкуль яна ўзялася? - І тут жа ўспомніла: - А-а, Яраш расказваў пра «залатую сястру», - і зноў хмыкнула: - Залатая!»
Можа, Іра нешта сказала б, але маці глянула на яе строга, папярэджваючы.
Валянціна Андрэеўна рабіла пірог, і рукі яе былі ў белым цесце, а правая скроня ў муцэ. Іра падумала, што і сівая мама будзе прыгожая. У яе расла непрыязь да гэтай рудой. Як незалежна яна трымае сябе на іх імправізаванай кухні! Як гаспадыня. А як размаўляе. Ад вайны і бацькі - да дроў:
- Тарас! Дровы вашы залішне сухія. Не трэба такі агонь. Усё папаліць. Знайдзіце сырэйшыя дровы.
Тады Іра нечакана для сябе самой прапанавала:
- Тарас! Хадзем купацца.
Але найбольшай нечаканасцю гэта было для Валянціны Андрэеўны. Маці што токам ударыла. Няўжо гэта сказала Іра? Тая Іра, якая чырванела і абуралася, калі пры ёй пачыналі размову пра каханне, хлопцаў-жаніхоў, замужжа. Малодшы Славік сваімі бесцырымоннымі жартамі часта даводзіў яе да слёз. А яна, Валянціна Андрэеўна, неаднойчы з болем гаварыла мужу:
«Боязна мне за Ірку. Нейкая яна замкнутая, нелюдзімая. Дваццаць год, а яна што дзіця. Баюся, не выйсці ёй замуж. Шчэ гэтая блізарукасць».
«Выйдзе», - адказваў аптыміст Шыковіч.
Жонка папракала:
«Не думаеш ты пра дзяцей».
«Калі мы абое пачнём гэтулькі думаць, як ты, замнога ўвагі ім будзе. Лепш навучы яе суп варыць».
Іра нават з імі, жанчынамі, не надта ахвотна хадзіла купацца. Больш адна. А пры мужчынах ніколі не скідала плацця, хоць мела самыя закрытыя купальнікі.
І раптам яна запрашае хлопца ісці купацца. Удваіх? Валянціна Андрэеўна проста аслупянела. Што здарылася? Што адбылося з яе Ірай?
- Я ўжо купаўся, - адказаў Тарас, адчуваючы няёмкасць ад такога запрашэння.
У гэты момант Галіна Адамаўна папрасіла яго схадзіць па ваду. Ваду для піцця і стравы бралі ў лясніцтве.
- Давайце я прынясу, - адгукнулася Іра.
Схапіла вёдры і пабегла. Рэдка яна праяўляла такую ахвоту да фізічнай працы. Маці, здзіўленая да ашаламлення, забыўшыся на ўсіх другіх, глядзела ёй услед. І раптам зіхнула думка: Іра, яе Іра закахана ў Тараса. Гэта так відавочна. Яна ўмела хаваць сваё каханне, пакуль яму нічога не пагражала. А ўбачыла гэтую рудую, адчула саперніцу... І знікла сарамлівасць, замкнутасць - усё, што дагэтуль вызначала яе характар. Валянціне Андрэеўне стала і радасна, і балюча, і боязна за дачку. Першае каханне. Першыя пакуты. А што ён, Тарас? Як ён адносіцца да Іры? Яна, маці, лічыла б за шчасце, каб такі хлапчына, разумны, стрыманы, разважлівы, пакахаў яе дачку. Чаму яна адкрыла Ірыніна каханне толькі сёння? Навошта з'явілася гэтая вогненная дзяўчына? Чаму Тарас тырчыць каля іх? Няхай бы сапраўды пайшоў на луг, купацца ці лавіць рыбу.
Іра прынесла ваду. Над быльнягом за паветкай пляснула з конаўкі на твар, выцерлася і далучылася да жанчын.
- Што мне рабіць, мама?
Што ёй рабіць? Ёй так захацелася рабіць, абы застацца тут. У Валянціны Андрэеўны сціснулася сэрца. Можа, упершыню яна адчула на поўную сілу, як няўмела выхоўвала сваіх дзяцей. Якую даць работу, каб Іра магла рабіць яе з такім жа ўменнем, спрытам, артыстычнасцю, як гэтая

чужая дзяўчына, на першы позірк непрыгожая, а ў сапраўднасці элегантная, менавіта праз гэтае сваё высокае ўменне працаваць і трымацца?
- Хадзем дроў напілуем, - сказаў Іры Тарас.
- Дровы? - здзівілася яна, але тут жа згадзілася.
Валянціна Андрэеўна ведала, што не ўмее яе дачка пілаваць, бо ніколі ў жыцці не бралася за пілу. Але ўзрадавалася, што яна пайшла з Тарасам. Цяжка ёй, маці, глядзець і параўноўваць, як працуе Іра і гэтая залатая чарадзейка. На міг адступілі некуды захапленне і любаванне дзяўчынай і з'явілася раўнівая непрыязь да яе. Агіднае пачуццё. Ёй, настаўніцы, зрабілася сорамна за такое пачуццё. Не, яна павінна быць шчырай і аб'ектыўнай.
А другая жанчына - Галіна Адамаўна - у гэты момант думала:
«Няхай бы Тарас закахаўся ў гэтую рудую. Ён бы адгарадзіў яе ад Антона. Антон высакародны чалавек. Але ён слабы, як усе мужчыны. Калі ён прывёз яе, каб пазнаёміць з Тарасам, то, значыцца, нічога ў іх не было, яна добрая дзяўчына, і мне варта прылашчыць яе».
Паднялося над лесам сонца - і ўзняўся вецер. Зашумеў бор, як далёкі марскі прыбой. Знікала ранішняя дымка на небе, быццам вецер старанна працёр гэтае вялізнае блакітнае шкло. Не было душна, як некалькі апошніх дзён. Аднак сонца паліла няшчадна. Доўга чакалі рыбакоў снедаць. Яны не прыйшлі.
Снедалі пад дубамі.
Шыковіч прачнуўся з галаўным болем, не мог знайсці лязо для брытвы, хоць добра помніў, што прывозіў іх з горада, узлаваўся, бурчаў на жонку, на дачку. А ўбачыў Машу - і адразу падабрэў. Валянціне Андрэеўне, разважлівай, спакойнай, якая ніколі не раўнавала беспадстаўна, стала смешна і сумна. З іроніяй назірала за мужам, як ён заляцаецца да Машы, з трывогай - за Тарасам і Ірай. Каб толькі залатая чараўніца не падзейнічала так на хлопца, як на гэтага лысаватага рамантыка, яе мужа. Здаецца, Тарас вядзе сябе больш разумна, паважна, больш стрымана.
А ў Галіны Адамаўны, калі яна ўбачыла, як загарэўся Шыковіч перад Машай, зноў засмактала ў грудзях. У яе была свая грубая філасофія: мужчыны - што каты, адразу, нюхам, чуюць кошку. І яна ўжо амаль ненавідзела дзяўчыну. Але за сталом было весела.
Шумелі дубы. Церушыліся на стол, у талеркі і шклянкі тонкія сухія галінкі, мох, зрэдку злятаў заўчасна пажоўклы ліст. З лугу цягнула густым водарам сухога сена.
Ва ўсіх быў добры апетыт. Маша ела са смакам, многа і па-дзіцячы прыгожа. Шыковіч любіў такую здаровую, «эстэтычную», як ён казаў, яду. Наташа, нягледзячы на пагрозы маці, за снеданнем чытала, не магла адарвацца ад «Запісак вучаніцы». І раз-пораз выбухала такім залівістым смехам, што і ўсе дарослыя смяяліся, хоць і не ведалі, што там, у кнізе.
- Ох, не магу! Памру, - дрыгала Наташа пад сталом нагамі. - Усё, як у нашым класе.
- Наташка, не крыўляйся.
- Што ты, мама! Каб ты прачытала, то сама поўзала б ад смеху. Вы не чыталі, дзядзька Кірыла?
- Не.
- Вы нічога не чытаеце. Самі пішаце, а нічога не чытаеце.
- Наташа!
- Правільна, Наташа. Не ў брыво, а ў вока бі, - ухваліла Валянціна Андрэеўна.
- Валя! Ёсць і другія правілы для дзяцей.
- А я чытала - і нічога там смешнага.
- Бо ты, Ірка, як наша ангелька, смяешся раз у месяц, па святочных днях.
- Наташа! Я табе язык накалю, паганка. Ідзі прэч, - узлавалася Галіна Адамаўна.
- Не трэба, Галя, - папрасіў Шыковіч. - Усе людзі павінны гаварыць, што думаюць. Якая была б шчырасць у адносінах!
- Быў бы поўны хаос, тата.
- А я чытаю мала, - уздыхнула Маша.
- Чаму? - спытаў Шыковіч.
- Не ведаю. А вы - чаму?
- Я? - Ён засмяяўся. - Дзіця маё, я мала чытаю такія кніжкі, якія чытае Наташа. Але колькі я чытаю другіх, часам такіх, над якімі Наташа заснула б на другой старонцы. А рукапісаў! Я аслеп ад рукапісаў. А цяпер яшчэ ад архіўных дакументаў. У мяне цяжкі жанр - дакументальны. Не толькі праца пісьменніка, але і гісторыка, - ён уздыхнуў.

Валянціна Андрэеўна хавала ўсмешку ў кубак з чаем. Яна паважала мужаву працу, яго творчае гарэнне. Але каму ён гаворыць усё гэта зараз, напускаючы на сябе такую паважнасць, скардзячыся на нялёгкі лёс? Незнаёмай дзяўчыне, каб паланіць яе хоць чым-небудзь. Смешны стары дурань! Пасаромеўся б дачкі.
Шыковіч, памогшы Тарасу вынесці пад дубы амаль усе сталы, якія былі на дачы, пайшоў дапісваць артыкул. Тарас і Наташа панеслі рыбакам снеданне.
Жанчыны займаліся той дробнай мітуслівай работай, якой амаль не відаць, але якая надзвычай стамляе і ўрэшце прыводзіць да апатыі, абыякавасці. Прыходзяць госці, а гаспадыню ўжо нішто не цікавіць, яна ўжо згарэла. Да такога стану дайшла Галіна Адамаўна дужа рана: яе стаміла не столькі работа, колькі хваляванне, трывожныя думкі пра мужа і Машу. Яна ўпала пад дубамі на коўдру і... заснула.
Валянціна Андрэеўна і дзяўчаты сцераглі яе сон. Гаварылі напаўголасу.
Маша і Іра быццам бы пасябравалі, разгаварыліся. Валянціна Андрэеўна назірала за імі і бачыла, як лёгка і адкрыта ішла на збліжэнне Маша і як асцярожна, хітра, дыпламатычна падступала да новай знаёмай яе дачка. Маці стала непрыемна. Адкуль гэта ўзялося ў Іры? І наогул, чаму ўсё так атрымліваецца? Здавалася б, простыя бацькі, простыя і шчырыя адносіны ў сям'і - і раптам такія дзеці, зусім розныя і абое з нейкімі дзіўнымі адхіленнямі ад той нормы, што выпрацавала педагогіка, якой яна, Валянціна Андрэеўна, аддала ўсё сваё свядомае жыццё. Упершыню яна падумала пра гэтую навуку без павагі, скептычна ўсміхнуўшыся.
«Можа, Кірыла таму лягчэй перажывае паводзіны дзяцей, што ён не ведае гэтых педагагічных догм. Ён лёгка запальваецца, але лёгка і патухае. Як ён сустрэне Славіка?»
Толькі падумала пра сына, а ён тут як тут.
Яна сядзела пад паветкай на нізкай калодачцы і, задумаўшыся, мыла ў тазе талеркі, відэльцы і нажы. І раптам убачыла не яго - цень. Уздрыгнула, падняла галаву. Славік упаў перад ёю на адно калена.
- Мама, твой блудны сын з'явіўся пад гэтую мірную дачную страху і вінавата схіляе гвалтоўна абстрыжаную галаву. Пасып яе гарачым попелам.
Звыклы яго ход - адразу ўсё перавярнуць на жарт. Яна ўпэўнена, што не так весела ў яго на сэрцы, але ён жартуе, ён усё адно жартуе. Аднак не пра гэта маці думала. Яна даўно не бачыла яго стрыжаным. І ў гэтай стрыжанай, круглай, трохі смешнай роднай галаве яна ўбачыла маленькага Славіка, добрага, ласкавага, таго, які, прачынаючыся, перабіраўся ў іх ложак і вось гэтай стрыжанай галавой туліўся да яе шчакі.
Ёй зрабілася да болю шкада яго. Нясцерпна хацелася ўзяць мокрымі рукамі яго дурную галаву, прытуліць да грудзей, пацалаваць, а потым накруціць гэтыя любыя ружовыя вушы. Салодка было недзе глыбока ў грудзях і горка ў горле. Уміг успомнілася, якім прыехаў у той дзень, калі Славіка пасадзілі, бацька - што хмара. Яна вырашыла, што ён зноў з кім-небудзь пасварыўся ў рэдакцыі, і, каб адцягнуць яго думкі ў іншы бок, спытала, ці бачыў ён Славіка. Як Кірыла падскочыў, як закрычаў:
«Дарожкі ў парку падмятае твой Славік! Пацалуйся ідзі з ім! Выхавала бандыта, педагог няшчасны!»
Яна адразу нават не зразумела, што да чаго. А з Ірай ледзь не здарылася істэрыка. Дачка крычала: «Вось ён, ваш сынок, ваш любімчык! Я даўно казала, што ён зганьбіць усіх нас! Божа мой! Які сорам! Цяпер нельга будзе паказацца ў горадзе. А ўсё вінаваты вы! Абое вы. Бацькі! Патуралі, няньчыліся...»
Валянціну Андрэеўну тады абразілі словы дачкі: быццам з ёй няньчыліся менш.
А цяпер Іра стаяла, глядзела на ўкленчанага Славіка і стрымлівала сябе, каб не зарагатаць.
Яны ішлі ад стала, які накрывалі, убачылі Славіка, - спыніліся за яго спіной. Маша глядзела здзіўлена, Іра - з іроніяй. Валянціна Андрэеўна ўбачыла іх і, схамянуўшыся, сурова сказала сыну:
- Не крыўляйся. Устань!
Славік падняўся, не забыўшыся абтрэсці калена, і паправіў канцы чырвонай вяровачкі, што замяняла гальштук.
Валянціна Андрэеўна раптам узлавалася:
- І каб я не бачыла ў цябе на шыі гэтую дурацкую вяроўку. Выкінь!

Ён паслухмяна сарваў бляшку, вышмаргнуў вяровачку, размахнуўся, каб шыбануць яе ў кусты каля ручая... І тут убачыў сястру і... Машу. Застыў у вялікім здзіўленні. Потым ступіў крокі два ўбок, пакруціў стрыжанай галавой, як бы праганяючы сон. Хутка наблізіўся да дзяўчат. Крыкнуў:
- Мама! Я не сплю? Адкуль узялося гэтае дзіўнае стварэнне? - І да Машы: - Слухайце, вы ж незямная. Я вас часта сніў. Я сніў марсіянак. І ўсе яны падобны на вас. Далібог жа, праўда? Не, скажыце шчыра, вы адтуль? - Ён паказаў на неба і зарагатаў.
- Славік! - сурова спыніла маці. - Вядзі сябе прыстойна.
- А хіба я сказаў што-небудзь непрыстойнае? Клянуся, я шчыра перакананы, што яна адтуль. На зямлі я такіх не страчаў.
Машу абразіла, як бесцырымонна, не пазнаёміўшыся нават, гэты юны шалапут разглядае яе. Абразіла і ўся яго недарэчная балбатня. Яна застыла на міг, а потым падняла руку, прыклала далоню да шчакі, нібы мацаючы, ці не гарачая. Сказала не яму - Валянціне Андрэеўне:
- А я такіх страчаю штовечар. У парку. І заўсёды п'яненькіх.
Словы яе ранілі сэрца маці. Валянціна Андрэеўна адчула непрыязь да дзяўчыны. А са Славіка - што з гусі вада. Ён галантна пакланіўся, шаркнуўшы нагой па сухой траве:
- Дзякую за высокую атэстацыю.
Мабыць, адчуўшы настрой маці, баючыся, што Маша зноў скажа што-небудзь непрыемнае, Іра павярнула знаёмства на звычайны мірны шлях:
- Мой брат. Уладзіслаў. Ён добры, толькі крыўляка.
- Ура! - гукнуў на ўвесь лес Славік. - Мая дарагая сястра прызнае мяне добрым. У такі дзень! Прагрэс!
- А гэта - Маша.
- Маша?
Мабыць, Славіку сапраўды здавалася, што ў дзяўчыны ўсё незвычайнае, і такое простае імя як бы працверазіла яго. Ён зусім сур'ёзна працягнуў ёй руку. Маша нейкі момант вагалася - падаваць руку ці не. Гэта спалохала Валянціну Андрэеўну. Што, калі яна не падасць рукі? Якая будзе абраза для хлопца. Яе заўсёды палохалі нячуласць, чэрствасць.
Але Маша раптам працягнула руку, хораша ўсміхнуўшыся. І ў гэты момант Валянціна Андрэеўна даравала ёй усё.
- Хто вы, Маша? - затрымліваючы яе руку, сур'ёзна спытаў Славік.
- Сястра.
- Чыя?
- Аперацыйная.
- Аперацыйная? - Відаць, да яго не адразу дайшло, што гэта такое. - З бальніцы? - Ён ціха свіснуў, нявесела пажартаваў: - Умее Яраш выбіраць сабе сясцёр. - І, ужо выпусціўшы яе руку, адыходзячы, кінуў убок, яўна з зайздрасцю: - Яраш усё ўмее.
Маці адчула гэтую зайздрасць, гэты нечаканы пераход ад крыўляння да сур'ёзнасці, зразумела, як нялёгка было Славіку прыйсці, і зноў пашкадавала яго: «Які ён худы, падстрыжаны, адны вушы тырчаць. І пад вачамі сінія цені».
- Ты галодны?
- Як воўк.
Яны падавалі яму на стол утраіх - маці, Іра, Маша - усё самае лепшае, што гатавалі для гасцей, як самаму галоўнаму госцю.
Валянціна Андрэеўна адчувала ўдзячнасць дачцэ і Машы за іх чуласць. Яе нават не вельмі кранала, што сын больш аддае ўвагі гэтай амаль незнаёмай дзяўчыне, чым ёй, маці. Пільна сочыць за кожным яе рухам, ловіць кожнае слова і позірк.
«Захапляецца зусім па-дзіцячы», - з замілаваннем падумала маці.
Ад добрага снедання і жаночай клапатлівасці Славік зноў зрабіўся балбатлівы.
- Маша, хочаце, я вас здзіўлю?
Іра спалохана страляла ў яго вачамі: маўчы!
Ёй здавалася ганьбай і сорамам такое прызнанне.
- Я толькі ўчора з турмы.
Ніводная рыска не тузанулася на надзвычай рухавым і выразным Машыным твары.
- І доўга там вас трымалі?
- Дзесяць сутак.

- О-о! - Што значыла гэтае «о-о», ніхто не зразумеў.
- Я пагразіў адным замежным дурням атамнай бомбай. Быццам яна ляжала ў мяне ў кішэні. І - калі ласка, маралісты ўляпілі мне... А ўчора я перачытваў газеты. Я рэдка чытаю. Так, ад смутку. І - божа мой! - што я там прачытаў. Калі мне далі дзесяць сутак, то многім сэрам і лордам трэба даць па дзесяць гадоў. Як яны махаюць гэтымі бомбамі! Жах!
Валянціна Андрэеўна насцярожана замерла: ніколі яшчэ сын не гаварыў пра такія сур'ёзныя рэчы. Няхай з гумарам, але з якім!.. Як вырываюцца праз гэты гумар злосць, абурэнне! Чым ён больш абураецца? Тым, што несправядліва пакаралі яго за п'яную балбатню? Ці тым, што над чалавецтвам вісіць страшэнная пагроза?
- Махаюць нада мной. Над табой! Над табой, мама. А ты хочаш, каб я быў у захапленні ад гэтага свету! Пляснуць у такую вось чароўную раніцу... - Ён нервова засмяяўся.
- Не будзь песімістам, Уладзіслаў, - сказала маці, расчараваная, што сын павярнуў не туды. - Ты ўсё пераблытаў. Сваю маленькую крыўду ты ўзнімаеш да праблемы, якая сапраўды хвалюе ўсё чалавецтва. Але і на гэтую страшную небяспеку ты глядзіш як індывідуаліст і песіміст!..
- Мама, не трэба мне маралі! - Ён кінуў відэлец, заціснуў далонямі вушы, потым правёў рукой па горле. - Я сыты вось так!
- Не, ты паслухай! Людзі змагаюцца і перамагаюць. Вайну. Страх. Голад. Дэспатызм, тупасць...
- Нічога гэтага людзі не перамаглі! Не цешце сябе!
- Няпраўда! - запярэчыла Іра. - Можа, не ўсё, але шмат што перамаглі.
- Перамаглі ў адной вайне, каб пачаць другую? Такую, у якой ужо не будзе ні пераможаных, ні пераможцаў. Застанецца адзін попел.
- Ты проста баязлівец! Панікёр! Ты заўсёды быў баязліўцам! - раздражнёна папракнула Іра.
- Вы самі баіцеся. Вы ўсе нервуецеся, калі пачуеце пра гэта. Усе, акрамя хіба мамы. Я ж чуў, як бацька і Яраш гавораць...
«Няўжо яны так часта гавораць пра гэта?» - падумала Маша. Сама яна нават рэдка думала пра такія высокія матэрыі. Не ўмела гаварыць пра іх, спрачацца. Ды і не было з кім. Сёстры і лекары гаварылі пра атамную вайну між іншым, і то больш з гумарам і ўсе аднолькава. Значна больш іх цікавіла тое, што звязана з жыццём, простым і няспынным, - кватэры, заробак, цэны, каханне, замужжа, дзеці. Маша не ўяўляла, што ёсць сем'і, у якіх вядуць вось такія спрэчкі. Ёй было цікава і дзіўна слухаць. Захацелася самой умяшацца і сказаць нешта значнае, разумнае. Але, дасціпная, знаходлівая ва ўсіх іншых спрэчках і гаворках, тут яна баялася, каб не сказаць глупства, не выдаць прымітыўнасць мыслення.
- Не, Слава, я таксама баюся, - адказала сыну Валянціна Андрэеўна, - баюся, можа, больш, чым усе. Але я веру ў чалавечы розум...
І тут Маша не стрымалася:
- Людзі не збіраюцца сябе хаваць. Людзі жывуць. І будуць жыць!
Проста, амаль наіўна. Але тыя націскі, якія яна зрабіла на «жывуць» і «будуць», надалі яе словам надзвычайную пераканальнасць. Нават Славік хутка ўзняў галаву, паглядзеў на дзяўчыну, усміхнуўся не скептычна - прасветлена, нібы ўбачыў выйсце.
Магчыма, што спрэчка ўсё адно яшчэ працягвалася б. Але выйшаў Шыковіч. Рушыў да іх.
Славік прыўзняўся з-за стала, адсалютаваў:
- Вітаю цябе, стары!
Бацька не адказаў. Валянціна Андрэеўна адчула, што ён кіпіць, і спалохалася; яна была пераканана, што любая грубасць у адносінах да сына пасля ўсяго, што ён перажыў і перадумаў, недаравальна, антыпедагагічна. Іра таксама насцярожылася. Але, відаць, прысутнасць Машы стрымала Шыковіча. Ён спытаў з сарказмам:
- Ну як, герой... нашага часу?
Славік засунуў рукі ў кішэні вузенькіх штаноў, бадзёра абышоў стол, наблізіўся да бацькі, як бы дэманструючы, што ён нічога не баіцца і што ўвогуле з бацькам у яго адносіны вось такія - панібрацкія.
- Ты ведаеш, творца, чартоўскі цікава. Для цябе асабліва. Каб ты пабачыў, якія там тыпы, то памёр бы ад смеху. А пасля папрасіў бы туды творчую камандзіроўку.
Засмяялася Іра. Усміхнулася Валянціна Андрэеўна. Шыковіч адказаў лагодна:
- Балбатун няшчасны. - І да жонкі: - У каго ён, такі чорт, удаўся?

- У цябе, бацька, - адказаў Славік. - Калі ў мяне будзе такая лысіна і такі жывоцік, я буду выліты Шыковіч-старэйшы.
- Калі з цябе выб'юць дурноту?
- Выб'юць!
Шыковіч нахмурыўся.
Маша падумала: як бы яна гаварыла са сваім бацькам? Ёй зрабілася сумна, і яна непрыкметна адышла за дубы, спусцілася да ручая...
Праз хвіліну Славік паклікаў яе:
- Маша!
**10**
Сябры Тараса - сябры яго брыгады - хоць і адчувалі сябе няёмка ў прысутнасці пісьменніка, дактароў, іх жонак, але, узбуджаныя ракой, лугам, купаннем і гульнёй, на пачатку абеду былі шумныя і вясёлыя. Бурна рэагавалі на тосты Шыковіча, на шчырыя дзіцячыя каментарыі Наташы, нават на недарэчныя жарты Славіка.
А калі выпілі і закусілі, то сціхлі, абмяклі. Дзіўная з'ява! Здарылася гэта таму, што хлопцы пілі вельмі стрымана - толькі віно і не асушвалі чаркі да дна. Было ў іх такое правіла. Не запісвалі яго ні ў якія абавязацельствы, але дамовіліся паміж сабой: аскетамі не будзем, аднак у любых абставінах, у любой кампаніі, на любым вяселлі кожны павінен помніць пра сваё высокае званне.
Славіку ўдалося глытнуць каньяку з бутэлькі яшчэ да таго, як селі за стол. Мабыць, бацька і маці здагадаліся пра гэта і цяпер пільна сачылі за ім. Хлопец увесь час адчуваў калючы, насцярожаны, папераджальны і пагрозлівы бацькаў позірк. «Стары конь», як ён у кампаніі сяброў часам называў бацьку, сядзеў як на старшыньскім месцы і добра бачыў увесь стол. Бутэлька з гарэлкай абмінула Славіка першы раз і другі. Сусед злева, доўгі, сутулы слесар-зборшчык, смешны на выгляд і са смешным спалучэннем імя і прозвішча - Генрых Варэнік, наліў яму яблычнага віна, якое хлопцы прывезлі з сабой. Славік выпіў, паморшчыўся, быццам воцату каўтнуў:
- Дрэнь. - І папрасіў Машу, якая сядзела побач з другога боку, каб падала бутэльку з гарэлкай. - Давай, сусед, лепш вось той божай слязы...
Маша пацягнулася за бутэлькай, але яе перахапіла Іра і перадала Тарасу - далей ад брата. Славік зразумеў, што супраць яго змова. Жэстамі паказаў Тарасу: дай нам з Генрыхам.
Але гэты «сагнуты Варэнік» запярэчыў:
- Не трэба. Я не п'ю.
Славік узлаваўся. Зашыпеў яму на вуха:
- Не п'еш?
- Не.
- Хлусіш. Я ж бачу, як ты каўтаеш сліну.
Генрых збянтэжыўся, пачырванеў, як дзяўчына. Яго выручыў сябра - бялявы, прыгожы, памяркоўны з выгляду Іван Ходас. Ён пачуў, што сказаў Славік, нахіліўся да яго за спіной Генрыха і пагрозліва прашаптаў:
- Мы такіх разумнікаў бачылі. І ведаем, чаго варта твая «шчырасць».
- Чаго? - натапырыўся Славік.
- Я асабіста сапсутай гайкі за яе не дам.
- А я плюю на вашу крытыку.
- Ты дзе вырас такі? На Брадвеі? Мне шкада цябе.
- Пашкадуй сваю маму.
- Хлопцы! Хлопцы! - прасіў Генрых.
- Вось такія на родную маму гатовы плюнуць.
А маці ўжо тут. Валянціна Андрэеўна непрыкметна падышла ззаду, паклала адну руку на плячо сыну, другой дакранулася Івана.
- Што ў вас, хлопчыкі? Можа, чаго не хапае?
- Не. Дзякуем, Валянціна Андрэеўна. Гэта мы з-за футбола паспрачаліся. Якая каманда сёння выйграе.
«Здзекуецца, гад», - ажно перасмыкнула Славіка. Ён наліў сабе таго ж паганага віна і дэманстратыўна, на злосць усім, выплеснуў у рот.
Маша, якая чула ўсю іх размову, ціха сказала:
- Ты задзірысты певень.

- А ты рыжая курыца.
Яна бяскрыўдна засмяялася. А ў Славіка ўжо залез чорцік: хлопцу хацелася ўсіх крыўдзіць і каб да яго таксама чапляліся. Тое, што Маша не пакрыўдзілася за «рыжую курыцу», трохі абяззброіла яго. Ён надзьмуўся, прыслухаўся да застольнай гаманы.
- Мы можам выхоўваць чалавека ў сваёй брыгадзе. А выхоўваць начальніка змены, інжынера - нам, рабочым!.. Яго інстытут не выхаваў, - даводзіў Тарасу яго сусед, самы старэйшы з іх брыгады, мужчына з тварам баксёра (нават нос сплюснуты) - Васіль Лапацін. Ён прыехаў з жонкай. Славік заўважыў, што дзябёлая, здаецца, цяжарная жанчына сама ела мала, сарамліва, а мужу падкладвала смачнейшыя і большыя кавалкі і ўвесь час непрыкметна падлівала віна. Ён выпіваў цішком, як ваду. Славіка гэта развесяліла.
«Вунь вашы праведнікі як дзейнічаюць», - хацелася яму сказаць Генрыху. Але той шаптаўся з Іванам.
- Талстоўская філасофія ў цябе. Часам трэба і па мордзе даць.
«Пра мяне, гады. Паспрабуй даць».
- Я Волгу пераплываў...
- Дзе? Каля вытоку?
Самыя малодшыя, сярод іх і Віктар, жартуюць на другім канцы стала, у іх свая тэма: спорт, рэкорды, галубы.
«Нецікава. Я вырас з гэтых штаноў».
- Наташка, наелася? Бяжы гуляй.
- Што ты, тата? Я ж люблю гасцей. Ты хіба не ведаеш?
- Гасцінная натура!
- Аднойчы на імяніны яна запрасіла два класы - свой і паралельны. Помніш, Антон?
- У нас Славік быў такі.
«Быў... Быццам мяне пахавалі».
- Хлопчыкі, ешце. Усё, што на стале, павінна быць з'едзена. Кірыла, прапануй тост.
- Праўда, ён цікавы, Косця? Як цыган. Глядзі, якія вочы. Як вуглі. А зубы якія!
«Наіўна, але правільна, сястра. Хвалі другіх, каб адвесці ад таго, з каго сама не спускаеш вачэй».
Славіку рабілася нудна, і ён пачаў шукаць, чым бы пазабаўляцца. Падсунуўся бліжэй да Машы, дакрануўся нагой да яе нагі. Яна строга глянула на яго і адсунулася да Іры.
Яраш з цікавасцю прыглядаўся да моладзі. Пасля размовы з Машай, калі ён адчуў раптам разрыў паміж такімі, як яна, і сабой, яго зацікавіла моладзь. Уся моладзь: маладыя лекары, сёстры, санітаркі... Але сябры Тараса асабліва. Рабочы клас. Творцы матэрыяльных каштоўнасцей.
Пакінуўшы Майзіса і яго жонку, якая стаіла крыўду, Яраш ганяў з хлопцамі па выкашаным лузе мяч, спаборнічаў у плаванні, загараў. Услухоўваўся ў іх размовы. Але на адпачынку словы і думкі былі лёгкія, як той мяч, што ганялі. Ён не верыў, што можна пагаварыць сур'ёзна цяпер за сталом, але паспрабаваў арганізаваць такую размову. Пастукаў відэльцам па пляшцы, просячы цішыні. Моладзь адразу ўгаманілася, бадай, хутчэй, чым перад тостамі Шыковіча.
- Хвіліначку, сябры. Сумнавата робіцца за нашым сталом. Сепаратныя размовы, шаптанне... Давайце паспрабуем пагаварыць калектыўна. Пра што? Адкажам, напрыклад, на такую анкету: мае мары, маё ўяўленне пра будучыню, чаго я хачу, да чаго імкнуся. Ша! Не хаваю нашага з Кірылам Васільевічам хітрага намеру - выпытаць пра вашы мары. Мы тут з ім часта спрачаліся наконт ідэалаў маладога пакалення. Толькі ўмова: адказваць шчыра, не баючыся, што адказы вашы трапяць у друк. Карэспандэнтаў тут няма.
- А Кірыла Васільевіч?
- Ён без пяра. Акрамя таго, у яго прынцып: калі ем...
- То глух і нем. Адно мурлыкаю, як кот.
Засмяяліся, заварушыліся, трохі ўзрушаныя нечаканай прапановай. Кожны, безумоўна, адразу падумаў: пра што сказаць? Хіба мала іх, мар? А якая галоўная?
Славік хмыкнуў. І здзейсніў намер, які з'явіўся хвілін колькі назад: апусціў руку пад стол, дакрануўся да Машынага голага калена. Яна ўздрыгнула, тузанулася, ушчыпнула яго за руку. Сказала спакойна:
- Славік, схопіш аплявуху.
Іра здагадалася, што ён зрабіў, і вочы яе пад шкламі акуляраў сталі жоўтымі ад гневу.
- Славік! Паскуда! Я маме скажу.

- Закрычы, ябеда. Ты ўсё жыццё нагаворвала.
Бацькі ўжо звярнулі ўвагу на іх злоснае перашэптванне. Валянціна Андрэеўна зноў падышла да сына, ласкава папрасіла:
- Прынясі, сыне, піва з пограба.
- Чакай, паслухаю людзей будучага.
- Дык хто пачне, хлопцы? - запрашаў Яраш.
- Косця! - падказала жонка Лапаціна.
Той самы Косця, якім захаплялася Іра, маленькі, рухавы, смяшлівы і самы малодшы ў брыгадзе, падскочыў, як школьнік. Чорныя вочы яго загарэліся, як вугалькі. Можа, ён не адразу зразумеў, што ад яго патрабуюць.
- Сядайце, Косця. Што вы! - адразу запярэчыла Валянціна Андрэеўна. - Гэтак будзе не сяброўская гутарка, а непрыемны экзамен. Ты сам, Антон Кузьміч, пачні.
- Не, я пасля скажу, пра што я марыў, калі мне было столькі ж гадоў. Параўнаем...
- Я скажу, - адгукнуўся Косця. - Я думаю пра ўсё... Пра дзяўчат...
- Вось гэта шчыра! - засмяяўся Славік.
Але яго смеху не падтрымалі, можа, таму, што Косця тут жа запэўніў горача, з дзіцячай непасрэднасцю:
- Я хораша думаю пра дзяўчат... Жанчына дае жыццё і красіць яго, усё прыгожае ад жанчыны. Я многа думаў пра касмічныя палёты. Але, ведаеце, самому мне чамусьці не хочацца ляцець туды.
- Баішся? - зноў гукнуў Славік і быў рады, што ў гэты раз выклікаў смех.
- Не, не баюся. Але я люблю зямлю... дрэвы і кветкі. Для мяне найвялікшая радасць бачыць вось гэты лес. Я так мяркую, што ў камунізме ўсе людзі павінны жыць сярод дрэў і кветак. Тады ўсе стануць добрыя, вясёлыя...
- Правільна! Я таксама за тое, каб усе сталі дачнікамі.
- Слава! Вылеціш з-за стала, як корак з бутэлькі, - не стрымаўся ўрэшце Шыковіч-старэйшы.
- Маўчу, як фаршыраваная рыба. - Славік зацiснуў рот далоняй.
- Карацей кажучы, я хацеў бы пажыць у грамадстве, дзе не будзе людзей злосных, несправядлівых, дурных, несумленных...
- У Косці хрысціянская мараль, - перапыніў сябра Іван Ходас. - Яму здаецца, што такое грамадства нехта падасць на талерцы, калі ласка, Косця, жыві, расці кветачкі, гадуй дзетачак... А для мяне - радасць у змаганні. І я думаю, што камунізм - гэта найвышэйшая форма барацьбы.
- Супраць каго?
- За што?
- Супраць дурняў, бюракратаў, дармаедаў... Я не кажу ўжо пра ворагаў знешніх, імперыялістаў розных...
- А калі іх не стане? Знішчым?
- Ага!
- Я не заглядаю так далёка! І ў царства ўсеагульнага цалавання не веру. І сярод анёлаў жыць не жадаю! Нудна. Я сам злосны і, магчыма, бываю несправядлівы. Малы быў - маму крыўдзіў. Дык што ты, і мяне знішчыш? - горача насядаў Ходас на Косцю.
- Завёўся ўжо! - папракнула яго Вера, жонка Лапаціна.
Іван асекся, павярнуўся да гаспадароў: як рэагуюць яны? Яраш з ухвалой кіўнуў галавой. Шыковіч сказаў:
- Я згодзен, Іван. Камунізм пабудуюць не святыя, а мы з вамі, кожны са сваім характарам, даволі часта вельмі супярэчлівым і складаным. Але бясспрэчна і тое, што мы павінны стаць лепшымі, чым ёсць. Пазбавіцца перажыткаў... Як гэта зрабіць хутчэй? Што, па-вашаму, мае першаступеннае значэнне ў выхаванні камуністычнай культуры пачуццяў?
Іван задумаўся. І ўсе змоўклі, задумаліся таксама.
- Калектыў, - першы адгукнуўся Тарас.
- Праца, - амаль адначасова з ім выказаўся Лапацін, прынімаючыся за кавалак пірага, які падсунула яму клапатлівая жонка.
- Барацьба! - не адступаў Ходас ад сваёй пачатковай думкі.
- Праўда! - Славік сказаў гэта сур'ёзна, цвёрда, пераканана. - Пакуль будзе ханжаства, падман...
Кірыла Васільевіч пераглянуўся з жонкай і, відаць, хацеў нешта адказаць сыну. Але перапыніў Косця.

- Любоў! - крыкнуў ён.
Усе маладыя засмяяліся. Акрамя Славіка.
- Цябе ўсё-такі хіліць да Езуса, - падкалоў сябра Іван.
- Чаму любоў, Косця? Растлумач!
- Любоў не ў вашым вузкім разуменні. А наогул. Любоў з вялікай літары. Да радзімы, да працы, да людзей, блізкіх і далёкіх...
- Якая шчодрая душа, - з добрай усмешкай сказала Галіна Адамаўна так, што пачулі толькі свае - Майзісы і Шыковіч. - Можна падумаць, што яго ніхто ніколі не крыўдзіў.
- Прадстаўнік пакалення, якое не ведае, што такое нянавісць. - І на поўны голас да Косці і да ўсіх:
- Па-мойму, Косця, такая любоў - гэта мэта, а не сродак. Тое ж самае і твая праўда, Славік. Да такой праўды і такой любові мы прыйдзем... Безумоўна, Іван, праз барацьбу з маральнымі заганамі і ўсімі тымі, хто будзе перашкаджаць... І, напэўна, маюць рацыю таварышы, Тарас, Васіль Пятровіч, што праца... праца ў калектыве... грамадска карысная - галоўны фактар. Раз Шыковіч павярнуў на тэорыю, няхай ён падводзіць вынікі. А мне хацелася пачуць ад вас больш простыя адказы. Каб кожны пра сябе. І я скажу пра сябе. Планы, мары, жаданні... Вось Генрых маўчыць...
Генрых, які сапраўды не сказаў ні слова, пачырванеў, збянтэжана ўсміхнуўся. Сябры скіравалі на яго позіркі, чакалі яўна з цікавасцю. Ён прыгладзіў дзвюма далонямі валасы і затрымаў рукі на патыліцы.
- Мары, яны не пастаянныя, Антон Кузьміч. Калі я быў вучнем, то вельмі любіў чытаць раманы. Ну, Вальтэра Скота, Дзюма... І мне страшэнна хацелася быць рыцарам, выратаваць прынцэсу - абавязкова прынцэсу! Не ніжэй! - і... жаніцца на ёй.
Моладзь стрымана засмяялася.
- А цяпер я штоноч сяджу над тэорыяй машынабудавання, супраматам, мару, як бы хутчэй здаць экзамены, стаць інжынерам і... жаніцца на Зоі Крахмалавай.
Выбухнуў такі рогат, што з-пад стала спалохана выскачыла кошка. Гаспадары і Майзісы не разумелі прычыны гэтага рогату, а таму ветліва ўсміхаліся весялосці моладзі.
Вера, выціраючы слёзы, тлумачыла ім:
- Ён заўсёды так, маўчыць, маўчыць, а потым як ска-а-жа...
А Генрых павярнуўся да Славіка і сказаў яму:
- Твая чарга. Па парадку.
- Я? - здзівіўся Славік, тыркнуўшы сябе ў грудзі пальцам. - Чаму я? Пра што мару? Ні пра што! Хачу? - Ён абвёў дзёрзкім позіркам усіх, хто сядзеў за сталом, - ад бацькі да Косці, потым павярнуўся да Машы і сказаў быццам ёй адной: - Хачу паляцець у космас. У пустату. Дзе б ніхто не дапытваў і не чытаў «маралаў».
Усе сціхлі, усім зрабілася няёмка, бо ведалі, што хлопец толькі што адбыў пакаранне за свае паводзіны. З далікатнасці ніхто не напамінаў яму пра гэта. Шанавалі бацькоў - паважаныя людзі. Усе бачылі, як уразілі іх раздражнёныя сынавы словы. Асабліва маці. Валянціна Андрэеўна, схаваўшы вочы, сціснула мужаву руку, молячы яго маўчаць.
Каб загладзіць няёмкасць, Маша вырашыла перавесці ўвагу на сябе, сказала весела, гарэзліва:
- А я ведаеце пра што мару? Выйсці замуж за добрага, разумнага чалавека і нарадзіць добрых, разумных дзяцей.
Хацела, каб гэта прынялі як жарт, але сустрэлася вачамі з сур'ёзным і здзіўленым позіркам Наташкі і... збянтэжылася, загарэлася ўся, бо здалося ёй, што сказала пры малой непрыстойнасць. Пэўна, праз гэтую яе збянтэжанасць ніхто не пачаў жартаваць з такога прызнання. Нават усмешак яна не ўбачыла. Стрыманасць такая ішла ад той жа далікатнасці. Але Машы яна здалася дакорам агульным. Чаму яны такія сур'ёзныя? Чаму так свідруе яе позіркам жонка Яраша? Праўда, сам Антон Кузьміч падтрымаў яе:
- Вось гэта зямная мара! - і яшчэ нешта сказаў.
Але Маша не пачула. У вуха ёй горача дыхнуў Славік:
- Хочаш, я зраблю табе дзіця? - і зноў дакрануўся рукой да калена.
Цынічны шэпт яго і дотык абразілі дзяўчыну, і яна здзейсніла сваю пагрозу - пляснула яму па твары. Не моцна. У другіх абставінах магло б сысці за жарт. Але ў той момант аплявуха прагучала, як гарматны стрэл.
Аглушыла і сталых і маладых. На міг усе застылі. Першая падхапілася Іра. Крыкнула брату:

- Хам! - і выскачыла з-за стала.
Пагрозліва павольна падняўся Шыковіч. Жонка паспрабавала стрымаць яго, ён тузануўся ўсім целам, як бы вырываючыся. Але сказаў спакойна, амаль весела:
- Хадзем, Уладзіслаў, пагаворым, - і рушыў да дачы. Не азіраўся, ці ідзе Славік за ім, не чуў, як той, весела падміргнуўшы хлопцам, кінуў: «Іду на эшафот», не бачыў будынка, лесу, неба і сонца, усё кіпела ў яго грудзях. Калацілася сэрца, млелі ногі...
Толькі ў пакоі Кірыла павярнуўся і ўбачыў, што Славік стаіць на парозе, засунуўшы рукі ў кішэні штаноў. Такая нахабная пастава яшчэ больш абурыла.
- Падыдзі бліжэй! - працадзіў ён праз зубы.
Славік, іранічна ўсміхнуўшыся, не ступіў тры крокі, а, здавалася, павольна прасунуўся, як на лыжах. Магчыма, каб не такая яго ўсмешка, усё было б, як многа разоў дагэтуль: успыхнуў бы феерверк гнеўных слоў і... патух. Ні разу Кірыла не падымаў на сына руку. Не мог, бо любіў яго. Але тут сарвалася апошняя кропля цярпення.
- Рукі з кішэняў! - грымнуў ён і, не дачакаўшыся, пакуль сын выканае загад, схапіў за адварот тэніскі, ірвануў на сябе. - Ты! - І з усяго размаху саданўў правай рукой у сківіцу.
Славік адляцеў да дзвярэй, ударыўся спіной аб вушак, споўз на падлогу, войкнуў, схапіўся за шчаку. У той жа міг у дзвярах з'явілася маці. Загарадзіла сабой сына, замаліла да мужа:
- Што ты робіш, дурны? Пасаромейся!
- Змоўкні! - у страшэнным гневе закрычаў Кірыла. - Абаронца! Ты бачыш, да чаго давяла твая абарона? Шчанюк! Ты доўга будзеш ганьбіць добрае імя бацькі, маці, сястры? Хто цябе выгадаваў такога?!
- Не крычы! Людзі, - зморшчылася Валянціна Андрэеўна, заклапочана схіліўшыся над Славікам, які сядзеў нерухома, рукамі закрыўшы твар.
- Табе сорамна людзей, калі я крычу? А за яго табе не сорамна? Пашкадуй, пашкадуй яго, вытры соплі, ён табе не адну яшчэ пілюлю падсуне. Герой! На што ты здатны? Што ты ўмееш? Толькі можаш, што паскудзіць, як шалудзівы кот.
- А сам ты што ўмееш? Біцца? - праенчыў піскліва Славік. - Стары конь!
Недарэчнае пытанне і яшчэ больш недарэчная мянушка прагучалі надзвычай па-дзіцячаму, вырваліся ад бяссільнай злосці і крыўды. Гэта расчуліла Шыковіча. Стала шкада сына і брыдка за свой учынак. Нікога ў жыцці ён не біў, нават калі быў хлапчуком, пазбягаў боек, часцей білі яго. А тут - выкінуў з кабінета Рагойшу, ударыў сына... Што здарылася? Нервы? Аднак, каб не раскіснуць, ён пагразіў:
- Я табе пакажу «конь»! Ідыёцкі жаргон! Разбэшчаныя шчанюкі! - Злосна да жонкі: - На рукі яго вазьмі! Пакалышы. Соску дай. Пе-да-го-ог!
І выйшаў. На верандзе адчуў, як дрыжаць рукі, ногі, «сігналіць» сэрца. Падумаў: «Так інфаркт нядоўга схапіць».
А Славік, пачуўшы, што бацька выйшаў, уткнуўся тварам у матчыны рукі, якія хацелі падняць яго з падлогі, і... заплакаў. Зусім па-дзіцячы, усхліпваючы.
Хлопцы ляжалі на беразе ракі, на пясчанай касе. Грэлі спіны на стомленым ласкавым сонцы. Слухалі, як ззаду ціха плешчацца і журчыць вада, а наперадзе, на адхоне, шалясціць лазняк. Вецер сціхаў - і ўсё сціхала, лагаднела, утаймоўвалася: вада і лес, птушкі і чалавечыя страсці. Нават ластаўкі, што гняздзіліся ў абрыве, лёталі без заўсёднай сваёй трывогі. Хлопцы займаліся адным: ляніва падграбалі пад сябе цёплы, вымыты ракой да белізны пясок і сачылі, як у чыстым небе над лугам плавае коршак. Гэтак жа ляніва і спакойна, не палюе - адпачывае. Калі коршак раптам куляй упаў уніз, у кусты, яны, як па камандзе, апусцілі галовы на рукі і праз сухі пясок удыхалі вільготныя пахі ракі. Пасля іх увагу прыцягнула маленькая, у залатой манішцы і блакітным фартушку птушачка: яна села за паўкроку ад Косцевай галавы і, віхляючы зялёным хвосцікам, праскакала міма ўсіх, як бы правярала, ці жывыя гэтыя голыя нерухомыя людзі. Яе не спалохаў і голас Генрыха:
- Хлопцы, хто ведае, як называецца гэтае прыгожае птушанятка?
Маўчанне.
- Ніхто не ведае? Косця?
- Шчурка.
- Дакладна? Маўчыш? Як мала мы ведаем!
- Дарэмна ты, Тарас, пацягнуў нас на гэтую куркульскую дачу, - прабурчаў Іван Ходас.

- Не папракай! - крыкнуў Косця.
- Я не папракаю.
Тарас маўчаў. Ён думаў пра Машу. Здзіўляўся: «Чаму я думаю пра яе? Дзіўна. Што дала аплявуху таму шалапуту? Яму варта. Але не гэтак. Не да месца было. Сапсавала абед, настрой усім... І сабе».
Як задрыжалі яе вусны, калі Шыковічы адзін за адным - сам, Славік, маці - пайшлі ў дом, а Іра і Яраш пачалі прасіць у яе прабачэння. Тарас бачыў, як крывілася Галіна Адамаўна, яна асуджала Машу, асабліва ёй не падабалася, што муж просіць у сваёй падначаленай прабачэння. Майзісы адразу пачалі збірацца дадому. Хлопцы падзякавалі Ярашам і, вылезшы з-за стала, тут жа зніклі. З Машай яны не развіталіся. Чаму? А цяпер маўчаць. Ну і да д'ябла, няхай маўчаць.
«Завошта яна пляснула яго? Што ён такое сказаў?»
- Куды ён хоча падацца цяпер?
- Хто?
- Гэты... «атамшчык».
- Славік? Не ведаю.
- А навошта яму куды падавацца? У бацькі грошай хопіць.
- Не думай дрэнна пра Шыковіча. Гэты чалавек правільны.
- А сынок?
- Чорт іх ведае, адкуль яны бяруцца, такія сынкі.
- Глядзіце, зноў коршак. Што ён выглядае?
- Шкада, што не паслухалі Яраша. Пра што ён хацеў расказаць?
- Хлопцы! А давайце возьмем яго ў сваю брыгаду!
Косця, падцягнуўшыся на руках, прасунуўся наперад і сеў, павярнуўся да хлопцаў, каб бачыць іх твары.
Тарас падняў галаву і паглядзеў: сур'ёзна ён? Маленькі, але ладна збіты, загарэлы, чорны, Касцік сядзеў на пяску, як будыйскі бажок; блішчалі зубы і гарэлі вочы - прыкмета таго, што ён гатовы да знямогі абараняць сваю ідэю. Іван Ходас глянуў на яго адным вокам і свіснуў у пясок, выдзьмуўшы ямачку.
- Не хапае табе дзярма?
- А што? Калі мы такая брыгада, то чаму не памагчы чалавеку стаць на верны шлях?
- Завод не школа-інтэрнат.
- Сябры, цікавая з'ява - супрацiўленне матэрыялаў...
- Генрых, не трызні. Ці захоча ён сам? - спытаў Лапацін і павярнуўся на спіну, тварам да сонца.
Тарас сеў. Косцева прапанова падабалася. Сапраўды, чаму б ім не ўзяцца за гэтага неўраўнаважанага юнака.
Генрых пісаў пальцам на пяску доўгую формулу.
- Я пагавару з ім.
- Ты згодзен? Тарас? - Іван так дзьмухнуў у пясок, што засыпаў Генрыхаву формулу. - Вар'яты! Не бярыце на сябе ўсяго, зробіцеся пазёрамі. Я - супраць.
- Гаворыш, што камунізм - гэта змаганне, а сам не хочаш лішні раз паварушыць рукамі і мазгамі. Як жа ты думаеш змагацца за такіх?..
- Гнаць у шыю.
- Куды?
- На ўсе чатыры.
- Ну і логіка ў цябе!
- Логіка жалезная. А чаму я павінен падбіраць усялякае смецце і выкладаць элементарныя нормы паводзін? Я сам сябе яшчэ не выхаваў.
- Вось гэта правільна!
- Сам баіцца, каб гэты «стыліст» не перавярнуў яго ў сваю веру. Як жыд папа. Ведаеце показку?
- Пішы свае формулы! Канструктар ліпавы!
- Хлопцы, не сварыцца! - Лапацін запляскаў у далоні. - Усіх вас выхаваюць жонкі. Толькі жаніцеся...
- Цябе выхавала?
- А што ты думаеш? Я таксама ў пажыўныя мясціны заглядваў, як жаўтароцік гэты. Нават калі ў брыгадзе ўжо быў. А паспрабаваў бы цяпер!

- То-та, бачу, валасы ў цябе пачалі радзець.
Зарагаталі. Жарт найлепшым чынам прымірае людзей. Тарас адчуў, што настрой ва ўсіх узняўся. Лапацін брыкнуў Івана нагой. Той злавіў нагу і пацягнуў «жанаціка» да вады. Тарас ускочыў, разбурыў усе Генрыхавы формулы і схапіў Лапаціна за рукі. На падмогу ім кінуўся Косця. Утрох яны раскачалі свайго паважнага сябра і шыбанулі ў раку, ведаючы, што ён кепска плавае і баіцца вады. Самі скочылі следам за ім. Пырскі бліснулі на сонцы вясёлкавымі пералівамі. Хвалі пакаціліся на пясок, лізанулі Генрыху ногі. Ён устаў, прыгожа пацягнуўся, кінуў на адзенне акуляры і, разагнуўшыся, ракетай пайшоў пад ваду. Ён быў лепшы плывец. І ўсе яго сябры, што дурэлі ў вадзе, сціхлі, з цікавасцю і, магчыма, з трывогай чакаючы, калі і дзе Варэнік вынырне. Ён вынырнуў амаль на сярэдзіне ракі. Паплыў хутка, спрытна выкідваючы з вады ўсё цела. Не плыў, а ляцеў.
Тарас і Косця пайшлі за ім. Плылі побач. Косця сказаў:
- А гэтая рыжая сядзела з ім, а вачамі страляла ў цябе.
Тарас збянтэжыўся.
- Ды ну цябе, Косця! Выдумаеш! - Але яму было прыемна, і ён пахваліў сябра: - А наконт Славіка - гэта ты добра прыдумаў. Трэба пераканаць хлопцаў.

**11**

Яраш перад аперацыяй начаваў у горадзе. Шыковіч ляцеў на сваім «Масквічы» адзін, рызыкуючы апынуцца пад адхонам. У прыгарадзе, на чыгуначным пераездзе, быў зачынены шлагбаўм. Старэнькі закапцелы паравозік з адной платформай дошак манеўраваў быццам на здзек шафёрам. Шыковіч, машына якога стаяла першая, утыркнуўшыся ў шлагбаўм, кіпеў: крычаў вартаўніцы, пагражаў кулаком машыністу, праклінаў усе чыгуначныя парадкі.
А ў бальніцы яго не прапусціла другая вартаўніца - у белым халаце. Дарэмна ён даказваў, што запрошаны самім Ярашам прысутнічаць на аперацыі, што ён карэспандэнт, пасля выдумаў, што асістэнт і без яго не будуць аперыраваць і ўвогуле ўсё паляціць дагары нагамі.
- Нічога не ведаю. Ніхто нічога не казаў, - флегматычна адказвала старая жанчына, не без цікаўнасці, аднак, назіраючы праз акенца, як нервуецца гэты поўны, лысаваты ўжо мужчына ў пакамечаным парусінавым касцюме.
Шыковіч скрыгатаў зубамі. Успомніў, што Антон не вельмі ахвотна згадзіўся, каб ён прысутнічаў на аперацыі. Няўжо перадумаў? Не пусціць? Пажартаваў. Аднак за такі жарт... Кірыла хадзіў каля варот, круціў у руцэ ключы ад машыны і выдумляў сябру самую страшную кару.
Але раптам адчыніліся дзверы, і юная істота ва ўсім белым ветліва запрасіла:
- Кірыла Васільевіч? Калі ласка, праходзьце.
І куды дзеліся яго злосць і абурэнне! Ідучы па бальнічным двары, ён узяў сястру за локаць. Яна глянула на яго, збянтэжана ўсміхнулася, вызваліла руку. Але ад гэтага дотыку да маладосці ён таксама адчуў сябе маладым, бадзёрым, свежым, як той ліпеньскі ранак.
На другім паверсе, у асобным пакоі, сястра памагла яму надзець стэрыльны халат, шапачку, павязку і палатняныя бахілы вышэй каленяў. Ён пажартаваў, што ўпершыню ў жыцці падобны на прафесара. Яна не ўсміхнулася на яго жарт. Правяла па калідоры, паказала на дзверы:
- Сюды.
У перадаперацыйнай было многа людзей у белых халатах, з ссунутымі на падбародкі маскамі. Але ніхто з іх нічога не рабіў. Усе чакалі. Шыковіч зразумеў, што гэта такія ж назіральнікі, як і ён, - маладыя лекары, практыканты.
Ён пачаў разглядаць інструменты ў шкляных шафах, будку для стэрылізацыі з адчыненым акенцам у аперацыйную. Падумаў, як нялёгка вывучыць назвы і прызначэнні ўсіх гэтых інструментаў - іх тысячы. Хацеў пачуць, што лекары гавораць пра сённяшнюю аперацыю. Але побач з ім малады высокі мужчына, яўна заляцаючыся, шаптаў чорнай тоўсценькай дзяўчыне:
- Клава, махнём пасля абеду ў Палянкі? На кацеры?
- На Будаеў луг. Там пляж лепшы.
Шыковіч абурыўся: вось-вось будзе вырашацца лёс чалавека - жыццё ці смерць! - а яны, чэрці, пра пляж думаюць.
На яго не звярталі ўвагі.
«Як у лазні. Усе роўныя».
Жанчына, што сядзела за сталом і нешта занатоўвала ў журнал, паднялася і шырока адчыніла дзверы аперацыйнай.

Кірыла ўбачыў Яраша. Той стаяў у кутку вялікай залы, выставіўшы перад сабой да локцяў голыя рукі, нібы ўзважваючы растапыраныя пальцы. Белізна яго шапачкі аж ззяла ў святле раніцы. А святла гэтага, роўнага, ледзь-ледзь падзеленага водбліскам дрэў і шыб, лілося мора: уся сцяна - шкло.
Незвычайны ў сваёй паставе і адзенні, велікан побач з нізенькім Майзісам, якому сястра, як маламу, выцірала салфеткай рукі, галоўны хірург здаваўся звышчалавекам, богам.
Кірыла падумаў: «Як можа пераўтварыцца чалавек! Ці той гэта Антон, просты, свойскі, шчыры хлопец?»
Той. Убачыў сябра і кіўнуў галавой, усміхнуўся зусім звычайна. Нацягнуў тонкія гумавыя пальчаткі, падышоў бліжэй да дзвярэй. Сказаў да ўсіх, хто чакаў у перадаперацыйнай:
- Таварышы! Не скажу, што аперацыя незвычайная. Але адказная. Хворай трыццаць шэсць год. Могуць быць любыя нечаканасці. Прашу: ніякіх каментарыяў. Поўная цішыня. Каму дазволіў, сядайце тут, - ён кіўнуў на лаўку каля сцяны, адгароджаную шырмай са стэрыльных прасцін. - Астатнія глядзяць па тэлевізары. Калі ласка, - і адступіў убок.
Чалавек сем хірургаў-практыкантаў, бесцырымонна адціснуўшы Шыковіча ўбок, хутка і смела прайшлі ў аперацыйную, залезлі за шырму.
«Прабіўны журналіст», можа, упершыню разгубіўся - што рабіць, адкуль глядзець? Але пачуўся голас Яраша:
- Кірыла Васільевіч! Заходзь!
Шыковіч нясмела ступіў у «святую святых» медыцыны. Цяпер на яго звярнулі ўвагу. У аперацыйнай таксама было нямала людзей. Маша, у масцы ўжо (праз гэта Кірыла не адразу пазнаў яе) і ў пальчатках, перакладала на маленькім століку бліскучыя інструменты, быццам лічыла, ці ўсё ёсць. Яна ўсміхнулася яму вачамі. Майзіс здалёк памахаў рукой. Гледачы пачалі перашэптвацца: «Хто гэта? Хто?» Яраш наблізіўся, па-сяброўску падміргнуў, паўшэптам спытаў:
- Не баішся?
Кірыла ў адказ тайком паказаў яму кулак. Гэта быў працяг іх дачнай размовы. Жонка адгаворвала яго ісці на аперацыю:
«Самлееш ты, Кірыла, я ж ведаю, як ты баішся крыві».
«Ну, глупства, самога мяне рэзалі - не млеў».
Галіна Адамаўна, наадварот, падтрымлівала яго жаданне: «Нічога страшнага. Яраш жартаваў».
Ён і цяпер засмяяўся:
- Аднак садзіся з краю, на выпадак чаго.
Практыканты паціснуліся, і Шыковіч сеў за шырмай.
Першае, што ўразіла яго, - гэта спакой сябра. Там, у лесе, каля іх вогнішча, расказваючы план аперацыі, Антон хваляваўся, бадай, больш і прызнаваўся ў гэтым. А тут - ходзіць, як упэўнены ў перамозе спартсмен. Хоць бы чым-небудзь выдаў сваю ўзрушанасць.
Кірыла прыкаваў да яго позірк.
«Не, не можаш ты быць такім спакойным. На чым-небудзь сарвешся, выдасі сябе».
Аднак ніводная рыска не ўздрыгвае на твары хірурга. Хіба толькі залішне пільна сочыць ён за калегамі і памочнікамі, якія таксама даволі спакойна поркаюцца каля апаратаў.
Апараты... Апараты... Розныя. З экранамі. Без экранаў. На калёсіках. З правадамі. Са шлангамі. Кірыла ўспомніў Ярашавы «лекцыі» па хірургіі, фразу, якую той аднойчы кінуў яўна з гонарам: «Мая аперацыйная цяпер - што цэх».
Сапраўды, што цэх.
Вунь тая зялёная скрынка з лейкай, шкляным балонам, сігнальнымі лямпачкамі, ці не той гэта апошні цуд, па які Яраш ездзіў у Кіеў, - апарат «сэрца - лёгкія»?
Яраш нешта кажа сваім памочнікам. Лекары адказваюць незразумелымі Шыковічу словамі.
Нечакана адчыняюцца другія дзверы. Санітары хутка і бясшумна падвозяць хворую і гэтак жа, да абразлівасці хутка, быццам нежывую, кладуць на аперацыйны стол.
А яна жывая. Яна звычайная. Нават прыгожая. Вялікія вочы, і ў позірку іх не страх, а як бы здзіўленне і любаванне ўсім, што ўгледзела. Зося Савіч! Шыковіч бачыць яе ўпершыню. А вобраз яе ўжо месяц жыве ў яго ўяўленні - пасля таго як Яраш расказаў пра яе. Дзіўна. Менавіта такой яна і ўяўлялася. Да незапамінальнасці звычайная з твару. Маленькая жанчына, спакутаваная жыццём і хваробай... Але ён убачыў больш: схаваную, замураваную пакутамі прыгажосць, абаяльнасць і... мужнасць. Усё гэта цяпер толькі ў яе вачах, у яе позірку.

Кірыла ажно прыўзняўся, каб добра разглядзець твар жанчыны. Запомніць. Ці ўбачыць ён яе, жывую, другі раз?
Яраш, усё такі ж спакойны і велічны, прыветліва ківае ёй галавой. У адказ яна заплюшчвае вочы: маўляў, я ўсё разумею, не турбуйцеся, я на ўсё гатова. Нічога не сказаўшы, ён адыходзіць. Працягвае рукі Машы. Яна спрытна сцягвае пальчаткі і накрывае яго вялікія рукі салфеткай. Ён садзіцца. Ён адпачывае. Можа, апошні раз прадумвае план аперацыі. А яго памочнікі - лекары і сёстры - не вельмі каб спешліва падключаюць да хворай датчыкі апаратаў: пад спіну, да галавы, да рукі, да нагі... Правады, шлангі звісаюць над сталом. Шыковічу чамусьці больш за ўсё кінуўся ў вочы і запомніўся маленькі апарацік, які надзелі Зосі на левае вуха. (Пасля ён даведаўся, што гэта аксігемометр - прыбор, які вызначае насычанасць крыві кіслародам.)
Яраш расказваў яму пра назначэнне многіх апаратаў. Але цяпер у галаве ў Шыковіча ўсё пераблыталася. Ды прыборы і машыны яго ніколі не цікавілі. Цікавяць людзі. Цяпер больш за ўсіх яна, Зося. І лекары. Здавалася, злачынна павольна яны ўсё робяць. Хіба можна ў такі момант быць такімі марудамі? Хацелася крыкнуць Антону: «Чаму ты ўсеўся, як Буда? Падгані іх!»
У самога яго ўсё часцей і мацней б'ецца сэрца. Ён амаль пачынае дрыжаць ад хвалявання і нецярплівасці: хутчэй, хутчэй! Нарэшце Майзіс, першы асістэнт, кідае:
- Гатова, Антон Кузьміч.
Толькі ў гэты міг бліскае ў шырока расплюшчаных вачах Зосі іскра страху. Шыковіч ловіць гэтую іскру. Невядома, што робіцца ў яе хворым сэрцы, але яго сэрца пачынае грукацець так, што ўдары аддаюцца ў скронях, у руках, у паху - ва ўсім целе.
- Наркоз! Вера Паўлаўна! - устае з табурэціка Яраш.
Секунды - і павекі хворай цяжка апускаюцца. Яна засынае.
Над сталом загараецца велізарнае кола бясценевай лямпы. Нехта адкідвае прасціну, і Шыковіч бачыць яе грудзі, залітыя яркім святлом, зусім дзявочыя, па кулачку, - узгорачкі з ружовымі маячкамі на вяршынях.
Яму робіцца няёмка, як бывае няёмка глядзець на голую нябожчыцу. Ён пераводзіць позірк на Яраша. Той падыходзіць да стала, хвіліну пільна глядзіць на хворую і раптам праводзіць пальцам пад левай груддзю, потым - ад падложачкі пад паху.
Вось так ён распаласуе ёй грудзі? Шыковічу робіцца страшна. Дарэмна ён храбрыўся!
Скіраваць увагу на што-небудзь другое!
Шчоўкаюць апараты. На адным экранчыку бяжыць блакітная стужка, як тая змейка ў бажоўскім сказе. На другім - маланкі, то ўзлятаюць, то падаюць, пішуць ломаную крывую. Не, не адарвацца яму ад рук хірурга! А ў гэтых руках ужо электраскальпель.
Шыковіч зажмурваецца, уявіўшы, як пырсне кроў, залье халаты лекараў, прасціны. Але храбрыўся ён дарэмна, крыві ён сапраўды баіцца. Вочы падаюць на падлогу, на Машыны і Майзісавы ногі ў белых панчохах. Нешта ціха патрэсквае, нібы рвецца тканіна. Трэск мацнее. Пахне крывёю. Ён доўга баіцца глянуць на стол.
Першы позыў на рвоту. Але сорам і страх перамагаюць, і Кірыла прымушае сябе падняць вочы, паглядзець, што робіць хірург. І перад тым, што ён бачыць, на нейкі момант адступае ўсё іншае. Жывое чалавечае сэрца, пра якое ён так многа пісаў, - вось яно, перад яго вачамі, у раскрытых грудзях. Невялікае, трапяткое, а галоўнае - жывое! Пульсуе, б'ецца...
Кірыла ажно зноў прыўзнімаецца над шырмай, цягнецца, каб лепей разгледзець гэтае цуда.
Зусім іншы рытм работы хірургаў і лекараў каля апаратаў. Цяпер усе спяшаюцца, усе - уважлівыя і напружаныя.
- Ціск восемдзесят на пяцьдзесят.
- Стадыя ўзбуджэння...
Лічбы. Словы. Шыковіч не ўнікае ў іх сутнасць. Ды каб і хацеў, то не здолеў бы.
Маша спрытна мяняе Ярашу пальчаткі. І вось яго пальцы, тоўстыя, але чулыя, абмацваюць сэрца. Удакладняюць дыягназ. Вось сэрца ляжыць на яго шырокай далоні. Жывое сэрца на далоні! І б'ецца, б'ецца, нібы хоча вырвацца.
Але ў другой руцэ хірурга бліскае скальпель... І гэтая сталь над жывым сэрцам, яна вінавата ва ўсім.
Калыхнулася сцяна аперацыйнай, паплылі ўбок хірургі. Але Кірыла зноў перамог сябе і надзвычай асцярожна, каб нікому не перашкодзіць, прыціскаючыся да сцяны, рушыў да дзвярэй. Як яны далёка, дзверы! У жоўтым тумане. Але ён дабраўся да іх, адчыніў. Нехта спытаў:

- Вам блага?
Ён вінавата ўсміхнуўся:
- Не.
Павярнуўся туды, куды глядзелі ўсе, - да экрана тэлевізара. І зноў убачыў яго, сэрца. І ўбачыў нешта зусім жудаснае: тоўсты палец праткнуў яго, маленькае, здалося, ужо нерухомае, нежывое. Тэлевізар падскочыў угору, закруціліся плафоны на стале... Нехта закрычаў...
Больш дапытлівы журналіст нічога не помніў.
Апрытомнеў у кабінеце галоўнага хірурга. Сястра, якая праводзіла яго, паднесла да твару тампон, змочаны нашатырам. Кірыла чыхнуў. Нашатыр асвяжыў. Але ў галаве гудзела, як у пустым склепе. Цяжкімі зрабіліся ногі, і пальцы іх варушыліся недзе, здавалася, за вярсту. А ў роце быццам ваты напхана, і яна прамакнула ўсю сліну; язык прыліп да паднябення. Ён прыслухаўся да гэтага дзіўнага стану ў целе.
Сястра схілілася над ім і ўсміхнулася, яму здалося, насмешліва.
- Нарабіў я вам клопату. - Ён не пачуў ці не пазнаў свайго голасу.
- Нічога, на першы раз гэта з многімі здараецца.
Тады ўсплыла карціна таго, што прывяло яго да непрытомнасці, і Кірыла ўстрапянуўся:
- Што там?
- Аперыруюць.
- Яна жывая?
- Безумоўна. Хіба аперыравалі б на мёртвай?
Ён на поўныя грудзі ўдыхнуў паветра і адразу адчуў сябе лепш.
- Ляжыце спакойна, - строга сказала сястра і выйшла з кабінета.
Ён глядзеў у белую столь і... бачыў сэрца, жывое, трапяткое, на далоні, на шырокай добрай далоні. Яму не рабілася страшна і непрыемна, ён з цікавасцю ўглядаўся ў гэты маленькі і вельмі складаны апарат. Ён мацаў сваё сэрца, слухаў яго ўдары. Але як толькі тоўсты палец, здавалася, чужы, варожы, набліжаўся, каб праткнуць гэты жывы камячок, Кірыла ўвесь скаланаўся, быццам хацелі праткнуць яго сэрца, зажмурваўся, круціў галавой, каб рассеяць прывід. Так паўтаралася колькі разоў, і яго пачало трохі ліхаманіць.
Заглянула сястра.
- Як вы тут?
- Што там?
- Зашываюць сардэчную сарочку. Я па тэлевізары бачыла.
Кірыла ледзь не закрычаў. Ліха на іх, як яны гавораць пра такія рэчы! «Зашываюць сардэчную сарочку». Нібы зашываюць начную сарочку.
Але разам з тым гэта настроіла яго на звыклую, крыху гумарыстычную разважлівасць. Падумаў, як, напэўна, Антон і жанкі будуць кпіць з яго.
«Усё бярэшся апісаць - нараджэнне і смерць, а сам не мог вытрымаць аперацыі».
Паглядзеў на гадзіннік. Было адзінаццаць. Каля дзвюх гадзін ужо ідзе змаганне за жыццё чалавека. Не, ён усё-такі напіша пра гэтую аперацыю, хоць Яраш і не хоча, каб пра яго пісалі. І не толькі пра аперацыю... Абавязкова напіша пра гэтую жанчыну. Пра яе жыццё. І пра бацьку яе!
Задумаўшыся пра сваю работу, Кірыла Васільевіч набыў душэўную раўнавагу і ўспомніў, што на дванаццаць яго выклікаюць на бюро гаркома.

**12**

У прыёмнай было нямнога народу, значна менш, чым звычайна, калі ідзе бюро. Чалавек сем панурых мужчын. Двое - знаёмыя Шыковіча: загадчык кафедры ў педінстытуце Левановіч і галоўны архітэктар горада Гамбіцкі.
Кірыла прывітаўся з імі і з Ларысай Пятроўнай, сакратаркай. Гамбіцкі як сарваўся з крэсла, каб падаць руку, так і пакаціўся ад акна да дзвярэй, ад дзвярэй да акна. Ён сапраўды нагадваў шар, адглянцаваны, бліскучы, галава голая, як бубен, пінжак на пузе выцерты аб чарцёжную дошку і такія ж выцертыя штаны.
Кірыла пацікавіўся, чаго выклікаюць.
Ларыса Пятроўна, сярэдніх год жанчына, стары работнік, абвяла ў надрукаваным на машынцы парадку дня яго пытанне чырвоным алоўкам.
- «Аб выхаванні дзяцей», - прачытаў ён уголас і не адразу зразумеў.

- За сыноў будуць пясочыць, - растлумачыў з кутка пануры Левановіч, доўгі, сутулы, з суровым тварам аскета, і цяжка ўздыхнуў: - Эх, сыны, чортавы сыны!
- Ясна, - па-сяброўску ўсміхнуўся сакратарцы Шыковіч. Гэта яго не ўстрывожыла, за Славіка ён цяпер спакойны.
Да яго падкаціўся Гамбіцкі, выхапіў з кішэні вялікую хустку, абмахнуў ёю твар.
- Дык у вас хоць сыны. А ў мяне - дачка... Дачка! - прашыпеў з гневам, з абурэннем, спалохам і пакаціўся да дзвярэй.
Было душна. Кірыла скінуў пінжак, павесіў на крэсла. Гамбіцкі паглядзеў на яго спачатку са здзіўленнем, потым - з удзячнасцю. І тут жа сцягнуў з плеч свой цесны пінжачок, які трашчаў па ўсіх швах. І ажно павесялеў, няшчасны. Дагэтуль, мабыць, лічыў, што здымаць пінжак у гаркоме няёмка. Падкаціўся да століка ў куце, націснуў клапан пустога сіфона, уздыхнуў, напіўся з графіна - і зноў да Шыковіча:
- Растлумачце, чаго ім не хапае? Чаму яны растуць такія, нашы дзеці?
- Дзеці як дзеці. - Кірылу чамусьці зусім не хацелася разважаць на гэтую тэму. Раптам зноў прыгадалася аперацыя.
Загнаўшы машыну ў двор рэдакцыі, ён ішоў сюды цераз парк, пастаяў над абрывам каля ракі, углядаючыся ў засмужаную лугавую даль. Гэта хораша супакоіла, ён пачаў думаць пра свой «хірургічны» эксперымент з гумарам.
Аперацыя працягвалася, калі ён пайшоў з бальніцы, - значыцца, усё ў парадку.
А тут - зноў перад вачамі сэрца. І трывога... Не, больш чым трывога. Амаль страх за жыццё жанчыны, якую ён упершыню ўбачыў на аперацыйным стале, але якая здавалася цяпер вельмі блізкай і роднай, як сястра, як жонка, як дачка... Дзіўна.
Ён спытаў у сакратаркі:
- Ларыса Пятроўна, вы сэрца бачылі?
- Чыё? - усміхнулася яна, відаць, думаючы, што ён спытаў з алегарычным сэнсам.
- Чалавечае.
- Бачыла. У анатамічным музеі. Наглядзелася - тыдзень не магла есці.
Кірыла паморшчыўся; жаданне расказаць пра аперацыю адразу знікла. Ён зноў застаўся сярод людзей у адзіноце са сваім незвычайным, да болю вострым уяўленнем, прыгожым і страшным.
Пазваніў у бальніцу. Дазваніцца туды было нялёгка: то ніхто не адказваў, то занята. Нарэшце адазваліся.
- Скажыце, калі ласка, аперацыя скончылася? - спытаў ён далікатна, ветліва.
- Якая?
- Якую рабіў Яраш.
- Так.
- Як «так»? Што?
- Нармальна.
Сястра (ці лекар) адказвала голасам манахіні - халодным, бясстрасным. Шыковіча гэта ўзлавала.
- «Нармальна»! Чорт бы вас!.. Калі вы навучыцеся адказваць па-чалавечы? Фармалісты ў белых халатах! Паклічце Яраша!
Голас адразу змяніўся, зазвінеў ручайком: відаць, там, у бальніцы, падумалі, што гаворыць нехта з высокага начальства.
- Антон Кузьміч не можа падысці. Ён у палаце. Каля хворай. Пасля такой аперацыі, зразумейце... Што перадаць доктару Ярашу?
- Вось так заўсёды гаварыце з кожным, хто вам пазвоніць.
Шыковіч паклаў слухаўку.
- Хто-небудзь з вашых блізкіх? - спытала паўшэптам Ларыса Пятроўна.
Ён кіўнуў: але!
- Цяжкая аперацыя?
- На сэрцы. Набыты парок.
Яна ўстрапянулася, паглядзела на яго спачувальна. І ўсе, хто пачуў, таксама зацікавіліся.
- Я магу сказаць Сяргею Сяргеевічу, што ў вас такі дзень. Сказаць?
- Не, не трэба.
- Вас будуць крытыкаваць.
- Мяне заўсёды крытыкуюць. Такая ў мяне прафесія.

Бясшумна адчыніліся абабітыя дэрмацінам дзверы ў кабінет першага сакратара. Групай вывалілі работнікі тэлестудыі: галоўны рэжысёр, сакратар партбюро, загадчыкі рэдакцый, акторы тэатра. Відно было, што ім не церпіцца пагаварыць, паспрачацца, таму і спяшаліся хутчэй у калідор, на вуліцу. Толькі актор Павел Стэльмах затрымаўся, прывітаўся з Шыковічам за руку.
- А ты чаму не быў? Ты ж таксама сябра мастацкага савета.
- Хапае другіх клопатаў.
- Далі нам за перадачы для моладзі, - паведаміў шэптам, азірнуўся на дзверы: - Тукала - дуб. Не слухаў мяне. Ну, будзь...
Шыковіча крыху закранула, што яго не запрасілі на абмеркаванне работы тэлестудыі: ён з'яўляўся бадай самым актыўным сябрам савета.
«Хто гэта пастараўся? Тукала? Ці гаркомаўскія «палітыкі»? Каб перад персанальнай справай патрымаць для строгасці ў прыёмнай?»
Ён не вызначаўся залішняй самалюбівасцю, але яго заўсёды абурала, калі дзе пачыналася палітыканства - гульня ў важнасць і строгасць. А галоўнае, у яго ёсць што сказаць пра тэлеперадачы.
Ларыса Пятроўна сутыкнулася ў дзвярах з Тукалам. Той далікатна ўступіў ёй дарогу ў кабінет. Убачыўшы Шыковіча, Тукала прыветліва, па-сяброўску ўсміхнуўся і накіраваўся да яго. Але Кірыла знарок адвярнуўся да акна.
«Што, нацвалі табе - лезеш цалавацца? Не, ты мяне папросіш яшчэ, кар'ерыст няшчасны».
- Заходзьце, таварышы, - запрасіла Ларыса Пятроўна.
Шыковіч рушыў першы, абмінуўшы разгубленага Тукалу.
Павітаўся з сябрамі бюро. Усе - знаёмыя людзі, з якімі прыходзіцца сустракацца амаль штодня і якія нязменна праяўляюць цікавасць да яго працы шаблонным запытаннем: «Чым новенькім парадуеш нас?»
Цяпер на яго «добры дзень» адказаў адзін Тарасаў. Гукан не адарваўся ад папер і не глянуў нават. Затое сакратар гаркома камсамола Васіль Грыбок таращчыў крыху лупатыя бясколерныя вочы з бесцырымоннай нахабнай цікаўнасцю. Так глядзяць у судзе на злачынцу.
Шыковіча перасмыкнула ад гэтага.
«Што ты ўставіўся, як малады баран на новыя вароты?»
Сакратар па прапагандзе Тужыкаў таксама разглядаў Шыковіча праз свае вялікія, у рагавой аправе акуляры, але зусім інакш, бяскрыўдна. На прывітанне ён адказаў кіўком галавы, сумна ўсміхнуўся і цяпер як бы хацеў нешта падказаць ці здагадацца загадзя, пра што ён, Шыковіч, будзе гаварыць. Яму было балюча, што большасць з тых, каго сёння будуць слухаць па такім незвычайным пытанні, - людзі ідэалагічнага фронту, яго памочнікі. Злосці на іх сакратар не меў. Былы дырэктар школы, ён, магчыма, лепей, чым хто другі, ведаў, якая гэта складаная рэч - выхаванне дзяцей.
Дырэктара машынабудаўнічага завода Лукашэнку нават самыя нечаканыя персанальныя справы мала цікавілі, калі яны не мелі дачынення да выпуску станкоў.
Лукашэнка быў сам канструктар і вынаходца і на ўсіх такіх пасяджэннях займаўся тым, што абдумваў дэталі новых канструкцый, занатоўваў у вялікую запісную кніжку разлікі і формулы. Ён адарваўся ад сваёй запісной толькі таму, што сярод вінаватых бацькоў быў інжынер яго завода. Дырэктар дакорліва паківаў яму галавой. Пакуль рассаджваліся, Гамбіцкі падышоў да Гукана і нешта шаптаў яму на вуха.
Тарасаў пачакаў, пакуль яны скончаць шаптацца. Не дачакаўся. Сказаў:
- Сядайце, таварыш Гамбіцкі. Архітэктурныя справы вырашыце пасля, - і абвёў позіркам сваіх светлых вачэй усіх - і сябраў бюро і «падсудных». - З каго пачнём, паважаныя бацькі?
- Усё адно - з каго. Але я так мяркую, што пісьменніку нашаму належала больш, чым каму, задумацца над такімі пытаннямі, - сказаў Гукан, зноў-такі нават не глянуўшы ў бок Шыковіча.
- Ну, што ж... Раскажыце, таварыш Шыковіч, як вы выхоўваеце сваіх дзяцей.
Кірыла падняўся і... раптам адчуў, што не ведае, пра што гаварыць. Ён не вызначаўся красамоўствам увогуле. А ў такіх абставінах - тым больш. Яму варта было, пакуль сядзеў у прыёмнай, прадумаць сваё выступленне. Але яго мала закранула, што выклікаюць з-за сына. Хвалявала другое - аперацыя.
І цяпер зноў, узіраючыся ў шырокі добры твар Тарасава, Кірыла бачыў... сэрца на далоні. На вялікай, умелай, чулай, ласкавай далоні Яраша. І захацелася яму расказаць пра ўсё гэта сябрам

бюро - пра Яраша, Зосю, пра чалавечае сэрца, якое можна адрамантаваць... Але ён усведамляў, што цяпер на хаду не знайсці яму лагічнай сувязі, «трывалага мастка» паміж адным і другім і яго, безумоўна, не зразумеюць, падумаюць, чаго добрага, што ён знарок «расказвае казкі», «водзіць бюро за нос». З чаго ж пачаць?
Ажно ўспацеў ад думак. Дастаў хусцінку і выцер лоб, шыю. Цяпер ужо ўсе, хто прысутнічаў, глядзелі на яго, адны - з цікаўнасцю, другія - са спачуваннем, трэція - з трывогай. Ён стрэўся позіркам з Гуканам, той, можа, адзін з усіх глядзеў амаль зларадна.
«Чаму?»
Успомніліся словы Гукана. З іх ён і пачаў упэўнена і смела:
- Але, Сямён Парфёныч, я многа думаў пра гэта. Вельмі многа. Не толькі як бацька, але як сябра партыі, грамадзянін... Не здымаючы з сябе адказнасці за паводзіны майго сына, я хачу разабрацца... пранікнуць у сутнасць... з вашай дапамогай, таварышы: чаму сярод нашай увогуле здаровай, адданай партыі моладзі трапляюць вось такія...
- Як ваш сын, - кінуў Грыбок.
- Як мой сын. Хоць сын мой не самая небяспечная з'ява, як я разумею. Ёсць горшыя прыклады...
- Гаварыце за сябе. Па сутнасці, - сказаў сакратар Чыгуначнага райкома Красоўскі, малады высокі брунет, апрануты ў асляпляльна белы, модна скроены часучовы касцюм. Шыковіч мала ведаў гэтага чалавека. Глянуўшы на яго, падумаў: «Сам ты ў студэнцкія гады, відаць, быў хват», - і адчуў непрыязнасць, адказаў раздражнёна:
- Маё жаданне разабрацца - не па сутнасці хіба? Я не буду апраўдвацца, але хачу сказаць: у тым, што мой сын вырас, на жаль, не такім, якім бы хацелася і мне, і грамадству, - не толькі віна бацькоў... Думаецца, што ўсе разам мы робім у гэтай важнейшай справе сур'ёзныя промахі... Школа, камсамол...
- Вы не ўмееце выхоўваць, а вінаваты камсамол! Здорава! - хмыкнуў няўрымслівы Грыбок.
Шыковіч глыбока ўдыхнуў гарачае паветра, якое гнаў у адчыненыя вокны лёгкі скразняк, і - быццам захлынуўся ім.
Тарасаў пастукаў алоўкам па стале, папярэдзіў:
- Таварышы, не перашкаджайце. Дайце яму сказаць.
Грыбок паслухмяна апусціў галаву. Але Шыковіча ўзлаваў наскок гэтага маладога пеўня. І ён не стрымаўся, каб не спытаць уедліва:
- А вы лічыце, таварыш Грыбок, што гарком камсамола працуе ідэальна?
Грыбок змаўчаў. Адказаў Гукан, паважна, ветліва:
- Кірыла Васільевіч! Гарком мы будзем слухаць асобна. А цяпер слухаем вас. І ў нас во колькі яшчэ пытанняў. - Ён паляпаў далоняй па стосе папер, што ляжаў перад ім, і адштурхнуўся ад стала, выпрастаўся ў крэсле; найвышэйшы ростам, як бы ўзняўся над усімі і глядзеў паверх галоў.
- Але, - пацвердзіў першы сакратар з нечаканай строгасцю. - Без доўгай прэамбулы, таварыш Шыковіч.
- Добра, Сяргей Сяргеевіч. Як я выхоўваю сваіх дзяцей? Было б недарэчнасцю сказаць - абсалютна правільна, бо абсалютна правільнае выхаванне, у маім разуменні, само па сабе - абсалютнае глупства. Але я адно магу сказаць: у галоўным мы - я і жонка - ніколі не давалі дрэнных прыкладаў...
- У чым - у галоўным? - спытаў Гукан.
- У чым? Я быў дармаедам? Несумленным перад грамадствам, перад партыяй? Хітраваў? Браў хабары? Жыў не па сродках? Вы мяне ведаеце, Сяргей Сяргеевіч. І вы, Сямён Парфёнавіч. Усю вайну я быў на фронце. Пасля настаўнічаў. Жонка і зараз настаўнічае. Можа, хто-небудзь скажа, што праца журналіста лёгкая?
- Чакайце, - перапыніў яго Тарасаў. - Чаму вы задаяце такія катэгарычныя пытанні? Ніхто не сумняваецца, што вы працуеце сумленна.
- Дык у чым жа заключаецца выхаванне дзяцей? Адносіны ў сям'і? Я жыў і жыву з жонкай, далібог жа, душа ў душу. Абодва працуем. Паважаем працу адно аднаго. Скандалаў нашы дзеці не чулі. Калі спрачаемся, то па прынцыповых пытаннях. Між іншым, часцей за ўсё менавіта з-за гэтага самага выхавання. Яна педагог, і, думаю, нядрэнны. Але ў адносінах сваіх дзяцей робіць тую ж памылку, якую робяць многія маці ў інтэлігентных сем'ях. Асцерагаюць ад фізічнай працы. «Я сама зраблю». Год дзесяць ужо мы не трымаем нават хатняй работніцы. Прынцыпова.

Усё робім самі. І я не сказаў бы, што сын мой Уладзіслаў - гультай і лежабока. Безумоўна, занятыя працай, нешта мы прагледзелі. Пасля дзесяцігодкі хлопец пачаў адбівацца ад рук. За яго ўчынкі, і ў прыватнасці за апошні ўчынак, я бяру віну на сябе. Вас не віню, таварыш Грыбок, хоць мог бы сказаць пра работу камсамольскай арганізацыі тэлестудыі. Няма там ніякай работы. Але пра гэта - пасля. А што датычыць майго сына, то думаю, што больш, таварышы, вы нічога благога пра яго не пачуеце. Хлопец нарэшце трапіў у добрыя рукі - у брыгаду Ганчарова.
- На станкабудаўнічы? - здзівіўся Тарасаў і глянуў на Лукашэнку. Той нарэшце адарваўся ад сваіх формул.
- Да нас? Цікава. - Аднак дырэктар зусім не выказваў гэтым «цікава» здзіўлення. Не. У яго быў свой погляд на моладзь: пасталеюць - паразумнеюць. Але затое ажно падскочыў уважлівы Грыбок.
- Яшчэ як цікава! Проста з турмы, без перасадкі, - у брыгаду камуністычнай працы. Куды там глядзіць Клецень? Вы бачыце, Сяргей Сяргеевіч, што робіцца!
Шыковіч адчуў, што спіну яго, павернутую да акна, абадзьмуў халодны вятрыска, непрыемны, калючы.
«Няўжо яны супраць, каб Славік быў у брыгадзе?»
Больш, чым пры любой другой акалічнасці дагэтуль, спалохаўся за сына. І разгубіўся. Як даказаць, што нельга выганяць хлопца з брыгады, куды ён пайшоў з радасцю. Што гэта не толькі жорстка і несправядліва... Зноў - каторы раз ужо! - уявілася жывое чалавечае сэрца. А слоў, важкіх, пераканаўчых, каб абараніць сына, не было. Кірыла пакутліва шукаў іх.
Яму сказалі раз і другі: «Сядайце». Кірыла дайшоў да сэнсу слова толькі тады, калі перад ім падняўся Гукан. Гаварыў старшыня роўна, не павышаючы і не паніжаючы голасу, націскі рабіў стукам алоўка аб стол, паўзамі. Атрымлівалася важка, пераканаўча, салідна.
Шыковіч, думкі якога насіліся ад аднаго полюса да другога, успомніў, што Кушнер, намеснік старшыні гарвыканкома, камічна перадае Гуканаву манеру выступаць, і не стрымаў усмешкі.
- ...Вы думаеце, калі працуеце вы, жонка, дык гэтага даволі? Не, Кірыла Васільевіч. У нас працуюць усе. Дармаедаў у нас адзінкі. Але акрамя працы ёсць яшчэ маральныя прынцыпы, грамадскія паводзіны чалавека... І яны часта з'яўляюцца рашаючымі ў выхаванні дзяцей. Гляньце на сябе! Уважліва гляньце на свае паводзіны! Вы аналізуеце другіх - прааналізуйце сябе. Вы здзіўляецеся, чаму ваш сын вырас такі? А я не здзіўляюся. Быццё вызначае свядомасць. Дабрабыт нашага народа расце. І я не супраць таго, што вы купілі машыну. Трэба вам машына. Але на ёй ездзіць ваш сын.
- Я забараніў яму.
- Ездзіў. Машына, лішнія грошы, кампанія... Дзяўчаткі, выпіўкі... А ў бацькоў тым часам другія клопаты. Машыны ім мала - трэба дача. Абуджаюцца дробна-ўласніцкія тэндэнцыі.
Шыковіч слухаў надзіва спакойна. Разумеў: Гукан «задае тон». Кірыла ненавідзеў гэты тэрмін - «задаць тон», народжаны ў часы культу. Але ў такой сітуацыі, відаць, інакш нельга. Трэба пагаварыць з бацькамі такіх сынкоў з усёй суровасцю! Што ж, няхай сабе валяць на яго, што хочуць, - усё стрывае, абы толькі пакінулі Славіка ў брыгадзе.
Тарасаў таксама не любіў «задавання тону». Ён, кіраўнік новага тыпу, умеў і думаць і вырашаць па-новаму. Але і ён упачатку прыняў выступленне Гукана як зусім натуральнае. Гукан выпраўляе сваю памылку. Яны, сябры бюро, не дамаўляліся аб парадку - як заслухоўваць бацькоў, але відавочна, што пачынаць трэба было не з Шыковіча. Не самы небяспечны выпадак. І не той бацька. Яго разважлівы роздум, трапныя адказы на заўвагі сябраў бюро ў нейкай меры згладзілі вастрыню пытання і навучылі другіх, як абараняцца. Тарасаў, назіральны і праніклівы, бачыў, што нават твар Левановіча пасвятлеў, а непаседлівы, вяртлявы Гамбіцкі стаў менш выціраць лысіну і больш круціцца, шэпчучы нешта суседзям.
- Зазнаўся ты, Кірыла Васільевіч, - нечакана з разважання аб уласніцкіх тэндэнцыях зрабіў вывад Гукан, чамусьці перайшоўшы раптам на фамільярнае «ты». - Адрываешся ад жыцця. Закапаўся ў архівах...
«А пры чым тут архівы?» - падумаў Шыковіч.
- Лічыш, што табе ўсё можна, усё дазволена і ўсё даруюць. Не! Дысцыпліна ў партыі адна для ўсіх! Адны нормы. Ленінскія. А як сябе паводзіць камуніст Шыковіч? - Пытанне прагучала сурова, асуджальна, без кроплі фамільярнасці, аловак гучней, чым звычайна, стукнуў па стале. -

Машына, дача - адзін бок... А паводзіны ў калектыве?.. Калі камуніст свайго таварыша па рабоце выкідвае з кабінета...
«Паскардзіўся, паскуда», - падумаў Шыковіч пра Рагойшу са злосцю.
- А другому, адказнаму работніку, пагражае, што выкіне праз акно...
«І гэты таксама скардзіўся? Ёлуп! Зусім страціў пачуццё гумару».
- Каментарыі, як кажуць, наўрад ці патрэбны. - І пагрозліва стукнуў алоўкам.
Тарасаў насцярожыўся. Не, у Гукана гэта больш чым «задаць тон».
«Што гэта яны, сааўтары, ганарару не падзялілі, ці што?» - падумаў ён. Аб выпадку з Рагойшам яму расказваў Тужыкаў, і ён згадзіўся з думкай сакратара па прапагандзе: не трэба ўсё валіць у адну кучу; Рагойша вядомы інтрыган, і можна зразумець, што ў Шыковіча пасля такога здарэння з сынам не вытрымалі нервы. Варта ўсё-такі разбірацца ў пачуццях людзей. Не з кожнага факта трэба рабіць палітыку.
- А калі бацька ўсё дазваляе сабе, то чаму сыну адставаць? Не, ён хоча быць наперадзе. У яго размах большы. Кулакоў яму мала, за каўнер схапіць - глупства. Яму атамную бомбу давай...
Шыковіч бачыў, як, схіліўшыся над сталом, паківаў галавой Тужыкаў, крыва ўсміхнуўся, паправіў акуляры. Сцёр далоняй з шырокага твару ўсмешку Тарасаў. Мабыць, Гукан убачыў, што пра бомбу - не ўхваляюць, і загаварыў больш горача і гнеўна:
- Як вы думаеце, таварыш Шыковіч, што вырасце з дзіцяці, якому бацькі ні ў чым не адмаўляюць? Усё падносяць на залатой талерцы. Машыну, дачу, вучобу, работу... Не паступіў у інстытут - куды жадаеш, сынок? На тэлестудыю? Калі ласка. Выгналі адтуль - навошта прымушаць яго падумаць, папакутаваць, пашукаць... З помпай, як героя, - на лепшы завод, у лепшую брыгаду. У брыгаду камуністычнай працы! Падумайце, таварышы! Ці не выклік гэта?..
Цяпер словы Гукана балюча білі сваёй несправядлівасцю. Ён мог усё гаварыць пра бацькоў. Кірыла, бадай, з усім згадзіўся б: нічога не скажаш, выхоўваць-такі не ўмеем. Але калі Гукан робіць вунь якія вывады з таго, што Славік пайшоў на завод, калі вядзе да таго, каб патрабаваць выгнаць хлопца з брыгады, - з гэтым Кірыла не мог згадзіцца. Зноў хлынуў пот. Стрымліваў і супакойваў Тарасаў; глядзеў добрымі вачамі і нават кіўнуў: трымайся.
- Мы ж добра ведаем, Шыковіч - лепшы сябра хірурга Яраша. А Ганчароў - прыёмны сын Яраша. Добры хлопец, а, на жаль, не вытрымаў такога націску, паддаўся.
- Эх, чорт! - абурыўся Грыбок. - І тут блат! Ну, не! Тут яго не будзе! Дарожку закрыем! Такіх сынкоў на вярсту не падпусцім да камуністычных брыгад!
Флегматычны Тужыкаў рэзкім рухам зняў акуляры, махнуў імі, гатовы запярэчыць.
Але яго апярэдзіў Шыковіч.
- А такіх - куды? - усхапіўся ён з месца. - У турму, ці што? Дык няма ў кодэксе...
- Вы чулі, Сяргей Сяргеевіч? - таксама ажно падскочыў Грыбок.
- Чулі! - адказаў яму Тужыкаў. - А праўда - дзе такіх выхоўваць?
- Дзе? - сумеўся Грыбок і асеў, з'ядаючы вачамі першага сакратара.
- Я мушу заявіць, таварышы сябры бюро, - працягваў між тым Шыковіч, - з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю сябра партыі, што абвінавачванне мяне, Яраша, Ганчарова, усяе брыгады ў нейкім блаце... - гэта, мякка кажучы, глупства. Ганчароў і яго хлопцы самі прапанавалі Ўладзіславу пайсці да іх у брыгаду. І я лічу, што яны паступілі правільна. І радуюся, што сын згадзіўся. Значыцца, разумее... Мяне не здзіўляе, Сямён Парфёныч, ваш погляд на такія рэчы. Цяжка глянуць на свет па-новаму. Здзіўляе малады Грыбок.
- Я?
Гукан стаяў, упёршыся алоўкам у стол, і спакойна чакаў, пакуль выказваліся другія. Ніхто, магчыма, не прыкмеціў, як змяніўся ён пры апошніх словах Шыковіча: на шчоках выступілі сінія плямы, а карак наліўся крывёю, дзіўна неяк скрывіліся вусны. Калі ўсе нарэшце сціхлі, Гукан сказаў усё тым жа роўным голасам:
- Прапаную вынесці Шыковічу суровую вымову, - і сеў.
Прапанова з'явілася нечаканасцю для ўсіх - і сябраў бюро, і прысутных. Гамбіцкі быццам прыліп да крэсла, у Левановіча выцягнуўся і без таго доўгі твар. Не менш спалохаліся і другія бацькі: калі Шыковічу вось так, дык што будзе ім?
Ашаломлены Кірыла спытаў шэптам:
- Завошта?

- За няправільнае выхаванне дзяцей, - Гукан стукнуў алоўкам па стале, - раз. За грубыя паводзіны ў калектыве, за парушэнне партыйнай этыкі, - і зноў стукнуў, - два. За прыватнаўласніцкія тэндэнцыі, - не стукнуў. - Між іншым, мне вядома, што дача Шыковіча і Яраша збудавана незаконна. Няправільна, зноў-такі па блату, я не баюся паўтарыць гэтае слова, адведзены ўчастак. Лічу, што гарком павінен высветліць усе акалічнасці.
«Што гэта ён так уз'еўся на Шыковіча? - думаў Тарасаў. - Праўду кажуць: сааўтары - што палюбоўнікі адной жанчыны. Абавязкова счэпяцца. Трэба будзе разабрацца».
Калі на пасяджэннях узнікалі вось такія складаныя сітуацыі, Тарасаў любіў паназіраць за людзьмі. Хто як рэагуе? Хто каго падтрымлівае? Гэта лёгка чыталася па тварах. Бо здаралася, што чалавек займае ўпачатку адну пазіцыю, а ў канцы - зусім супрацьлеглую, зрэдку бывае і так, што ў думках ён за адно, а на словах - за другое. Такіх Тарасаў не любіў. Маўклівага для прапагандыста, упартага, цяжкаватага па характару Тужыкава ён паважаў за тое, што той заўсёды трымаўся пэўнай думкі. Такога лёгкі вецер не паверне, толькі добрая бура. Мабыць, адчуваючы, што сябры бюро разышліся ў сваіх адносінах да таго, што сказаў Гукан, Тужыкаў шчыра раіў вачамі: «Скажы ты, Сяргей Сяргеевіч». Тарасаў паслухаўся гэтай парады.
- З дачамі мы разбяромся, - сказаў ён да Гукана, потым - да Шыковіча: - Паводзіны вашага сына, таварыш Шыковіч, - ганебныя паводзіны. І мы вас сур'ёзна папярэдзім. Не толькі вас. Увогуле будзем сурова патрабаваць ад камуністаў, каб яны адказвалі за сваіх дзяцей, за выхаванне моладзі. Гэта закон нашага жыцця. Я асабіста ўхваляю, што ваш сын пайшоў на завод. Калі праўда, што хлопцы з брыгады Ганчарова самі яго ўзялі, то хвала ім і чэсць. Думаю, што яны больш шырока разумеюць сваю ролю ўдарнікаў камуністычнай працы. Правільна разумеюць. Не замыкаюцца. Змагаюцца за кожнага чалавека. Як, таварышы прапагандысты? Правільна я разумею, што такое брыгада камуністычнай працы? - Ён глядзеў на Грыбка, і ў светлых вачах яго скакалі іскаркі хітрага смеху.
- Правільна, Сяргей Сяргеевіч! - умомант згадзіўся Грыбок.
«Ну і флюгер!» - ужо без злосці і абурэння падумаў Шыковіч. Разам з усведамленнем, што пагроза быць выгнаным з брыгады ад Славіка адведзена, прыйшла дзіўная фізічная слабасць. Зашумела ў вушах, самлелі ногі, высахла ў роце. Наступіла разрадка пасля нервовага напружання гэтага багатага на ўражанні, цяжкага дня. Ён нават дрэнна чуў, хто яшчэ што гаварыў пра яго і Славіка. Помніў: Гукан настойваў на сваёй прапанове.
«Завошта?» - хацелася спытаць зноў, але Кірыла і гэтага не здолеў зрабіць, толькі са здзіўленнем падумаў: «Што мае да мяне гэты чалавек? Што яму не спадабалася? Я да яго заўсёды з адкрытым сэрцам».
Адкрытае сэрца...
Нутро гарэла ад смагі. Але не хапіла смеласці падняцца і наліць з графіна, што стаяў на сакратарскім стале. Раптам з'явілася боязь самлець - як там, у аперацыйнай. Грыбок цяпер амаль што абараняў яго і абмяжоўваў спагнанне папярэджаннем. Красоўскі падтрымліваў Гукана. Кірыла падумаў: «Цікава, якая сям'я ў сакратара райкома? Дзеці ёсць? Трэба даведацца», - хоць адчуваў, што наўрад ці будзе займацца гэтым. Не хопіць энергіі. Здавалася, што яе ўвогуле ўжо няма, энергіі, што ён разрадзіўся, як акумулятарная банка, - увесь, ад галавы да ног.
Сябры бюро пагадзіліся на вымове. Шыковіч не аспрэчваў, не апраўдваўся - абы хутчэй. Нават не запытаў, якая вымова - без занясення ці з занясеннем ва ўліковую картку. (Пасля даведаўся - не запісана.)
Калі паднялі Левановіча, Кірыла спытаў:
- Мне можна ісці?
- Чаму? Паслухайце другіх. Вам будзе карысна. І цікава, - сказаў Тужыкаў.
А Тарасаў, які больш пільна назіраў за ім, нечакана дазволіў:
- Ідзі.

**13**

Бадай што ён не толькі «не разрадзіўся» ў той дзень, як яму здавалася, зморанаму фізічна і душэўна, а, наадварот - «зарадзіўся».
Шыковіч адчуў гэта на другі дзень. У той вечар ён моцна выпіў. Гэтая слабасць была агідная. Усё астатняе на адлегласці ў адны суткі ўяўлялася зусім інакшым. Ён адразу ж падумаў пра Зосю. Ці жывая? Пазваніў у бальніцу (начаваў у горадзе). Яраш да тэлефона не падышоў: ён не выходзіў з палаты.

Кірыла прарваўся ў аддзяленне, яго ведалі па ўчарашнім здарэнні і далі халат. Нясмела адчыніў дзверы. У маленькай пасляаперацыйнай палаце яна ляжала адна. І амаль так жа, як у часе аперацыі, да яе былі падключаны датчыкі прыбораў. Дзяжурылі лекары і сёстры. Трымалі на кіслародзе. Шыковіч не адважыўся пераступіць парог палаты, дзе ішла нябачная барацьба жыцця і смерці.
Яраш выйшаў у калідор. Магчыма, толькі пухліны пад вачамі выдавалі, што ён не спаў. А больш - ніякіх прыкмет стомленасці. Нават пагаліўся, як заўсёды раніцой.
- Што? - нецярпліва спытаў Шыковіч, сціснуўшы яго рукі каля локцяў, паверх халата, і зазіраючы знізу ў вочы.
- Ты думаў, аперацыяй усё канчаецца? Аперацыя толькі пачатак барацьбы... Былі крытычныя хвіліны. Але, здаецца, мы перамаглі...
- Дай я абдыму цябе.
Яраш баязліва адступіў.
- Мне - не да тваіх жартаў.
- Ну, чорт з табой.
- Дзякую. Ты што замочваў учора?
- А што табе! Прэсны мараліст!
Павярнуўся і пайшоў па доўгім калідоры. Можна было падумаць, што яны пасварыліся. Але Яраш глядзеў услед сябру з добрай усмешкай, як часам глядзіць дарослы, шчыры і душэўна багаты чалавек на капрыз здольнага падлетка. Крыкнуў:
- Перадай маім, што і сёння я не прыеду.
Шыковіч павярнуўся, адсалютаваў рукой. Гэтая кароткая, крыху дзіўная сустрэча з сябрам, як кажуць, «паставіла Шыковіча на рэйкі». А ўсё тое, што ён убачыў і перажыў учора, сапраўды надало энергіі, імпэту.
І Кірыла зноў кінуўся на пошукі.
...Тыдні два назад ён заходзіў у КДБ. Падпалкоўнік Вагін, высокі брунет, на выгляд зусім малады («Відаць, толькі з камсамола», - падумаў Шыковіч), прыняў ветліва. Здаецца, нават узрадаваўся знаёмству з пісьменнікам. Адразу пачаў гаворку пра літаратуру, паказваючы сваю начытанасць. Паведаміў сціпла, быццам між іншым, што сустракаўся з Шолахавым. Шыковіч у думках адзначыў, што амаль усе афіцэры, з якімі яму прыходзілася страчацца, хваліліся сваім знаёмствам з выдатным пісьменнікам.
Выслухаўшы просьбу Шыковіча - пашукаць у спецархівах матэрыялы аб дзейнасці патрыётаў і здраднікаў у іх горадзе ў час акупацыі, - Вагін шчыра загарэўся. Расказ пра падполле, пра першы гарком, групы Мельніка і Дубецкага, пра Вараву, Ганчарова, цётку Любу, Яраша і, нарэшце, пра Савіча ён выслухаў з вялікай цікавасцю. Чалавек новы ў горадзе, малады і цікаўны не толькі па абавязку службы, але і па прыродзе сваёй, ён, як губка, убіраў усё, што ўзбагачала яго веданнем людзей і абставін. А справа Савіча - здалося Шыковічу - проста-такі захапіла кіраўніка абласной дзяржбяспекі. Ён тут жа выклікаў капітана, бадай разы ў два старэйшага за сябе, пасівелага і ссутуленага.
Шыковіч, які стараўся запомніць усе дэталі паводзін работнікаў, пільна прасачыў, як капітан увайшоў. Не выцягваўся, не дакладваў. Аднак па-вайсковаму спыніўся каля парога, сказаў:
- Слухаюся, Андрэй Астахавіч.
- Сядайце, Анатоль Барысавіч, - запрасіў падпалкоўнік і, калі той наблізіўся да стала, спытаў: - Знаёмы?
Капітан кіўнуў Шыковічу галавой, але рукі не працягнуў. Сеў у крэсла насупраць, нязграбна неяк сеў, яшчэ больш згорбіўся і разглядваў свае вялікія мазолістыя, як у дрывасека, далоні, сашчапіўшы пальцы.
«Чаму ў яго такія рукі?» - падумаў Шыковіч.
Вагін сам пачаў выкладаць сутнасць просьбы нечаканага наведвальніка. Кірыла здзівіўся, што падпалкоўнік адразу запомніў прозвішчы людзей.
«Зайздросная памяць».
Капітан, здавалася, не слухаў - думаў пра нешта сваё, абыякавы да ўсяго на свеце. Разы два падняў вочы, але былі яны халодныя - ніводнай іскры цікаўнасці. Шыковіч ведаў гэтага чалавека, хоць знаёмы не быў. Нехта некалі яму сказаў, што гэты сівы капітан працаваў у іх горадзе яшчэ ў трыццаць сёмым годзе. І Кірыла адчуў цяпер непрыязнасць да яго.

Перапыніўшы начальніка, Шыковіч сказаў:
- З тых, што супрацоўнічалі з акупантамі, мяне больш за ўсё цікавіць Савіч.
Капітан падняў вочы і кароткім позіркам вопытнага следчага як бы прасвяціў Шыковіча.
- У якім сэнсе?
- Ёсць у мяне ўпэўненасць, што доктар памёр сумленным савецкім чалавекам.
- Доказы, здагадкі?
- І тое і другое. Трэба дакументальнае пацвярджэнне.
- Вы думаеце пісаць раман ці займацца пасмяротнай рэабілітацыяй?
- А вы лічыце, што гэта несумяшчальна? - спытаў Шыковіч. - Я хачу напісаць аповесць, якая была б праўдзівым дакументам... Народ павінен ведаць і герояў і здраднікаў.
Капітан паглядзеў на свайго начальніка. Той хораша ўсміхнуўся.
- Вы ведаеце, што ў горадзе жыве дачка Савіча? - спытаў пасля паўзы капітан.
- Ведаю. - Кірыла хацеў быў расказаць, што яна ў бальніцы і ёй будзе зроблена вельмі складаная аперацыя, якая можа скончыцца трагічна; нават Яраш не дае гарантыі.
Але капітан раптам падняўся, звяртаючыся да свайго начальніка ўжо больш афіцыйна, па-вайсковаму:
- Зраблю, таварыш падпалкоўнік, усё, што можна.
І на развітанне зноў толькі кіўнуў галавой. У той міг Шыковіч падумаў пра яго інакш. Калі Сербаноўскі гэтулькі год у органах і, як відаць, карыстаецца павагай маладога начальніка, то вельмі можа быць, што гэта адзін з сапраўдных чэкістаў.
Шыковіч званіў Сербаноўскаму два разы. Той адказваў: «Пакуль што нічога цікавага няма».
Кірыла не стаў больш званіць, а проста з бальніцы рушыў у камітэт.
Капітан сядзеў адзін у даволі вялікім ценявым пакоі - старыя ліпы засланялі шырокія закратаваныя вокны. Калі Шыковіч увайшоў, Сербаноўскі спачатку паклаў у вялізны сейф нейкія паперы, з якімі, відаць, працаваў, і толькі тады прывітаўся за руку.
Хоць прайшло ўсяго нейкія паўтары гадзіны рабочага дня, у яго быў выгляд стомленага і абыякавага да ўсяго чалавека.
Шыковіча ён пачаў цікавіць сам па сабе. Як жыве гэты чалавек? Чаму ў яго мазолістыя рукі? Чым яго разварушыць, выклікаць на шчырую размову? Яшчэ нават не сеўшы, Кірыла паведаміў:
- Учора Соф'і Савіч зрабілі аперацыю. На сэрцы. Яраш апераваў.
Капітан неяк устрапянуўся і ўпершыню ў прысутнасці Шыковіча выявіў сапраўдную чалавечую цікавасць: абапёршыся ўпалымі грудзьмі на стол, ён неяк па-дзіцячы падпёр кулаком шчаку, гатовы слухаць, і вочы яго засвяціліся.
- Я толькі што з бальніцы. Яны ўсю ноч змагаліся за яе жыццё. Яраш радуецца: перамаглі! Будзе жыць!
- І будзе здаровая?
- Яраш кажа, што восемдзесят працэнтаў такіх аперацый даюць добрыя вынікі.
- Восемдзесят?
- Гэта нямала, калі ўлічыць, што аперыруецца. Сэрца!
- Але.
- А ведаеце, я прысутнічаў на аперацыі.
- Сур'ёзна?
- Праўда, для мяне гэта скончылася трагічна.
- У якім сэнсе?
- Я самлеў.
- Проста там?
- Не. Паспеў выйсці ў перадаперацыйную.
- І што?
- Упаў.
- Так нічога і не пабачылі?
- Бачыў. Як раскрывалі грудную клетку. Як Яраш трымаў яе сэрца ў руках...
- У руках?
- Але, на далоні. Ведаеце, яно маленькае, сэрца. З жаночы кулачок. Ён узяў яго на далонь, а яно білася, спалохана так...

Шыковіч убачыў, што Сербаноўскі непрыкметна прытуліў руку да левай стараны грудзей і задумліва паўтарыў:
- Маленькае...
- А ведаеце, што за суткі сэрца пераганяе дзесяць тон крыві?
- Дзесяць тон?!
- Я вас пазнаёмлю з Ярашам. Ён можа цэлую ноч расказваць пра сэрца. Прыязджайце да нас на дачу. Вы не рыбак?
Чэкіст раптам цяжка ўздыхнуў:
- У мяне хворая жонка. Таксама сэрца. Стэнакардыя.
Ледзь-ледзь падняў чалавек заслону над сваім асабістым жыццём і адразу ўвесь раскрыўся. Цяпер Шыковічу ўсё стала зразумела: і яго стомлены выгляд, і загрубелыя рукі, і смутак у вачах. Нялёгкая ў яго праца - нялёгкае і жыццё. Кірыла адчуў яшчэ большую прыязь, давер, добрую сімпатыю. І пачаў падрабязна расказваць, як Зося ратавала Яраша, як пасля шукала сына Ганчарова. Гадзіны дзве гаварыў. Факты і свае здагадкі. Сербаноўскі слухаў уважліва, не перапыніў ніводным пытаннем ці заўвагай. А потым раптам глянуў на гадзіннік і сказаў:
- Вы амаль пераканалі мяне, што Савіч - наш чалавек. Але скажу вам шчыра: даказаць гэта будзе нялёгка. Нам прыслалі з спецархіва яго справу, - ён кіўнуў на сейф. - Там - ніводнага дакумента ў яго карысць.
- Можна паглядзець справу?
- Не! - катэгарычна адмовіў чэкіст і ў той жа міг быццам замкнуўся на сто замкоў. Куды дзяваўся просты, стомлены чалавек, які дома абірае бульбу, мые бялізну, даглядае хворую жонку!
- Чаму?
- Вы для нас пакуль што прыватная асоба. Хто вас упаўнаважваў?
- Маё партыйнае сумленне. Хіба не аўтарытэтны орган?
- Таварыш Шыковіч, парадак ёсць парадак. Дакументы, якія з'яўляюцца дзяржаўнай тайнай...
- А па-мойму, ніякі гэта не парадак, а ўсё тая ж бюракратыя. Не веру я ў сакрэтнасць гэтай справы! Праз дваццаць год вы ўсё яшчэ лічыце такія дакументы дзяржаўнай тайнай? Што там ёсць, чаго нельга паказаць камуністу?
Капітан не адказаў. Ён зноў разглядваў свае натруджаныя рукі.
- Нічога там няма! Калі вы кажаце, што ніводнага дакумента ў карысць Савіча. - Шыковіч падняўся. - Пайду да Вагіна.
- Дарэмна.
- Што трэба?
- Адносіна партыйных органаў. Зайдзіце ў гарком - вас там добра ведаюць.
- Значыцца, трэба паперка - і ўсяго?
Капітан развёў на стале рукі і, падняўшы вочы, усміхнуўся па-сяброўску шчыра:
- Што зробіш.
Але ўсмешка гэтая ўжо больш не падзейнічала на Шыковіча. Ён не меў злосці на Сербаноўскага - радавы работнік, дзейнічае па інструкцыі. Аднак развітаўся холадна, расчараваны і ўзлаваны ўвогуле. У думках лаяўся:
«Не можаце паказаць дзве паперкі без гаркома».
Яму страшэнна хацелася хутчэй заглянуць у справу - што і як там інкрымінуюць мёртваму Савічу? Але не хацелася ісці ў гарком. Пасля ўчарашняга. Каб не падумалі, што ён выстаўляе сябе, іграе гэткага дзеяча, якога цікавяць матэрыі больш высокія, чым клопаты пра сына.
У рэдакцыі ішла лятучка. Калі Шыковіч з'явіўся ў кабінеце рэдактара, выступаў Рагойша - разносіў яго фельетон. Прамоўца сумеўся на нейкі момант. Але «адбою» не даў, наадварот, пачаў крытыкаваць яшчэ больш бязлітасна і зласліва. Журналісты заварушыліся ў прадчуванні бойкі. Фельетон Шыковіча - не самы лепшы, гэта так. Але ў тым жа нумары надрукаваны артыкул самога Рагойшы. Калі Рагойша гаворыць, што фельетон сумны, то ад яго артыкула, напэўна, «падохлі мухі». Многім карцела сказаць пра гэта, ды нікому не хацелася заядацца з такім інтрыганам. Лепш далей ад яго, а то ён знойдзе выпадак сапсаваць табе кроў. Цяпер спадзяваліся на Шыковіча: ён не стрывае. Але Кірыла праявіў поўную абыякавасць да крытыкі. Нават слухаў няўважліва - думаў пра сваё. Некаторыя палічылі, што гэта своеасаблівая форма адказу - поўная знявага да крытыка. Нецярплівы, гарачы Васіль Парэчка, загадчык аддзела культуры, шаптаў ззаду:

- Плясні ты яго, Васільевіч. Няхай не гаўкае. Артыкул яго блытаны...
Але Шыковіч не чытаў артыкула, не да газеты яму было ўчора. Ды каб і чытаў, то ўсё адно не выступіў бы: пасля аперацыі, гаркома, размовы ў КДБ яму здавалася: не на тое, на што трэба, ён часта траціў сілы і энергію. У сорак пяць год усвядоміць гэта - не вельмі прыемна.
Выступіў Парэчка, па-юнацку ўлюбёны ў свайго кансультанта. Счапіліся з Рагойшам.
Жывіцкаму прыйшлося «ліць халодную ваду». Асцярожны рэдактар, добры чалавек, ён не любіў сварак у калектыве. З-за гэтай дабраты з яго ўпотай кпілі, але ўвогуле паважалі.
Маўчанне Шыковіча на лятучцы ўсіх здзівіла. Звычайна ён кідаў трапныя жарты.
Рэдактар тут жа, плануючы будучыя нумары, папрасіў яго з'ездзіць у раён, даць нарыс пра лепшага камбайнера.
Застаўшыся пасля лятучкі, Кірыла адмовіўся ад задання.
Жывіцкі разгубіўся.
- Ты што, нездаровы?
- Не. Захоплены другой работай.
- Шкада. Вельмі шкада.
- Я дам у суботні нумар апавяданне.
Жывіцкі любіў прозу і не любіў вершаў. З Парэчкам, які кожны дзень адкрываў новых паэтычных геніяў, у яго ішлі бясконцыя баталіі.
Кірыла паспрабаваў працаваць - правіць матэрыял. Але ўсё здавалася сумным, непатрэбным - і чужое і сваё. У галаве круціліся нейкія «касмічныя думкі», далёкія і ад газетных матэрыялаў і ад справы Савіча. Мабыць, ён доўга сядзеў нерухома, бо Парэчка, які працаваў за суседнім сталом, раптам прапанаваў:
- Давай махнём на раку, Васільевіч. Будзе навальніца. Люблю навальніцу на лузе! І клёў будзе. Вось пабачыш.
Кірыла паглядзеў у акно і ўбачыў, што неба, яснае з раніцы, завалакла бела-попельная смуга. Аднак сонца, да ненатуральнасці абстрактна-жоўтае (на яго можна было глядзець без акуляраў), пякло зямлю па-ранейшаму. Было ціха і душна. Вяла лісце на маладых ліпах, прасіла піць.
«Але, будзе навальніца. І, магчыма, пачнуцца дажджы. Заўсёды, калі ў разгары ўборка, пачынаюцца дажджы. Сельскай гаспадарцы проста не шанцуе», - падумаў Кірыла і пашкадаваў, што адмовіўся ад паездкі ў раён; ён заўсёды адчуваў сябе як бы вінаватым перад людзьмі сяла і пісаў пра іх многа, з любоўю.
«А можа, праўда, паехаць на луг, пад стагі? І да ніткі вымакнуць пад дажджом».
Але тут жа прыйшло адчуванне, што ён не зрабіў нечага вельмі важнага. Не адразу нават зразумеў - чаго. А зразумеў - кіўнуў загадчыку аддзела:
- Пачакай мяне, - і знік за дзвярыма.
Няхай што хочуць думаюць пра яго, абы дазволілі паглядзець справу Савіча.
Вырашыў пагутарыць з Тужыкавым. Праўда, ён - тугадум, як той анекдатычны фін, - на пытанне, якое задалі раніцой, адкажа ўвечары, але затое аб'ектыўны і разумны.
У калідоры гаркома Кірыла нечаспадзявана сустрэўся з Тарасавым. Прывіталіся.
- Ну, як - вычухаў? - спытаў сакратар як быццам жартаўліва, але без усмешкі.
- Што?
- Галавамойку. Не апеліруй. Другім дасталося больш.
- А я і не меў намеру апеліраваць, - адказаў Шыковіч і падумаў: «Ну, вось, я так і ведаў».
Дайшлі да дзвярэй прыёмнай. Спыніліся. Тут Тарасаў адчуў, што Шыковіч, які пры сустрэчы неяк даверліва пацягнуўся да яго, раптам, пасля гэтых слоў, быццам палез у панцыр. Сакратар падумаў пра сябе: «Гэтыя ўмоўнасці, згары яны, мімаволі робяць нас бюракратамі. Інстанцыя, дыстанцыя... А пасля глядзіш: усё па форме правільна, а па сутнасці... Нялёгка нам вяртацца да ленінскага стылю», - і шчыра запрасіў, адчыніўшы дзверы:
- Заходзь - пагутарым.
На нейкі момант Шыковіч застыў у нерашучасці - ісці ці не ісці? Пра што ён мае намер гутарыць са мной? Зноў пра сына?
Тарасаў зразумеў, чаму ён вагаецца. Пажартаваў:
- Не бойся. Маралі чытаць не буду.
Ужо ў кабінеце, скінуўшы пінжак і расслабляючы гальштук, спытаў:
- Каго там з тваіх блізкіх апервалі? Мне Ларыса Пятроўна сказала.

І Шыковіч пачаў расказваць усё з яшчэ большымі падрабязнасцямі, чым раніцой расказваў Сербаноўскаму, - пра Савічаў, бацьку і дачку, пра падпольшчыкаў, імёны якіх раней нідзе не ўпаміналіся, пра свае здагадкі, меркаванні, пра суб'ектыўнасць кнігі Гукана. «Вось яно што, - падумаў Тарасаў, прыгадаўшы, як Гукан выступаў на бюро. - Зразумела. «Старому» нялёгка адмовіцца ад старых поглядаў. Яму здаецца, што ён адзін усё сказаў. І хочацца любымі сродкамі збіць з тропу гэтага няўрымслівага чалавека, свайго сааўтара, які можа ўсё перавярнуць дагары нагамі. Метад той. Але час не той, Сямён Парфёнавіч».
- Я тут чалавек новы, Кірыла Васільевіч. Але ведаю, што пасля вайны гарком разы чатыры, здаецца, займаўся падполлем.
- І кожны раз у спіс падпольшчыкаў заносілі дзесяткі новых імён. Хіба гэта не доказ таго, які размах мела барацьба нашых людзей? Хіба для выяснення і ўслаўлення гэтай барацьбы не варта папрацаваць? - Шыковічу здалося, што Тарасаў супраць таго, каб яшчэ раз вяртацца да падполля, і ён выказаў гэта горача, з наступальным запалам.
- Але, для гэтага варта папрацаваць, - задумліва згадзіўся сакратар гаркома, шукаючы ў спісе пад шклом нумар тэлефона.
- Першапачаткова нават імя Яраша нідзе не ўпаміналася. А ён выконваў спецзаданні гаркома.
Тарасаў павярнуўся да століка з тэлефоннымі апаратамі і набраў кароткі нумар.
- Ало. Вагін? Добры дзень. Тарасаў. Многа шпіёнаў злавіў? Што? Вывеліся, кажаш? Глядзі, як бы мы не прытупілі пільнасць. То-та. Андрэй Астахавіч, што гэта ў цябе баяцца паказаць дакументы часоў вайны нашаму пісьменніку? Чалавек цікавую працу задумаў. Трэба памагчы. Што? - Тарасаў змоўк і слухаў даволі доўгае тлумачэнне, кідаючы час ад часу кароткае: «Ыгы».
Кірыла заўважыў, што ў нейкі момант ён шчыльней прыціснуў слухаўку да вуха. Сакрэт. Кірыла падняўся з крэсла і адышоў да акна. Неба зрабілася шэра-попельным. Сонца рассеяла свае прамені ў гэтых сухіх і высокіх аблоках. Не пякло больш. Але нерухомае паветра не астывала, яно як бы згушчалася, ад чаго духата нават мацнела - ажно цяжка рабілася дыхаць.
«Але, паедзем з Парэчкам на луг. Пад навальніцу. Станем на беразе і будзем гукаць грому: о-го-го! Некалькі гадзін першабытнага жыцця. Васіль умее арганізаваць яго. Каб ні пра што не думаць...»
- Добра. Давай у чатыры.
Шыковіч схамянуўся, узрадаваны, што гэта яму назначае Вагін сустрэчу на чатыры. Глянуў на гадзіннік: было без чвэрці тры. Тарасаў паклаў слухаўку.
- Дні праз два яны пакажуць табе, Кірыла Васільевіч, патрэбныя дакументы. У такіх органах нельга без некаторых фармальнасцей.
«Два дні, якія, напэўна, расцягнуцца ў тыдзень!» - нецярплівы даследчык расчаравана ўздыхнуў.
Сакратар нібы прачытаў яго думкі.
- Не бойся, гэта не будзе праз два тыдні. У чатыры Вагін будзе ў мяне, і я яшчэ раз напомню яму. Жадаю поспеху.
На трэці дзень пасля аперацыі Яраш нарэшце пакінуў бальніцу і прыехаў на дачу. З'явіўся гадзін у пяць дня на таксі, акуратна паголены, у новай чэшскай тэнісцы (дома ведалі, што пасля ўдалай аперацыі ён заўсёды нешта купляе), з шампанскім, цукеркамі, падарункамі. Быў уважлівы, далікатны, ласкавы, быццам не бачыў сям'ю і суседзяў цэлы год.
Галіна Адамаўна ўмела сустрэць яго ўрачыста. Калі ён затрымліваўся ў бальніцы на суткі, на двое пасля такіх вось аперацый, у яе не ўзнікала ніякіх дурных думак. Ніштто не псавала настрою, і яна сама радавалася, што страчае мужа з чыстай душой. Пра аперацыі яна звычайна не любіла распытваць. Але на гэты раз выпадак быў асаблівы.
- Па тваім выглядзе бачу, што ўсё добра. Віншую.
- Не трэба віншаваць, Галка. Не трэба. Ты ведаеш, я не люблю віншаванняў, калі размова ідзе аб жыцці чалавека. Ды і не ўсё яшчэ добра.
Але калі прыбегла з лугу Наташка і павісла на шыі, спытала таямнічым шэптам: «Ну, як там, тата? Што?», то ён адказаў:
- Добра, Наталка. Мы з табой перамаглі яшчэ раз.
- Раскажы.
Яна адна любіла слухаць, як бацька расказваў пра сваю работу, і даволі добра ўжо для свайго ўзросту разбіралася ў хірургічнай тэрміналогіі. А таму Яраш ахвотна пачаў перадаваць увесь ход

аперацыі, амаль гэтак жа падрабязна, як расказваў бы студэнтам, трохі хіба больш спрошчана, з меншым ужываннем спецыфічна медыцынскіх слоў.
Маці не падабалася гэтае дзіўнае, не па ўзросту, захапленне дачкі хірургіяй, але яна маўчала, рабіла выгляд, што таксама слухае з цікавасцю. Неяк раней яна аднойчы сказала:
- Антон, я зусім не хачу, каб Наташа была лекарам. Даволі ў хаце медыцыны!
Наташа горача запярэчыла:
- Хіба дрэнна быць такім лекарам, як тата?
- Такіх нямнога... А быць такім, як я... Вырываць гнілыя зубы...
Антон тады абурыўся, закрычаў, што ён катэгарычна забараняе ёй гаварыць гэтак пры дзецях аб сваёй прафесіі, ды і наогул аб любой прафесіі. Дзеці павінны паважаць кожную карысную працу!
З таго часу яна не перашкаджала іх медыцынскім размовам. Толькі радавалася, што медыцына зусім не цікавіць сына. Але не радавалася, што ён, як бацька, галубятнік.
Віктар дапамагаў маці ставіць на стол з паважнасцю дарослага. Але ў душы раўнаваў да сястры, што яна захапіла бацьку. Яму таксама хацелася пахваліцца, што ён перабудаваў галубятню, нечакана пазнаёміўся з галубятнікам з суседняй вёскі, тутэйшым настаўнікам, і выменяў у яго пару рэдкіх паштавікоў. Але не можа ж ён вось так з бухты-барахты, як тая Наташка, кінуцца бацьку на шыю і прапанаваць: «Хутчэй лезем на гарышча!» У самым пачатку сустрэчы з бацькам Віця паведаміў толькі адну навіну:
- Учора, ведаеш, якая навальніца шуганула. Франтальная. За Студзёнкай на тры кіламетры лес палажыла. Максім Рыгоравіч кажа - тысячы дзве кубаметраў буралому.
Пра галубоў сказаў пасля полудня, калі выйшлі на двор. Сказаў стрымана, між іншым.
Яраш усё зразумеў. Выгукнуў, нібы нават з крыўдай:
- Што ж ты маўчаў? - і адразу палез на веранду. Праз колькі хвілін вясёлы, пранізлівы свіст абудзіў адвячоркавую цішыню лесу і лугу.
Увечары, калі прыехаў з горада Шыковіч, яны палілі свой касцёр і на агні варылі юшку; Яраш з сынам паспелі налавіць рыбы.
Мокрае яшчэ ад учарашняга ліўня ламачча гарэла роўна і нягорача. Юшка варылася доўга. Елі яе ўжо ўпрыцемку. Накармілі дзяцей.
- Наташа і Віця! Спаць!
- Мама!
- Спаць. Спаць.
Дзеці неахвотна рушылі да дачы.
- Ты бязлітасная, Галя. Віктар збіраў дровы і лавіў рыбу.
- Галя - лепшы педагог, чым мы з табой.
- Правільна, жонка. Педагогі мы з табой - дрэнь.
- Як там Уладзіслаў? - спытаў Яраш.
- Працуе.
- Ты яго бачыў?
- Хіба яму да сына! Ён увесь - у падполлі.
- Не іранізуй з сур'ёзнай справы. Сын пазбягае сустракацца са мной. Яму сорамна. Прыязджаў Тарас.
Жанчыны сядзелі на лавачцы, мужчыны - па-турэцку, на вільготнай зямлі, насупраць адзін аднаго.
Яраш адпачываў. Яму не хацелася ні гаварыць, ні думаць. Ён глядзеў у агонь, любаваўся водбліскам полымя, жарам, бурштынавымі кроплямі смалы, што выступілі на тоўстым суку. Прыгожыя кроплі. Шкада было, што яны згараць. І ў гэты міг упершыню пасля таго, як паехаў з бальніцы, варухнулася ў душы трывога за Зосю. Ды ён прагнаў яе. Нічога не здарыцца. Яшчэ ўчора хворая апрытомнела. Сёння глядзела на яго з удзячнасцю яснымі вачамі. Спрабавала ўсміхнуцца. Прашаптала: «Мне лёгка дыхаецца!» Але, цяпер ёй будзе лёгка дыхацца і лёгка хадзіцца па зямлі! Ярашу было радасна. Аднак выказваць сваю радасць усім не хацелася. Ён выдаў яе Наташы. Мог бы яшчэ прызнацца Шыковічу, каб яны былі адзін на адзін.
Кірыла пачаў расказваць пра свае пошукі, пра размовы ў КДБ і гаркоме.
Яраш здзівіўся:
- Ёсць справа на Савіча? На мёртвага?

- Ты ж сам казаў, што ў твае абавязкі падпольшчыка ўваходзіла вывучаць тых, хто супрацоўнічаў з акупантамі. Я думаю, не дзеля спартыўнай ці мемуарнай цікавасці гэта рабілася.
- Але, - згадзіўся Яраш задумліва.
Галіна Адамаўна падала яму місачку з юшкай.
- Дзякую, - сказаў, як чужой, паспытаў варыва з лыжкі, паставіў місачку на край лавачкі. - Горача.
- І да Шыковіча: - Слухай, Кірыла, а ці варта варушыць такія архівы? Каб узняць пыл, ад якога нехта будзе чыхаць?
- Хто? Ты? Я? Я не буду чыхаць ад такога пылу! - Шыковіч ажно падхапіўся. Яго абурыла, што Яраш, які быў загарэўся таксама, як і ён, раптам зноў дае адбой. Чаму? Сам жа падпольшчык! На самога ж былі забыліся і колькі год ніхто не ўспамінаў!
- Чакай. Я лічу, што гэта трэба было рабіць або раней, адразу ж па гарачых слядах... Мы не здолелі тады разабрацца ва ўсім, наадварот, шмат што заблыталі... Няхай даруюць мне, але я не веру ў аб'ектыўнасць спраў, якія заводзіліся ў той час... Або гэта трэба рабіць пазней, калі загояцца ўсе раны... Найдаражэйшая якасць памяці - забыўлівасць... Каб нічога не забывалася, чалавецтва загінула б. Забыўлівасць лечыць і раны душы, і раны цела.
- Дзіўная ў цябе філасофія! Ведаеш, з якога арсенала?
- Давай, Кірыла, без арсеналаў. Я думаю пра жывых людзей, пра іх сэрцы, а не пра адносіны паміж дзяржавамі. Хоць у палітыцы таксама забываюць і варта забываць... Інакш ніколі б не канчалася варожасць.
- Ты думаеш пра Зосю.
Галіна ўстрапянулася, балюча ёкнула сэрца: «Але, ён думае пра яе. Чаму ён так хвалюецца за яе?» І ў гэты міг у душу яе ўпала зерне раўнівай падазронасці - упершыню да пацыенткі мужа.
Яраш узяў сваю місачку, пачаў сёрбаць юшку. Кірыла кінуў у касцёр ламачча. Дым пацягнула на жанчын. Яны закашляліся, але з лавачкі не сышлі. Агонь прытух, і ў цемры ніхто нікога не бачыў.
- Дык вось што я табе скажу! - гучаў быццам здалёк голас Шыковіча. - Можа, ты забыўся ці хочаш забыцца. У цябе праца не менш гераічная, чым у падполлі. Навука, ад якой ты шкадуеш адарваць адну хвіліну на што іншае. Але май на ўвазе, што яна, Зося, нічога не забыла і ніколі не забудзе. І мільёны не забудуць. І ты не асцерагай яе ад мінулага. Яна не баіцца яго.
Галлё з боку Яраша разгарэлася, і агонь асвятліў яго постаць. Чырвоны ад водбліску полымя, вялікі і нерухомы, з місачкай у руках, ён нагадваў правадыра невядомага племя надзвычай дужых і прыгожых людзей. Галіна, убачыўшы мужа ў такой паставе, адчула новы прыступ страху ад думкі, што можа страціць яго. Валянціна Андрэеўна глядзела на Яраша з захапленнем і патаемнай жаночай зайздрасцю.
Ён варухнуўся і няўлоўным рухам чараўніка кінуў пустую місачку ў цемру.
- Дык і я табе скажу. Слухай. Ты ж не даследуеш падполле ў поўным аб'ёме. Ты - як дэтэктыў. Цябе захапіла гісторыя аднаго чалавека, яго загадкавая смерць, і ты ўзрадаваўся выпадку знайсці востры сюжэт.
- Яго ўвесь час хіліла да дэтэктыва, - сказала Валянціна Андрэеўна з іскрынкамі смеху ў голасе. Ёй было хораша, весела і хацелася, каб мужчыны паспрачаліся больш горача.
- Але ты нічога такога не знойдзеш. Цяпер я больш, чым раней, упэўнены, што Савіч не быў ні ворагам, ні героем. Ён звычайны стары лекар, які хацеў памагаць людзям у любых абставінах. Інфекцыяніст, ён баяўся эпідэмій, якія заўсёды прыносіць вайна. Каб сачыць за санітарным станам роднага горада, пайшоў на службу да акупантаў. Вось табе ўвесь твой дэтэктыўны сюжэт.
Касцёр разгарэўся. Святло яго выхапіла з цемры ладны круг, колькі дубоў, сосен і дзіўна пафарбавала іх: кара сосен пачырванела, а мох на старых дубах стаў што снежны іней- сівы-сівы. Над галавой зашамацела лісце - ад гарачага паветра. Страляў залатымі кулькамі-вугальчыкамі касцёр. Яраш, яшчэ больш пачырванелы, прыўзняўся на руках і адсунуўся далей ад агню. Шыковіч стаяў з другога боку вогнішча, шырока расставіўшы ногі, заклаўшы рукі за спіну.
- Тое, што ты расказаў, доктар, ёсць найлепшы сюжэт. Але я сюжэтаў не шукаю, май на ўвазе. Савіч абвешчаны здраднікам. А ты сам сцвярджаеш, што ён сумленны чалавек, няхай сабе і не герой. Дык што ж, па-твойму, пакінуць яго ворагам? Не паварушыцца, каб даказаць яго сумленнасць, рэабілітаваць яшчэ адно добрае імя, як рэабілітаваны імёны тысяч ні ў чым не вінаватых людзей?
Шыковіч пачакаў пярэчанняў. Але Яраш маўчаў. Ён згаджаўся. Больш таго, ён не разумеў самога сябе - чаму раптам уздумалася адгаворваць сябра ад такой пачэснай і высакароднай справы? Не,

ён бадай што разумеў - чаму, бо думаў пра гэта яшчэ ў бальніцы. Цяпер, калі Зосі зроблена, ён упэўнены, удалая аперацыя і яна, па сутнасці, пачне новае жыццё - новае ва ўсім (аб гэтым ён паклапоціцца), яму чамусьці не хочацца, каб хто-небудзь ці што-небудзь вяртала яе да мінулага. Добра, калі Шыковічу ўдасца даказаць тое, што хочацца даказаць. Ён, Яраш, упэўнены, што Савіч - сумленны чалавек, сумленны лекар. Але калі не будуць знойдзены дакументы, якія пацвердзілі б яго сувязь з падпольшчыкамі, з партызанамі, гэта застанецца толькі яго прыватным перакананнем ці гэткай жа прыватнай думкай Кірылы. Зосі наўрад ці будзе лягчэй ад гэтага.
- Маўчыш? - пераможна спытаў Шыковіч. - Май на ўвазе, што абыякавасць да лёсу людзей, якіх мы ведалі, з якімі працавалі, якія вучылі нас, прынесла вялікую шкоду ў пэўны час. Так, я паставіў у цэнтры справу Савіча, бо нельга ахапіць усяго адразу. Але, знаёмячыся з дакументамі, я выяўляю ўсё новых і новых герояў. Хіба для гэтага не варта пачыхаць ад архіўнага пылу? Хіба пыл гэты такі шкодны? - наступаў Кірыла так напорыста і рашуча, што ледзь не ўлез у агонь - наблізіўся да кастра так блізка, што яму прыпякло калена. Адступіў, нахіліўся, каб пагладзіць калена, але як толькі прытуліў нагрэтую штаніну да цела - заенчыў:
- Гару, ратуйце!
Жанчыны засмяяліся. Антон ледзь прыкметна ўсміхнуўся. Такая раптоўная задумлівасць яго сур'ёзна ўстрывожыла Галіну.
«Залішне ён думае пра гэтую Зосю», - падумала яна.

**14**

У папцы было нямнога дакументаў. Фота ў памер паштоўкі. Спакойны і просты, з шырокім ілбом і глыбокімі залысінамі хударлявы твар чалавека год шасцідзесяці. Вось ён які, Савіч! Шыковіч доўга ўглядаўся ў рысы гэтага твару.
Данясенне безыменнай разведгрупы аб здрадніках і нацыяналістах, якія займалі кіруючыя пасады ва ўправе і паліцыі. Бургамістр Цішчанка стаяў у гэтым спісе першым. Лучынскі - другім, Савіч - дзевятым, перадапошнім. Відаць, данясенне перадавалася групай па радыё, а таму характарыстыкі былі вельмі лаканічныя: адзін-два факты. Толькі факты, без усялякіх тлумачэнняў.
«Цішчанка Мікадзім Фёдаравіч, бургамістр. Пры арганізацыі гета ўласнаручна страляў у жыдоў, забіваў дзяцей.
Лучынскі (Склота, Усаў Іван Селівонавіч), начальнік паліцыі, шпіён, агент СД. Катуе арыштаваных. Кіруе расстрэламі. Павесіў дзевяць калгаснікаў сяла Вялоцічы, заложнікаў».
Самая разгорнутая характарыстыка давалася рэдактару фашысцкага лістка, нацыяналісту Хмару - на добры абзац. Супроць прозвішча Савіча стаяла: «Загадвае аддзелам управы. Заражае людзей інфекцыйнымі хваробамі!»
У той суровы ваенны час, пры той падазронасці, якая мела месца, і такое агульнае абвінавачванне пераконвала. Безумоўна, што і лейтэнант Шыковіч тады паверыў бы яму: усё можа зрабіць чалавек, які пайшоў на службу да фашыстаў! Але цяпер, ведаючы па расказах Яраша і другіх Савіча, Шыковіч адразу зразумеў, што ў разведчыкаў не было ніводнага факта злачыннай дзейнасці лекара-інфекцыяніста, акрамя таго, што ён загадвае аддзелам управы, і яны яўна выдумалі гэтае - «Заражае людзей інфекцыйнымі хваробамі». Якіх людзей? Якімі хваробамі?
Шыковіч не вытрымаў і выказаў сваё меркаванне капітану Сербаноўскаму. Той адарваўся ад нейкіх папер, якія перачытваў, уважліва выслухаў, неазначальна гмыкнуў, сказаў:
- Чытайце далей.
Шыковіч не проста чытаў, ён вывучаў дакументы, як сапраўдны дэтэктыў, звяртаючы ўвагу на кожную дэталь. Данясенне было напісана на машынцы і, безумоўна, з'яўлялася копіяй. Але на ім стаяла ажно шэсць нумароў і шыфраваных літар. Супроць прозвішчаў Лучынскага і Хмары былі пастаўлены крыжыкі сінім алоўкам, наперадзе Савіча - чырвоная «птушка».
Другі дакумент збянтэжыў Шыковіча - заява самога Савіча на імя нямецкага фельдкамендanta оберштурмбанфюрэра Ютнера. У верасні 1941 года Савіч запэўняў фашыста ў сваёй вернасці «новаму парадку» і прасіўся на службу. Паклёпу на савецкую ўладу не рабіў, аднак фактамі ўласнай біяграфіі даводзіў, што мае на бальшавікоў даўнюю крыўду. Ён, Савіч, дарэвалюцыйны інтэлігент і паходзіць з інтэлігентнай сям'і, бацька быў выкладчыкам гімназіі. Ён, Сцяпан Савіч, быў жанаты на дваранцы. Рэвалюцыя пазбавіла яго жонку ўсіх правоў, адняла багатую маёмасць. З-за гэтага першая жонка яго заўчасна памерла. Другая яго жонка была пралетарскага паходжання - з рабочай сям'і, але, магчыма, з-за яго бальшавікі яе праследавалі. Выключалі з

інстытута, калі яна вучылася. У трыццаць сёмым пасадзілі ў турму, а можа, і расстралялі (ніхто не ведае) яе брата, хоць ён быў сябрам партыі і займаў адказную пасаду на чыгунцы. І самую яе тры месяцы трымалі ў турме. А ў пачатку вайны забралі зноў нібыта ў армію, але ён, Савіч, не вельмі ўпэўнены ў гэтым. Ён цяпер, мусіць, здзіўляецца, чаму не зачапілі яго. Відаць, бальшавікам патрэбны былі яго веды, яго спецыяльнасць, бо лекараў у іх не хапала. Заява канчалася словамі:

«...Пан фельдкамендант!

Сваёй прафесіяй і грамадскай дзейнасцю я жадаю паслужыць стварэнню ў маім родным горадзе новай цывілізацыі і новай культуры, якую прынесла вялікая армія фюрэра.

Сцяпан Савіч, лекар».

Чалавек эмоцый, Шыковіч не стрымаўся - і ўголас вылаяўся, калі прачытаў гэта. Сербаноўскі паглядзеў на яго з дзіўнай ухмылкай, здавалася, здзекліва пытаў: «Што ты будзеш даказваць цяпер?» Кроў ударыла Кірылу ў твар, ён пачырванеў. З'явілася адчуванне, што мёртвы Савіч груба і нахабна ашукаў яго, жывога. Каб той, як другія здраднікі, галаслоўна і агульна паклёпнічаў на савецкую ўладу і кляўся ў вернасці акупантам, гэта пераконвала б менш, чым вось такая біяграфія. Бо калі ў ёй усё праўда, то зусім натуральна, што стары інтэлігент мог мець крыўду на савецкую ўладу і гэтая крыўда павяла яго да ворага.

Але ў наступную хвіліну Шыковіч падумаў пра Заслонава, пра Кузняцова, потым - пра Яраша: колькі ў таго было падпольных біяграфій і якую заяву ён пісаў, калі па заданню гаркома паступаў у пажарную: сын кулака, асуджаны і ўсё, што хочаш.

Не, адступаць нельга! Яраш не жадае, каб ён узнімаў архіўны пыл, - баіцца за Зосю, гуманіст. Ён і Зося ўпэўнены, што бацька яе - сумленны чалавек, «не герой, але і не вораг». Яраш баіцца, раптам дакументы дакажуць другое. Пакуль што пра здраду Савіча напісаў адзін чалавек - Гукан, напісаў адзін сказ, на якім наўрад хто з чытачоў затрымлівае ўвагу. Прайшло шмат год, вырасла новае пакаленне, якому няма ніякай справы да нейкага доктара Савіча, лёс яго нікога не цікавіць. Дык навошта выцягваць яго з небыцця? Так, напэўна, разважае Яраш. Але ён, Кірыла, трымаецца іншай думкі. Нарэшце, гэта справа яго гонару: завяршыць пачатую працу!

І Шыковіч пачаў вывучаць гэты бадай што галоўны дакумент абвінавачвання. Цікавы дакумент. Ён чытаў пераклад, надрукаваны на машынцы. Але тут жа быў падшыты і арыгінал. Савіч вырашыў паказаць сваё веданне нямецкай мовы. Відаць, сам камендант з нямецкай акуратнасцю зялёным чарнілам выправіў у заяве ўсе памылкі (іх было многа), падкрэсліў няправільныя выразы і напісаў рэзалюцыю ўнізе пад подпісам Савіча:

«Пану Цішчанку. Рэкамендую даручыць пану Савічу ахову здароўя цывільнага насельніцтва», - і вельмі неразборлівы подпіс, замест якога ў перакладзе стаіць пытальнік.

«Ахову здароўя! Які цынізм!» - падумаў Шыковіч, перачытваючы пераклад заявы яшчэ раз.

Наступны дакумент - пастанова ўправы ў сувязі з эпідэміяй брушнога тыфусу, якая ўспыхнула ў горадзе ўлетку сорак другога года. Доўгі тэкст на штучнай беларускай мове. Аднак чамусьці ў друкарні замест «н» кірыліцы часта набіралі «п» лацінскае. Слова «насельніцтва», напрыклад, было надрукавана як «пасельніцтва». Подпісы - Цішчанкі і Савіча. Параграф, у якім гаварылася, што кожны, хто парушыць вышэйпералічаныя санітарныя правілы, будзе асуджаны па законах ваеннага часу, абведзены сінім алоўкам. Яшчэ адзін доказ віны Савіча. Але тэкст пастановы сведчыў, што напісана яна чалавекам, які ведаў, як змагацца з эпідэміяй, і сапраўды дбаў пра ахову здароўя цывільнага насельніцтва.

- На месцы вашага калегі я не далучаў бы такі дакумент да справы. Ён апраўдвае Савіча, - сказаў Шыковіч капітану.

Сербаноўскі адказаў холадна, амаль непрыязна, не адарваўшыся нават ад папер:

- Тут падшыты ўсе дакументы, якія знойдзены.

- Мяркуючы па заяве, захоплены архіў управы... Так?

- Не ведаю.

- Няўжо там больш нічога не знайшлося, што характарызавала б дзейнасць Савіча?

- Не ведаю. Прачытайце выразкі.

Выразак з газет было некалькі. З розных - нацыяналістычных, нямецкіх, партызанскіх. Фота: у прэзідыуме сходу беларускай інтэлігенцыі - Савіч, над галавой яго пастаўлены крыжык. Здымак цьмяны, невыразны, твары расплыліся, але ўсё-такі пазнаць можна, што чалавек, адзначаны крыжыкам, той самы, што і на фота, якім адкрываецца справа. Вельмі прыкметны лоб.

Узнагароджанне шчырых служкаў «новага парадку» ордэнамі рэйха. У спісе ўзнагароджаных Савіча няма. Але на фота, на якім адбіта цырымонія ўручэння фашысцкім генералам узнагарод, на заднім плане, праўда, - зноў той жа лоб выглядвае з-за галоў другіх. Нарэшце доўгі слязлівы некралог, які Шыковіч чытаў яшчэ тады, калі пісаў кнігу Гукана. Спачуванні ў нацыяналістычнай і нямецкай газетах. Паведамленне аб пахаванні «актыўнага дзеяча беларускага вызваленчага руху», праслаўленага доктара медыцынскіх навук Сцяпана Савіча, «які загінуў ад рук бандытаў». Кароткая інфармацыя ў газеце партызанскай брыгады «За Радзіму»: «Падпольшчыкі горада выканалі прысуд народа над здраднікам Радзімы доктарам Савічам. Такая кара чакае кожнага фашысцкага сабаку!»
Шыковіч загарнуў папку, моцна пляснуў па ёй далоняй. Настрой у яго быў такі, што хацелася з кім-небудзь пасварыцца. З Сербаноўскім, ці што? Яго ўзлавала, што капітан ніяк не зрэагаваў на тое, як ён скончыў сваю працу. Нават не ўзняў галавы.
- І гэтыя дакументы вы баяліся паказаць мне? Ва ўсіх інстанцыях узгаднілі? Фармалісты!
- Нічога цікавага для вас няма? - як бы шкадуючы, спытаў Сербаноўскі, адкінуўшыся на спінку крэсла і праціраючы пад акулярамі стомленыя вочы.
- Апроч прашэння Савіча, усё гэта я чытаў дванаццаць год назад. Без усялякай гульні ў хованкі.
Капітан, між іншым, падумаў:
«А следчы з цябе не надта. Каб ты быў больш уважлівы, то ўбачыў бы, што папка расшывалася і адзін дакумент з яе вынялі».
- Не сакрэт, што вы намерваецеся рабіць далей?
- У маёй працы сакрэтаў няма. Плюну на архіўны пыл, як раіў мой сябра Яраш. Буду шукаць жывых людзей, якія ведалі Савіча, працавалі з ім. - Шыковіч падняўся, пацягнуўся, каб распрастаць самлелае цела. І раптам павярнуўся да капітана, спытаў ва ўпор: - Скажыце, Сербаноўскі, па-чалавечы шчыра: а што вы думаеце, пазнаёміўшыся са справай Савіча? Што падказвае вам чуццё старога чэкіста?
Сербаноўскі падняўся, падышоў да сейфа, дастаў з кішэні ключы, адчыніў тоўстую дзверку.
- Я пакажу вам маленькі дакументік, які мне ўдалося адшукаць. - І дастаў з верхняй палічкі блакнотны пажоўклы лісток, доўгі і вузкі, працягнуў Шыковічу. Той у адзін позірк прачытаў:
«Хведзя!
Я абсалютна уверен, что аграбление аптечного склада не абышлося без Савича. О, ты не знаеш, какая эта хитрушчая лиса! Гарантируй тысячу марак - и я табе раскушу эты арех. Имею «ключик». Табе - слава и спасибо гестапо, а мне - грошы. Давай согласие. Не тяни
Твой Кравец».
Напісана алоўкам, па-расейску, з памылкамі.
Шыковіч прачытаў другі раз, трэці, здзіўлены і ўзрадаваны. Потым з удзячнасцю паглядзеў на капітана. Зачыніўшы сейф, Сербаноўскі круціў на пальцы ключы і тлумачыў:
- Гэта з «архіва» следчага паліцыі Хведара Швагерава. Яго судзілі ў сорак пятым, далі пятнаццаць год. Я вось разбіраю судовыя матэрыялы. На жаль, тады ніхто не расшыфраваў гэтай запіскі. Хто пісаў? Калі? З якой прычыны? Відаць, палічылі, што намёк на Савіча - непаразуменне. Прыйдзецца расшыфроўваць цяпер.
Яны глядзелі ў вочы адзін аднаму, глядзелі з той шчырасцю і разуменнем, якое яднае людзей, робіць сябрамі. Сербаноўскі адчуў, зразумеў, як раптам змяніў сваю думку аб ім пісьменнік, і парадаваўся, хоць лічыў, што яму не да твару выяўляць якія б там ні было пачуцці. А Шыковіч, наадварот, адчуваў, што ён не можа, не мае права апусціць вочы, пакуль не скажа гэтаму, на першы погляд, сухому чалавеку нейкія асаблівыя словы.
- Слухайце, Анатоль Барысавіч!.. Каб мы з вамі былі ў больш блізкіх адносінах, эх, як я зараз вылаяў бы вас! Ведаеце, ёсць такія нецэнзурныя словы, якія пры адпаведнай інтанацыі лепш і мацней за любую пахвалу.
- Мне не трэба пахвалы, Кірыла Васільевіч. Толькі, калі ласка, не думайце, што я і мае калегі заўсёды падбіралі толькі тыя дакументы, якія абвінавачваюць. «На месцы вашага калегі...» Эх, Кірыла Васільевіч! Паверце, што для мяне самая радасная работа - даказаць, пацвердзіць сумленнасць савецкага чалавека.
Шыковіч працягнуў яму руку. Яны застылі ў моцным сяброўскім поціску рук.
- Памажыце нам. А я памагу вам.
- Дзякую, Анатоль Барысавіч.

Шматтонная станіна павольна плыла ў цесным праходзе паміж станкамі, паўсабранымі і гатовымі, шэрымі і ярка пафарбаванымі для экспарту. Высока над дахам цэха сунулася шкляная будка крана. Дзяўчына ў сінім чысценькім камбінезоне, стракатай, як вясновы луг, касынцы пільна сачыла за рухам станіны, за людзьмі ўнізе, занятымі працай. Зараз нехта са зборшчыкаў возьме гэтую «дэтальку», павядзе па праходу і пакажа месца, дзе яе паставіць. Павіснуць аслабленыя тросы, лёгка адчэпяцца крукі. Яна падцягне іх на небяспечную для людзей вышыню, і тады кран з грукатам і звонам ад'едзе назад. Часам ёй доўга прыходзіцца сядзець без працы, чакаць, пакуль механікі і зваршчыкі дадуць новую цяжкую дэталь. Яна азірае цэх з вышыні і зайздросціць слесарам - яны працуюць увесь час ад гудка да гудка. Сярод вялізных машын маленькія людзі - як мурашкі. Але машыны гэтыя, прыгожыя і разумныя, збіраюцца іх рукамі. Праўда, без яе працы, без крана, яны нічога не сабралі б, бо не здолелі б падняць нават невялікі «вузялок». Гэтая думка заўсёды суцяшае Ніну: не апошні «вінцік» і яна ў цэху.
Ніна пазваніла: «Прымайце сваю дэтальку».
З-за станка вынырнула знаёмая постаць. Хлопец у берэце спыніўся ў праходзе, спіной да яе, глядзіць некуды ў канец цэха, дзе працуюць упакоўшчыкі, і быццам не чуе і не бачыць, што на яго паўзе двухсотпудоваяаграмадзіна. Ніна рэзка затармазіла кран. Станіна небяспечна гайданулася. Кранаўшчыца пазваніла гучна, злосна. Хлопец - ні з месца.
Ніна высунулася з будкі і закрычала:
- Гэй, ты! Доўга варон будзеш лавіць? Разява!
Тады Славік павярнуўся, ухмыльнуўся на ўвесь замурзаны твар, бліснуў прыгожымі зубамі, сарваў берэт і прыветліва махнуў ім.
- Ах, гэта вы, лэдзі?! Рады вас вітаць! І пачуць анёльскі галасок і арыстакратычны стыль...
Але ў гэты момант нехта са слесараў заляпаў малатком так, што зазвінеў увесь метал у цэху. Ніна не разабрала ніводнага слова. А Славік пачуў, як яна кінула з вышыні, як камень:
- Піжон!
«Запішам і гэта на твой рахунак, дарагі «дзятлік», - падумаў Славік і, нахіліўшыся, спрытна нырнуў пад станіну, што па тэхніцы бяспекі таксама забаранялася. З'явіўшыся на другім баку, надзеў парусінавую рукавіцу і... «павёў» станіну на месца. Рабіў ён гэта спачатку лёгка і няўважліва, як вопытны майстар. Але паставіць «дэтальку» на месца - на другую станіну - аснову станка - не так проста, як Славіку здавалася спачатку. Пры ўсім уменні і спрытнасці кранаўшчыцы станіна гойдалася і адыходзіла то ў адзін, то ў другі бок. Пасля дзвюх-трох спроб Славік зразумеў, што яму не вытрымаць гэтага, па сутнасці, першага экзамену, і вырашыў, што ва ўсім вінавата чортава «дзятліха». Там, у будцы, яна знарок робіць так, каб паказаць яго няздатнасць. Здзекуецца. Чакай жа!
Ён задраў галаву і крыкнуў:
- Гэй,ты! Варона!
Але Ніна была такая засяроджаная, што востры тварык з доўгім носікам, за што Славік адразу ахрысціў яе «дзятлікам», яшчэ больш завастрыўся і выцягнуўся. Славік азірнуўся, каб паклікаць Тараса. Гонар дазваляў яму ў цяжкіх абставінах звяртацца за дапамогай да Тараса і да Косці - больш ні да каго. Але ў той міг з'явіўся Іван Ходас. Славіка ажно перасмыкнула: зноў Ходас. Гэты востры на слова, зласлівы і непрымірымы Іван заўсёды аказваецца побач, калі ён, Славік, трапляе ў няёмкае ці цяжкае становішча. Быццам назірае за ім.
Ходас ледзь прыкметнымі, дырыжорскімі рухамі левай рукі паказаў Ніне, у які бок скрануць станіну. Павёў яе на сябе, глянуў па зрэзу бакавой пліты, нібы прыцэліўся, і, даўшы каманду кранаўшчыцы ад'язджаць, лёгка і проста паставіў станіну на месца - паз у паз, шчыліна ў шчыліну.
Калі кран з грукатам ад'ехаў, Ходас, аглядаючы аснову будучага магутнага станка, спытаў быццам між іншым:
- Ты працаваць сюды прыйшоў ці забаўляцца?
- А што? - адразу натапырыўся Славік.
- А тое, што ў цэху працуюць. А крыўляцца можаш у парку.
- Калі я не здолеў паставіць гэтую штуковіну, значыцца, я крыўляюся? Добранькая дапамога!

Іван узняў галаву, і вочы яго, звычайна блакітныя, як два лясныя азяркі ў ясны дзень, пацямнелі, быццам на іх упаў цень ад навальнічнай хмары. Славік ужо і раней прыкмеціў незвычайную злаславасць колеру яго вачэй і забаўляўся гэтым.
- Крыўляўся пад кранам. Вытанцоўваў перад станінай, як дурань перад труной.
- Дзякую, маэстра. Вось гэта зусім па-кам... - Славік пракаўтнуў слова, бо Іван неспадзявана схапіў яго за нагруднік камбінезона і гнеўна прашаптаў:
- Ты-ы! Не кідайся гэтым словам дзе папала! Для мяне яно святое. Зразумеў? Піжон! - і, расшчапіўшы пальцы, сказаў звычайна: - Замацуеш асноўныя балты. Прывінціш кранштэйны. - І вочы яго сталі блакітнымі.
Знешне грубаваты і цынічны, Славік быў уражлівы і па-дзявочы сентыментальны. Застаўшыся каля станка адзін з цяжкім ключом у руках, ён раптам адчуў сябе прыніжаным і абражаным. Рукі дрыжалі - ключ зрываўся з гайкі, і яму хацелася плакаць. І работа здалася ненавіснай, прыніжаючай яго чалавечую годнасць. Які здзек лёсу! Столькі найвышэйшых мар, і раптам - завінчваць гайкі. З'явілася жаданне кінуць усё да д'ябла, пайсці з завода і ніколі больш не вяртацца. Але за апошні тыдзень, як ён працуе ў брыгадзе, у яго з'явілася новая рыса - нейкі своеасаблівы гонар: дакажу, што і я не горшы за вас - за Тараса і яго брыгаднікаў, за бацьку, за Яраша. Разам з тым ён працягваў сваю ранейшую лінію: пераконваў самога сябе, што ўсе другія не лепшыя за яго, што яны проста па-ханжаску прытвараюцца, іграюць, як акцёры, высакароднасць і высокую свядомасць. Сябра брыгады, ён радаваўся, калі ў брыгадзе нешта не ладзілася ці нехта дрэнна гаварыў пра яе. У першы дзень да яго падышоў стары рабочы. Славік адразу адзначыў, што чалавек худы, і падумаў: «Не дужа сыта, відаць, харчуецца».
Рабочы спытаў з хітраватай усмешкай, кіўнуўшы ў той бок, дзе хлопцы збіралі станок:
- У брыгадзе будзеш?
- Ага.
- Вучнем?
- Хацеў за інжынера - не бяруць.
- Як пралез? Па блату?
- Куды?
- У брыгаду.
«Ага, значыцца, і ў гэтую брыгаду могуць пралазіць па блату», - амаль узрадаваўся Славік і адказаў:
- Па блату. Я - сваяк Ганчарова.
- Ясна. Сваяк сваяка...
- Ага.
Славіку хацелася, каб рабочы пачаў ганіць брыгаду і нават Тараса, хоць у душы быў удзячны Тарасу за сяброўскую падтрымку. Але рабочы сказаў іншае:
- Ганчароў - чалавек правільны, але дзівак. Лепшы зборшчык. Пяты разрад. Працуй - заганяй манету. Дык не - хочацца яму вучыць такіх смактункоў, як ты. Няхай у фазаў ідуць. А ён - у брыгаду. Не было на зборцы брыгад. Яны перайначылі. Даюць сто пяцьдзесят працэнтаў. Але што ён мае ад гэтага, Ганчароў? Вось чаго я не магу зразумець. У яго пяты разрад, у Косці - другі, а прагрэсіўку дзеляць пароўну. Дзівак!
- У Тараса бацька багаты, - вырашыў падыграць Славік.
- Яраш? Ён жа не родны.
- Але ўсё адно грошай дае - колькі хочаш.
- Маніш, - усміхнуўся рабочы. - Навошта ж яму тады жыліцца так на зборцы?
- Свядомасць.
- Але, ёсць такія людзі, - уздыхнуў чамусьці стары, можа, пашкадаваў, што ён пражыў сваё жыццё не зусім так. Сказаў: - Ну, Ярашу не шкада. Залатыя рукі мае чалавек. Люблю людзей умелых. Такім і тысячу можна плаціць.
- А колькі вы выганяеце?
- Ды як калі. Паўтары-дзве.
Славік свіснуў.
- Што ж гэта па вас не відно? - І, уцягнуўшы шчокі, сціснуў іх пальцамі, разявіў рот, маўляў, чаму ж такі худы?
Рабочы ў адказ мазануў Славіка па твары намасленай веташшу.

- Вытры нос.
Стары, відаць, пакрыўдзіўся. І Славік абразіўся таксама. Каб хто ў іншым месцы гэтак зняважліва пэцнуў па твары - не паглядзеў бы ні на ўзрост, ні на пасаду, ні на што. А тут прыйшлося змаўчаць.
Увогуле, у першы дзень яму не пашанцавала. Як пэцнулі па твары - гэтага хоць ніхто не бачыў. А вось другое яго ўніжэнне бачылі многія. Ён стаяў і з цікавасцю разглядаў вялізныя станкі. Раптам - званок угары. Ён задраў галаву і жахнуўся: на яго паўзла агромністая станіна. Ён не ведаў яшчэ тады, якая паслухмяная машына кран і як спрытна і лёгка можа пранасіць па цесным праходзе шматтонныя дэталі беленькая хударлявая дзяўчынка-кранаўшчыца. Здалося, што ніхто не здолее спыніць інерцыю гэтай махіны і яна вось-вось раздавіць яго. І ён адскочыў, як спалоханы заяц. Моцна выцяўся аб станок нагой і ледзь не распластаўся на чорнай прамасленай зямлі. Калі ж убачыў, што станіна нерухома павісла, а з вышыні, з будкі, выглядае дзюбаты тварык і весела смяецца, Славіку захацелася праваліцца скрозь зямлю.
У той момант ён узненавідзеў кранаўшчыцу. І вось цяпер бравіруе смеласцю да парушэння правілаў тэхнікі бяспекі. За гэта яго не раз ужо лаялі: майстар, Тарас, хлопцы. Усялякія маральныя павучанні Славіка раздражнялі. Лаянка майстра Галыгі яму спадабалася: той па-кручаста мацюкнуўся і пагразіў, што выганіць з завода - без лішніх слоў і настаўленняў. Славік, сам балбатлівы, паважаў людзей немнагаслоўных і рашучых: сказаў - зрабіў. Пагроза майстра крыху падзейнічала, дні два ён не выкідваў ніякіх «конікаў».
Увогуле ўзаемаадносіны паміж людзьмі на заводзе яму падабаліся. Няма той інтэлігенцкай ветлівасці, як на студыі, але няма і прытворства. На студыі Славік бачыў, як асобныя рэдактары, акцёры часам нават падхалімнічалі перад дырэктарам, перад галоўным рэжысёрам.
На заводзе людзі ўвесь час заняты працай. Не збіраюцца, каб расказаць новыя анекдоты ці пагуляць у шашкі, як на студыі. Не пляткараць. Калі часам лаюцца, дык вось так, як Галыга: на ўсю моц, адкрыта і шчыра.
А галоўнае - падабалася прадукцыя. Гэта табе не асвятляльны штатыў. А спецыяльны, па асобаму заказу Балгарыі, гарызантальна-працяжны аўтамат з цягай у шэсцьдзесят тон! Ці вунь другая «штучка» - вертыкальны станочак вышынёй з добры дом! Відаць, павінна з'яўляцца нейкае асаблівае пачуццё, калі ўласнымі рукамі збярэш такі станок, электрыкі ўставяць яму «душу», прыйдуць інжынеры і пачнуць выпрабаванне. Хлопцы здалі ўжо адзін такі станок, і Славік прысутнічаў на выпрабаванні. Ён прыдзірліва назіраў за брыгадай і ўпершыню тады сур'ёзна падумаў, што недарэмна пішуць у кнігах пра асобую рабочую гордасць. Гэтыя мурзатыя чэрці могуць ганарыцца! Не станок - цэлая паточная лінія. Аўтаматычная загрузка і разгрузка дэталей, аўтаматычная ачыстка стружкі і - 300 трактарных утулак за гадзіну... Няхай радуюцца браты-балгары! Добра было б, каб пісалі дзе-небудзь у пашпарце, хто збіраў станок. Глядзі, неўзабаве магло б з'явіцца: Уладзіслаў Шыковіч.
Славік падумаў пра гэта зусім сур'ёзна, без звычайнай іроніі над уласным жаданнем. Гэтак жа сур'ёзна прапанаваў у канцы змены:
- За такі станок не пашкодзіла б... - і пацёр падбародак.
Брыгада, як адна сям'я, ішла па заводскім двары, любуючыся мяцеліцай тапалінага пуху. Славіка быццам не пачулі. Гэта кранула яго самалюбства.
«На мяне, значыцца, можна не звяртаць увагі? Чакайце ж!»
Але праз хвіліну адгукнуўся Лапацін:
- А можа, праўда, хлопцы?
- Ты забыўся на ўмову? - спытаў Тарас.
- Як лёгка ты ідзеш на спакусу, - зласліва кінуў Лапаціну Ходас.
- Не спакушай мяне, галубка! - жартаўліва праспяваў Косця.
- Мяне чакае Зоя, - па-прафесарску паправіў акуляры Генрых.
- Глядзі, як бы ён не перавярнуў цябе ў сваю веру.
- Хто «ён»? У якую веру? Хто - «ён»? Я? Дык я - тут, жывы, здаровы. Імя - Уладзіслаў Шыковіч. - Хлопца заела, што Ходас сказаў «ён», нібы яго, Славіка, няма тут ці ён не роўны ім. Але раскрычаўся ён знарок, каб другія рабочыя каля прахадной пачулі, што не такі ўжо лад і дружба ў гэтай камуністычнай брыгадзе.
Тарас балюча сціснуў яго локаць:
- Славік, сціхні!

- А чаму ён увесь час глядзіць на мяне з завоблачных вышынь? Я што - ніжэйшая істота?
- Што ты мелеш? Як я на цябе гляджу?
- Калі чалавек залішне высока ставіць сябе, яму ўвесь час здаецца, што другія хочуць прынізіць яго. Гэта - манія, - сказаў Генрых, прыветліва махаючы камусьці рукой.
Варэнік быў заўсёды падкрэслена ветлівы, і нечаканы філасофскі вывад яго збянтэжыў Славіка, ён не адразу знайшоў, што адказаць. А тут яшчэ напорыста даводзіў Тарас:
- Не будзь ты такім пеўнем. Не прыдзірайся да слоў. Свае ж хлопцы, усе. І, як ты кажаш, жывыя, здаровыя. Не гаварыць жа нам з рэверансамі.
- Хлопцы! Кампраміснае рашэнне: у сталоўцы чыгуначнікаў п'ём піва, - прапанаваў Вася Лапацін.
- А як ты абыдзеш свой дом? Вера даўно пільнуе, - засмяяўся Косця.
Размова пайшла ў другім кірунку, і Славік хутка забыў сваю крыўду.
А вось сёння пасля новай сутычкі з Ходасам успомніў усё да драбніц, пачынаючы з першай сваркі за сталом на дачы.
«Чаму ён чапляецца? Што яму трэба? Кіну да д'ябла! Ну іх!.. Не, так лёгка я не кіну. Я вам наладжу салодкае жыццё. А пайду - дык з музыкай», - пагражаў ён усёй брыгадзе.
Але падышоў Тарас. Паглядзеў, як ён працуе. Сказаў па-сяброўску шчыра:
- Слава, ты няправільна трымаеш ключ, таму ён у цябе зрываецца. Вось так трэба, - і паказаў, як трэба.
Маленькая ласка - і знікла злосць на ўсіх, засталася на аднаго хіба Ходаса.
Панядзелак, кажуць, «цяжкі дзень». Але той панядзелак быў незвычайны, пачынаўся ён амаль святочным настроем, асабліва ў Тарасавай брыгадзе. Сам Тарас, Генрых і Косця прыйшлі на завод з газетамі і віталіся словамі:
- Чытаў?
- Ага.
- А ты, Косця?
- Усяго не паспеў.
- А я, браткі, да цешчы ездзіў. Галава баліць, - шчыра прызнаўся Лапацін, вінавата зморшчыўшыся.
- Няхай жывуць цешча і шчырасць! - весела выгукнуў Славік. - Нават я пра галаву не прызнаўся б. - І гарэзліва аглянуўся: - Ша! Каб ніхто не пачуў.
- Не блазнуй, калі гавораць пра такія рэчы, - асек яго Іван.
Ужо тады Славіку хацелася счапіцца з ім. Але размова сапраўды ішла занадта сур'ёзная. Славіка яна таксама цікавіла, праўда, больш з іншага боку-усё з таго: шчыра хлопцы так зацікаўлены і так блізка бяруць да сэрца ўсё, што запісана ў надрукаваным учора праекце Праграмы, ці па звычцы выказваюць «газетныя пачуцці»? Гэтае пытанне ўзнікла ў яго яшчэ ўчора ў адносінах да бацькі і Яраша. «Класік» (так Славік называў бацьку ў яго адсутнасць) прыліп да дачы; калі не трэба на работу, яго немагчыма сілком выпіхнуць у горад: гатовы сядзець на адной цыбулі і грыбах, абы не ехаць лішні раз. А тут раптам у добрую спякотную нядзелю паляцеў пасярод дня - знарок па газеты. А Яраш адмовіўся нават пайсці на раку - так нецярпліва чакаў гэтых газет. Яны абодва зачыніліся ў пакоях і чыталі да самага вечара. А потым да позняй ночы спрачаліся каля кастра.
Славік спачатку паставіўся да павышанай цікавасці бацькі і Яраша даволі скептычна. Ён чуў размовы, што ў Праграме будзе запісана наконт прыватнай уласнасці - дач, машын. Ці не гэта пагнала старога па газеты?
Адвячоркам бацька загадаў яму катэгарычна і не дужа прыязна:
- Прачытай! Можа, паразумнееш.
Ён разгарнуў «Праўду» і ўпотай свіснуў: гэтулькі чытаць, дзесяць газетных палос! Але асобныя раздзелы прачытаў. І адразу ж, з першых радкоў, зразумеў, якое ў яго было вузкае і прымітыўнае ўяўленне аб будучай Праграме, пра якую многа гаварылі. Партыйны дакумент захапіў юнака незвычайнай шырынёй філасофска-палітычных і эканамічных палажэнняў, грандыёзнасцю практычных планаў. Быў яшчэ адзін нечаканы вынік азнаямлення з Праграмай: бадай, упершыню Славік зразумеў, як мала ў яго, «тэарэтыка новай маралі», ведаў. Да ўсяго ён ставіцца скептычна, нігілістычна. А сам што ведае? Што адкрыў? Што зрабіў? Па-свяціў на тэлестудыі? Завінціў сотню гаек? Гэтыя думкі спалохалі і засмуцілі. «Э-э, пачынаю здаваць пазіцыі. Уступаю пад

напорам прапаганды», - падумаў ён і акуратненька, без паказной, а з сапраўднай пашанай згарнуў газету. Маці, якая не спускала з яго вачэй, сказаў:
- Не для майго маленькага розуму такія высокія матэрыі.
Самакрытычнасць сына, які раней быў даволі высокай думкі пра свой розум, спадабалася Валянціне Андрэеўне. Яна лагодна сказала:
- Але, усяго адразу не ахопіш. Гэта трэба вывучаць паступова, удумліва.
...Калі хлопцы спыталі, ці чытаў Праграму Славік, ён прыгадаў словы маці і тут жа перакруціў іх, як кажуць, дагары нагамі - усё тое ж недарэчнае жаданне вызначыцца, не быць падобным на другіх.
- А навошта? Прымусяць вывучаць - тады прачытаю.
- А без прымусу ты не можаш? - зноў не стрымаўся Ходас. Была другая прычына пасварыцца з ім. Але Тарас умеў спрытна адвесці размову ад Славікавых часам залішне гарэзлівых, часам празмерна сур'ёзна-песімістычных і амаль заўсёды недарэчных заўваг і адказаў.
Хлопцы гаварылі аб Праграме так, што ў Славіка зноў з'явілася захапленне яе велічнасцю, і ён слухаў моўчкі і сур'ёзна. Ды раптам выявіў, што Іван Ходас не чытаў Праграмы, нават газету не бачыў (Славік зразумеў гэта па тым, як ён разглядаў Тарасаву газету). А робіць выгляд, што чытаў. Паўтарае ўсё, што гаворыць разумны Генрых Варэнік.
«Ах, вось ты які мараліст, ханжа! - узрадаваўся Славік «падзенню» свайго ворага. - Чакай жа, я зараз цябе злаўлю», - і ўжо пачаў успамінаць тыя раздзелы, якія прачытаў учора, каб на іх выкрыць Ходаса. Але перашкодзіў гудок.
Праз якую паўгадзіну яны сутыкнуліся ля станіны. Страсці накаляліся. Славік гарэў помстай.
У часе абеду ён знарок сеў за той жа стол, што і Ходас. Але ад іх не адступаў Тарас. Брыгадзір хітра нейтралізаваў усе прычэпкі і наскокі вучня. Ды і ад Івана ўсе Славікавы словы - што гарох ад сцяны. Пакуль Косця (яго чарга) выбіваў чэкі і падносіў талеркі з супам, Іван густа намазваў хлеб гарчыцай і еў. Гарчыца, відаць, была пякучая, хлопец крывіўся, чмыхаў, з вачэй сыпаліся слёзы, але еў са смакам. Славіка давяла да шаленства такая Іванава абыякавасць да яго прычэпкі:
- Ты за ўсю брыгаду жарэш хлеба.
- А ён бясплатны.
- Не бясплатны. А ўваходзіць у кошт страў. Пабудуеш з такімі камунізм!
- Слава! Як не сорамна! - абурыўся Тарас. - Табе хлеба шкада? Няхай есць на здароўе. Хлеб застаецца на сталах.
- Гэта крык душы індывідуаліста, які не можа дараваць, што нехта з'еў больш за яго, - спакойна, быццам аб нечым пабочным, сказаў Варэнік з суседняга століка.
А для Славіка яго словы - што аплявуха. Ён зразумеў, наколькі недарэчны папрок, які ён кінуў Івану. Ганебны. Як не сорамна яму, сыну інтэлігента, які рос у выгодзе, папракнуць за кавалак хлеба рабочага чалавека? Пры ўсёй сваёй развязнасці Славік збянтэжыўся і змоўк. Раптам адчуў, што цяпер самому страшна працягнуць руку за хлебам. А хлопцы ўжо гаварылі пра другое. Кінулі дзве рэплікі - і далей, ніколі не перажоўваюць адно і тое ж. У размовах, як у працы, у жыцці, не спыняцца, імкліва рухацца ўперад - такі дэвіз іх.
Славік сербануў гарачага супу і адставіў талерку.
- Ты што? - заклапочана спытаў Тарас.
Хлопец зморшчыўся.
- Нясмачна? Ды не, сёння якраз што трэба, малайцы кухары. Еш.
Суп Славіку падабаўся, есці хацелася, і яму зноў стала ледзь не да слёз шкада сябе. Следам за гэтым прылівам жаласці да сябе - злосць на ўсіх, нібы яны вінаваты, што з-за сваёй упартасці ён застанецца галодны. А Ходас, накідаўшы ў суп гарчыцы, сёрбаў з такім смакам, што ажно варушыліся паружавелыя вушы і раздзьмуліся ноздры.
«Чаўкае, як свіння», - падумаў Славік, каб хоць як-небудзь прынізіць свайго непрыяцеля. Да іх падышоў сакратар парткома завода Гарачкін. З тонкімі рысамі твару, белымі валасамі, сакратар здаваўся маладзей сваіх год. Але на заводзе ведалі, што ён дваццаць пяць год праслужыў у арміі палітработнікам. Чалавек ён памяркоўны, далікатны, але напачатку спрабаваў заводскую дэмакратыю ператварыць у вайсковую.
- Я вам прынясу супу, Пятро Савелевіч, - прапанаваў Косця, калі сакратар падсеў да іх стала.
- Дзякую. Няма калі. Тысяча спраў. Я пазней паабедаю.
«Калі ў сталоўцы не будзе рабочых?» - хацеў уедліва спытаць Славік, але стрымаўся.

- Хлопцы, пасля змены правядзём мітынг. Скажам наша рабочае слова аб Праграме. Трэба, каб хто выступіў ад вашай брыгады.
- Тарас.
- Ды ну, хлопцы, няёмка! Усё я ды я.
- Правільна. Лепш, каб хто з сябраў брыгады.
- Тады Іван. Ён народжаны прамоўца.
- Значыцца, дамовіліся: Ходас, - звярнуўся сакратар да рабочага.
Іван кіўнуў галавой.
- Падумайце, што вы можаце яшчэ зрабіць да з'езда, - сказаў сакратар да Тараса. - Паглядзіце свае абавязацельствы.
Тады Славік гучна, здзекліва і зларадна хмыкнуў:
- Хэ! А што ён скажа, Ходас? Ён жа газеты ў вочы не бачыў.
Іван падскочыў, твар яго ўміг наліўся крывёю.
- А ты бачыў?
- Я не толькі бачыў. Я чытаў! А ты ўпершыню ў Тараса пабачыў. А збіраешся выступаць. Балбатун ты!
- Сам ты балбатун! Большага за цябе...
- Ах, я балбатун? Тады скажы шчыра і сумленна - чытаў ты? Ага, маўчыш! Ты ж з Валькай на пляжы пракачаўся.
- Ну, ты! - Іван сціснуў кулак.
- Слава!
- Што «Слава»? А я выкрываю няшчырасць і ханжаства.
Славік знарок амаль крычаў, каб пачулі другія рабочыя, каб прыцягнуць іх увагу. Ён бачыў, як Тарас і ўсе хлопцы стараюцца «спусціць на тармазах» гэтую непрыемную размову. Тарас пацягнуў за палу пінжака Івана, прымусіў яго сесці, сціснуў локаць і сказаў да сакратара:
- Мы абмяркуем, Пятро Савелевіч... Выступленне ад брыгады будзе.
Гарачкін стаяў і моўчкі слухаў, пільна разглядаючы Славіка. Праніклівы позірк сакратара і бянтэжыў і яшчэ больш раздражняў няўрымслівага юнака.
- Славік, дай папяросу, - працягнуў руку Лапацін.
- «Люблю грозу в начале мая», - дэкламаваў у талерку Генрых.
- Што вы загаворваеце зубы? - не сціхаў Славік, яшчэ больш павышаючы голас. - Вам хочацца быць добранькімі? Чаму ты змоўк, прамоўца? Няма чаго сказаць? Дэмагогі!
Гарачкін раптам ляпнуў далоняй па стале.
- Даволі мітынгаваць, Шыковіч! Абед канчаецца, - сказаў сярдзіта і пайшоў у другі канец залы.
Славік, як бы дэманстратыўна выконваючы загад сакратара, пачаў на поўны рот есці катлеты. За сталом усталявалася цяжкая цішыня. Нават жавалі бясшумна. Не ўзнімалі вачэй. Толькі Генрых, разглядаючы шклянку з рэдкім ружовым кісялём, ціха дэкламаваў:

Дорогая, сядем рядом,
Поглядим в глаза друг другу.

...Сакратар парткома выклікаў Тараса.
- Але і экземплярчык ты прыцягнуў. Мне казалі - я не верыў. Разваліць ён табе брыгаду.
- Калі ён можа развaліць брыгаду, то грош нам цана. Чаго мы варты?
- Ты самакрытычны. Але май на ўвазе, Славік твой не такі наіўны, як табе здаецца. У яго даволі цвёрдыя перакананні. Не Ходасу ён крычаў, а ўсім, хто абедаў. Хацеў памітынгаваць раней... Ходас - зачэпка...
Тараса здзівіў такі нечаканы паварот у разважаннях сакратара. Баяцца Славіка? Смешна.
- Ты чуў, што ён крычаў? «Дэмагогі!» Хто - дэмагогі? Хто не прачытаў. Шмат хто не паспеў прачытаць.
- Але не меў Ходас маральнага права згаджацца выступаць! - запярэчыў Тарас. - Тут Шыковіч праўду сказаў. Іншая рэч, як ён гэта сказаў. Непрыязь у іх адзін да аднаго - вось што дрэнна.
- Што ж, глядзі. На тваю адказнасць. Калі што - будзеш адказваць перад парткомам.
Мітынг уразіў Славіка перш за ўсё сваёй масавасцю. Звычайна пасля змены рабочыя спяшаюцца хутчэй дадому. Асабліва жанчыны. Іх цяжка затрымаць на пяць - дзесяць хвілін.

Славік знарок праціснуўся да прахадной, каб пабачыць, як рабочыя будуць уцякаць, сварыцца з вартаўніком. Але нічога гэтага не было. Тыя ж самыя жанчыны, наадварот, ціснуліся бліжэй да трыбуны, выкарыстоўваючы сваё жаночае права быць наперадзе. Людзі засяроджаныя, сур'ёзныя, уважлівыя - і старыя і моладзь. І, што дзіўна, не было нудных прамоўцаў. Гэта таксама ўразіла Славіка. Усе гаварылі з такой палымянасцю, што ў хлопца зноў з'явілася тое пачуццё захаплення, якое ён адчуў учора, калі чытаў праект. Толькі выступленне Тараса яго насцярожыла. Брыгадзір гаварыў пра маральны кодэкс будаўніка камунізму. Славіку здалося, што гэта знарок для яго. А ён страшэнна не любіў, калі хто-небудзь пачынаў чытаць яму мараль з мэтай перавыхаваць. Тады ў яго з'яўлялася жаданне зрабіць усё наадварот. Разам з насцярожанасцю ён адчуваў задавальненне, што не даў Ходасу пакрасавацца перад народам. Хацелася глянуць пераможанаму ворагу ў твар. Славік пачаў прабірацца наперад. На яго зашыкалі, каб не перашкаджаў слухаць. І ён не адважыўся хваляваць ціхае людское мора - застыў на месцы. Ён адчуў, усвядоміў веліч гэтага мора, яго магутную сілу. Разумную сілу, якая не разбурае, а стварае. І, можа, упершыню адчуў сябе часцінкай гэтай сілы. Аднак разуменне таго, што ён - часцінка вельмі маленькая яшчэ, на гэты раз не здалося яму зневажаючым яго чалавечую годнасць.
Ён выходзіў з завода цераз шырока адчыненыя вароты ў натоўпе рабочых з нейкім асаблівым гонарам. Чамусьці яму хацелася, каб у гэты міг яго ўбачыў бацька.

**16**

Шафёр гнаў па лясной дарозе як ашалелы, таго і глядзі, разаб'е. А дарогі такой - кіламетраў дваццаць. У некранутым сасновым бары - тоўстае карэнне, цэлыя карнявыя вузлы, як добрыя камяні; у дубовых гаях - старыя грэблі, на якіх мала засталося насцілу, адны ямы, палітыя ўчарашнім дажджом. Шафёр ні на што не зважаў. А побач з ім у кабіне бестурботна спаў старшыня. Шыковіч праз шкло ў задняй сценцы бачыў, як з боку ў бок матлялася пляшывая галава. Яго і дзвюх дзяўчат-калгасніц кідала ў кузаве, як тыя кавуны, - ад борта да борта. Дзяўчаты смяяліся, хапаліся адна за адну, потым, асмялеўшы, пачалі хапацца і за яго. Кірылу падабалася такая непасрэднасць і тое, што яго не лічаць яшчэ за старога, калі падбіваюць на жарты. Неяк асабліва хваляваў дотык маладых дужых рук, ад якіх пахла зямлёй і зернем. Ад мяшкоў, на якіх яны сядзелі, патыхаў цёплы водар збажыны. Але хутка Шыковіч адчуў, што ад такой вясёлай язды пачынае балець усё нутро. Не тыя гады, каб так трэсціся.
Нарэшце выехалі з лесу на асушанае балота. Дарога праз тарфянікі - што коўдра, роўная і мяккая. І дзіўна - ці так здалося на раўніне, дзе няма за што зачапіцца воку, ці на самай справе - шафёр павёў машыну асцярожней і павольней. Сціхлі дзяўчаты, як бы засаромеліся сваёй лясной гарэзлівасці. Нават прачнуўся старшыня; з яго боку з кабіны пацягнула папяросным дымком.
Кірыла прылёг на мяшкі і паглыбіўся ў разважанні.
«Трэба будзе высвятліць, колькі служыць машына пры такіх дарогах і такой яздзе. Варта ўставіць дзе-небудзь пра тып старшыні, як з гадамі мяняецца іх знешні выгляд. Такіх, як гэты Грак, я даўно не сустракаў. Вынырнуў быццам з сорак пятага года».
Немалады - год пад пяцьдзесят - старшыня больш за ўсё нагадваў калгасных кіраўнікоў таго далёкага пасляваеннага часу: непаголены, у зашмальцаванай, даўно, відаць, не мытай, гімнасцёрцы з чорнага грубаватага сукна, у старамодным дыяганалевым галіфэ, у пажоўклых ботах і, галоўнае, з кірзавай палявой сумкай, невядома чым туга напакаванай. Гэтая працёртая на вуглах сумка проста-такі прываражыла Шыковіча. «Няўжо з ваеннага часу?» - карцела спытаць.
Убачыўшы каля складоў «Закупзерне» старшыню з Загалля, Шыковіч зразумеў, чаму сакратар райкома спрабаваў адгаварыць яго ад паездкі ў гэтую далёкую вёску, куды нават раённыя работнікі рэдка заглядваюць.
Беразоўскі - стары знаёмы Шыковіча, некалі працаваў у абкоме камсамола. Малады энергічны сакратар. Сустрэў Шыковіча з радасцю:
- Нарэшце ты заглянуў і ў наш забыты творцамі раён. Цяпер я цябе не выпушчу.
- Мне трэба перш за ўсё дабрацца да Загалля.
Сакратар насцярожыўся:
- Чаму адразу ў Загалле?
- Ды так. Кажуць, цікавая вёска, - ухіліўся ад тлумачэння Шыковіч.
- Вёска за сямю лясамі, дзевяццю балотамі. Этнаграфічны куток. Гэтым і цікава. Але, скажу табе шчыра, калгас там не самы лепшы.
- А мне і трэба не самы лепшы.

- Значыцца, маеш намер пісаць разгром?
- А ты баішся?
- А хто не баіцца? Ваш брат настрочыць - а нас на бюро абкома па сігналу газеты. Каму-каму, а табе вядома, што пры ўсёй той велізарнай рабоце, якую вядзём у апошнія гады, і пры пэўных поспехах хапае і прарэхаў. Шмат якія намаганні тонуць, як у бяздоннай бочцы. То засушыла, то падмачыла. Працуеш-працуеш, а вынікі...
- Незадаволены вынікамі?
- Якая можа быць задаволенасць? Вышэй дзевяці цэнтнераў ніяк не можам узняцца.
- А кукуруза?
- Кукуруза якраз добрая. На круг цэнтнераў па трыста.
- Лепшая, чым летась?
- Лепшая!
- А летась у вас, здаецца, было па шэсцьсот?
Беразоўскі засмяяўся:
- Гэта твой друг Раманаў у кабінеце на паперы вырошчваў па гэтулькі.
- Ты ў яго быў трэцім. Маеш вопыт.
- Цяпер за такі вопыт будзеш глядзець на неба вось праз што, - сакратар склаў пальцы ў выглядзе крат.
- А не здаецца табе, Барыс Пятровіч, што нежаданне пусціць журналіста ў слабы калгас - гэта сцэна з той жа оперы «Паказуха»?
Беразоўскі пакрыўдзіўся:
- Я хацеў памагчы табе напісаць такі нарыс, за які цябе, пісаку, пахвалілі б, а ты вунь як вытлумачыў... Ну дык каціся ты ў сваё Загалле.
- А як туды дакаціцца?
- Добра. Не будзем крыўдзіцца адзін на аднаго, а то яшчэ пасварымся. Пачакай гадзіны дзве, я правяду нараду дырэктараў школ і пасля завязу цябе сам.
Але, блукаючы па райцэнтры, Шыковіч падышоў да склада, дзе стаяла чарга машын са збажынай, і натрапіў у канторы на загальскага старшыню.
Грак, калі Шыковіч звярнуўся да яго, акінуў падазроным позіркам, спытаў коратка:
- Хто?
- Лектар.
Шыковіч не хлусіў: кожны раз, выязджаючы ў раён, ён браў у абкоме партыі лектарскую пуцёўку. Часцей за ўсё рабіў даклады пра літаратуру. Але цяпер яму хацелася расказаць сялянам аб праекце Праграмы, пачуць іх думкі.
- Лектар - рэч патрэбная, - паблажліва дазволіў пад'ехаць супакоены старшыня. Але, пераканаўшыся, што едзе ў калгас птушка невялічкая, ніякі не рэвізор, ён тут жа страціў усялякую цікавасць да гэтай «рэчы патрэбнай».
Шыковіча такое вызначэнне лектара спачатку абурыла, пасля рассмяшыла. Прыгадаўшы ў машыне, што ён - «рэч патрэбная», не стрымаўся - усміхнуўся, пакруціў галавой. Дзяўчаты глядзелі на яго як на дзівака.
Зноў лес. Зноў балота, не асушанае, з дзедаўскімі грэблямі. І вось яно - Загалле, вялікае сяло ў падкове дубовых гаёў.
Не вызначаюцца яшчэ асаблівай навізной нашы вёскі. Пра гэта многа гаварылі і пісалі. Пісаў і Шыковіч. Але амаль усюды, дзе ён ні ездзіў, то бачыў побач са старымі хатамі новыя збудаванні: ці то тыповая школа, бальніца, клуб, ці новыя дамы, светлыя, прасторныя, хоць і нетыповыя (кожны будаваў па ўласнаму праекту), шмат дзе цагляныя, пад гонтай і шыферам, і бадай што ва ўсіх калгасах новыя гаспадарчыя пабудовы: кароўнікі, свінарнікі, над якімі ўзвышаюцца воданапорныя вежы, ветраныя рухавікі. Усё гэта надае вёскам новы выгляд. Нічога новага не было ў Загаллі. Сяло ў вайну не гарэла. І ўсё тут было старое. Хаты бадай што дарэвалюцыйныя, прыплюснутыя, з нізкімі і маленькімі акенцамі, з замшэлымі стрэхамі. Быццам і не раслі тут людзі, не жаніліся, не аддзяляліся ад бацькоў, не заводзілі свой куток, не дбалі, каб ён быў больш прыгожы, чым дзедаўскі.
Калгасныя патрэбы, відаць, задавальнялі тыя хлявы і свірны, якія зляплены былі пасля калектывізацыі з абагуленых гумнаў.

На доўгай травяністай вуліцы гуляла многа малых, пасвіліся шматлікія чароды гусей. Відаць, праз гэта шафёр вёў машыну з асцярожнасцю вучня: куды знік той ліхач, які ляцеў па лясной дарозе з хуткасцю ветру. Больш, чым выгляд хат, Шыковіча ўразілі андаракі на старых жанчынах. Даўно ўжо ён не бачыў андаракаў! Сапраўды, этнаграфічны куток. Кірыла чамусьці падумаў пра адзенне старшыні і яго пацёртую кірзавую сумку. Андаракі хоць прыгожыя - квяцістыя. Трэба купіць адзін - для экзотыкі.
Машына спынілася насупраць дома, які стаяў у глыбіні старога і, пэўна, здзічэлага саду: пладоў на яблынях і грушах не было. У суседніх сялянскіх садках чырванабокія яблыкі былі відны здалёк.
Старшыня выскачыў з кабіны і, нічога не сказаўшы Шыковічу, не запрасіўшы нават у праўленне, хутка пайшоў па сцежцы да дома, памахваючы сваёй сумкай.
Калі машына адышла, Шыковіч застаўся адзін на вуліцы. Ён нават не паспеў спытаць у дзяўчат, якія таксама выскачылі з кузава, што ж там, у садзе: кватэра старшыні ці калгасная канцылярыя? Ён толькі беспамылкова вызначыў, што гэта былы папоўскі дом. На другім баку вуліцы ці, хутчэй, цэнтральнай плошчы (тут перакрыжоўваліся вуліцы) узвышалася былая царква. Шыковічу хацелася адгадаць, што ў гэтай недарэчнай будыніне - клуб ці склад?
Ды раптам з'явіўся Грак. Без сумкі. З прыветлівай усмешкай на ўвесь шырокі загарэлы твар:
- Таварыш Шыковіч?
Кірыла адразу здагадаўся, што адбылося: пакуль яны ехалі, пазваніў Беразоўскі. Усміхнуўся ў адказ.
- Кірыла Васільевіч! - Усё было высветлена. - Як жа можна так? Ай-я-яй... - Старшыня дакорліва ківаў галавой, цмокаў языком, быццам дакараў малога. - Я разумею, ваш брат, інжынер нашых душ, хоча глянуць на людзей так, каб яны не ведалі, хто на іх глядзіць. Але мне вы павінны былі сказаць. Калі трэба, я - ні гу-гу.
- Ды не, я хавацца не думаю. Даклад буду рабіць. Можна сёння сабраць людзей?
- На ваша імя прыляцяць, як матылі на агонь.
«Ого, - падумаў Шыковіч, - ды ён галантны мужчына. Можа і кампліменты выдаваць».
Ветліва адчыніўшы перад госцем дзверы ў кантору праўлення, Грак закрычаў з парога:
- Трышка! Абвясціць па ўсяму сялу: да нас прыехаў вядомы пісьменнік Шыковіч! У дзевяць гадзін усе як адзін у клуб, слухаць лекцыю!
Хлапчына з надзвычай прыгожай чупрынай, белай, хвалістай (лепшы парыжскі цырульнік не зрабіў бы такой прычоскі, як зрабіла прырода), раней чым кінуцца выконваць загад старшыні, шчыра і моцна паціснуў Шыковічу руку і паведаміў:
- Я чытаў вашу аповесць. І фельетоны.
Жанчына-бухгалтар, наадварот, чамусьці скептычна ўсміхалася. Відно было, што гэта маладая маці: кофтачку на кнопках распіралі поўныя грудзі, з белага твару не сышлі яшчэ плямы. Пры паўнаце постаці твар гэты здаваўся худым, хваравітым і, бадай што, быў бы непрыгожы, каб не вочы - вялікія, чорныя, хітрыя і разумныя. Ды яшчэ валасы, такія ж чорныя, скручаныя на патыліцы ў вялікую куксу, рабілі жанчыну прыгожай.
Неспадзявана для Шыковіча агульны пакой канцылярыі аказаўся даволі чыстым і ўтульным - нават вазоны на падаконніку. А сцены абклеены сельскагаспадарчымі плакатамі, падабранымі больш па яркасці і прыгажосці, чым па іх прапагандысцкаму значэнню. Плакат, на якім з кукурузнага пачатка сыплюцца, як з мяшка, каўбасы, сала, масла, сыр, тканіна, гума і іншыя каштоўныя рэчы, аказаўся не на самым цэнтральным месцы, а ў куце каля грубкі.
Грак адчыніў дзверы з шыльдачкай: «Старшыня праўлення», але Шыковіч зрабіў выгляд, што разглядае табель выпрацоўкі працадзён, і не пайшоў у кабінет.
Старшыня пачаў шаптацца з жанчынай.
Шыковіч здагадаўся, пра што, і перапыніў іх:
- Таварыш Грак, калі вы наконт абеду, то не турбуйцеся. Тры гадзіны назад я абедаў у раённай чайной. За вячэру буду ўдзячны. У нашыя з вамі гады і пры нашай камплекцыі многа есці - самагубства.
Грак засмяяўся:
- Я думаю, ад яды ніхто не памёр. Можа, памідорчыкаў, гурочкаў маласольных? А?
- З прыемнасцю. Але пазней. На вячэру.
- А палуднічак павінен быць.

Цяпер ужо засмяялася жанчына.
- Энергія траціцца ад усялякай работы, - глыбакадумна зазначыў старшыня, каб апраўдаць сваё жаданне паабедаць.
- У мяне, ведаеце, акрамя даклада яшчэ адна справа ёсць. Скажыце, Сухадол Клаўдзя Сідараўна жывая,здаровая?
- Баптыстка гэтая? Яна сто гадоў пражыве! - кінуў амаль злосна Грак.
- Баптыстка? - здзівіўся Шыковіч.
- Ды не баптыстка яна! - запярэчыла бухгалтар.
- Ну не ведаю, якому яна ідалу там кланяецца, але што шаманка, то шаманка. Больш хітрая, чым тыя, якіх я бачыў у якутаў. Адным словам, дармаедка. Абвясціла сябе знахаркай. Варажбіткай.
- Ды не варожыць яна. Травамі лечыць.
- Ты, Кацярына, не абараняй. Ты сама туды ж. Сорам! Культурная сіла! - кінуў ён жанчыне з дакорам.
- А што? Яна вылечыла мяне.
- Вылечыла. Лекарка! Прафесар! Дурнота ваша бабская ёй кішэню набівае. Хочаце напісаць пра яе, таварыш Шыковіч?
- Ага.
- Дайце добранькі фельетон. Я вам факцікаў падсыплю. Можа, пракуратура тады дацягнецца. А то я колькі разоў казаў нашаму пракурору, ды ён усё рукамі разводзіць: «Няма падстаў, трэба блюсці законнасць». Я ёй, праўда, крыллі падрэзаў - сядзібку па самыя вуглы адшахаў.
Але, не такой уяўляў Кірыла гэтую жанчыну, калі пасля доўгіх пошукаў з дапамогай Яраша даведаўся нарэшце, куды знікла з горада былая сястра інфекцыйнай бальніцы Клаўдзя Сухадол.
«Медсястра - і раптам знахарка, сектантка нейкая. Ліха ведае што такое!» - разважаў ён, незадаволены, ужо трохі расчараваны, ідучы па доўгай вуліцы ў край сяла. Прыгадваў, як адразу варожа насцярожылася бухгалтар, калі пачула, што ён хоча пісаць пра Клаўдзю. Што пісаць - тлумачыць не стаў, бо раптам страціў веру, што ўвогуле прыйдзецца нешта пісаць у выніку размовы з гэтай жанчынай.
Знайсці яе хаціну было лёгка. Па-першае, яна стаяла трэцяй з краю, каля самага лесу, а па-другое, адзіная такая ў сяле: маленькая мазанка, пабеленая на ўкраінскі лад. Высокі лазовы пляцень, якім з усіх бакоў быў абгароджаны цесны дворык, здаўся Шыковічу крапасной сцяной, за якой нехта як бы хацеў схавацца ад людзей і свету. Дзе ў суседзяў былі садкі і агароды, тут, адразу за плятнём, шапацела надзіва высокая кукуруза. «Каралева палёў», дзіця сонечнай Украіны як бы цягнулася да мазанкі. Спалучэнне натуральнае, нават прыгожае. Але Шыковічу ўспомніліся словы Грака: «Я ёй крыллі падрэзаў», і ён упершыню падумаў аб крыўдзе, якую, напэўна, мае жанчына на мясцовую ўладу і - вельмі можа быць - нават на гэтую цудоўную кукурузу.
Ад весніц паўз хату ішла вузенькая і чысценькая, пасыпаная жоўтым пясочкам сцежачка. Уся астатняя плошча дворыка была разбіта на малюсенькія акуратныя градкі, засаджаныя гароднінай і кветкамі. Безумоўна, не хадзіла па гэтым двары ні карова, ні каза, нават слядоў курэй не было відно, хоць невялічкі хляўчук, таксама абмазаны і пабелены, туліўся ў кутку за хатай.
Шыковіч разгледзеў усё гэта, пакуль, прасадзіўшы руку ў шчыліну, шукаў адмысловую «зачынялку», каб адчыніць весніцы. Ды так і не знайшоў, хоць дасканала ведаў усе старажытныя канструкцыі сялянскіх замкоў - круцёлак, засовак, зашчэпак.
І тут з'явілася сама гаспадыня. Яна, нахіліўшыся, выйшла з дзвярэй, шырокімі крокамі падышла да агароджы, цераз пляцень глянула, хто там, адчыніла весніцы, але загарадзіла сцежку сваёй постаццю, акідваючы няпрошанага госця дапытлівым позіркам: што ты за птушка?
Шыковіча адразу ўразіў яе выгляд. Жанчына была на добрую галаву вышэйшая за яго і значна старэйшая, чым яму ўяўлялася, зусім сівая ўжо. Па-мужчынску кастлявая, крыху ўжо ссутуленая, але, відаць, даволі дужая яшчэ, яна стаяла з пучком сухой травы ў руцэ, як вартавы са зброяй. Глядзела так, што Шыковічу здалося: вось-вось сцебане яго гэтым венікам па твары. Ён адчуваў, што не вытрымае яе позірку, і паспяшаўся загаварыць першы:
- Клаўдзя Сідараўна?
- Што вам? - сурова спытала яна.
- Я хацеў пагутарыць...
- Пра што? Хто вы?

- Я растлумачу... Я з рэдакцыі. - Вопытны журналіст, ён, можа, упершыню адчуў сябе ніякавата, знаёмячыся з чалавекам.
У старой гнеўна бліснулі вочы.
- Што вам трэба ад мяне? Я не займаюся знахарствам, няхай не брэшуць. Я збіраю травы. Раю іх людзям. Няма такога закону, каб забараніць мне... Няма! - Яна крута павярнулася і... пайшла ў хату.
Шыковіч зусім разгубіўся.
«Чорт мяне пацягнуў за язык сказаць, што я з рэдакцыі. Калі яна зачыніцца і больш не выйдзе, тады хоць крычы пад акном, што мне трэба ад яе».
А з-за плятня ўжо зыркалі цікаўныя вочы суседкі. Ляпнула акно за спіной, у хаце на другім баку вуліцы. Яго бралі пад скрыжаваны «абстрэл». Мабыць, другіх сваіх наведвальнікаў Сухадоліха сустракала інакш.
Але паколькі весніцы засталіся адчыненыя, Кірыла рашуча ступіў у двор і спыніўся перад акном: няхай бачыць, што ён не адыдзе, пакуль не пагутарыць.
Ды жанчына праз хвіліну выйшла. У выцягнутых перад сабой доўгіх руках яна несла тоўстую кніжку ў палатнянай вокладцы.
«Няўжо Біблія? - амаль са страхам падумаў Кірыла. - Не хапала клопату!»
Чаго ён не ўмеў - дык гэта весці антырэлігійную прапаганду сярод веруючых. Суцяшаў сябе тым, што гэтага не ўмее рабіць большасць прапагандыстаў, а таму і чытаюць свае лекцыі не перад веруючымі, а перад тымі, хто даўно ўжо ні ў Бога ні ў чорта не верыць.
Яна злосна сунула яму кніжку:
- Во!
Ён адгарнуў вокладку і ледзь не засмяяўся. Гэта быў том «Лекарственные растения».
- Во! - паўтарыла яна. - Усяго пяць гадоў назад выпусцілі. Савецкі інстытут. Медыцынскі. Вучоныя! І ўсе пішуць: збірайце травы. Дык пакажыце мне закон, каб забаранялі іх збіраць? Дзе такі закон? - наступала яна.
Шыковіч глядзеў на яе знізу ўгору і не адразу здагадаўся, чаму змяніўся яе суровы твар, што яго быццам памаладзіла за тыя хвіліны, якія яна была ў хаце. Ага, жанчына паспела павязаць белую хусціну, і павязала своеасабліва, не так, як тутэйшыя сялянкі, «хаткай», а так, як павязваюць касынкі сёстры і санітаркі ў бальніцах.
Шыковіч вырашыў не перапыняць яе: няхай выкажацца.
- Не думайце, што я дурная, цёмная баба. Я не маю дыплома. Але я пятнаццаць гадоў рабіла сястрой у бальніцы. Былі людзі, якія верылі мне без паперак. Цяпер не вераць. Лепш за яе, нашу дурную фельчарыцу, што заявы на мяне піша. І грошы бяру! Бяру! А што мне - паміраць? Гародчык і той абрэзалі...
- Клаўдзя Сідараўна! - нарэшце перапыніў яе Шыковіч. - Я прыехаў да вас зусім па іншай справе.
Яна змоўкла, не разумеючы.
- Я хацеў спытаць у вас пра Савіча. Доктара Савіча. Сцяпана Андрэевіча.
Як яна адразу змянілася! Адступіла на крок, нібы спалохалася. Сцялася неяк уся, ажно ростам паменшала. Аднак твар асвяціўся нейкім унутраным агнём, адны маршчыны разгладзіліся, другія сталі глыбей. Але сказала яна яшчэ даволі сурова:
- Савіч васемнаццаць гадоў у зямлі. Навошта ён вам?
- Я хачу напісаць пра яго і пра вас.
- Што пра нас пісаць?
- Што? Я хацеў бы напісаць, што Савіч быў савецкім чалавекам. І тады, калі служыў у немцаў. Але для гэтага мне патрэбны доказы. Факты. Сведкі.
Яна зірнула на суседскі падворак і раптам запрасіла ветліва, ціха:
- Хадземце ў хату.
З дзвярэй патыхнула не кіслым і цвілым, як амаль з усіх сялянскіх сенцаў, а ліпеньскім вячэрнім лугам - густым водарам сухіх траў. У хаце таксама пахла травамі, але неяк зусім інакш. Ні сцяблін, ні пацярухі насення нідзе не было відно. Хіба толькі ў тых мяшочках, што віселі на жэрдачцы над печчу, ды ў тых пляшках і шклянках, што стаялі ў куце пад лавай. А так усюды чысціня: старанна пабелены сцены і нізкая столь, да жаўцізны адмыта падлога, заслацы квяцістай дамотканай посцілкай драўляны ложак. На стале пад настольнікам - круглая паляніца хлеба.

Абразы ў куце, два невялічкія, упрыгожаныя вышываным ручніком. Самаробная рамка на сцяне, у якой пад шклом некалькі фатаграфій.
Гаспадыня выцерла пярэднікам і без таго чысты ўслончык, падсунула яго да стала, без слоў запрашаючы госця сесці. Сама стала пасярод хаты, сашчапіўшы рукі на грудзях. Спытала ўсё яшчэ з тайнай падазронасцю:
- Дык вы з рэдакцыі?
- Не верыце? - усміхнуўся Кірыла і дастаў з кішэні пасведчанне. - Калі ласка. Маё прозвішча Шыковіч... - Ён пашкадаваў, што не захапіў кніжкі. Але жанчына не кранулася з месца, каб паглядзець дакумент, і яму нават стала нейк няёмка. Ён паклаў пасведчанне на стол.
- А што вы ведаеце пра Савіча?
- Шмат чаго, але пакуль што рознае. Па некаторых дакументах Савіч - вораг. А людзі кажуць, што да апошняй хвіліны свайго жыцця ён змагаўся з фашыстамі...
- Хто кажа?
- Хто ведаў яго. У тым ліку дачка.
- Зося? - уся ўстрапянулася жанчына, хіснуўшыся наперад, і ў голасе яе чуліся здзіўленне, недавер, радасць. - Зося? Зоська жывая? Дзе яна?
- У горадзе. - Шыковіч не стаў адразу тлумачыць, што дачка Савіча яшчэ ў бальніцы пасля цяжкай аперацыі.
- Зося жывая! Божачка мой! - зусім па-старэчы не то ўсхліпнула, не то засмяялася Клаўдзя Сідараўна і зрабіла круг па хаце, як бы нечага шукаючы. Дакранулася рукой да печы, паправіла занавесачку на акне. Потым раптам села з другога боку стала, падперла далоняй шчаку і пільна ўглядзелася ў Шыковіча.

* * *

Сабраліся, безумоўна, пазней дзевяці. Шыковіч не здзіўляўся: летні дзень, пакуль людзі вярнуліся з поля, памыліся, павячэралі, жанчыны падаілі кароў, паклалі дзяцей. Але гадзіне а дзесятай, калі добра ўжо сцямнела, прасторная зала клуба, былой царквы, была паўнюткая - не праціснуцца. Перад самай сцэнай, на падлозе, размясціліся хлопцы-падлеткі (дзяцей не пускалі), на пярэдніх лаўках - пажылыя калгаснікі і вясковая інтэлігенцыя, далей - усе тыя, без падзелу на ўзрост і становішча, хто прыйшоў раней і захапіў месца. А з бакоў і ззаду стаялі жанчыны, дзяўчаты і тыя хлопцы, якім няёмка ўжо было садзіцца на падлогу. Большасць стаяла. Таму Шыковіч вырашыў гаварыць нядоўга, каб не змарыць і так ужо стомленых за дзень людзей.
Але тэма была проста-такі неабдымная. Ён упершыню вось так, вусна, расказваў людзям аб Праграме. А ён ніколі не быў бясстрасна-акадэмічным дакладчыкам. Ён перш за ўсё выказваў свае адносіны да з'явы, і заўсёды без усялякіх шпаргалак. Тут яму хацелася перадаць людзям сваё захапленне веліччу тых планаў, якія партыя вынесла на ўсенароднае абмеркаванне. Каб ён не адчуў у самым пачатку нейкай незвычайнай хвалюючай блізкасці слухачоў - таго, што лектары называюць тэхнічным словам «кантакт», то, магчыма, гаварыў бы карацей. Але аўдыторыя была надзіва: розныя па ўзросту людзі - і ўсе такія ўважлівыя! Слухаюць - не варухнуцца. Відаць, не часта тут бываюць добрыя лектары.
Шыковіч нават не прыкмеціў, як прагаварыў дзве гадзіны. Схамянуўся толькі тады, калі ўбачыў, што адзін з тых падлеткаў, што сядзелі на падлозе, усё-такі змогся: захроп, адкінуўшы галаву да сцяны. Сябры штурхалі яго са стоеным смехам. Шыковіч перапыніўся, глянуў на гадзіннік:
- О-о! Здаецца, аднаго я ўжо даканаў.
Ад рогату залы хлопец адразу прачнуўся і, засаромлены, падхапіўся, праціснуўся праз натоўп да дзвярэй.
Грак, які адзінока сядзеў за сталом прэзідыума, шырока пазяхнуў, памахаўшы перад ротам далоняй, як бы адганяючы злога духа. Шыковіч зразумеў, што гэта хітры сігнал: закругляйся.
Але хацелася яшчэ сказаць аб перабудове вёскі. Не ўвогуле, а канкрэтна ў дачыненні да іх Загалля. Сказаць так, каб гэта было папрокам самаздаволенаму Граку, які дванаццаць год старшынствуе тут, выстаўляе гэта як сваю заслугу, а слядоў гаспадарання яго не відно.
- Самае страшнае, таварышы, калі людзі звыкаюцца са становішчам, якое ёсць. Гэта называецца кансерватызмам, застоем. Ёсць хата, клуб, свіран, і добра. А якая гэта хата? Які клуб? Ці можна з такім бытам і такой культурай ісці ў камунізм? Вы мне прабачце, але скажу вам шчыра, сумна

мне было сёння глядзець на ваша Загалле. Месца добрае. Прырода якая! А вось па выгляду сяла, па здабытках працы вашай не відаць, што гэта час, калі шырока абмяркоўваецца вялікі план будаўніцтва камунізму.
Грак раптам без прычыны закашляўся. На тварах тых, хто сядзеў на першых лаўках, Шыковіч убачыў хітрыя ўхмылкі. На што яны рэагуюць так - на яго словы ці на старшынёў кашаль?
Слухалі ўважліва, а апладзіравалі стрымана. Шыковіча гэта не збянтэжыла, ён з вопыту ведаў, што ў вёсцы амаль заўсёды гэтак: сяляне не любяць лішняга шуму.
Грак адразу падхапіўся:
- Дазвольце, таварышы, ад вашага імя...
- Можа, пытанні ёсць? - перапыніў яго Шыковіч.
- Пытанні ў каго ёсць? - амаль злосна ўжо выгукнуў старшыня.
- Ёсць! - падняў руку высокі мужчына сярэдніх год.
- Што там у цябе, Казімір?
- Тут вы нам, таварыш лектар, добра ўсё расказалі. Дзякуй вам. Але я вось наконт перабудовы. Вы нас папракнулі, што закапаліся мы ў гразі ды балоце і свету не бачым. Жывём, як пры цару Гароху, і лепшага не жадаем. А гэта няпраўда! Кожны з нас з радасцю збудаваў бы новую хату. Але як? Парайце нам! Я не кажу ўжо, што на наш працадзень не разгонішся... Але матэрыялы - во дзе яшчэ загвоздка. Дзе іх узяць? Вось я, напрыклад, толькі ўлез у новы дом. Дык гэта ж можна цэлую кніжку вам напісаць, як я будаваўся. Паўгода хадзіў, пакуль лес выпісаў. Не адну пару ботаў стаптаў. У лапцях жа не пойдзеш цяпер, нямодна. Больш тое хаджэнне сажрала грошай, чым сам лес.
- Карацей, Казімір! - кінуў нецярпліва старшыня.
- Няхай скажа! - пачуліся галасы.
- Ды я каротка. Адным словам, надумаў я накрыць свой дом шыферам, каб як у людзей. Дык зноў хадзіў-хадзіў я за тым шыферам, месяцы тры хадзіў, ды так нічога і не выхадзіў. Надраў гонты. Дык вось вы скажыце, як будзе з лесам, цэглай, шыферам для сяла. Гэта ўсіх цікавіць.
Як будзе? Будзе з кожным годам лепш і лепш, мог адказаць Шыковіч. Гэта бясспрэчна. Аб гэтым напісана ў Праграме. Але калі ён хоча быць канкрэтным і пераканальным, то, напэўна, яму трэба ведаць больш: як будзе развівацца вытворчасць будаўнічых матэрыялаў у вобласці, у раёне? Нарэшце, што можна зрабіць у самім калгасе?
Шыковіч падумаў, як многа павінен ведаць дакладчык па Праграме, як дэталёва ён павінен рыхтавацца ў залежнасці ад слухачоў. І шчыра сказаў пра гэта. Яго зразумелі. Ён гэта ўбачыў па добрых даверлівых усмешках. А калі сказаў, што перабудова вёскі настолькі важная справа, што яна павінна набыць дзяржаўны размах, стаць першаступенным клопатам калгаса, саўгаса, сельсавета, раённых арганізацый, то стрыманыя сяляне нечакана для яго горача запляскалі ў далоні.
- Раскажыце, што вы пішаце цяпер! - выгукнуў з гушчы моладзі звонкі голас.
Была гадзіна ночы, а людзі, здавалася, і не думалі разыходзіцца, нібы чакалі, што ён скажа ім яшчэ нешта самае цікавае. Нечакана пераключыліся на літаратуру. І гэта ім таксама цікава.
- Што я пішу? Нядаўна я скончыў аповесць пра людзей сяла. Цяпер мяне захапіла барацьба падпольшчыкаў нашага горада ў часе фашысцкай акупацыі. Збіраю матэрыял для дакументальнай аповесці. Між іншым, калі сказаць праўду, то з гэтай мэтай я і прыехаў да вас. Адна з былых падпольшчыц жыве ў Загаллі.
Зала варухнулася. Зашапталіся, пытаючы адзін у аднаго:
- Хто?
- Хто?
Шыковіч схамянуўся. Адказваючы шчырасцю на шчырасць сваіх слухачоў, ён выдаў тое, чаго, магчыма, гаварыць не варта было, тым больш без згоды чалавека.
«Сказаць ці не сказаць?» - у разважлівасці Кірыла выйшаў з-за трыбуны, наблізіўся да краю сцэны. Не, не сказаць нельга. Ды і ўсё адно здагадаюцца, калі даведаюцца, да каго ён хадзіў адразу, як прыехаў.
- Сухадол, Клаўдзя Сідараўна.
Зала ў адзін голас ахнула ад здзіўлення і загудзела, як разварушаны вулей.

Такія сустрэчы не забываюцца! Яшчэ больш кранула Кірылу, калі пасля таго, як незадаволены Грак посна падзякаваў яму за даклад і людзі пачалі разыходзіцца, яго раптам акружыла моладзь, і чалавек, можа, дваццаць працягнулі кнігі - яго, Шыковіча, кнігі - з просьбай напісаць на памяць.
- Гэта ў вашым сельмагу пылілася столькі маіх кніг? - пажартаваў аўтар.
- Не. У нас не было. Трышка ў раён з'ездзіў і там знайшоў, на базе.
- У раён? Сёння?
Калгасны касір і бібліятэкар, хлапчына хваравіты (у маленстве перанёс параліч), як пасля даведаўся Шыковіч, кінуўся ў чарговую машыну, якая везла збожжа, трохся трыццаць кіламетраў туды, трыццаць назад, каб знайсці на базе райсаюза і прывезці ў вёску два дзесяткі кніжак.
Шыковічу нават ніякавата зрабілася. А ці варта яго кніга, каб за ёй так ездзілі? А раптам прачытаюць гэтыя юнакі і дзяўчаты і будуць шкадаваць патрачаных грошай, якія нялёгка зарабляюцца, часу?
Начаваць яго запрасіў стары. Ішлі па начной вуліцы, маўчалі. Кірыла падумаў, што стары, мабыць, выконвае павіннасць, даручаную яму старшынёй, і не вельмі задаволены начлежнікам. Але прыйшлося яшчэ раз здзівіцца, калі хату ім прыветліва адчыніла тая самая бухгалтарка, што так непрыязна глянула, калі ён сказаў, што хоча пісаць пра Сухадол.
На стале стаяла позняя вячэра і пляшка вішнёвай настойкі. Перад дакладам ён так і не паспеў павячэраць - прасядзеў у Клаўдзі Сідараўны.
- Хведара няма? - спытала жанчына.
- Пакрыўдзіўся твой Хведар. Далі яму перцу. Ажно чмыхнуў, - весела і задаволена засмяяўся стары.
Шыковіч зразумеў, што размова ідзе пра старшыню.
Гаспадар хаты - нізкі ростам, хударлявы, з паголенай барадой, але пышнымі рудаватымі вусамі. Вусы гэтыя, аднак, не старылі, а, наадварот, маладзілі яго. Цяжка было сказаць, колькі яму год.
- Сядайце, Кірыла Васільевіч, - ласкава запрасіла гаспадыня.
- Прабачце, але мы нават не пазнаёміліся там як мае быць, - збянтэжыўся Шыковіч.
- Кацярына маё імя. А гэта мой бацька, Халімон Дзям'янавіч.
Стары, не трацячы часу, разліваў настойку ў чаркі. А Кацярына палівала госцю на рукі. Але за перагародкай заплакала дзіця, і яна ўміг забылася на ўсе свае абавязкі гаспадыні.
- Сядайма, таварышок, яе не дачакаешся.
Халімон Дзям'янавіч быццам спяшаўся без дачкі выпіць. Перакуліў чарачку - і загаварыў сцішаным голасам:
- Ета мая малодшая, Кацярына. Два сыны, Павел і Дзям'ян, з вайны не вярнуліся. Дужа гаравала старая. Усё чакала Дзям'яна. Не верыла, значыцца... Тут адзін у нас гадкоў, можа, пяць як з'явіўся... Там, у іх, быў... Старая, царства ёй нябеснае, тры гадкі, як праставілася. Яшчэ сын ёсць, Іван. Дык той пасля арміі ў Данбас паехаў. Не хочуць, таварышок, у калгасе... Во бяда. Я тут сваруся з каторымі. Хто хлеб будзе вырошчваць, чортавы дзеці? Закусвайце. Памідорчыкі, гурочкі. Свае. О, на ента я масцер. Яшчэ ў пана Пячэгі гароднікам служыў...
- Колькі ж вам год? - зацікавіўся Шыковіч.
Стары задаволена засмяяўся і зноў наліў чаркі:
- Адгадайце.
- Ды так шэсцьдзесят. Можа, з маленькім хвосцікам.
Стары зморшчыўся так, быццам хацеў пырснуць вясёлым і гучным смехам, ды стрымліваў сябе.
- А хвосцік енты дванаццаць гадкоў.
- Семдзесят два? - шчыра здзівіўся госць.
- Ага ж. Пражыў, таварышок, дзякуй Богу, усяго на свеце пабачыў і пачуў. Першым калгаснікам быў. Во! - сказаў ён сур'ёзна, з гонарам. - А цяпер Хведар кажа... Учора ета мы з ім за чубкі счапіліся... Цябе, кажа, Халімон, трэба пасадзіць за такія словы, каб ета ў трыццаць сёмым ты сказаў. А што я сказаў? Не пабудуем, кажу яму, Хведар, мы з табой камунізму. А як ён сказаў, што пасадзіць мяне трэба, ды я яму і кажу: навучыся, кажу, ты лепш памідоры ды буракі садзіць, а не людзей. - Стары хіхікнуў, задаволены, мабыць, сваім адказам.
З бакоўкі выйшла Кацярына.
- Што гэта вы тут гародзіце, тата?
- А што, хіба ж не праўду кажу? - узлаваўся раптам бацька.

- Цішэй, Паўліка разбудзіце. - Жанчына прысела каля стала, спытала: - Што ж гэта вы не выпіваеце, Кірыла Васільевіч?
Шыковіч падняў чарку:
- За вас і вашага сына.
Яна ўзяла і наліла сабе колькі кропель настойкі.
- А я за Лёню вып'ю. За мужа. Каб усё добра было. Ён паехаў у інстытут здаваць. На завочнае. Гэта ён бухгалтарам у нашым калгасе. А я замяшчаю. - Яна як ведала, што Шыковічу з самага пачатку карцела спытаць, дзе бацька малога, ды ён не адважваўся, каб не апынуцца ў няёмкім становішчы: усялякія акалічнасці бываюць.
У гэты раз стары не дапіў свае чаркі, настойка перастала яго цікавіць. Больш цікава яму было скончыць думку. Пазіраючы не вельмі добразычліва на дачку, мабыць, баючыся, што яна перапыніць, ён працягваў свае разважанні:
- Вы, таварышок, вас я слухаў... Дужа ладна вы гаварылі. Красіва. На Хведара кіўнулі правільна. Але мала. Яму трэба хіба так кіўнуць! Няма ў яго етай самай, як вы сказалі, праспякцівы. Няма! Во бяда...
- Ды і няма перспектывы, - нечакана згадзілася Кацярына. Стары, яўна здзіўлены, змоўк. - Мне Лёня скардзіўся. Ды і сама я, як улезла ў гэтую бухгалтэрыю, пасядзела там у праўленні... Вы ведаеце, Кірыла Васільевіч, застылі мы на месцы. Паглядзіце, што робіцца. Мы не пагарэлі ў вайну. А таму ў першыя пасляваенныя гады наш калгас быў ледзь не самым багатым у раёне. Па кілаграму хлеба на працадзень. Усе нарыхтоўкі выконвалі. Грак лепшым старшынёй лічыўся. І цяпер шчэ нос задзірае. А летась таксама далі адзін кілаграм. Ды і ў гэтым больш не дамо. Якая ж будзе ў людзей перспектыва?
- Во-во! - падхапіў стары. - Я і кажу яму: па такім працадні мы далёка не заедзем. А ён мне кажа: за такія словы...
- Муж мой неяк гаварыў, што аджыла ўжо сябе гэтая форма ўліку. Бязлікі ён стаў, працадзень. Рысачка на паперы. Стаўлю я іх у табелі, і самой мне здаецца ўсё гэта несур'ёзным нейкім. Ненавуковым.
- Дык пераходзяць жа на грашовую аплату. Гарантыйную, - сказаў Шыковіч.
- А дзе іх узяць, грошай? Гэта хто блізка ад горада. А ў нас выгадаваць свінню ў паўтара раза даражэй абыходзіцца, чым мы маем за яе.
- Дык што, па-вашаму, трэба зрабіць?
- Не ведаю. Каб Лёня быў...
- Трэба, штоб хазяін з галавой! Во што трэба! - рашуча стаяў на сваім Халімон Дзям'янавіч. - Не задзіраў штоб нос, як той кажа... А на зямлю глядзеў.
- А чаму ж вы столькі год трымаеце такога старшыню?
Кацярына дзіўна глянула на госця і нічога не адказала, паклала яму з глінянай міскі свежых гуркоў са смятанай: еш, маўляў, наіўны чалавек.
А Халімон Дзям'янавіч адказаў па-свойму:
- Во, то я і кажу яму ўчора: ці не пара табе, Хведар, унукаў няньчыць? Як ён чмыхнуў, ты пабачыў бы! - Стары зноў смешна зморшчыўся, заплюшчыў вочы, пакруціў галавой, як бы выпаласкваючы смехам рот.
Лежачы пасля на сенавале, слухаючы, як унізе цяжка ўздыхае карова, Шыковіч доўга думаў і пра гэтую начную размову, і пра расказ Клаўдзі, і пра энтузіязм моладзі, і пра самаўпэўненасць старшыні. Як усё пераплялося - старое і новае, вялікае і малое, гераічнае і буднічнае, коснае і перадавое! Што ж галоўнае для яго - услаўляць ці выкрываць? Пісаць пра мінулае ці пра заўтрашні дзень? У галаве складаўся план артыкула пра Савіча. І тут жа побач - аб гэтым калгасе, аб яго перспектывах, аб людзях, з якімі сустрэўся за адзін толькі дзень. Дзякуючы за вячэру, ён сказаў Кацярыне:
- А пра Клаўдзю Сідараўну я зусім не збіраюся пісаць фельетон. Напроціў...
- Я ведаю, - усміхнулася яна.
Яна ўжо даведалася, а таму, магчыма, і запрасіла на начлег, частавала сярод ночы вячэрай. Але чаму тады ніхто пра Сухадол нічога не ведаў дагэтуль? Жыла жанчына трохі не дваццаць год - і нікому ні слова.
Пра ўсё хочацца напісаць.

Учора ён устаў разам з сонцам. Ехаў цягніком, аўтобусам, грузавіком. Працаваў. Аднак спаць не хацелася. Прачнуліся ластаўкі. Хутка ім збірацца ў вырай. Шыковіч прыслухаўся да іх шчабятання. Праз шчыліну ў страсе цадзіўся досвітак. Заскрыпеў першы журавель. Недзе далёка на балоце заржаў конь. Карова ў хляве цяжка паднялася і пацягнулася, ажно застагнала па-каровінаму. Вось-вось зазвоніць аб дно дайніцы струмень малака. Ён чамусьці чакаў гэтага моманту амаль з нецярплівасцю. Усё такое ж, як і тады, калі ён, юнаком, на світанні вяртаўся з гулянкі і цішком, каб не чуў бацька, залазіў на сенавал. Усе тыя ж гукі.
Ад гэтага было і радасна і чамусьці трохі сумна. Неяк ён сустрэў тую, да якой гадоў трыццаць назад бегаў на спатканне, - цяпер ужо даволі пажылую сялянку. Яму вось гэтак жа зрабілася радасна і сумна. Няўжо і ўчора ён сустрэўся са сваёй маладосцю? Калі зазвоніць малако аб дайніцу - не дачакаўся, заснуў пад спеў пеўняў.
**17**
Артыкул называўся: «Хто ж такі доктар Савіч?» Ён пачынаўся цытатай з кнігі Гукана ў яго, Шыковіча, літаратурным запісе і з некаторых іншых дакументаў, афіцыйных і неафіцыйных. Гэтыя выказванні аўтар падмацаваў вытрымкамі з заявы самога Савіча на імя фельдкамендanta. Можа, гэтага даволі, каб нашчадкі праклялі і забылі імя гэтага чалавека?
Але ёсць людзі, якія, нягледзячы ні на што, думаюць інакш пра Савіча.
«Кандыдат медыцынскіх навук хірург Яраш, добра вядомы ў нашым горадзе...» Шыковіч каротка пераказваў, як пасля дзёрзка-смелага забойства начальніка паліцыі малады падпольшчык Яраш апынуўся ў доме доктара.
«Могуць сказаць, што Савіч не выдаў падпольшчыка, баючыся за дачку. Не было б другіх фактаў - адзін гэты, безумоўна, не мог бы служыць доказам патрыятычнай дзейнасці доктара».
Шыковіч пераказаў дакументы, якія знайшоў у архіве, - запіскі Варавы.
Была ў артыкуле і запіска, якую паказаў Сербаноўскі... Але чэкіст чамусьці папрасіў пра яе пакуль што не ўспамінаць. Шыковіч не стаў спрачацца. З яго даволі было таго, што расказала Сухадол. Расказ яе займаў большую палову артыкула. Прыводзіў яго Шыковіч амаль цалкам, так, як запісаў на другі дзень свайго прабывання ў Загаллі. Там ён прачытаў гэты запіс Клаўдзі Сідараўне, выправіў па яе заўвагах.
Вось тая частка артыкула.
«...У той дзень, калі ўступілі немцы, у бальніцы заставаўся ён, Сцяпан Андрэевіч, ды я. Усе разбегліся. Нават хворыя паўцякалі, хто мог хадзіць. Але ў нас было чалавек дваццаць дызентэрыйных дзяцей. Доктар стараўся, каб эвакуіраваць іх. Ды каму хацелася браць у эшалон хворых з заразнай бальніцы?! Сцяпан Андрэевіч сказаў мне тады:
«Застанемся, Клаўдзя Сідараўна, на сваім пасту. Толькі баязліўцы пакідаюць пост у цяжкі момант», - і прызначыў мяне старшай сястрой. З таго дня ўся бальнічная гаспадарка была на мне.
Хутка самі немцы пачалі прывозіць нам хворых. Яны вельмі баяліся эпідэмій розных. Загады пісалі адзін за адным. Тады вярнуліся некаторыя з нашага персаналу. Лекараў, праўда, мала, больш сёстры ды санітаркі. Лекар адзін новы прыйшоў. Малады, худы, як жардзіна, у акулярах. Макейчык яго прозвішча было. Ды я адразу ўбачыла, што ў хваробах ён нічога не разумее і вельмі баіцца хворых, каб не заразіцца. Сказала я пра гэта Савічу, а ён мне ў адказ:
«Не звяртайце ўвагі. Назначэнні яго сам буду правяраць. Вам раю: асцерагайцеся гэтага чалавека. Нічога не выказвайце пры ім».
Тады я раскумекала, што да чаго і што гэта за гліста такая ў нас завялася.
А неяк увосень ужо выклікае мяне Савіч і кажа:
«Во, Сідараўна, штат ваш папаўняю. Бачыце, якія хлопцы!»
Хлопцы добрыя. Двое. Адразу бачу - не абкружэнцы. Абкружэнцы былі ўжо ў нас. Скура ды косці. Каторых мы лячылі, каторых проста падкармлівалі. А гэтыя абодва ў целе. Толькі адзін, Лёша, бараду адпусціў. А ў другога, Вані, дык яна, мабыць, не расла яшчэ. Чаго гэта, думаю, такія хлопцы да нас у заразную пруцца? Дурні. Праўда, Лёша гэты як адкрыў рот, дык, можа, хвіліна прайшла, пакуль слова сказаў: заіка такі. Яго Сцяпан Андрэевіч прызначыў ездавым - дровы прывозіць, мёртвых адвозіць на могілкі. А Ваню - санітарам. Ён як дзяўчынка быў, маладзенькі, беленькі і ручкі белыя, да чорнай работы нязвыклыя. Шкада мне яго было. Дзіцятка горкае, што цябе прымусіла за заразнымі прыбіраць?
А дзён праз колькі кліча мяне Сцяпан Андрэевіч, зачыняе дзверы ў сваім кабінеце і кажа шэптам: «Сідараўна, ёсць да вас просьба. Дайце, кажа, ключ ад вашай кладоўкі Ваню».

Я не зразумела адразу, завялася:
«Навошта яму ключ? Не дам я нікому ключа».
Ён - галоўны лекар і мог загадаць мне, а ён просіць ласкава так:
«Зразумейце, Сідараўна. Гэта вельмі патрэбна».
Тады я і пытаюся ў яго:
«Скажыце мне, Сцяпан Андрэевіч, хто гэтыя хлопцы?»
«Я нічога ад вас не таю, Сідараўна, - адказаў ён. - Гэта разведчыкі савецкія. Ім трэба нешта перадаць па радыё нашым. Яны аблюбавалі вашу кладоўку».
Кладоўка для бялізны была на гарышчы трэцяга корпуса, дзе размяшчаліся ізалятары.
На другі дзень раніцой аддае мне ключы не Ваня, а Лёша і кажа ціхенька, але хуценька, ніколечкі не заікаючыся: «Дзякую, кажа, Клаўдзя Сідараўна. Утульная ў вас мясцінка там, зручная. Але мы вас будзем турбаваць не часта».
Пасля я ведала, што яны перавозілі і пераносілі рацыю сваю ў розныя мясціны. Каб не засеклі іх.
Сцяпан Андрэевіч у той час пайшоў служыць ва ўправу. Нашы, хто не ведаў яго добра, лаяліся: да немцаў падлізваецца. Некаторыя нават кінулі працу. Бо ён заставаўся галоўным лекарам. Але цяпер ён не сядзеў увесь час у бальніцы. Прыязджаў пасля абеду, рэдка зранку, на кансультацыю, на абход. Бальніцай загадвала яго намесніца Вакулава, Раіса Сяргееўна. Яна і да вайны ў нас працавала, у дзіцячым аддзяленні. Не старая яшчэ была, ды ў першыя дні вайны яе сына забіла бомбай, шаснаццаць гадоў хлопчыку было. Можа, ад гора такога яна ўся пасівела. Белая-белая была. І маўклівая. Рэдка слова ад яе пачуеш.
Раісу Сяргееўну гестапа схапіла ў тую ноч, калі забілі Савіча. Тады шмат каго з нашых арыштавалі. Аптэкарку Надзю (прозвішча не помню ўжо), Васю Адзінца, шафёра санітарнай машыны; Сцяпан Андрэевіч, калі пайшоў ва ўправу, машыну гэтую раздабыў для бальніцы. Грузавічок з будкай. Здымалі будку, вазілі дровы з лесу, бо са склада немцы не давалі. Добра ведаю, што і ў лес машына пустая не хадзіла: часам ехала па дровы пяць чалавек, а назад вярталася двое. Хто ўцякаў з лагера - прытулак у нашай бальніцы меў. Ачуняе, падкорміцца чалавек - і ў лес. Я такім вопратку знаходзіла, купляла, выменьвала. Мяне аднойчы сама Раіса Сяргееўна папрасіла купіць дзесяць ватовак, грошы дала. Але яна - не як Сцяпан Андрэевіч - не з адкрытай душой. Яна быццам і не давярала мне, асцерагалася. Мне гэта, прызнаюся, крыўдна было. Сцяпан Андрэевіч вунь каго мне даверыў - разведчыкаў! Ды і не толькі разведчыкаў! Аднойчы Вася прывёз у машыне «хворага» - лысага чалавека з вясёлымі вачамі. Прывёз тады, калі Савіч у бальніцы быў. З машыны яго ссаджвалі, пад ручкі вялі, як напраўдашняга хворага. А паклікаў мяне Сцяпан Андрэевіч да сябе, гляджу: «хворы» гэты ходзіць па кабінеце, гладзіць лысіну і весела смяецца, падміргвае. Доктар таксама ўсміхаецца:
«Трэба, кажа, Клаўдзя Сідараўна, гэтага хлопчыка памясціць у бокс у дзіцячае аддзяленне».
А той смяецца:
«Вы мяне коклюшам не заразіце, а то буду кашлем птушак у лесе палохаць».
«Дайце, - кажа мне Сцяпан Андрэевіч, - на сённяшні вечар якое-небудзь заданне вартаўніку. А на прахадную пастаўце Лёшу. Няхай падзяжурыць. Гэтак жа зрабіце з сястрой. Выдумайце якую-небудзь прычыну. А самі падзяжурце за яе».
Я ўсё зрабіла як трэба. У той вечар яны доўга раіліся ў працэдурнай. Лысы, Сцяпан Андрэевіч, Раіса Сяргееўна, Вася Адзінец і яшчэ тры ці чатыры незнаёмыя мужчыны, якіх прапусціў Лёша».
Я хачу перапыніць расказ Клаўдзі Сідараўны, каб паведаміць чытачам, што Пракоп Варава, камандзір, пасля камісар атрада імя Чапаева, запіскі якога я знайшоў у архіве, быў лысы і вясёлы чалавек, як расказваюць тыя, хто яго ведаў асабіста. Гэта дае мне падставы меркаваць, што на нараду з падпольшчыкамі прыходзіў не хто іншы, як Варава.
Памер газетнага артыкула не дае магчымасці прывесці расказ К. С. Сухадол цалкам дэталёва. Яна расказала, што недзе ў пачатку сорак другога года загінулі Лёша і Ваня. Прозвішча аднаго з іх было Калуноў, але каторага - жанчына, на жаль, не помніць, ды наўрад ці было гэта сапраўднае прозвішча. Іх схапілі на могілках, яны вялі перадачу з капліцы. Напэўна, гэта пра іх пісаў у сваёй запісцы Варава.
Клаўдзю Сідараўну ў той жа дзень папярэдзіў Савіч, каб у выпадку арышту і допытаў яна нічога не гаварыла. Папрасіліся хлопцы на работу - узялі іх, больш нічога не ведаем, што яны рабілі, чым займаліся. Яе не арыштавалі. Але праз два дні ў бальніцы быў вобыск. Гестапаўцы перавярнулі ўсё дагары дном. Нічога не знайшлі. Але ў часеператрусу лекар Макейчык, той

самы, якога лічылі за фашысцкага агента, замест спірту (да спірту ён часта прыкладваўся) выпіў шклянку кіслаты. Знарок ці выпадкова - невядома. Пасля гэтага, як расказвае Сухадол, ёй доўга не давалі ніякіх даручэнняў. Увогуле ёй здавалася, што і Савіч і Вакулава прыціхлі, нават палонных больш не перапраўлялі за горад. Толькі Вася колькі разоў браў у яе прасціны і марлю. Пасля яна зноў пачала выконваць розныя, як сціпла кажа гэтая жанчына, дробныя даручэнні: узяць да сябе дзяўчыну і выдаць за пляменніцу, да некага схадзіць, нешта схаваць, нешта перадаць і г.д.

Пасля забойства доктара яе не арыштавалі разам з другімі, але тры разы выклікалі ў СД і хітра распытвалі пра ўсіх, больш пра Вакулаву і Васю, менш пра Савіча.

Дзіўны лёс гэтай жанчыны пасля вайны. У наш час, пасля дваццатага з'езда, пра гэта нельга не сказаць. Пасля вызвалення горада яна зайшла ў адну ўстанову «да высокага начальніка» і шчыра расказала яму ўсё, што ведала пра падпольную дзейнасць Савіча і Вакулавай. Яе ўважліва выслухалі. А праз некалькі дзён яна была звольнена з бальніцы «за супрацоўніцтва з фашыстамі». Цяпер жыве ў далёкай вёсцы без пенсіі, нават без сядзібы. Жыве за тое, што збірае травы і лечыць хворых. За гэта мясцовыя медыкі абвясцілі яе знахаркай.

Прыглядзіцеся, таварышы, хто жыве з вамі побач, узнайце чалавека, яго справы, яго біяграфію. Колькі на зямлі нашай безыменных герояў, сціплых і простых! Мы і дзеці нашы павінны ведаць іх імёны!

Не ўсё яшчэ нам ясна і зразумела ў гісторыі доктара Савіча. Невядома, хто яго забіў. Невядома, навошта акупантам і нацыяналістам спатрэбілася камедыя з пахаваннем доктара. Але тыя факты, дакументы і расказы, якія маюцца, даюць мне права сцвярджаць: у інфекцыйнай бальніцы актыўна дзейнічала падпольная група, пра якую пакуль што нідзе не ўпамінаецца ў нашых афіцыйных дакументах. Кіраваў гэтай групай доктар Савіч, які меў сувязь з камандзірам партызанскага атрада імя Чапаева Пракопам Ігнатавічам Варавам.

Я спадзяюся, што на артыкул гэты адгукнуцца людзі, якія здолеюць дапоўніць факты і высвеціць тое, што няясна ў дзейнасці Савіча і другіх савецкіх патрыётаў, жывых і мёртвых, гераічныя справы якіх будуць натхняць многія пакаленні.

К.Шыковіч».

Артыкул спачатку выклікаў буру. Спачатку - у рэдакцыі. Першы ўзвіўся Рагойша.

- Гэта ж прыём жоўтай прэсы! - крычаў ён. - Шыковічу захацелася набыць танную папулярнасць. Паласкатаць нервы абывацеля. Як сябра рэдкалегіі, я катэгарычна супраць надрукавання.

Чуткім нюхам сваім Рагойша адразу адчуў, у кім шукаць надзейнага і аўтарытэтнага саюзніка. Гукан, напэўна, выкажацца супраць, а ён - першы аўтарытэт у горадзе па партызанскай гісторыі. Экземпляр артыкула тут жа апынуўся на стале ў старшыні гарвыканкома.

Сямён Парфёнавіч чытаў, зачыніўшы дзверы, каб ніхто не перашкодзіў.

Назву ён злосна падкрэсліў тоўстым карычневым алоўкам і паставіў напроціў на полі тоўсты клічнік, як бы сцвярджаючы гэтым, што для яго няма пытання ў тым, хто такі доктар Савіч.

На цытаце са сваёй кнігі ён зламаў аловак і шыбануў яго ў кошык. Другі не ўзяў. Чытаў так, раптам сцішаны, засяроджаны, уважлівы. На твары яго не адбіваліся больш ні гнеў, ні раздражненне. Толькі неяк дзіўна ўсё больш і больш аплывалі худыя шчокі і адвісала ніжняя губа, нібы імкнулася дацягнуцца да паперы.

Скончыўшы чытаць, ён згарнуў лісты, паклаў у рэдакцыйны канверт, пераламаў канверт, сунуў у глыбокую кішэню галіфэ і, шырока сігаючы, выйшаў з будынка гарсавета.

Гэтак жа шырока крочыў ён па кабінеце сакратара гаркома, пакуль Тарасаў канчаў размову з загадчыкам аддзела. Тарасаў употай назіраў за ім і здзіўляўся: даўно ўжо ён не бачыў спакойнага Гукана такім устрывожаным.

Не зачыніліся яшчэ дзверы за работнікам - і Сямён Парфёнавіч нецярпліва і непаважліва кінуў канверт на стол:

- Чытаў?

- Што гэта? - Тарасаў выцягнуў з канверта артыкул, глянуў, падумаў: «Ах, вось што цябе...» І чамусьці зманіў: - Не, не чытаў.

А на самай справе чытаў. Рэдактар яшчэ ўчора прыслаў артыкул у гарком.

- Пачытай. Хоць няма чаго чытаць. Дурная фантазія безадказнага пісакі. Знайшоў, ведаеш, нейкую бабу, знахарку, і на яе блытаным расказе хоча перагледзець гісторыю ўсяго падполля...

- Няўжо ўсяго? - як бы здзівіўся Тарасаў, праглядаючы бегла артыкул.

- Хоча абяліць таго, хто сам сябе счарніў. Адкрывацель знайшоўся! Але ж не ў гэтым сутнасць... Гісторыя ёсць гісторыя. Шыковіч яе не рабіў. Не Шыковічу яе і перарабляць. Тут небяспечная сама тэндэнцыя. Я табе папрок кіну, Сяргей Сяргеевіч. Патураеш ты яму. А ён з тых, хто лічыць, што калі партыя развянчала культ Сталіна, значыцца, трэба ўсё перавярнуць дагары нагамі...
- Тэндэнцыя, безумоўна, шкодная, - спакойна згадзіўся Тарасаў, праглядаючы апошнюю старонку артыкула, а потым узняў галаву, глянуў на Гукана і сказаў: - Але я не бачу лагічнай сувязі. Пры чым тут гэтая тэндэнцыя да таго, што Шыковіч хоча даказаць ды амаль даказвае, што ў бальніцы была падпольная група. Ты цвёрда ведаеш, што яе там не было?
Гукан шумна сеў з боку стала, ляпнуў сябе далоняй па грудзях.
- Ды не ў гэтым справа, Сяргей Сяргеевіч! Тут галоўнае - метад. Пры такім метадзе пошукаў любы фашысцкі паслугач можа цяпер аб'явіць сябе падпольным дзеячам...
- А хто тут аб'яўляе? - паклаў на артыкул рукі Тарасаў.
- Ды хаця б баба гэтая...
- Сухадол? - голас сакратара гаркома раптам стаў жорсткі. - Дзе ж яна служыла? У заразнай бальніцы?! - І рэзка падняўся. Але, мабыць, спалохаўшыся, што можа сарвацца, дастаў папяросу, запаліў і сказаў прымірэнча: - Не гарачыся, Сямён Парфёнавіч. А то як бы нам не вярнуцца да старой тэндэнцыі, якая таксама нямала шкоды нарабіла.
Гукан зразумеў, што Тарасаў знаёміўся з артыкулам раней. Не мог ён, так бегла прагледзеўшы, запомніць прозвішчы і абставіны.
«Ясна, Шыковіч узгадняў з ім. Цяпер, безумоўна, Тарасаў будзе падтрымліваць яго. З ім не дамовішся. Трэба ісці ў абком».
- Ты пачытай уважліва. Як ён будуе артыкул. Робіць надзьмутую позу аб'ектыўнага шукальніка. А па сутнасці, рэвізуе рашэнні гаркома аб падполлі.
- Сур'ёзна? - зноў як бы здзівіўся Тарасаў. - Ну, гэта мы паправім.
«Паправім? Няўжо ён збіраецца друкаваць?»
- Ты што, лічыш, што гэтую муру можна друкаваць?
Тарасаў зноў сеў, падсунуўшы крэсла бліжэй да Гукана, каб не было так афіцыйна, убок выпусціў дым і, пранікліва зазіраючы ў глыбокія чорныя вочы Гукана, спытаў па-сяброўску інтымна, каб выклікаць на шчырасць:
- А што цябе, Сямён Парфёнавіч, так усхвалявала? Жаданне Шыковіча рэабілітаваць Савіча? А калі ён сапраўды патрыёт?!
- Сяргей Сяргеевіч, ты далёкі ад нашых партызанскіх спраў. Ты быў на фронце. А я ў самай гушчы варыўся. Ты не ўяўляеш умоў, у якіх мы вялі барацьбу. Акупанты, правакатары, здраднікі. Нарэшце, такія зайцы, якія баяліся вушамі паварушыць. А цяпер хочуць выдаць сябе за герояў. Ну, у атрадах, там ясна, на віду ўсё: хто герой, хто баязлівец. А вось тут, у горадзе... Я семнаццаць год разбіраюся з гэтымі справамі...
«Нічога ты не разбіраешся. Напісаў за цябе Шыковіч кнігу, і ты цяпер выдаеш яе за непагрэшную ісціну», - падумаў Тарасаў з абурэннем. А сказаў з усмешкай:
- Памруць гісторыкі, Сямён Парфёнавіч, калі ты захопіш манаполію на ўсе даследаванні.
Гукан зразумеў іронію сакратара, і яна моцна апякла яго. Ён ажно адхіснуўся. Але зрабіў выгляд, што адваліўся на спінку крэсла, прыгладзіў рэдкія валасы, адпарыраваў амаль весела:
- Ну, з Шыковіча гісторык, як з мяне... паэт.
Тарасаў патушыў у попельніцы папяросу і адсунуўся разам з крэслам да стала. Быццам абодва работнікі захацелі разгледзець адзін аднаго з пэўнай адлегласці.
- А гэта дрэнна, што мы з табой не паэты. На нашых пасадах нам трэба быць паэтамі. Неабавязкова, канешне, рыфмаваць. Рыфмачоў без нас даволі. А вось мысліць паэтычна, шырока і вобразна... - Сакратару самому падабалася гэтая нечаканая думка, і ён падняўся да акна з намерам трохі пафіласофстваваць. Але Гукан зірнуў на гадзіннік і таксама падняўся:
- У мяне сустрэча з архітэктарамі. Не хочаш папрысутнічаць? Архітэктура блізкая да паэзіі.
- Не, дзякую. Ты ж казаў, вы самі не разабраліся яшчэ. Не буду перашкаджаць вам спакойна разбірацца.
- Дык што з гэтым? - зняважліва кіўнуў Гукан на стол, дзе ляжаў артыкул.
- Пачытаем. Падумаем. Памяркуем.
- Жывіцкаму пазвані, а то, чаго добрага, пад націскам напорыстага аўтара...
- Не бойся. Без нашай з табой згоды не дадуць.

Застаўшыся адзін, Тарасаў доўга, задумліва паліў каля адчыненага акна, разглядаючы вуліцу, машыны, прахожых. Потым дастаў з сейфа нейкі дакумент, пачаў чытаць яго не сядаючы. Зайшла работніца гаркома высветліць нейкае пытанне - ён схаваў дакумент у шуфляду стала. Пагутарыў з ёй, падпісаў паперы. Выйшла - павольна дачытаў гэтыя нейкія паўтары старонкі на машынцы, прагледзеў дакумент яшчэ раз, схаваў яго ў сейф і зноў паліў каля акна.
Сказаў сам сабе сярдзіта:
- Этыка!.. Даволі такой этыкі! Эх, Сяргей, Сяргей, страхуешся. Пасаромейся! Не бойся шышак.
Рашуча падышоў да століка з тэлефонамі, набраў нумар.
- Жывіцкі? Прывет. Што гэта ты марынуеш справаздачу аб злёце ўдарнікаў камуністычнай працы? Заўтра? Ох, аператыўнасць у вас! Шыковіч у рэдакцыі? Папрасі яго зайсці да мяне.
Спытаў адразу ж, як толькі прывіталіся:
- Што будзем рабіць, Кірыла Васільевіч?
- Трэба друкаваць, - пераканана адказаў Шыковіч. - Я ўпэўнены, адгукнуцца дзесяткі людзей, якія дагэтуль маўчалі. Не разумею, Сяргей Сяргеевіч, чаго мы баімся.
- Мы нічога не баімся. Але, можа, варта яшчэ пашукаць?
- Такая публікацыя - даволі распаўсюджаны і плённы метад пошукаў.
Тарасаў на хвіліну як бы задумаўся. Потым энергічна падышоў да сейфа, адчыніў яго, дастаў той дакумент, які паўгадзіны назад перачытваў.
- Хачу паказаць табе яшчэ адзін дакумент. Гэта з той папкі, з якой ты знаёміўся ў Вагіна. Але тады я параіў гэта выняць.
Кірыла амаль з хваляваннем узяў працягнутыя стандартныя лісты, сашчэпленыя, і адразу чамусьці глянуў на другую старонку, на подпіс. Дакумент быў копія, і подпіс, як і ўсё іншае, надрукаваны на машынцы: «С.Гукан, былы камісар партызанскай брыгады імя Чапаева, сакратар Чыгуначнага райкома партыі». Дата: 16/X 1945 г.
Гэта была заява ў органы дзяржаўнай бяспекі. Яна пачыналася словамі:
«Мне стала вядома, што ў горад з Германіі, дзе яна прабыла каля двух год, вярнулася дачка ворага народа і здрадніка, фашысцкага прыслужніка доктара Савіча С.А. - Савіч Соф'я Сцяпанаўна».
Прачытаў гэта Кірыла і адчуў, як кроў балюча ўдарыла ў скроні і ў цемя. Перасохла ў горле. Ён каўтнуў паветра.
Тарасаў як бы ўглыбіўся ў газету, але ўпотай сачыў за выразам твару Шыковіча.
У заяве характарызаваўся Савіч. Ён не толькі служыў у нямецкай управе, ён яшчэ, выходзіць, правакатар. Меў сувязь з некаторымі падпольшчыкамі. З адным з партызанскіх атрадаў, з якім - не гаварылася. Але ў выніку яго «падпольнай дзейнасці» адзін за адным правальваліся і гінулі нашы людзі, зрываліся адказныя аперацыі. Падпольная арганізацыя вынесла здрадніку і правакатару Савічу смяротны прысуд.
Далей Гукан пісаў, што дачка жыла з бацькам, вяла яго добрую гаспадарку і «мела цесныя адносіны» з гітлераўскімі афіцэрамі, якія ўвесь час кватаравалі ў «гасцінным доме Савіча».
- Подласць! - злосна кінуў Кірыла, скончыўшы чытаць.
- Не абурайся. - Тарасаў падсунуў яму пачак з папяросамі. - Быў час усеагульнай звышпільнасці.
- Але ж можна было даведацца, з якім «камфортам» яны вывезлі яе ў Германію і дзе трымалі там.
- Гэта, бадай, можна было, але, відаць, не хапала часу. Мнагавата было такіх спраў.
Шыковіч прыпаліў і прагна зацягнуўся дымам.
- Дзякую, Сяргей Сяргеевіч. Для мяне ў гэтым дакуменце больш важна другое. Чаму Гукан нічога не сказаў пра тое, што Савіч быў звязан з падпольшчыкамі? З кім канкрэтна? І з атрадам... З якім? Не сказаў ні тады, калі мы пісалі кнігу, ні цяпер, калі я хадзіў да яго з запіскамі Варавы. Чаму?
- Вось і паспрабуй высветліць чаму. У псіхалагічным плане, - ледзь прыкметна ўсміхнуўся сакратар гаркома.
- Можна сказаць яму пра гэта? - спытаў Кірыла, працягваючы заяву Гукана.
- Лепш не адразу. Такі лабавы ход наўрад ці дапаможа знайсці ісціну.
- Прыйдзецца чакаць, пакуль Яраш дазволіць пагаварыць з Савіч. Можа, яна што праясніць.
Яраш шырока замахнуўся. Застракатала катушка. Блешня, зіхатнуўшы на сонцы, плёснула на сярэдзіну ракі. Яраш даў блешні патануць, і плынь аднесла яе і леску яшчэ далей. Нарэшце ён пачаў круціць катушку павольна-павольна. Катушка ледзь чутна папіскvала.
Кірыла стаяў крокаў за пяць. Мачаў з абрыву блешню свайго спінінга ў мелкую ваду, з цікавасцю сачыў, як чырвона-срэбная пялёстачка то лажыцца на жоўты пясок, то выскаквае на паверхню.

«Зараз зачэпіць», - думаў ён пра сябра, пазіраючы, як той павольна круціць - блешня паўзе па дне. Чамусьці хацелася, каб Яраш зачапіўся і адарваў усю леску. Яму абрыдла гэтае бясконцае кіданне.
Сонца з-за ракі біла ў вочы. Лёгкі вецярок шастаў лазнякі. Хацелася сесці ў цяні пад стогам і пагутарыць.
Блешня Ярашава, не зачапіўшы нават ніводнай водарасці, зайграла на мелі.
«Чорт!» - вылаяўся пра сябе Шыковіч.
Яраш зноў гэтак жа прыгожа размахнуўся, далёка закінуў блешню і зноў моўчкі вёў з той жа задумлівай павольнасцю. Кірыла больш не вытрымаў:
- Чаму ты маўчыш?
- Я думаю, - адказаў, не павярнуўшыся нават, Антон Кузьміч. - Я, здаецца, пачынаю разумець сэнс таго, што ты робіш. Пасля твайго расказу...
- Дзякуй Богу. Нарэшце дайшло да тваіх заспіртованых мазгоў. Ты павінен заўтра ж дазволіць мне пагаварыць з Зосяй!
- Не! - пагнаў Яраш блешню шпарчэй. - Не! Ты - як азартны ігрок. Табе абы хутчэй выйграць. А ў мяне - жыццё чалавека. Я ніколі не іграю жыццём.
Кірыла размахнуўся і што ёсць сілы не кінуў, а пляснуў блешню ў ваду.
- Ты халодны, што той шчупак! - кіўнуў ён назад, дзе ў траве сутаргава раздзьмухваў жабры, задыхаючыся ад паветра, светлы рачны шчупак, злоўлены, як ні дзіўна, Шыковічам. Нечаканая ўдача сябра распаліла рыбацкі азарт Яраша, а таму ён і не пераставаў кідаць.
- Не хваліся ты сваім шчупаком. Дрэнь шчупачок. А галоўнае - усё адно дома не паверацъ, калі я не пацверджу.
- Пайшоў ты... Эскулап! Канавал!
- Мыло, ошэнь мыло, - бяскрыўдна бубніў Яраш, зноў закінуўшы блешню. - А ты ведаеш, што канавал вельмі тонкая прафесія?
- Антон, ты мяне сваім дурацкім спакоем давядзеш, што я нап'юся сёння.
- Выпі ракі.
- А-а, чорт! Дулю ж ты ў мяне з'ясі, а не юшку. - І, шыбануўшы ў траву спінінг, Кірыла з ваяўнічым намерам рушыў да шчупака.
Тады і Яраш кінуўся яму наперарэз, схапіў за рукі.
- Э-э! Што ты дурны - я ведаю. Але выкінуць такога шчупака!
Шыковіч хацеў падставіць яму ножку. Але Антон Кузьміч лёгка падняў мяккі пяціпудовік, панёс да абрыву.
- Астуджу я тваю гарачую галаву.
- Чакай. Вунь на тым беразе людзі. Знарок патану - цябе пасадзяць.
Яраш адпусціў сябра. Яны селі на мяккую атаву, звесіўшы ногі з абрыву. І так, ужо сур'ёзна размаўляючы, прасядзелі, пакуль з неба не палілося ў раку расплаўленае золата захаду.
**18**
Маша, у якой у бальніцы быў разлічаны кожны рух, ускочыла ў палату, як гарэзлівае дзяўчо, вясёлая, узбуджаная. Падбегла да ложка Зосі, прысела, асцярожна і мякка абняла яе.
- Віншую, Соф'я Сцяпанаўна. Цудоўная кардыяграма! Усе лысыя дзяды - кансіліум - горача віншуюць Антона Кузьміча. Бліскучая аперацыя! Рэдкая! Хутка мы будзем з вамі танцаваць. Вы любілі танцаваць?
Вялікія Зосіны вочы раптам напоўніліся слязамі.
- Што вы?! - спалохалася Маша. - Я сказала што-небудзь не так?
- Нічога. Не звяртайце ўвагі. - Зося выцерла слёзы рагом новенькай прасціны. - Гэта я так. Я любіла танцаваць. Але я была вучаніца. Мяне не пускалі на вечары. Толькі ў драмгурток.
Яна сумна ўсміхнулася.
«Божа мой! Гэта ж дваццаць год яна як бы і не жыла, - жахнулася Маша, і ёй зрабілася да болю шкада жанчыну. - І цяпер яшчэ ў яе такія сумныя вочы. Каб я ведала, чым можна ўзрадаваць цябе!»
- З заўтрашняга дня за вас возьмецца лекар лячэбнай фізкультуры.
Зося ў знак удзячнасці ледзь прыкметна кіўнула галавой.
Да аперацыі яна была больш гаваркая і цікаўная. А цяпер быццам баіцца са словамі страціць сілу, якая павольна вяртаецца да яе.

Сапраўды, Зося з дня ў дзень адчувала прыліў гэтай новай сілы, даўно забытай, і ёй было хораша і... страшна. Ніколі, ні ў гестапа, ні ў лагеры, ні перад аперацыяй, у яе не было такіх прыступаў страху, якія здараюцца часам цяпер. Часта сніцца, што ў яе зноў хворае сэрца, што яна зноў задыхаецца, і яна прачынаецца ў халодным поце і слухае сваё сэрца. Ну вось, зноў яно калоціцца ліхаманкава. Але праходзяць хвіліны - і сэрца пачынае біцца поўна, спакойна, у рукі і ногі вяртаецца здаровая моц.
Ёй хочацца расказаць пра свой страх Антону Кузьмічу ці Машы, але яна не адважваецца, прымхліва баіцца - не спалохаць бы словамі гэтую дзівосную сілу.
З удзячнасцю, улюбёна глядзіць Зося на Машу, любуецца яе залатымі вейкамі і такімі ж незвычайнымі валасамі, і вельмі хочацца ёй сказаць гэтай дзяўчыне сардэчныя словы, сказаць, што палюбіла яе не як бальнічную, а як родную сястру. Але чамусьці і гэтыя словы яна баіцца сказаць. А Маша таксама заваражана, з замілаваннем, як на дзіця, глядзіць на Зосю, думае, чым бы развесяліць яе, і пакутуе ад таго, што нічога не можа прыдумаць. Зрэдку яны ўсміхаюцца адна адной вачамі і позіркамі прызнаюцца ў любві.
- Соф'я Сцяпанаўна, хочаце, я пачытаю вам вершы Блока. Антон Кузьміч любіць Блока, і ў яго кабінеце ляжыць томік.
Яна згадзілася, ледзь прыкметна кіўнуўшы галавой і заплюшчыўшы вочы.
Узрадаваная Маша пабегла за кнігай. Яна не ўбачыла, як Зося ўздрыгнула ад гэтай нечаканай прапановы. Блока любіў яе бацька і чытаў ёй, малой. Маці не вельмі ўхваляла гэта, раіла Маякоўскага. Яны па-рознаму выхоўвалі яе, маці і бацька. Маці, напрыклад, каб навучыць яе плаваць, аднойчы выпіхнула з лодкі на сярэдзіне ракі і гэтым так напалохала бацьку, што ў таго ледзь не быў сардэчны прыступ. У дзевятым класе Зося таксама палюбіла Блока.
Пасля вайны яна рэдка думала пра маці. А ў той момант, калі Маша сказала пра Блока, яна чамусьці ўспомніла маці, і сэрца яе, яшчэ не загоенае, сціснулася і зашчымела забытым болем. Маці загінула ў Польшчы, у жонкі яе брата ёсць паведамленне, у якім горадзе яна пахавана.
Зося падумала:
«Калі я зусім ачуняю, то збяру грошай і з'езджу на яе магілу. Я папрашу кветак з нашага саду. Работніцы ясляў дадуць. - І раптам зноў страх: - Няўжо мяне не пусцяць на магілу маці?»
Прыгадала, што, вярнуўшыся з Германіі, яна не знайшла магілу бацькі, хоць помніла, дзе яго пахавалі, і ёй захацелася плакаць. Яна паспрабавала стрымацца і не здолела - заплакала па-дзіцячы, наўзрыд. Суседка, таксама пасляаперацыйная, слабым голасам спытала:
- Чаго вы? У вас жа ўсё так добра! - Сама яна здагадвалася, што ў яе выразалі ракавую пухліну, і з жахам думала, што гэта не збаўленне ад хваробы.
- Калі ласка, не звяртайце ўвагі. - Зося ўсхліпвала і выціралася прасцінай.
Вось і гэтага ніколі не было да аперацыі: хворае сэрца яе было чэрствым.
Маша, вярнуўшыся і ўбачыўшы сяброўку ў слязах, спалохалася. Але тая заспакоіла яе:
- Ды не, нічога, Маша, слаўная вы мая. Я проста ўспомніла. Мой бацька любіў Блока.
Пра бацьку яе Яраш забараніў гаварыць. І Маша, каб нічога не адказваць, наўздагад разгарнула томік і пачала чытаць:

В сыром ночном тумане
Все лес, да лес, да лес...
В глухом сыром бурьяне
Огонь блеснул - исчез...
Опять блеснул в тумане,
И показалось мне:
Изба, окно, герани
Алеют на окне...

Адзін верш, другі, і раптам убачыла, як азарыўся Зосін твар. Не было ў яе яшчэ такой усмешкі. Невясёлыя вершы, а смутак з вачэй яе знік. Дзіўна. Ды ім перашкодзіла суседка: заплакала яна.
Усё адно Маша выскачыла з бальніцы на вуліцу з надзвычай узнятым настроем. Свяціла неспякотнае ўжо жнівеньскае адвячоркавае сонца. Ішлі па вуліцы людзі, адны - павольна, другія - спешліва. Імчалі аўтобусы, «Волгі» і «Масквічы».

Маша любіла свой горад. Любіла гуляць у парку, які лічыцца найлепшым у рэспубліцы. Але адной усё-такі сумна. Каб сустрэць каго-небудзь вясёлага! Яна ўспомніла Славіка. Яна думала пра яго і раней. І пра Тараса. Пра абаіх. Употай чакала, што хтосьці з іх захоча сустрэцца з ёй.
Але хлопцы не праяўлялі ініцыятывы. Славік, безумоўна, несур'ёзны суб'ект, балбатун і нахабнік. Але Маша не магла забыцца, як ён з першага позірку захапіўся ёю. Ніхто яшчэ так адразу не захапляўся. Часцей за ўсё яна чула: «Глядзі, якое рыжоцце пайшло!» Гэта яе абражала. А вось Славік, той адразу: «Вы ж незямная». А яна зямная, звычайная дзяўчына з палескай вёскі, і ёй, як усякай дзяўчыне, было прыемна пачуць такі шчыры камплімент. Акрамя ўсяго, яна адчувала сябе вінаватай - за аплявуху. Не такая ўжо яна «кісейная паненка», каб так абражацца за яго дурную балбатню.
Так, ёй хацелася сустрэцца. Але дзявочы гонар не дазваляў ёй першай шукаць гэтай сустрэчы.
А тут ёй раптам захацелася зрабіць нешта незвычайнае, гарэзлівае.
Паабедаўшы ў кафэ, яна пайшла ў парк. Разменіла ў прадаўшчыцы газіроўкі пяцікапеечную манету, папрасіла «дзве па дзве». Шчыльна зачыніла дзверцы будкі аўтамата. Даведалася па 09 тэлефон Шыковіча.
- Ало! - пачулася ў трубцы. Яна пазнала голас Славіка і не адказвала.
- Ало! - крыкнуў ён. - Што? Правяраеш, ці ёсць хто дома? На жаль, браток, ёсць я, верны вартавы бацькавых мільёнаў. І май на ўвазе - узброены атамнай пушкай. Але калі ты пазычыш мне пяць рублёў, мяне тут не будзе. Залазь, рабуй. Хрэн з імі, з мільёнамі!
Маша ледзь вытрымала, каб не зарагатаць ад гэтай Славікавай тырады невядомаму абаненту. Праглынуўшы смех, яна піскнула:
- Уладзіслаў Кірылавіч!
- О-о! - Відаць, яго здзівіў жаночы голас і такі нечаканы зварот. - Хм... сапраўды, гэта, здаецца, я - Уладзіслаў Кірылавіч. Я слухаю вас.
- Адна ашоба чакае ваш каля ўвахода ў парк, - па-старэчы прашамкала Маша.
- Колькі ёй год, ашобе гэтай?
- Шэмдзешат.
- Самы мой любы ўзрост! - засмяяўся хлопец.
- Калі вы не будзеце праз пятнаццаць хвілін, многа страціце, - сказала Маша звычайным голасам і павесіла слухаўку.
Славік быў упэўнены, што знаёмыя дзяўчаты хочуць з яго пажартаваць. Але ён ніколі не баяўся апынуцца ў смешным становішчы. Ён сумаваў у пустой кватэры, без грошай і ўзрадаваўся выпадку хоць чым-небудзь забавіцца. Праз дзесяць хвілін Маша ўбачыла яго на пляцоўцы каля ўвахода ў парк. Яна стаяла па той бок агароджы за кніжным кіёскам і ўпотай назірала. Ён ішоў павольна, засунуўшы рукі ў кішэні блакітных штаноў. Трошкі насцярожана азіраўся. Прайшоў раз да варот і назад, заглядаючы спачатку ў твары дзяўчат, потым - пажылых жанчын, нарэшце і бабуль не стаў мінаць.
Машу гэта смяшыла. На яе з цікавасцю пазіралі: адна, а такі гарэзлівы выраз яе твару, такія чорцікі ў вачах.
Так яна памучыла яго хвілін пятнаццаць. І толькі калі ўбачыла, што цярпенне яго вычарпалася і ён энергічна рушыў у парк, яна пайшла насустрач - на выхад. Ішла спешліва, глядзела ўбок - на партрэты перадавікоў вытворчасці. Была ўпэўнена, што міма яе ён не пройдзе. Сапраўды, хутка пачула яго радасны вокліч:
- Маша!
Яна спынілася, зрабіла здзіўленыя вочы, нібы не пазнавала яго. Ён працягнуў руку. Яна не падала сваю. Але Славік не збянтэжыўся.
- Гэта ты званіла мне?
- Я званіла вам? І не думала! Многа ў вас самаўпэўненасці, таварыш Шыковіч.
- Нейкая бабуля назначыла мне спатканне.
- То і чакайце вашу бабулю.
- На д'ябла мне яна! Я рады, што сустрэў... вас. - Славік раптам страціў сваю смеласць і не адважваўся казаць «ты». Тут яна здалася яму яшчэ больш прыгожай, чым там, на дачы. Вельмі захацелася, каб Маша засталася з ім, пайшла ў парк. Няхай бы паглядзелі яго даўнія сябры і пазайздросцілі: якая дзяўчына з ім!

Але Маша глянула на ручны гадзіннік так, быццам давала зразумець, што яна спяшаецца. Ён нясмела ўзяў яе за руку, каб утрымаць.
- Вы крыўдуеце на мяне? Я прашу прабачэння. Я не крыўдую на вас за аплявуху. Я гатовы атрымліваць па аплявусе кожны дзень, абы быць з вамі. Хадзем пагуляем.
- Каб вы зноў сказалі якую-небудзь брыдоту?
- Клянуся. Я адкушу сабе язык, калі з яго сарвецца хоць адно непрыстойнае слова.
Маша ўсміхнулася. Усё-такі ён пацешны, гэты балбатліва-галантны хлопчык. З ім не засумуеш. Гэта той вясёлы чалавек, якога ёй хацелася сустрэць пад свой сённяшні настрой.
- Веславаць вы ўмееце? На лодцы пакатаеце? - неспадзявана для Славіка, весела і проста, як малая, спытала Маша.
Славік не ўзрадаваўся, што яна згадзілася. Ён пахаладзеў: у яго кішэні было ўсяго некалькі капеек. О, якія эпітэты паслаў ён у той міг бацьку, які не даваў яму цяпер ні капейкі. Ды і сяброў па брыгадзе ўспомніў:
«Самі, чэрці, па дзве сотні калупаюць, а мне далі ў аванс вучнёўскіх пятнаццаць рублёў. Вось табе роўнасць і брацтва!..»
Ён ляпнуў далоняй па нагруднай кішэні сваёй моднай, навыпуск, жоўта-блакітнай сарочкі.
- Чорт, я забыўся захапіць грошы. І дакумент.
Маша прыхавала ўсмешку, успомніўшы яго прызнанне па тэлефоне ўяўнаму рабаўніку.
- У мяне ёсць грошы, - паказала яна сумачку і пажартавала, нечакана перайшоўшы на «ты»: - Я буду эксплуатаваць цябе.
- О, з вамі я згодзен плыць хоць да Чорнага мора. Вы былі б маім сонцам і маяком.
- Пайшлі, - сказала яна. - А то на нас звяртаюць увагу.
Славік толькі цяпер убачыў, што яны стаяць пасярод праходу ад плошчы да варот парку, што навокал многа людзей, і схамянуўся, што ён гаворыць залішне гучна.
Чоўны былі ў разгоне. Прыйшлося чакаць. Маша аддала яму сумачку, скінула басаножкі і хадзіла па мелі. Зайшоўшы глыбей, яна ледзь прыўзняла сукенку, і Славік любаваўся яе прыгожымі каленямі з залатымі кропкамі радзімак. Ён стаяў на беразе паважны, сцішаны, з сумачкай у руках і з нейкім салодкім страхам адчуваў, што ў галаве яго як бы ўтварылася шчыліна і праз яе выцякаюць тыя скептычна-насмешлівыя словы, якія былі запасены там на ўсе выпадкі і якімі ён вельмі спрытна ўмеў адгароджвацца і ад сур'ёзнага і ад смешнага. Ён падумаў, што сябры, напэўна, кпілі б з яго, каб убачылі ў такім стане - вартаўніком дамскай сумачкі, нібы ён верны муж суровай жонкі. Але адчуваў, што, каб Маша сунула яму ў рукі і басаножкі, ён з прыемнасцю трымаў бы іх, не баючыся ніякіх кпінаў. Чаго не зробіш для такой дзяўчыны!
Яна пырснула на яго вадой. Ён адскочыў.
- Здымай чаравікі!.. Закасвай свае модныя штаны і лезь у ваду. Так прыемна!
- Мы на лузе пакупаемся. Згода?
- Я без купальніка.
Любой другой дзяўчыне ён, напэўна, адказаў бы: «Тым лепш». Або пачаў бы «філасофстваваць»: «Гэта ўмоўнасць. Чалавецтву пара выкінуць сарамлівасць, як шкодны перажытак мінулага». А Машы ён не сказаў ні таго, ні другога. Не, не пабаяўся, помнячы аплявуху. Стрымала нейкае інакшае, зусім яшчэ не знаёмае яму пачуццё. Ён трохі ўжо пачаў злавацца на сябе за такую нязвыклую разгубленасць. З нецярпеннем чакаў чоўна і злаваў на ўсіх, хто праплываў міма.
«Якога д'ябла без патрэбы плаваць? Вунь тумба якая! Яшчэ за вёслы села. Каб ты перакулілася!»
Прыйшла маторка, і хвалі, пацалаваўшы Машыны ногі, пакаціліся на пясок. Дзяўчына стала тварам да сонца, грацыёзна падняла рукі, папраўляючы капу залатых валасоў.
- Паглядзі, які прыгожы адгэтуль чыгуначны мост. І лёгкі-лёгкі. Здаецца, можна ўзяць яго на рукі і панесці. Табе не хочацца падняць яго?
- Не, мне хочацца ўзяць на рукі цябе.
Яна пагразіла пальцам.
- Дамовіліся, што ты не будзеш крыўляцца. Я не люблю.
А ён зусім не крыўляўся. Яму сапраўды ў той міг нясцерпна хацелася падхапіць яе на рукі і панесці ў невядомую даль, ад людскіх вачэй, дзе б яны маглі застацца адны.
Нарэшце яны атрымалі лодку...
Славік, паказваючы сваю радасць і сілу, адразу ад мастка так шырока замахаў вёсламі, што ледзь не ўрэзаўся ў другую лодку.

- Асцярожна! - упікнула Маша, яна сядзела на карме. - І не туды. Туды, - паказала ўверх па цячэнню. - Я ж сказала, што буду эксплуатаваць.
- А я хацеў да Чорнага мора.
- Не, лепш ужо да Балтыйскага. Вёрст трыста правалачэш па сушы. Так рабілі нашы продкі. Яны былі сапраўднымі рыцарамі. Не тое што ў наш час.
Славік, не дужа натрэніраваны вясляр, хутка адчуў, як нялёгка веславаць супраць, здаецца, непрыкметнай, а ў сапраўднасці даволі моцнай плыні ракі. Павольна праплылі зарослыя кустамі чаромхі і каліны абрывы парку, няхітрыя збудаванні і дэбаркадэры прыстані з закапцелымі стомленымі параходзікамі каля прычалаў. На высокай кручы над прыстанню, за старымі таполямі, бялелі новыя дамы.
Маша не толькі любіла горад знутры, яна любіла глядзець на яго адгэтуль, з ракі, а яшчэ лепш здалёк, з насыпу акружной дарогі, і з таго вунь гаю, да якога ёй хочацца даплыць. Няхай папацее гэты шукальнік лёгкіх прыгод! Яна, задумліва чэрпаючы ў жменю ваду, глядзела на горад.
Модная Славікава сарочка змокла ад поту і пакамячылася. Пот залівае вочы, але, каб не выдаць сваёй слабасці, хлопец не кідаў вёслаў. Расла злосць на сябе: ніколі яшчэ ён так па-дурному не выстаўляў сябе перад дзяўчатамі. На нейкі момант з'явілася тое ж пачуццё, што і да Ніны: адпомсціць гэтай рыжай чарадзейцы за такое сваё ўніжэнне.
«Вытры пот, дурань!» - весела і лагодна думала Маша. Настрой яе яшчэ больш харашэў. Не марна згіне вечар. Будзе што ўспомніць. І расказаць. Каму? Ці не расказаць заўтра Соф'і Сцяпанаўне?
- Слава, заспявай што-небудзь.
Гэта быў амаль ужо здзек: як ён мог спяваць, так вяслуючы!
- Я пяю толькі п'яны, - прахрыпеў хлопец без усмешкі.
Яна зразумела, што даволі, бо цярпенне яго вычэрпваецца, і закамандавала:
- Права руля. Да тых кустоў. Адпачнём.
Славік азірнуўся і «высушыў» левае вясло. Лодка крута павярнула да берага, уткнулася носам у травяністую купіну. Ён, закінуўшы вёслы, выскачыў першы, выцягнуў нос лодкі на бераг. Яна, сыходзячы, падала яму руку. Ён рэзка пацягнуў яе да сябе, схапіў на рукі, лёгка падняў, цяжка дыхаючы; паспрабаваў цалаваць, нягледзячы на тое, што міма праплывалі другія лодкі.
Маша далонямі ўперлася яму ў твар, у вусны. Ён пацалаваў халодную ад частага мыцця спіртамі і эфірамі далоню. Дзяўчына спрытна, як рыбіна, выслізнула з яго абдымкаў. Адскочыла. З нядобрымі вачамі Славік ступіў да яе. Яна не адступала. Стаяла ў ваяўнічай позе, залажыўшы рукі за спіну.
- Ну!.. Паспрабуй! Атрымаеш такую аплявуху, што апынешся ў рацэ. Не лезь са сваімі пацалункамі... пакуль што...
Гэтае «пакуль што» неяк адразу астудзіла разгарачанага і ўзлаванага цяжкім веславаннем хлопца.
- Пакуль што? А калі можна будзе?
- Ніколі!
Ён весела засмяяўся.
- Ніколі? Тады дазволь цяпер пацалаваць хоць край сукенкі. Ці твой пальчык. Адзін. Любы з дваццаці.
Яна таксама не стрымала ўсмешку:
- Блазен! Калі-небудзь ты моцна пагарыш за свае дурныя жартачкі.
Яна з апаскай абышла яго, ускочыла ў лодку, села за вёслы:
- Адпіхні.
Лодка захісталася. Славік стаяў ззаду, трымаючы раўнавагу, дыхаў ёй у патыліцу, у залатыя косы. Як яму хацелася пацалаваць іх. Што за ліха! Ніколі яшчэ яму не хацелася так пацалаваць ніводную дзяўчыну, хоць цалаваўся ён з многімі. Яна як бы адгадала яго намер.
- Праходзь на карму. Але да мяне не дакранайся, а то будзеш за бартом. - Пасунулася на лавачцы, адхілілася ўбок. Але калі лодка, якую круціла плынь, хіснулася, схапіла яго за руку, падтрымала.
Яна скіравала не ўніз, а таксама ўверх і веславала лёгка, роўна, спорна. Славік, зразумеўшы, што яна знарок здзекавалася з яго, надзьмуўся, ужо зусім сур'ёзна думаючы, як бы ёй адпомсціць.
Але яна сказала проста, па-сяброўску:
- Ты, дурань, траха не сапсаваў мне настрой. А ў мяне сёння такі настрой!
- Ад чаго гэта?

- Не ведаю. Быў кансіліум у Савіч. Сэрца яе ўсе прафесары прызналі нармальным. Цудоўная аперацыя! Антона Кузьміча віншавалі.
- А хто гэты Савіч?
- Гэты! Соф'я Савіч! Няўжо ты нічога не ведаеш? - вельмі здзівілася Маша. - Табе Яраш не расказваў?
- Ты думаеш, я з Ярашам штодня п'ю чай?
- А бацька твой?
- Бацька заклапочаны, каб перавыхаваць мяне.
- О, я табе раскажу.
Яна павярнула лодку назад, уніз па плыні, і, амаль не вяслуючы, толькі накіроўваючы, каб не круціла, пачала расказваць, што ведала, пра Зосю, пра яе бацьку, пра Яраша, Тараса. Славік слухаў, як казку, без скептыцызму, удумліва, забыўшыся на сваю крыўду і ўсе іншыя пачуцці. Калі яна дайшла да аперацыі, ён недаверліва спытаў:
- Ты сама бачыла, як ён дабраўся да сэрца?
- Дзівак! Я аперацыйная сястра. Ты ведаеш, што робіць аперацыйная сястра?
Ён засаромеўся свайго пытання.
Дзіўна, яе расказ не проста зацікавіў хлопца. Ён неяк зусім з іншага боку адкрыў яму самую Машу. Пры першай сустрэчы і цяпер ён глядзеў на яе як на незвычайную, па-свойму цікавую і прыгожую, дасціпную і вясёлую дзяўчыну, з якой прыемна правесці час. Ён не ўнікаў у сутнасць яе прафесіі і ў самую сутнасць як чалавека, які трохі больш пажыў і, безумоўна, значна больш пабачыў. Цяпер ён адчуў гэта, і ў яго з'явілася павага да яе - такая, як да Яраша, да Тараса, да Галыгі, да ўсіх, хто меў цікавую і карысную, на яго думку, для людзей прафесію і цвёрдыя погляды на жыццё.
Машу здзівіла, крыху спалохала і нават расчаравала, калі пасля катання Славіка быццам падмянілі. Пакуль яна разлічвалася і забірала дакумент, ён стаў сур'ёзны да паважнасці, рахмана-сцішаны і ветлівы. Можа, таму позна ўвечары, каля яе кватэры, яна не вырвала сваёй рукі і не абурылася, калі ён раптам на развітанне сціснуў яе тонкія пальцы, нахіліўся і пацалаваў іх.
Ёй упершыню быў прыемны такі пацалунак.

**19**

А на другі дзень ёй пазваніў Тарас. У бальніцу. Яна толькі скончыла з хірургам Лапацінай аперацыю. Дзяжурная па аддзяленню сястра паклікала яе да тэлефона, амаль таямніча паведаміўшы:
- Трэці раз звоніць.
Маша падумала, што гэта Славік, і пайшла незадаволеная, сярдзітая, збіраючыся добранька прабраць яго.
Ды раптам зусім другі голас, усхваляваны да невыразнасці:
- Маша? Маша! Я прашу прабачыць. Можа, адарваў вас ад работы? Прабачце. Гэта Тарас... Маша... Помніце? Ну, Ганчароў.
Яна павіталася сур'ёзна, стрымана:
- Добры дзень, Тарас.
Ён ажно засмяяўся ад радасці, што яна помніць яго.
- Добры дзень, добры дзень... Маша! Вы прабачце. - І раптам выпаліў на адным дыханні: - Я запрашаю вас на канцэрт Дзяржаўнай капэлы ў клуб Леніна. Сёння ў восем.
Яна анямела ад нечаканасці. Успомніла, што паабяцала Славіку сустрэцца з ім. Яна ніколі не была такой ветранай, каб ад аднаго бегчы да другога. Праўда, да яе раней не надта заляцаліся. І раптам два такія хлопцы, розныя і цікавыя! Каго ж выбраць? Адмовіцца ад спаткання з Тарасам ды яшчэ на канцэрце, на які немагчыма дастаць білетаў? Не, не, не.
Пра Тараса яна думала больш, чым пра каго другога. Падвесці Славіка? Яму можна пазваніць. Не, не трэба і званіць. Няхай паблукае па парку. У яго залішне самаўпэўненасці, хоць учора пад канец ён і быў сур'ёзны. Няхай не думае. Ёй зрабілася смешна, калі яна ўміг уявіла, як Славік будзе шукаць яе. Два дні, учора і сёння, быццам нейкі вясёлы чорцік штурхаў яе на гарэзлівыя ўчынкі. Пакуль мільгалі гэтыя думкі, яна чула, як цяжка дыхаў у слухаўку Тарас.
«Хвалюецца... Няўжо хвалюецца?»
Адказала весела, гучна:

- Дзякую, Тарас. Я з прыемнасцю пайду з вамі. Дзе мы сустрэнемся?
Ён задыхнуўся ад шчасця:
- Дзе хочаце.
- На пераходным мосце. А палове восьмай. Добра?
Яна паклала слухаўку і вясёлымі вачамі пераможна агледзела сваіх калег - маладога лекара і дзвюх сясцёр.
- Хто гэты Тарас? - спытала адна, старэйшая, замужняя і незадаволеная сваім замужжам.
- Ярашаў сын.
- Антона Кузьміча? О-о!
- Нішто сабе!
- Цэліш правільна!
Маша засмяялася. Яна, напэўна, зарагатала б, каб ведала, што адбылося на заводзе.
Славік з'явіўся на працу такі шчаслівы, нібы за ноч ён засвоіў усе таямніцы зборкі і заняў месца брыгадзіра ці нават начальніка цэха. Да гудка частаваў хлопцаў «Казбекам».
- Ого! Ці не атрымаў ты спадчыну? - пажартаваў Косця.
Славік кінуў Тарасу між іншым:
- Табе прывет.
- Ад каго?
- Адгадай.
- Што мне гадаць!
- Ад Машы.
- Ад той?
- Ад той.
- Дзе ты яе бачыў?
- Сустрэў на вуліцы. Яна пыталася пра цябе.
Ён не схлусіў. Маша сапраўды пыталася ў яго пра Тараса.
Косця адразу ж, як толькі адышлі ўбок, накінуўся на свайго брыгадзіра:
- Ну што, не казаў я табе? А ты - вось. - Ён моцна і злосна стукнуў сябе кулаком у лоб. - Я ж бачыў, што яна не зводзіла з цябе вачэй. Дагэтуль не сустрэцца! Аблавух! А яшчэ ў арміі служыў. Памрэш ты халасцяком.
Тарас не крыўдзіўся і не адбіваўся. Ён думаў пра Машу. Яму вельмі хацелася сустрэцца. Але як гэта зрабіць?
- Ведаеш што? - не адставаў між тым Косця. - Я аддаю табе свой білет на сённяшні канцэрт. Запрасі яе.
- Як?
- У дваццатым стагоддзі існуе тэлефон, майстар. Калі ты баішся, я пазваню ад твайго імя.
Рэдка калі Тарас адрываўся ад работы. А то раптам знік да абеду на добрыя паўгадзіны.
У яго, як у намесніка сакратара, быў другі ключ ад пакоя камітэта камсамола. Падпільнаваўшы, калі сакратар пайшоў на чарговую нараду ў райком, ён нырнуў у пакой. Можа, дзесяць разоў падымаў тэлефонную слухаўку і клаў назад, часам набраўшы тры лічбы з чатырох. Па-першае, баяўся наскочыць на бацьку. Кніжка і даведачная станцыя паведамлялі той жа нумар, па якім ён званіў Ярашу. Урэшце адважыўся, вырашыўшы, што калі нават слухаўку возьме і бацька, то ён усё адно папросіць паклікаць Машу. Што тут такое? Бацька - гэта нават лепш, бо ён, на жаль, не ведае прозвішча дзяўчыны.
Адгукнуўся жаночы голас.
- Паклічце, калі ласка, аперацыйную сястру Машу.
- Літвін? Яна на аперацыі.
Так, так, гэта яна Літвін, ён бачыў гэтае прозвішча ў Ярашавых паперах - апісаннях аперацый.
Другі раз ён званіў смялей, чамусьці ўпэўнены, што яе не паклічуць. Трэці раз, пасля абеду, зусім смела. Але калі пачуў і пазнаў яе голас, то спалохаўся, пачаў заікацца.
З'явіўся ў цэх як удачлівы змоўшчык. Прашаптаў аднаму Косцю:
- Запрасіў.
- Згадзілася?
- Ага.
- А што, не казаў я табе? Заяц! Будзеш тыдзень паіць мяне півам.

Але самае смешнае, што Косцю не прыйшлося ахвяраваць у імя дружбы сваім білетам. Ад канцэрта адмовіўся Славік. У канцы змены ён з посным выразам твару сказаў:
- Нешта маці званіла, прасіла прыехаць на дачу. Хлопцы, хто прадасць мой білет?
- Дай мне, - падскочыў Косця. - Да мяне сястра прыехала. Сама ў калгасным хоры спявае.
У хлопцаў былі дарагія месцы, у другім радзе. Апрануты яны, як дыпламаты: у новых гарнітурах. Косця і Генрых нават у чорных, па апошняй модзе, у Генрыха і гальштук - бабачка; блішчалі манжэты накрухмаленых сарочак, зіхацелі дарагія запанкі. Ішлі па зале ўсе разам. Яна сярод іх - як вогненная кветка. Менш бачыла вачамі, больш адчувала аголенымі рукамі, шыяй, патыліцай, спіною, што яе працінаюць позіркамі, разглядаюць усе: мужчыны - з захапленнем, з цікавасцю, жанчыны - з рэўнасцю, асуджэннем, скептыцызмам, пагардай. Гіпноз соцень вачэй моцна і незвычайна хваляваў: радаваў і страшыў.
Добрая палавіна залы - музыкальная публіка, яны калі не былі знаёмы паміж сабой, то помнілі адзін аднаго па сустрэчах на канцэртах, у тэатры. Натуральна, што іх зацікавіла група добра апранутых маладых людзей, якія прабіраюцца да пярэдніх радоў.
- Хто? Адкуль? - пыталіся шэптам сусед у суседа.
- Ды гэта з кінагрупы, што фільм на рацэ здымаюць, - адказаў адзін з тых, што ведаюць усё на свеце.
- Актрыса?
- Як прозвішча?
Маша пачула гэта. І Косця, які ішоў побач, пачуў. Дакрануўся да яе рукі:
- Чулі?
Маша нервова засмяялася. Ёй зрабілася яшчэ больш весела ад таго, што яе прымаюць за кінаактрысу. Але чамусьці боязна, быццам перад адказным экзаменам. Яна так навучылася трымацца сярод людзей, самых розных! І ў тэатры - хіба ўпершыню! А вось жа хвалюецца. Чаму?
Перад канцэртам яна з хваляваннем, першы раз у жыцці, ішла ў лепшую цырульню горада, каб зрабіць прычоску. І нечакана для самой сябе выявіла такую патрабавальнасць, што малодшая майстрыца мусіла перадаць яе старшай, а тая пакрыўджана сказала:
- Ляціце, мілая, у Маскву рабіць сваю прычоску, калі вам не падабаецца ў нас.
Толькі сеўшы ў крэсла паміж Тарасам і жонкай Лапаціна, схаваўшы плечы і рукі, Маша супакоілася.
Адкрылася заслона. Ва ўсім белым, як лебедзі, стаялі праз усю сцэну паўсагнутай шарэнгай спявачкі. Над імі ўзвышаліся ў два ярусы спевакі, у нацыянальных кашулях, у чорных сурдутах.
З-за куліс выйшаў стары. Сівыя валасы, сівая, прыгожая, на клін, бародка, высакароднае інтэлігентнае аблічча і зусім маладая пастава каранастага цела, зацягнутага ў чорны фрак і белы камізэль. Ішоў ён лёгка, ступаў мякка. Пакланіўся зале. Яму горача запляскалі.
Маша падумала, што сам выгляд гэтага чалавека абяцае штосьці харошае, прыгожае.
Ён павярнуўся да хору. Падняў дзве рукі, і на нейкі міг усё замерла. Ён лёгка павёў правай рукой - і палілася песня.
Машы нават спачатку здалося, што спявае не хор, што спяваюць недзе там, за сцэнай, на вуліцы, у полі. Яна ўпершыню чула капэлу - спеў без музычнага суправаджэння. Калі песня нарасла, наблізілася і было бачна, што спяваюць усе харысты, Маша слухала завarожаная, але не бяздумная. Думкі ляцелі, як іскры: то па адной, то роем, згасалі адны, успыхвалі другія. То вясёлыя - яна ўспомніла Славіка. То сумныя - і яна не бачыла сцэны, хору, а праз затуманены зрок убачыла маці: вось яна, вярнуўшыся з калгаснага поля, гне спіну на сваім гародзе. Бясконца ў працы! На нейкі момант дзяўчыне стала сорамна, што яна заплаціла гэтулькі за сваю шыкоўную прычоску. Маці жахнулася б, каб даведалася, што яна столькі плаціць за такую непатрэбшчыну. Якая пані! «Рыжоцце такое!»
«Заўтра я пашлю вам грошы, слаўныя мае, - звярталася яна да маці і малодшых сястры і брата. - Не крыўдуйце на мяне. Я добрая. Я люблю вас».
Потым падумала, што яна разумее рухі гэтага дзівоснага чалавека на сцэне. Яны - як у Яраша. Такія дакладныя. Адзін няправільны рух, адна памылка, і смерць: там - чалавеку, тут - песні.
- Бачылі, які чарадзей? - нахіліўся да яе Тарас.
- А? Але, - яна ўдзячна паклала сваю руку на яго.

Яна тут жа, з новай песняй, забылася на гэта. А ён баяўся паварушыцца. Ён нічога не чуў і нічога не бачыў, толькі адчуваў яе халаднаватую руку.
На перапынак яна выйшла трохі як бы засмучаная - задумлівая, маўклівая. Хлопцы, яе спадарожнікі, круціліся вакол і рознымі спосабамі памагалі Тарасу развесяліць яе. Ажно Вера прыраўнавала свайго Лапаціна і адцягнула ўбок.
У буфеце яны частавалі яе шампанскім, лепшым марожаным і самымі дарагімі цукеркамі.
З нейкай прычыны яна спытала:
- Гэта ўся ваша брыгада, Тарас?
- Не. Яшчэ Славік.
- Які Славік? Той? - вельмі здзівілася яна. - Ён хіба ў вас?
- Мы ўзялі яго вучнем. Хочам зрабіць чалавекам, - адказаў Ходас.
- А дзе ён цяпер?
- Нешта маці пазваніла. Паехаў на дачу.
Маша незнарок праліла на стол шампанскае і зарагатала. Яны не ведалі, чаму яна смяецца, і таксама смяяліся. На іх звярталі ўвагу.
**20**
Гукан амаль спалохаўся, калі сакратарка паведаміла, што да яго хочуць зайсці Яраш і Шыковіч. Хутка падняўся з крэсла, перабіраючы паперы, як бы шукаючы самую патрэбную.
- Скажы, што я заняты.
Гэта была праўда: пільныя справы, нарады падганялі ў той дзень адна адну. Але ён тут жа сцяміў, што не прыняць Яраша, дэпутата гарсавета, старшыню камісіі, і Шыковіча, таксама дэпутата, было б больш чым неразумна. Можна адкласці размову, калі яна ў іх доўгая, але не пусціць у кабінет...
Ён спыніў дзяўчыну, здзівіўшы яе парушэннем сваёй звычайнай паважнасці, памяркоўнасці.
- Не, не... Няхай заходзяць. Калі ласка, - сказаў мітусліва, разгублена, а сам думаў:
«Абодва. Без званка. Не папярэдзіўшы. Што ім трэба?»
Намеснік яго, Кушнер, з якім яны працавалі над пісьмом у Дзяржплан, падняўся, каб пайсці. Гукан і яго спыніў:
- Не, не... Застанься.
Пайшоў да дзвярэй, шырока і прыветліва расставіўшы рукі, нібы хочучы абняць яшчэ нябачных гасцей.
- Ну, ну!.. Каго я бачу! - выгукнуў ён, калі ў дзвярах з'явілася мажная постаць Яраша. - Прашу, прашу. А то вы, Антон Кузьміч, старшыня камісіі, а ў гарсавет заглядваеце рэдка. Дый ты, Кірыла, даўно ўжо не быў, - паціскаючы руку Шыковічу, усміхнуўся Гукан. - Усё ездзіш? Шукаеш герояў?
- Шукаю, - адчуўшы хітра схаваную іронію ў Гуканавых словах, сур'ёзна і цвёрда адказаў Шыковіч.
- Прашу, прашу, - паказваў на мяккія крэслы каля рабочага стала Гукан.
Калі яны прывіталіся з Кушнерам і селі насупраць адзін аднаго, Гукан зірнуў на вялікі гадзіннік, што стаяў у куце, даючы зразумець, што на доўгія размовы ў яго часу няма. Спытаў напалову з жартам:
- Які клопат звёў разам медыцыну і літаратуру?
Яраш сказаў проста, без дыпламатыі:
- Сямён Парфёнавіч, трэба памагчы аднаму чалавеку.
- Трэба - паможам. Калі хадайнічаюць два дэпутаты...
- Жанчыне, - сказаў Шыковіч, зазіраючы старшыні ў вочы.
Гукан увесь час, з самага парога, адчуваў, што Шыковіч не зводзіць з яго вачэй, і гэтыя дапытлівыя позіркі - «Што ён хоча ўбачыць?» - нервавалі яго.
- Тым больш неабходна памагчы.
- Трэба невялічкая, на адзін пакой, але асобная кватэрка.
Гукан ціха свіснуў:
- Таварышы дарагія, дэпутаты мае, вы не ў курсе нашых кватэрных спраў.
- Жанчына ў бальніцы. Пасля цяжкай аперацыі.
- На сэрцы, - падказаў Шыковіч, разглядаючы на гэты раз Гуканавы рукі, у якіх ён круціў тоўсты зялёны аловак.

- Яшчэ адна аперацыя на сэрцы? - зацікаўлена спытаў Кушнер, падняўся з крэсла каля стала для пасяджэнняў, дзе было прымасціўся, каб не перашкаджаць размове, падышоў да Яраша. - Што ў яе - нікога няма родных?
- Няма.
- А дзе яна жыла да аперацыі?
- Наймала прыватны куток. На ўскраіне. А ёй цяпер неабходны меднагляд.
- Безумоўна, - згадзіўся Кушнер і паківаў галавой. - Выпадак цяжкі. Трэба нам падумаць, Сямён Парфёныч.
Гукан падсунуў да сябе вялікі настольны каляндар, нацэліўся ў яго алоўкам:
- Як яе прозвішча?
- Савіч, Соф'я Сцяпанаўна, - хутка адказаў Кірыла, ва ўпор гледзячы на старшыню.
Аловак уздрыгнуў. Расшырыўся вузкі твар каля вачэй і тут жа звузіўся - шчокі аплылі ўніз. Абяскровіліся глыбокія залысіны. Гукан залішне доўга не ўзнімаў вачэй. А потым схамянуўся, хутка глянуў, і нешта накшталт сумнай усмешкі скрывіла яго вусны:
- Гэта не таго Савіча?
- Таго, - жорстка адказаў Кірыла.
- Яна прапісана ў нас? - спытаў Гукан абыякавым голасам.
- Чатыры гады жыве. І працуе.
Шчокі аплылі яшчэ раз - нібы пад гладка паголенай скурай перакочваліся нейкія валікі.
«Чорт! - вылаяўся Сямён Парфёнавіч у думках. - Трэба міліцыі накруціць, каб такіх без майго дазволу не прапісвалі».
Ён падняўся, выпрастаўся на ўвесь рост, быццам узлез на п'едэстал, засунуў рукі глыбока ў кішэні штаноў. Сказаў афіцыйна і катэгарычна:
- Што ж... Паглядзім. Можа, возьмем на чаргу.
- Не будзь бюракратам! - амаль пагрозліва папярэдзіў Шыковіч.
Гукана ашаламілі не столькі словы, колькі тон, тое, што «пісака гэты» вось так да яго - на «ты».
- Дзён праз дзесяць Савіч можна выпісаць, - спакойна паведаміў Яраш і наском чаравіка наступіў сябру на нагу, каб той трымаўся спакайней.
- Праз дзесяць дзён, Антон Кузьміч, і размовы не можа быць. - Гукан звяртаўся цяпер толькі да хірурга. - Што вы! Ды яшчэ асобная... Такіх і кватэр няма для аднаго чалавека. Ёсць дзяржаўная норма.
- Тады яна зойме свой дом. Судовага рашэння аб канфіскацыі маёмасці няма. Дом належыць ёй, - сказаў Шыковіч, гледзячы ў гэты раз не на Гукана, а на Яраша.
- Яслі? - на міг аслупянеў старшыня, а потым шырока махнуў рукамі, як журавель на ўзлёце крыламі, і закрычаў, здавалася, узрадавана: - Цудоўна! Цудоўна! - Да Кушнера: - Ты чуў? Выкінем на вуліцу дзяцей! Сотню дзяцей! І аддамо дом, у якім, дарэчы, амаль нічога не засталося Савічавага, ён перабудаваны і надбудаваны намі з табой... аддамо гэты дом - каму? Дачцэ...
- Віна Савіча не даказана! - злосна перапыніў яго Кірыла.
Гукан шырокімі крокамі выйшаў з-за стала і стаў перад Шыковічам у непахіснай паставе, з цвёрдасцю і жорсткасцю ў твары.
- Не, таварыш Шыковіч, даказана! Вельмі добра даказана! Усімі органамі. А вы не думайце, што калі знайшлі нейкую знахарку і яна напляла вам казак, дык вы ўжо ўсё даказалі, зрабілі пераварот у гісторыі падполля. Вы наіўны чалавек, Шыковіч. Для мяне цяпер ясна, чаму напісаны ваш артыкул. Як толькі паявілася гэтая асоба...
- Пра асобу гэту ты памаўчы. - Кірыла хацеў сказаць: «Хто, як не ты, загнаў яе ў Сібір?», але Яраш зноў штурхануў яго нагой.
Антону Кузьмічу хацелася патушыць гэтую нечаканую ўспышку. Цяпер галоўная мэта - кватэра. Ён даў сабе слова любымі сродкамі вырваць для Зосі пакой, і сварыцца з Гуканам зусім не ўваходзіла ў яго планы.
- Не прэтэндуе яна на дом, - сказаў ён. - Наліха ёй той дом!
- А вось камуніст, работнік рэдакцыі прэтэндуе. - Гукан адступіў ад Шыковіча, павярнуўся да свайго намесніка. - Дзеля гэтага ён гатовы выкінуць дзяцей... Чаго хочаш... Абы даказаць сваё...
«Ох і дэмагог, сабачы сын. Выдаў бы я табе», - думаў Шыковіч, але пад выразнымі позіркамі і жэстамі сябра маўчаў.

- А чаму, сапраўды, мы не можам даць кватэру гэтай жанчыне? - нечакана для Гукана спытаў Кушнер. Ён не ўсё зразумеў са спрэчкі, але, чалавек сумленны, просты і шчыры, адчуў, што праўда на баку хірурга і пісьменніка, што жанчына гэтая мае ўсе правы на кватэру.
Гукан аж крутнуўся на адной назе - да намесніка:
- Ты можаш даць?
- Магу, - з добрай усмешкай адказаў Кушнер. - Роўна праз тыдзень рачнікі здаюць дом па Элеватарнай. Напішам ім гарантыйнае пісьмо, і яны пазычаць адну кватэру. Такі выпадак!
- Ну, ведаеш, я не магу адказваць за падобны шахер-махер. Ёсць партыйны і грамадскі кантроль.
- Які ж тут шахер-махер? Вынесем на выканком. Папросім таварыша Яраша далажыць. А я тым часам дамоўлюся з рачнікамі. Яны хлопцы добрыя, зразумеюць. - Спакойная разважлівасць Кушнера неяк адразу ўтаймавала ўсіх. Нават Гукана. Але, забыўшыся, Кушнер нахіліўся ў адчыненае акно і сарваў зялёны калючы плод каштана. І тады Сямён Парфёнавіч закрычаў вісклявым, як у істэрычнай бабы, голасам:
- Не рві каштанаў! Абшморгаў усё дрэва!

**21**

Яны стаялі перад шырока адчыненым акном пустога пакоя, у якім пахла фарбай і цэментам. Пакой быў на другім паверсе. Але і адгэтуль паміж садамі віднелася лукавіна ракі і зарэчныя, спачатку лугавыя, далей палявыя і лясныя прасторы.
- Цудоўна! Малайцы рачнікі! - ухваліў Шыковіч пасля добрых пяці хвілін маўклівага любавання і далёкімі прасторамі, і блізкімі садамі, і гонтавымі, шыфернымі дахамі дамоў, што густа, як ластаўчыны гнёзды, ляпіліся на пакатым беразе.
- Малайчына Кушнер! - адгукнуўся Яраш. - Ён вытрымаў галоўны бой.
- А ты маўчаў?
- Не маўчаў. Але калі пачалася бойка паміж старшынёй і намеснікам за галасы сяброў выканкома, то цяжка ўставіць слова...
- Не было мяне!
- Ты хутчэй сапсаваў бы справу. Я думаў, ты - флегматык, а ты - афрыканец.
Маша, якая стаяла крыху збоку ад іх, павярнула сваю залатую галаву, усміхнулася Шыковічу, як бы ўхваляючы, што ён вось такі, неспакойны.
- Не, ты растлумач, Антон... Здаецца, усё разумею, а паводзін яго зразумець не магу. Добра, дапускаю, што ён упэўнены, што Савіч вораг... Хоць зноў-такі, чаму такое нежаданне сур'ёзна, па-новаму разабрацца з фактамі? Чаму такая ўпартасць? Але мяне больш абурае другое: што ён мае да гэтай няшчаснай дзяўчыны? Ужо каму-каму, а яму-то ўбівалася ў галаву формула, што сын ці дачка не адказваюць за бацьку.
- Формула! Ты скажы, навошта яна патрэбна была, такая формула? Чаму, нарэшце, не адказвае? Тады па логіцы трэба ісці далей: і бацька не адказвае за сына. Ніхто ні за каго не адказвае. А вось я, наіўны чалавек, хачу адказваць за ўсіх. І хачу, каб усе адказвалі за мяне. І радуюся, што гэта цяпер запісана ў такім дакуменце!
Яраш выказаўся злосна - што стасавалася да мінулага, і любоўна-горача - аб сваім жаданні і пра той партыйны дакумент, пра які ў тыя дні гаварылі ўсе.
Маша паглядзела на яго з захапленнем, як глядзела неаднойчы ў час аперацый і пасля іх. Не ўсю сутнасць размовы, якую яны пачалі яшчэ ў машыне і прадаўжалі тут, у толькі што атрыманай Зосінай кватэры, яна адразу зразумела. Гісторыю Зосі і яе бацькі яна ведала, але не здагадвалася, што гісторыя гэтая не скончана, і не магла ўцяміць, чаму яны так абураны Гуканам. Асабліва Шыковіч. Не хацеў даваць кватэры? А каму ён вось так, адразу, даў кватэру? Што-што, а кватэрныя справы, пажыўшы ў горадзе, яна добра ведала, штодня чула размовы пра гэта, у размовах часта ўпаміналася імя Гукана: адны яго хвалілі, другія лаялі. Маша ўмела быць аб'ектыўнай. Думала, што каб яна прасіла кватэру і ёй не далі, то яна не рабіла б з гэтага такой трагедыі, як робяць другія. Таму і абурэнне Кірылы Васільевіча яна спачатку не зусім разумела. А пасля апошніх слоў, якія мужчыны сказалі, асабліва пасля слоў Антона Кузьміча, ёй усё праяснілася. Галоўнае - не кватэра, галоўнае - адносіны да чалавека ўвогуле і ўзаемаадносіны людзей, усіх людзей. Маладой душой сваёй, усім складам характару і жыцця дзяўчына была за тое, што сказаў Яраш.
Яна зноў падумала пра маці, брата, сясцёр, і ёй стала радасна, што на другі дзень пасля канцэрта яна паслала ім грошы, якія збірала на новае плацце, і напісала доўгае і добрае пісьмо.

Ехаць глядзець і абсталёўваць Зосіну кватэру Маша папрасілася сама. Кватэрка яе парадавала. Даволі прасторны пакой, маленькая, але ўтульная кухня, дзе ўсё пад рукой: двухканфорная газавая плітка, беленькая ракавіна, бліскучы кран, павярнулі - палілася вада.
Шыковіч, зайшоўшы, сказаў:
- Каб трохі вышэй. Усё-такі нізка. Час ужо адмаўляцца ад такіх габарытаў.
Яраш дастаў рукой столь і засмяяўся. Ого, дзіва што! З яго ростам! А Машы ўсё здалося нармальным і прыгожым. Яна ўзрадавалася, калі мужчыны пахвалілі від з акна.
Яна каторы раз прайшлася па пакоі. Абцасікі прыліпалі да свежай фарбы і, адліпаючы, патрэсквалі. Заставаліся ледзь прыкметныя сляды. Таму яна хадзіла не па сярэдзіне, а каля сцен, дзе стане мэбля.
- Падлогу трэба памыць халоднай вадой, - сказала дзяўчына і пашкадавала, што няма вядра і анучы.
Яраша не здзіўляў яе гаспадарчы практыцызм. Здзіўляўся Шыковіч. І любаваўся дзяўчынай. Ён таксама, як некалі на дачы Валянціна Андрэеўна, параўнаў яе са сваёй дачкой і падумаў аб адказнасці за выхаванне дзяцей. Да Іры ён, праўда, хоць быў трохі абыякавы, сына ж з рук не спускаў, а вынікі хоць і розныя, але аднолькава не надта радасныя.
Пасля яны паўдня ездзілі па горадзе - шукалі мэблю. Іх усіх аднолькава захапілі клопаты па абсталяванню кватэркі. У ашчаднай касе, калі бралі грошы, Кірыла прашаптаў сябру:
- Ты ведаеш - я скупы. Але для яе мне чамусьці нічога не шкада.
Машыну ён вёў з вясёлай зухаватасцю. Яраш жартаўліва папярэдзіў:
- Кірыла, я не застрахаваў свайго жыцця.
- Я недзе чытаў, што хірургі - найбольшыя баязліўцы. Страшэнна баяцца трапіць пад нож свайго калегі.
- Няпраўда! - сур'ёзна запярэчыла Маша.
Крамаў было некалькі. Яны аб'ехалі ўсе. І адусюль выходзілі расчараваныя.
Маша, пра густ якой Шыковіч спачатку, калі яна выказала захапленне маленькай, просценькай кватэркай, быў невысокай думкі, тут нечакана выявіла здзіўляючую патрабавальнасць. Яна ніколі яшчэ ў жыцці не купляла мэблі. Але тое, што яны ўбачылі ў крамах, яна ганіла адразу, з першага позірку. Сталы, шафы, крэслы былі вялікія, нязграбныя, непрыгожыя.
Яраш хмура маўчаў. Шыковіч сварыўся з дырэктарамі.
- Не мы выпускаем, таварыш.
- Дык не бярыце, што не ідзе. Патрабуйце!
- А план?
- Ды не жывіце адным днём. Адзін месяц не выканаеце, на другі перавыканаеце, калі атрымаеце, што трэба.
Яны паблажліва і скептычна ўсміхаліся: нічога, маўляў, ты не разумееш, дарагі пакупнік, у гандлёвых справах.
Нарэшце адзін малады прадавец употай, у цесным праходзе паміж шафамі-бегемотамі параіў Машы:
- З'ездзіце да Грабара. На складзе вы знойдзеце, што вам трэба.
- А хто гэта - Грабар?
- «Гармэблягандаль».
Маша, сядаючы ў машыну, расказала пра гэтую патаемную размову. Шыковіч адразу ж згадзіўся:
- Ідэя! Стану лепшы даставала з усіх нашых доставал!
- Ненавіджу пакупку па блату, цераз чорны ход.
- Антон - ідэаліст! - засмяяўся Шыковіч, крута паварочваючы свайго шматпакутнага «Масквіча».
- Будзе мэбля. Будзе і факт для фельетона.
У калідоры гандлёвай установы Кірыла са смехам штурхаў мажнага Яраша да абабітых жоўтым дэрмацінам дзвярэй з шыльдай «Дырэктар».
- Заходзь смела, паважна. Каб зрабіць уражанне.
Але ніякая смеласць і паважнасць уражання на «ўсемагутнага Грабара», маленькага лысаватага чалавечка, не зрабіла. Ён не адказаў нават на іх прывітанне і прадаўжаў размову з двума сваімі работнікамі: выраршалі важнейшае пытанне - у якую краму перамясціць нейкую Гаюнкову. Потым дырэктар, мабыць, спахапіўся, што пытанне гэта незвычайная тайна, і незадаволена звярнуўся да наведвальнікаў:

- Вам што, таварышы?
- Я - Шыковіч, - сказаў Кірыла і ўбачыў, што прозвішча яго ніякага ўражання не зрабіла. Нязлосна падумаў: «Газеты чортаў гандляр не чытае». Аднак рушыў далей: - А гэта - Яраш, наш праслаўлены хірург.
Антон Кузьміч сціснуў кулакі.
Але - о дзіва! - перад Ярашам маленькі Грабар пачціва падняўся, працягнуў руку:
- Ведаю, ведаю. Хто ў нас не ведае таварыша Яраша! Прыемна, вельмі прыемна.
«Клюнула», - падумаў Кірыла, падставіўшы крэсла сябру. Сеў побач сам і тут жа пайшоў у наступленне:
- Справа такая, таварыш Грабар... У Антона Кузьміча жаніўся сын. (Яраш уздрыгнуў ад нечаканасці.) Хлопец узначальвае брыгаду камуністычнай працы на станкабудаўнічым. Яму даюць кватэру. Бацька ў падарунак хоча абсталяваць яе. Але, ведаеце, трэба прыстойнае што-небудзь... Сучаснае. Стыль. Каб не сорамна было.
- Разумею. Усё зробім, - чамусьці ўзрадаваўся дырэктар.
Яраша неаднойчы здзіўлялі нечаканыя выдумкі Шыковіча. Але гэтая яго проста ашаламіла. Ён спачатку абурыўся, пасля натужліва стрымліваў смех, каб не здацца гэтым людзям дзіваком. У цесным калідоры ён даў сябру кухталя.
- А што ты яму будзеш тлумачыць? Шукаем стыльную мэблю для хворай? Казка!
Яны паклікалі Машу. І сам Грабар, вырашыўшы, відаць, за тры хвіліны, якія яны чакалі яго, куды перавесці Гаюнкову, павёў іх на склад. Праўда, перад гэтым ён здзівіў Машу. Раптам спытаў:
- Нявестка, таварыш Яраш? - і працягнуў руку, пачаў віншаваць.
У дзяўчыны бровы палезлі на лоб.
Але Шыковіч міргаў ёй так выразна, што яна зразумела: ён нешта выдумаў.
На складзе яна адразу звярнула ўвагу на гарнітур вытворчасці адной з латышскіх фабрык, просты, прыгожы, з наборам рэчаў для аднаго пакоя: канапа-ложак, нізкі стол, разборная кніжная паліца, нізкія зручныя крэслы.
- О, у вас густ! - усміхнуўся Грабар. - Я мог бы ўзяць вас тавараведам. - І пашкроб патыліцу. - Мы пакідалі гэта для выстаўкі-продажу. Але калі такі выпадак - бярыце.
У машыне, задаволеныя пакупкай, якую Грабар паабяцаў праз гадзіну прывезці, яны рагаталі з выдумкі Кірылы Васільевіча. Асабліва смяшыла, што «мэблевы начальнік» палічыў Шыковіча «заўхозам» Яраша. Потым Машу скаланула думка: магчыма, што гэты хітры Шыковіч ведае, што яна сустракаецца з Тарасам, а таму і выдумаў такую прычыну. Не, не падобна. Хутчэй ён мог бы даведацца, што яна сустракаецца з яго сынам: Славік балбатун. І ёй зноў стала весела ўжо ад іншай думкі: можа здарыцца, што некаму з іх сапраўды прыйдзецца купляць з ёй мэблю з такой прычыны - жаніцьба сына.

* * *

- Ну, Соф'я Сцяпанаўна, пара дадому.
Словы Яраша, іх тон, не, як звычайна, афіцыйна-лекарскі, хоць і ласкавы, а нейкі вельмі ўжо сяброўскі, спалохалі Зосю. Зноў той жа незразумелы прыступ страху, ад якога яна душэўна пакутавала. Сапраўды незразумелы. Дзіўны. Чаго ёй баяцца цяпер? Многа год яна пераконвала сябе: не скардзіся на лёс, жыві, як жывецца, заўтра можа здарыцца горшае, і нічога не баялася, ніякіх хвароб, ніякіх нягод. А прыйшло збаўленне ад цяжкай хваробы - яна адчувае, што сэрца яе не тое, з якім яна жыла многа год, і ўсе лекары робяць такое заключэнне (яе слухала, можа, сотня лекараў і практыкантаў)... Прайшло многа добрага... Яраш яшчэ колькі дзён назад сказаў, што атрымалі для яе кватэру амаль у цэнтры горада. І Маша паведаміла з радасцю: «Такая сімпатычная кватэрка. Сюрпрыз для вас». Вярнулася здароўе, знайшліся шчырыя, чулыя сябры, чаго ж баяцца? Аднак страх не праходзіў.
Збірала рэчы, пераапранулася - і ў яе калаціліся рукі, ногі.
- Слабенькая ты яшчэ. Чаго ён цябе выпісвае? - загаварыла бабуля-санітарка.
Зося сама з задавальненнем засталася б у бальніцы. Тут яна хоць з усімі і ўсім звыклася, нават са сваім страхам. А што там? Яна многа дзён ужо гуляла па садзе. А цяпер баялася глянуць на адчыненыя вокны, за якімі шумеў вялікі горад. Дзень быў не вельмі вясёлы - амаль па-асенняму хмурны, з дрэў злятала першае лісце. Можа, і ад гэтага яшчэ незнаёмы боль у сэрцы?

Магчыма, што адчуванні яе можна было б параўнаць з адчуваннем таго шахцёра, якога, не па яго волі, спусцілі ў глыбокую шахту, завалілі і пратрымалі там у цемры доўга-доўга. А потым другія людзі, добрыя, адкапалі і паволі падымаюць наверх. І вось гэты міг, калі ён павінен ступіць на паверхню зямлі, убачыць неба і сонца, - самы страшны. Не аслепнуць бы!
Правесці яе выйшлі многія лекары, сёстры, санітаркі, хворыя аддзялення, якія маглі хадзіць. Яны ведалі яе лёс, аперацыю. Некаторых, праўда, цікавіла іншае: хворую выпісвае і забірае сам Яраш. Ёй выказвалі найлепшыя пажаданні.
«Колькі добрых людзей», - падумала Зося і, расчуленая, заплакала: даўно ўжо яна так не развітвалася з людзьмі, з якімі зводзіў яе лёс.
Маша ўзяла яе за руку, сказала амаль жорстка да ўсіх:
- Даволі! - да Зосі: - Вам нельга хваляваецца, - і павяла да цэнтральнай алеі, дзе іх чакаў сіні «Масквіч».
Яраш стаяў каля машыны. Зося зноў спалохалася, убачыўшы яго тут, без халата, у добра адпрасаваным шэрым гарнітуры. Ён быў зусім не такі, як той асілак-чарадзей у белым халаце, якога ў бальніцы ўсе любілі і баяліся. Ён нават здаваўся не такі высокі і мажны і ўсміхаўся не так, як у палаце, - прасцей, цяплей. Яна раптам больш выразна, чым калі-небудзь раней, убачыла ў ім таго да дзёрзкасці смелага, вясёлага «Кузьму», якога хавала на гарышчы дзевятнаццаць год назад. Усміхаўся ён так, як тады, і амаль гэтак жа трохі збянтэжыўся. Яна таксама ўсміхнулася, і дзіўна - страх яе як рукой зняло. Яна выйшла з падзямелля, расплюшчыла вочы, убачыла неба, сонца і... не аслепла. Антон Кузьміч узяў з яе рук пакуначак, сказаў зноў-такі зусім не так, як у палаце:
- Віншую. Бальніца наша добрая, але лепш у яе не трапляць. Можаце паверыць, што я не буду сумаваць без работы.
- Будзеце, - не згадзілася Маша.
- Не, не буду. - Ён адчыніў ім заднія дзверцы. - Калі ласка.
Сам пайшоў садзіцца за руль.
- А Кірылы Васільевіча няма? - азірнулася Маша.
- У яго ўчора аднялі правы за перавышэнне хуткасці. Сёння недзе дае тлумачэнні інспекцыі.
Маша засмяялася:
- Гэта я накаркала. Помніце, я сказала: «Аднімуць у вас правы». А ён: «Ціпун вам на язык».
Чамусьці хораша зрабілася Зосі ад гэтай жартаўлівай іх размовы пра чалавека, якога яна ведала па расказах Машы, ведала, што ён хацеў пабачыцца з ёй, але Антон Кузьміч пусціў яго толькі на аперацыю, дзе той самлеў. Хораша ад іх вось такой дружбы.
Машына павярнулася і выехала за вароты. Зося азірнулася на бальніцу, але без жалю, без жадання застацца там і без страху перад тым, што чакае яе наперадзе. Яраш вёў асцярожна, павольна. Зося залюбавалася горадам, амаль незнаёмым, новым. Хоць жыла яна тут ужо чатыры гады, але ёй цяжка было хадзіць па горадзе, рэдка яна выязджала са сваёй далёкай ускраіны на аўтобусе ў цэнтр.
Са здароўем, з сілай да яе вярталася разуменне прыгожага, замілаванне хараством. Калі яе вывелі першы раз у сад, яна глянула на яблыні з рэдкімі пладамі і, як дзіця, засмяялася ад радасці. Там, у бальніцы, і гэтае пачуццё яе палохала. А тут, на цэнтральнай вуліцы, яна глядзела на маладыя ліпы, каштаны, і сэрца яе поўнілася здаровай, незнаёмай ці даўно забытай радасцю. Яна ўсміхалася, не падазраючы, што Яраш бачыць яе ўсмешку праз люстэрка.
Праўда, калі машына павярнула на вуліцу, на якой мала што змянілася з таго часу і якую яна ведала лепш, чым любую другую вуліцу, Зося замерла - куды ён вязе? Але прамінулі завулак, да болю блізкі, - і яна зноў супакоілася.
Шыковіч чакаў іх каля пад'езда. Машына яшчэ не спынілася, а Зося ўжо здагадалася, што гэта ён.
- Кірыла Васільевіч? - спытала яна ў Машы.
- Відаць, правы яму аддалі - лысіна блішчыць, што намаслены блінец, - пажартаваў Яраш. - На яго фізіяноміі - усе яго пачуцці.
Зося вылезла з машыны і першая працягнула Шыковічу руку.
Ён асцярожна сціснуў яе тонкія, сухія, гарачыя пальцы і доўга не выпускаў іх - разглядаў жанчыну з бесцырымоннай цікавасцю. Яго прыемна ўразіла, што твар яе зусім не спакутаваны, як яму ўяўлялася, крыху бледны, але бадай што прыгожы. Усё перажытае хіба што адбілася ў вачах, вялікіх, блакітных, залішне выразных, як ва ўсіх людзей пасля цяжкай хваробы, ды ў

дробных зморшчынках каля куточкаў вачэй і ў адзінай глыбокай маршчыне на высокім белым ілбе. Зося збянтэжылася ад такога яго разглядання, апусціла вочы, убачыла свае стаптаныя чаравікі, пакамечанае ў бальнічных капцёрках просценькае плацце і... засаромелася, магчыма, упершыню за многа год вось так. Да аперацыі гэта таксама здаралася рэдка. Была сарамлівасць, але заўсёды з іншай прычыны. Бадай ніколі ад таго, што нехта разглядаў яе беднае адзенне, як і ад таго, што лекары і камісіі аглядалі і мацалі яе хворае цела. І вось - амаль дзявочая засаромленасць, хоць разглядае немалады ўжо, лысаваты чалавек. Проста апрануты: стаптаныя басаножкі, пакамечаны парусінавы касцюм.
Яна ўзняла вочы, усміхнулася і спытала:
- Аддалі вам правы?
- О! - здзівіўся Шыковіч. - Вам ужо расказалі? Аддалі, але замянілі, чэрці, талон. Аднак віншую вас. Паверце, як я рады за вас! Гэтаму чарадзею трэба пры жыцці паставіць помнік. Праўда? - кіўнуў ён на Яраша, які зачыняў машыну на ключ.
Яна, Зося, і Маша адказалі яму аднолькавымі ўсмешкамі любві да чарадзея. А сам чарадзей сярдзіта нахмурыўся:
- Пайшлі. Ад Кірылы Васільевіча вы пачуеце яшчэ нямала казак.
- Чакай, - спыніў яго Шыковіч. - Соф'ю Сцяпанаўну правяду да кватэры я. Прашу, - ён жартаўліва падставіў ёй локаць.
І яна, на здзіўленне Машы, даволі грацыёзна абаперлася на яго руку і пайшла ўпэўнена, цвёрда, у нагу з ім. Па бальнічным садзе яна так упэўнена не хадзіла яшчэ. Маша зірнула на Антона Кузьміча. Той кіўнуў галавой задаволена і, здалося ёй, упершыню з гонарам, як бы кажучы: «Вось што мы здольны зрабіць з вамі».
На пляцоўцы другога паверха Кірыла спыніўся, дастаў з кішэні тонкі ключык ад французскага замка, амаль урачыста перадаў яго Зосі.
Усе ўбачылі, што рука яе задрыжала. Яна доўга глядзела на ключ.
- Адчыняйце.
Яна павярнулася і доўга не магла пацэліць у замочную шчыліну.
Потым, як бы ўзрадаваўшыся, што дзверы адчыніліся, хутка ўвайшла ў цемнаваты цесны калідорчык, павярнула налева і спынілася ў шырокіх дзвярах, асепленая бляскам мэблі, эстампаў на сценах, агнём букета, зіхаценнем бутэлькі шампанскага, пералівамі яблык, груш, вінаграду, торта і яшчэ многага іншага, чым быў устаўлены нізкі стол на тонкіх ножках.
Убачыла ўсё гэта Зося, і яе зноў апанаваў страх, можа, апошні. Яна азірнулася і як бы паклікала на дапамогу:
- Антон Кузьміч!
Яраш прайшоў міма яе і, ні на каго не гледзячы, сказаў збянтэжана, а таму трошкі сярдзіта:
- Ну, ну... без усяго... без здзіўлення. Пасля, пасля... Усё гэта ваша. Жывіце. А мы зараз вып'ем за ваша здароўе... За наваселле, Маша! - Ён, каб нечым заняць сябе, пачаў перастаўляць шклянкі, яны меладычна зазвінелі. Падняў бутэльку з шампанскім.
- Чакай! Сапсуеш усю ўрачыстасць! - Шыковіч любіў эфекты.
Яны, усе трое, замітусіліся каля стала, на нейкі міг, відаць, забыўшыся на гаспадыню, якая ўсё яшчэ, асепленая і аглушаная, стаяла ў парозе. А потым раптам ступіла ўперад, сапраўды як сляпая, выставіўшы перад сабой рукі. Падышла да Яраша, маленькая, просценькая, як дзяўчынка, у пакамечанай штапельнай сукенцы, палажыла рукі на шырокія грудзі яго, зазірнула знізу ў вочы і раптам прытулілася тварам да сэрца яго і... бязгучна зарыдала. Ён зусім збянтэжыўся. Не ведаў, што рабіць. Шырока расставіў рукі, трымаючы ў адной бутэльку. Ён як бы баяўся да яе дакрануцца, не мог адарваць ад сябе. У вялікай разгубленасці паўтараў:
- Не трэба... Не трэба... Што вы... Калі ласка... Зося... Соф'я Сцяпанаўна!..
Маша ўміг злётала на кухню і вярнулася са шклянкай вады. Але Шыковіч кіўнуў ёй: «Не трэба. Не чапайце», - і асцярожна забраў ад Яраша бутэльку з шампанскім.

**22**

Машы падабалася гэтая гульня - сустракацца па чарзе то з адным, то з другім. Яе калегі, напэўна, вельмі здзівіліся б, каб даведаліся, што яна, Маша Літвін, сур'ёзная, разважлівая, акуратная, сумленная і не такая юная ўжо - дваццаць тры гады, - здольная на гэткія жарты. Ды і не такая красуня, каб так млелі хлопцы. Сама яна таксама лічыла сябе непрыгожай, пакутавала ад гэтага, старалася ўпрыгожыць сябе моднымі плаццямі і прычоскамі, але ўпотай амаль рыхтавалася

пражыць «векавухай» (так у іх вёсцы называюць старых дзевак). Ды раптам гэтыя хлопцы, кожны па-свойму, адкрылі яе прыгажосць, адкрылі для сябе, а самае галоўнае - для яе самой. Яна асабліва адчула гэта на канцэрце і пасля належным чынам асэнсавала. Канцэрт, праўда, выклікаў цэлую гаму пачуццяў, самых супярэчлівых, але ўсё-такі найважнейшым для яе было адкрыццё: яна можа падабацца. Гэта акрыліла яе. Яна была ўдзячна і Славіку, і Тарасу. Яны былі розныя, вельмі непадобныя, але шмат у чым дапаўнялі адзін аднаго. Каб сплавіць іх характары, рысы і звычкі ў адно, то вельмі можа быць, што ў такога хлопца яна закахалася б адразу, такі набліжаўся б да яе ідэалу.
Тарас ёй здаўся спачатку сумным. Нават у кампаніі сваіх хлопцаў на канцэрце ён, брыгадзір, трымаўся неяк збоку, тон задавалі смяшлівы Косця і не вельмі гаманкі, але надзвычай дасціпны Генрых. Але пасля двух-трох спатканняў яна пераканалася, наколькі ён глыбейшы і разумнейшы за Славіка, як многа ведае - так многа, што ёй зрабілася боязна. Ён расказваў сур'ёзна, але цікава. Ён да ўсяго ставіўся з цяжкаватай сур'ёзнасцю, з большай, чым нават яго прыёмны бацька, які ўмеў павесяліцца і пажартаваць. А Славік, наадварот, падабаўся ёй за несур'ёзнасць, за лёгкасць, бесклапотнасць. І за іронію.
З усяго ён смяяўся. Разыдзецца - не дае літасці нікому: ні бацьку, ні сястры, ні сябрам, ні нават сабе. Праўда, да адных, як да Ходаса, іронія злосная, да другіх - бяскрыўдна-паблажлівая. Адну маці, прыкмеціла Маша, ён ніколі не чапаў. Можа, таму Маша і даравала яму гэтыя насмешкі з усіх, нават з Яраша.
З Тарасам было цікава, са Славікам - весела.
На трэцім ці чацвёртым спатканні Тарас нарэшце пацалаваў яе, і яна не запярэчыла, не адштурхнула, як Славіка; яна з цікавасцю чакала ўсе вечары - калі ж ён адважыцца?
Славік зрываў пацалункі, як крадзеныя яблыкі. Знянацку. Яна не дазваляла. Яна вырывалася, давала яму лёгкія аплявухі. Ён падстаўляў шчокі і казаў:
- Бі, бі... Але май на ўвазе, я лічу, за кожную аплявуху - сто пацалункаў. Ты не расплацішся.
Ён аднойчы напомніў, што прасіў яе аб адной ласцы - пацалаваць край яе плацця. Яна засмяялася:
- Пацалуй.
Ён тут жа на вуліцы (добра, што час быў позні) укленчыў на тратуары, абняў яе ногі і... пацалаваў калена. Такой дзёрзкасці Маша не чакала. Узлавалася, пайшла дадому. Клала слухаўку, калі ён назаўтра, напаслязаўтра, штодня званіў у бальніцу.
Славік засумаваў. Яму ўсё абрыдла: піжоністыя сябры, модныя дзяўчаткі, ліпсі, пласцінкі з мексіканскімі песнямі, «Паплавок». Яму хораша было толькі з Машай. Таму ён надумаў падпільнаваць яе. Зрабіў засаду на ціхай вуліцы, дзе яна жыла. Дачакаўся, калі, ужо добрым прыцемкам, яна выйшла з дому. Пайшоў назіркам. На суседняй такой жа ціхай вуліцы з прысадамі ліп Маша сустрэлася з хлопцам. Не, не проста сустрэлася. Яны пацалаваліся ў цяні старога каштана. Як малаткі застукалі Славіку ў скроні. Здрада! Чорная здрада! Ён сціснуў кулакі, гатовы кінуцца на саперніка. Але аслупянеў, калі па голасу пазнаў Тараса. Гэта не было абурэнне, не было, бадай, і здзіўленне. Пачуцця свайго ён нікому не мог бы пасля расказаць. Гэта - як удар моцнага электраразраду: ніякіх адчуванняў - і шок.
Схамянуўся Славік толькі тады, калі пачуў, што яны ідуць на яго. Стала чамусьці страшэнна боязна сустрэцца з імі, ён кінуўся ўцякаць. Павярнуў у нейкі завулак, выйшаў на другую вуліцу... А калі прыйшла злосць і прага помсты, ён вярнуўся назад, але не знайшоў іх. Згараючы ад рэўнасці і крыўды, падумаў, што яна павяла яго да сябе. Кінуўся да яе дома, загрукаў кулакамі ў зачыненыя аканіцы. Выйшаў гаспадар з добрым кіем у руцэ.
- Паклічце Машу.
Гаспадар глядзеў на яго як на п'янага. Цярпліва і лагодна растлумачыў, што яе няма дома - пайшла ў кіно. Славік не паверыў, хацеў праскочыць у фортку. Гаспадар паказаў кій.
Цэлую ноч ён блукаў па вуліцах. Пад раніцу заснуў на лаўцы прывакзальнага сквера. Адтуль з'явіўся на завод у сваім вячэрнім модным гарнітуры. Рабочыя ў прахадной скептычна азіралі яго.
Тарас сустрэў у цэхавай раздзявалцы, здзівіўся:
- Ты дзе гэта быў, што не паспеў пераадзецца?
- Дзе? - Славік утаропіўся на яго сваімі чырвонымі ад бяссоння вачамі.
Тарас усміхаўся.

«Усміхаешся? Радуешся? Чакай жа! Я табе пакажу радасць! Святымі прыкідваліся, гады! Дэмагогію разводзілі аб новай маралі!»
Яго апанавала халодная разважлівасць у пошуках помсты. Хацелася прыдумаць нешта такое, каб разваліць іх брыгаду, скампраметаваць Тараса і наогул нарабіць груку на ўвесь горад. Але разам з тым яму было ўсё-такі шкада пакідаць завод. Гэта яго стрымлівала ад нечага такога, што магло сапраўды нарабіць вялікага шуму. Проста нахуліганіць - пасадзяць. Садзіцца яму больш зусім не хацелася. Праўда, ён зноў лез пад кран. Зноў пасварыўся з Нінай. Запусціў ключом у Косцю, які паспрабаваў быў пакпіць з яго настрою. Мацюкнуў Галыгу, калі той мацюкнуў яго. Гэта такі нарабіла шуму. Начальнік змены лаяў усіх. Але каб яго, ды яшчэ вучань!.. Пабялеў, затупаў нагамі:
- Шчанюк! Малюска! Выганю! Сёння ж разлічу.
Тарас і хлопцы абаранілі Славіка. Яны асцерагалі яго, як скулу. Пакуль ён сустракаўся з Машай, яго нельга было пазнаць: уважлівы, старанны, дасціпна-вясёлы. Хлопцы радаваліся: становіцца чалавекам. І раптам за адну ноч змяніўся, што яго нельга пазнаць, у другі бок, назад.
Хлопцы мусілі пагадзіцца з Косцевай думкай, што яны слаба ўплываюць на яго. Толькі на заводзе ды ў тыя вечары, калі ім удаецца ўтрымаць яго ў сваёй кампаніі. А што ён робіць, калі застаецца адзін? З кім сустракаецца? З кім сябруе?
Яны выпрацавалі цэлы план актыўнай разведкі, размеркавалі ролі і абавязкі. Была якраз субота, кароткі рабочы дзень.
- Што ты думаеш рабіць сёння? - спытаў у Славіка Косця.
Ён паблытаў ім карты.
- Паеду на дачу. Нашы едуць. Паблукаю па лесе. Можа, апошнія цёплыя дні. -І раптам да Тараса:
- Паедзем разам! - За дзень ён не мог прыдумаць ніякай помсты. А тут у яго нечакана бліснула думка.
Тарас успомніў, што Галіна Адамаўна неяк упікнула, што ён пачаў забывацца на сям'ю. Ды і Косця маргаў: згаджайся!

* * *

- Асцярожна ж, хлопчыкі, - ласкава сказала Валянціна Андрэеўна, калі яны выйшлі з дачы, абодва са стрэльбамі на плячах. Маці радавалася, што Славік пасябраваў з Тарасам, з рабочымі хлопцамі і, здаецца, бярэцца за розум. Цяпер яна згаджалася з мужам, што трэба было адразу ўладкаваць хлопца на завод.
Валянціна Андрэеўна доўга з замілаваннем глядзела ім услед.
Яны выйшлі на луг. Быў ціхі, але па-вераснёўску бадзёры ўжо адвячорак. На небе ляжалі пашматаныя воблакі, нізкія, высокія, перыстыя і дажджавыя. Быццам нейкая цэнтрабежная сіла разагнала іх у бакі, да небасхілу: у зеніце ясна, а з бакоў блакіт закрылі дагістарычныя кашлатыя звяры, знясіленыя ветразі, што павіслі пасля буры. Сонца засланіў вялізны аднагорбы вярблюд. Але праменні прабіліся паверх горба і пазалацілі воблака-крыло.
Ад лугавых узгоркаў, выпаленых сонцам да попельнага колеру, дыхала сумным настроем восені. Цешыла вока атава ў лашчынах, але і яе колер мала нагадваў колеры вясны: ніводнай краскі, адна цёмная, як зацвілая вада балота, зялёнасць. На адным з узгоркаў стаяла маладая асінка, амаль уся ўжо чырвоная. Яны прайшлі міма. Тарас пагладзіў асінку рукой і засмяяўся - золатам сваіх лісцяў яна нагадала яму Машу. Славік зірнуў на асінку і, напэўна, усё зразумеў.
«Смяешся, гад? Радуешся? Хутка ты ў мяне заплачаш». Ён выплюнуў недакурак цыгарэты і запаліў новую. Ён паліў усю дарогу. Гэтае яго глытанне цыгарэт, маўклівасць і асабліва тое, што ад яго патыхала каньяком, не падабаліся Тарасу, насцярожвалі яго.
«Ну і характар! Не ведаеш, што ён выкіне праз хвіліну. То ў яго славесны панос, то маўчыць як анямелы».
Яны наблізіліся да густога зарасніку высокай лазы. За гэтай лазой - невялікая старыца, на якой любяць начаваць качкі.
Раптам Славік спыніўся, павярнуўся да Тараса, які ішоў крыху ззаду. Абразліва плюнуў міма яго недакурак. Зняў з пляча стрэльбу, паставіў прыкладам на пясок сцежкі. Вочы яго гнеўна бліснулі і тут жа пацямнелі.
- Адзін з нас сёння павінен памерці! - сказаў ён злосна і сур'ёзна.

Тарас, хоць і адчуваў нешта нядобрае, усміхнуўся, як бы зацікаўлены гульнёй.
- Умова: разыходзімся і сыходзімся ў лазняку. Хто ўбачыць першы... выпадковы стрэл... Няшчасны выпадак... Больш двух год не дадуць... Не бойся!
Каб не блiскалі так вочы, не перасмыкаліся вусны і пальцы ліхаманкава не гралі па гранёных ствалах дубальтоўкі, то гэта можна было б палічыць за чарговы Славікаў жарт, няхай недарэчны, дзіцячы, але жарт. А так - Тарас узлаваўся.
- Для такой гульні ты папрасіў бы Віцю. І не стрэльбы трэба вам - кіі. А я перарос. Ды і табе час...
- Ты - гад! - закрычаў Славік, пырскаючы слінай. - Ты... Ты... Ты - падлюга! Я ненавіджу цябе!
- Завошта?
- Завошта?! Яна мая дзяўчына. Я першы пазнаёміўся!.. Я першы!..
- Ціў, - свіснуў Тарас. - Чакай, ты пра каго гэта?
- Хадзем, а то я цябе прыкончу на месцы! - шалеў Славік.
Тарас нарэшце ўсё зразумеў. Маша неяк прызналася, што яна сустракалася са Славікам. Не сказала толькі, што страчаецца па чарзе з імі. Ён не прыдаў гэтаму значэння. Мала хто з кім раней сустракаўся! Аж вунь яно як павярнулася! Аднак што гэта за метад вырашаць такія пытанні? Скажы, калі ласка, які сярэдневяковы рыцар!
- Дурань! Яна што, твая прыватная ўласнасць? Ты прысвоіў яе? Ідыёт! У яе свая галава на плячах. І не такая пустая, як твая. Яна сама можа выбраць, з кім ёй страчацца. Пайшоў ты! - Тарас моцна вылаяўся, павярнуўся і, папраівіўшы на плячы стрэльбу, шпарка закрочыў назад.
У душы Славік узрадаваўся, што Тарас адмовіўся ад «каўбойскай дуэлі». Ён, безумоўна, быў упэўнены, што Тарас адмовіцца, калі яму яшчэ там, на заводзе, ускочыла ў галаву гэтая вар'яцкая думка. Але калі ішлі па лузе, спалохаўся: а раптам згодзіцца? Страляе ён лепш і ростам вышэйшы.
Адмовіўся, спалохаўся, уцякае - гэта, бадай, ужо яго, Славікава, перамога. Няхай паспрабуе цяпер расказаць пра ўсё на камсамольскім сходзе ці дзе хоча - як з яго можна пасмяяцца! А па якіх матывах ён выганіць яго з брыгады?
Аднак гэтага мала, трэба замацаваць перамогу. Тым больш што злосць не астыла, кіпела.
- Стой! Буду страляць! - Славік ускінуў стрэльбу і выпаліў угору.
Тарас уздрыгнуў. Ён ішоў з незараджанай, а гэты тып, выходзіць, зарадзіў яшчэ дома.
«Ад такога вар'ята ўсяго можна чакаць». Ён спыніўся, павярнуўся:
- Страляй!
Славік з узнятай стрэльбай пасунуўся на яго:
- Хто цябе будзе страляць! Каб прасмярдзеў увесь луг. У цябе ж поўныя штаны ўжо. Дрыжыш? Збялеў?
Сапраўды, Тарас пабляднеў і дрыжаў. Ён быў з тых, каго ўвесці ў такі гнеў, калі чалавек губляе ўладу над самім сабой, амаль немагчыма. Але няхай сцеражэцца той, хто ставіць сабе такую мэту! А неразумнаму Славіку, відаць, здалося, што ён і напраўду ўтаптаў свайго саперніка ў гразь - спалохаў, зняважыў, збэсціў. Што яму яшчэ дадаць? І ён з усяго размаху даў Тарасу кулаком у сківу. Той трохі пахіснуўся, адступіў на крок убок, шырэй расставіў ногі. Крыва ўсміхнуўся:
- Хіба так б'юць?
Здаецца, амаль не замахваўся, а Славік адляцеў крокаў за пяць, пляснуўся патыліцай на калючую сухую траву. Стрэльба вываліліся з рук.
Падхапіўся і пеўнем кінуўся на Тараса. Той даў яму ўдарыць сябе. А потым зноў як бы і не моцным ударам спрактыкаванага баксёра адкінуў яго яшчэ далей. Славік завыў ад шаленства і не падхапіўся, а папоўз да стрэльбы. Тарас кінуўся наперарэз. Падняў Славіка, убачыў, як заплывае ў яго падбітае вока. Спытаў:
- Хопіць ці яшчэ?
Славік да крыві пракусіў яму руку. Тарас за гэта аддзячыў яго дзвюма лёгкімі аплявухамі, без удару ўжо адкінуў у лазняк. Схапіў яго стрэльбу і адбег, схаваўся ў кустах. Славік не кінуўся шукаць яго. Сядзеў у лазе, закрыўшы далоняй падбітае вока, і ціха скуголіў - ад злосці, крыўды і болю...
Валянціна Андрэеўна жахнулася, убачыўшы Тараса з дзвюма стрэльбамі.
- А Славік? - кінулася яна насустрач.
- Ляжыць там.
- Як ляжыць?

- Я набіў яму морду. Не ўмее абыходзіцца са стрэльбай. Ледзь не падстрэліў мяне.
Маці глыбока ўдыхнула халоднае вячэрняе паветра і тады толькі пачула, што сэрца няроўнымі штуршкамі пагнала гарачую кроў у пахаладзелыя ногі.
- Што ў вас здарылася там? Тарас!
- Нічога. Ён раскажа, - адмахнуўся Тарас, перадаўшы Валянціне Андрэеўне стрэльбу.
Але размову пачула Наташа. Ускочыла ў пакой, паведаміла бацьку і маці з захапленнем:
- Тарас набіў Славіку морду.
- Што ты вярзеш? - абурылася Галіна Адамаўна.
Малая сустрэла брата на парозе, павісла на шыі:
- Тарасок, раскажы, як ты вучыў яго страляць.
- Каго?
- Каго! Славіка!
Тарас анямеў: ці не сачыла за імі Наташа? Гэтая праныра прасілася на паляванне. Вось яшчэ не хапала такой сведкі!
- Божа мой! - пляснула далонямі Галіна Адамаўна. - Ды ў цябе распухла шчака. Што здарылася?
Падняўся з качалкі Антон Кузьміч, падышоў, павярнуў сына да акна, лёгка свіснуў - здзівіўся.
- Нічога, сілу мае. Баліць? У панядзелак зробім здымак, каб трэшчыны не было.
Бацька нічога не распытваў, як заўсёды. Ён чакаў, спадзяваўся, што сын раскажа сам.
Тарасу зрабілася раптам страшэнна брыдка на душы і сорамна, быццам гэта ён зрабіў нешта вельмі ганебнае. Каб можна было нікому не расказваць, забыцца і нават не ўспамінаць! Але нельга. Ён не ўмее зманіць бацьку. Можна, праўда, змаўчаць. Але сітуацыя такая, што гэта, напэўна, выкліча падазронасць. Не трэба, каб з'ўлялася падазронасць! Яны сябры. Нарэшце, толькі ён, Яраш, можа парадзіць, як яму паводзіць сябе далей з гэтым няшчасным шалапутам.
- Хадзем, тата, пагуляем. Я маю табе нешта расказаць.
- Ах, сакрэцікі? - закрычала абураная Наташка. - Ну і хадзіце! Ну і гуляйце! Зазнавакі вы! Я таксама маю сакрэт, у сто разоў цікавейшы за ваш, і ніколі вам не раскажу. - Яна ледзь не плакала ад незадаволенай цікаўнасці.
- Не лезь, Натка, у мужчынскія размовы.
- Падумаеш, мужчыны!
Яраш некалькі разоў свіснуў, адзін раз засмяяўся. Больш за ўсё яго ўразіла і здзівіла Маша. Вось дык рамантычна-задумлівая ціхоня! Ён вінаваты, што запрасіў яе сюды, пазнаёміў хлопцаў. Недарэмна казалі ў старажытнасці, калі здаралася бяда - вайна, сварка, бойка: не абышлося без жанчыны!
Потым яны абодва колькі хвілін маўчалі. Зайшло сонца. Па-асенняму хутка згусціўся змрок. Пад соснамі стала амаль ужо цёмна.
Яны думалі ў лясной цішыні. Антона Кузьміча кранула сынава даверлівасць.
- Ты кахаеш яе?
- Яна падабаецца мне.
- Яна доўга сустракалася з ім?
- Не ведаю. Яна сказала, што сустракалася, а ці многа разоў - я не распытваў.
- Яму таксама яна сказала?
- Наўрад.
- Ты моцна пабіў яго?
- Не. Нармальна.
- Ведаю я тваё «нармальна»! Нельга было без мардабою?
- Я не талстовец. Ён ударыў першы.
- Трэба расказаць Валянціне Андрэеўне.
- Навошта?
- Ты ж расказаў мне. І ўсё стала на месца. А ён не здагадаецца зрабіць гэта...
Валянціна Андрэеўна, не даслухаўшы, занепакоілася. Маці ёсць маці. Славік здаўся ёй маленькі, бездапаможны, збіты да паўсмерці дарослым і дужым хлопцам. У яе з'явілася нядобрае пачуццё да Тараса, хоць сваім цвярозым розумам яна добра ўсведамляла, што больш разумна, як зрабіў Тарас, зрабіць нельга - у руках у іх была смерць.
Яны ўтраіх шукалі Славіка на лузе. Маці гукала. Адгукалася рэха.
Нізіны зацягвала туманам.

Халадала.
Матчына трывога расла. Яраш супакойваў жанчыну:
- Упэўнены, Валя, што ён драпануў у горад. Яму сорамна паказвацца на вочы. Давайце паедзем - і ён будзе дома.
Яна папрасіла:
- Антон, не расказвай Кірылу. Баюся, ён не зразумее.
Недарэчна, што чалавек, які павінен разумець усе рухі чалавечай душы, раптам не зразумее ўласнага сына. Ён, Яраш, усіх разумее.
Шыковіч сядзеў дома, чытаў новы раман свайго сталічнага сябра.
Яраш сказаў, што забыўся зрабіць важнае назначэнне цяжкаму пасляаперацыйнаму хвораму.
- Што ты забыўся - гэта, мабыць, хлусіш, ты ніколі нічога не забываеш. Тут вось, - Кірыла ляпнуў па часопісе, - адзін разумны герой кажа: найлепшаму сябру не давярай дзвюх рэчаў - машыны і жонкі.
- Не вельмі разумны твой герой.
- А я табе давяраю дужа часта і машыну і жонку.
- Валя паедзе са мной, між іншым.
- А яна што там забылася?
- Не бойся, едзе і Галіна. Няхай пракатаюцца.
- Цісніце на ўсе педалі. Не будзеце хоць перашкаджаць.
Антон Кузьміч не мог не ўзяць жонкі, бо добра ведаў, што спакойнай Галіна не будзе, ведаючы, што ён паехаў у ноч з жанчынай, хоць гэтая жанчына і Валянціна Андрэеўна, жонка сябра, маці дарослых дзяцей.

* * *

Валянціна Андрэеўна супакоілася толькі каля дома, калі ўбачыла, што вокны кватэры асветлены.
У яе быў свой ключ. Яна ўвайшла непрыкметна. Заглянула праз шкляныя дзверы ў пакой. Славік ляжаў на канапе без сарочкі, мокры ручнік закрываў левае вока і шчаку. На падлозе стаяла раскаркаваная бутэлька дарагога каньяку. Быў уключаны прыёмнік. Далёкая спявачка даволі прыемным меца-сапрана спявала на чужой мове сумную песню.
Славік ствараў сабе настрой. Яму хацелася, каб была роспач, душэўная дэпрэсія, каб зрабіўся ненавісным увесь свет. Але такі настрой не прыходзіў. Была, праўда, злосць, заставаўся боль. Але недзе ў мазгавых глыбінях цяплілася думка, што ўсё скончылася для яго не так ужо дрэнна. Жыла недзе побач са злосцю ранейшая павага да Тараса. Разам з тым яму хацелася пераканаць сябе, што ён завёў брыгадзіра ў больш няёмкае становішча, чым апынуўся сам. «Няхай паспрабуе растлумачыць мой нявыхад на работу».
Але тут жа зноў закіпала злосць і на Тараса і на Машу. Зноў пачыналася напружаная работа разгарачанага мозгу: як адпомсціць ім? Потым з'явілася думка, што ўчынак яго наіўны (больш за ўсё ён баяўся наіўнасці і сентыментальнасці), і сэрца пачалі апякаць дробныя і непрыемныя іскры сораму. Гэта, бадай, было самае пакутлівае пачуццё. Ён тушыў гэтыя іскры маленькімі глыткамі каньяку.
Не расплюшчваючы вачэй, ён пацягнуў руку па бутэльку... І раптам адчуў, што хтосьці забраў бутэльку з-пад яго рукі. Ён падхапіўся з прымхлівым страхам.
Каля канапы стаяла маці.
- Мама?! - і зноў упаў на падушку.
Валянціна Андрэеўна паставіла бутэльку на стол. Падсунула крэсла, села побач, як каля хворага. Паглядзела ў яго здаровае вока. Моўчкі адгарнула ручнік, разглядзела сіняк.
- Не глядзі так, мама, - папрасіў Славік.
- Божа мой! Які ты малы яшчэ і дурны. Калі ты ў мяне паразумнееш?
Малы задзіра, ён крычаў не так даўно ў адказ на папрокі маці: «А чаго яны самі лезуць?» Цяпер ён крыкнуў амаль гэтак жа:
- А чаму яны не даюць мне жыцця?
- Хто табе не дае жыцця?
- Усе!
- Хто «ўсе»? Усе жадаюць табе дабра. Усе хочуць, каб ты стаў чалавекам.

- І б'юць па мордзе?
- А ты хацеў, каб стралялі? Дурань! Скажы дзякуй. - Яна паднялася ў злосці і пайшла на кухню, захапіўшы каньяк.
Славік зразумеў, што маці ўсё ведае. Тарас расказаў. Гэта страшэнна ўразіла: выходзіць, Тарас мог адразу проста так вось пра ўсё расказаць. Можа, смяяўся нават? Смяяліся ўсе разам: Яраш, бацька, маці, малая Наташка... Дуэль здалася цяпер да дзікасці наіўнай. Сорам пекануў жаркім полымем. Славік закрыў увесь твар мокрым ручніком.
**23**
Шыковіч не любіў восені. Увосень яму дрэнна працавалася. Нават улетку лепш. Дзіўна! Большасць пісьменнікаў мінулага пісалі ў сваіх успамінах, што найлепшы творчы перыяд - асеннія месяцы.
Раней Кірыла тлумачыў гэта тым, што дзеці, пачаўшы вучобу, жонка - работу ў школе, заўсёды месяц-два пасля канікул былі неарганізаваныя, шумныя, завальвалі ўсе сталы падручнікамі і сшыткамі, займалі лепшыя рабочыя гадзіны падрыхтоўкай урокаў і выцяснялі яго, выбівалі з «творчай каляіны». Усё жыццё ён пакутаваў ад кватэрнай цеснаты і марыў пра цішыню.
І вось наладзіў яе, цішыню: застаўся на дачы адзін. Навокал - ні душы. А дзень асенні, неба зацягнула нізкімі і цяжкімі хмарамі з самай раніцы. Пайшоў дождж, дробны, спорны, але цёплы яшчэ, - грыбны, кажуць у народзе. Дождж шамацеў у не кранутых яшчэ агнём восені лісцях дубоў, сыпаўся, як пясок, па шыферным даху. Гэта быў адзіны шум, які парушаў цішыню.
Кірыла смажыў сабе на керагазе яешню, варыў густую чорную каву і радаваўся дажджу і цішыні. Думаў, з якой асалодай і натхненнем ён папрацуе. Ірваўся да стала. Ён пісаў пра арганізацыю падполля, першы гарком, непахіснага і мужнага Дубецкага, пра групы Ганчарова, Мурыгіна, пра Яраша - пра ўсіх тых, хто першы пачаў змагацца і пра дзейнасць каго была поўная яснасць і для яго і для тых, хто будзе бласлаўляць кнігу ў свет. Ён пакуль што абыходзіў «белыя плямы». Іх нямала, найбольшая - група інфекцыйнай бальніцы, якую пакуль што ніхто не прызнае. Артыкул яго не друкуюць. А новыя дакументальныя доказы не знаходзяцца. Гэта яго злавала і перашкаджала паслядоўнаму разгортванню падзей у аповесці. Але ў апошнія дні ён знайшоў такі кампазіцыйны ход, які дазваляў гісторыю Савіча і ўсёй бальнічнай групы напісаць і ўставіць пасля. Работа зрушылася з месца.
Ён ірваўся да стала. А сеў - і раптам адчуў, што не можа пісаць. Магчыма, залішне многа цішыні і адзіноцтва. Нязвыкла. А галоўнае - многа думак. Яны, як марскія хвалі, набягаюць адна на адну, разбіваюцца аб бераг яго імкнення засяродзіцца на адным, і ў выніку застаецца адна пена ды выпадковыя непатрэбныя для працы рэчы - шматкі ад самых розных успамінаў.
Прыгадаўся ўчарашні партыйны сход у рэдакцыі. Новая вылазка Рагойшы. Ён раптам пад канец, калі быў вычарпаны парадак дня, узняў пытанне аб ідэйных пазіцыях Шыковіча. Чаму не пайшлі яго абодва артыкулы - пра Савіча і пра калгас у Загаллі?
«Пра што піша Шыковіч? Народ абмяркоўвае Праграму пабудовы камунізму, а Шыковіч у гэты час - глядзіце! - як паказвае калгас, як выказваецца аб працадні, аб культуры сяла. Праз якія акуляры ён глядзеў на свет - во што мы павінны спытаць у камуніста Шыковіча».
Рагойшу не падтрымалі: артыкулы не апублікаваны, няма пра што гаварыць! Кірыла паставіўся там, на сходзе, да гэтага чарговага наскоку Рагойшы з іроніяй, ведаючы, як шалее той ад яго спакою. А сёння яго апанавала злосць.
«Не, чорт вазьмі, я даб'юся, што артыкулы будуць апублікаваны! І адзін, і другі. Бо гэта якраз пра тое, пра што запісана ў Праграме. У абком пайду. У ЦК пашлю. Не можа лічыцца лепшым такі калгас, як у Загаллі. І такі старшыня, як Грак! Ды і такі журналіст, як ты, доўбня!»
Узрушаны, ён пачаў хадзіць па пакоі мансарды. Адна масніца скрыпела, і гэта яшчэ больш раздражняла і злавала. Ён бязлітасна разносіў сваіх праціўнікаў. Рагойшу знішчыў адразу, лёгка. Ударыў па Тукалу - дурняў трэба біць. Дурняў! А хто Гукан? Ён быў замахнуўся і на яго, але рука павісла. Не, гэта не дурань. Але хто? Успомніў, як дзён колькі пазваніў яму. З выдавецтва прыслалі прапанову перавыдаць кніжку Гукана, але прасілі зрабіць некаторыя папраўкі. Шыковіч узлаваўся: у выдавецтве лічаць, што папраўкі павінен рабіць ён, «літаратурны пісар». Не, даволі! Не трэба яму лёгкі ганарар! Ды, нарэшце, ніякія папраўкі не палепшаць кніжкі, прасякнутай духам культу асобы.
Ён сказаў Гукану па тэлефоне:

«Я пішу ў выдавецтва: кніга патрабуе карэннай перапрацоўкі, а таму аб перавыданні яе ў наступным годзе не можа быць і размовы. Згодны, Сямён Парфёныч?»
Гукан доўга не адказваў, але ў трубцы было чуваць яго цяжкае дыханне. Нарэшце ён сказаў далёкім асіплым голасам:
«Я вас прашу зайсці да мяне. Нам трэба пагутарыць».
Шыковіч не пайшоў: «Трэба табе - прыйдзі сам».
Цяпер ён думаў, што яму варта ўсё-такі пайсці і выклікаць Гукана на шчырую размову. Але ён адчуваў, што пасля пісьма, якое паказаў яму Тарасаў, і асабліва пасля гісторыі з кватэрай для Зосі яму цяжка будзе гаварыць з гэтым чалавекам. Ён адчуваў да Гукана не толькі непрыязь, нешта большае. Аднак даследчык у любых умовах павінен заставацца аб'ектыўным, як добры следчы. Возьмуць пачуцці ўладу над розумам - да ісціны не дакапаешся.
«Трэба схадзіць, - вырашыў ён, стоячы каля зашклёных дзвярэй, што вялі на маленькі балкончык мансарды. Па жоўтай нахіленай падлозе балкончыка каціліся слёзы дажджу. Прастор лугу, старыца, лазнякі танулі ў дажджавой імгле. - Не, спачатку трэба ўсё распытаць у Зосі. Чортаў Яраш! Як ён асцерагае яе!»
Потым ён думаў пра жончыну скаргу: Іра закахана ў Тараса, а ён сустракаецца з гэтай рудой сястрой. Валя гаварыла пра Машу не надта прыязна, а ён, Кірыла, падумаў і тады і думае цяпер, што Тарас зрабіў правільны выбар. Каб выбіраў ён, Кірыла Шыковіч, то таксама выбраў бы Машу. Ён не сказаў гэтага жонцы. А цяпер адчуў некаторую віну перад уласнай дачкой за такія думкі. Ён паспрабаваў адагнаць усе гэтыя думкі, прымусіць сябе працаваць.
«Я вазьму цябе, Кірыла, за каўнер і пасаджу за стол. Ты проста гультай. Ты дзікі гультай, якіх павінны выганяць з таго грамадства, якое мы пабудуем, - бязлітасна дакараў ён сябе і тут жа чапляўся да сваіх слоў: - А куды ты яго выганіш? Выгані прэч самога сябе. На дождж яго, сабачага сына!» І ён выйшаў пад дождж, стаяў, пакуль не намоклі валасы і струменьчыкі не пацяклі па твары, па шыі за каўнер курткі.
Не, у такой дажджавой цішыні працаваць нельга! Глянуў на гадзіннік. Хаваў яго пад газеты, калі садзіўся працаваць, каб не заглядваць, не адцягваць увагу развагай аб часе. Прайшло гадзіны дзве ў гэтай бясконцай плыні думак. Мозг стаміўся, прасіў адпачынку. Пасля яешні і кавы захацелася з'есці што-небудзь больш грунтоўнае. Але ён вырашыў трымаць сябе на паўгалодным пайку і не захапіў ні каўбасы, ні вяндліны, ні сала, нічога такога. Думкі скіраваліся да яды. Жах! Як ён не можа авалодаць імі, уласнымі думкамі!
Скончылася тым, што ён плюнуў на ўсё, завёў машыну і паехаў у горад. Па дарозе надумаў, на злосць Ярашу, заехаць адразу да Зосі і размовай з ёй кампенсаваць страчаны дзень.
Кірыла ведаў, што Яраш учора паляцеў у далёкі раён рабіць нейкую тэрміновую аперацыю. А таму здзівіўся, калі на бязлюднай Пушкінскай убачыў адзінокую мажную постаць у элегантным чорным плашчы, які Яраш купіў у Бруселі, куды ездзіў на кангрэс хірургаў. Чаму ён тут? Куды ідзе? Гуляе пад дажджом? У глыбокай задуме. Шыковіч добрую хвіліну ехаў з ім побач - і Яраш не звяртаў увагі на машыну. Кірыла абагнаў яго, спыніўся, вылез з машыны, выйшаў на тратуар.
Яраш ішоў на яго як сляпы. Вось-вось саб'е з ног, раздавіць, як цяжкі танк. Спыніўся за два крокі. Паглядзеў, нібы раптоўна разбуджаны. Спытаў:
- А-а?
Кірыла засмяяўся:
- Ты што, з пахмелля? Накачалі ў раёне?
Яраш правёў мокрай далоняй па твары і злосна сказаў:
- Дурань!
У Кірылы дрогнула сэрца: няўжо няшчасце з Зосяй?
- Хадзем у машыну. Дождж.
Яраш паслухмяна сеў на пярэдняе сядзенне. Машына пад цяжарам яго цела асела.
Яраш павярнуў да сябра мокры твар.
- Я даўно, Кірыла, нічога падобнага не перажываў, - сказаў ён даверліва і з глыбокім смуткам.
- Што здарылася?
- Яны памерлі ў мяне на стале.
- Хто?
- Дзеці. Абодва. Два хлопчыкі. Браты. Аднаму дзевяць, другому сем. Каб мне ўдалося прыляцець хаця б гадзіны на дзве раней. Аднаго, безумоўна, удалося б уратаваць. Непаваротлівыя ідыёты і

там, у раёне, і тут, у аблздраве! Дзве гадзіны арганізоўвалі вылет. Я з іх душы вытрасу за гэтых дзяцей! - Ён скрыгатнуў зубамі. - Каб я прыляцеў раней, я зашыў бы артэрыю...
- А што з дзецьмі?
- Міна. Выцягнулі з рэчкі. І, як водзіцца, разбіралі. Ведаеш, старэйшы, Міша, быў у прытомнасці. Усё пытаў: «Дзеці цэлы? Як Алёнка?» Там былі малодшыя, і яны адганялі іх ад сябе, адчуваючы небяспеку. Падазраю, што ў апошні міг ён сабою закрыў дзяцей. Яму разарвала жывот. Дзіму асколкам прабіла шыю. Засынаючы пад наркозам, Міша сказаў: «Ох, будзе мне ад мамы!» - Яраш закрыў далонямі вочы, паківаў галавой, паўтарыў: - Ох, будзе мне ад мамы! Жахліва, Кірыла! Ніколі я не быў яшчэ такі бяссільны перад смерцю.
Шыковіч маўчаў. Што гаварыць? Яго моцна ўразіла і сама трагедыя і тое, як яе перажывае чалавек, які бачыў тысячу смерцяў, які ўмеў перамагчы яе, бязлітасную кастлявую. Яны доўга сядзелі моўчкі.
Дождж барабаніў па кузаве. Зрэдку прабягалі з парасонамі і ў накідках прахожыя. Зазіралі ў машыну не без здзіўлення. Яраш пакруціў галавой, як бы страсаючы нешта:
- У мяне ў галаве звіняць яго словы. Не магу. Напіцца, ці што? Крыўдна! У клініцы я мог бы ўратаваць іх абаіх. У Мішы парвала кішэчнік. Трэба было ўдаліць парваныя ўчасткі і хутка сшыць. Хутка! А там, ва ўчастковай бальніцы, прыйшлося ўсё рабіць дзедаўскім спосабам. Асістэнтка, раённы хірург, маладая, нявопытная, яе ліхаманіла. Ды і ў самога мяне - сорамна прызнацца - дрыжалі рукі. Жахліва! Можа, дваццаць гадоў праляжала яна на дне рэчкі, гэтая праклятая міна. Уяўляеш? І вось - новыя ахвяры вайны. Дзеці! Дзеці! Ух-х! Паедзем куды-небудзь.
- Куды?
- Куды хочаш.
- Можа, заедзем да Зосі? - спытаў Шыковіч.
- Так, так... Да Зосі, - адразу згадзіўся Яраш.
Яны зноў маўчалі, пакуль ехалі. Каля самага дома Яраш сказаў:
- Толькі не будзем расказваць ёй пра гэта.
Гаспадыня ўзрадавалася гасцям. А Маша, якая жыла цяпер у Зосі, спалохалася. Яна лепш, чым нават Шыковіч, ведала Яраша, і яе спалохаў яго выгляд. Увогуле, яна стала баяцца яго пасля нядаўняй размовы. Неяк ён паклікаў яе ў кабінет. Калі яна ўвайшла, ён сядзеў за сталом і чытаў Блока. Яна спынілася каля дзвярэй, здзіўленая тым, што ён не паглядзеў нават. Гэта не яго манера: ён кожнага з персаналу, ці то галоўны лекар, ці то санітарка, сустракаў заўсёды аднолькава - добрым позіркам, прыветлівым словам.
Маша чакала, імкнучыся здагадацца, навошта паклікана.
Ён сказаў, не адрываючыся ад кнігі:
- Яны пабіліся за вас.
- Хто? - Хоць яна адразу ж здагадалася хто, і ёй вельмі захацелася засмяяцца.
«Няўжо праўда пабіліся? - падумала з вясёлай гарэзлівасцю. - Хто каго біў?»
- Яны працуюць у адной брыгадзе. Сем'і нашы дружаць, разам жывуць. Навошта вам спатрэбілася сутыкнуць іх ілбамі?
- Каб зрабіць правільны выбар, трэба эксперыментаваць, Антон Кузьміч, - адказала яна яго словамі і не вытрымала - засмяялася.
Тады ён адарваўся ад кнігі і паглядзеў на яе. Дзіўна вельмі паглядзеў, быццам на яе месцы чарадзейна апынуўся зусім другі чалавек - не тая сястра, якую ён ведаў два гады, любіў, цаніў, паважаў. З якой нават пасябраваў пэўным чынам, калі з'явілася Зося.
- Дзіўны эксперымент, - хмыкнуў ён, хіснуўшы галавой. - Можна вас папрасіць, каб вы з нашымі сынамі такіх эксперыментаў не рабілі?
Ад гэтай яго просьбы, падкрэслена-ветлівай, афіцыйна-халоднай, яна страшэнна збянтэжылася. Як яна недарэчна трымала сябе - засмяялася, сказала несусветную лухту! Праваліцца б лепш скрозь падлогу. Добра, што ён зноў углыбіўся ў кнігу і не глядзеў на яе. Але яна не ведала, як выйсці, і ўсё стаяла перад сталом, анямелая, пакараная найгоршым чынам. Відаць, ён зразумеў, што з ёю робіцца, бо сказаў:
- Папрасіце, калі ласка, Дабравольскую зайсці да мяне.
Маша ветрам вылецела з кабінета.

...Таму яна і спалохалася, убачыўшы абодвух бацькоў. А што, калі яны збіраюцца пагутарыць з ёй?
Супакоіў Шыковіч.
Выйшаў за ёй на кухню, спытаў прыветліва, па-сяброўску:
- Маша, вы ўмееце варыць каву? Чорную?
- Умею.
- Вы ўсё ўмееце. З вас будзе цудоўная жонка.
Ён даў ёй грошы на каву і каньяк. Яна ўзрадавалася даручэнню.
Зося захвалявалася была, хацела адзявацца, каб прымаць гасцей, як належыць гаспадыні. Але Яраш пачаў распытваць яе пра адчуванне, прафесійна, падрабязна, па-бальнічнаму. І яна зноў залезла на шырокую канапу з нагамі. Сядзела ў куточку, захутаўшыся ў халацік, як малая японачка. Маша навучыла яе адмыслова закручваць валасы, і высокая кукла прыгожых валасоў сапраўды рабіла яе падобнай на ўсходнюю жанчыну.
Яраш скончыў распытваць пра здароўе і змоўк. У той дзень яму цяжка было весці размову для размовы, гаварыць пра ўсё.
Шыковіч паліў на кухні, пускаючы дым у фортку, слухаў іх, зразумеў зацяглую паўзу.
Зося сказала нешта пра дождж. Яраш крыху іншымі словамі сказаў тое ж.
- У вас стомлены выгляд, Антон Кузьміч.
- Я сёння прыляцеў з раёна.
- Камандзіроўка?
- Але.
Шыковіч кінуўся на дапамогу сябру.
- Соф'я Сцяпанаўна, не сумна вам адной у гэтым доме? - спытаў ён з жартаўлівай весялосцю, сядаючы ў зручнае нізкае крэсла.
- О не. Я чытаю. У мяне добрыя суседзі. Яны наведваюцца. А потым прыходзіць з работы Маша...
Вось так пагаварылі яшчэ пра тое-сёе. Нарэшце Кірыла падступіў да галоўнага, асцярожна, далікатна:
- Соф'я Сцяпанаўна, скажыце, калі ласка, вас не вельмі расхвалюе размова пра мінулае?
Яна ўздрыгнула, насцярожылася:
- Пра якое мінулае?
- Ну, напрыклад, пра вайну. Пра смерць бацькі...
- А што вас цікавіць?
- Што мяне цікавіць?.. - Ён палез ва ўнутраную кішэню пінжака і дастаў складзеныя лісты паперы. - Прачытайце вось гэта, і вы зразумееце.
Яраш зірнуў на сябра з дакорам, але змаўчаў.
Зося разгарнула сашчэпленыя лісты, прачытала загаловак, устрапянулася, паглядзела на Шыковіча са здзіўленнем, страхам і надзеяй. Позірк яе пытаў:
«Што ты падрыхтаваў мне? Гора? Хіба ў мяне яго было мала? Радасць? Няўжо радасць?..»
Пачала чытаць прагна, нецярпліва, маланкава хутка. Лісткі трапяталіся ў руках, як жывыя птушкі. Пабляднелі, а потым загарэліся шчокі. Яны абодва не зводзілі з яе вачэй. Але вось яна, перагортваючы старонку, з палёгкай уздыхнула. Прыціхлі лісты, перасталі трапятаць. Павольней пачала чытаць яна. Пад канец, было відаць, зусім супакоілася і здавалася нават крыху расчараванай. Задумалася глыбока. Яны доўга, ніводным рухам не парушаючы цішыні, цярпліва чакалі, калі яна вернецца з успамінаў.
Шпарка-шпарка, нібы надзвычай спяшаўся - цік-цік-цік, - адганяў у нябыт секунды прыгожы гадзіннік на кніжнай паліцы. За акном у лісцях таполі шумеў дождж.
Нарэшце Шыковіч не вытрываў:
- Пра што вы думаеце?
Яна не ўздрыгнула, не схамянулася, - паглядзела сухімі, але напоўненымі святлом удзячнасці вачамі, спакойна адказала:
- Я думаю, як хораша, што ёсць на свеце такія людзі, як Антон Кузьміч, як вы... Дзякую вам.
- Падзякі пасля. Ды і не мне павінны быць адрасаваны. Антону - справа іншая. А за тое, што ў нашы дні ўсюды аднаўляецца справядлівасць, вы ведаеце, каму дзякаваць. Цяпер вы разумееце, што мяне цікавіць. Як загінуў доктар Савіч? Хто яго забіў? Вы былі пры гэтым?

Зося паківала галавой: не, не была. Потым сказала:
- Я думаю, тата застрэліўся...
- Сам?
**РАСКАЗ ЗОСІ САВІЧ**
- Вы помніце, Антон Кузьміч, я расказвала вам: бацька вельмі асцерагаў мяне. Я, па сутнасці, была схавана ад свету. Толькі ваша з'яўленне, ды калі я шукала Тараса... А больш я нічога не зрабіла. Мне ніхто нічога не даручаў. Я ведала: бацька сумленны чалавек. Але ці проста сумленны лекар ці змагар? Я здагадвалася, што нейкім чынам ён памагае нашым. Але як? Спрабавала гутарыць з ім пра гэта. Ён умеў адвесці размову ўбок. А разы два ўзлаваўся і загадаў, каб я не совала носа куды не трэба. «Малая яшчэ! - сказаў ён. - Не нам з табой займацца палітыкай. Не думай, што гэта рамантыка, як у кніжках. Ты ў мяне адна». Яшчэ тата часта казаў, каб я не думала, што ён служыць чужынцам, ён лячыў і лечыць сваіх людзей. А людзі - гэта самае каштоўнае, астануцца людзі - гісторыя не спыніцца і не пойдзе назад. Будуць жыць людзі - будзе жыць краіна і тая ўлада, якой народ даражыць. Вось так ён гаварыў. Гэта я помню, бо словы гэтыя ён казаў часта. Я не згаджалася: а хто ж будзе ваяваць? Ён злаваўся: «Не многа будзе карысці, калі пойдуць ваяваць дзеці, як ты, ці такія старыя, як я». Я пасля толькі зразумела, што бацька проста асцерагаў мяне, любым чынам, абы я была далей ад таго, што рабілася навокал. І раптам... Гэта было перад Першым маем, дні за два. У той дзень нашы ўзарвалі электрастанцыю. Пасярод дня. Так грымнула, што нават у нас - а гэта ж вунь дзе! - вылецела шыба ў мансардзе, у пакоі Грота. Нямецкі лекар у нас жыў. Казалі, што міну ўкінулі ў топку і выбухнуў кацёл...
- Група Шылава, - сказаў Шыковіч. - Пішу пра іх.
- Што? - не зразумела Зося.
- Хто ўзарваў станцыю. Камсамольская група. Загінулі хлопцы. Валодзя Шылаў зачыніўся ў трансфарматарнай будцы і адстрэльваўся да апошняга патрона. Жывым не здаўся. Залішняя смеласць і рызыкоўнасць загубіла...
Зося памаўчала, як бы ўспамінаючы, на чым перапынілася.
- Бацька прыехаў позна, калі сцямнела. На санітарнай машыне. Заехалі ў двор. Ён ніколі не заязджаў у двор. Я выскачыла насустрач. Тата папрасіў мяне памагчы шафёру аднесці на кухню мяшок бульбы і мяшок мукі. Мы аднеслі.
Грот быў дома. Добра помню, ён сустрэў бацьку словамі:
«Калі ласка, пан Савіч... Неяк вы сказалі, што мы бываем задужа жорсткія... Не, мы мяккія. Мы, немцы, увесь час пакутуем ад сваёй мяккасці і дабраты. А жорсткасць там. Жорсткасць і дзікунства! Каму перашкаджала электрастанцыя? Давала святло ў вашу бальніцу, у мой шпіталь, у наш дом...»
Ён так і сказаў - «наш».
«А цяпер будзем паліць... Як гэта вы сказалі, Софа? - звярнуўся ён да мяне. - Лучыну? О, лучыну! Свечак і тых няма. Я ледзьве раздабыў дзесятак. Божа мой! Якое дзікунства і фанатызм! Сёння ў нас арыштавалі сястру. Вашу. Мы далі ёй работу. Добрую работу з добрай аплатай. Яна магла жыць культурна, прыгожа. А яна шпіёніла, карыстаючыся тым, што ведала нашу мову. Жахліва!»
«Сёння многіх арыштавалі, - сказаў бацька і таксама паўтарыў: - Жахліва! Жахліва!»
«Я рад, пан Савіч, што вы разумееце, - узрадаваўся Грот. - Не, мы не жорсткія. Мы мяккія і добрыя».
Ён жыў у нас год і з дня на дзень трубіў аб дабраце нямецкага характару. Я часам не магла вытрымаць і гаварыла, якую яны «дабрату» праяўляюць. Тады ён пачынаў чытаць цэлыя лекцыі, прыводзіў прыклады з нямецкай гісторыі, чытаў на памяць Гётэ і Шылера. Аднойчы я незнарок знайшла ў бацькавай бібліятэцы Гейнэ, прачытала, і мне зрабілася весела. Я прачытала яму, Гроту, што пісаў пра нямецкі характар Гейнэ. Грот разумеў крыху па-расейску, я - па-нямецку... Звычайна спакойны, ён узлаваўся. Сказаў, што Гейнэ жыд, а ўсе жыды злейшыя ворагі нямецкай нацыі. Забраў кніжку і, напэўна, спаліў. А на другі дзень цэлы вечар капаўся ў нашай бібліятэцы - шукаў крамолу.
Але што я расказваю вам пра гэтага немца? Я пасля бачыла іх тысячы, розных, добрых і звяроў. О, каб вы ведалі, што такое эсэсаўцы!
Зося заплюшчыла вочы і ўздрыганулася, прыціснулася да спінкі канапы, закрыла халацікам горла, быццам ёй раптам зрабілася холадна. І тут жа вінавата ўсміхнулася, просячы прабачэння.

- Калі Грот, павячэраўшы, падняўся да сябе, бацька прыйшоў на кухню, дзе я мыла талеркі, абняў за плечы, прашаптаў:
«Зося, дзіця маё, у нас у садзе хаваецца чалавек. Я пайду да немца гуляць у шахматы. Ты адсунь свой ложак, пасцялі за ім на падлозе. Адчыні акно. У твой пакой Грот ніколі не заходзіць».
О, каб вы ведалі, што я адчула! Калі я схавала вас, Антон Кузьміч, я хавала вас і ад бацькі, бо не ведала, як ён паставіцца, што зробіць, калі даведаецца. Гэта вельмі цяжка - любіць і не верыць. А верыць лёгка, калі людзі робяць адну справу, калі яны аднадумцы. Разумееце? Я няскладна расказваю, але вы зразумееце... І з вамі, і з Тарасікам я вымушала бацьку нешта рабіць, ведаючы, што дзеля мяне ён зробіць усё, выканае і сур'ёзную просьбу і капрыз. А тут раптам усё мянялася. Ён даваў мне заданне. Як старэйшы. Як кіраўнік. Давяраў такое...
Хто гэты чалавек, думала я, калі адсоўвала ложак і сцяліла на падлозе пуховую коўдру, найчысцейшыя прасціны. Наіўна, але мне захацелася, каб гэта зноў былі вы, Антон Кузьміч... Прабачце. Дзверы ў мой пакойчык - пад лесвіцай на мансарду. Я пакінула ў пакоі свечку, узышла на лесвіцу - ці не відаць ложак? Колькі пражыла, колькі хадзіла малая, я ніколі не зазірала з лесвіцы ў адчыненыя дзверы - што відаць у пакоі?!
Грот, які бесцырымонна лазіў нават у кухонныя каструлі, у бочкі ў паграбе, ні разу не адчыніў дзвярэй майго пакоя. Гэта праўда. У гэтым ён быў інтэлігент.
З радасцю і страхам я адчыняла акно. А потым стаяла ў калідоры і слухала... Калі ён залезе... І баялася, каб у цемры не нарабіў грукату. Ён зрабіў гэта вельмі асцярожна, я пачула толькі, як рыпнуў незнарок закрануты ложак. Пасля гэтага я доўга яшчэ стаяла, потым сядзела на кухні - думала, што рабіць далей. Бацька не сказаў: можна мне заходзіць у пакой ці нельга. Можа, чалавека трэба накарміць? Урэшце я рашуча са свечкай у руках увайшла ў свой пакой. Убачыла, што коўдру і прасціну ён палажыў назад на ложак. Я заглянула за ложак.
Чалавек быў доўгі, худы, барадаты. Такі доўгі, што каб выпрастаўся, то, напэўна, ногі высунуліся б з-пад ложка. Таму ён сагнуў іх, і вострыя калені траха не вытыркнуліся над ложкам. Вочы яго бліснулі насцярожана і падазрона. Ён ляжаў у ватоўцы, у ботах і трымаў руку за пазухай. Ад яго пахла зямлёй. Я спытала шэптам:
«Прынесці вам вячэру?»
Ён палажыў далоню на бараду, на вусны і паківаў галавою: не.
Але я ўсё-такі прынесла яму кавалак хлеба з маслам, бутэльку чаю і яшчэ нешта... Я знарок хадзіла шумна, як звычайна, ляпала дзвярамі. Можа, праз гэта ён зірнуў на мяне злосна і зноў прыкрыў рот рукой.
Калі роўна без чвэрці адзінаццаць (самая цікавая партыя адкладвалася на заўтра, такі ён быў акуратны, Грот) бацька спусціўся з гарышча, я паведаміла, што ён тут. Бацька адказаў надзіва спакойна, быццам размова ішла пра самае звычайнае: «Добра, дачка». Я спытала, дзе мне спаць.
«Дзе хочаш, абы Грот нічога не ўгледзеў».
Пакуль немец чысціў зубы, умываўся, я ў сваім пакоі перабірала бялізну, знарок пакінуўшы дзверы крышку прачыненымі.
Я лягла ў маміным пакоі. Але не магла заснуць амаль да раніцы. Усё думала, думала... Радавалася. І палохалася. За бацьку. За гэтага чалавека. Хто ён такі? Адкуль? Можа, толькі што прыляцеў з Масквы? Але больш за ўсё я думала пра бацьку. І, далібог, ніколі гэтак не любіла яго, як у тую ноч. Здаўся ён мне такім героем, такім мужным, разумным, самым галоўным падпольшчыкам у нашым горадзе. Наіўна. Але я думала, што пра тату ведаюць у Маскве... Я думала пра маму. Каб яна пабачыла, што мы робім з татам! Яна больш не ўпікала б: «Мяккацелы інтэлігент дарэвалюцыйнай закваскі! Не псуй мне дачкі сваім слінявым гуманізмам! Не той час!» Мама была рашучая. Яна яшчэ ў грамадзянскую з бранецягнікам на фронт паехала. Мама злавалася, што я баюся крыві. Прымушала мяне рабіць самую брудную работу. З-за гэтага яны сварыліся часам, тата і мама... Многа я ўсяго перадумала... Добра мне запомнілася тая ноч. Ёсць такія дні і ночы, якія запамінаюцца, выдзяляюцца і свецяцца, як маячкі, у памяці. Праўда? А ўсе іншыя зліваюцца ў адну плынь і цякуць, як магутная рака. На адным месцы вада заўсёды новая, а ўсё адно такая ж...
Спала я, можа, якія дзве гадзіны. Прачнулася раней за ўсіх. Калі Грот роўна ў сем спусціўся ў ванную, я «прыбірала» свой пакой і спявала. За снеданнем немец сказаў: «У вас добры настрой, фрэйлейн Софа. А ў мяне дрэнны. Ад свечкі баліць галава».
Тата нічога не гаварыў. Пацалаваў у лоб, калі адыходзіў на працу, як заўсёды, усміхнуўся:

«Вопыт ты маеш. Глядзі».
Наступілі тыя дзённыя гадзіны, калі я заставалася адна. Помніце, Антон Кузьміч? Адной мне было сумна... На кухні і на кухні.
...Прыйшла Маша з пакупкамі, мокрая, шумная, вясёлая. Гукнула з калідора:
- Кірыла Васільевіч! «Беламора» няма. Купіла «Казбек». Добра?
Зазірнула ў пакой, убачыла іх, засяроджана-ўважлівых, сур'ёзных, насцярожылася.
- Сядайце, Маша, паслухайце, - сказаў Шыковіч, хуценька занатоўваючы нешта ў запісную кніжачку.
Маша паставіла сумку каля парога.
- Я сказала яму:
«Вылазьце. У доме нікога няма. Будзем снедаць».
Ён падняўся з-за ложка. Ён быў высокі, але не такі доўгі, як здаўся мне, калі ляжаў. І не такі худы. Так, звычайны чалавек з тых, якія ніколі не паўнеюць, хоць ты іх пакладзі і знарок адкормлівай. Перш за ўсё ён глянуў на акно, потым агледзеў пакой і... мяне... Можа, я была такая ўражлівая, «мяккацелая інтэлігентка»... Як толькі пасля на мяне ні глядзелі, і свае і чужынцы, - мяне не кранала. А яго позірк... Вы прабачце, можа, я расказваю дробязі, глупства. Але я шчыра...
- Не, не. Калі ласка, як можна больш падрабязна, - папрасіў Шыковіч. -Гэта не дробязі... Для мяне гэта асабліва важна.
- Яго позірк мяне... абразіў... Пакрыўдзіў. З нейкай нядобрай падазронасцю ён агледзеў мяне. Я не ведаю, як вам сказаць... Але мне стала крыўдна. Чалавек даверыў нам сваё жыццё... Мы рызыкуем сваім, хаваючы яго... Чаму ж ён глядзіць так? Нядобра. А можа, мне здалося? Я малая была вельмі крыўдлівая. Маці не так гляне, як мне хацелася, і я цэлы дзень заліваюся слязамі. Больш, праўда, ён так не глядзеў. Быў прыветлівы, хоць не вельмі гаваркі.
Тады, за першым снеданнем, ён распытваў, як я жыву, з кім сябрую, куды хаджу, хто прыходзіць да нас, што за чалавек гэты Грот. Я разумела, што яму трэба ўсё ведаць, і падрабязна расказвала. Спытала, як яго імя.
«Навошта табе?» - сказаў ён без падазронасці.
«Неяк жа я павінна да вас звяртацца».
«Калі табе так хочацца, кліч мяне - дзядзька Сажань».
Я здагадалася, што гэта мянушка, яна здалася мне смешнай, і я засмяялася. Ён таксама ўсміхнуўся. Тады я адважылася і спытала, ці не з Вялікай зямлі ён прыляцеў. Сажань нахмурыўся і адказаў, што я рана пастарэю, калі ўсё буду ведаць. Гэтыя жартаўлівыя словы па-рознаму можна сказаць. Ён сказаў іх так, што мне расхацелася пытаць у яго пра што-небудзь яшчэ. Праўда, на другі дзень я не стрымалася і спытала пра вас, Антон Кузьміч. Мне чамусьці здавалася, што ён абавязкова павінен ведаць вас. Не, ён не ведаў.
«Што здрадніка Лучынскага пакаралі, пра гэта я чуў, а хто гэта зрабіў - Віктар, Антон ці Павел, - не мае значэння».
Каб ён ведаў вас, я, напэўна, расказала б, як вы хаваліся ў нас. Але пасля яго слоў, што не мае значэння, хто забіў Лучынскага, мне зноў-такі расхацелася расказваць яму пра вас. Не падумайце, што я стаіла крыўду на яго. Не. Я вельмі паважала яго. Асабліва калі бацька на маё пытанне: «Хто ён?» - адказаў: «Партыйны кіраўнік». О, як ён вырас у маіх вачах!
Я гатавала яму лепшыя снеданні і абеды, чым нават бацьку. Мяне толькі здзіўляла спачатку адно, зноў-такі гэта, відаць, ад майго такога выхавання - «мяккацелая інтэлігентка». Але ў нашым доме ўсе казалі адзін аднаму дзякуй, жадалі добрай ночы. Я хадзіла за ім, як санітарка за хворым. Ён ні разу не сказаў мне дзякуй. Не, здзіўляцца - гэта не тое я сказала. Мне зноў-такі трошкі крыўдна рабілася. Не за сябе. За яго. Фашыст Грот такі ветлівы, што бясконца, на кожным кроку: данке, данке, данке. Мне хацелася, каб наш чалавек, ды яшчэ такі кіраўнік, быў у сто, тысячу разоў больш культурны і ветлівы. Але на трэці дзень Сажань даказаў, што не гэта галоўнае. Мне нават сорамна стала за свае такія думкі.
Раніцаю я павіншавала яго са святам - з Першамаем. Як радасна бліснулі яго вочы!
«Дзякую, Зося, дзякую. Дзякую табе, дарагі таварыш. Цябе таксама віншую і жадаю дажыць да сапраўднага свята. Мы з табой станем побач і пройдзем пад сцягамі праз увесь наш горад».
Ён моцна паціснуў мне руку, і ў вачах яго, здалося, бліснулі слёзы. Я таксама ледзь стрымалася, каб не заравуці ад гора і шчасця.

Бацька ў першы дзень прыйшоў абедаць на гадзіну раней. Гэтую гадзіну яны гутарылі, зачыніўшыся ў маім пакоі. У гэты ж час яны размаўлялі і на другі дзень. А на трэці, Першага мая, прыехаў Вася, шафёр санітарнай машыны. І Сажань паўгадзіны гутарыў з ім. Пра што - я не ведаю. Вася выйшаў з пакоя з добрай усмешкай, паказаў мне язык, як малой. Потым, кіўнуўшы назад на дзверы майго пакоя, выставіў вялікі палец, маўляў, во які чалавек. Тады паказаў на гарышча і сякануў далоняй па горле; я зразумела: з такімі мы хутка зробім фашыстам чык-чырык. Але мяне рассмяшыла гэтая размова жэстамі - у доме ж нікога больш не было. У адказ на мой смех ён уставіў вялікія пальцы ў вушы і вось так памахаў далонямі. Гэта, мабыць, значыла, што я несур'ёзная, дурніца. Я пакрыўдзілася і паказала, што ў яго пуста ў галаве. Ён зняў сваю замасленую кепачку і тэатральна пакланіўся. Але з ганка вярнуўся, працягнуў мне каробачку і сказаў сур'ёзна:
«Гэта вам, Зося. Ад мяне».
У каробачцы былі мятныя цукеркі.
На чацвёрты дзень усё было, як звычайна. Раніцаю бацька і Грот пілі кофе і хвалілі нейкае новае нямецкае лякарства, не помню якое. Першы пахваліў бацька. Гроту гэта вельмі спадабалася. Яны разам выйшлі з дому. Я карміла снеданнем дзядзьку Сажаня. Перад абедам бацька зноў гутарыў з ім. У часе абеду Сажань быў заклапочаны і раптам вельмі даверліва паведаміў мне, што яму ніяк не могуць дастаць надзейнага дакумента і ён не можа выйсці з горада, бо ўсюды заставы, а ў горадзе ўсё яшчэ ідуць арышты. Сумна пажартаваў:
«Ем хлеб дарэмна. Мала што ў гэты раз зрабіў. І хлопцы недзе непакояцца, што са мною».
Бацька ўвечары прыехаў раней, чым звычайна. На той жа санітарнай машыне. У нашым цесным завулку машына доўга паварочвалася, буксавала ў гразі, і тата доўга не заходзіў у дом. Я чула, як ён перамаўляўся з шафёрам. Нарэшце машына пайшла. Тата ўвайшоў устрывожаны, нават спалоханы. Такі ён не быў яшчэ ніколі. Я спытала, што здарылася. Ён заспакоіў:
«Нічога, нічога, дачка».
А сам адразу пайшоў да яго. Праз колькі хвілін яны выйшлі, і Сажань упершыню агледзеў увесь дом, нават падняўся ў пакоі Грота.
Неўзабаве зноў прыехаў Вася. Бацька адчыніў вароты. Ён заехаў пад самы ганак. Зноў зваліў мяшок бульбы. Сказаў бацьку:
«Аглядалі. Двойчы. Адсюль і сюды. Злосныя, як сабакі».
«Падымі хлопцаў. Калі да ночы нічога не здарыцца, мы выведзем яго на Элеватарную».
Яшчэ пра нешта яны шапталіся.
Калі Вася паехаў, я зноў спытала ў бацькі, што ж усё-такі іх устрывожыла.
«Арыштавалі нашых людзей. Каля дома шнырае тайны агент паліцыі. На Пушкінскай правяраюць дакументы. Тройчы агледзелі нашу машыну».
Сажань перамясціўся ў пограб. Пад домам у нас вялікі пограб. Лазілі ў пограб з кухні. Але на двары каля сцяны быў люк - для вентыляцыі, і бульбу ўвосень праз яго ссыпалі. Ён быў яшчэ закрыты з зімы, люк. Бацька адкрыў яго. Потым сказаў мне разведаць сцежку. Была ў мяне патаемная сцежка, па якой я бегала яшчэ да вайны да адной сваёй сяброўкі-аднакласніцы. Адстаўляла дошку ў паркане, пралазіла ў суседні сад, такім жа чынам з таго саду - у Вішнёвы завулак, потым - на Клімаўскую. І сюды на Элеватарную, да ракі.
Але прыехаў Грот. Ён часам прыходзіў пехатой, пакідаючы машыну ў шпіталі. Часам прыязджаў, і машына начавала ў двары. У той вечар, як на злосць, ён доўга корпаўся ў ёй, нешта рамантаваў, мыў.
Шыковіч заўважыў, што, забываючыся, Зося пачынае расказваць для аднаго Антона Кузьміча. На яго аднаго глядзіць, да яго аднаго звяртаецца, але так, быццам ён той адзіны сведка, які можа пацвердзіць праўдзівасць яе слоў.
Схамянуўшыся, яна вінавата ўсміхнецца ўсім ім і пэўны час расказвае яму, Шыковічу, з нейкай дзіўнай насцярожанасцю сочачы, як ён запісвае: то піша доўга, нібы стэнаграфуе, то ўзмахам пяра ставіць нейкі іерогліф, толькі яму зразумелы.
Маша скінула чаравікі і босая, на насочках, выйшла на кухню, відаць, паставіла чайнік. А потым стала ў калідорчыку і слухала адтуль. Шыковіч умеў і ўважліва слухаць і ўсё прыкмячаць навокал. Ён знакам запрасіў Машу зайсці і сесці. Тая адказала яму таксама жэстамі. Гэтая іх незразумелая нямая размова збянтэжыла Зосю. Яна змоўкла. Шыковіч крутануўся ў крэсле, як гарэза-школьнік, злоўлены настаўнікам:

- Прабачце, Соф'я Сцяпанаўна, я ўвесь - увага.
Але яна ўжо свядома звярнулася да Яраша з усмешкай, якую дораць выпрабаванаму сябру:
- Вы ведаеце, Антон Кузьміч, мяне зноў выручылі трусікі пана Грота. Помніце? Я засунула аднаго за ватнік і палезла ў суседскі сад. Абышла паўз паркан і знайшла дошку, якую можна было адсунуць без шуму. Выйшла гаспадыня, не тая, якая жыла да вайны, жонка нейкага белагвардзейца-эмігранта, які вярнуўся з Германіі і займаўся камерцыяй. Я растлумачыла ёй, што ўцёк трусік. «Я баялася, каб ён не папсаваў вашы дрэвы». Старая дурніца пацалавала трусіка, якога я паказала ёй.
«Якая мілая мордачка!»
Гроту я таксама сказала, вярнуўшыся ў свой двор, што ўцёк трус.
Ён узяў яго спрытна і бязлітасна, мяне заўсёды і палохала і абурала, як ён браў гэтых няшчасных жывёлінак. Вось так, двума пальцамі, за скуру.
«О, ты хочаш уцячы? - сказаў ён трусу. - Заўтра я цябе пакараю за гэта. Мне шкада цябе. Але чаго не зробіш у імя навукі».
Як толькі сцямнела і Грот падняўся да сябе, бацька сказаў:
«Выводзь, дачка. Шчасліва вам. На Клімаўскай сустрэне Вася. Калі ж не сустрэне...»
Ён даў адрас на Элеватарнай, нумара ўжо не помню, здаецца, дзевятнаццаць, мне пасля прыйшлося запамінаць многа розных нумароў, і нейкі мудры пароль, які я таксама забылася, нейкая прымаўка з рэлігійным сэнсам, здаецца.
Яшчэ бацька сказаў: «Назад, дачка, гэтым шляхам не вяртайся. Выходзь на Пушкінскую. У цябе ёсць пропуск. І зайдзі да Цішчанкаў. Старая занемагла і вельмі прасіла, каб ты зайшла. Зайдзі абавязкова. Так трэба».
Бургамістарша сама мне званіла дні тры назад. Але мне было агідна ісці да гэтай звар'яцелай ад страху бабы, якая дзень і ноч малілася. Але калі бацька сказаў, што так трэба - для канспірацыі, так мне здалося тады, я гатова была пайсці хоць да самога д'ябла. Толькі пазней... вельмі позна я здагадалася, што мой добры, разумны і наіўны тата хацеў такім чынам ураТаваць сваё адзінае дзіця...
Увесь час яна расказвала роўна, ціха, без інтанацый, без асаблівых жэстаў і мімікі, калі не лічыць вінаватых усмешак. А тут вусны яе па-дзіцячы скрывіліся і задрыжалі.
- Два нашы афіцэры, якія дапытвалі мяне ў сорак шостым, здзекаваліся, калі я шчыра расказала ім усё. Смяяліся, маргалі адзін аднаму. «Сіла дзеўка! Значыцца, правёўшы падпольшчыка, вы адразу ж пайшлі суцяшаць жонку гарадскога галавы? Хітрая казачка, але пакіньце яе для дурняў. Мы чулі казкі не такія!»
Няшчасны мой бацька! А я... дурная якая была! Паверыла яму нават тады, калі ён пазваніў на кватэру Цішчанкам, пагаварыў спачатку з Алімпіядай Паўлаўнай, а пасля папрасіў, каб я паначавала там. «У горадзе неспакойна. Недалёка ад нашага дома толькі што стралялі. Заначуй, дзіця маё. Цалую цябе, Зосечка».
Гэта былі яго апошнія словы. Ён не любіў залішніх пяшчот, сюсюкання, цалавання па тэлефоне. А тут вось так - як маленькай. І я, дурная, усё адно ні пра што не здагадалася. Я магла быць побач з ім! Магчыма, ён адстрэльваўся, калі яны ўварваліся. І апошнюю кулю... Тата хаваў пісталет, хаваў нават ад мяне, але я ведала, што ён ёсць. Слухайце, можа, яго застрэліў Грот? Немца не было на пахаванні. Усе знаёмыя былі. З гестапа былі, адусюль. Аднаго яго не было.
- А што Сажань, Соф'я Сцяпанаўна? Правялі вы яго? - спытаў Шыковіч, каб вярнуць яе да паслядоўнасці.
- А як жа! Мы выйшлі на Вішнёвы. Цёмна было. Ні агеньчыка. Замаскіравана ўсё. Я пачула, што за намі нехта ідзе. Мы пабеглі. На Клімаўскай нас сустрэў Вася. З'явіўся як з-пад зямлі. Я сказала яму, што нехта ідзе. Ён адказаў, што гэта свае. З-пад полы бліснуў ліхтарыкам у адзін бок вуліцы, потым у другі. Яму адказалі адтуль і адтуль. Вунь яны як ахоўвалі таго чалавека! Вася сказаў: «Ты, Зоська, герой!» - і пацалаваў мяне ў шчаку. Мне стала сорамна: яшчэ Сажань падумае што! А я таго Васю, можа, якіх пяць разоў бачыла ўсяго. Мне тады - зноў! - вельмі захацелася, каб на развітанне ён падзякаваў мне. Смешна! Ён не сказаў звычайнага дзякуй. Ён сціснуў маю руку і сказаў:
«Усяго добрага табе, Зося. Скончыцца вайна - сустрэнемся».
Разбудзіла мяне бургамістарша рыданнем. Упала на калені перад маім ложкам:
«Мужайся, дзетачка. Бог міласэрны, ён усё бачыць. Партызаны забілі твайго бацьку».

Я не закрычала. Здаецца, нават не заплакала. У адзін міг я ўсё зразумела. У той міг я пасталела, можа, на дваццаць гадоў. Шаптала сабе: мужнасць, толькі мужнасць. Прасіла Бога, у якога не верыла, каб ён даў мне яе, гэтую мужнасць, каб я здолела ўсё перажыць. І маўчаць. Маўчаць, маўчаць!
Ашалелая ад жаху баба ўгаворвала мяне ў тую ж хвіліну ўцячы з ёй на край свету, у манастыр, яна ведае такі манастыр. «А то яны ўсіх нас заб'юць». Я маўчала.
Два агенты гестапа везлі мяне на рамізніку па горадзе. Выказвалі спачуванне. Я маўчала. Дадому мяне не павезлі. Бацька ляжаў ужо ў вестыбюлі гарадской управы. Калі толькі яны паспелі перавезці і ўбраць яго? Ён ляжаў у сваім вячэрнім гарнітуры, у сарочцы, якую я за дзень да таго памыла. Толькі гальштук чужы, бабачка, тата ніколі не насіў бабачкі. Да вайны гэта было нямодна, і мама, напэўна, першая пасмяялася б. На твары яго застыў спакой, не было ні пячаці страху, ні пячаці пакут. Відаць, ён памёр адразу. Толькі чамусьці пасінела левая скроня. Я спытала ў начальніка паліцыі Магнатава, куды трапіла куля. Ён паціснуў плячамі.
«У сэрца. У самае сэрца, - адказаў адзін з тых, што не адыходзілі ад мяне ні на крок. - Бандыты стралялі ва ўпор».
Да мяне падыходзіла ўся здрадніцкая сволач, выказвала спачуванне. Раней яны здаваліся мне смешнымі і дурнымі, гэтыя людзі. У той дзень я адчула, што такое нянавісць. О, як я іх ненавідзела! Мне хацелася пляваць на іх, біць па мордах. Але я маўчала. Я мусіла маўчаць.
Калі з'явіўся фельдкамендант, пстрыкалі фотаапараты. Ён не падышоў да мяне. Спачуванне паднёс перакладчык. Мне запомніўся позірк афіцэра-гестапаўца. Ён доўга сачыў за мной, і я адчула гэты позірк. Глянула на яго. Якія ў яго былі вочы! Ён усё ведаў і смяяўся, злосна, нахабна, пераможна. Вочы яго смяяліся.
Скажыце, навошта ім спатрэбілася гэтая камедыя з пахаваннем?
Зося змоўкла і чакала адказу ад Шыковіча: на яго глядзела. Адказаў Яраш:
- Правакацыі былі розныя. У залежнасці ад фантазіі таго, хто іх арганізоўваў. Бругер быў з фантазіяй, я ведаю.
- У маі сорак трэцяга Бругера ўжо не было, - удакладніў Шыковіч. - Начальнікам гестапа быў Гільберт, штурмбанфюрэр.
- Вы таксама былі ў падполлі? - здзівілася Зося.
- Не. Я пішу кнігу, а таму мне трэба дакладна ўсё ведаць.
Маша, выкарыстаўшы паўзу, прапанавала:
- Я вам падам каву.
- Але, але, - падтрымала Зося.
- Стамілася? - ласкава спытаў Яраш. - Дай руку.
Можа, ад таго, што ён нечакана сказаў ёй «ты», яна зардзелася, засаромелася.
- Не, не.
Антон Кузьміч падняўся з крэсла, палічыў пульс. Шыковіч убачыў, што доктар застаўся задаволены яе пульсам. А Зося, як бы імкнучыся даказаць, што ёй гэта няцяжка, пачала расказваць далей, не зважаючы на тое, што Маша хадзіла, звінела шклянкамі.
- Я думала, што мне будзе ўсё адно - як пахаваюць. Хто пахавае, што будуць гаварыць... Я ведала, што гэтым не скончыцца. І рыхтавалася, збірала сваю мужнасць. Але калі бацьку неслі на могілкі, я ўбачыла, як глядзяць людзі... рабочыя. «Туды яму і дарога!» - вось як яны глядзелі. Мне зрабілася балюча. Страшэнна балюча. І крыўдна. І страх апанаваў. Сэрцам я прадчула тое, што пасля здарылася. На могілках я страціла прытомнасць.
Дні тры ляжала ў Цішчанкаў, знясіленая, прастуджаная, разбітая. З кватэры не выходзілі тыя двое - «апекуны» мае. Яны, Цішчанка, уся зграя дамагаліся, каб я падпісала пісьмо ў рэдакцыю, у якім гнеўна кляйміла, як бандытаў, партызан, што забілі майго бацьку, невіноўнага чалавека, лекара, які займаўся толькі тым, што пазбаўляў людзей ад цяжкіх хвароб. «Чаму вы не хочаце падпісаць, панна Зося?» - здзіўляліся яны.
«Яны заб'юць мяне».
«Мы вас схаваем у такім месцы, куды не дабярэцца ніводзін бандыт. Не бойцеся».
А Цішчанчыха шаптала: «Не падпісвай. Заб'юць», - і ўсё ўгаворвала ўцячы разам з ёй у манастыр. Дурная, яна не бачыла, як мяне ахоўвалі.

Яны перавялі мяне ў іх, нямецкі, гатэль. Памясцілі з нейкай немкай. Па-расейску яна гаварыла дрэнна, але «апрацоўвала» мяне моцна. Нават пільнавала ўначы - што я кажу ў сне? Пасля нават адпусцілі дадому. Яны былі яшчэ ветлівыя: «Не будзеце баяцца адна?»
«Не буду».
Спадзяваліся, што да мяне нехта прыйдзе. Можа, паспрабуе вывезці ў лес. У іх нямала было клопату - сцерагчы мяне. Але ніхто не прыходзіў, і хутка ім абрыдла гэта. Тыя ж два «апекуны» адвезлі мяне ў гестапа. Спачатку допыт, колькі дзён пра адно і тое ж: хто прыходзіў да бацькі, з кім ён сустракаўся, як ён жыў і гэтак далей. На другі дзень тое ж самае ў іншым парадку - каб заблытаць. Потым вочныя стаўкі. Каго я пазнаю з гэтых людзей. Прыводзілі чалавек пятнаццаць. Я пазнала толькі адну жанчыну, сястру з дзіцячай бальніцы. Але яна глянула на мяне вельмі варожа, і я не прызналася, што ведаю яе. Калі прывялі Васю, я не магла адмаўляць наша знаёмства. Сказала, што гэта шафёр бальнічнай машыны. Вася, збіты, сіні ўвесь, прыветліва кіўнуў галавой: ён ухваліў маё прызнанне.
«Ён часта прыязджаў да вас?» - спытаў следчы.
«Не вельмі часта», - адказала я.
«Чаму ў той дзень, перад забойствам, ён прыязджаў тройчы?»
«Прывозіў бацьку. Потым бульбу. Мяшок».
«А яшчэ каго?»
«Тры мяшкі партызан», - засмяяўся Вася.
Гестапавец ударыў яго па твары. Я заплакала. Вася крыкнуў:
«Нічога, Зоська! Не гаруй. Мы яшчэ патанцуем на тваім вяселлі!»
Я пачала пратэставаць. Чаму мяне трымаюць у гестапа? Завошта? Гэта бесчалавечна! Такое гора, а мяне дапытваюць, як злачынцу. Я буду скардзіцца!
Тады з'явіўся той афіцэр, што глядзеў так на пахаванні.
«Яна не ведае, чаму яе трымаюць тут? Няшчасная дзяўчынка!» - здзекліва кінуў ён па-нямецку. Потым сеў за стол, палажыў перад сабой пісталет. Злосна сказаў цераз перакладчыка: «Даволі гэтай дурацкай камедыі. Ты добра ведаеш, чаму цябе трымаюць. Твой бацька быў звязаны з партызанамі. Ты памагала яму. У вас хаваўся камісар. Мы злавілі яго. Ён ва ўсім прызнаўся».
«Хто ж забіў майго бацьку?»
Ён падскочыў:
«Шкадую, што гэта зрабіў не я!»
«А хто?»
«Яна што, вырашыла дапытваць мяне?» - спытаў афіцэр у перакладчыка. Я сказала па-нямецку:
«Я хачу знаць, хто забойца майго бацькі. А камісара вы выдумалі. Калі Грот, хірург шпіталя, і ёсць той камісар, тады так, ён хаваўся ў нас».
Ён наблізіўся да мяне, доўга і пранікліва глядзеў у твар, у вочы. Потым расцёр у мяне на шчацэ запаленую цыгарэту. Працадзіў праз зубы:
«Ах, з якой асалодай я распяў бы цябе, сучка, на крыжы. Але сёння мне не да цябе. Табой я займуся пасля. Падумай над сваім лёсам», - і двойчы моцна ўдарыў па твары.
На шчасце маё ці на няшчасце, гэты больш мной не займаўся. Дапытваў другі афіцэр. Я ўсё адмаўляла. Білі. Не, не моцна. Адзін раз толькі драўлянымі абцугамі ціснулі пальцы. Гэта балюча. Пальцы і цяпер баляць.
Зося падняла левую руку, паварушыла пальцамі.
- Што ж вы не сказалі мне? - дакорліва паківаў галавой Яраш.
- Яны баляць, калі ўспомню. А так нічога. У лагерах таксама білі. Бізунамі. Гумавымі палкамі. Мяне нядоўга трымалі ў турме. Тыдні два. А потым лагер пад Баранавічамі. Потым Майданак... Пасля... Я ўжо нават не помню іх, усіх лагераў, у якіх была. Мяне чамусьці часта пераводзілі. Апошні - жаночы лагер пад Гісенам. Нас вызвалілі амерыканцы...
Вельмі можа быць, што яна ўсё-такі стамілася, а таму спяшалася як можна хутчэй скончыць свой расказ. Маша гэта адчула першая і шумна пляснула ў далоні, як бы ставячы кропку:
- Таварышы, астывае кава.

**24**

Завод абавязаўся выканаць дзесяцімесячны план да адкрыцця з'езда. Цэхі, змены, брыгады неслі перадз'ездаўскую вахту. Знешне як бы нічога не змянілася. Хіба толькі абнавіліся лозунгі і заклікі. І больш іх стала ўсюды - на прахадной, у заводскім двары, у цэхах, у сталоўцы, у

канторы. Але нават Славік з яго двухмесячным стажам адчуў новы рытм у рабоце. Менавіта рытм, бо раней нямала было і аўралаў. Добрыя і шчырыя працаўнікі мусілі часам прастойваць праз тое, што недзе нехта нешта недарабляў - ці забеспячэнцы, ці транспартнікі, канструктары, ці ліцейшчыкі, механікі, ці планавікі. Зборшчыкам, якія, па сутнасці, завяршалі працэс вырабу станка, гэтае «нешта недзе» больш, чым каму, давалася ў знакі. Славік неаднойчы ўжо чуў, як хлопцы з яго брыгады скланялі механікаў. А тыя ў сваю чаргу валілі віну на каго-небудзь другога. Але вось ужо колькі дзён усё ідзе як па масле. Без запіначкі. Хлопцы працавалі з вясёлым уздымам. Гэты ўздым захапіў і Славіка. Яго менш вучылі, больш даручалі работу, якую ён мог ужо выконваць самастойна. Гэта яму падабалася, і ён рабіў даволі старанна. Работа зборшчыка такіх унікальных, несерыйных станкоў тым і цікавая, што яна рэдка паўтараецца, што кожны дзень і кожную гадзіну прыходзіцца рабіць нешта новае.
Славік заўсёды ставіўся скептычна да розных лозунгаў і заклікаў. А цяпер хадзіў і ўважліва перачытваў цытаты з праекта Праграмы, як бы хочучы знайсці тыя словы, якія прымусілі ўсіх, ад вахцёра да Галыгі, вось так працаваць - па-новаму. Нават у сталоўцы сталі лепш карміць. Славік неяк сказаў у часе абеду сваім хлопцам:
- Архімеды, растлумачце мне, чаму ў вас не могуць увесь час вось так працаваць - роўна, рытмічна, каб не псаваць людзям нерваў.
- Пачынае думаць хлопчык, - кінуў Косця, калі Славік, выслухаўшы супярэчлівыя адказы, пайшоў у буфет купляць папяросы.
- Толькі ўсё ў яго вось так, - Ходас дастаў правай рукой, цераз галаву, сваё левае вуха.
Генрых далікатна, двума пальцамі, паправіў пазалочаныя акуляры. Хмыкнуў:
- Але ж і артадокс ты, Іван. Быць табе прафсаюзным лідэрам, бо ад усяго складанага ты ўмееш адмахнуцца.
А Славік задаў пытанне, на якое не так проста адказаць.
- Адзін дурань можа спытаць такое, што не адкажуць сто разумных.
- Але няхай яны паварушаць мазгамі, разумныя, - нечакана і чамусьці злосна сказаў Тарас. - А то ў нас, сапраўды, некаторыя толькі перад святамі запускаюць вось гэтую «кібернетычную машыну», - ён пастукаў пальцам па лбе, - на поўны ход.
Ходас не адразу зразумеў, каго падтрымлівае брыгадзір. А Генрых пускаў з акуляраў вясёлых зайчыкаў на твары сяброў.
- Прычын арытмічнай работы завода - адна тысяча дзвесце сорак чатыры і шэсць дзесятых. Каб мы з табой, Іван, іх выявілі, раскрылі і апісалі, нам можна было б прысвойваць дактароў навук.
- У тым і бяда, што мы іх не выяўляем, - сказаў Тарас ужо лагодна, без злосці.
- А давайце зробім пачатак! - Косця любіў выказваць самыя нечаканыя прапановы і сам жартаваў з гэтага: «З сотні хоць адна ды будзе разумная». - А каб не выяўляць усіх тысячы двухсот Генрыхавых прычын, выявім адну: чаму цяпер усё пайшло нармальна?
- Вахта, - каратка і вычарпальна растлумачыў Васіль Лапацін, вымакваючы хлебам рэшткі соўсу на талерцы.
- А Косця мае зерне...
- Адно? Я маю мяшок.
- Не блазнуй.
- Ён у Славіка вучыцца.
- Я ў тым сэнсе, - Тарас звяртаўся да Генрыха, ён быў іх «галоўны тэарэтык», - што прычыны арытмічнай работы, можа, яны і выяўляюцца... А калі работа наладзіцца так, як у нас цяпер, усялякі аналіз канчаецца. Пачынаем славасловіць, раздаваць прэміі...
- Любім «ура» крычаць, - азваўся Славік, пачуўшы апошнія Тарасавы словы. Кінуў на стол пачак папярос. - «У нас не паляць», - прачытаў шыльдачку на сцяне і чыркнуў запалку.
- «Ура» вядзе на штурм, - сказаў Лапацін, адстаўляючы нарэшце талерку. - Не, Вера смачней гатуе.
- Таму, відаць, і крычым, што часта прыходзіцца штурмаваць, - засмяяўся Генрых.
- Вера гатуе смачней? - усумніўся Косця, гарэзліва падміргнуўшы Генрыху. Той прыняў «эстафету», сказаў сур'ёзна, амаль трагічным голасам, звяртаючыся да Тараса:
- Няшчасная. Я ёй не зайздрошчу.
Лапацін, які не адчуваў гумару гэтак жа тонка, здзівіўся:
- Каму? Веры? Чаму?

- Паспрабуй нагатаваць на такога абжору, - бліснуў зубамі Косця.
- Ну і пустабрэхі!
- Трэба будзе пагаварыць на парткоме...
Славіку падабалася, што ў брыгадзе ўмеюць і пажартаваць і пагаварыць сур'ёзна, глыбока, і пераходы гэтыя ад жарту да сур'ёзнага і наадварот заўсёды нечаканыя, раптоўныя.
Увогуле яму ўсё больш і больш падабаліся хлопцы. Нават з Ходасам стала менш сутычак. Вось толькі з Тарасам...
...На другі дзень пасля «дуэлі» ён не пайшоў на работу. З такім вокам сорамна было на вуліцу высунуцца, не толькі на завод. Усю раніцу сварыўся з Ірай, якая даволі-такі злосна кпіла з яго «ліхтара», не верачы, што ён зваліўся з матацыкла. Пайшла Іра ў інстытут - шукаў, куды маці схавала каньяк. Перавярнуў усю кватэру. У шуфлядзе Ірынага стала, пад старымі канспектамі знайшоў яе дзённік. З цікавасцю чытаў. Дзяўчына пісала пра сваё каханне, пра сваё жаданне адкрыцца яму і пра сваю боязь і сарамлівасць зрабіць гэта першай. Славік доўга не мог уцяміць, хто «Ён». Займеннікі, што замянялі яго імя, Іра пісала з вялікай літары.
«Звяртаецца, як да Бога», - смяяўся Славік, паціраючы рукі і калені ад зларадднасці. Вось цяпер ён жыцця не дасць сваёй дарагой сястрыцы. Не, ён прымусіць яе служыць, як вернага сабачку, калі яна не хоча, каб ён выдаў яе тайну. Каб толькі яшчэ расшыфраваць яго імя!
Нарэшце ён дайшоў да апісання таго дня, калі ўся брыгада і Маша абедалі на дачы. Іра больш не хавала яго імя.
Адкрыццё ашаламіла Славіка. Знікла жаданне помсціць сястры, кпіць з яе. Наадварот, стала шкада дзяўчыну. Уразіла Ірыніна празорлівасць: «Я адразу адчула ў гэтай рудой саперніцу. Маё няшчаснае каханне! Ты яшчэ не засвяцілася для Яго і для ўсіх, а на цябе ўжо насоўваецца хмара». Не, ён, Славік, адпомсціць яму - за сябе, за сястру!
Але прачытаўшы, ужо без асаблівай цікавасці, яшчэ пару старонак дзённіка, ён разважаў інакш.
А можа, лепш зрабіць так, каб Ірына адкрылася яму? Памагчы ёй. Тады можа здарыцца, што ён адмовіцца ад Машы.
Славік лаяў сястру:
«Авечка! Да дваццаці двух год дажыла, інстытут канчае, а паводзіць сябе, як сямікласніца. Уздыхае, дзённічак піша!.. Дурніца!»
Узлаваўшыся, шыбануў тоўсты сшытак на ложак. Але праз хвіліну з пэўнай павагай палажыў дзённік назад у шуфляду.
«Усё пераблыталася. Сам чорт нагу зломіць. А «стары конь» скардзіцца, што няма цікавых сюжэтаў. Залез у нейкія архівы і ні храна не бачыць вакол сябе. А тут такія трыкутнічкі будуюцца! Пра любоў трэба пісаць, стары, калі хочаш, каб цябе чыталі», - глыбакадумна параіў бацьку. Дакараў маці: «А гэтая маралістка, як гусыня, толькі асцерагае: каб лішняе з'елі дзеткі і лішняе не выпілі. Жратвы поўны халадзільнік, а каб хоць на кампрэс дзе стаяла - дык не. Куды яна дзявала каньяк? Няўжо выліла? Бутэлькі няма», - злаваўся ён, не перастаючы шукаць.
Урэшце Славік зразумеў, што ўсё гэта - пошукі каньяку (выпіваць яму зусім не хацелася), развагі пра бацьку і маці, пра Ірына каханне - не што іншае, як безнадзейная спроба адвесці думкі ад галоўнага: што робіцца ў брыгадзе? Не прызнаючыся сам сабе, ён пакутаваў ад думкі, што Тарас усё раскажа і абураныя хлопцы выганяць яго. Са здзіўленнем ён упершыню адчуў, што яму шкада пакідаць брыгаду. Куды ён пойдзе ад іх?
Калі пад вечар да яго заглянулі Косця і Генрых, Славік спалохаўся: што яны хочуць? Што прынеслі? А калі хлопцы шчыра, па-сяброўску прывіталіся і Генрых сказаў:
- Ну як? Косці цэлыя? Чорт вас нёс на гэтым матацыкле. Маглі насмерць разбіцца.
Славік траха не падскочыў ад радасці. Асабліва яго здзівіла і рассмяшыла, што яны аднолькава хлусяць, ён таксама плёў шафёру, які падвозіў яго да горада, пасля сястры і бацьку, што ўпаў з матацыкла. Тое, што Іра і бацька, прыехаўшы з дачы, нічога не ведаюць, супакоіла яго яшчэ раніцай. Значыцца, Тарас расказаў адной маці. Ну, маці можна, у яе даволі педагагічнай тактоўнасці.
Даведаўшыся, як растлумачыў свае сінякі Тарас, Славік адчуў да яго павагу і падумаў: «Гэта па-мужчынску!» Каб ён ведаў, што гісторыю з матацыклам выдумалі калектыўна, брыгадай... Спачатку Тарас растлумачыў хлопцам пра свой сіняк проста:
- Ударыў адзін п'яны дурань.

Але ўсё расказаў Косцю. Была ў гэтага смяшлівага рамантыка дзівосная прыцягальная сіла: усе яму давяралі свае самыя таемныя сакрэты і думкі. Косця сказаў, што сітуацыя даволі сур'ёзная, а таму варта яе абмеркаваць у брыгадзе. Пасля змены ў тым жа пакоі інтэрната за зачыненымі дзвярамі ішла гарачая размова.
Ходас даказваў, што Славіка трэба гнаць прэч, пакуль ён не зганьбіў брыгады.
Генрыху гісторыя з «дуэллю» здавалася надзвычай вясёлай. Ён жартаваў:
- Ты ведаеш, я ўвесь час мару, каб хто-небудзь другі закахаўся ў Зою. Выклікаў бы саперніка на дуэль... Паказаў бы сваё рыцарства.
Вася прызнаўся, што ён таксама «заехаў аднаму па мордзе», калі той пачаў занадта завіхацца каля Веры.
- Жах, жах! - хапаўся за вушы Косця. - Выходзіць, усе вы з радзімымі плямамі праклятага капіталізму. Івана салам не кармі, дай залезці на высокую трыбуну. Славалюбства! Васіль баіцца ўласнай жонкі. Баязлівасць! Брыгадзір наш, замест таго каб правесці выхаваўчую работу, выбівае вучню сківіцу... Адзін я...
- Балбатун ты!.. Самая шкодная загана! Ты любую справу ўтопіш у словах. Кажы сваю прапанову.
- Статус-кво. Усе застаюцца, як у Берліне да заключэння мірнага дагавору. Вы ўпалі з таго матацыкла, на якім я ўчора ездзіў да бацькоў.
Усіх рассмяшыла Косцева прапанова. З ёй пагадзіліся. Паспрачаліся аб другім.
Лапацін прапанаваў, каб Тарас аб'явіў Машы байкот: няхай не водзіць адразу двух. Тарас пачырванеў, разгубіўся. Косця сказаў, што такія пытанні нельга вырашаць калектыўна.
- Дамаўляліся, што ў нас не будзе тайны адзін ад аднаго, - сказаў прасталінейны Ходас.
- Я не раблю тайны з таго, што Маша падабаецца мне, - адказаў Тарас. - Але...
- Але, - падхапіў Косця, - гэта не значыць, што ён павінен дакладваць нам, пра што гаварыў з дзяўчынай. Так можна дайсці да таго, што патрабаваць у Васіля справаздачы, пра што ён шаптаўся ўначы з жонкай. Гэта будзе ўжо не дружба, а гвалт, прымус... Можна ўзненавідзець адзін аднаго!
- Тады як зразумець, што Шыковіч працуе ў брыгадзе, а жыве, як воўк? І ўчынкі воўчыя. А мы гуляем у хованкі. Я супраць любога індывідуалізму! - Ходас ніколі не ўмеў так ясна аргументаваць свае думкі, як гэта рабіў Косця, гаварыў траха не лозунгамі і ў сваёй упартасці часта быў непаслядоўны.
- Нікога нельга абавязаць быць шчырым і адкрытым, - падсумаваў Тарас. - Славік павінен паверыць у нашу шчырасць.
Ён сказаў гэта і спалохаўся: а як яму, брыгадзіру, праявіць сваю шчырасць пасля таго, што здарылася?
Славік таксама ішоў на працу са страхам: як яны сустрэнуцца? Не, нічога. Працягнулі рукі адзін аднаму, усміхнуліся. Знешне як быццам нічога не змянілася. Знешне...
А што рабілася ў кожнага ў душы?
Тарас стараўся перамагчы сваю непрыязнасць. Але пакутаваў ад рэўнасці. Яму здавалася, што Маша сустракаецца з ім рэдка, неахвотна і сумуе, калі яны ходзяць па асенніх вуліцах. Яму рабілася таксама сумна. Ён падазраваў, што яна не перастае сустракацца са Славікам, хоць яна запэўнівала, што пасля таго ні разу не бачыла маладога Шыковіча. Але Тарасу ўспаміналася, як весела і легкадумна яна смяялася, калі ён расказваў ёй, што ў іх адбылося. Безумоўна, ёй падабаецца вось такі вясёлы, бесклапотны рызыкант і пазёр. То няхай бы сказала! Тарасу да болю было крыўдна: чаму яна, якая здалася яму такой разумнай, не хоча быць з ім да канца шчырай? Калі ў яе сэрцы няма кахання, ён згодзен застацца добрым сябрам. Абы была шчырасць.
А Маша не хлусіла.
Славік званіў ёй, дамагаўся спаткання. Яна са смехам адказала, што баіцца яго: «Яшчэ застрэліш».
Рэўнасць яго патухла разам з «ліхтаром» пад вокам. Але такі яе адказ моцна закрануў самалюбства.
«Ага, сабака, расказаў! Чакай жа!» - зноў узлаваўся ён на Тараса. Не верыў яго добразычлівасці. Ставіўся з падазронасцю. Чапляўся без усялякай прычыны.
- Ты чаму глядзіш на мяне так? - спытаў ён аднойчы ў Тараса, калі яны выпадкова апынуліся ў цесным праходзе паміж станкамі-волатамі. Вось тут бы ім і пагутарыць па шчырасці. Дык не - у кожнага гонар.

- А як я гляджу на цябе?
- Як? Як воўк на авечку. З такім замілаваннем.
- Хачу з'есці.
- Паломіш зубы.
- Дурны ты, Слава.
- Ты вельмі разумны.
Над іх галовамі з грукатам прайшоў кран. Славік падскочыў, схапіўся за крук і ўскочыў на станок. Ніна спыніла кран, высунулася з будкі, махала кулаком. Славік пасылаў ёй паветраныя пацалункі. За такую хлапчуковую выхадку трэба добра прабраць. А ён, брыгадзір, не можа. Не можа сварыцца, каб не ўскладняць адносіны. Тарас упершыню падумаў, што, відаць, Ходас мае рацыю: такога не перавыхаваеш. Можа, усё было б добра, каб не яна, Маша. Стала яна паміж імі.
Нінка спусцілася са сваёй будкі, закрычала на ўвесь цэх:
- Калі вы камуністычная брыгада, дык і паводзьце сябе па-камуністычнаму. Я праз дурняў у турму не хачу садзіцца.
На гэты раз Косця і Генрых, якія добраахвотна шэфствавалі над Славікам, добра-такі намылілі карак яму.
А на другі дзень Славік запрасіў Нінку ў кіно. Яна доўга вагалася. Але яе ніхто яшчэ з хлопцаў ніколі не запрашаў. І яна не ўтрымалася ад такой спакусы. Хіба мала пішацца ў кніжках, паказваецца ў кіно, што любоў пачынаецца са сваркі?
**25**
Канец верасня выдаўся надзіва цёплы. Здавалася, вярнулася лета, сапраўднае, не бабіна. Зацвіталі вішні. У лесе быў небывалы ўраджай грыбоў. Гараджане хлынулі ў лясы. Перапаўняліся аўтобусы, рабочыя цягнікі. Пачалася проста-такі грыбная ліхаманка - хто збярэ больш і лепшыя. Але калі многія выязджалі толькі таму, што было чым пажывіцца, то такому старому палымянаму грыбніку, як Яраш, гэта прыносіла сапраўдную асалоду, шчасце, лепшы адпачынак. Выкарыстоўваючы Шыковічаву машыну, ён выязджаў у лес двойчы на дзень: на досвітку, да работы, і адвячоркам, пасля работы. Звычайна стрыманы ва ўсім, што датычылася яго асабіста, тут ён з хлапчуковай радасцю хваліўся ў бальніцы персаналу і нават хворым сваімі грыбнымі зборамі. У яго пыталіся ў калідоры, як толькі ён з'яўляўся акуратна без дзесяці дзевяць, свежы, памаладзелы, прапахлы хвояй і грыбамі:
- Колькі сёння, Антон Кузьміч?
- Сто дваццаць тры! Ды каб вы пабачылі якія! - І пачынаў распісваць, як сядзела сям'я грыбоў - дваццаць сем штук! - вакол аднаго маладога дубка. Небывалая з'ява! Варта напісаць у «Огонек». І тут жа лаяў браканьераў, якія вырываюць грыб з коранем. Напісаў нават у газету: «Як трэба збіраць грыбы». Лаяў газету, якая выкінула з яго допісу расказ аб нараджэнні і жыцці грыба і пакінула адны голыя парады. Траха не біўся з Шыковічам, які сядзеў на дачы і цэлымі днямі пісаў. Навокал дома, пад самым ганкам, растуць грыбы, а не выцягнеш яго - не выйдзе. Пакуль выканае норму, якую сам сабе ўстанавіў, зварыць абед, глядзі - і вечар.
- Галава дубовая! Куды ты спяшаешся? Хто цябе гоніць у шыю? Хопіць у цябе часу. А грыбы - адзін тыдзень, і не будзе іх. Які ты да д'ябла пісьменнік, калі не адчуваеш такога хараства?
- О, ты не ведаеш, які я грыбнік! Але мне здорава працуецца ў гэтыя дні. Пахаладае - зноў будзе крызіс, ведаю. Прыходзіцца выбіраць. - І, пахадзіўшы з сябрам гадзінку, Кірыла кідаўся да рабочага стала.
Аднойчы, калі Яраш у перадаперацыйнай расказваў пра сваю чарговую грыбную ўдачу, Маша нясмела папрасіла:
- Антон Кузьміч, вазьміце нас з Зосяй як-небудзь.
Узяць Зосю?
Цудоўная думка! Ён жа думаў пра гэта сам, раней: трэба паназіраць, як паводзіць сябе адрамантаванае сэрца ў розных умовах. Да таго ж Зося, напэўна, даўно не бачыла лесу. Чаму не даць ёй гэтую маленькую радасць? У жыцці ў яе так мала было радасці.
Але тут жа мільганула думка пра жонку: даведаецца - зноў будуць непрыемнасці. Узяць і яе з сабой? З-за гордасці не паедзе, а ўсё адно будзе хвалявацца, перажываць, падазраваць. Не, лепш няхай не ведае. Яму стала сорамна ад сваіх ваганняў, і ён сказаў Машы:
- Ну, што ж. Давайце паедзем. Сёння ж.

Зося села побач з Антонам Кузьмічом на пярэднім сядзенні. У новай сукенцы, якую ёй пашыла Маша, у шарсцяным світэры гарчычнага колеру, са сваёй адмысловай двух'яруснай прычоскай (таксама Машына фантазія), яна мела даволі прывабны выгляд. А Маша зусім выглядала элегантна: вузкія штаны, клятчастая куртка.
Едучы па горадзе, Яраш падумаў з невясёлай іроніяй:
«Не дай божа ўбачыць Галіна - загінуў ты, Антон».
Зося сустрэла прапанову аб паездцы з ціхім, але прыкметна радасным энтузіязмам. А пры выездзе з горада яе пачало ліхаманіць ад хвалявання. Не, гэта быў не страх! Нешта іншае. Імчала машына. Свістаў вецер. І ёй здавалася, што яна вось-вось узнімецца і паляціць... Паляціць у дзівосны край, дзе здарыцца нешта незвычайнае, што яшчэ раз зменіць яе жыццё. Але ёй было хораша, лёгка, і яна не хацела больш ніякіх змен.
Ад гэтага ці яшчэ ад чагосьці яе апанавала хваляванне. Дробна задрыжалі плечы. Яна сцялася, уціснулася ў сядзенне.
- Зося, табе холадна? - спытала Маша, якая сядзела за яе спіной. - На маю куртку.
- Не, не. Нічога. Гэта так.
- Зачынім шкло, - сказаў Яраш, круцячы ручку. - Прастудзіцца вам нельга ні ў якім разе.
- Мне не холадна. Я проста хвалююся.
- Чаму?
- Не ведаю.
Што ж, урэшце не так ужо цяжка зразумець душэўны стан чалавека, які вярнуўся да жыцця і ўпершыню пасля такой хваробы і аперацыі выязджае за горад, у лес. Яраш пажартаваў:
- Бачыце, ехаць па грыбы таксама трэба мужнасць.
Далёка ў глыбіні бароў яны не паехалі. Прыехалі да іх дачы. Паставілі машыну. Шыковіча не было: відаць, усё-такі выбраўся ў лес.
Маша, у якой з грыбамі звязаны і радасныя і горкія ўспаміны - у першыя пасляваенныя гады грыбамі і за грыбы яна карміла ўсю сям'ю, - адразу ж кінулася ў лес, як у вір. Яна не ўмела шукаць так павольна і разважліва, як Яраш. У кожнага грыбніка свой стыль і метад. Праворная, хуткая, яна шнырыла пад кожным кустом і дрэвам, кружыла, рабіла петлі, хутка траціла ўсялякі кірунак і часта блудзіла.
Яраш не любіў гэтак пятляць. Ён хадзіў амаль проста. Але ў яго было незвычайнае чуццё, дзе ў гэты дзень мог вырасці баравік. Ён ішоў на грыб ці грыбную сям'ю, як на радыёпеленг.
- Заглянем мы вось сюды, пад нашы дубы, - сказаў ён Зосі, як толькі яны адышлі ад дачы ў лес.
Яна зразумела яго словы як запрашэнне хадзіць за ім. Сапраўды, Яраш хацеў, каб яна была побач. Яна ішла крокаў за дзесяць ад яго. Каля самага вогнішча, дзе яны палілі ўсё лета касцёр, на сцежцы пад дубам Яраш убачыў першы баравік. Нявопытны грыбнік ніколі не падумаў бы, што ён мог вырасці ў такім вытаптаным месцы. Баравік быў надзіва прыгожы - як знарок вырашчаны напаказ. На тоўстым белым корані - крамяная, цяжкая на выгляд шляпка; светлая бурштынавасць, што выцякала з-пад нізу, залаціла кромку, паступова цямнела і пераходзіла ў масляністы цёмна-карычневы колер; толькі цераз самую макаўку праходзіла тоненькая пераламаная светлая палоска, мабыць, ляжала галінка.
Яраш спыніўся за два крокі з выглядам чарадзея. Моўчкі, пальцам, паклікаў Зосю. Таямнічым шэптам сказаў:
- Вось ён! Бачыце?
Яна ўгледзела, здзівілася:
- Ах! - і папрасіла, як маленькая: - Дайце я...
- Толькі - чур, падразаць! - папярэдзіў ён.
Яна прысела, асцярожна падрэзала, падняла яго і, любуючыся, засмяялася, ціха і радасна, зусім як дзіця. І Ярашу таксама зрабілася надзвычай хораша ад гэтай яе маленькай радасці.
Ён азірнуўся навокал і адразу ўбачыў другі грыб.
Нахіліўся, падрэзаў.
- А во яшчэ адзін.
Трэці дык быццам сам падскочыў пад руку.
- А во яшчэ...
- Ах! - ужо зайздрасна ахнула Зося. І яшчэ больш узрадавалася, калі нарэшце сама ўгледзела грыб. Падняла яго, паказала:

- Глядзіце які! Як хлопчык.
Сапраўды, баравічок быў маленькі і вясёлы, падобны на таго малога гарэзу, у якога заўсёды кепка ссунута набок.
«Як хлопчык», - гэтыя словы запалі Ярашу ў памяць, і ён падумаў аб тым, што, акрамя ўсяго іншага, гэтая немаладая ўжо жанчына не ведала радасці мацярынства.
«Трэба будзе пазней паказаць яе Левіну і Шувалавай (яго калегі, лепшыя ў горадзе тэрапеўт - спецыяліст па сэрцу - і гінеколаг). Няхай скажуць, можна ёй радзіць?»
Ён падумаў гэта з бацькоўскім клопатам, як пра дарослую дачку. І даў ёй, як малой, як часта даваў Наташы, калі браў яе з сабою ў лес, адной вытаптаць пятачок, на якім нарадзілася грыбная сям'я.
Зося ўзяла яшчэ тры ці чатыры грыбы. Далей Яраш, верны свайму метаду, рушыў проста, затрымліваючыся толькі ў тых мясцінах, дзе нейкая асаблівая інтуіцыя падказвала: тут будуць грыбы. І амаль не памыляўся. Зося ішла збоку за колькі крокаў. Здаралася чамусьці так, што ёй усё часцей і часцей пачалі трапляць грыбы. Бадай, больш, чым яму, Ярашу. Ён пажартаваў:
- Дык вы грыбнічка.
Недзе далёка ззаду гукнула Маша. Яраш пачакаў, што адкажа Зося. Яна не адказвала. Ён адгукнуўся жартаўліва - пісклявым жаночым голасам. Маша, не пазнаўшы, пачала клікаць настойліва:
- Ос-ся-а! То-он... Мі-іч!..
Яраш гукнуў сваім сапраўдным голасам, і дзяўчына змоўкла.
Яны шлі па прачышчаным бары. Месца тут, уздоўж лугу, узгоркавае. Магчыма, некалі, у дагістарычны перыяд, у сто разоў больш магутная рака намыла гэтыя высокія пясчаныя дзюны, на якіх пасля разумныя людзі пасадзілі лес. На грэбнях узгоркаў раслі адны сосны, не дужа старыя, роўныя, высокія, чыстыя - красуні, адна ў адну. Адвячоркавае сонца залаціла іх медныя ствалы. Лёгкі вецер гойдаў гнуткія верхавіны, за якія, здавалася, чапляліся лёгкія хмары, што плылі на ўсход - ад сонца насустрач ночы. На зямлі, укрытай сухой ігліцай, ляжалі дзівосныя карункі святла і ценяў.
А ў нізінах побач з соснамі раслі дубы, зрэдку - бярозы, яны згушчалі лес, і на зямлі ляжаў густы цень. Але пад дубамі часцей трапляліся грыбы. Можа, на нейкі час Яраш забыўся на здароўе сваёй напарніцы і ішоў залішне хутка.
Ап'янелая ад хвойнага і грыбнога водару, ад сонца і шчасця, Зося раптам спынілася, паставіла на зямлю торбачку і прытулілася спіною да сасны.
Антон Кузьміч занепакоіўся: можа, ёй блага? Але яна заплюшчыла вочы і засмяялася, разводзячы вакол сябе рукамі:
- Грыбоў! Колькі грыбоў!
Гэты яе зусім дзіцячы смех, уяўленні і радасць, відаць, і сталі прычынай таго нечаканага ўчынку, які зрабіў Яраш. Ці, можа, яго ўласная радасць і залішняя дужасць?
Яны стаялі перад самым крутым узгоркам. Сосны, агаляючы свае фантастычныя карэнні, здавалася, лезлі на самае неба. Можна было павярнуць назад, можна было абысці па нізіне. Але Ярашу хацелася прабрацца напрасцяк, узлезці на гэтую лясную гару. Але ж не даваць такую нагрузку яе сэрцу!
- Я ўзнясу вас туды, а назад мы пойдзем па лузе.
Не паспела яна запярэчыць, як ён, укінуўшы яе сумку ў свой вялікі кош, лёгка, як колькі год назад малую Наташку, падхапіў яе на рукі.
Яна войкнула, устрапянулася, але не вырвалася.
Прыціхла. З'явілася пачуццё, якога яна не ведала, - яшчэ адна тайна жыцця, якая адкрывалася ёй. Ніколі не трымаў яе вось так мужчына, здаровую і шчаслівую. Зрабілася да неверагоднасці хораша і страшна. Божа мой! Аказваецца, жанчыны, сёстры яе, маюць яшчэ і такое шчасце - блізасць любага, дарагога мужчыны. А яна не мела гэтага і наўрад ці будзе мець. Навошта ён робіць гэта? Навошта абуджае ў яе гэтае пачуццё? Каб даць замест старых, фізічных, новыя, душэўныя, пакуты, магчыма, не менш цяжкія?
Яна думала пра гэта і, аднак, не рабіла спробы вырвацца. Яна раптам пачула яго сэрца і стаілася, слухала яго ўсё часцейшыя і гучнейшыя ўдары. Ён узыходзіў лёгка і хутка. Яна адкінула галаву і ўбачыла, што верхавіны сосен кружацца. І воблачка кружыць на адным месцы. Можа, гэта закружылася ў яе галава?

Доктар Яраш ведаў усе таямніцы чалавечага цела, ды і душы таксама. Яму здавалася, што для яго ўжо няма ніякіх тайн і загадак. Ён узяў Зосю, як санітар бярэ хворую. Як лекар, ён клапаціўся пра яе сэрца, якое бачыў, трымаў на сваёй далоні. Яму было абсалютна ўсё адно - мужчына гэта ці жанчына. Але нечакана і ў яго з'явілася загадкавае пачуццё, незнаёмае, невыразнае, дзіўнае. Нешта як бы ўсхвалявала яго. І сэрца забілася не так, як, ён ведаў, павінна было біцца пры такім пад'ёме, з такім цяжарам. Выдатны спартсмен, ён вельмі добра ведаў сваё сэрца, дакладна ўмеў разлічыць нагрузку яго. Што ж гэта яно выходзіць з-пад улады - пачынае грукаць не так, як яму належыць? «Старэю», - падумаў ён і асцярожна апусціў Зосю на зямлю.
Каля дачы стаяла санітарная машына. Яраш з трывогай падумаў: «Няўжо ў бальніцы што здарылася?» Закрочыў шпарчэй. Але хутка ўбачыў, што на лавачцы сядзяць Шыковіч, Гаецкая і незнаёмая жанчына. Пачуў вясёлы смех Гаецкай і спахмурнеў: не хапала яшчэ яе тут! Зося адчула, як нечакана змяніўся яго настрой, зразумела, што яму не спадабаліся гэтыя нечаканыя госці. Спытала:
- Хто гэта?
- Галоўны лекар трэцяй бальніцы. У якой ты ляжала.
Яна помніла гэтую прыгожую поўную жанчыну, якая часам абыходзіла палаты і рабіла разнос сёстрам і санітаркам. Настрой Яраша як бы перадаваўся ёй: Зося адчула сябе няёмка, быццам у нечым была вінаватая.
Яраш сказаў:
- Дурная баба. І подлая.
Гэта яшчэ больш збянтэжыла Зосю, быццам ёй даверылі тайну, ведаць якую зусім не трэба, нават небяспечна. Угледзеўшы Яраша і Зосю, Тамара Аляксандраўна паднялася, пайшла насустрач, прыветліва махаючы касынкай.
- З уловам, Антон Кузьміч, - праспявала яна. - Я не ведаю, як кажуць... Шыковіч! Як віншуюць грыбавікоў? Са зборам? З падборам? З уловам?
Смяяліся яе сакавітыя вусны, выпешчаныя шчокі - то з'яўляліся, то знікалі сімпатычныя ямачкі на іх. А вочы... вочы, халодныя і злосныя, разглядалі Зосю. Ды так нахабна, бесцырымонна, што Зосі здалося - раздзяюць. І яна, зусім разгубленая, спалоханая і абураная, не пазнаёміўшыся, не прывітаўшыся, амаль уподбег кінулася да Машы, якая сядзела на ганку і перабірала грыбы.
- Глядзі, колькі я знайшла баравікоў! А ты? О, з табой ні ў чым нельга зраўняцца!
- Твая пацыентка? - спытала Гаецкая ў Яраша.
Гэта можна спытаць па-чалавечаму, прафесійна, як лекар у лекара. Яна хацела зрабіць выгляд, што пытае іменна так. Але Яраш бачыў, як яна працягвае глядзець у спіну Зосі, і адчуў, што пачынае закіпаць. Ён сам баяўся свайго гневу, бо ведаў, што «сарвацца» яму, ды яшчэ перад жанчынамі, нельга, непрыстойна.
Гаецкая працягнула яму руку, падвяла да лавачкі, пазнаёміла са сваёй сяброўкай. Гаварылі нейкія пустыя словы. Смяяліся.
- Гаспадары, запрашайце ў хату. Трэба ж абмыць вашы новыя вуглы, - сказала Тамара Аляксандраўна.
Шыковіч сумеўся, паглядзеў на свайго хмурага сябра - можа, ён што прапануе? - і з жалем уздыхнуў:
- Калі я працую, у мяне - «сухі закон». І каб быць далей ад спакусы...
Гаецкая зразумела.
- А мы ў лес ездзім са сваім віном.
- О, тады іншая размова! Калі ласка! Прашу, - галантна пакланіўся Кірыла, паказваючы на сваю палавіну дачы.
Яраш падумаў, што Зося не сядзе за адзін стол з гэтай жанчынай. Ды і не жадае, каб яны сядзелі разам. Ды і ўвогуле: не хапала яму яшчэ піць віно з Гаецкай у лесе, на дачы! Ён сказаў, як адсек:
- Мяне чакаюць дома.
- У Антона Кузьміча раўнівая жонка, - як бы ў жарт, сказала Тамара Аляксандраўна, але знарок так, каб пачулі Зося і Маша.
Нічога не адказаўшы і не развітаўшыся, Яраш рушыў да «Масквіча». Завёў, рыўком пад'ехаў пад самы ганак, узняўшы пыл, быццам стварыўшы дымавую заслону. Зося першая хуценька ўскочыла на задняе сядзенне.
З ветлівасці Яраш махнуў доктаркам рукой, спытаў у Кірылы:

- Што перадаць тваім?
- Прывязі заўтра масла і хлеба.
Гаецкая, закусіўшы губу, злосна прыжмурыўшыся, доўга глядзела ўслед сіняму «Масквічу».
Яе сяброўка спытала:
- Ён заўсёды такі... нелюдзімы?
- Бывае горшы, - нядобразычліва адказаў Шыковіч. Цяпер і ён узлаваўся на няпрошаных гасцей. Чорт іх прынёс! Каб не яны, яму, напэўна, удалося б угаварыць Антона пасядзець гадзінку. Маша засмажыла б грыбы, і яны разам павячэралі б і хораша пагутарылі б. Ён прачытаў бы ім раздзел - расказ Зосі. Што-нішто трэба ўдакладніць. А сядзець з гэтымі чужымі бабамі - мала цікавасці і ніякай карысці для яго працы.
Тамара Аляксандраўна спачатку збянтэжылася, калі яе «ўсемагутная разведка» ўстанавіла, хто тая жанчна, якую яна сустрэла з Ярашам каля дачы. Але, разважыўшы, узрадавалася: гэта яшчэ лепш, бо, акрамя ўсяго іншага, на галаву чалавека, які зрабіўся цяпер ёй ненавісны, падае яшчэ адзін цяжкі грэх - парушэнне лекарскай этыкі.
Больш за дваццаць год яна песціла надзею, што ўрэшце ўсё-такі ачаруе гэтага ўпартага асілка. Уласна кажучы, у апошнія гады ёй не столькі хацелася ачараваць яго, закахаць, колькі проста пераможна ўзяць - націскам, прыступам. Гэта быў ужо своеасаблівы спартыўны азарт. Цяпер усё рушылася, надзея знікла назаўсёды. Жанчына шалела ад злосці. Чакай, доктар Яраш, ты доўга будзеш помніць мяне!
Забыты былі справы, хворыя, грыбы. Сама галоўны лекар і ўсё яе даволі значнае акружэнне лёталі па горадзе ў пошуках звестак пра Зосю і Яраша. І вельмі хутка было выяснена ўсё: і тое, што яны, Яраш і дачка здрадніка Савіча, знаёмы яшчэ з часоў акупацыі, і тое, як Шыковіч і Яраш дамагаліся для гэтай жанчыны асобнай кватэры, як яны самі (вядомы хірург і пісьменнік) купілялі для яе мэблю і нават якую суму кожны з іх зняў з ашчаднай кніжкі, і, нарэшце, тое, што яны збіраліся на кватэры ў Зосі ўчацвярых. О, гэта ўжо не проста сувязь аднаго жанатага мужчыны з незамужняй жанчынай! Тут значна большае - групавое маральнае разлажэнне!
І паляцела плётка з касмічнай хуткасцю. Каб Яраш і Шыковіч былі людзі звычайныя, вядомыя толькі ў сваіх калектывах, безумоўна, што ўсё гэта не выклікала б сенсацыі. Але абодвух у горадзе добра ведалі, а таму ўсе праяўлялі да такой навіны незвычайную цікавасць: адны злараднічалі, другія, галоўным чынам замужнія жанчыны, абураліся, трэція ўпотай зайздросцілі.
**26**
Галіна Адамаўна глянула на ручны гадзіннік і ўзрадавалася - да канца рабочага дня заставаліся хвіліны. Яна сапраўды не любіла сваёй работы. Ёй больш падабаліся хатнія абавязкі - гатаваць смачныя абеды, кроіць і шыць, яна была добрая гаспадыня, ласкавая маці і жонка. Думкі яе ляцелі дадому: што згатаваць сёння, каб страва аднолькава падабалася і Антону, і Віцю, і Наташы, густы якіх даволі розныя.
- Дзве гадзіны нічога не ешце, - сказала яна пацыенту, які паласкаў рот содавым растворам.
У яе самой ніколі не балелі зубы, можа, таму яна ставілася да сваіх пацыентаў з іроніяй, не верыла іх стогнам і пакутам; яна двойчы раджала і ні разу не войкнула, а тут другі так енчыць, што брыдка слухаць. І да крывавых пляўкоў яна не магла прывыкнуць за ўсе пятнаццаць год сваёй работы. Жыла ў чысціні, і ёй быў агідны ўсялякі гной і бруд, фізічны і маральны, нават праяўленне звычайнай неакуратнасці. Сястра глянула за дзверы, таксама не без радасці паведаміла, што нікога больш няма, і пачала праціраць інструмент. Галіна Адамаўна падышла да ўмывальніка, закасала рукавы халата, узброілася шчоткай... У гэты момант шырока расчыніліся дзверы і ўвайшла яна - Тамара Аляксандраўна.
Сэрца ў Галіны адразу быццам адарвалася і ўпала ў нейкую гулкую пустэчу, ад чаго зрабілася балюча ў жываце.
З крана лілася вада.
Страшэнна непрыемныя струменьчыкі холаду папаўзлі па спіне, як толькі яна падумала, што гэтая пышная, прыгожая жанчына з нахабнымі вачамі, якія яна многа год ненавідзела, прынесла ёй гора. У Галіны Адамаўны жыло цвёрдае перакананне, што з добрым намерам Гаецкая ніколі не з'явіцца.
Тамара Аляксандраўна, прывітаўшыся, адразу па-гаспадарску забралася ў зубалячэбнае крэсла, уселася, як царыца на троне, такая ж ззяючая, як панікеліраваныя дэталі апаратуры.
Галіна Адамаўна ўпусціла ў ракавіну шчотку, непаслухмянай рукой закруціла кран. Падумала:

«Калі ў яе зубы, чорт з ёй, неабавязкова для такой мыць рукі».
Ніколі яшчэ і ні пра каго яна так не думала. Спытала холадна-афіцыйна, як у зусім незнаёмай, і троху недарэчна:
- У вас - зубы?
- У мяне - зубы, - з падкрэсленай іроніяй, бліснуўшы залатымі каронкамі, адказала Гаецкая.
Ногі наліліся холадам, яны сталі непаслухмяныя, але Галіна Адамаўна прымусіла сябе наблізіцца і ўзяць інструмент.
- Сястрычка, ідзі пагуляй, любая. Мне трэба нешта сказаць лекару, - мядовым голасам праспявала Тамара Аляксандраўна.
Сястра глянула на Галіну Адамаўну. Той хацелася крыкнуць: «Не трэба! Не выходзь!» Але замест гэтага яна чамусьці, як вінаватая, збянтэжана апусціла вочы, і далікатная сястра ўміг знікла.
- Галя, дарагая мая, - адразу пачала Гаецкая, шчыра, ласкава, чым яшчэ больш насцярожыла Галіну Адамаўну, - я ведаю, ты ненавідзела мяне. Але ты памылялася...
«Чаму яна кажа мне «ты»? Мы ніколі не былі з ёй у сяброўскіх адносінах».
- ...Ты глыбока памыляешся. Ніколі я не пасягала на тваё шчасце. Ніколі не жадала табе кепскага. Твае і мае зайздроснікі плявузгалі табе, хацелі сутыкнуць нас ілбамі. Павер мне, Галечка, я твой лепшы друг. Таму і прыйшла. Таму вырашыла сказаць. Не люблю пляткарыць... Але калі закранаецца наш жаночы гонар...
Галіна Адамаўна ўзялася рукой за штангу бормашыны, да болю сціснула яе. Чамусьці з'явілася жаданне ўдарыць Тамару Аляксандраўну. Вельмі блізка былі яе вочы, яе твар.
«Трэба адысці. Трэба адысці», - загадала яна сабе, аднак баялася скрануцца з месца.
- ...Каб хто другі сказаў, не паверыла б. А то ж на свае вочы бачыла. На дачы вашай. І зразумела: частыя госці яны там. Рыжая сястра. І яна... пацыентка яго... Можа, нічога і няма паміж імі. Але што падумаюць людзі? Гэта ж, ведаеш, хто? Дачка таго Савіча. Здрадніка.
Тамара Аляксандраўна спадзявалася, што жонка Яраша, пачуўшы такое пра мужа, якому (Гаецкая гэта ведала) яна не верыла, кінецца ў істэрыку, закрычыць, наробіць шуму і яна, Тамара Аляксандраўна, пацешыць сваю душу такім відовішчам: гэта будзе помста і за тое, што Галіна некалі перахапіла Антона, і за яе шматгадовую нянавісць.
Але Галіна Адамаўна маўчала. Як скамянелая. Ніводная рыска не тузанулася на яе застылым твары.
- Не верыш - спытай у людзей. Ды хіба ты не ведаеш, што ён жыў у іх, у Савічаў, яшчэ ў акупацыю? А ты спытай у яго, як ён са сваім неразлучным Шыковічам дамагаўся ёй кватэру. Якую яны мэблю купілі за свае грошы. Абсталявалі кватэрку - дай-дай. Усё як мае быць, на французскі манер. Не верыш?
Уся трагедыя заключалася ў тым, што Галіна Адамаўна верыла. Верыла ўсяму, кожнаму слову. Ад гэтага ў яе муцілася ў галаве. Быў момант, калі калыхнулася і адплыло крэсла і яна ўбачыла ажно тры Тамары, якія зларадна скаліліся. Яна ўвесь час бачыла гэты зларадны аскал, хоць выраз твару нечаканай госці быў увесь час спачувальны ці абуральна-сур'ёзны.
Нейкім сёмым ці дзесятым пачуццём Галіна Адамаўна здагадалася, чаму прыйшла гэтая жанчына, і ніводным рухам не выдала свайго гора, болю, пакуты. Выдала толькі старую нянавісць. Раптам працадзіла праз зубы:
- Ідзі прэч!
Гаецкая ўстрапянулася:
- Дурная...
- Прэч!
Галіна Адамаўна з грукатам кінула на паднос лапатку і ўзяла востры пінцэт.
З неўласцівай яе паўнаце рухавасцю Тамара Аляксандраўна шмыгнула з крэсла, ледзь не паваліла бормашыну. Толькі ў дзвярах зларадна крыкнула:
- Што? Дажыла?!

* * *

Антон Кузьміч адчыніў дзверы ўласнай кватэры і па беспарадку ў калідоры, па пахах ці, правільней кажучы, па тым, што не было іх, кухонных пахаў, здагадаўся, што нешта здарылася. Не нешта, а ён пэўна ведаў што. Ён добра ведаў, што Гаецкая не змоўчыць. За гэтыя дні пасля іх

сустрэчы ў лесе колькі разоў хацеў сам расказаць Галіне, каб папярэдзіць, і не здолеў - не хапіла мужнасці. Не хапіла, бо ведаў: не паверыць, не зразумее ці зразумее зусім інакш, па-свойму, яшчэ горш, чым Гаецкая. Было брыдка і сорамна ад сваёй нерашучасці, боязі. Але ён думаў пра дзяцей і ўпотай спадзяваўся: а можа, абыдзецца. Можа, Тамара зробіць нейкі другі ход? Між іншым, гэтая цікаўнасць - што ж усё-такі яна зробіць? - была адной з прычын яго маўчання. Ён нават не расказаў Шыковічу. Урэшце ён мог бы заклікаць на дапамогу сябра і разважлівую, спакойную Валянціну Андрэеўну, якая неаднойчы ўжо тушыла ўспышкі Галінай хваравітай рэўнасці. Але ўсё гэта выйшла б так, што ён нібы апраўдваецца. Завошта? Ды, нарэшце, ці варта надаваць гэтаму такое значэнне? Ён мае права падняцца вышэй усёй гэтай бытавой лухты, што атручвае жыццё і перашкаджае галоўнаму - працы!
У паліто і капелюшы ён пайшоў у спальню. Галіна сядзела за швейнай машынай халодная, непрыступная. Выгляд яе спалохаў яго. Такой яна не была ніколі. І ніколі так не паводзіла сябе. Каб у яго паляцела машына ці трумо, гэта ўразіла б менш.
Яна не шыла, але, відаць, спрабавала шыць: заціснутая іголкай тканіна звісла на падлогу.
Антон спыніўся пасярод пакоя. Жонка не ўзняла вачэй.
- Што здарылася, Галя?
Твар яе непрыгожа перасмыкаўся.
- Вы, Антон Кузьміч, не ведаеце, што здарылася?! - сказала яна з сарказмам і жахлівай адчужанасцю.
- Галка. Усё гэта лухта!
- Ах, лухта! - адкінула яна тканіну ўбок, выхапіла аднекуль з-пад яе ашчадную кніжку, падняла, патрасаючы. - І гэта лухта? Шчодра, доктар Яраш, аплачваеш палюбоўніцу! Але не думай, што мне шкада тваіх грошай. На! - яна шыбнула кніжку яму пад ногі.
Пры ўсёй яе рэўнасці жонка рэдка кантралявала яго расходы. Ён часта пазычаў буйныя сумы калегам, некаторыя з іх не вярталі гадамі. Галіна, даволі абыякавая да грошай, забывалася пра такія пазыкі, а калі часам і патрабавала справаздачы, то заўсёды ў добрым настроі, абмяркоўваючы чарговую буйную пакупку. А цяпер праверыла ўсё. Ён, Яраш, нават не падумаў, што Гаецкая разведае і выкарыстае ўсё. Яго кінула ў пот ад прадчування цяжкасцей на шляху да прымірэння. Колькі прыйдзецца патраціць энергіі... Ён кінуў паліто на ложак, зрабіў крок да жонкі. Яна ведала яго прыём: абняць, схапіць на рукі, цалаваць... І яна, слабая жанчына, сціхала, даравала яму... Але цяпер не!
- Я табе ўсё растлумачу, Галка. Выслухай толькі.
- Не падыходзь! - Яна ўзброілася нажніцамі, але тут жа шыбнула іх на столік. - Не трэба мне ніякіх тлумачэнняў! Усё! Усё! Усё! Цяпер я не буду ні крычаць, ні плакаць... Мы чужыя. Ты абсталяваў сабе новую кватэру - ідзі туды. Не пойдзеш ты - я ніводнага дня, ніводнай хвіліны не буду тут. Усё! - Яна вымаўляла гэтыя «ўсё», быццам ставіла кропкі.
Яраш зразумеў, што гэта больш, чым нервовая ўспышка, гэта цвярозы намер, і не ведаў, з якога боку падступіцца, каб разбурыць такое яе рашэнне. Ён спыніўся, паглядзеў на яе ласкава, з жалем, дакорліва паківаў галавой: дурніца, дурніца! Яна не вытрымала яго позірку, закрыла твар рукамі, перасмыкнулася ўся. Заціскаючы рыданні, сказала праз далоні глуха, чужым далёкім голасам:
- Божа мой! Шаснаццаць год жыла з гэтым чалавекам! Аддала яму ўсё. А ён... Яму мала было гэтай тоўстай шлюхі, «залатой сястры», усіх баб, якіх ён меў... Яму трэба яшчэ зблытацца з пацыенткай. Які жах! Якая ганьба! - Яна адкрыла твар і вельмі нядобра ўхмыльнулася. - Але што я хацела ад таго, хто мог забіць, зарэзаць з большай лёгкасцю, чым я вырываю зуб.
Гэта было ўжо занадта. Нават з яго нервамі і разважлівасцю вытрымаць такое нялёгка. І ён грымнуў на ўсю кватэру:
- Вы хаця падумалі б, якая яна жанчына! Лекары задрыпаныя! - і вылаяўся груба, злосна, як не лаяўся яшчэ пры жонцы ніколі.
Ён не ведаў, што дома Наташа. Яна сядзела ў кабінеце, дзе заўсёды рыхтавала ўрокі, калі бацькі не было дома. Яна бачыла, у якім стане вярнулася дадому маці. Калі з'явіўся бацька і адразу накіраваўся ў спальню, дзяўчынка насцярожылася. Не, яна не стала падслухоўваць іх размову. З малых год бацька вучыў яе, што гэта нядобра. Але калі ён закрычаў, Наташа не вытрымала.
Яна з'явілася ў дзвярах спальні ў чорным фартушку, з банцікам у косах, стройная, высокая (у бацьку пайшла), з ласкавай усмешкай на твары.

- Добры дзень, тата. Мы не бачыліся сёння, - падбегла, паднялася на пальчыках, чмокнула ў шчаку.
- Твой тата падлюга! - не вытрымала Галіна Адамаўна, каб не шыбануць у мужа самы цяжкі камень. Яна не чакала, што камень можа паляцець у яе.
Наташа адступіла ад бацькі, агледзела яго, потым - маці. І зноў да бацькі. Абняла за шыю, закрычала:
- Няпраўда! Няпраўда! Няпраўда! Ён добры, ён разумны. А ты... ты... неразумная... ты - раўнівая. Ты атручваеш яму жыццё.
- Наташа! Наташка! Хіба можна! Сціхні! - Антон Кузьміч сварыўся на яе, але прыціскаў да сябе. Гладзіў худзенькія плечы і адчуваў, што сам захлынаецца слязамі.
Дачка вырвалася, выбегла з пакоя.
Галіна Адамаўна самлела, у яе здарыўся сардэчны прыступ.
Валянціна Андрэеўна атрымала ананімнае пісьмо. Немагчыма растлумачыць, чаму Гаецкая жанчынам, якія сябравалі паміж сабой, паведаміла па-рознаму: адной - яўна, другой - ананімна.
Нельга сказаць, што Валянціна Андрэеўна ніколі не раўнавала Кірылу. Усё было ў жыцці. На тое яно і жыццё. Але яна ніколі не трациіла розуму і здольнасці разважаць, аналізаваць. Быў у яе вопыт і добрая жаночая мудрасць. Калі ніводзін лекар не задумаўся, колькі патрэбна часу, каб пасля такой аперацыі чалавек вярнуўся да нармальнага, не, ненармальнага, вясёлага жыцця, то яна адразу ж падумала пра гэта і першаму, чаму не паверыла, - сувязі Яраша з Зосяй. Кірыла і Маша?.. Прыпісалі б яе мужу любую другую жанчыну, у Валянціны Андрэеўны, магчыма, яшчэ ўзніклі б нейкія падазрэнні: не бывае дыму без агню. Але Маша... Яна бачыла дзяўчыну адзін раз, ведала, што яна сустракалася з Тарасам і Славікам. І раптам - Кірыла. Не, не, не! Яна з агідай, з нянавісцю да ананімшчыка адганяла гэтую брудную плётку. Яна палюбіла Машу, паверыла ў яе розум, у яе дзявочую сумленнасць і чысціню, інтуітыўна, чуццём педагога, адчувала, што такая натура ніколі не зробіць подласці. Валянціна Андрэеўна любіла людзей і верыла ім.
Увечары яна паказала пісьмо Кірылу. Пакуль ён чытаў, яна ўважліва сачыла за выразам яго твару. Спачатку ён пачырванеў, потым пабляднеў, спацеў. Як бы вытлумачыла гэта тая ж Галіна Адамаўна! Валянціна Андрэеўна ўбачыла іншае: здзіўленне і абуранасць. Дачытаўшы да канца, ён разгублена пагладзеў на жонку.
- Чорт ведае што такое! Падумай толькі, якая душа павінна быць у чалавека, каб з усіх гэтых фактараў зрабіць такія высновы. Вырвалі мы ёй кватэру, куплялі мэблю, прывезлі яе з бальніцы, былі яшчэ разы два. Ты чытала яе расказ... Але, прыязджалі яны з Антонам па грыбы... Ну і што? Гэта - яна, Гаецкая. Недарэмна Антон так не любіць гэту бабу.
- Увогуле ты, Кірыла, ласы на каўбасы. Гэта я ведаю. На кожную прывабную кабету зіркаеш як кот на сала.
- Валя!
- Але не бойся. Гэтаму пісьму і я не веру. Не таму, што ў табе вельмі ўпэўнена. Не суцяшайся. Веру ім - Зосі, якую знаю па тваіх расказах, і Машы...
Кірыла з палёгкай уздыхнуў.
- Ведаеш, пра што я падумаў? Чаму ў такіх разумных бацькоў, як мы з табой, не вельмі разумныя дзеці?
- Што табе трэба ад тваіх дзяцей? - адразу спахмурнела і ўзлавалася Валянціна Андрэеўна. - Розум прыходзіць з гадамі. У цябе яго і цяпер не надта, калі ты пра яго такой высокай думкі.
Пра ўсё яна магла гаварыць разважліва і спакойна. Але няхай ніхто не чапае яе дзяцей, нават іх родны бацька.
Кірыла зразумеў, што зрабіў не той паварот і не так, як трэба, зліслівіў перад жонкай.
- Ну, добра, добра. Не злуй. Чаму ты думаеш, што я так ужо дрэнна думаю пра сваіх дзяцей? Я проста хачу, каб яны былі лепшыя за нас.
Валянціна Андрэеўна чамусьці цяжка ўздыхнула.
- Ёсць, Кірыла, норма чалавечых якасцей? Хіба дрэнны чалавек Галіна Адамаўна? Але ўяўляю, што з ёй робіцца, калі такое агідненькае пісьмо прыслалі і ёй.
- Няўжо можна паверыць гэтаму?
- Ты не ведаеш яе. Нам трэба зараз жа схадзіць да іх.

На іх званок адчыніла Наташа. У дзяўчынкі быў такі выгляд, быццам яна толькі што вярнулася з пахавання кагосьці блізкага.
- Тата дома?
Яна кіўнула галавой.
- А мама?
- І мама.
Антон Кузьміч сядзеў у сваім застаўленым кніжнымі шафамі кабінеце і бяздумна гартаў альбом Траццякоўскай галерэі.
Галіна ляжала ў спальні. Яна не хацела бачыць ні мужа, ні дачкі - гэтага «Ярашавага кодла», як яна пасля крычала ў істэрыцы. Каля яе быў адзін Віця, далікатны, ціхі, асцярожны ў сваіх пачуццях і меркаваннях. Можа, праз гэта Галіна Адамаўна больш любіла сына, чым рэзкую, нявытрыманую дачку. А Ярашу, наадварот, якраз гэтая рыса не падабалася ў сыне.
Валянціна Андрэеўна, уміг зразумеўшы становішча, адразу пайшла да сяброўкі. Кірыла, убачыўшы, у якім настроі Яраш, паспрабаваў жартаваць, весела спытаў:
- Што? Выдала?
Антон Кузьміч сціснуў рукамі скроні, на твары яго была пакута.
- Жах! Калі гэта будзе паўтарацца, калі так будзе далей - немагчыма жыць, працаваць...
Шыковіч адкінуў прэч свой гулліва-жартаўлівы тон. Пэўна, справа сур'ёзная, калі нават Яраш, які да ўсіх нягод ставіўся з гумарам, так перажывае. Кірыла ўпаў у крэсла насупраць сябра. Пстрыкнуў партсігарам.
- Ты мне растлумач. Чым ты вінаваты перад ёй, што яна так не верыць?
- Не хапае інтэлігентнасці. Звычайнай культурнасці. Усё няшчасце наша, што мы не выхавалі ў нашай інтэлігенцыі неабходнай інтэлігентнасці. Адгэтуль дзікая рэўнасць маёй жонкі, дзікая подласць Гаецкай, усё што хочаш.
Яны доўга гутарылі пра гэта. Можа, праз добрую гадзіну Валянціна Андрэеўна паклікала іх у спальню.
- Ну вось што, хлопчыкі, - сказала яна двум сталым мужчынам, як малым. - Сядайце і расказвайце. Толькі не круціце хвастамі, а то надзяру вушы.
Яны расказвалі, дапаўняючы адзін аднаго, да позняй ночы.
Здавалася, наступіла прымірэнне.

**27**

Старшынёй сесіі выбралі Гаецкую. З'яўленне яе за сталом прэзідыума дэпутаты сустрэлі вясёлымі апладысментамі. Раней увесь час старшынёй выбіралі мужчыну, сакратаром - жанчыну. На мінулай сесіі нехта з дэпутатаў зрабіў заўвагу аб такім парадку. І вось упершыню зрабілі наадварот.
Тамара Аляксандраўна са сціплай усмешкай ківала галавой у залу і крышку даўжэй, чым трэба, ціснула руку сакратару - зусім юнаму электразваршчыку будаўнічага трэста. Яна ўмела паказаць сябе людзям! Прыемным голасам абвясціла парадак і рэгламент. Усё было распісана, звыкла, і ніхто не чакаў, што могуць быць заўвагі па парадку. Ды раптам падняўся Яраш і сказаў, што яму для садаклада патрэбна не дваццаць хвілін, як прапануюць, а мінімум гадзіна - ёсць што сказаць пра медыцынскае абслугоўванне гараджан.
Зала загудзела. Такія з'явы здараліся рэдка.
Нехта кінуў уголас:
- Чаму раней не дамовіліся?
Гукан падхапіўся, каб адхіліць просьбу Яраша: будзе грунтоўны даклад загадчыка аддзела і няма патрэбы гэтулькі часу даваць садакладчыку. Але яго апярэдзіла Гаецкая. З абваражальнай усмешкай сказала:
- Я думаю, дамо доктару Ярашу гадзіну. Пытанне важнае, а ён наш лепшы спецыяліст. Хто «за» - прашу падняць рукі.
Работнікі гарсавета, лекары прагаласавалі з-за пэўнай цікавасці, усе другія - з павагі да вядомага хірурга.
А сам Яраш раптам падумаў, што не трэба яму гадзіна. У садакладзе яго, які напісаны даўно, добрыя хвілін дваццаць адводзіліся трэцяму клінічнаму аб'яднанню, якім кіравала Гаецкая. Як будзе вытлумачана цяпер такая жорсткая крытыка яе дзейнасці? Яшчэ да пачатку сесіі па тым, як

віталіся з ім знаёмыя, ён зразумеў, што «царыца Тамара» не абмежавалася яго жонкай і жонкай Шыковіча. Кругі ад яе плёткі-каменя шырока разыходзяцца.
Што рабіць?
Майстар у сваёй справе, Яраш быў не надта вопытны ў выступленнях. Шкада, што няма побач Кірылы, той добра ведае «псіхалогію сходаў». Але хітрун з'явіўся, пазубаскаліў з дзяўчатамі, якія рэгістравалі дэпутатаў, атрымаў блакнот і карандаш і знік. У яго прынцып: «На ўсіх пасяджэннях не перасядзіш, усіх дакладаў не праслухаеш». Праўда, на яго, Ярашаў, садаклад абяцаў прыйсці.
Пакуль загадчык аддзела аховы здароўя да нуднасці аднатонна чытаў свой даклад, Яраш бязлітасна перакрэсліваў, выпраўляў свой.
Пасля даклада патрабавалі перапынку.
Гукан і Тарасаў селі ў буфеце за адзін столік.
- Што, Сямён Парфёнавіч, знішчым па парасяці? Бачыш, як заліты? - весела прапанаваў Тарасаў.
- Не, я - кефірчык.
- Баішся халестэрыну? Мая дачка кажа: халерастэрын. А я не баюся ніякай халеры.
- У твае гады і я нічога не баяўся.
- Але? Нічагусенькі? - як бы здзівіўся Сяргей Сяргеевіч, пасылаючы ў рот ладны кавалак парасяціны. - А я дык усё жыццё каго-небудзь ці чаго-небудзь баяўся. Малы - бацькі, у мяне суровы бацька, у арміі - камандзіра. Калі ранілі, ведаеш, як я баяўся, каб гэтыя эскулапы не адхапілі нагі...
Гукан, слухаючы, стукаў кулаком па дне бутэлькі, каб выліць захаладзелы кефір.
- Бачыў, якія анархічныя замашкі ў Яраша? - раптам перапыніў ён сакратара і так трасянуў бутэльку, што кефір плёхнуўся цераз край шклянкі на стол. Адразу падскочыла афіцыянтка, каб выцерці.
- Чаму анархічныя? А калі яму сапраўды ёсць што сказаць?
- Ох гэтыя мне свяцілы! - Сямён Парфёнавіч разрэзаў лімон, выціснуў палавіну ў шклянку з кефірам.
- Моцна ты вітамінізуешся, - усміхнуўся Тарасаў.
Старшыня гарсавета азірнуўся, нахіліўся над сталом, спытаў паўшэптам:
- Чуў пра яго інтымнае жыццё?
Але, Тарасаў чуў. Нават яго жонка, работніца бібліятэкі, прынесла дадому гэтую навіну. Спачатку ён паверыў: што ж, усё можа быць, такому мужчыну, як Яраш, любая ў абдымкі кінецца. Ён не любіў падобных гісторый, асабліва калі справа даходзіла да партыйнага разгляду, а таму ўзлаваўся на Яраша: яшчэ яго не хапала туды ж? Але калі пра гэта пачалі гаварыць многія другія, сакратар адчуў, што тут нешта не так, што нехта стараецца, каб плётка разышлася па горадзе. Хто і з якой мэтай - хацелася яму даведацца. Таму ён насцярожыўся, калі пра гэта загаварыў і Гукан.
- Старая любоў з дачкой Савіча. Адкуль цягнецца, а? Цяпер ты можаш зразумець «прынцыповую» падаплёку артыкула Шыковіча.
Тарасаў чытаў ужо другі варыянт артыкула, дапоўнены расказам Зосі, Шыковіч прыходзіў раіцца з ім. Усе факты, на яго думку, заслугоўвалі самай сур'ёзнай увагі, хоць для публікацыі патрабаваліся дадатковыя даследаванні. А тут, выяўляецца, вунь як павapoчваюць, вунь да чаго зводзяць! Дагэтуль ён ставіўся да старшыні даволі прыязна, хоць бачыў і разумеў яго слабасці і памылкі, частка з якіх ішла ад яго асабістых чалавечых якасцей, другая - ад пэўнага часу, калі ён выхоўваўся як кіраўнік. Ён дараваў Гукану шмат якія слабасці і памылкі: ідэальных людзей мала. Але ад гэтых Гуканавых слоў яго скаланула. Тарасаў раптам убачыў, адчуў, зразумеў: чалавек гэты варожы яму па духу, па складу думак, па адносінах да людзей - па ўсім. І нельга яму паблажліва дараваць! Яго трэба бязлітасна выкрываць!
Сяргей Сяргеевіч сказаў спакойна, але з гнеўнай непрымірымасцю:
- Ух, з якой радасцю ты зрабіў бы іх правакатарамі і агентамі гестапа. Усіх. Нават Шыковіча, які быў у арміі.
Гукан папярхнуўся кефірам.
А ў гэты момант Яраш у фае палаца раіўся з Кірылам, які выканаў сваё абяцанне - з'явіўся паслухаць садаклад сябра. Антон Кузьміч выказаў сваю боязь, каб калегі не палічылі яго крытыку Гаецкай за акт помсты. Ён не хацеў бы змешваць асабістага з грамадскім. Шыковіч, які гадзіну гуляў па парку - любаваўся залатой восенню і абдумаў цікавы кампазіцыйны ход для наступнага раздзела сваёй кнігі пра падполле, быў у бадзёрым і ўзнёслым настроі. Ён бачыў, што Яраш

хвалюецца, і як бы радаваўся гэтаму: хоць раз угледзець сябра ў хваляванні. Кірыла слухаў яго з іранічнай усмешкай. Перапыніў нечакана для Яраша, сказаў з вясёлай жорсткасцю:
- Па-мойму, ты робішся талстоўцам.
Яраш здзівіўся:
- У якім сэнсе?
- У гэтым самым сэнсе. Ты мяне здзіўляеш, падпольшчык, дыверсант Яраш. Навука яўна псуе цябе.
Ты - той прыклад, калі інтэлігентнасці замнога, а гэта таксама шкодна. Ды калі яна дала табе аплявуху, плясні яе пяць разоў. Плясні так, каб іскры з вачэй пасыпаліся, нягледзячы на яе прыналежнасць...
- Ты так думаеш?
- Я так зрабіў бы. Тут няма чаго размяжоўваць асабістае і грамадскае.
Пошукі фактаў пра падполле выклікалі ў Шыковіча гэты ваяўніча-наступальны настрой. Памяркоўны, ленаваты і ліберальны раней, ён здзіўляўся цяпер сам сабе: адкуль бярэцца такая энергія, такі імпэт і рашучасць?
Яраш не паспеў у другі раз перабудаваць свой даклад, а таму гаварыў, амаль не заглядваючы ў напісанае. Але гэта прыдало выступленню пафасную жвавасць і злосць да тых бюракратычных непарадкаў, якія мелі месца ў медыцынскім абслугоўванні. Ніхто з дэпутатаў не чытаў больш газеты, ніхто не кляваў носам. Разоў колькі яго перапынялі воплескамі.
Тамара Аляксандраўна кляла тую хвіліну, калі дала згоду заняць старшынскае месца. Сотні вачэй свідравалі яе. Яна бачыла ўсмешкі, розныя па сваіх адценнях, ад зларадных да спачувальных.
Дасталося і выканкому гарсавета.
Гукан не глядзеў на Яраша, ён увесь час, яўна і ўпотай, глядзеў на Тарасава: хацеў зразумець па яго рэакцыі, ці не ўзгадняўся садаклад з ім. Калі ўзгадняўся, тады ўсё ясна. Але было падобна, што многія факты сакратар гаркома чуе ўпершыню. Гэта трохі супакойвала Сямёна Парфёнавіча.
Расчырванелая, узрушаная Гаецкая ў наступны перапынак злавіла Яраша ў фае. Сказала яхідна, але зноў-такі дэманструючы перад людзьмі сваю блізасць з ім:
- Ведаеш, Антон, прымаўку: смяецца той, хто смяецца апошні.
- Уяві сабе, Томачка, што ведаю, - засмяяўся Яраш.

**28**

Гукану гарком даручыў прысутнічаць на станкабудаўнічым заводзе. Мітынг адбыўся ў апошні дзень з'езда.
Заводскі двор - мора замасленых кепак і паліняллых касынак. Трыбуна - грузавік з адкінутымі бартамі - была абсталявана ў глыбіні двара.
Рашэнні дваццатага з'езда аб культе Гукан прыняў параўнаўча спакойна. Была кароткая разгубленасць, але ні ў якім разе не спалох. Магчыма, усе іншыя пачуцці перамагла тады сенсацыйная цікаўнасць. За пяць год умацавалася перакананасць у тым, што культ сапраўды прынёс шкоду, і ён, Гукан, зусім шчыра гаварыў пра гэта ў сваіх дакладах і выступленнях. І, здавалася яму, гэтак жа шчыра змагаўся за адраджэнне ленінскіх норм кіраўніцтва і жыцця. Рашэнне гэтага, дваццаць другога, з'езда ён таксама прыняў як заканамерную з'яву. Але калі на мітынгу - першы ж пасля сакратара парткома - Тарас Ганчароў нечакана прапанаваў знесці заводскі помнік, Сямён Парфёнавіч неяк балюча скалануўся і... спалохаўся. Не так даўно ён адкрываў гэты помнік.
Ведаючы, што Ганчароў - прыёмны сын Яраша, ён адразу падумаў: «Адна хеўра. Анархісты!»
Яму варта было выступіць, ён не выступіў - не ведаў, што сказаць.
Адпусціўшы машыну, пайшоў пехатой па вуліцах, якія забудоўваліся пад яго кіраўніцтвам. Ён падумаў пра гэта - што амаль увесь новы горад будаваўся пры яго ўдзеле, пад яго кіраўніцтвам. Ён заўсёды адчуваў сябе гаспадаром горада. Гэта надавала яму ўпэўненасці, сілы. І раптам цяпер адчуў, што ніякі ён не гаспадар тут... Але ад гэтага адчування яму зрабілася страшна. Упершыню ён не радаваўся рашэнням партыі, а ён жа заўсёды лічыў сябе самым верным яе сынам. Што ж здарылася, Сямён Парфёнавіч? Што змянілася? Вось ад гэтага яму сапраўды стала страшна, аж кінула ў пот, хоць апошні кастрычніцкі дзень быў ужо амаль па-зімоваму халодны. Ён падумаў пра Шыковіча і Яраша, падумаў неяк зусім інакш, чым думаў дагэтуль, - без сувязі з гісторыяй, якую расказала Гаецкая, з учынкам Славіка, выступленнем Тараса. Ён пазайздросціў ім. Лёгка ім жывецца, калі што і няясна, незразумела, то - пра другіх, а ў саміх іх, напэўна, усё ясна і ўсё

проста. А вось ён, Сямён Гукан, у самім сабе не можа разабрацца. Хто і што ён, маленькі чалавек, радавы работнік? (Ён раптам пачаў думаць пра сябе як пра зусім маленькага чалавечка.) «З якою радасцю ты зрабіў бы іх правакатарамі». Няпраўда, таварыш Тарасаў! Я нікога не думаю рабіць правакатарамі! - хацелася крыкнуць яму на ўвесь горад.

Дадому ён прыйшоў разбіты, з галаўным болем. Хацелася легчы ў ложак, выклікаць лекара.

Жонка яго, Вольга Раманаўна, старая і шчырая работніца ашчаднай касы, раней газеты толькі праглядала і чытала галоўным чынам фельетоны ці тыя матэрыялы, якія хто-небудзь перад гэтым параіў. А тут за вялікім сталом сядзела абкладзеная кіпамі газет.

Гукан заглянуў цераз жончына плячо, вырваў вачамі абзац, другі. Захацелася яму шчыра, па-сямейнаму, без сведак, пагутарыць з жонкай. Яна, на яго думку, не надта разумная, аднак па-жаночы чулая. За трыццаць год добра вывучыла яго, неаднойчы ў цяжкую хвіліну суцяшала, можа, і цяпер зразумее, як нялёгка яму.

- Як табе, Оля, падабаецца ўсё гэта?

- Што?

- Ну, з культам...

- А што? Правільна! Не так трэба служыць народу, каб быць побач з Леніным, - не ўзняўшы галавы, адказала жанчына.

Сямёна Парфёнавіча чамусьці ўзлаваў яе такі адказ і тое, што яна не адарвалася ад газеты.

- Разумныя вы ўсе пасталі! Заднім чыслом. Палітыкі ліпавыя! Абед давай! Зачыталася!

Здаралася, што раней ён гэтак крычаў на яе, у маладосці. Але калі выраслі і раз'ехаліся дзеці, а ў іх пасівелі галовы, Сямён многа год ужо такім тонам з ёй не размаўляў.

Вольга Раманаўна здзівілася. Пільна паглядзела на мужа. Яна не разумела яго. Чаму ён у такой злосці, калі ўвесь народ радуецца? Мякка спытала:

- Што здарылася, бацька? Непрыемнасці?

Яму зрабілася няёмка, ён памякчэў:

- Ніякіх непрыемнасцей няма. Стаміўся. У сэрца коле.

- Прымі валідол. Паляжы, пакуль я згатую што-небудзь. Я сапраўды зачыталася.

Ляжаць Сямён Парфёнавіч не здолеў. Лекара не выклікаў. Пахадзіў па трох пакоях сваёй кватэры, пачытаў газеты, паглядзеў па тэлевізары канец нейкага замежнага кінафільма - нічога не зразумеў.

Зноў вяртаўся ў думках да заводскага мітынгу.

Ён не дапускаў думкі, што не згодзен з рашэннем з'езда. Не, ён згодзен. Але ўсё-такі, здавалася яму, нешта рабілася не так. Асабіста ён так не зрабіў бы.

Вось хаця б з помнікамі гэтымі... Прыгадалася, што помнік на плошчы рабіўся ў першы год яго старшынства. Ён, гаспадар горада, прыклаў столькі энергіі. Было ўрачыстае адкрыццё. Свята. Мітынг. Ён казаў прамову, і прамова яго была адной з лепшых. Праўда, напісаць яе дапамог Шыковіч. Ён, Гукан, пазваў, і той адразу ж з'явіўся, сеў за працу... Быў парадак. А цяпер? Той жа Шыковіч, сярэдні журналіст, паводзіць сябе бог ведае як. Усё хоча перавярнуць дагары нагамі.

Моцна кальнула ў сэрца. Сямён Парфёнавіч прыціснуў руку да грудзей, быццам жадаючы падтрымаць яго, сваё патрывожанае сэрца.

**29**

Шыковіч пісаў дакументальную аповесць пра падполле. Але «белая пляма» - група інфекцыйнай бальніцы - моцна перашкаджала завяршэнню работы. Уласна кажучы, не было ніякай «белай плямы». Пра гэтую групу ён ведаў цяпер больш, чым пра любую другую. Аднаго толькі не разумеў: навошта гестапа спатрэбілася такая правакацыя з Савічам? Гэтага не разумелі многія. Выказвалі сумненні. Яны злавалі Кірылу: жыве яшчэ недавер да людзей! Хіба жывыя людзі - Сухадол, Зося - не самыя лепшыя дакументы? Праўда, ніхто, акрамя хіба Гукана і Рагойшы, так адкрыта не паказваў, што не верыць іх расказам. Аднак недзе паміж радкамі выказванняў самых аб'ектыўных і шчырых людзей Шыковіч чытаў: усё-такі Зося - дачка, Сухадол - нейкая лекарка, да таго ж не такая ўжо актыўная падпольшчыца, старая жанчына, якая з-за склерозу і даўнасці магла шмат што наблытаць.

Урэшце і сам даследчык зразумеў, што не хапае яму той нітачкі, знайшоўшы якую можна разблытаць увесь клубок. Тут трэба было або шукаць гэтых кончыкаў ніткі, або секчы гордзіеў вузел. Ён шукаў настойліва, упарта. Ездзіў у цэнтральны партызанскі архіў. Доўга сядзеў там, выкарыстаўшы свой адпачынак. Шукаў падпольшчыкаў. Ах, каб яму далі магчымасць

апублікаваць артыкул! Тады людзі, безумоўна, прыйшлі б самі. Тарасаў абяцаў, але ўсё чамусьці адцягваў.
Шыковіч у адным памыляўся: яму здавалася, што ўсёй гэтай справай па-сапраўднаму займаецца адзін ён. Ды яшчэ Яраш. І ўсё. Ён не думаў, што падполлем займаюцца многія людзі, па розных лініях, у розных аспектах. Яго пошукі, магчыма, толькі з'явіліся тым каталізатарам, які паскорыў рэакцыю. Неўзабаве ён зразумеў гэта.
У лістападзе ўжо, калі за акном лёталі «белыя мухі», пазваніў Сербаноўскі. Кірыла даўно не бачыўся з капітанам і ўжо амаль страціў надзею, што той можа нечым памагчы яму. Сербаноўскі прасіў зайсці да яго заўтра.
- А сёння нельга? - з нецярплівасцю спытаў Шыковіч.
- Не, заўтра. У адзінаццаць.
Капітан за гэты час зрабіўся маёрам. Вырас. Але здавалася, яшчэ больш схудзеў: глыбей запалі вочы і як бы пабольшалі вушы - адтапырыліся наперад, быццам чалавек насцярожана ўслухоўваўся ў падманную цішыню. Вітаючыся, Шыковіч адчуў мазалі на яго далоні, успомніў пра хворую жонку і пашкадаваў гэтага засяроджанага і, відаць, упартага ў любой працы чалавека. Але Сербаноўскі нечакана выявіў даволі бадзёры настрой і добрую, амаль сяброўскую прыязнасць.
- Што маем новае, Кірыла Васільевіч?
- Па групе чыгуначнікаў знайшоў гару новых дакументаў, па групе Савіча... - Шыковіч развёў рукамі. - Акрамя ўсяго іншага, гэтыя людзі здорава ўмелі маўчаць.
- Але, - згадзіўся чэкіст. - Не дзеля ўласнай славы яны змагаліся. І не думалі, што нам з вамі прыйдзецца не спаць начамі, каб даследаваць іх дзейнасць.
Не спыняючы размовы, маёр набраў нумар тэлефона, коратка загадаў:
- Арыштаванага Дымара да мяне.
Шыковіч устрапянуўся:
- Што-небудзь новае?
- Зараз пабачыце і пачуеце, - усміхнуўся Сербаноўскі. Падняўся з-за стала, пацягнуўся, падышоў да акна і адчыніў фортачку. - Як ваш сябра Яраш жыве?
Шыковіч насцярожыўся: ці не дайшла і сюды, у гэты старажытны будынак, плётка пра сувязь Антона о Зосяй? Адказаў жартам:
- Рэжа людзей без літасці.
- Мне Вагін расказваў: здорава ён выступіў на сесіі. Малайчына!
- Але. Прыйшлося каму-нікаму пачухацца.
Пастукалі ў дзверы.
- Заходзьце! - гучна крыкнуў Сербаноўскі. Хутка ўзяў ад сцяны крэсла, паставіў на вугал стала, з таго боку, дзе сядзеў сам. Кіўнуў Шыковічу: - Сюды, калі ласка...
Кірыла хутка перасеў.
Ён чакаў убачыць у арыштаваным грамілу з бандыцкай мордай, а ўбачыў раптам у дзвярах старога - сівога, сухога, з пакорліва-дабрадзейным выразам твару. Салдат з аўтаматам на грудзях пачаў дакладваць:
- Таварыш маёр...
Сербаноўскі спыніў яго знакам рукі:
- Пасядзіце ў калідоры.
- Слухаюся, таварыш маёр! - Шчоўкнулі абцасы, бясшумна зачыніліся дзверы.
Стары, як бы раптам успомніўшы, сарваў з галавы кепку:
- Добры дзень, грамадзянін следчы.
- Добры дзень, - адказаў Сербаноўскі як быццам і ветліва, але Шыковіч адразу адчуў знявагу і агіду ў яго голасе.
Маёр стаяў каля акна, залажыўшы рукі за спіну. Шыковіч упершыню ўбачыў яго такім - высокім, стройным, паважным і нават гордым, магчыма, за сваю нялёгкую, але пакуль што вельмі патрэбную прафесію. Ва ўсякім разе, у гэты момант ён зусім быў не падобны на таго сутулага, са змораным тварам капітана, якога Шыковіч некалі сустракаў на вуліцы і чамусьці неўзлюбіў завочна, пакуль не пазнаёміўся, не пачаў разам працаваць.
- Сядайце, - паказаў Сербаноўскі арыштаванаму на крэсла, што стаяла амаль пасярод пакоя.
Стары цяжка ўздыхнуў і сеў. Маёр прайшоў міма яго і зайшоў з другога боку стала на сваё месца.

«Няўжо гэты дзядуля сур'ёзны злачынца? - думаў Шыковіч, разглядаючы арыштаванага. - Такі бяскрыўдны твар. Тонкія кісці, пальцы рук, як у музыкі. Няўжо з інтэлігентаў? Не, ёсць у ім нешта лакейскае. Хутчэй афіцыянт які-небудзь. Сумеў агледзець мяне так, каб не сустрэцца позіркамі. Ацаніў касцюм».
Сапраўды, сівы дзядуля прыкінуў па адзенню: хто гэты другі - цывільны ці пераапрануты чэкіст? Пазнаваць людзей па вопратцы ён умеў добра.
- Грамадзянін... - Сербаноўскі як бы забыўся прозвішча і заглянуў у паперы, - Дымар-Сокалаў-Беразоўскі... Я ўсё забываю, якое з гэтых прозвішчаў ваша сапраўднае?
- Ну Дымар, Дымар, Ды-ы-ма-ар, - раздражнёна праскрыпеў стары.
Сербаноўскі ўскінуў галаву, сказаў:
- Я прашу вас спакайней.
- Ды я спакойны, грамадзянін следчы. Я ўжо спакойны, - раптам скіс, згорбіўся арыштаваны, нахіліўся, кранаючыся кепкай падлогі.
- Чым вы займаліся да вайны, Дымар?
- Рабіў закройшчыкам у атэлье,
- У часе вайны?
- Трымаў сваю майстэрню, кравецкую. Невялічкую.
- А яшчэ чым займаліся?
- Эх, грамадзянін начальнік! - ляпнуў раптам стары кепкай па падлозе, выпрастаўся, упершыню не хаваючы вачэй, паглядзеў на Шыковіча. - Не абрыдла вам цягнуць адно і тое ж па дзесяць разоў?
- Адказвайце на пытанні!
- Ну, выконваў некаторыя заданні паліцыі, - глуха, у падлогу, адказаў Дымар.
- Чые яшчэ заданні выконвалі?
- У СД не служыў! - пісклява крыкнуў арыштаваны. - Чаго не было, таго не было! Я ўсё вам сказаў. Нагаворваць на сябе мяне не прымусіце!
- Чакайце, чакайце. Не прыкідвайцеся дурнем. Нам добра вядомы ўзаемаадносіны СД і паліцыі. І вам яны не горш вядомы. Якія канкрэтна заданні вы выконвалі?
Прозвішча выпала ў Шыковіча з галавы - эпізадычная асоба, а яму трэба было ў працэсе запамінаць сотні розных прозвішчаў, беларускіх, расейскіх, нямецкіх. Але калі ён пачуў аб прафесіі гэтага чалавека, то адразу прыгадаў Ярашаў расказ. Не стрымаўся, звярнуўся да Сербаноўскага:
- Прабачце, Анатоль Барысавіч. Як імя, імя па бацьку арыштаванага?
- Адказвайце, Дымар!
- У вас жа запісана.
- Пытаюць у вас.
- Назар Авяр'янавіч.
- Гэты тып шпіёніў за Ярашам, - сказаў Шыковіч маёру.
Дымар зноў выпрастаўся, з неўразуменнем паглядзеў на Шыковіча, які задае пытанні зусім не прафесійна. Значыцца, не чэкіст, не вышэйшы начальнік. Хто ж? Сведка?
- Вы ведаеце Яраша? - спытаў у яго Сербаноўскі.
- Не, не, - хутка, не падумаўшы, адказаў здраднік. - Такога прозвішча не чуў.
- Кузьма Клешч. Пажарнік. Ведалі такога?
Дымар на хвіліну задумаўся, непрыгожа, па-старэчы, звесіўшы сківіцу, ад чаго рот ператварыўся ў нейкую бясформенную шчыліну. Потым як быў узрадаваўся:
- Ах, Клешч? Пажарнік? Помню, помню. Прызнаюся, меў заданне прасачыць за ім. Меў, меў... Але. Грамадзянін начальнік! Прашу запісаць гэта. Не выдаў. Не. Не выдаў, хоць раскусіў, што гэта за птушка. Аро-ол! - на высокай ноце, як бы з захапленнем выгукнуў стары шакал і раптам хіхікнуў: - Гэта ж ён Лучынскага... фота яго пасля размножвалі. А я не выдаў. Добры чалавек. Спадабаўся мне. Значыцца, жыве Кузьма Клешч? Хе-хе, Клешч. Вось вам яшчэ факт. Запішыце. Не выдаў я добрых людзей!
- Гэта запішам, - сказаў Сербаноўскі, сапраўды старанна занатоўваючы ўсю размову, яго проста-такі прафесійна ўзрадавала, што Яраш ведае здрадніка і на працэсе будзе такі аўтарытэтны сведка.
- Ад каго вы, Дымар, атрымалі заданне шпіёніць за Кляшчом?

- Усё ад таго ж Швагерава.
- А Лотке вы ведалі? - спытаў Шыковіч.
- Лотке? Немец? Першы раз чую.
- У той час, калі вы шпіёнілі за Ярашам, Лотке быў механікам у пажарнай.
- Я пажараў не тушыў, - нахабна і нечакана дзёрзка адказаў здраднік.
- Вы іх распальвалі, - кінуў Сербаноўскі, запісаўшы і гэты дыялог.
Нечаканыя адкрыцці далі новы матэрыял, новых сведкаў.
У Шыковіча цудоўная памяць. У падполле ён улез грунтоўна. Але ён, Сербаноўскі, ведае, што больш за ўсё зараз цікавіць пісьменніка. Дзеля гэтага і паклікаў яго сюды.
Узяўшы з папкі пажоўклы аркуш з вучнёўскага сшытка, Сербаноўскі паказаў яго арыштаванаму.
- Вы пісалі?
- Ну я. Я. Я! - зноў раздражнёна, перакасіўшы твар і прыціснуўшы дзвюма рукамі кепку да грудзей, праскрыпеў Дымар.
Маёр падсунуў аркуш да Шыковіча. Кірыла ўбачыў тую ж запіску начальніку следчага адзела паліцыі пра Савіча, якую ўжо аднойчы Сербаноўскі паказваў яму.
- Ён?
- Ён. Паўмесяца адмаўляўся. Не хацеў прызнаваць ніякіх экспертыз. Пакуль не выклікалі з далёкіх краёў таго, каму адрасавана запіска.
Здраднік сядзеў, панурыўшы галаву, быццам і не слухаў, не чуў, пра што гавораць следчы і гэты, другі, незнаёмы.
- Грамадзянін Дымар, што вы можаце сказаць пра доктара Савіча?
- Што я магу сказаць пра Сцяпана Андрэевіча Савіча? - Ён па-жаночы гаротна схіліў сваю маленькую сівую галаву набок, паківаў ёй. - Я магу толькі сказаць, што гэта быў залаты чалавек. Я пятнаццаць гадоў шыў яму касцюмы і паліто. Прымяраў на даму. І заўсёды выходзіў з гэтага дома начаставаны вось так. - Дымар правёў далоняй па шыі; дзіўна мяняліся інтанацыі яго голасу: то ён скрыпеў, як старая асіна, то сыпаў, як гарохам, то цягнуў павольна, з амаль лірычнай задумлівасцю.
- І вы гатак аддзякавалі яму? - не вытрымаў Кірыла.
Здраднік закаціў вочы пад лоб, быццам намерваўся прачытаць пакаянную малітву.
- Усё зло ў свеце ад грошай. Хацеў выбіцца ў людзі... - Ён цяжка ўздыхнуў.
- На смерці другіх?
Спачатку Кірыла слухаў спакойна. Больш было прафесійнай цікаўнасці да гэтай быццам выкапанай пачвары, да таго, як ён паводзіць сябе, і наогул да ўсяго працэсу допыту, чым абурэння, гневу. Але калі дайшло да Савіча, калі здраднік з цынічным прытворствам пахваліў нябожчыка, у Кірылы перавярнула ўсю душу. У яго не было выпрацаванага гадамі спакою Сербаноўскага. Яго прафесія дазваляла яму даваць волю сваім пачуццям. Ён адчуваў, як усё мацней і мацней грукае сэрца, аж пачало звінець у вушах. Ён зняў са стала рукі свае, каб яны былі далей ад цяжкага чарнільнага прыбора. Мабыць, маёр адчуў, што робіцца з ім, бо сурова сказаў арыштаванаму:
- Давайце, грамадзянін Дымар, без філасофіі. Што дало вам падставы напісаць такую запіску?
- Чуццё. Я ды каб не ведаў Савіча! Хе. Як аблупленага. Я ніколі не верыў, што ён шчыра служыць немцам. Ён заказаў у мяне касцюм. Я на прымерках пачаў «мацаць», чым жа ён дыша. Даверліва расказаў яму пра зверствы гітлераўцаў. А ён кажа: мы самі вінаваты. І супраць партызан нешта сказаў. Хе, Савіч супраць партызан! Я падумаў тады: «Каго ты хочаш правесці, доктар Савіч? Хе».
- Ну і гніда! - кінуў Шыковіч з агідай.
Здраднік уздрыгнуў, але тут жа натапырыўся, як певень, віскнуў:
- Прашу не абражаць! Я чалавек...
- Які ты чалавек! Ты горш вошы тыфуснай!..
- Кірыла Васільевіч! - дакорліва паківаў галавой Сербаноўскі.
- Калі да мяне будуць вось так, я не скажу больш ні слова. - І Дымар надзьмуўся, ужо з інакшым выразам адвесіўшы сківіцу.
Шыковіч толькі цяпер убачыў, што ўсе зубы ў яго ўстаўныя. Ад гэтага зрабілася так брыдка, што Кірыла баяўся, каб не званітавала.

- Гэта вы засвоілі, - сказаў Сербаноўскі, набіраючы нумар тэлефона. - Ало. Швагерава да мяне. - Паклаўшы слухаўку, паўтарыў: - Свае правы вы засвоілі, - і сказаў Шыковічу: - Аднойчы, калі ён вывеў мяне з цярпення вось так, як вас, і я павысіў голас, ведаеце, што сказаў гэты «законнік»? «Можа, ударыць хочаце? Ага, баіцеся! Не той час». Ніколі, ні ў які час, я не стаў бы пэцкаць рукі аб вас, Дымар. Брыдка.
Шыковіч спытаў ужо амаль спакойна?
- Усё ж цікава, што вас прымусіла прадаваць людзей фашыстам? Лепшых людзей.
Дымар заплюшчыў адно вока, быццам крыўляўся, як блазен, і не адказваў.
- Раскажыце, як вы сталі Беразоўскім, - загадаў маёр.
Здраднік заплюшчыў другое вока і звесіў сівую галаву на грудзі.
Расказаў сам Сербаноўскі:
- Вам гэта павінна быць цікава, Кірыла Васільевіч. Знішчыўшы дакументы на Дымара, ён сімуляваў прыступ эпілепсіі. Упаў на вуліцы ўвечары. У Куйбышаве гэта было. Так, Дымар? Натуральна, трапіў у бальніцу. Апрытомнеў - цап-мац, пуста ў кішэнях. Усё нібыта вычысцілі: дакументы, грошы, гадзіннік. Прозвішча? Беразоўскі, Сяргей Пятровіч. Па даведцы з бальніцы атрымаў новы пашпарт. Хутка асталяваўся ў Вольску. Лепшым краўцом лічыўся ў рабочых цэментавых заводаў.
Дымар на міг падняў галаву, і дзіўная ўсмешка скрывіла яго бяскроўныя вусны.
У пакой, атрымаўшы дазвол, увайшоў каранасты барадач у ватоўцы, у высокіх юхтовых ботах. Постаць яго, хада, рукі выдавалі чалавека фізічнай працы. Можа, таму недарэчнымі і непатрэбнымі здаваліся акуляры на яго барадатым шырокім твары.
Шыковіч угледзеў, з якой нянавісцю зірнуў на дзябёлага барадача мізэрненькі Дымар.
Швагераў - былы следчы паліцыі - прывітаўся і дысцыплінавана пачакаў каля парога, пакуль Сербаноўскі не паказаў яму, куды сядаць.
- Ну, чым вы займаецеся? - спытаў маёр.
- Аглядаю горад. Які горад вырас! Які горад! - і ўздыхнуў на поўныя грудзі не то ад захаплення, не то шкадуючы, што горад збудаваны без яго.
- Горад - песня, - згадзіўся Сербаноўскі.
- Песня?! Гэта вы добра сказалі. - Швагераў, не здымаючы акуляраў, выцер чыстай хусцінкай вочы.
- Скажыце, Швагераў, што даносіў вам Дымар пра Кузьму Кляшча?
Падследчы насцярожана павярнуў галаву да сведкі. Швагераў задумаўся.
- Я вам напомню. Пра таго хлопца, які пакараў Лучынскага.
- Ах, пра Яраша?
- Скажыце, адкуль вы ведаеце яго сапраўднае прозвішча?
- Пасля таго здарэння хутка ўстанавілі, што ніякі ён не Клешч, а студэнт медтэхнікума Яраш. Уся паліцыя была паднята на ногі, каб знайсці яго.
- Хочаце ведаць, у каго ён хаваўся? У доктара Савіча.
Кашлатыя бровы Швагерава варухнуліся ад здзіўлення. А Дымар каўзануўся на крэсле і праскрыпеў:
- Пра Кляшча я нікому слова не сказаў.
Швагераў паківаў галавою:
- Мне пра Яраша ён не гаварыў.
- Швагераў, я не хачу вам лішні раз напамінаць, што значыць для вас шчырасць і сумленнасць.
- Таварыш маёр! За сваю віну я пятнаццаць год меў. Нядаўна пачаў жыць нанова. Адчуў сябе чалавекам. Вы чыталі мае характарыстыкі... Дык няўжо вы думаеце, што я буду цяпер выблытваць гэтага... павука?
- Сам ты павук! - злосна агрызнуўся Дымар.
- Быў, - спакойна згадзіўся Швагераў. - Але цяпер стаў чалавекам.
- Вы ведалі, - Сербаноўскі глянуў у паперы, - Лотке? Механік у пажарнай быў перад здарэннем з Лучынскім.
- Лотке? - Швагераў хмыкнуў. - Якіх толькі прозвішчаў у яго не было. Гэта Ганс Крафт. Каланіст з Украіны. Шпіён.
- Агент СД?
- Безумоўна.

- Дымар быў знаёмы з Крафтам?
- Не, не быў! Не ведаю ніякага Крафта! - паспяшаўся адмовіцца стары правакатар.
- А па-мойму, быў, - сказаў Швагераў. - Нешта мне прыпамінаецца, што, калі ты шыў мне касцюм, Крафт таксама прыйшоў на прымерку. Тады ён быў у форме чыгуначніка.
- Мала каму я шыў! Усіх...
- Ясна! - перапыніў Сербаноўскі. - А цяпер паўтарыце коратка свае паказанні па справе Савіча.
Швагераў зразумеў, што паўтарыць трэба для гэтага, другога, незнаёмага яму чалавека ў цывільным, і павярнуўся да Шыковіча, пачаў расказваць яму:
- Ну, Савіча мы лічылі надзейным. Вядома, для «новага парадку». Многія дзеячы выклікалі падазрэнне. Ён - не. І раптам яго запіска, - кіўнуў на Дымара, потым на стол, - тая, што ў справе. Я ведаў яго манеру, - зноў кіўнуў на свайго былога сябра. - Там, дзе няпэўна, ён гаварыў вусна, дзе пэўна, заўсёды пісаў, каб пакінуць дакуменцік, відаць.
- Хлусіш! - праскрыпеў Дымар.
- Навошта ж мне хлусіць? Я нават разгубіўся. Прызнаюся, было жаданне самому злавіць такога сама, як доктар Савіч. Падзяка, грошы, кар'ера, няхай яны спрахнуць... Мы ж там адзін аднаму не верылі, адзін аднаго хаваліся, каб перахітраваць, вырвацца ўперад. Але пабаяўся я сам... Вялікая адказнасць. Куды мне! Начальніку сказаў. Той, помню, таксама разгубіўся. Калі, кажа, Савіч з імі, з нашымі, значыцца, з партызанамі, нікому, кажа, з нас не будзе веры ад СД. Уцячэ Савіч - труба будзе нам. Узяць яго без доказаў - таксама не лягчэй. Адным словам, ламаў галаву начальнік. Мне нічога не даручыў, хоць справай з медыкаментамі займаўся я. Але мы яшчэ раней дамовіліся весці яе, як звычайную крымінальную. Гэта, ведаеце, куды прасцей: крымінальнымі справамі менш цікавіліся. Хто з іх данёс у гестапа, - ён, - зноў ківок у бок Дымара, - ці начальнік паліцыі - гэтага я не ведаю.
- Сам ты!.. Сам данёс! - раптам закрычаў Дымар. -А цяпер хочаш зваліць на мяне? Хочаш быць чысценькім? Не выйдзе!
- Не, я не чысценькі. Але я ў сорак чацвёртым прыйшоў з лесу. Вось я, судзіце. А ты дзе быў? Не я пачаў шпіёніць за Савічам. Я наогул ні за кім не шпіёніў. Я вёў справы як следчы.
- Па сутнасці, - заўважыў Сербаноўскі.
Швагераў зноў павярнуўся да Шыковіча.
- Натуральна, што Савічам занялося само гестапа. Не паспелі мы агледзецца, як усё здарылася... Пасля я даведаўся, што ў дзень налёту і смерці доктара гестапа стала вядома, што ў яго хаваецца прадстаўнік партызанскага штаба. Ад каго, якім чынам яны даведаліся пра гэта, ніхто мне не сказаў. Але, безумоўна, гэта паскорыла развязку. У паліцыі казалі, што Савіч адстрэльваўся. Сапраўды, былі забіты два гестапаўцы і тры ці чатыры ранены. Забілі Савіча ці сам застрэліўся - пра гэта маўчалі. Хто мог разявіць рот, калі афіцыйна было аб'яўлена, што доктара забілі партызаны? Пасля нашаму начальніку расказаў п'яны ад'ютант фельдкаменданта лейтэнант Крэйман, што ў часе аперацыі «Доктар» - яны назвалі гэта цэлай аперацыяй - машыны гестапа былі абстраляны з суседняга саду з аўтаматаў. Відаць, тады і былі забіты і ранены гестапаўцы. Мяркую, што гэта і навяло іх на думку аб'явіць, што Савіч забіты партызанамі. Вы пыталіся, навошта трэба была акупантам такая правакацыя? Я так думаю: баяліся прыкладу. Калі агласіць, што шасцідзесяцігадовы доктар, кіраўнік аддзела гарадской управы, вёў актыўную барацьбу, як бы гэта ўзняло дух падпольшчыкаў і ўсіх патрыётаў. А так, наадварот, магло дэмаралізаваць тых, хто быў звязаны з Савічам. Па гэтай справе я ведаю яшчэ, што лекар інфекцыйнай бальніцы Акулава...
- Вакулава, - паправіў Шыковіч.
- Мне добра помніцца, што начальнік сказаў - Акулава. А можа, і не так... Столькі прамінула год! Дык вось гэтая жанчына ў калідоры гестапа, па дарозе на допыт ці з допыту, спрабавала вырваць у канваіра аўтамат. Вядома, была застрэлена на месцы. Мабыць, гэтага яна і хацела. Такі выпадак быў не адзіны. Скатаваныя людзі кідаліся на аўтаматы.
- Швагераў, чаму ў вашых паказаннях на працэсе пра Савіча нічога не сказана?
- Ні следчы, ні суддзі, пэўна, не надалі запісцы ўвагі і не націскалі на гэты факт. А каму, грамадзянін начальнік, хацелася браць на сябе лішнюю справу? Каб атрымаць «вышку»? Ваенны час. Ваенны трыбунал. Маё шчасце, што я сам з'явіўся.
Шыковіч спытаў пра другія групы, пра правалы - хто вінаваты, хто выдаў? Дымар маўчаў. Швагераў адказваў ахвотна і, здавалася, шчыра, але не без хітрасці: стараючыся так падаць усё,

каб нідзе не ўблытаць сябе. А вядома, што «паліцыя агульнага парадку» крымінальнымі злачынствамі займалася між іншым і ў большасці выпадкаў забойцаў, рабаўнікоў, зладзеяў рабіла правакатарамі, агентамі; галоўная дзейнасць паліцыі, у тым ліку і следчага аддзела, была скіравана на выкрыццё савецкіх патрыётаў, на дапамогу гестапа і СД. Таму былы следчы з надзвычайнай асцярожнасцю абыходзіў небяспечныя мясціны. Але Шыковіч і Сербаноўскі ведалі значна больш, чым думалася Швагераву; мелі магчымасць супаставіць факты, параўнаць яго паказанні з іншымі крыніцамі. Што-нішто ён усё-такі праясніў і ўдакладніў. Раскрыў, напрыклад, структуру і метады шпіянажу, даўшы Кірылу новы матэрыял для кнігі. Калі нарэшце арыштаванага адвялі, а сведка пайшоў чакаць вырашэння свайго лёсу: застанецца ён толькі сведкам ці сядзе на лаву побач з агентам, Сербаноўскі сказаў:
- Вось цяпер, я думаю, ніхто ўжо не затрымае ваш артыкул. Устаўляйце запіску, карыстайцеся пратаколам допыту - і друкуйце. Толькі назву прыйдзецца мяняць. Думаю, што больш не існуе пытання, хто ж такі доктар Савіч?
- Асабіста для мяне яго даўно не існавала.
- Але патрабаваліся доказы.
- Дзякую вам.
- Няма за што. Святы абавязак.
- Як вам удалося выкапаць гэтага дыназаўра?
- Няхай гэта застанецца нашай прафесійнай тайнай.
Яны хораша, з разуменнем усміхнуліся адзін аднаму, як два добрыя сябры, якія агульнымі сіламі зрабілі карысную справу.

* * *

- Хадзем да Зосі. Я люблю прыносіць людзям добрыя весткі.
Яраш, надзвычай узбуджаны расказам пра Дымара, хадзіў па сваім кабінеце, прыгадваў паводзіны агента, калі той сачыў за ім, выкрываў філасофію здрады. Нечаканая прапанова Кірылы захапіла яго знянацку.
- Да Зосі? - Ён спыніўся каля акна і як бы раптам патух: уся яго магутная і прыгожая постаць у чорным світэры ў нейкі міг зрабілася каржакавата-нязграбнай. Ён згорбіўся, выгнуў шыю, быццам убачыў нешта незвычайнае ў белай ваце паміж рамамі.
- Няўжо баішся? - укалоў Кірыла без злоснага намеру.
Яраш крута павярнуўся да сябра. На твары яго з'явілася пакутлівая грымаса.
- Я даў клятву... Галі.
- Ух, людзі добрыя! Да чаго мы дажылі!
- Я ніколі не парушаў сваіх клятваў. - Голас Антона Кузьміча ўпаў да шэпту.
Кірыла ўзлаваўся. Падхапіўся, адскочыўшы ад крэсла, як гумавы мяч, пакаціўся да кніжных паліц, што займалі ўсю сцяну. Загрымеў на поўны голас, забыўшыся, што ў суседнім пакоі Наташа:
- Ты прабач... Я паважаю клятвы... Паважаю Галіну... Але калі на кожны бабскі капрыз... Не будзе ж жыцця...
Яраш знясілена апусціўся ў тое ж мяккае крэсла, дзе толькі што сядзеў Шыковіч, выцер далонямі твар.
- Кінь! Я сам ведаю. Але калі не хапае розуму і, я ўжо казаў табе, звычайнай інтэлігентнасці... Што рабіць? Скажы, інжынер душ?
Пасля прымірэння Галіна вырвала ў яго гэтую клятву - што ён ніколі больш не наведае Зосі. Ён пакляўся з бяздумнай лёгкасцю, абы замацаваць прымірэнне, бо бачыў, як цяжка перажываюць разлад дзеці. Пасля зразумеў, што такая клятва абражае яго. Хіба ён у чым вінаваты? Магчыма, у яго і не было б патрэбы і ахвоты заходзіць больш да Зосі. А цяпер яму рабілася брыдка за ўласную слабасць і бязвольнасць і часта хацелася пайсці да Зосі на злосць жонцы. Дзіўна, што жаданне такое мацнела з кожным днём. Ён змагаўся з ім. Ён сумленны чалавек і сапраўды ніколі не парушыў свае клятвы. Урэшце, справа не ў клятве. Ён проста вышэй за ўсё гэта і не дазволіць, каб подласць плеткароў і жончына неразумнасць давялі іх да разрыву, што было б трагедыяй і для іх абаіх і яшчэ большай - для Віктара і Наташы.

Так ён думаў. Але ад гэтай лагічнай разважлівасці не рабілася лягчэй. Ён мог усё даравацъ, але нічога не дараваў сабе - памылак, слабасці, неразумных слоў, непатрэбных учынкаў. У той міг ён пазайздросціў Шыковічу і ўзлаваўся за гэта на сябе і на яго.
Кірыла раптам спыніў разважанні, якія ён было пачаў, аб ролі мужа ў выхаванні жонкі. Мабыць, ён адчуў, што сябру непрыемна і цяжка выслухоўваць гэта. А можа, упершыню адчуў непавагу да таго, кім захапляўся, хаваючы сваё захапленне за кепліва-жартаўлівымі словамі. Яшчэ ўлетку на дачы ён неяк сказаў пра Яраша: «Такі вялікі і такі маленькі перад жонкай». Гэта быў жарт. Аднак, магчыма, падсвядома хацелася, каб яго лепшы сябра і герой быў вялікі ва ўсім. Зашпіліўшы верхні гузік на сарочцы і падцягнуўшы гальштук перад чорнымі тамамі энцыклапедыі, Шыковіч грубавата сказаў:
- Чорт з табой! Пайду адзін, - і рушыў да дзвярэй.
У суседнім пакоі зірнуў цераз Наташына плячо ў кнігу, якую дзяўчынка чытала, дакрануўся далоняй да яе белых шаўкавістых валасоў. Яна глянула на яго і ўсміхнулася вінавата, як бы просячы за штосьці прабачэння, можа, за тое, што падслухала іх размову, ці, можа, за бацькаву нерашучасць.
Кірыла апранаўся ў калідоры. Калі выйшаў Антон, ён таксама пачаў моўчкі апранацца. Праз адчыненыя дзверы Наташа глядзела на бацьку з ухвалой і страхам, нібы несла адказнасць за яго ўчынкі.
На дварэ добра прымарозіла. У паветры кружыліся сняжынкі. Але асфальт вуліцы быў сухі і шэры ў цьмяным святле ліхтароў, пабялелі толькі лункі каля ліп і каштанаў.
Шыковіч даўно ўжо прыкмеціў: у іх горадзе найбольшы рух на тых вуліцах, што ідуць паралельна цэнтральнай, а на тых, што перасякаюць яе, нават у нядзелю ціха і бязлюдна, хоць гэта бадай самыя прыгожыя вуліцы, нешырокія, зялёныя, утульныя, асабліва іх кароткія ўчасткі ад Савецкай да ракі. Шыковіч любіў гэтыя вуліцы. Любіў гуляць па іх.
Яны ішлі не спяшаючыся. Звычайная рабочая хада ў Яраша такая, што побач з ім трэба ісці ўподбег, каб не адстаць. А тут ён ішоў надзіва павольна - магчыма, усё яшчэ вагаўся. Яны як бы знарок забыліся, да каго і з якой прычыны ідуць.
- Што, аднак, ты думаеш рабіць з дачай?
- Паеду, раскладу пасярод кабінета касцёр, пагрэю вочы... Асалода на ўсё жыццё.
- Не вярзі лухты, Кірыла.
- А як інакш ты яе знясеш за месяц? Куды?
Тры дні назад яны атрымалі рашэнне аблвыканкома, у якім ім прапаноўвалася ў месячны тэрмін знесці дачу. Матывы: зямельны ўчастак адведзены райвыканкомам незаконна. Яраша гэтая бюракратычная паперка здзівіла, пакрыўдзіла і расстроіла, Кірылу - абурыла.
- Гуканаў ход канём! - адразу здагадаўся ён.
- Але ж гэта не яго сфера.
- Ты наіўны чалавек, доктар.
- Навошта яму?
- Даць нам лішні клопат, выбіць з нармальнай каляіны, адцягнуць увагу, абвінаваціць у прыватна-ўласніцкіх тэндэнцыях. Зусім нядрэнна прыдумана. Заадно паказаць сваю прынцыповасць і непрымірымасць да перажыткаў...
- Але як маглі прыняць такое рашэнне, не пагаварыўшы нават з намі? Быццам мы з табой дармаеды нейкія, - перажываў Яраш.
Яны хадзілі ў выканком. Іх ветліва прымалі, выслухоўвалі, спачувальна паціскалі плячамі. Здавалася, ніхто нічога не ведае. Толькі намеснік старшыні Мухля чамусьці ўзлаваўся:
- А што вы хацелі, таварыш Шыковіч? Будаваць асабнякі, калі людзі не маюць яшчэ звычайных кватэр? Вам волю дай - палову калгаснай зямлі захопіце...
Кірыла таксама ўзлаваўся.
- Ясна. Значыцца, ты хапуга і спекулянт, доктар Яраш! - сказаў ён сябру, які панура маўчаў, барабанячы па замку партфеля.
Мухлю стала няёмка перад Ярашам.
- Ніхто так не думае. Не кідайцеся словамі, Шыковіч. Мы абавязаны былі паправіць райвыканком.
- Іншым чынам гэта нельга зрабіць?
- Падумаем. Пастановы часам адменьваюцца.

Але пастанова не адмянілася. У той дзень яны атрымалі напамінак з раёна, на зямлі якога стаяла дача. Райвыканком скасаваў сваё, трохгадовай даўнасці, рашэнне аб адводзе ім зямельнага ўчастка. Абжытая будыніна не мела права стаяць на зямлі.
Ад злосных жартаў Кірыла паступова перайшоў да менш злоснай сур'ёзнасці і разважлівасці:
- Днямі бюро гаркома займалася майстэрнямі для мастакоў. Абавязалі гарсавет знайсці патрэбныя памяшканні. А я сам, за сумленна запрацаваныя грошы збудаваў сабе майстэрню. Мне не дача патрэбна! Мне трэба цішыня!
Ён гаварыў гучна, размахваў рукамі. Прахожыя азіраліся на яго, як на п'янага. Захапіўшыся, ён не заўважыў, што той, каму ён усё гэта гаворыць, бадай не слухае яго. Яраш раптам страціў цікавасць да гэтай дачнай праблемы, і яму стала ўсё адно, што будзе з іх дачай. Няхай хоць сапраўды Кірыла распальвае там касцёр.
Калі падыходзілі да дома, дзе жыла Зося, Антона Кузьміча апанавала незразумелае хваляванне. Такога пачуцця ён не ведаў ужо даўно, магчыма, з гадоў юнацтва. Было радасна і боязна. Амаль страшна, аж халадзела пад сэрцам. Ён прыслухаўся да сябе, каб зразумець, што гэта. І не мог зразумець. Боязь жонкі? Але адкуль гэтая радасная нецярплівасць? Як у юнака перад першым спатканнем. Дзіўна. Можа, яму няёмка перад Машай, якая, напэўна, будзе там? Не, няпраўда, што пачуцця такога ён не ведаў сто год. Яно ўжо неяк з'яўлялася і, здаецца, зусім нядаўна. Калі? З якой прычыны? Нешта знаёмае, блізкае і адначасова далёкае, забытае. Пэўна, адно - парушана душэўная раўнавага. Кім? Ці чым?
Многа год ён меў той спакой, упэўненасць, што нараджаюцца ад веры, ад пераканання ў карыснасці сваёй дзейнасці, ад пазнання людзей і з'яў ва ўсёй іх дыялектычнай складанасці. Былі, безумоўна, хваляванні: перад цяжкімі аперацыямі, перад нараджэннем дзяцей, у часе іх хваробы, пасля сварак з жонкай, ад яе беспадстаўнай рэўнасці. Але ўсё гэта было проста і ясна як божы дзень, яно ядналася адным акрэсленым паняццем - быццё. А гэтае хваляванне не падобна ні на адно з тых, ранейшых. Ён спытаў у Кірылы:
- Ты не баішся, што наш візіт падмацуе плёткі?
- А ты баішся ўсё-такі?
- Баюся, - прызнаўся Яраш, каб хоць чым-небудзь вытлумачыць свой душэўны стан. - Ты ведаеш Галіну.
- Ты проста дрэнна выхаваў яе. Ідэаліст - вось ты хто. Хірург-ідэаліст - унікальная рэдкасць. Мае сталічныя калегі, якія пішуць слязлівыя вершы, у сто разоў больш практычныя і зацвярдзелыя... Каб я напісаў, што былы падпольшчык, славуты хірург так заціснуты жончыным абцасам...
- Трапло ты. Абараняй свае тэндэнцыі. Але май на ўвазе, што я думаю аддаць сваю палавіну нашаму прафсаюзу пад летні дзіцячы сад.
Шыковіч сігануў наперад, зазірнуў знізу ўгору сябру ў твар, каб пераканацца, сказаў той сур'ёзна ці жартам. Яраш глядзеў удалеч, некуды ў канец вуліцы, быццам хацеў нешта разглядзець у святле цьмяных ліхтароў.
- У нас розныя прафсаюзы. Не пагіраццa. У іх аднолькавыя характары. - Шыковічу спадабаўся ўласны жарт, і ён засмяяўся.
Яраш таксама хмыкнуў.
Ім адчыніла Маша.
- Ах, вы?! - здзівілася яна. - Калі ласка! - Аднак не адступала ад дзвярэй, не прапускала іх, быццам хацела адцягнуць час і даць некаму схавацца ці замясці нейкія сляды.
Шыковіч нахіліўся і жартаўліва нырнуў пад яе руку, якой яна ўсё яшчэ трымалася за адчыненую палавіну дзвярэй.
«Няўжо плётка дайшла і да яе?» - амаль са страхам падумаў Яраш.
Маша збянтэжана адступіла, і ён нерашуча ўвайшоў у калідор. З пакоя выйшла Зося. Яраш не бачыў яе больш за месяц. За гэты час яна яшчэ больш пamaладзела і папрыгажэла. У добра скроеным сінім плацці, з двух'яруснай прычоскай-куклай, расчырванелая, яна мела амаль элегантны выгляд. Як лёгка жанчыны харашэюць!
Зося выявіла шчырую радасць, збянтэжанасці ў яе не было ні кроплі. Яна сказала надзвычай проста:
- Якія вы добрыя, што не забываеце нас. Хоць зрэдку заглядваеце на аганёк. Распранайцеся. У нас ёсць чай.

Але праз адчыненыя дзверы Яраш убачыў у пакоі Тараса. Хлопец сядзеў за нізкім сталом, застаўленым чайным посудам, услухоўваўся ў галасы і крыху дзіўна ўсміхаўся. Хоць Яраш ведаў, чаму ён тут, і ў душы ўхваляў яго выбар - абы толькі сур'ёзна, але нечаканая сустрэча з сынам тут, у Зосі, збянтэжыла яго, магчыма, нават больш, чым Машу. Ён адчуў сябе як бы ў нечым вінаватым. Што сказаць Тарасу, калі зойдзе ў пакой? Як будзе паводзіць сябе Тарас? Прыйдзецца прасіць яго, каб не прагаварыўся дома, а то зноў будзе скандал.
Ад гэтай думкі зрабілася да балючасці непрыемна. Тое, што ён вымушаны рабіць з гэтага бязвіннага наведвання тайну, уніжала і абражала. А ўніжэнне для яго, гордага і незалежнага, было самай страшнай карай.
Яраш пашкадаваў, што прыйшоў сюды.

**30**

Грукат крана над галавой быў для Славіка цяпер як нечаканы гром для забабоннага грэшніка. Ён уціскаў галаву ў плечы, палахліва азіраўся і, калі плыла цяжкая дэталь, адступаў, а то і зусім хаваўся за высокія станіны. Ён баяўся падняць вочы вышэй крука - да шкляной будкі, у якой сядзела кранаўшчыца, «дзятлік» з востранькім носікам і вострым чубком, бо сваю чырвоную касыначку Нінка заўсёды чамусьці абпінала «домікам», ад чаго твар яе яшчэ больш завострываўся. Славік баяўся сустрэчы з ёй.
Кран панёс да ўпаковачнай гатовы станок. Яго ўрачыста суправаджалі кіраўнікі цэха і амаль уся Тарасава брыгада. Акрамя Славіка. І Генрыха. Яны былі заняты другім станком: прыладжвалі зманціраваны электрыкамі праграмны вузел. Гэтую тонкую складаную і марудную работу заўсёды браў на сябе будучы інжынер. А ў Славіка гэта была апошняя стадыя вучнёўства, набліжаўся экзамен на разрад, і трэба было, хоць збольшага, ведаць зборку ўсіх вузлоў.
Усунуўшы галовы ў люкі тумбы, яны падганялі счапленне электраматора з перадачай аўтаматычнага з'ёмшчыка дэталей.
Разгружаны кран вяртаўся з лёгкім гулам. Ён ляцеў па доўгім пралёце цэха з хуткасцю цягніка. Звінелі шыбы і дрынчалі незамацаваныя дэталі і ключы на станку.
І раптам усё сціхла: кран спыніўся, замёр. Славік упусціў гайкі, якія падаваў Генрыху. Спіной сваёй, што вытыркала з-пад станка, ён адчуў, што цяжкі крук павіс якраз над ім. Больш таго, ён адчуў позірк Ніны, яна высунулася са сваёй шкляной будкі і глядзіць... глядзіць на яго.
Славік уціснуўся глыбей пад станіну. Хацелася ўсяму залезці ў вузкі люк, схавацца, ператварыцца ў электравузел, каб рухаць станок, а самому нікога не бачыць, нічога не адчуваць.
Не раз за сваё нядоўгае жыццё ён чыніў шкоду. Здаралася, што колькі дзён жыў з бояззю кары. Але ніколі яшчэ ў яго не было такога страху. Агіднае і цяжкае пачуццё! Яно скавала ўсю яго істоту. Яно - як невылечная хвароба, як рак, пра які чалавек ведае і нічога не можа зрабіць для свайго ўратавання, толькі слухае, чакае, калі, як ён праявіць сябе і нанясе апошні ўдар.
Станок уздрыгнуў, як жывая істота, - кран паволі рушыў далей.
Славік стоена ўздыхнуў. Генрых сказаў:
- Пасвяці сюды.
Славік падняў вышэй «пераноску», ад яркага святла якой слязіліся вочы.
Генрых кінуў на яго кароткі позірк і рухамі штукара пачаў мацаваць маленькія гаечкі. Недасведчанаму чалавеку, які бачыць станок толькі звонку, можа здацца, што такая аграмадзіна складзена з адных вялікіх і цяжкіх дэталей. Так упачатку здавалася і Славіку. А тут ёсць дэталькі не большыя за гадзіннікавыя, асабліва ў электраабсталяванні. Між іншым, гэтая складанасць і прываблівала няўрымслівага хлопца. Каб усё было проста і аднастайна, як яму ўяўлялася па школьнаму знаёмству з заводамі, адно і тое з хвіліны ў хвіліну, з дня ў дзень, то, напэўна, даўно ўсё абрыдла б. А на зборцы заўсёды нешта новае.
- Што ў цябе з Нінай? - спытаў Генрых, працягнуўшы руку па гайкі і пракладкі.
Рабро станіны здушыла Славіку грудзі. Пракладкі прыліплі да потнай далоні.
- А-а... нічога. Ходзім у кіно...
- Ты ж не любіш яе.
- А хіба нельга так?
- Як «так»?
- Ну... разам працуем, разам гуляем.
- Я сам, стары, раней глядзеў на дзяўчат несур'ёзна. Нібы яны для адных танцулек створаны. З Нінкай нельга так, май на ўвазе. Яна не такая, як тыя... У яе ўсё сур'ёзна. І планы яе сур'ёзныя і

простыя: выйсці замуж, нараджаць дзяцей... Некаторыя моднікі фыркаюць: мяшчанства. Ёлупы! Схіліце галовы! Гэта жыццё ў яго натуральным выглядзе. Самі вы мяшчане!
«Чаму ён гаворыць гэта мне? Няўжо ведае? У вочы, у вочы б яму глянуць».
Але «зайчыкі» ад яго прафесарскіх акуляраў сляпілі. І Славік - што той трусік перад кобрай. Толькі вушкамі варушыў. Куды знікла дасціпнасць, кідкасць: ты мне слова - я табе дзесяць. Ён, акулярысты чорт, здаецца, працуе, а зіркае, усё бачыць. Разбіць пераноску, ці што? Быццам незнарок.
Нарэшце Славік скінуў чары. Выскаліўся:
- Думаў, хоць адзін чалавек як чалавек. А ты - як Ходас і Тарас. Маралісты! - і завыў у вантробе станка: - Сумна жыць, Генрых!
Ён неаднойчы хіліў Варэніка на свой бок вось такімі жартамі. У яго і Косці найлепшае пачуццё гумару.
- Думаеш, калі сапсуеш камусь жыццё, табе стане весялей?
- А каму я псую? Пайшлі вы ўсе...
Хвілін праз колькі Тарас накіраваў яго ў склад па дэталі. Славік напусціў на сябе такую бестурботнасць і весялосць, каб нікому і ў галаву не ўлезла, што ў яго штось нядобрае на душы.
Ён ішоў паміж станкамі, як па лесе. Насвістваў. І раптам з-за станка - яна, Нінка. Носік - чырвоны, вочы - злыя.
- Славік!
Ён спалохана азірнуўся.
- Такая цана тваім словам? Дзе твае вочы бессаромныя? Цяпер табе нічога не трэба? Ведай жа: або на сябе рукі налажу, або цябе станінай прыдушу. Цяпер мне ўсё адно не жыць. - Яна ўсхліпнула.
А побач, за станком, - галасы. Здаецца, начальнік цэха.
Славік схапіў яе за руку.
- Чаго ты? Дурная, дурная... У мяне проста часу няма. Я на падрыхтоўчыя курсы ў політэхнічны паступіў. Кожны вечар... Ну добра. Сёння, сёння...
Ішоў знаёмы рабочы, і Славік, узрадаваны, пакінуў дзяўчыну і закрочыў побач з ім. Расказваў новы анекдот. Хацеў смяяцца. Выціскаў з сябе смех, бо ўсё скаваў страх, новы, невядомы. О, жорсткае жыццё! Ніякай радасці і гэтулькі пакут! Ён праклінаў той час і міг, калі яму прыйшла ў галаву гэтая дзіўная думка - пазабаўляцца з ёй, адпомсціць за свой спалох у першы дзень.
Месяц ён вадзіў яе ў кіно, у тэатр і гаварыў, гаварыў, гаварыў. Пра ўсё на свеце ён ведаў. Заходзіў проста ў інтэрнат, пакідаючы ў строгай каменданткі свой заводскі пропуск. Сяброўкам яе па пакоі падабаўся: вясёлы. Адны, праўда, папярэджвалі: «Ой, глядзі, Нінка, загаворыць ён цябе». Другія падбадзёрвалі: «Хапай, Нінка, на ляту. Закруці яму галаву. Чаго на свеце не бывае! Вунь Лідка за інжынера выскачыла. Цяпер вітацца, зараза, не хоча».
Яна ведала, што не вызначаецца прыгажосцю. Але дзявочае сэрца перамагло розум, нараджаючы адвечную наіўную ілюзію. Хіба адны прыгожыя падабаюцца? Славік пакарыў тым, што не саромеўся паказацца з ёй на людзі - у кіно, у тэатры, знаёміў са сваімі знаёмымі, прыгожа апранутымі хлопцамі і дзяўчатамі, і рабіў гэта, здавалася ёй, з гонарам. Для простай дзяўчыны, якая была яшчэ ў палоне вясковых уяўленняў, гэта з'яўлялася найвышэйшым доказам яго кахання. Магчыма, было і другое: цяга чалавека, які жыў у беднасці і нястачы, да прыгажэйшага, вышэйшага, лепшага.
У тую нядзелю ён з'явіўся ў інтэрнаце раніцай і запрасіў яе на дзённы сеанс. А калі выйшлі з кіно, прапанаваў зайсці да яго дадому. Нінка на міг сумелася, але не ўтрымалася ад спакусы паглядзець, як ён жыве. Увогуле, як жыве пісьменнік? Хіба гэта не цікава? Адначасна мільганула патаемная дзявочая думка, што хлопец хоча паказаць яе сваім бацькам. Славік не прызнаўся, што дома нікога няма. Бацькі разам з Ярашамі паехалі на дачу садзіць нейкія адмысловыя дэкаратыўныя кусты, па якія «стары конь» ездзіў ажно на Украіну. Іра з курсам у калгасе, паехалі выбіраць бульбу.
Славік адчыніў дзверы і сам «здзівіўся», што ў кватэры ніводнай душы жывой. Ён паказаў ёй бібліятэку, бацькавы кнігі. Потым уключыў радыёлу і ўсё ставіў «нярасейскія пласцінкі». Пад гукі прыгожай і незразумелай музыкі выставіў на стол доўгую і тонкую пляшку, таксама не нашу. Віно Нінцы не спадабалася - кісляціна. Але яна ведала, што ўсе інтэлігенты п'юць чамусьці

кіслае, а не смачнае салодкае віно, а таму асушыла два высокія келіхі. І ёй стала хораша і весела. Яна сама прапанавала:
- Давай патанцуем.
Яна любіла танцаваць, а Славік не. Ён хадзіў з ёй усюды, толькі на танцы ў заводскі Дом культуры не пайшоў ні разу.
Яны закружылі ў кабінеце вакол маленькага століка, паўз шкляныя шафы, з якіх глядзелі на іх маўклівыя і суровыя кнігі.
Славік пацалаваў дзяўчыну. Нінка шчасліва засмяялася. Яна заўсёды так смяялася, калі ён цалаваў яе. Праходзячы міма канапы, Славік «спатыкнуўся» і... паваліў дзяўчыну на канапу. Пачаў цалаваць прагна вусны, шчокі, шыю.
- Славічак... Родненькі... не трэба, Славічак... Пасля, пасля... даражэнькі... - шаптала яна, цалуючы з такой жа прагнасцю, балюча.
Ён быў у тым узросце, калі сніў пра гэта. І думаў бясконца. І шукаў.
Але адбылося зусім не так, як у сне і ў думках... Калі праз хвіліну наступіла працверазенне, ён замест задавальнення адчуў нешта зусім супрацьлеглае - сорам само сабой, але яшчэ агіду, да гэтага, да сябе, да яе. Раптам убачыў, якая яна непрыгожая, Нінка. І адразу чамусьці ўспомніў Машу, якую даўно не бачыў, але не забываў. Зашчымела сэрца. Нясцерпна захацелася, каб побач была Маша, каб яе рукі абдымалі, яе залатыя валасы датыкаліся яго шчок. І ўсё больш расла непрыязь да Ніны. Нават злосць... Чаму яна так лёгка аддалася? Можа, ён не першы?.. Як лашчыцца!..
- Славічак... даражэнькі... цяпер мы звязаны з табой назаўсёды.
Яго нібы агнём апякло.
«Звязаны... назаўсёды... Усё жыццё з ёй? З-за адной хвіліны? Што яна вярзе? Чаго яна хоча?»
І да ўсяго непрыемнага - яшчэ страх. Як удар. У галаву, у грудзі. Ажно пот выбіла.
А ў гэты момант - званок. Яны падхапіліся. Славік спалохаўся, разгубіўся. Кінуўся да радыёлы, выключыў. Настойліва прагучалі кароткія тры званкі. Іра! Так звоніць яна. А калі бацькі? Славік уключыў радыёлу зноў. Крутнуў рэгулятар гучнасці залішне. Музыка запоўніла кватэру.
Здалося, што Нінка знарок павольна наводзіць парадак у сваім туалеце. І робіць гэта перад ім бессаромна. Славік узненавідзеў яе ў гэты міг. Шыкнуў злосна:
- Хутчэй! - і пабег да дзвярэй. Прыслухаўся. Доўгі званок. Але, Іра. Злуецца. Ён адчыніў. Сястра ляпнула яго па твары рукавіцай, з якой пасыпаўся пясок.
- Соня! Не дазваніцца!
У яго рыбацкай куртцы, у штанах, у акулярах яна падобна была на геолага. Кінула шапку ў калідоры на столік і, нібы ўчуўшы нюхам прысутнасць старонняга, заглянула ў кабінет. Славік убачыў, як Ніна, недарэчна (о, як недарэчна!) абшмаргнуўшы плацце, прывіталася, сарамліва і лісліва. Іра не адказала. Яна глядзела на незнаёмку амаль з жудасцю. Здавалася, не толькі вочы, але і акуляры яе расшырыліся. Потым кінула позірк на брата, позірк бязлітасны, знішчальна-грэблівы, крута павярнулася і пабегла ў свой пакой. Хаця б слова сказала.
«Кобра!» - хацелася крыкнуць Славіку. Аднойчы, калі яны сварыліся, ён ляпнуў гэтую абразлівую мянушку. Рэакцыя была нечаканая: на яго страшэнна ўзлавалася маці, ніколі ён не бачыў маці такой расхваляванай і злоснай. Таму ён баяўся гэтага слова. Не крыкнуў ён нічога ўздагон сястры яшчэ і таму, што злосць на яе тут жа перайшла на Нінку. Але, ва ўсім вінавата гэтая «дзятліха». Не знайшла другога жэста, як абшмаргнуць плацце. Варона.
Разгубленая, пакрыўджаная дзяўчына страціла сваю ўпэўненасць і ад гэтага сцялася, змізарнела. Апранала паліто і палахліва азіралася. Але гэта яшчэ больш раздражняла Славіка. Фу, якая недарэка! Дзе былі яго вочы? Як ён мог звязацца з такой?
Але за дзвярамі кватэры, на лесвіцы, Нінка, як бы страсянуўшыся, як тая птушка, уміг набыла ранейшую ўпэўненасць.
- Пыхлівая якая сястра твая! Падумаеш, пані!
- А што яна, цалавацца з табой павінна была? - груба адказаў Славік.
- А чым я горшая за яе?
У Славіка хапіла тактоўнасці змаўчаць. Калі вёў Нінку ў дом, тады ён не баяўся, што ўбачыць нехта з суседзяў. А цяпер баяўся. Узрадаваўся, што на лесвіцы нікога не сустрэлі. Але на вуліцы было многа народу, і яму пачало здавацца, што многія, асабліва жанчыны, глядзяць на іх з разуменнем і насмешкай. Дагэтуль ён дэманстратыўна знаёміў сваіх стыляжных сяброў з рабочай

дзяўчынай і пляваў на іх кпіны. Цяпер жа халадзеў ад думкі, што можа сустрэць каго-небудзь з гэтых сяброў. Вынаходлівы і не дужа далікатны, ён не мог прыдумаць, як пазбавіцца ад яе, застацца аднаму. А яна, як ніколі, стала гаманкая. Расказвае пра сваіх дзяўчат, што Верка збіраецца замуж. Яго спалохала гэтае слова - «замуж». Дайшлі да Палаца спорту, і ён узрадаваўся нечаканай думцы:

- Я ў басейн. На трэніроўку.

...Безумоўна, паводзіў ён сябе пасля як апошні дурань. Не здолеўшы перамагчы сваю антыпатыю, не пайшоў больш у інтэрнат, не запрасіў Нінку ні разу ў кіно, пазбягаў сустрэчы адзін на адзін у цэху. Яна, аднак, праз колькі дзён падпільнавала яго, заплакала:

- Я табе аддала ўсё. А ты... Зняславіў, насмяяўся... З дзіцем хочаш пакінуць?

«З дзіцем», - во адкуль гэты страх.

«Няўжо яна можа зацяжараць?!» - ні на хвіліну не пакідала яго думка з таго дня. Ён купіў тоўстую кнігу «Акушэрства», прачытаў у пустым асеннім парку ўсё пра цяжарнасць і закінуў кнігу ў кусты. Не, нічога яшчэ яна не ведае. Але зацяжараць можа, калі не ад яго, то ад каго другога, ахвотнікі знойдуцца. А зваліць на яго. Чым больш ён думаў пра гэта, тым больш пераконваў сябе, што Ніна абавязкова гэтак зробіць, і ўсё больш пачынаў ненавідзець дзяўчыну за гэтую яе ўяўную каварнасць. Яе пагроза прыдушыць яго станінай спалохала Славіка значна менш. Але ўстрывожыла Генрыхава пытанне. Што, калі яна расказала сяброўкам, а яны Косцю, які жыве ў інтэрнаце побач і часты госць у дзяўчат? Тады, напэўна, ужо ведае ўся брыгада. Даведаецца ўвесь цэх, завод. Чаго добрага, пачнуць разбіраць на сходзе.

Не, няма чалавеку волі на зямлі. Тысячу ўмоўнасцей звязваюць рукі і ногі, тысячу страхаў падпільноўваюць на кожным кроку. Ён, Славік, доўгі час лічыў, што пазбавіўся ад такіх «перажыткаў і забабонаў», як сумленне, сорам, каханне, пакланенне аўтарытэтам і г.д. Ні д'ябла не атрымалася. Ён не толькі такі, як усе, ён горшы - сентыментальны слюнцяй. А вінаваты бацькі, гэта яны так выхавалі. І ў такім абкружэнні перарабіцца, выходзіць, проста-такі немагчыма. На турыстаў крыкнуў - у каталажку, вузкія штаны надзеў - у сатырыкон, дзяўчыну пацалаваў - прымусяць жаніцца. Жах!

Дзень той, аднак, скончыўся спакойна: станіна яго не прыдушыла, у камітэт камсамола не выклікалі.

Але Славік не ўзрадаваўся гудку. Ён паабяцаў Нінцы сустрэцца ўвечары. А страчацца зусім не хацелася. І не страчацца боязна.

З цэха і заводскіх варот яны выйшлі разам з Тарасам. Брыгадзір часта затрымліваўся, часам і зусім заставаўся начаваць у інтэрнаце. А тут раптам спяшаўся дадому, да Ярашаў. Хоць як сказаць - спяшаўся, калі прапанаваў пайсці пехатой? Тым больш не спяшаўся Славік. Дома ў яго былі складаныя адносіны з Ірай. Яны, на здзіўленне маці, зусім перасталі сварыцца паміж сабой. Сястра глядзела на яго з грэблівай пагардай. А ён баяўся адказаць нават злосным позіркам. Ён проста пазбягаў яе. Не чапаў. Абы ціха было.

Тарас доўга ішоў моўчкі. У яго быў свой клопат: адносіны ў сям'і Ярашаў - у яго сям'і. З малых год ён ведаў рэўнасць Галіны Адамаўны і цяпер, калі ўсё разумеў, шкадаваў бацьку. Першая паведаміла яму Наташа, што маці зноў да кагосьці прыраўнавала. Дзяўчынка была ў роспачы: маці ўпершыню груба абразіла яе. Пасля іх нечаканай сустрэчы на кватэры ў Зосі Антон Кузьміч упершыню расказаў сыну пра свае адносіны з жонкай, расказаў усю праўду... Тарасу зрабілася балюча: як можна ўскладніць простыя і ясныя рэчы, забрудзіць чысцейшыя чалавечыя адносіны! Хочучы шчыра дапамагчы ім, ён паспрабаваў пагутарыць з Галінай Адамаўнай. Але тая груба перапыніла яго: «Я цябе прашу не ўмешвацца ў нашы справы». Ён, Тарас, не прыхільнік таго, каб лезці ў чужую душу. Але ж нельга і абыякавым заставацца, калі двое добрых і блізкіх людзей, пражыўшы разам многа год, раптам не разумеюць адно аднаго. Як многа яшчэ гэтага неразумення!

- Катка сёлета, відаць, не дачакаешся. Бр-р, - скурчыўся Славік і наставіў каўнер свайго лёгкага кароткага паліто.

Снег, што выпаў тыдзень назад, раставаў. Было сыра, слізка і холадна. Тарас у скураной куртцы на футры, у галёшах крочыў размашыста, упэўнена. Славік з галёшаў смяяўся - старамодна! - і ў даўганосых чаравіках коўзаў па талым снезе, пераскакваў лужыны, лаяў недарэчную зіму. Гаварыў ён прыкладна гэтак жа, як ішоў: скакаў з прадмета на прадмет, з пагоды на кінаафішу, адтуль на валёнкі і бахілы сустрэчнага селяніна... У сувязі з чым усплыла раптам гэтая думка, ён і

сам не здолеў бы растлумачыць. Ляпнуў нечакана не толькі для Тараса, а вельмі можа быць, што і для самога сябе:
- У цябе моцна ўтрэскалася адна дурніца.
Баючыся злоснага жарту, Тарас змаўчаў, толькі глянуў на Славіка як бы з недаверам.
- Не верыш? Не цікавішся хто? Мая сястра. Іра.
- Яна ўпаўнаважыла цябе сказаць пра гэта?
- Ну што ты! - засмяяўся Славік. - Яна авечка. Я прачытаў у яе дзённіку.
- Прыгожа, няма чаго сказаць!
- А ты не прачытаў бы дзённіка сястры, каб ён трапіў табе на вочы? Не люблю прытвораў! А я чытаў з цікавасцю. Як яна цябе там узносіць! Культ Ганчарова.
Тарас паверыў, што на гэты раз Славік кажа праўду. Ён сам неаднойчы прыкмячаў, як Іра глядзіць на яго, як стараецца застацца разам. І, можа, каб не з'явілася Маша, нейкія пачуцці варухнуліся б і ў яго душы. Але з якой мэтай Славік сказаў яму пра каханне сястры цяпер? Ён успомніў: Маша гаварыла яму, што Славік званіў ёй двойчы ці тройчы, зноў дамагаўся спаткання. Яна не пайшла, безумоўна. А ці праўда, што не хадзіла? А можа, зноў пачала гарэзлівую гульню? Не, не. Не хацелася думаць пра Машу дрэнна.
Не адказваючы па сутнасці, Тарас спытаў:
- Ты скажы мне, што ў цябе з Нінкай?
Славік паслізнуўся, вылаяў гарадскія ўлады і дворнікаў, што не чысцяць тратуараў. Гэта памагло яму схаваць сваю збянтэжанасць.
- Што ў цябе з Машай, то ў мяне з ёй. Ходзім у кіно. Сёння пойдзем. Чаму гэта цябе зацікавіла?
- Хлопцы не вераць, што ў цябе гэта сур'ёзна. Глядзі. Пакрыўдзіш дзяўчыну...
- О, вялікія маралісты! Вам хацелася, каб я тут жа жаніўся, схадзіўшы два разы ў кіно. Аднак самі вы не вельмі спяшаецеся з гэтым актам... Філосаф гэты акулярысты тры гады Зою мацае, а сам брэша. - Славік нечакана моцна ўзлаваўся, мацюкнуўся гучна, не зважаючы, што ішлі яны па даволі люднай вуліцы. - Абрыдлі вы мне як горкая рэдзька! Усе! Адзін Косця чалавек...
Тарас даўно ўжо не звяртаў увагі на любую яго балбатню, але гэтыя словы пакрыўдзілі. Столькі яны важдаліся з ім, столькі даравалі ўсяго, а ён вунь якой думкі пра брыгаду.
«Пэўна, сакратар парткома меў рацыю, не будзе з яго толку, прыйдзецца развітацца». - Тарас уздыхнуў, аднак, з жалем, яму амаль па-бацькоўску зрабілася шкада гэтага шалапута.
**31**
Маша здзівілася, калі выявіла, што білетаў у Тараса толькі два.
- Як? Ты не ўзяў на Зосю?
Тарас моцна збянтэжыўся. І Зося таксама.
- Ну што ты! Я зусім не хачу перашкаджаць вам.
- Чым ты, скажы, калі ласка, можаш перашкодзіць нам?
Маша гаварыла з калідора, куды выскачыла пераадзецца плацце. Але пры ўсёй шчырасці адносін да Зосі яна не абуралася. У голасе яе гучала адно вясёлае здзіўленне: эх ты, кавалер! Хіба так можна рабіць?
Зося сядзела на канапе ў звыклай позе, падкурчыўшы ногі, пакрыўшы іх цёплай хусткай. У кватэры было нават душна, але ў яе ўсё яшчэ жыло нервовае адчуванне, што ногі стынуць; так у калекі жыве боль ампутаванай нагі.
Да прыходу Тараса яны нешта кроілі, і на канапе былі раскіданы зялёныя і чырвоныя, адмыслова выкраеныя шматкі. Як кветкі. Яна збірала іх і звязвала ў пучкі.
Маша ўскочыла ў пакой з распушчанымі валасамі. Пачала прычэсвацца перад люстрам. Яны залюбаваліся яе залатымі валасамі. Зося глянула на Тараса з усмешкай сястры, старэйшай. Словамі ён, напэўна, нічога не растлумачыў бы, але вачамі, позіркам здолеў папрасіць у Зосі прабачэння, сказаць: не думайце пра мяне дрэнна, проста мне хочацца... трэба пабыць з ёй удваіх. Зося зразумела. Але тут жа адчула, што недзе ў самым далёкім тайнічку яе загоенага сэрца варухнулася зайздрасць, ціхая і добрая. І гэтае пачуццё яна забыла, бо не ведала яго шмат год. А таму спалохана прагнала яе прэч, няхай сабе і добрую зайздрасць. Хіба мае яна права ім зайздросціць? Яны маладыя, шчаслівыя, у іх зусім іншае жыццё...
Зося любіла Машыных сяброў. Усіх. Любіла, каб яны часцей заходзілі. Яны як бы звязвалі яе з вялікім светам, з новым жыццём, у якое яна ўваходзіла асцярожна і нават з некаторым недаверам.

Яны былі розныя, але ўсе шчырыя і добрыя. А лепш за ўсё гаіла яе душэўныя раны дабрата людская. Яна руйнавала рэшткі недаверу яе да людзей і жыцця.
Тарас заняў у яе сэрцы, у думках асобае месца. Яшчэ ў ссылцы яна часам думала, што, магчыма, каб ёй тады ўдалося знайсці і прытуліць таго хлопчыка, лёс яе быў бы зусім інакшы. Яна зноў падумала пра гэта перад аперацыяй, ёй вельмі хацелася пабачыць Тараса, але яна не адважылася прасіць Антона Кузьміча, толькі расказала, як шукала яго сына.
Калі Маша паабяцала запрасіць яго, яна моцна хвалявалася, чакаючы іх. Калі ён прыйшоў, была трохі расчаравана: чамусьці ён уяўляўся ёй зусім іншым, магчыма, больш падобным на Яраша. Але пазней Зосі здалося, што ў яе і ў Тараса падобныя характары. Ці не таму, што і лёс іх шмат у чым падобны? Яна палюбіла яго, як брата. Але, каб яна тады знайшла яго, яны б сталі братам і сястрой на ўсё жыццё. Аднак, нягледзячы на гэтую любоў, у апошні час з'явілася нейкая іншая трывога, незразумелая, неасэнсаваная. Яна выяўлялася асабліва выразна заўсёды, калі яны, ён і Маша, вось гэтак збіраліся ісці гуляць, у кіно, у тэатр. Не, гэта не было рэўнасцю ні да яго, ні да яе. Зайздрасць да іх маладосці? Можа.
Падфарбоўваючы губы (яна, як і ўсё іншае, рабіла гэта ўмела і з пачуццём меры), Маша сыпала ў люстра іскры смеху.
- Тугадум ты, Тарас. І ўвогуле - мядзведзь. Я здзіўляюся... Рос ты ў горадзе, у такой інтэлігентнай сям'і. Каб ты пабачыў, дзе расла я! - Але сказала яна гэта не са скаргай, а з гонарам і радасцю: расла ў бядзе, а вырасла вось якая, любуйцеся!
Зося пажартавала:
- Але. Цяжка паверыць, што ты не панскага роду. Каб я не бачыла твае маці...
І тут жа зразумела, што сказала недарэчы. Машын твар у люстры адразу змяніўся, дзяўчына цяжка ўздыхнула:
- Мая маці! - І, як бы спалохаўшыся нечага, кінула фарбу, падхапілася, сказала Тарасу: - Пайшлі, мой верны рыцар. - Падбегла да Зосі, абняла, пацалавала ў шчаку: - Прабач. І не сумуй без нас.
У фае Тарас нечаспадзявана для сябе ўбачыў Славіка... з Нінай.
Славік спачатку аслупянеў. Ён знарок пайшоў не ў цэнтральны, а ў гэты новы, у Залінейным раёне, кінатэатр, дзе бадай выключалася сустрэча са знаёмымі. І раптам на табе. Ды з кім! Ён гатовы быў збегчы куды хочаш, калі Тарас і Маша рушылі да іх. Але схавацца немагчыма, людзей было яшчэ нямнога. Ды і зусім іншае пачуццё спыніла - зачараванасць Машай. Ён даўно не бачыў яе. І калі, пасля сувязі з Нінай, вобраз яе зноў завалодаў яго марамі, то ён часам, каб супакоіць сябе, думаў, што яму толькі ўяўляецца, што яна такая незвычайная, прыгожая, а ў сапраўднасці ўсё хараство яе - выдумка яго ўзбуджанай фантазіі. Аж не. Не! У новым адзенні, недарагім, але элегантным светла-шэрым варсістым паліто і ў кашлатай высокай зімовай шапцы, з-пад якой выбіваліся яе залатыя валасы, яна здалася яму яшчэ больш прыгожай, чым у тую першую сустрэчу на дачы, чым нават уяўлялася ў бяссонныя ночы. Ён проста аслеп ад ззяння яе вачэй, аглух ад яе голасу, непараўнальнага ні з якім другім, задыхнуўся ад непаўторнага, адной ёй уласцівага водару. Ён пачуў гэты прыцягальны водар яе цела, валасоў, вопраткі яшчэ здалёк. Яна смяялася. Яна казала нешта Тарасу. Ён не чуў. Аглушыла і асляпіла яшчэ адно - хваля рэўнасці да свайго брыгадзіра.
Не ён, а Тарас пазнаёміў дзяўчат. Маша не аглядала Ніну з той крыху зняважлівай цікаўнасцю, з якой аглядалі некаторыя Славікавы сябры. Не, яна, выхаваная жыццём і бальніцай, ніколі не раздзяляла людзей на нейкія катэгорыі, а тым больш не меркавала пра іх па вопратцы, па знешнасці. Але і яна глянула на Славіка са здзіўленнем. Яе здзівіла не Ніна. Яе здзівіў Славік. І ён убачыў гэта і зразумеў. З тае хвіліны ён бачыў усё - кожны яе рух, кожную іскру ў вачах, ледзь прыкметную ўсмешку і пералівы ценяў на твары. І ўсё разумеў з незвычайнай, неверагоднай, проста-такі мефістофельскай праніклівасцю.
Яму хацелася закрычаць ад роспачы, укусіць самога сябе, калі ўбачыў іх побач, параўнаў. Просценькі, зямны, мізэрненькі «дзятлік» з пачырванелым носам - і Маша!
Калі хвіліны ўтрапення мінулі і Славік вярнуў сваю самаўпэўненасць і дасціпнасць, ён кінуўся як у вір, як матыль на агонь. Запрасіў усіх у буфет. Частаваў з купецкім размахам. Талерку эскімо. Ешце, хоць пуза расперажыце. Паўкіло «Мішак».
Як? У гэтым буфеце яшчэ знайшлося шампанскае? Ура гаргандлю! Давайце шампанскае!

Пратэставаў Тарас. Сарамліва адмаўлялася Нінка. Ён прымушаў іх сілком есці і піць. Ён быў падкрэслена ўважлівы да ўсіх. Але ў сапраўднасці нікога для яго не існавала, акрамя Машы. Уся шчодрасць, усе жарты, усе словы, смех - для яе адной, толькі для яе.
Тарас нахмурана маўчаў. Хутка пачала разумець і Ніна, што да чаго. Прыгледзелася, прыслухалася - і стала відушчая. Дурная, дурная! Як яна магла падумаць, што Славік пакахаў яе? Спадзявалася, верыла, марыла. Хіба так кахаюць! I хіба такая, як яна, простая кранаўшчыца, патрэбна яму? Яму вось якая краля трэба! Модная, нафарбаваная! Абражаная, пакрыўджаная, Нінка, якую спачатку Славікавы жарты смяшылі, сцішылася, замкнулася, адступіла за круглым столікам ад Славіка да Тараса. Пашкадавала брыгадзіра: перажывае. Сябе не шкадавала. Сябе карала: так табе і трэба, авечка! Кіўнуў табе пальцам, і ты пабегла следам. Як на экране кіно, хутка змяняліся пачуцці, выбухалі адно за адным то боль, то бязгучны горкі смех, то роспач, ад якой хацелася па-бабску завыць на ўвесь буфет, на ўвесь кінатэатр. Не, яна трымалася. Яна ніводным рухам не выдасць сябе. А вось яны... яны страцілі ўсялякі сорам.
- Праўда. Мне штоноч сняцца марсіянкі. Яны падобныя на цябе.
- Я ўжо чула пра гэта. Ты не арыгінальны.
- А што ў гэтым свеце арыгінальнае? Мой бохан неяк сказаў адзіную разумную ісціну: усё новае - даўно забытае старое.
- Ты выдумаў сам.
- Каб я мог такое выдумляць, то не завінчваў бы гайкі пад наглядам маэстра Ганчарова. Я слаўлю цябе, Тарас! Вып'ем. За што? За рыжых. Згода?
- За рыжых я вып'ю. Яны - няшчасныя.
- Ты няшчасная? Паглядзі на буфетчыцу. Вунь дзе няшчасная.
- Яна не рыжая. Нафарбаваная.
- Твае бацькі прадбачылі моду.
- Не вярзі, Славік. Ты - п'яны.
- Ад тваіх вачэй.
- Ад маіх вачэй цверазеюць.
- Як хто.
- Ты цверазееў. Я гэта бачыла.
- А цяпер - нямею...
«Няўжо яны сустракаліся? - Тарас з натугай пракаўтнуў шампанскае, недарма яно завецца сухое. - Няўжо яна можа хлусіць?»
«Чаго яна смяецца? - паморшчылася Ніна. - Нічога смешнага няма. Колькі часу яны знаёмыя, што так размаўляюць? Ён пра ўсё расказваў. Толькі пра гэтую рыжую ні слова. Прытворшчыкі!»
Тарас не вытрымаў:
- Ты хоць бы цішэй гаварыў. Людзі слухаюць.
- Слухаюць, бо цікава. Чытаў бы я лекцыю пра спаборніцтва - ніхто і вуха не натапырыў бы. Ты, Маша, слухала б?
- Я ўсё слухаю.
- Тарасаў уплыў. Раней ты была больш пераборлівая.
- Да чаго?
- Да лекцый. I да людзей.
«Каб як у нас, у вёсцы, Тарасу трэба даўно даць яму па мордзе». У чарговую ўспышку злосці Нінка пашкадавала, што ўсё гэта адбываецца не ў іх вёсцы, дзе размова вялася працай, а дзейнічалі хлопцы з большай рашучасцю. «Тарас перадавы, яму нельга». Яна ўздыхнула.
А Славік, круцячы ў руках пустую шклянку, ужо чытаў нейкія вершы.

Я ругаю все напропалую,
А друзьям-товарищам грублю.
И меня такого не целует
Женщина, которую люблю.

Нінка запомніла іх і падумала, што Славік сачыніў сам. Зноў-такі - як бы для іх, а ў сапраўднасці для Машы, каб сказаць яшчэ раз, што любіць яе. Яна праверыла:
- Гэта ты сам напісаў?

- Мой сябра.
- У цябе ёсць сябры маскоўскія паэты? - з іроніяй спытаў Тарас.
- У мяне ўсё ёсць. І нічога няма.
Жанчына, якую ён любіць, не цалуе яго, і нічога ў яго няма - гэта на нейкі міг суцешыла Нінку, вярнула надзею.
Пазванілі. Клікалі ў залу.
Яны падымаліся па крутой лесвіцы першыя - Славік і Маша. Зноў яны забыліся на ўсё, нават на тое, хто з кім прыйшоў і павінен сядзець. Не, на парозе залы яна, рыжая, успомніла-такі пра гэта. Але як Славік цягнуўся за ёй позіркам! І калі сеў на месца, то ўвесь час глядзеў у той бок, дзе селі яна і Тарас. І калі патухла святло і пачалася карціна, Нінцы здавалася, што ён глядзіць не на экран, а ўсё туды ж...
Бяда гераіні расчуліла дзяўчыну. Больш яна не думала пра тое, каб утрымаць Славіка, прымусіць яго жаніцца. Дзякуй Богу, што хоць усё добра абышлося, не здарылася таго, чаго яна падсвядома хацела - каб паставіць хлопца перад фактам - і баялася, баялася, не менш, чым і Славік. Цяпер яна прымала гэта як кару за сваю даверлівасць і дурноту. «Так табе і трэба! Так табе і трэба!» - бязлітасна ўпікала яна сябе і... плакала, смаркалася, выцірала хусцінкай вочы. На яе нават азірнуліся з пярэдняга рада.
Славік дзівіўся, што яе так расчуліла трагедыя гераіні. Яму смешна стала, бо яго асабіста ўся кінагісторыя не ўсхвалявала ні на грам, не кранула ніводнай стрункі душы. Банальная драма. Ён нават адчуваў некаторую няёмкасць перад суседзямі, што яго дзяўчына такая «дзярэўня».
Маша і Тарас сядзелі бліжэй да выхада і, калі сеанс скончыўся, выйшлі першыя. Як ён ірваўся, Славік, каб дагнаць іх. Лез на людзей, расштурхоўваў. Абражаная Ніна засталася ззаду, хацела схавацца ў натоўпе. Ён спахапіўся, пачакаў яе каля дзвярэй. Але яўна быў незадаволены, што Маша з Тарасам зніклі. Можа, таму доўга ішоў моўчкі, панура наставіўшы каўнер. Нінка таксама маўчала. Вуліцы, па якіх яны ішлі, хутка апусцелі. Горад засынаў. Але недалёка быў вакзал, і там бесперапынна стомлена пыхкалі і зрэдку злосна крычалі паравозы.
На пешаходным мосце цераз чыгунку, вузкім і высокім, Нінка спынілася і глядзела, як унізе ішоў доўгі таварны састаў. Маленькія вагоны з чырвонымі дахамі, доўгія пульманы з белымі люкамі, пляцоўкі з трактарамі, з лесам. Цягнік прайшоў. Міма зялёных і чырвоных нерухомых агнёў стрэлак і святлафораў плыў-хістаўся, аддаляючыся, чырвоны стоп-сігнал. Нінка праводзіла яго сумным позіркам, быццам у тым цягніку ў запламбаваным пульмане ці, можа, на адкрытай пляцоўцы павезлі яе шчасце. Але, павезлі. Хто? Куды? Славік стаяў побач, наваліўшыся грудзьмі на парэнчы, і... пляваў уніз, з дзіцячай свавольнасцю цэлячыся ў сігнальны слупок стрэлкі.
Не адводзячы вачэй з далёкіх агнёў, Ніна сказала ціха, з болем:
- Цяпер я ўсё разумею. Бачыла. Не дурная. Ты любіш яе, гэтую рыжую. Не хлусі мне больш. Ты любіш яе!
У Славіка быццам стопудовы камень сарваўся з душы, паляцеў уніз, пад мост, бразнуўся аб сталёвыя рэйкі і разляцеўся на парашок. Нічога не засталося. Зрабілася лёгка-лёгка. І смешна: яна думае, што ён будзе адмаўляцца, хлусіць. Ды не ж! Яна сама рассекла складаны для яго вузел. Вызваліла ад страху, ад абавязку - ад усяго, што яго мучыла.
Ён спачатку прашаптаў:
- Я люблю яе, гэтую рыжую.
Потым паўтарыў голасна:
- Я люблю яе!
Потым закрычаў на ўсю прастору станцыі:
- Я лю-ю-блю я-е-е! Чу-у-еш?
Крык яго падхапіў блізкі паравоз.
Нінка заціснула рукамі вушы і кінулася прэч, як ад ашалелага. Пабегла. Пад яе нагамі загудзела, залязкатала жалезная ферма моста. Ёй здавалася, што ён усё яшчэ крычыць ёй услед гэтыя словы, са здзекам і радасцю. Не, ён не крычаў. Ён ішоў павольна, праводзіў рукой па мокрай парэнчы і, шчасліва ўсміхаючыся, шаптаў:
- Я люблю яе. Я люблю яе.
Зося яшчэ не спала. Чытала. Па прыездзе з бальніцы яна глытала кнігі з незвычайнай прагнасцю. І сама дзівілася: яна чытала і раней, але тады, хворай, кнігі не давалі той радасці і асалоды, што

даюць цяпер. Тады яна проста чытала ад смутку, каб скараціць час. А цяпер, чытаючы, жыла, весела і хораша.
Маша скінула ў калідорчыку паліто, увайшла ў пакой, правяла гарачымі далонямі па халодным твары і гучна засмяялася.
Зося адарвалася ад кнігі, са здзіўленнем паглядзела на сяброўку:
- Чаму ты?
- Там, у рамане, - кіўнула яна на кніжку, - гэта, напэўна, называецца: ён папрасіў яе рукі.
- Хто?
- Тарас маёй.
Зося адчула, як ёкнула сэрца. Цяпер яна зразумела, чаму ў яе была трывога і насцярожанасць да Тараса. Яна баялася менавіта гэтага - што ён забярэ Машу. Яна баялася адзіноцтва. Дзіўна. Усяго некалькі месяцаў назад яна пазбягала людзей. А цяпер яе палохала думка, што яна можа застацца адна.
- Ты... згадзілася?
- Ён чамусьці спяшаецца. Заўтра ж, кажа, хадзем у загс. О не! Дай мне падумаць. Я кажу яму: дай мне падумаць да Новага года. Расчараваўся. Чаму яму загарэлася? - Яна скінула чаравікі, ускочыла на канапу, схавала акалелыя ногі пад коўдру... - Ты ведаеш, я праўда хачу падумаць. Тарас, напэўна, будзе найлепшы муж. Але ён вельмі правільны. А я з ветрыкам. Ты ведаеш, мяне лічаць сур'ёзнай, а я зусім несур'ёзная. Вось я зараз падумала. Каб пасватаўся такі шалапут, як Славік Шыковіч... Хоць які з яго муж, дзіця горкае, і не з ветрыкам, а з завірухай у галаве! Але я, напэўна, адразу згадзілася б. Замуж дык замуж. Як у палонку. Адразу. З галавой. Бух - і ўсё. А з Тарасам гэта вельмі сур'ёзна. Я павінна прыслухацца: ці ёсць у мяне тое каханне, якое патрэбна яму. Ты разумееш?
У знак сцвярджэння, што яна гэта добра разумее, Зося заплюшчыла вочы.
**32**
Шыковіч спадзяваўся, што пасля надрукавання артыкула ён не адаб'ецца ад тэлефонных званкоў, ад наведвальнікаў. Званкі былі, але не тыя, якіх ён чакаў. Званілі сябры. «Здорава, стары, напісаў. Віншую». Кірыла злаваўся: хіба соль у тым, як напісана! Званілі чытачы. Большасць пыталася пра Зосю. Дзе яна цяпер, як адчувае сябе? Прасілі перадаць ёй добрыя пажаданні. Другія пыталіся пра тое, пра што Шыковіч сам хацеў даведацца. Дзе яны, таварышы па барацьбе Савіча, Вакулавай, Васі? Жывыя сведкі? Няўжо ў горадзе нікога не засталося? Няўмольны час! Скасіў людзей, разагнаў па свеце.
«Каб удалося ўціснуць хоць невялічкі артыкульчык у цэнтральную газету, можа, тады хто і адгукнуўся б», - думаў Кірыла, седзячы ў кабінеце рэдактара і сто першы раз пераглядаючы тыя тры нумары газеты, дзе быў змешчаны яго нарыс-артыкул аб падполлі.
Наконт артыкула званілі рэдактару, таму Шыковіч і сядзеў гэтыя дні ў яго кабінеце. Дарэчы, Жывіцкі грыпаваў і ў рэдакцыю не з'яўляўся. Падпісваў газету дома. Шчыра кажучы, Кірыла сам не разумеў, чаго ён чакае. Усё ўжо ясна. Садзіся, дапісвай сваю аповесць, стаў апошнюю кропку і ляці ў сталіцу, каб уладзіць яе ў часопіс. Але ў тым і бяда, што ў апошні час, пасля, здавалася б, поўнага высвятлення, у яго раптам як бы знікла натхненне. Парадокс. І вельмі можа быць, што ён чакаў нечага такога, што зноў запаліла б яго.
Вось чаму, калі адчыніліся дзверы рэдактарскага кабінета і на парозе з'явіўся незнаёмы, Кірыла адразу падумаў:
«Вось. Гэта ён».
Па нейкіх асаблівых прыкметах, якія нават цяжка растлумачыць, Шыковіч умеў беспамылкова пазнаваць пенсіянераў. Пра гэтага адразу падумаў: «Пенсіянер».
Чалавек не запытаў, ці можна ўвайсці. Але праціснуўся ў дзверы не тое што нясмела, а неяк нязграбна, быццам дзверы былі цесныя. Не, ён не быў тоўсты. Нармальны для сваіх гадоў, трохі ацяжалелы. А з твару нават худы. Твар яго быў абветраны да задубення скуры, як у рыбака, пасечаны глыбокімі і непрыгожымі маршчынамі (бываюць маршчыны прыгожыя). Хоць з-пад каракулевай шапкі-staўбуна вылазілі зусім сівыя на скронях валасы, бровы яго былі чорныя, як падфарбаваныя. Можа, ад гэтага вочы здаваліся залішне зоркімі і калючымі. Ён у сваю чаргу агледзеў Шыковіча. Але калі Кірыла сустрэў яго з добразычлівай цікаўнасцю, нават з радаснай надзеяй, то ў яго позірку злавіў нешта падобнае на знявагу ці насмешку: «Сядзіш, пісака, у кабінеце? Бач, як абставіўся!»

Можа, ён так і не падумаў, але Кірылу чамусьці ўпершыню стала няёмка ад таго, што ён забраўся ў рэдактарскі кабінет.
Чалавек, не вітаючыся, спытаў:
- Вы Шыковіч?
- Я. Сядайце, калі ласка.
Шыковіч працаваў не за рабочым сталом рэдактара, а за доўгім - для пасяджэнняў, на краі якога ляжаў стос падшывак газет. Чалавек сеў насупраць. Шапкі не зняў. Расшпіліў паліто з добрага драпу, але моцна пабітае моллю - недзе доўга ляжала.
Гледзячы Кірылу проста ў вочы (цяжка было вытрымаць такі позірк!), незнаёмы спытаў з крывой усмешкай:
- Што ж гэта ты, друг сітны, сказаўшы «а», не сказаў «бэ». Не хапіла духу? Ці замялі?
У Шыковіча замерла сэрца ад прадчування нечага незвычайнага.
- Што вы маеце на ўвазе?
- Што, што... Сам ты добра ведаеш што. Чаму не раскрыў, хто такі Сажань? Спалохаўся? Ну, канешне, куды табе! Думаў паласкатаць нервы чытачоў, нагнаць таямнічасці. Ды выйшла прамашка. - Ён хмыкнуў, прыстукнуў кулаком па стале, нібы паставіў пячатку, голас яго зрабіўся скрыпуча-злосным. - Цяпер я скажу «бэ»!
Здалося, што чалавек гэты пырснуў жоўцю. Шыковіч не любіў такіх: маўчаць, чакаюць выпадку, калі хто пачне першы, тады і яны вырываюцца і б'юць з-за вугла.
- Што ж вы першы не сказалі гэтага «а»? - ужо без ветлівасці, са злосцю спытаў Кірыла.
- Не меў такога факта. Казаў другія. Не даказаў. Далі па мордзе. Ён жа, твой Сажань...
Кірыла падняўся:
- Слухайце, я не ведаю, хто такі Сажань.
- Не ведаеш? - з яўным здзекам перапытаў чалавек. - Не ведаеш, што гэта паважаны Сямён Парфёныч Гукан?..
- Гукан?!
«Гукан! Гукан!» - загудзела, загукала, зашумела ў Шыковіча ў галаве, быццам запрацавала там магутная электронна-вылічальная машына: яна ў адзін міг выцягнула з глыбінь памяці ўсе факты, якія ён сабраў, па-новаму выстраіла іх зусім у іншым парадку. Недзе на пабочных маленькіх клавішах нехта выстукваў:
- Мы калі яшчэ ў рабфаку разам вучыліся, то далі яму гэтую мянушку... У партызанах, калі хадзілі на сувязь у горад, ён хацеў аднойчы выпісаць пашпарт на Сажаня... Не хто другі, я адгаварыў яго. З тваім ростам, кажу, выкліча падазронасць... Ён мне аддзякаваў пасля за ўсё...
- Як ваша прозвішча?
- Ведаеш ты маё прозвішча. Пісаў... распісваў з яго слоў... - Чалавек зноў як бы паставіў пячатку.
Шыковіч напружваў памяць, але ўспомніць не мог: у кнізе дзесяткі прозвішчаў людзей, якіх ён ніколі не бачыў у вочы.
Па сутнасці справы, яму трэба было ўзрадавацца, выказаць гэтаму чалавеку сваю думку пра Гукана, факт з яго пісьмом у органы дзяржбяспекі наконт Зосі Савіч, запрасіць у сведкі, у памочнікі па выяўленню поўнай ісціны. Але нешта стрымлівала. Што? Злосць гэтага чалавека, яго жаданне па-свойму расквітацца з Гуканам. Для яго цяпер галоўнае не ісціна, а помста. А Шыковіч ненавідзеў людзей помслівых. Таму сведка, якога ён падсвядома чакаў, стаў яму непрыемны. Кірылу не хацелася заключаць з такім чалавекам які б ні было саюз.
- Але, падрэзаў ты корань свайму дружбаку. - Наведвальніку яўна прыносіла задавальненне пакатаваць, як ён, пэўна, лічыў, неасцярожнага журналіста, нават голас яго палагаднеў.
- Што вы хочаце рабіць?
Ён адразу натапырыўся і таксама падняўся.
- А гэта мая справа, што я буду рабіць. Карціць даведацца? А? Не, цяпер вам з Гуканам не абяззброіць мяне!
- Што датычыць мяне, то я асабіста нікога не абяззбройваў. І не збіраўся гэта рабіць. Усё, што я раблю, я раблю дзеля таго, каб сказаць праўду пра людзей, якія змагаліся... Сумленна...
- Калі сказаць шчыра, то я і прыйшоў, каб сказаць вам за гэта дзякуй.
- Не для вас я гэта рабіў!
- Што-нішто зрабіў і для мяне. Даробяць другія. Усяго добрага.

Кірыла не стаў яго затрымліваць: «Чорт з табой. Прозвішча я тваё ўспомню. А не ўспомню - сам адгукнешся, вiдаць па ўсім. З мяне даволі таго, што ты паведаміў. Гукан! Няўжо Гукан?»
Ён колькі хвілін усхвалявана хадзіў па прасторным кабінеце, паціраючы лысіну, шчокі. Не ад радасці. Не, якая там, да д'ябла, можа быць радасць, калі пухне галава! Як, чаму чалавек, які шчыра ваяваў супраць ворага і, нягледзячы на ўсе свае недахопы і слабасці, напэўна, мае шчырую веру ў нашы гуманныя ідэі, мог зрабіць вось так? Зося ж хадзіла каля яго, як каля хворага. Хавалі, ратавалі. Бацька ахвяраваў жыццём. Каму ж ён верыў, калі пасля ўсяго гэтага не паверыў у сумленнасць такіх людзей? Усеагульная падазронасць? Ці подласць?
Кірыла выскачыў у калідор, узбег па крутой лесвіцы на гарышча. Там, у падстрэшшы, хаваліся рэдакцыйныя архівы і была абсталявана фоталабараторыя. Загрукаў у дзверы лабараторыі. Адгукнуўся флегматычны голас:
- Хто там?
- Я, Шыковіч. Адчыні. Тэрміновая справа.
- Пачакай.
Нарэшце вядомы на ўвесь горад фотакарэспандэнт Пеця Чарнавус, душа-хлопец, флегматык у працы і віхор у гульні, адчыніў дзверы сваёй «святой келлі».
- Пеця! Дружа! Выручай! Перавярні ўвесь свой архіў. Знайдзі здымкі, на якіх ёсць Гукан. Усе. Ад сорак пятага да нашых дзён.
- Навошта яны табе?
- Трэба. Вось так трэба!
- Ён што, юбіляр?
- Юбіляр, ліха на яго!
- Працуеш без асечак. А што буду я мець за гэта? Кватэру ён мне заменіць?
- Кватэру не гарантую. А дзве бутэлькі каньяку з мяне. Сёння ж, увечары.
- Хлусіш.
- Я цябе падвёў калі?
- Згода. Праз гадзіну будзеш мець усё, што трэба. Падаць у альбоме ці ў папцы?
- У папцы.
Зося, адчыніўшы дзверы і ўбачыўшы Шыковіча, спалохалася. Ніколі ён яшчэ не прыходзіў адзін і ў такі час - пасярод дня. І выгляду ў яго такога дзелавіта-нецярплівага ніколі не было. Дзіўна, але яна чамусьці з чыста жаночай трывогай падумала пра Антона Кузьміча: можа, з ім што? З-за тактоўнасці не спытала, што здарылася. Ветліва запрасіла:
- Калі ласка, Кірыла Васільевіч. Распранайцеся. Вы зусім забыліся на мяне. Антон Кузьміч учора заглядваў. А вы... Я і не помню ўжо, калі вы былі апошні раз.
«Антон заходзіць адзін? Без мяне? - у думках здзівіўся Кірыла. - Ну і ну! Даведаецца Галя - бедная твая галава будзе, Антоша. Не хопіць у мяне, міратворца, імпэту памірыць вас».
- Дзякую, Зося Сцяпанаўна. Я на хвіліначку. Можа, і распранацца не буду. Ну, добра, добра... Але ні чаю, ні кавы не трэба. Я ж на працы. І да вас я па справе.
Ён скінуў у калідоры кароткую футравую куртку і з шалікам на шыі і ў кашлатай андатравай шапцы ўвайшоў у надзвычай утульны пакойчык, у якім усё было прыбрана руплівымі рукамі і ўсё ззяла ад снежнага святла, што лілося праз шырокае акно. Таполі ў квецені інею глядзелі ў гэтае акно. А за таполямі віднелася заснежаная рака з чорнымі кропкамі - «падлёднікамі», што выседжвалі над палонкамі гадзінамі.
Падаў лёгкі-лёгкі сняжок.
Апанаваны віхурнымі думкамі, Кірыла, калі ішоў сюды, не бачыў хараства зімовага дня. А тут, у гэтым дзявочым пакоі, раптам убачыў. І спыніўся, сціх каля дзвярай, узіраючыся ў акно. На нейкі міг, на адну хвіліначку, настала тая расслабленасць, тая лірычная дабрата, калі раптам хочацца забыцца на ўсе справы, зліцца з прыродай, акунуцца ў яе. Але не такая ў яго справа, каб можна было забыць на яе!
Не сядаючы, ён развязаў шнуркі папкі, у якую Чарнавус палажыў дзесяткі два фатаграфій розных гадоў.
- Зося Сцяпанаўна, я хачу паказаць вам некалькі фатаграфій. Можа, вы пазнаеце каго-небудзь. Гэта мае значэнне для маёй работы.
Ён дастаў самы ранні здымак, сорак шостага года, калектыўны - мітынг у дзень пахавання партызан і падпольшчыкаў у адной брацкай магіле ў гарадскім скверы. Гукан выступае з

невысокай трыбуны. Ці то здымак выцвіў ад часу, ці ў той дзень не хапала святла, але быў ён цьмяны, невыразны, твары другіх людзей расплыліся. Але прамоўца выйшаў лепш за ўсіх.
Зося ўзяла здымак, паднесла блізка да вачэй, хоць блізарукасці ў яе Кірыла раней не прыкмячаў. Яна таксама стаяла каля канапы, бліжэй да акна, уся асветленая ззяннем снегу.
І Шыковіч убачыў, як раптам змяніўся яе твар: у адзін міг нейкія рыскі, зморшчынкі быццам памяняліся месцамі ці быццам ценявы зайчык праскочыў па твары знізу ўгору. Шчака яе, што была павернута да яго, відавочна пабялела. Безумоўна, яна пазнала.
Шыковіч чакаў.
Зося доўга разглядала здымак, але на твары яе больш нічога не адбівалася. Нарэшце яна адарвалася ад здымка, перавяла позірк на Шыковіча і паківала галавой: не, нікога я тут не пазнаю.
Кірыла ледзь не закрычаў ад расчаравання. Выхапіў другі здымак.
- А тут?
Яна зірнула, не ўзяўшы здымка ў рукі, і зноў адмоўна пакачала галавой.
- Ты не пазнаеш гэтага чалавека? - забыўшыся, на «ты» крыкнуў Шыковіч, працягваючы трэці здымак - вялікі фотапартрэт Гукана.
Зося ўся сцялася і спалохана адступіла ад яго.
- А калі я памылюся? - ціха-ціха спытала яна. - Прайшло столькі год!
- Гэта - Сажань? - перайшоў Шыковіч да імклівага наступу.
Не адказваючы проста, яна спытала:
- Хто ён, гэты чалавек?
- Старшыня гарсавета Гукан.
Дзіўная ўсмешка скрывіла яе твар: яна чула гэтае прозвішча сотні разоў, і тады, калі працавала ў атэлье, і ў бальніцы, і яшчэ часцей цяпер ад іх - Кірылы Васільевіча і Антона Кузьміча, калі яны часам заходзілі да яе і вялі размову пра Шыковічаву работу, мінулую і цяперашнюю. Дык вунь каго яны з бацькам ратавалі! Не, ніякіх асаблівых пачуццяў у яе не ўзнікла, акрамя аднаго: раптам захацелася ніколі-ніколі не чуць, не ўспамінаць гэтых імён - Сажань-Гукан. Забыць іх у адзін міг і назаўсёды.
Нясмела, няўпэўнена, як малая, яна спытала:
- А можа, не трэба, Кірыла Васільевіч?
- Што не трэба? Чаго вы баіцеся? Яго?
- Я не за сябе. За вас.
- За мяне? Го-о! - ён галёкнуў. - Не той час,
Соф'я Сцяпанаўна, каб баяцца! Ён сам увесь час дрыжаў. І цяпер дрыжыць... А мы станем гнілымі ліберааламі, пляснівымі гуманістамі, калі не будзем выводзіць такіх на чыстую ваду... Калі ты выдаеш сябе за героя, то будзь ва ўсім героем. А ён баяўся за сваю кар'еру!.. За яе затаптаў у гразь...
Зося пакутліва зморшчылася, як ад болю.
- Ну добра, добра. Не думайце і не хвалюйцеся. Нічога асаблівага не здарыцца. Мы надзіва добрыя. Самае большае - яго пашлюць на пенсію.
«Куды цябе пашлюць, гэта я не ведаю. Але пагаварыць з табой я пагавару. Зараз жа. Пагавару так, як з табой не гаварыў яшчэ, бадай, ніхто!» - не думаў, а гнеўна шаптаў Шыковіч, на хаду апранаючы сваю куртку і збягаючы з другога паверха.
Ён зноў запаліўся і прагнуў дзейнасці. Ішоў, думаў, як уварвецца ў кабінет Гукана і якія словы скажа. А калі там наведвальнікі? Скажа і пры іх! Няхай ведаюць. Скандал? Няхай выкліча міліцыю і выведуць яго.
Але, нягледзячы на такое гарэнне і завіруху ў думках, пасля таго як убачыў таполі і раку, да яго вярнулася звычайная аптымістычная здольнасць любавацца навакольным: зімой, дрэвамі, жанчынамі, дзецьмі».
Падаюць сняжынкі, сухія і... цёплыя. З крутога адхону з'язджаюць у роў на лыжах хлапчукі. Кідаюцца, чарцяняты, як у бездань. Шыковіча на міг аж страх апанаваў. Але тут жа стала радасна ад іх смеласці. Як хараша было б, каб вырасла пакаленне людзей, якое нічога не баялася б! Але ўспомніў сына. Славік бадай нічога не баіцца, аднак гэта не зрабіла яго лепшым.
Наадварот. Ёсць іншыя нормы, якіх чалавек павінен прытрымлівацца, каб стаць чалавекам. Усё знаходзіцца ва ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці.

Шыковічу не хацелася паглыбляцца ў філасофскія разважанні, і ён пачаў узірацца ў твары людзей, ён здаўна любіў гэтую гульню: адгадваць прафесію чалавека і чым ён заклапочаны ў той момант. Некалі ён пажартаваў, што нідзе няма столькі прыгожых жанчын, як у іх горадзе. Яраш і Валя смяяліся, а Галіна Адамаўна згадзілася. Можа, таму, што сама прыгожая, ці, можа, каб яшчэ раз нагадаць мужу, як многа спакусы на яго шляху, а таму няхай асцерагаецца.
Цяпер, узіраючыся ў твары жанчын, Кірыла Васільевіч пераконваўся, што яго жарт адпавядае сапраўднасці. Кажуць, жанчыны - што кветкі, расцвітаюць вясной. Не, яны цвілі і ў снежні, на парозе Новага года. Расчырванелыя, рухавыя, хораша заклапочаныя, яны, здавалася, запаланілі ўвесь горад. На цэнтральнай вуліцы, каля ГУМа, не прабіцца.
«У гэтым горадзе змяшалася кроў нацый, якія маюць найлепшых красунь, - беларускай, расейскай, украінскай, польскай». - Шыковіч амаль узрадаваўся нечакана ўзнікшаму тлумачэнню. Жарт ператварыўся ў выснову.
Хутка ён злавіў сябе на тым, што перастаў думаць пра Гукана. Утаймавалася абурэнне. Аслабла жаданне ўварвацца ў яго кабінет і кінуць яму ў твар словы-каменні. Навошта? Ці не можа гэта даць Гукану лішнія козыры?.. Людзі накінуцца на сенсацыйную дробязь і застануцца безуважлівымі да галоўнага. Не, справу трэба даводзіць да канца з ранейшым спакоем і разважлівасцю. Яшчэ праз хвіліну Кірыла адчуў, што, акрамя ўсяго таго, што падказвае розум, яму проста не хочацца сустракацца з гэтым чалавекам, бачыць яго. Брыдка. А тым больш што ён, Шыковіч, не зларадны, не «крыважэрны». Яму нават усё адно, што будзе з Гуканам як работнікам: дадуць яму вымову, выганяць, пашлюць на пенсію. Галоўнае, што маральна ён прыкончаны, выкрыты. Цяпер ужо нішто - ні хітрыкі, ні заслугі, ваенныя і мірныя, - не паможа яму выкруціцца, захаваць позу героя. Праўда, як бы глыбока яе ні закопвалі, у якія б віры ні тапілі, у якіх бы архівах ні хавалі, яна ўсё адно ўсплыве, вырвецца на волю і з'явіцца людзям у сваім першародным харастве.
«Вось так, Сямён Гукан!»
Не дайшоўшы квартала да гарвыканкома, Шыковіч хвіліну пастаяў на рагу вуліц, паназіраў за людзьмі і рушыў у другі бок - да гаркома партыі.

**33**

Галіна Адамаўна адразу ж здагадалася, што муж парушыў клятву, якую даў ёй, што ён зноў наведваўся да той. І зноў стаіў, зноў не прызнаўся. Чаму?
Парушэнне клятвы яшчэ больш абурыла і абразіла яе. Але яна змаўчала, хоць усё кіпела і гарэла ў ёй. Яна баялася сваркі, разрыву і прымусіла сябе маўчаць. Дзеля дзяцей. Выкрык Наташы, варожасць дачкі спалохалі яе. Яшчэ больш усхвалявала замкнутасць і адчужанасць Віці, яе любімца. Дзеля спакою дзяцей і спакою яго, Антона, яна гатова на любыя пакуты, душэўныя і нават фізічныя.
Знешне ў доме ўсё нібыта было добра.
Разам снедалі, разам спяшаліся на работу. Абедалі не заўсёды разам - Антон часам затрымліваўся ў клініцы, на кансультацыях. Але кожны раз, больш акуратна, чым раней, званіў і паведамляў, дзе ён. Разам вячэралі, усёй сям'ёй глядзелі тэлевізар ці, пакінуўшы дзяцей дома, хадзілі ў кіно, у госці. Але Галіне Адамаўне здавалася, што муж зусім не той, што раней, - не такі ласкавы. Ад гэтага яна пакутавала яшчэ больш, рэўнасць душыла яе, як хвароба. Але яна трывала і ў душы нават пачала ганарыцца сваім падзвіжніцкім цярпеннем. Паступова ўваходзіла ў ролю пакутніцы - дзікую, пачварную ролю, якая калечыць душу. Я пакутую ў імя Бога, у імя ідэі, у імя блізкага свайго... і пачынаецца чортведама што, чалавек ператвараецца ў фанатыка і перастае разумець самыя простыя, надзіва лагічныя і звычайныя рэчы. Галіна Адамаўна трохі не дайшла да гэтага...
Выбух адбыўся нечакана.
Аднойчы ўвечары, калі пілі чай, Антон Кузьміч сказаў спакойна, разважліва:
- Ведаеш, Галка, абрыдла мне займацца гэтай дачай. Зноў патрабуюць знесці. А куды зносіць? Каб угаварыць Кірылу, я з лёгкай душой перадаў бы яе нашаму прафсаюзу пад піянерскі лагер. Я гаварыў ужо ў абкоме. Яны маглі б нават выплаціць некаторую суму. Праўда, меншую, чым мы затрацілі. Але якое гэта мае значэнне? Мы ўтраіх працуем. Валя гатова згадзіцца, Кірыла ўпёрся...
Віця і Наташа першыя ўбачылі, як пабялела маці, прыкусіла губу, і сцяліся, насцярожыліся.

- Бо ў Кірылы сям'я, дзеці... І ён думае пра іх, - пачала яна ціха, але тут жа сарвалася на крык: - А ў цябе няма сям'і, няма дзяцей! Табе нічога не трэба!.. Ты ўсё гатовы раздаць! Каб выставіць сябе!..
- Мама! - паспрабавала спыніць яе Наташка.
- Маўчы, няшчасная! - цыкнула яна на дачку і выскачыла з-за стала, ужо расчырванелая, раз'юшаная. Кінула мужу: - Не думай, што я дурная! Я ўсё ведаю! Толькі з-за іх, - яна паказала пальцам на дзяцей, - я маўчу і цярплю!..
Віця, панурыўшыся, пайшоў да дзвярэй. Наташа стаяла ў ваяўнічай позе, гатовая зноў абараніць бацьку.
Антон Кузьміч, не адказваючы жонцы, спыніў сына:
- Збірайцеся, дзеці, на каток. Сёння і я пайду разамну свае старыя косці.
Яны любілі хадзіць з ім на каток. На яго, такога асілка, усе звярталі ўвагу і любаваліся яго лёгкасцю і спрытам. Яны ганарыліся сваім бацькам - ён усё ўмее і ўсё робіць дасканала.
Дзеці кінуліся апранацца. А Галіна Адамаўна падышла да мужа з перакошаным тварам і, задыхаючыся, прашаптала:
- Ты хочаш забраць у мяне дзяцей? Цяпер я разумею... Але дзяцей я табе не дам! Не дам! Не дам! Чуеш ты, кат?
Раней у хвіліны такіх успышак ён хапаў яе за рукі, прыцягваў да сябе, цалаваў і... супакойваў... Цяпер ён не мог гэтага зрабіць. Панурыўшыся, як Віця, ён выйшаў у калідор шукаць канькі.
Галіна Адамаўна запэўніла сябе, што муж шукае зручнага выпадку для канчатковага разрыву. Таму і дзяцей перацягвае на свой бок. Гэта зрабіла яе яшчэ больш падазронай, але і асцярожнай: не даць прычыны.
Пры сваёй рэўнасці яна, аднак, ніколі не шпіёніла за мужам, як робяць гэта другія жонкі. Залішне лічыла сябе чыстай і гордай, каб уніжацца да тайнага падглядвання і распытвання.
А тут не вытрымала. Дні праз тры пасля гэтай непрыемнай размовы ўвечары пазваніў Кірыла. Антон адказваў яму не на поўны голас ды ўвогуле мала гаварыў слоў, адны выклічнікі: ыгы, так, не. Быў у іх шматгадовы звычай: сазваніцца ўвечары, сустрэцца на вуліцы і пагуляць. Часам яны выходзілі з жонкамі, але часцей адны. Раней Галіна нават заахвочвала такія прагулкі. Але цяпер... Яна здагадалася, што мужчыны дамовіліся пайсці туды. Цяпер яна не верыла не толькі мужу, але і Кірылу... О, гэты вальнадумец здольны на ўсё! Толькі робіць хітрэй. Навучыўся сплятаць сюжэты. Дурніца Валя! Хоць што Валі! Яна проста стала абыякавай да Кірылы. Сваім восьмым класам занята больш, чым мужам і ўласнымі дзецьмі. У Валі пры любых акалічнасцях нічога не парушыцца, дзеці дарослыя... А ёй трэба ўсё ведаць, каб змагацца - не дзеля сябе! - дзеля гэтых неразумных яшчэ малых, якіх ён, бацька, настройвае супраць яе, маці.
Яна не спытала, куды ён ідзе. Але як толькі Антон Кузьміч зачыніў за сабою дзверы, яна хутка накінула хустку, футра, выскачыла следам, пайшла назіркам.
Яна не памылілася. Сапраўды, у той вечар яны дамовіліся наведаць Зосю. Кірылу хацелася парадаваць жанчыну: вызвалялася месца, у бібліятэцы рэдакцыі. Зося сама прасіла іх памагчы ёй знайсці работу. «Толькі не ў атэлье», - цяжкае ўражанне засталося ў яе ад гэтага атэлье.
Яраш і Шыковіч доўга думалі, куды яе ўладзіць. Нарэшце Кірылу прыйшла гэтая ідэя: самая спакойная работа, па яе здароўю. Калі супрацоўнікі будуць ведаць, што перажыла іх новая бібліятэкарка, можна быць упэўненым, што ніхто ніколі і нічым не расхвалюе яе - людзі добрыя. Але месца было занята. У бібліятэцы сядзела малапісьменная старая жанчына Фаня Сямёнаўна. Яе трымалі таму, што яна была найстарэйшая работніца рэдакцыі, працавала амаль з дня заснавання газеты - недзе на другім годзе рэвалюцыі. Ёй даўно пара ўжо на пенсію, але яна ўпарта не хацела пакідаць работы. «Рэдакцыйная матка», «шэф», «Еўфрасіння Полацкая» - называлі яе за вочы. Мужчыны адносіліся з абыякавай іроніяй, жанчыны ж проста не любілі: як большасць старых, Фаня Сямёнаўна была бурклівая, прыдзірлівая, умешвалася не ў свае справы, у прыватнае жыццё, прынцыповасць яе часта пераходзіла ў пляткарства. Таму ідэю Шыковіча - угаварыць яе пайсці на пенсію - усе горача падтрымалі. Угаворы цягнуліся месяцы са два. Кожны, як умеў, распісваў ёй выгады пенсіянерскага жыцця. Урэшце старую «даканалі».
«Бачу, я вам абрыдла, - сказала яна на прафсаюзным сходзе, - чорт з вамі! Але пагляджу, як вы напрацуеце без мяне! Памрэ хто, як пахаваеце!» Сапраўды, у арганізацыі пахавання, калі здаралася такое няшчасце, Фаня Сямёнаўна была незамянімым чалавекам. Бібліятэкарка падала

заяву. У рэдакцыі дамовіліся, што ў навагодні вечар яе ўрачыста праводзяць на пенсію. Рэдактар і мясцком расшчодрыліся на каштоўныя падарункі.
Кірыла расказваў пра камічныя выпадкі, якія ўзнікалі ў часе гэтай «пенсіённай кампаніі». Гучна смяяўся сам. Смяшыў Яраша.
Галіна Адамаўна, якая ішла за імі на пэўнай адлегласці, не чула, пра што яны гавораць, але чула іх смех, і ён кроіў яе сэрца: ім весела, можа, здзекуюцца з жонак.
Калі яны пайшлі ў дом, яна засталася на вуліцы, бязлюднай, ускраіннай, над самай ракой. І раптам ёй зрабілася страшна, сорамна, брыдка. Ніколі яна не адчувала сябе такой прыніжанай, растоптанай. Навошта яна прыйшла сюды? Хіба яна можа прымусіць любіць сябе, калі няма ў яго сэрцы гэтага пачуцця? Ды і ці было яно калі?
«Не кахае, сумна яму са мной, сказаў бы шчыра». Слёзы застылі на шчоках, і Галіна Адамаўна выцерла іх калючымі рукавічкамі. Усе зайздросцілі яе шчасцю: такі муж! Смешна. Вось яно, яе шчасце. Хацелася гучна і злосна засмяяцца. Але перамагала не злосць, перамагаў жаль, да сябе, да дзяцей, нават да яго, мужа: калі-небудзь схамянецца, ды будзе позна!
Але, будзе позна...
Ён кажа, што ў яе няма элементарнай інтэлігентнасці. Можа быць. Але ў яе ёсць жаночая гордасць! Больш нічым не ўнізіць яна сябе - ні падглядваннем, ні істэрыкай, ні дакорамі, ні просьбамі. Мужна вытрымае ўсё!
«Але дзяцей не аддам! Не!»
Скалелая, разбітая, яна раптам кінулася ад дома. Хутчэй прэч адгэтуль, каб ніхто не ўбачыў яе тут.
Але бегчы ёй стала цяжка. Яна задыхалася. Як прыступ астмы; нічога такога ніколі не было.
Галіна Адамаўна прытулілася да нейкага паркана, аграбла з карнізіка снег, набіла ім, пякуча-халодным, рот.
«Цяпер ужо ўсё адно...»
Тарас і Віця сядзелі на кухні, адзін супраць аднаго і націралі пастай лыжы з такой стараннасцю і сур'ёзнасцю, быццам чысцілі зброю перад атакай.
Наташка стаяла, прытуліўшыся плячамі да вушака дзвярэй, і з такой жа сур'ёзнасцю сачыла за іх работай. Доўга сачыла.
- Ты чаму маўчыш, Натка? - спытаў Тарас.
- У яе голас ламаецца, - адгукнуўся Віця.
- А ў цябе мазгі...
- Ну, ну, ну, зноў пасварыцеся.
Не, сварыцца ім не хацелася. Апошні час яны жылі надзіва дружна. І цяпер Віцю хацелася папрасіць у Наташы прабачэння, калі гэты жарт, нявінны, як яму здавалася, пакрыўдзіў яе. Хлопец сам здзіўляўся: ніколі раней ён не адчуваў да сястры такой пяшчоты і ўвагі.
Наташа раптам асцярожна, без стуку, шчыльна зачыніла дзверы.
- Тарас! Ты разумны. Паміры іх.
- Каго?
- Маму і тату.
- На-а-тка! - з дакорам працягнуў Віця, нібы яна адкрывала вялікую тайну некаму чужому.
- А я не магу так больш. Не магу!.. - Голас дзяўчынкі задрыжаў.
Заняты сваімі справамі і пачуццямі, ён асабліва не задумваўся над тым, як перажываюць малыя разлад бацькоў. Нечаканая Наташына просьба кранула яго. Ён падняўся з табурэта, паставіў лыжы ў куток, паміж дзвярамі на балкон і халадзільнікам «ЗІЛ». Наблізіўся да сястры. Яна глядзела яму ў твар з надзеяй, маліла вачамі, поўнымі слёз.
- Так нельга жыць!..
- На-а-тка! - зноў перапыніў яе брат. Яна не агрызнулася, яна сказала яму мякка, як старэйшая:
- Ты бесхарактарны, Віця. У каго ты такі ўдаўся? А я не магу...
- Я іх паміру, - упэўнена сказаў Тарас і сам паверыў, што здолее зрабіць гэта, хоць добра помніў, чым скончылася першая спроба пагаварыць з маці.
Галіна Адамаўна была дома. У спальні. Тарас пастукаў. Яна, пэўна, ляжала і, пэўна, плакала. Калі Тарас, атрымаўшы дазвол, увайшоў, яна стаяла перад люстрам і праціpала кулакамі вочы, як бы толькі што прачнулася. Яна ўбачыла яго праз люстра і насцярожылася, баючыся павярнуцца. А ён

не бачыў яе твару і трохі разгублена спыніўся каля ложка. Ён баяўся, што яна зноў даволі груба папросіць яго не сунуць нос туды, куды не трэба.
- Галіна Адамаўна, я ўсё-такі хачу пагаварыць з вамі. Сур'ёзна... Паслухайце.
Яна павярнулася, вочы яе былі чырвоныя.
- Тарас! З таго часу, калі я адчула, што ты не дзіця ўжо, я не ўмешвалася ў твае справы. - Яна сказала тое ж, што і першы раз, але зусім інакш, без злосці, раздражнення, спакутаваным голасам і нават усміхнулася так, нібы прасіла прабачыць ёй. Ён зразумеў, што цяпер ёй хочацца, каб нехта ўмяшаўся.
- Я люблю вас, мама. - Слова гэтае вырвалася неяк само, ад жалю да яе. Галіна Адамаўна ўзняла на яго вочы, і яны вільготна заблішчалі. - І бацьку люблю. Вы для мяне самыя дарагія людзі.
- Не трэба, Тарас, - цяжка ўздыхнула яна. - Твае адносіны да нас - адно, нашы адно да аднаго - другое.
- Вашы - нейкая дзікая недарэчнасць. Вы паверылі паклёпу. Бацька расказваў... Паверце мне, мама. Я ж вам не вораг. Штодзень я бываю там... Я люблю Машу. Пасля Новага года мы пажэнімся.
- Сур'ёзна? - У вачах яе бліснула іскрынка цікаўнасці.
- Хіба Соф'я Сцяпанаўна такая жанчына! Падумайце, колькі яна перажыла!
Галіна Адамаўна закрыла твар рукамі, заматала галавой:
- Не яна... Ты шмат чаго не ведаеш, Тарас. Ты галоўнага не ведаеш. Але, яна многа перажыла... Але хіба гэта дае ёй права?.. Хоць не яна... ён... Чаму ён хаваецца, падманвае? Навошта? Што я, такая дурная, подлая? Скажы, была я калі-небудзь прагная, скупая? У іх была дружба ў падполлі. Яму хацелася памагчы ёй. Калі ласка. Няўжо я не зразумела б, каб усё па-чалавечы? Цяпер ён папракае, што я не разумела яго, што ўвесь час думала пра яго бог ведае як... А што ён думаў пра мяне, калі пачаў хавацца? З грашамі... - Яна ўся перасмыкнулася. - За каго ён мяне лічыў? Гэта не абраза? - выкрыкнула яна. - Ён адчувае, калі абражаюць яго. А калі ён!.. Я перажыла ўсё, я перажыла б і гэта, каб па-чалавечы. Я ўжо была змірылася. А ён не пераставаў хлусіць, хавацца. Ты не ведаеш галоўнага. Ён здраджваў увесь час! Усё наша жыццё. Падманваў, хлусіў!..
- Няпраўда! - не стрымаўся і рашуча запярэчыў Тарас.
Яна адняла рукі ад твару, сухімі гарачымі вачамі паглядзела на яго, сумна паківала галавой:
- Але хто мне паверыць? Мне не верыць нават Валя Шыковіч, жанчына. Ён мудры, вялікі, добры. Ён усіх заваражыў. Цябе, Наташу... знаёмых. О-о, доктар Яраш! Свяціла! А што яго жонка? Бяздарны зубны лекар, мяшчанка. Каму цяпер клопат да таго, што сваю маладосць, сваё здароўе я аддала яму, табе, дзецям?..
Галіна Адамаўна сказала гэта злосна, і Тарас сумеўся: яна кідала горкі папрок і яму. Можа, сама яна таксама зразумела гэта, бо раптам зноў змяніла тон:
- Цяпер вы лічыце, што я стала псіхапатка. Можа, і праўда я псіхапатка. Дык я нікому не хачу атручваць жыццё! Нікому! Няхай яму яго талент, яго слава!.. Толькі дзеці... Дзеці мае! - крыкнула яна і ўпала тварам на падушку, прыглушана зарыдала.
Тарас зусім разгубіўся. Ён не ведаў, якім чынам супакоіць яе. Стукаў у дзверы, упэўнены ў непахіснай логіцы сваіх доказаў. А сказаў усяго два словы - і ўсе доказы, больш няма чаго і дадаць. Ён пераступаў з нагі на нагу і ціха, няўпэўнена прасіў:
- Не трэба, мама... Супакойцеся, Галіна Адамаўна!
Яна выцерла навалачкай твар і гэтак жа нечакана, як упала, паднялася. Сказала без слёз, без істэрыкі, цвяроза і жорстка, як аб справе, даўно вырашанай:
- Калі ты паважаеш мяне, памажы аформіць развод. Самой мне цяжка і... непрыемна...
Усяго чакаў Тарас - і слёз, і скарг, і праклёнаў, але такога заключэння не толькі не чакаў, але ніколі нават не падумаў. Спачатку, ашаломлены, замаргаў вейкамі, з надзвычайнай пільнасцю ўглядаючыся ў заплаканы твар жанчыны, якая гадавала яго. Ён сапраўды любіў яе, як маці. Але ў той міг яна здалася чужой і варожай. З'явілася злосць на яе, і ён амаль закрычаў:
- Гэта вы самі надумалі? А ў Наташы вы спыталі? А ў Віці?
Яны, Наташа і Віця, разумелі, што падслухоўваць чужыя размовы нядобра. Спальня - найбліжэйшы пакой ад кухні, і яны мімаволі пачулі першыя словы маці. Каб больш нічога не чуць, яны, не згаворваючыся, падняліся і перайшлі ў бацькаў кабінет - самы ізаляваны пакой. Селі там, адно - на канапе, другое - у крэсле, і моўчкі сядзелі. Не чыталі, не размаўлялі, нават не

маглі чамусьці паглядзець адно аднаму ў вочы, быццам саромеліся. Проста чакалі, як у прыёмнай бальніцы ці суда. Доўга чакалі. Можа, праўда саромеліся за маці? Ці шкадавалі яе?
Калі нарэшце Тарас вярнуўся, яны паглядзелі на яго з надзеяй, з запытаннем. Наташа нават саскочыла з канапы і памкнулася насустрач. Тарас усміхнуўся ім знясілена, але паабяцаў з ранейшай упэўненасцю:
- Я іх паміру.
**34**
- ...Не, скажы, верыў ты, што Савіч наш чалавек? Хоць як можна было не верыць!..
- Ты не ўяўляеш усёй складанасці барацьбы.
- Дапусцім, што акрамя цябе ёсць людзі, якія таксама ўяўляюць гэтую складанасць. Вярнуўшыся ў брыгаду, ты сказаў, у каго хаваўся ў горадзе?
- Не.
- Чаму?
- Тваё пытанне наіўнае. Ты думаеш, што гэтым прызнаннем я мог бы рэабілітаваць Савіча? Хто б мне паверыў? Я дзесяць дзён прабыў у горадзе і трапіў у час, калі нічога нельга было зрабіць, калі ішлі арышты, правальваліся яўкі. Пасля гэтага я прыйшоў бы і паведаміў: мяне хаваў Савіч, якога забілі падпольшчыкі, а немцы з пашанай пахавалі. А можа, цябе хавала СД, спытаў бы, відаць, кожны партызан. Дакажы, што ты не лысы. Ты забываеш, які быў час.
- Карацей кажучы, ты пабаяўся.
- Ну пабаяўся, пабаяўся! Калі табе так хочацца, каб я сказаў гэта слова. Я эвакуіраваў горад - не баяўся. Адступаў да Масквы - не баяўся. Мяне паслалі назад у тыл - я не баяўся, не бегаў па камісіях, як другія. Ні разу не скакаў з парашутам - скочыў у ноч, у балота, пад бокам у нямецкага гарнізона. Вадзіў людзей на аперацыі - не баяўся. Пайшоў у горад на сувязь, каб наладзіць разбітае падполле, - не баяўся. Ну не выйшла, як хацелася, не атрымалася...
- Не крычы. І не бразгай сваімі медалямі. Тое, што рабіў ты, рабілі тысячы, мільёны... Мы выконвалі свой абавязак.
- Але, я пабаяўся. А другія не баяліся?! Усе, хто перажыў трыццаць сёмы! Адна справа памерці ад кулі ворага. А памерці ад рук сваіх таварышаў, аднадумцаў, адчуваючы, што ты ні ў чым не вінаваты... Ты ўяўляеш? Ты думаў калі-небудзь пра гэта?
- Думаў. І цяпер зноў падумаў, як адчувала сябе Соф'я Савіч, калі пасля фашысцкага канцлагера трапіла ў Сібір.
Паўза. Гучна, з лёгкім меладычным звонам адбіваў секунды вялікі медны маятнік стаячага гадзінніка. Астматычна дыхаў адзін з двух, што прысутнічалі ў кабінеце.
- Я думаў і бачыў многа разоў, як ішлі на смерць, каб ратаваць таварыша. І я гэта разумеў. А вось такі данос на людзей, якія ратавалі цябе, - гэтага я зразумець не магу.
- Ну, змаладушнічаў! Я ж не хаваю. Я напісаў пра гэта ў тлумачальнай запісцы. Прызнаюся табе. Так, пабаяўся, што прыйдзецца займацца старой гісторыяй, даказваць... Нічога ж не змянілася ў сорак пятым, ты ведаеш.
- Мы перамаглі фашызм, і нічога не змянілася?! Для цябе нічога не змянілася?
- Цяпер лёгка разважаць.
- Ну добра, тады ты пабаяўся. Дрыжаў за сваю скуру...
- Я прашу...
- Чаго там «прашу»! Не ірай святую невіноўнасць. Дрыжаў, як апошні баязлівец. Страціць партызанскую славу, кар'еру - вось чаго ты баяўся. Але прайшло дзевяць год, як яго няма, няма Берыі. Амаль шэсць год пасля дваццатага з'езда. Партыя сказала такую праўду! На ўвесь свет. Чаму ж ты не сказаў праўды пра сябе, пра другіх? Дзеля чаго, у імя якой ідэі ты хаваў яе?
- Гэта што, допыт?
- Я не прасіў цябе. Ты прыйшоў сам, каб «раскрыць душу», параіцца.
- Я не думаў, што ты так настроены. Мы з табой разам разбіралі справы некаторых з тых, хто пісаў даносы ў трыццаць сёмым. Мы былі аб'ектыўнымі.
- Мы разбіралі кожны канкрэтны выпадак. Хоць не скажу, што не праяўлялі часам лібералізму. Між іншым, некаторых з іх браў пад абарону ты. З пазіцый высокага гуманізму. А Шыковіча хацеў выключыць за ўчынак сына.
- Падбіраеш факты?
- Не. Проста прыгадваю. Факта даволі аднаго. Якія яшчэ патрэбны факты?

Зноў паўза. Чыркнула запалка. Патыхнула серай, пасля прыемна пахучым тытунём. Нервовыя цяжкія крокі.
«Дзын-дзон, дзын-дзон», - дзіўны стук маятніка ў гадзінніка, здаецца, ён чапляецца за два розныя металы, якія ад удару па-рознаму гучаць.
- Якое будзе рашэнне абкома? Як ты думаеш?
- Не ведаю. Як сябра бюро я магу сказаць толькі за сябе. Не хочацца мне пасля гэтага падаць табе руку. Тым больш - разам працаваць.
- Так нават?
- Уяві, што так. Дарэчы, ты запрашаў на Новы год у госці. Не чакай, не прыйду.
- Ясна.
- Але, я люблю яснасць з пачатку да канца.
- Ну што ж, дзякую за шчырасць. Бывайце.
- Бывайце.
Тыя ж цяжкія крокі, гулкія на паркеце, мяккія, з шоргатам, на дывановай дарожцы. Скрыпнулі дзверы. Ляпнулі другія, з таго боку.
«Бывайце»? - Гукан не помніў, што сам першы сказаў так, але, спускаючыся па шырокай гаркомаўскай лесвіцы, успомніў, што так адказаў Тарасаў - на «вы». Гэта яго чамусьці ўразіла больш, чым уся размова. Ён спыніўся, падставіў успацелую лысіну пад струмень халоднага паветра, што цёк з адкрытай фортачкі.
Безумоўна, усё ўжо вырашана. Каму-каму, а яму вядома, як вырашаюцца такія справы. На каго ці на што ён мог мець надзею?! Павінен быў здагадацца яшчэ пазаўчора, калі пазваніў Шыковічу і папрасіў сустрэцца. Як той, нахабнік, адказаў!
«Калі ласка, Сямён Парфёнавіч! Заходзьце заўтра пасля дванаццаці ў рэдакцыю. Уваход свабодны. Сакратарак у мяне няма».
Здзекаваўся, пісака няшчасны!
«Ох, распусцілі вас. Спахопіцеся!» - Ён выходзіў і пагражаў тым, хто заставаўся: маўляў, я пагляджу яшчэ, куды завядуць вас такія метады кіраўніцтва.
На першым паверсе яму зрабілася цяжка дыхаць, нібы ён спускаўся не ўніз, а падымаўся высока ўгору. Ён спыніўся каля міліцыянера, патрымаўся за сэрца. Сказаў, як бы апраўдваючыся:
- Гады.
Маладзенькі міліцыянер стукнуў абцасамі і бадзёра пацвердзіў:
- Так точна, таварыш Гукан!
Сямён Парфёнавіч выйшаў на вуліцу. Як ніколі, яна была людная. Няспынная рака людзей, бадзёрых, расчырванелых ад марозу. І кожны трэці з мінакоў нёс елку. Горад пахнуў лесам. Да Новага года заставаліся два дні.
Гукану заўсёды падабалася такая перадсвяточная мітусня, вясёлая ўрачыстасць. Гэтыя турботы, напэўна, больш прыносяць людзям радасці, чым само свята. Ён, гаспадар, любіў у такія дні аб'ехаць горад, паглядзець на афармленне, на ўстаноўку елак на плошчах, у скверах, часам заглядваў у крамы: як ідзе гандаль? Але яму ніколі не хапала часу, ён заўсёды спяшаўся. Хутка хадзіў, а больш ездзіў на машыне. А тут раптам адчуў, што яму няма куды спяшацца. Гэта яго спачатку спалохала, а потым дзіўна супакоіла. Ён залажыў рукі за спіну, згорбіўся больш звычайнага і рушыў па ачышчаным ад снегу тратуары. Але ачышчаны ўчастак хутка скончыўся, і якраз там, дзе асабліва было мнагалюдна, на падыходзе да ГУМа, пешаходы коўзалі па слізкім тратуары. Сямён Парфёнавіч вылаяў у думках трэст ачысткі. Вось зараз ён прачысціць ім мазгі! І пайшоў сваёй звычайнай рабочай хадой. Але тут жа схамянуўся. Навошта? Хвалявацца з-за нейкага тратуара? Цяпер ён павінен прывучыць сябе не хвалявацца і хадзіць толькі вось так - не спяшаючыся. Каб хада была адпачынкам.
Убачыўшы людзей з пакупкамі, ён успомніў, як жонка сказала дні два назад нібыта жартам, а магчыма, і з крыўдай:
«Даўно ты, Сеня, падарункаў мне ніякіх не рабіў. Падараваў бы што-небудзь да Новага года».
Сямёну Парфёнавічу раптам захацелася быць добрым, і ён пайшоў ва ўнівермаг.
Людзей - не прабіцца. Ён успомніў, што паслаў ужо два пісьмы ў Дзяржплан рэспублікі з просьбай асігнаваць сродкі на будаўніцтва другой універсальнай крамы ў раёне новай забудовы. Горад расце.

«Пабачу, як вы пабудуеце без мяне, - зноў падумаў ён пра тых, хто заставаўся, але праз хвіліну мусіў прызнаць: - Пабудуюць. Цяпер лёгка». Усё, што будзе рабіцца без яго, уяўлялася яму надзвычай лёгкім.
Рост яго дазваляў заглядваць на паліцы праз галовы людзей. Што купіць? Чаго ў яе не хапае? Што ёй хочацца? Ён доўга хадзіў з аддзела ў аддзел. Відаць, нехта з работнікаў пазнаў яго, перадаў дырэктару. Той выскачыў - малады, рухавы, у модным касцюме. Гукан добра яго ведаў, зацвярджаў на выканкоме, але толькі цяпер прыкмеціў, што універмагам загадвае такі малады чалавек. Гэта яму чамусьці не спадабалася.
Дырэктар скардзіўся:
- Мала тавараў, Сямён Парфёнавіч. Канец года. Фонды выбраны. Не ўмеем планаваць.
- Парайце, што купіць у падарунак жонцы.
- Сямён Парфёнавіч! - з дакорам зазначыў дырэктар. - Пазванілі б. Што вам самім хадзіць?
«Падхалім», - падумаў Гукан і строга адказаў:
- Я гэтага не люблю.
Аднак не адмовіўся пайсці ў кабінет дырэктара.
- Што б вы хацелі? - спытала таваравед, жанчына, ад погляду і ўсмешкі якой, здавалася, рабілася святлей у змрочным кабінеце.
«Штат падабраў, сабачы сын! Адна ў адну», - усё больш і больш раздражняўся Гукан супраць маладога дырэктара. Але жанчыне гэтай адказаў з добрай усмешкай:
- Далібог, не ведаю. На ваш густ.
- Колькі год вашай жонцы? Ён уздыхнуў:
- Пенсіённы век.
У чароўных вачах тавараведкі скокнулі чорцікі:
- Ёсць цудоўныя шалі. Ёсць венгерскія кофтачкі.
Гукану хацелася спытаць: «А на прылаўках яны ў вас ёсць?» Але не спытаў, цяпер яму ўсё адно.
- Давайце шаль. Давайце кофтачку.
- Вось гэта муж! - аднагалосна ўхвалілі ўсе тры жанчыны, якія прысутнічалі ў кабінеце, хоць на саміх іх былі найлепшыя імпартныя кофтачкі, такія, якіх яго жонка бадай што ніколі не насіла. Пра гэта ён не падумаў. Пацешыўся пахвалой: што б там ні здарылася, а ён такі добры чалавек быў і ёсць.
На плошчы каля пажарнай, дзе народу праходзіла нямнога, з Гуканам прывітаўся хлопец у спартыўным касцюме. Ён стаяў з лыжамі ў руках і размаўляў з дзяўчынай, апранутай у прыгожае нейлонавае футра. Твар хлопца добра знаёмы, але прыгадаць, дзе і калі сустракаўся з ім, Сямён Парфёнавіч ніяк не мог. І раптам праз дзесятак крокаў хлопец гэты, без лыж, дагнаў яго, пайшоў побач.
- Не пазнаяце, таварыш старшыня? Кухараў, архітэктар. З наступаючым Новым годам.
- Дзякую. Вас таксама.
- Мне захацелася сказаць вам, што праект, які я прапанаваў для забудовы Выселак, на конкурсе ў Ленінградзе атрымаў першую прэмію.
- Віншую вас.
- Але мне хацелася сказаць, што вы кансерватар. Так хваліць, а пасля столькі валаводзіць і... адхіліць...
- Тут ужо не мая віна. Вашы калегі...
- Не валіце з хворай галавы...
Гукан спыніўся, уражаны нахабнасцю і дзёрзкасцю маладога архітэктара.
- Малады чалавек! Не забывайце!..
- Я нічога не забываю. Але жадаю, каб у новым годзе ў вас было больш увагі да людзей і да праектаў. Выселкі забудоўваюцца дрэнна, - хлопец адсалютаваў левай рукой і пайшоў назад, да дзяўчыны, якая трымала яго лыжы і чакала.
Нават размова з Тарасавым, размова пра самае галоўнае - пра яго далейшы лёс - не ўзрушыла так, як гэты, здавалася б, выпадковы эпізод. Хіба не званілі яму раней, не пагражалі, не пісалі ананімных пісьмаў з самымі страшнымі пажаданнямі? Ён не звяртаў на іх увагі. Часам толькі паказваў у гаркоме, у абкоме і як бы выхваляўся: «Зразумейце ўсю складанасць маёй работы, нікому з вас не прыйшло ніводнага такога пісьма».
Але выхадка гэтага творцы ў такі дзень!..

«З Новым годам павіншаваў... Паганец! Малакасос! Распусцілі вас. Ох, распусцілі!»
Да апошняга моманту ён спадзяваўся, што тую віну (ён не лічыў яе такой цяжкай, як лічыць чыстаплюй Тарасаў) можна будзе ў нейкай меры ўраўнаважыць сваімі заслугамі, ваеннымі, пасляваеннымі. І раптам гэты тып, недапечаны архітэктар, замахваецца на апошнія заслугі - у адбудове горада. «Выселкі забудоўваюцца дрэнна». «Сапляки! Папрацуйце вы столькі, колькі папрацаваў Гукан».
Сямён Парфёнавіч глянуў на тое месца плошчы, дзе нядаўна яшчэ ўзвышаўся манумент, і цяжка ўздыхнуў.
Можна было ісці дадому - рабочы дзень канчаўся. Але яму чамусьці зрабілася страшна ісці ў пустую кватэру ці, можа, наадварот, стала страшна не наведацца пасля такіх размоў у свой службовы кабінет, у якім ён ужо многа год адчуваў сябе спакойна і ўпэўнена.
Рабочы дзень быў кароткі - напярэдадні выхаднога. Але да канца яго заставалася яшчэ добрыя паўгадзіны. Аднак работнікі разыходзіліся. Праўда, убачыўшы старшыню, многія збянтэжыліся, вярнуліся. Гукан умеў трымаць дысцыпліну, і яго баяліся. Ён не помніў, каб калі-небудзь вось так разыходзіліся. Гэта яго таксама спалохала. «Няўжо пранюхалі? Трэба сабраць усіх, даць адчуць, што я яшчэ старшыня. Ну і павіншаваць з наступаючым». І тут жа падумаў, што выйдзе так, як павіншавалі яго на плошчы. Але не праз гэта ён не стаў збіраць супрацоўнікаў. Яго ашаламіла, што няма сакратаркі. І пустата ў прыёмнай - ніводнай жывой душы. «Гэты пісака мог раззваніць па горадзе раней, чым прынята рашэнне», - падумаў ён пра Шыковіча з такой злосцю, што ажно балюча затахкала сэрца.
Ён асцярожна распрануўся, сеў у сваё зручнае крэсла, адкінуўся на спінку, выцягнуў ногі. Толькі цяпер адчуў, як моцна змарыўся, зусім разбіты, усё цела ные. Адпачынак прынёс заспакаенне. Ён доўга сядзеў, нерухома і бяздумна. Нікога не хацелася выклікаць, нікога не хацелася бачыць. Толькі калі ў калідоры загудзелі крокі і галасы - супрацоўнікі выходзілі ўсе адразу, ён як бы схамянуўся, глянуў на гадзіннік - было роўна тры - і падумаў зноў са злосцю:
«Адной хвіліны лішняй не хочуць папрацаваць. А я працаваў. Начамі». І яму захацелася, на злосць усім, працаваць да позняга вечара. Але што рабіць?
Пазваніў свайму старому сябру Мухлю.
- Пятро Макаравіч! З наступаючым... Прабач, брат, але навагодні баль наш адмяняецца. Занядужала мая палавіна. Дзякую. Перадам. Тваім таксама.
Трэба яшчэ двум чалавекам званіць - адмяняць запрашэнне. А жонка нічога не ведае і, безумоўна, заклапочана, як найлепшым чынам прыняць гасцей. Пазваніць ёй? Але што сказаць, як растлумачыць? Яму зрабілася шкада жонкі. І падарункі, якія купіў, здаліся мізэрнымі і непатрэбнымі. Хіба мала ў яе анучак гэтых? Цяпер, як ніколі раней, ён зразумеў, што яна - той адзіны чалавек, які ніколі не пакіне яго, што б ні здарылася, з якім яму давядзецца дажываць свае пенсіённыя гады. Ён адчуў удзячнасць жонцы, і захацелася зрабіць ёй нешта больш прыемнае, чым гэтыя падарункі.
Заказаў Менск. Далі хутка, хвілін праз дзесяць. Адказала дачка.
- Ала?! Здарова была. Як вы там? Добра? Ведаеш што... Зрабі ты маме навагодні падарунак. Які? Бяры нашчадка, сядай у цягнік - і да нас пад Новы год. Што? У Вовіка панос? - Зразумеўшы, што дачка не прыедзе, што ёй даражэй за ўсё на свеце гэты лабасты Вовік, Сямён Парфёнавіч узлаваўся: - Панос, панос... - і гаркнуў на ўвесь кабінет: - У мяне таксама панос! - і сярдзіта кінуў слухаўку.
Размова з дачкой як бы даканала Сямёна Парфёнавіча. Ён пабялеў, доўга трымаўся за сэрца. Потым рухамі хворага адчыніў шуфляду стала, дастаў цюбік з валідолам, укінуў таблетку ў рот.
Увайшоў Кушнер.
Гукан не любіў свайго намесніка, але ў гэты раз узрадаваўся, што ён прыйшоў: хоць з кім-небудзь пагаварыць, забыцца на ўсё. Можна нават заняцца справамі - апошняй справай года, які мінае.
- З наступаючым, Сямён Парфёнавіч.
- Цябе таксама, Іван Фёдаравіч.
Кушнер сваёй адзінай левай рукой моцна, да болю, сціснуў правую руку старшыні, зблізку зазірнуўшы ў твар.
- Нешта ў цябе, Сямён Парфёнавіч, несвяточны выгляд.
Гукан паскардзіўся:
- Сэрца зноў. Бачыш, валідол смакчу.

- Але, інваліды мы з табой.
- Ну, ты яшчэ інвалід баявы. А я, брат, усё. - І даверліва прызнаўся: - Хачу прасіцца на пенсію.
- Ды што вы! - шчыра здзівіўся Кушнер.
- Як думаеш, персанальную дадуць?
- Безумоўна. Каму ж тады даваць.
- Ты ведаеш усе мае заслугі?
- А хто іх не ведае! Ты сам іх распісаў...
Гукана ўсяго перасмыкнула.
- Здзекуешся? - пабялелымі дрыжачымі вуснамі прашаптаў ён.
Кушнер сумеўся:
- Сямён Парфёнавіч! Далібог, нічога дрэннага не падумаў. Меў на ўвазе тваю кнігу. А выйшла бог ведае што... Дурны ў мяне язык! Вы ж ведаеце. Прабачце.
Гукан супакоена падумаў:
«Гэты яшчэ не ведае, - але тут жа падумаў пра другое: - А даведаецца, злараднічаць не будзе. Проста скажа, як і той: «Не хачу падаць табе рукі». І ён адчуў нечаканы прыліў нянавісці да іх - да Тарасава, да Шыковіча, да Кушнера, да Яраша, да гэтага маладога архітэктара - за тое, што яны такія, у нечым галоўным не такія, як ён.

**35**

Пасля сустрэчы ў кіно Славік пачаў дзейнічаць даволі рашуча. Спачатку званіў у бальніцу. Маша або не падыходзіла да тэлефона, або падыходзіла і ў адказ на яго прапановы сустрэцца смяялася. Тады ён вырашыў схадзіць да яе на новую кватэру. Двойчы падыходзіў да дома, падоўгу блукаў вакол. Але ўвайсці - не хапала рашучасці. Каб Маша жыла адна. А то з ёй - нейкая Зося Савіч, пра якую бацька напісаў у газеце як пра гераіню падполля, значыцца, не маладая ўжо. Столькі часу ён выпрацоўваў у сабе незалежнасць, бессаромнасць, абвяшчаў вайну ўсім умоўнасцям, якія ўстанавілі людзі, а прыйшло да паверкі, і ён, выходзіць, як усе, як вучань восьмага класа, які ўпершыню прыйшоў на спатканне. Смешна! Ён здзекаваўся з сябе, каб раззлавацца і, сапраўды плюнуўшы на ўсе ўмоўнасці, пайсці ў гэты дом і сказаць пры ўсіх, што ён кахае гэтае рыжае дзіва. Але нічога не выходзіла. Рашучасці хапала да дзвярэй...
Нарэшце ў трэці раз ён з ходу ўскочыў на другі паверх, з ходу націснуў на званок. Адчынілі адразу, быццам чакалі каля дзвярэй. Адчыніла Зося. Агледзела яго, стыльна апранутага, трохі падазрона.
Ён спытаў:
- Маша дома?
Тады яна, відаць, здагадаўшыся, прыветліва ўсміхнулася:
- Няма. Ды вы заходзьце, калі ласка. Пачакайце, я думаю, яна хутка вернецца.
Але яго чамусьці збянтэжыла гэтая маленькая жанчына ў халаце, яе ўсмешка, яе цікаўнасць, з якой яна разглядала яго. І Славік не здолеў адразу ж пераступіць парог. А ў наступны момант адбылося недарэчнае. Яна спытала:
- Вы - сын Кірылы Васільевіча?
- Не. Не ведаю я ні Кірыла, ні Мяфодзія.
- О, тады і я вас не ведаю. І не магу пусціць у кватэру, - сказала яна без усмешкі, самым сур'ёзным чынам, і зачыніла дзверы.
Славік застаўся на пляцоўцы адзін, як дурань, якога прагналі з вяселля. Ён гатовы быў адкусіць свой балбатлівы язык. Які д'ябал штурхнуў яго адмовіцца, што ён сын Кірылы Васільевіча? Чаму? Прыйшлося зноў збегчы ўніз і зноў блукаць каля дома. Але Маша, якая павінна была «хутка прыйсці», як на злосць, не з'яўлялася. А ён, Славік, быў не вельмі цярплівы. Звык, каб жаданні яго здзяйсняліся неадкладна.
Зноў званкі ў бальніцу. Зноў смех у адказ. «Славік! Не дуры галаву!» - «Я памру». - «Абяцаю быць на тваім пахаванні».
У наступную суботу яму амаль пашанцавала. Ён убачыў Машу на катку. Не адну, з Тарасам. Шчаслівы сапернік вучыў яе катацца. Яна толькі-толькі навучылася стаяць на каньках і, як дзіця, рабіла першыя крокі. Ён, Славік, прыйшоў без канькоў - зазірнуў проста так, ад суму. Вось выпадак! Што рабіць? Бегчы дадому па канькі? Але пакуль туды ды назад... Убачыў аднаго са сваіх школьных сяброў - да яго:
- Дай канькі!

Той паказаў кукіш:
- Свае май.
Славік схапіў яго загрудкі:
- Дай канькі, а то выб'ю душу!
- Ты што, звар'яцеў? Міліцыянера паклічу.
- Дай канькі. Можаш ты зразумець, янычар? Трэба адной марсіянцы сказаць два словы.
- То так бы адразу і казаў, - здаўся сябра, зацікаўлены, хто ж яна, гэтая «марсіянка»?
Бацінкі аказаліся малыя. Славік усё-такі нацягнуў іх. Ціснулі да вострага болю. Напляваць. Каб там былі набіты нават цвікі, ён усё адно не адступіў бы. Кінуў на снежны бар'ер паліто, шапку, не клапоцячыся, хто будзе вартаваць іх. Чорт з ім, з паліто! Маці купіць новае! Як вецер, вырваўся на ледзяное поле. Спрытна лавіруючы, пайшоў супраць плыні канькабежцаў, каб хутчэй дабрацца да чырвонай шапкі і блакітнага світэра, з якіх ён не спускаў вачэй, пакуль надзяваў канькі. Падляцеў ззаду, схапіў Машу за руку. Яна войкнула, але, убачыўшы, што гэта Славік, засмяялася.
- Вітаю вялікіх спартсменаў эпохі! Хочаш, за паўгадзіны я зраблю з цябе рэкардсменку?
- А ці не замнога самаўпэўненасці? - Расчырванелая, яна ўся свяцілася, ззяла, сыпала з вачэй такія ж вясёлыя іскры, як блёсткі на снезе ад святла ліхтароў.
Тарас, пэўна, не надта ўзрадаваны, што з'явіўся гэты шалапут, сказаў, аднак, з клопатам:
- Што ты так лёгка? Прастудзішся.
- Брыгадзір! Ты дрэнна ведаеш свае кадры!
Маша зазвінела смехам.
Падтрыманая за абедзве рукі двума даволі спрактыкаванымі канькабежцамі, яна пайшла больш упэўнена, хутка, смела.
Шоргат соцень палазоў, галасы і смех, дзесяціградусны мароз, ззянне інею, іскрыстае святло ліхтароў, пах елкі - елка ўжо стаяла пасярод катка, але не была яшчэ ўпрыгожана і асветлена, - усё гэта п'яніла, напаўняла ўзнёслымі жаданнямі, весялосцю.
- Місіс марсіянка! Корпус наперад! Вось так. Глядзі на мае ногі! Не глядзі на яго! Ён жа ходзіць, як лось на лёдзе. - Пад нібыта бяскрыўднымі жартамі хаваўся намер, можа, нават і несвядомы, асмяяць, прынізіць свайго саперніка. - Пройдзем удваіх, і я пакажу табе вышэйшы клас фігурнага катання. Не бойся, я буду цябе трымаць вось так.
Славік паспрабаваў абняць дзяўчыну за талію, але яна адхілілася і вырвала сваю руку. Славік ламаў галаву, якім чынам адшыць Тараса і хоць на кароткі час застацца з ёй з вока на вока. Тады ў гэтым карагодзе ён, напэўна, здолеў бы сказаць ёй пра свае пачуцці. А сказаць трэба сур'ёзна і горача, каб яна паверыла, каб зноў не палічыла гэта за легкадумны жарт, на яго звычайную безадказную балбатню. Недарэчна ўсё выходзіць! Можа, упершыню ў жыцці яму захацелася пагаварыць з дзяўчынай з усёй сур'ёзнасцю, і няма як. Магчыма, што ўрэшце ён усё-такі нешта прыдумаў бы. Але калі ўжо не шанцуе, то не шанцуе да канца. Усё складвалася так, каб перашкаджаць яму. Немаведама адкуль з'явіўся Яраш з усім сваім вывадкам - з Наташай, Віцем. Яны адразу падхапілі Машу. Побач з імі пайшоў і Тарас. Уся сям'я сабралася! І ён, Славік, аказаўся як бы лішні. Колькі хвілін ён круціўся вакол гэтага сямейнага ансамбля, выпісваючы самыя адмысловыя фігуры. Яму хацелася паказаць свой спрыт, уменне. Але раптам сам Антон Кузьміч вырваўся наперад і зрабіў два-тры такія віражы вакол Славіка, што хлопец, пры ўсёй сваёй несамакрытычнасці, зразумеў: здзівіць свет яму няма чым. А тут яшчэ падляцеў дурань сябра з яго, Славікавым, паліто і шапкай і закрычаў, парасё, на ўвесь каток:
- Аддай мае канькі!
Размовы не адбылося. І ўвесь наступны тыдзень Славік быў заняты тым, што пісаў Машы пісьмы. Увогуле ён не любіў пісаць. А тут штодня сачыняў даўжэзныя пасланні. Пісьмы не падабаліся яму: яны былі сентыментальныя, як Ірынін дзённік. А ён ненавідзеў залішнюю чуллівасць. Хацелася сказаць пра сваё каханне проста, але гэтак шчыра, каб яна адразу паверыла. Цяпер ён добра разумеў, што толькі вера ў сур'ёзнасць яго прызнання можа нарадзіць у Машы гэтакія ж пачуцці. Толькі такім чынам можна перамагчы саперніка, а не дуэллю, бойкай, сваркай, знявагай, крыўляннем ці якім іншым глупствам. Але такія шчырыя пісьмы не выходзілі. Выявілася, што напісаць так, каб табе паверылі, гэта зусім нялёгка.

* * *

Сакратар камітэта Валодзя Клецень перабіраў у шуфлядзе стала паперы і доўга не пачынаў гаворкі. Тарас зразумеў, што размова мае быць далікатная і Валодзя, хлопец добры і мяккі, хоча, каб пачала яе Вера Куцькіна, лабарантка, сябра камітэта. Гэтая нязграбная, высокая, у чорных акулярах дзяўчына сядзела каля стала і вельмі ўважліва чытала нейкую чарговую доўгую пастанову вышэйшага камсамольскага органа.
Вера ў камітэце - спецыяліст па маральна-бытавых пытаннях. Усе на заводзе ведалі яе гнеўную непрымірымасць да ўсялякіх амаральных учынкаў. Тарас таксама цаніў яе прынцыповасць: нікому не змоўчыць, калі трэба, - ні дырэктару, ні парторгу. Таму ўсе пакрыўджаныя, асабліва дзяўчаты, ішлі да яе. Але што датычыць яе высокіх маральных прынцыпаў, то Тарасу здавалася, што Куцькіна не заўсёды бывае шчырая, што гнеў яе да парушальнікаў гэтых прынцыпаў - не ад глыбокага перакanання, душэўнай чысціні і дабраты, а хутчэй - ад злосці на людзей за тое, што самую яе прырода пакрыўдзіла. Таму Тарас трохі недалюбліваў гэтую дзяўчыну. Не падабалася яму, што яна залішне ўважліва прыглядаецца да яго брыгады, быццам паставіла сабе за мэту: абавязкова знайсці крамолу. Генрых сказаў ёй аднойчы:
- Ты, Вера, можаш глядзець на нас як хочаш. Але не забывай, калі ласка, што мы не ангелы, мы - людзі. Маладыя хлопцы.
Сакратар не дачакаўся, пакуль Куцькіна праявіць ініцыятыву. Сказаў:
- Давай, Вера, ты... выкладвай...
Яна з неахвотай адарвалася ад пастановы, бліснула акулярамі, крутнула галавой.
- Ох, ліберал! - І павярнулася да Тараса: - Даклад кароткі. Я патрабую, каб гэтага твайго піжона Шыковіча выцягнулі на камітэт.
- Завошта?
- Ён пакрыўдзіў дзяўчыну Ніну Байкач.
- Як пакрыўдзіў?
Вера сурова глянула на брыгадзіра з-пад акуляраў.
- Не прыкідвайся, Ганчароў, дурнем. Ты добра ведаеш, як можа пакрыўдзіць такі.
Тарас пачырванеў. Ён заўсёды адчуваў сябе няёмка, калі гаварылі пра такія рэчы маладыя людзі, ды яшчэ дзяўчаты.
- Яна паскардзілася табе?
- Не. Праз дурны дзявочы гонар яна нікому нічога не расказвае. Але сяброўкі чуюць, як яна начамі раве ў падушку.
- А чаму, Вера, па-твойму, гэта дурны гонар? - нечакана спытаў Валодзя Клецень.
Куцькіна доўга разглядала сакратара праз свае вялікія акуляры, як бы здзіўленая, што ён мог задаць такое пытанне. Потым, як суровая настаўніца, паківала яму пальцам.
- Клецень! Табе не да твару такая пазіцыя. У цябе спытаюць... Гарком спытае... Чаму такі чалавек носіць званне сябра брыгады камуністычнай працы? Я дагэтуль не ведаю, як ён апынуўся ў брыгадзе...
- Мы самі яго ўзялі.
- Ведаю, што самі. А завошта? За якія заслугі?
- Баюся, што ты, Вера, гэтага не зразумееш, - уздыхнуў Тарас, як бы шкадуючы, што яна не можа зразумець такой простай рэчы. А Вера прыняла гэта як абразу. Абурана закрычала:
- Ты чуў, Валодзя? Адны яны ўсё разумеюць! Што гэта такое, як не зазнайства? Хіба я не казала, што нам трэба глядзець ды глядзець за гэтай брыгадай?!
Тарасу хацелася пасварыцца, але ён змаўчаў. Іншае ўзрушыла. Ён быў супраць, каб адносіны Славіка з Нінай выносілі на камітэт. Хто ведае, што ў іх было. Калі дзяўчына не скардзіцца, а толькі плача па начах і сохне, то, на думку Тараса, справа гэтая не для такога разбору. Тут трэба нешта другое. Нейк інакш. Больш далікатна.
Акрамя ўсяго Тарас баяўся, як бы Славік не падумаў, што ўсё гэта ўзняў ён, брыгадзір, з-за Машы. Безумоўна, падумае.
Славікавы настойлівыя заляцанні да Машы прынеслі Тарасу нямала цяжкіх перажыванняў. Асабліва трывожыла, што Маша ўсё яшчэ не адказвае, ці згодна яна выйсці за яго замуж. Але каб выгнаць Славіка з брыгады, - такой і думкі ніколі не было. А вось жа могуць стварыцца абставіны, што зробяць іх ворагамі. І тады ўжо напэўна ў адной брыгадзе ім не працаваць. Валодзю Клецeню можна было б пра ўсё гэта расказаць. Але Куцькінай - не. Перакруціць усё дагары нагамі, даводзячы свае высокія прынцыпы. Тарас сказаў:

- Дайце спачатку нам самім пагутарыць з ім. У брыгадзе.
Вера падазрона прыжмурылася.
- Хочаце выпрацаваць тактыку, як абараняць свайго любімчыка? Ой, глядзі, Ганчароў, зацягне ён цябе ў балота!
Славік і Генрых прыйшлі апошнія: даўжэй другіх мыліся ў душы; любілі паплёскацца. Генрых ведаў, з якой мэтай збіраецца брыгада. Ён, як і Ходас, адразу паверыў, што Славік мог зрабіць подласць, і ўзлаваўся на гэтага «безадказнага шчанюка». Яны разам працавалі - на зборцы аўтаматычнага дэталез'ёмшчыка. Славік, як ніколі, быў уважлівы і старанны. «Асісціраваў» без адзінай памылкі. Гэтае яго ўменне яшчэ больш злавала «прафесара». Няўжо ўсе іх спадзяванні і намаганні дарэмныя? Няўжо не будзе чалавека? Генрых дзіўна гасіў сваё абурэнне і выдаваў свой настрой: увесь час, ад абеду да канца змены, бурчаў словы адной і той жа песні:

Миленький ты мой, возьми меня с собой
И в той стране далекой зови меня женой.

Славіку песня спачатку падабалася, потым пачала раздражняць.
- Бабская песня, - сказаў ён.
- Бабская, - згадзіўся Генрых.
Славік зразумеў, што сабраліся гаварыць пра яго адразу ж, як толькі ўвайшоў у пакой інтэрната. З якой прычыны?
Паважнай хадой «кіруючага таварыша» - Славік навучыўся передражніваць гэтую паходачку - крочыў па пакоі Іван Ходас, глыбока засунуўшы рукі ў кішэні штаноў. Косця заваліўся на свой ложак, прытуліўшыся патыліцай да сцяны - да фатаграфій кінаактрыс, і, чырвоненькі, узбуджаны, зіркаў сваімі цыганскімі вачамі на Івана. Відно было, што яны пасварыліся. Тарас і Лапацін сядзелі за сталом. Лапацін з дзіцячай цікавасцю разглядаў маленькую штучную елачку, круціў у руках, асцярожна дакранаўся да кожнай мініяцюрнай цацачкі.
- Скажы, калі ласка! Косця! Колькі каштуе?
- Сто рублёў.
- Маніш. Толькі што гаварыў - трыццаць. Але і трыццаць - дорага. - Пасля таго як Вера нарадзіла сына, Васіль стаў надзіва ашчадны.
«Знарок цягнуць», - падумаў Славік. Яго неаднойчы прабіралі ў школе, на студыі, у брыгадзе. Але ніколі ён не адчуваў сябе так кепска. Ён ненавідзеў сябе за гэтую незразумелую боязь. Загадваў сабе быць дзёрзкім і смелым. Але калі казаць шчыра, то таксама ўпершыню ўсумніўся, што здолее быць такім.
Генрых падышоў да этажэркі, узяў нейкую кніжку, разгарнуў і зноў ціха заспяваў:

Миленький ты мой, возьми меня с собой
И в той стране далекой зови меня чужой...

Славік узарваўся:
- Не вый! - Але спахапіўся і сказаў да ўсіх з усмешкай, быццам бы жартам: - Што вы паселі, важныя, як суддзі? Судзіце.
- І а-су-дзім, - пагрозліва, з націскам, праз зубы працадзіўшы склады, адказаў Ходас. Спыніўся перад Славікам, выцягнуў з кішэні сціснуты кулак. - Брыгаду ганьбіць не дамо!
- Хлопцы, няўжо трэба псаваць настрой перад Новым годам? - зморшчыўся Косця, просячы вачамі ўсіх, каб яны былі больш далікатныя, не сварыліся. Адкуль столькі чуласці і дабраты ў гэтага хлопца!
- Ён, можа, жыццё чалавеку сапсаваў, а не настрой! - крыкнуў Ходас. - А ты - добранькі!.. Хрыстосік!..
У Славіка захаладала ўсярэдку. Пад нагамі, здавалася, калыхнулася падлога.
Вось яно, прыйшло... Няўжо Нінка зацяжарала і пра ўсё расказала? О жах! На лбе выступіў пот. Здрадны пот. Выцерці? Не. Славік паварушыў пальцамі і адчуў, што яны зліпліся, быццам іх вымазалі смалой.
- Чакай, - спыніў Тарас Ходаса, які пачаў быў ужо гаварыць гнеўную прамову, і спакойна спытаў у Славіка: - Скажы нам шчыра, што ў цябе з Нінкай. Дзяўчына плача начамі...

«Значыцца, не скардзілася, а толькі плача, - узрадаваўся Славік. - Тады - адмаўляць. Усё адмаўляць! Не здавацца! Наступаць!» Ён даўно ўжо пераканаўся, што лепшая форма абароны - наступленне. І закрычаў:
- Ты ўжо пытаўся ў мяне пра гэта. І я табе адказаў. І табе адказаў! - тыркнуў Славік пальцам у Генрыха. - Шчыра. Чаму вы не верыце мне? Крычыце пра веру ў чалавека, а самі... Лезеце ў душу, дзе трэба і не трэба...
- Не, дзе трэба! Дзе не трэба - не лезем, - адказаў Тарас і папрасіў ветліва: - Не гарачыся, калі ласка.
А Генрых з узнятай кнігай ступіў да Славіка і сказаў са сваёй звычайнай разважлівасцю:
- Па маралі мяшчанскай мы, відаць, сапраўды не маем права лезці ў душу, як ты кажаш, калі справа датычыць тваіх адносін з дзяўчынай. А па маралі нашай, я думаю, мы маем гэтае права. Абавязаны, Косця! - павярнуўся «прафесар» да Косці і... сунуў яму ў рукі кнігу, невядома навошта.
- А ён плюе на нашу мараль! - ніяк не мог супакоіцца Ходас. - У яго свая, брадвейская... Выхоўваем... Даўно пара гнаць!
- А я веру Славіку! Хіба ён падвёў нас у чым? Дрэнным таварышам быў?
Славік хмыкнуў:
- Ты наіўны, Косця. Хіба не бачыш, што камусьці хочацца мяне выжыць? - Ён нахіліўся над сталом, да Тараса, заглянуў зблізку яму ў твар, у вочы, аскаліўся, як ваўчаня. - Што? Знайшоў прычыну, брыгадзір? Хочаш адпомсціць? Дык ведай. Я люблю Машу!
Усе адразу сціхлі. Тарас апусціў вочы, лоб яго пабялеў, а шыя налілася крывёю.
«Я так і ведаў», - падумаў ён, але схамянуўся, смела глянуў на Славіка і сказаў спакойна і цвёрда:
- І я люблю Машу. Але помсціць табе... - ён паківаў галавой, - няма за што. І не думай, што нам прыемна разбіраць такія справы. Вырашым так... - Брыгадзір рэзка падняўся, агледзеў сяброў; рэдка ў яго быў такі рашучы выгляд, звычайна ён любіў параіцца, разважыць. - Вырашым так... Калі ты сумленны перад Нінай, перад намі, - прыходзь заўтра ў брыгаду і - працуй. Мы слова больш не скажам. У камітэце я ўладжу. Калі ж ты зрабіў подласць і не маеш мужнасці прызнацца, - не прыходзь. - Ён вымавіў гэтае «не прыходзь» амаль шэптам, але выразна і цвёрда. - Так будзе лепш для цябе. Праўду не схаваеш. Выганім з ганьбай!

**36**

Славік не спаў усю ноч. Пасля доўгага роздуму вырашыў - пойдзе на завод. А можа здарыцца, што абыдзецца. Але калі маці раніцой пачала будзіць яго, сказаў, што ў яго выхадны.
Доўга валяўся ў ложку. Не хацелася нікога бачыць, нікому глядзець у вочы. Здавалася, глянуць на яго і ўсе адразу здагадаюцца.
Падняўся - і адразу схапіўся з сястрой. Знарок, на злосць ёй, абвясціў, што чытаў яе дзённік.
- Сентыментальная лухта.
Рэакцыя Іры была зусім нечаканая. Яна паглядзела на брата зняважліва і на поўны голас, пры маці, сказала:
- Падонак ты! Што ты разумееш? Так, я люблю яго!
- Але ж ён цябе, дурніцу, не любіць.
- Ну і няхай. І няхай. А я люблю! Люблю так, як ты, цынік няшчасны, не палюбіш ніколі. І мне хораша!.. І ты не чапай!.. Не лезь сваімі бруднымі лапамі! - Ёй было так «хораша», што слёзы паліліся ў яе з вачэй.
Славіку стала сорамна. Дурань! Надумаў здзекавацца... З каго? І з чаго? Сам такі.
Ніколі ён яшчэ не прасіў у сястры прабачэння. А тут збянтэжана папрасіў:
- Я не хацеў цябе пакрыўдзіць. Даруй.
Гэта да слёз кранула Валянціну Андрэеўну. Прызнанне дачкі, трагедыя яе першага кахання, нечаканая чуласць сына - як усё гэта адгукнулася ў мацярынскім сэрцы! Адначасна - і болем і радасцю. Папракнула сябе: мала займаецца дзецьмі.
Прыкмеціўшы, як за апошні час Славік пасталеў, пасур'ёзнеў, Валянціна Андрэеўна радавалася і сачыла, каб хто незнарок не абразіў яго напамінкам пра мінулае ці яшчэ чым-небудзь, што магло б зрабіць душэўную траўму.
Жадаючы замацаваць мір паміж дзецьмі, улагодзіць, яна дала кожнаму з іх прыемнае даручэнне.
- Я не веру, што бацька прывязе елку з лясніцтва. Ён тыдзень абяцае і не можа выбрацца. Ды, кажуць, леснікі і міліцыя затрымліваюць усіх елачных браканьераў. Славік, разбіся, а знайдзі

добрую елку. Што гэта за такая абыякавасць да Новага года? Зрабіце прыемнае мне, калі не хочаце рабіць сабе. Іра, сходзіш у краму, купіш цацкі. Каб да вечара ў нас стаяла елка. Будуць госці.
Славік узрадаваўся, што ёсць прычына пабадзяцца па горадзе, нечым заняцца. Абы забыцца на ўчарашняе. Каб можна было забыцца! А што, уласна кажучы, здарылася? Нічога. Яго ж не выгналі з завода. Ён можа працаваць. Не, чорта з два! Як ён можа вярнуцца, калі не пайшоў сёння?
Ён хацеў прымусіць сябе на ўсё махнуць рукой з цынічнай абыякавасцю чалавека, вольнага ад усіх умоўнасцей. Такім яму хацелася некалі быць. Але цяпер гэта не атрымоўвалася. Адбылося нешта незразумелае для яго. Каб раней яму сказалі, што здарыцца так, што яму будзе цяжка расстацца з брыгадай, то ён, напэўна, засмяяўся б. А цяпер, калі ён так прыжыўся там, нават з Ходасам, здаецца, паладзіў, набыў прафесію і палюбіў яе!.. Крыўдна, шкада. І ён не саромеецца гэтых «банальных пачуццяў». Застацца на заводзе? Але тады трэба ісці ў другі цэх, зноў вучнем, зноў пачынаць усё спачатку, могуць нават паставіць featureразнарабочым. Разгружаць вугаль ці вывозіць з цэха стружку разам з тымі дзяўчатамі, што толькі ўчора прыйшлі на завод з вёскі.
Праўда, цяпер ён не думаў са знявагай пра гэтых дзяўчат. Ні да каго - якую б чорную работу ні рабіў чалавек! - ён не ставіўся цяпер з вышыні сваёй выключнасці. Якая там, да д'ябла, выключнасць! Таксама знайшоўся звышчалавек! Ён скептычна ўсміхаўся з ранейшых думак пра свае таленты, незвычайнасць, са сваёй гульні ў расчараванасць, незадаволенасць. Не, цяпер яму хочацца аднаго - быць звычайным, звычайным слесарам-зборшчыкам, такім, як Косця, як хітрун і насмешнік Варэнік, як Лапацін, як Тарас, як нават Ходас. Як усе яны разам і кожны паасобку - з усім тым добрым, што ў іх ёсць, і з усімі чалавечымі слабасцямі. І мець звычайнае шчасце - Машына каханне. Больш нічога не трэба. Але, пэўна, ён горшы за ўсіх: Маша з ім не хоча нават сустрэцца, і з брыгады яго выгналі...
Славік спыніўся пасярод шырокай і пустой плошчы. У далёкім канцы яе, каля паркавай агароджы, прадавалі елкі. Углыбіўшыся ў развагі, ён зусім быў забыўся, чаго ішоў сюды. Убачыў елкі - успомніў і адчуў, што нішто яго не цікавіць: ні елка, ні Новы год.
А можа, пайсці да хлопцаў? І сумленна расказаць ім пра ўсё. І з Нінкай пагаварыць - папрасіць: даруй. Ён адчуў раптам павагу да дзяўчыны, якая «па начах раве ў падушку», але нікому - ні слова. Але ж - сорамна, ганебна. Як скажаш: даруй, што не кахаю цябе. Не, ён сапраўды такі пашляк і не мае права быць у такой брыгадзе. Каб можна было зайсці да Машы і да гэтай жанчыны з добрымі сумнымі вачамі... Чамусьці здалося, што толькі яны маглі б зразумець яго. Вельмі захацелася зайсці да іх. Але ён разумеў, што цяпер у яго тым больш не хопіць рашучасці.
- Што ты прывезла ламачча нейкага, а не елак? - закрычаў ён на маладую чырванашчокую жанчыну, якая ў кажуху, у валёнках сядзела на грудцы крыжавін і смачна ела свежую булку. - Думаеш, гарадскія - дурні, любую дрэнь праглынуць? Ці, можа, ім грошай няма куды дзяваць?
- А ты б пазней паспаў, можа б, табе сама Снягурачка прынесла елку, - хораша ўсміхнулася яна. - Елкі як елкі. Хто гэта будзе добры ельнік рубіць? У цябе елка два дні пастаяла, ды і на сметнік. А з добрай ялінкі якое дрэва вырасце!
Яе мудрая разважлівасць, спакой і здаровы апетыт неяк дзіўна супакоілі Славіка, нават развесялілі, настроілі па-святочнаму. Ён хутка выбраў елку, разлічыўся. Жанчына зычліва параіла:
- Галінак захапі. Падвяжаш, будзе елачка што лялечка.
Славік нёс сваё свята, дарагое яшчэ з маленства, і стараўся адагнаць прэч усе сумныя думкі. Пакінуць усе турботы старому году! О, каб можна было ўвайсці ў новы год зусім новым, без усяго мінулага! Нехта ўчапіўся ззаду за елку, пацягнуў. Нехта жартаваў. Ён намерыўся панатужыцца, пацягнуць на сябе, а пасля рэзка адпусціць - няхай грымнецца нейкі дурань. Але ззаду пырскнуў дзявочы смех. Славік хутка павярнуўся. Перад ім стаяла Маша. Трымала маленькую пушыстую елачку і ўсміхалася. Чырвоная, як жар, рукавічка гарэла паміж цёмнай зеляніны. Іскрылася інеем хлапчуковая шапка.
- З наступаючым, Славік.
Ён так узрадаваўся, што забыўся нават павіншаваць яе ў адказ. Стаяў, глядзеў і блазнавата ўсміхаўся.
Потым яны ішлі побач. Неслі елкі, вялікую і рэдкую - Славікаву, маленькую і густую - Машыну. Як у лесе. Славік сапраўды ішоў, як у лесе, - нікога вакол не бачыў, нічога не чуў, акрамя яе

голасу. Гаварылі пра пустое, дробязнае. Але ён увесь час думаў, што хутка ёй трэба павярнуць... Яна са смехам развітаецца і... пойдзе. А ён зноў застанецца са сваімі пакутамі. Калі яшчэ здарыцца такі выпадак?
Славік спыніўся, глыбока ўдыхнуў марознае паветра, як бы рыхтуючыся нырнуць.
Маша са смяшынкай у вачах глядзела на яго, напэўна, здагадваючыся, пра што ён хоча сказаць. Ён сказаў амаль шэптам:
- Я люблю цябе, Маша. Я вельмі...
І змоўк - спалохаўся, што яна засмяецца. Яна не засмяялася. Наадварот, зрабілася раптам вельмі сур'ёзнай. Ласкава дакранулася вогненнай рукавічкай да адварота яго паліто.
- Выкінь з галавы, Славік. Я выходжу замуж, - і ўздыхнула.
Словы яе - як удар молата, таго, шматтоннага, што ў механічным цэху. Неяк назіраючы за яго работай, Славік падумаў, што было б, каб пад молат трапіў чалавек. Ён «трапіў пад молат»... «Яна выходзіць замуж за Тараса. Але, за яго, безумоўна. За каго ж яшчэ?»
- Ты дзіця, Славік. А я - старая. Мне дваццаць тры. Тарас - цудоўны чалавек.
Усё. Цяпер - усё. Няма Машы, няма брыгады. Нічога няма. Што ж рабіць?
Кінуўшы елку, як непатрэбную рэч, Славік доўга без мэты і без думак, з пустой галавой блукаў па горадзе. Спачатку не бачыў людзей. Пасля іх узбуджаныя і шчаслівыя твары пачалі раздражняць яго. Што іх радуе? Новы год? Елкі? Смешна. Куды б пайсці, дзе б схавацца, каб нічога не бачыць, не чуць звычайных, банальных слоў?
Каля пад'езда рэдакцыі стаяў бацькаў «Масквіч». Славік як бы спатыкнуўся на яго. Доўга стаяў, разглядаў, як дзіва нейкае. Потым з'явілася думка. Вось яно - выйсце! Паехаць - куды вочы глядзяць. За горад! У снежны прастор! Ляцець, каб вецер свістаў! З'ехаць на край свету. Няхай шукаюць!
Бацька яшчэ вясной забараніў яму ездзіць на машыне і адабраў аматарскія правы. Але запасныя ключы Славік усё яшчэ насіў з сабой, на ланцужку ў маленькай кішэні штаноў. Ён насіў іх з восьмага класа, калі навучыўся вадзіць машыну, і дужа любіў пакруціць ключыкамі перад сябрамі, перад дзяўчатамі - усё, маўляў, мы маем і ўсё ўмеем!
Шыковіч-старэйшы спахапіўся, што няма машыны, хвілін праз дваццаць. У рэдакцыі ўзняўся вэрхал. Гэта ж нечуванае нахабства! Украсці машшу ад дзвярэй рэдакцыі сярод белага дня, ды яшчэ пад самы Новы год!.. Жах! З абурэннем званілі ў міліцыю з некалькіх тэлефонаў - у абласное, у гарадское кіраўніцтва: якога д'ябла вы там робіце, калі зладзеі дзейнічаюць вось так?! Гонар міліцыі быў закрануты, і яна праявіла незвычайную аператыўнасць.
Па горадзе Славік ехаў павольна: усюды міліцыя, асабліва пры выездзе, правяраюць кожную машыну, якая вяртаецца ў горад, адбіраюць елкі. Ён праехаў кантрольны пункт, кіруючыся ўсіх правілаў, спакойны і ўпэўнены, з папяросай у зубах. Як добры знаёмы, адсалютаваў міліцыянеру. Але як толькі вырваўся за горад, даў такі газ, што стрэлка спідометра хутка перапаўзла лічбу 100 і пачала канвульсіўна скакаць, падбіраючыся часам ажно да 120. Стары «Масквіч», здавалася, не датыкаўся сваімі аблыселымі шынамі слізкай дарогі.
Славік ехаў пасярод шашы, у лоб сустрэчным машынам. І спрактыкаваныя шафёры ў апошні міг кідалі свае ГАЗы і МАЗы ўбок, узнімаючы снежны пыл. Мацюкаліся, пагражалі ўслед вар'яту кулакамі.
Шалёная хуткасць канчаткова ап'яніла хлопца. І чым далей - тым горш. Падскаквала, дрынчала машына, кідаліся пад яе голыя вербы, і шумела ў галаве, мільгала і двоілася ў вачах.
У пасёлку хімічнага завода аўтаінспектар хацеў спыніць яго за перавышэнне хуткасці. Славік праляцеў міма. Але пільны вартавы дарожкага парадку ўсё-такі паспеў запомніць нумар. Таму вельмі хутка міліцэйскае кіраўніцтва, на радасць сабе, дакладна ведала, у якім кірунку гоняць украдзеную машыну. На дзвесце кіламетраў па магістралі былі падняты на ногі ўсе аддзяленні міліцыі.
Хто затрымае небяспечнага злодзея?
Кіламетраў за трыццаць ад горада Славік убачыў наперадзе на дарозе сярод пустога поля матацыкл. Двое ў чорных кажухах стаялі пасярод шашы. Ён зразумеў, што чакаюць яго. І тут жа ўявіў амаль дакладна, што адбылося там, у горадзе. Гэта надало яму панурую весялосць. Не аднаму яму пакутаваць. Няхай і самазадаволены «стары конь» паперажывае за сваю «рухомую ўласнасць». У апошні час ён занадта вясёлы.
- Іду на таран! - закрычаў ён і, наддаўшы газу, памчаў на міліцыянераў.

Натуральна, што яны не вытрымалі - адскочылі ўбок. Праз люстэрка Славік убачыў, як адзін выхапіў пісталет.
«Страляюць? Вось гэта здорава! Зусім як у кіно». Хутка ён убачыў, што міліцыянеры ўскочылі на матацыкл. Гоняцца. І хлопца апанавала новае пачуццё - азарт гоншчыка-ўцекача. Ён засвістаў, загалёкаў, як той каўбой на кані:
- Ану, злавіце!
Убачыўшы, што матацыкл адстае, ён знарок прытармазіў газам, даў ім пад'ехаць бліжэй. Зноў убачыў цераз люстэрка, як той, што сядзеў у калысцы, дастаў пісталет. Тады зноў ірвануў уперад так, што з-пад колаў паляцеў ледзяны пыл.
Міліцыянераў чакалі дома жонкі, дзеці і навагоднія сталы: яны адсталі, упэўненыя, што наперадзе ёсць другія.
Кіламетраў праз пятнаццаць - дваццаць уцекача чакала другая засада, больш хітрая і моцная.
Насустрач ішоў ГАЗ-69. Славік спачатку нічога не падумаў: ці мала было сустрэчных машын! Ды раптам метраў за дзвесце «газік» нібы занясло - ён стаў пасярод дарогі.
- А-а! - Славік завыў, як дзікун. - Вы так?! А мне як?! Мне як?!
Але волі хапіла не перакінуць нагі з педалі газу на педаль тормаза. Упяўся да болю ў баранку. Заплюшчыў вочы. Не вытрымалі нервы ў міліцыянера, які сядзеў за рулём: ірвануў машыну да кювета, і Славік праскочыў і гэтую засаду. Глянуў у люстэрка, убачыў, як «газік» вылазіць са снегу, паварочваецца, і амаль радасна галёкнуў:
- А што, укусілі?
Начальнік раённай міліцыі, чалавек добры і спакойны, заключыў:
- П'яны. Не гані, Пятро. Нікуды не дзенецца. А то яшчэ разаб'ецца, дурань. - Начальнік шкадаваў п'яных, нават зладзеяў. Але Пятра заела: нейкі шчанюк так напалохаў, увагнаў у сорам. І ён націснуў на газ.
Славік раптам адчуў, што «Масквіч» як бы знясіліўся. Не, стрэлка па-ранейшаму дрыжала направа ад 100. Але ўсё-такі нешта не так. А тут яшчэ ён выскачыў да рэчкі. Круты-круты спуск, а на тым беразе яшчэ вышэйшая гара. І Славіка раптам апанаваў страх. Здалося, што машына, набыўшы інерцыю, не здолее праскочыць вузкі мост, што ў яго не хопіць сілы ўтрымаць руль і ён зляціць у рэчку, праломіць лёд...
Не паспеў ён падумаць пра гэта, як нага сама рэфлекторна пераскочыла на тормаз. І ў той жа міг Славік адчуў, што машына, нібы раз'юшаны звер, выйшла з-пад яго ўлады. Ірванула ўлева. Ён крутнуў руль управа. Тады машына з шалёнай хуткасцю закруцілася на месцы, адарвалася ад зямлі і па спіралі ўзнялася ў паветра. Адзін віток, другі, трэці... Пры кожным вітку стрымгалоў ляцелі падстрыжанымі вяршалінамі ўніз старыя вербы.

**37**

Зося, пачуўшы званок, таропка адчыніла дзверы, убачыла Антона Кузьміча аднаго і спалохалася. Яна чакала яго колькі дзён і... баялася. Ён таксама трохі сумеўся і нейкі міг стаяў за дзвярамі, на асветленай пляцоўцы, расчырванелы, велічны, у багатай «баярцы», шалікавы каўнер з нейкага адмысловага футра заінеў наперадзе і, здавалася, ззяў пад святлом. Доктар трымаў некалькі пакункаў. Марозам і снегам, водарам елкі, святочным пахам пакупак і яшчэ нечым прыемным, здаровым павеяла ад яго на Зосю. Яна ўдыхнула ўсё гэта, і ў яе закружылася галава. Яна адступіла ад дзвярэй. Ён увайшоў, зачыніў дзверы. У калідорчыку не было ўключана святло, і яны апынуліся ў паўзмроку.
Зося мацала па сцяне, шукала выключальнік і ніяк не магла знайсці. Антон Кузьміч цераз яе галаву працягнуў руку і адразу ўключыў святло, але пры гэтым упусціў адзін з пакункаў. Нешта шкляное разбілася. Зося хутка нахілілася, каб падняць пакунак. Ён таксама ў гэты міг нахіліўся, і яны стукнуліся галовамі, добра, што шапка яго такая мяккая.
Антон Кузьміч засмяяўся:
- Гэта на шчасце.
Яна не зразумела, што на шчасце, ці тое, што нешта разбілася, ці тое, што яны стукнуліся, але таксама засмяялася.
Ён сказаў тут жа ў калідорчыку, трошкі ўрачыста, трошкі афіцыйна:
- Віншую вас, Соф'я Сцяпанаўна, з наступаючым Новым годам. Жадаю... Ну, жадаю ўсяго самага найлепшага. Рад быў бы сустрэць Новы год з вамі. Але не магу. Буду ў гасцях. Вось зайшоў... павіншаваць... І маленькі падаруначак прыміце...

Ён працягнуў адзін з пакуначкаў. Яна збянтэжылася:
- Што вы! - але ўзяла і прытуліла да грудзей, як нешта самае дарагое.
- Я сёння паўдня, як Дзед Мароз, разношу падарункі. Люблю прынесці хоць маленькую радасць.
- Маленькую?!
Ёй варта было прапанаваць яму распрануцца, запрасіць у пакой. Але яна на ўсё забылася. Стаяла перад ім, скрыжаваўшы на прыціснутым да грудзей падарунку рукі, але баялася падняць галаву, каб глянуць у яго вочы.
Антону Кузьмічу таксама зрабілася няёмка.
- Ну, прабачце, - сказаў ён. - Яшчэ раз віншую. Шчасця вам і здароўя... Мой першы клопат...
Тады яна расставіла рукі, трымаючы ў адной за матузок падарунак, як сляпая, ступіла да яго і раптам... прыпала тварам да халоднага паліто, да пахучай поўсці каўняра.
Ён зусім разгубіўся, не ведаючы, што рабіць.
- Што з вамі?
Яна адказала не адразу. Праз нейкі момант падняла галаву, глянула нарэшце яму ў вочы, без сарамлівасці, без збянтэжанасці, проста, шчыра, ясна, як глядзяць вельмі блізкія людзі.
- Са мной? Нічога. - І гэтак жа проста папрасіла, упершыню на «ты»: - Нахіліся, я пацалую цябе, - і паднялася на пальчыках.
Нечаканая гэтая просьба чамусьці не здзівіла Антона Кузьміча, і ён без вагання нахіліўся і сам пацалаваў яе ў вусны, нязграбна абняўшы - перашкаджалі пакункі. Ёй захацелася ў адказ павіншаваць яго так, няхай будзе так. Што тут асаблівага?
А яна гэтак жа нечакана і раптоўна - жанчыну ніколі нельга зразумець! - выслізнула з яго рук, павярнулася і, нічога не сказаўшы, пайшла ў пакой.
Антон Кузьміч неўразуменна пацiснуў плячамі і ціхенька, нібы ў кватэры спала дзіця, выйшаў.

**38**

Яны сядзелі ў кабінеце ў Яраша. Кірыла - у старым скураным крэсле, схіліўшыся, закрыўшы твар рукамі; Валянціна Андрэеўна - на краі жорсткай канапы, на якой аглядалі хворых. Не, яна не сядзела. Яна прысядала на хвілінку, на момант і тут жа падхоплівалася, нецярпліва камечачы мокрую хусцінку, ломячы пальцы рук. Падыходзіла да стала, нервова перастаўляла на ім канцылярскую аўтаручку ў выглядзе касмічнай ракеты. Баязліва дакраналася да чорнай скрынкі танометра. Адны і тыя ж рухі кожны раз. Потым кідалася да прыадчыненых дзвярэй і напружана ўслухоўвалася ў насцярожаную начную цішыню бальніцы. Хоць увогуле цішыні не было. Угары, над імі, хадзілі, гаманілі, ляпалі: хворыя страчалі Новы год.
Кірыла сядзеў нерухома. Можа, упершыню ў жыцці ён гэтак доўга сядзеў у такой нерухомасці. Зрэдку адсоўваў далоню і сачыў за жонкай.
Вось яна зноў тройчы пераставіла ручку-ракету, як бы хочучы адвярнуць убок яе пагрозліва нацэленую вастрыню. Нарэшце здагадалася: выняла ручку з крылатага каўпака на зялёнай падстаўцы - і «ракета» разбурана, абясшкоджана. Прайшла да парога. Прыслухалася.
- Я не магу. Я пайду туды.
Кірыла адняў ад твару рукі, папрасіў:
- Не трэба, Валя. Ідзе аперацыя.
- Але, але, - адразу пакорліва згадзілася жанчына, прысела на канапу, заціснула хусцінкай распухшы ад слёз нос.
Нейкі момант было чуваць, як цікаў Кірылаў ручны гадзіннік. А потым зноў гучна затупалі ўгары. Нехта, відаць, скакаў па лесвіцы на мыліцах. Валянціна Андрэеўна прыглушана ўсхліпнула:
- Калі ён памрэ, я таксама не выжыву.
- Ну навошта такія думкі? Усё будзе добра.
- Добра! О Божа! Мне абрыд твой аптымізм. Усё ў цябе добра. Гэты твой аптымізм пераходзіць ужо ў абыякавасць. Да ўсяго. Да мяне. Да дзяцей. Усё ў нас будзе добра - навошта ж ламаць галаву? Хапае другіх праблем...
Яна кінула гэта са злосным дакорам.
Кірыла зноў папрасіў:
- Не трэба, Валя. Пра гэта пасля. Не хапае нам яшчэ пачаць сварыцца... Цяпер...
Яна разумела і ў душы ўхваляла мужава маўчанне ў такі момант, калі сын на аперацыйным стале. Але, лепш усё-такі маўчаць. Чалавек робіцца прымхлівы, калі ведае, што блізкі яго на краі

жыцця. Не трэба думаць пра яе - смерць. Але Валянціне Андрэеўне лезлі ў галаву самыя жахлівыя думкі, таму ёй цяжка было сядзець у нерухомасці і тым больш маўчаць. Яна зноў усхапілася. Зноў падышла да стала. Механічна працягнула руку, але ні да чаго ўжо не дакраналася (пэўна, яе несвядома трывожыла «ракета»).
- Не, гэтага я не магу зразумець! Абвяшчаць сябе знаўцам чалавечых душ... Пісаць разумныя кнігі, разумныя артыкулы і... не разумець, не ведаць уласных дзяцей... чым яны жывуць...
Жонка за гэтыя колькі гадзін, як прыйшло трагічнае паведамленне, каторы раз дакарае яго, то мякка, з жаночай слязлівай чуллівасцю, то цвяроза-злосна. Кірыла ўрэшце не вытрымаў і першы раз кінуў ёй глуха, нязлосна:
- Вучыць чужых дзяцей...
Валянціна Андрэеўна змоўкла, да нечага прыслухалася. Паўтарыла яго словы, здавалася, неўсвядомлена:
- Вучыць чужых дзяцей... - і, мабыць, асэнсаваўшы, загаварыла з горыччу, з болем: - Але, вучыць чужых... У тым і бяда. Хіба я апраўдваю сябе? Я хачу разабрацца. Чаму... чаму так выходзіць? Чаму ты... мы так мала ведалі... так мала цікавіліся жыццём сына? Справы, праблемы, пошукі, знаходкі... Некалі ты быў проста бацька. Сябраваў з сынам. Ездзілі з ім на рыбалку, хадзілі на лыжах... А потым... ты ўмеў толькі накрычаць на яго і нават ударыць. Як пасля ён мог даверыцца табе, калі ты не верыў яму? А ён такі чуллівы. Ты лічыў яго шалапутам... А ён вось як... Калі ўжо пакахаў... У кішэні ў Славіка знайшлі неадасланае пісьмо Машы. Не, не, не кажы мне, што гэта няшчасны выпадак.
- За ім гналіся.
- Божа мой! Якая недарэчнасць! Бацька падняў на ногі ўсю міліцыю, каб злавіць сына, які...
- Не трэба, Валя...
- А што трэба? Што нам з табой трэба цяпер? Кірыла? Калі С-л-ла-вік...
- Валя!..
Яна змоўкла і нейкі час стаяла ў нерухомасці.
Зноў настала такая цішыня, што чуваць было ціканне ручнога гадзінніка.
Ды раптам цішыню гэтую разарваў рэзкі званок. Званіў тэлефон на стале. Яны абое трохі спалохана глядзелі на белы апарат. Нарэшце Валянціна Андрэеўна схапіла слухаўку.
Звaніла Іра. Яе звайшлі на інстытуцкім бале, каб паведаміць пра няшчасце з братам. Пазнала маці, заплакала: што са Славікам?
Кірыла здзівіўся, як разважліва і амаль спакойна адказвала жонка:
- Нічога, Ірачка. Не плач, - і паўтарыла яго словы: - Усё будзе добра. Перакуліўся на машыне. Пералом рукі. Антон Кузьміч аперыруе. Не пускаюць? Дай трубачку вахцёру. - Яна доўга і цярпліва ўгаворвала вартаўніка, каб дазволіў прайсці дачцэ. Але той быў няўмольны, ні просьбы, ні доказы не памагалі. - Пачакай там, Ірок. Антон Кузьміч дазволіць, - супакойвала яна дачку, калі тая зноў узяла слухаўку. - Што? Не думай пра гэта. Я ведаю, што ты любіш яго.
Валянціна Андрэеўна паклала слухаўку і, зусім знясіленая, прысела на канапу.
- Якія жорсткія людзі. Гэты стары - што чурбан. «Не магу», і ўсё.
- Ён выконвае свае абавязкі.
Пасля даволі працяглай паўзы Валянціна Андрэеўна сказала:
- У нас добрыя дзеці, Кірыла. Іра так перажывае, што яны пасварыліся. «Ты ведаеш, кажа, мама, як я люблю яго...»
Валянціна Андрэеўна заплакала, па-дзіцячы ўсхліпваючы.
- Не трэба, Валя. Ты ж сама сказала: усё будзе добра.
- Маўчы, калі ласка! Зноў твой дурны аптымізм!
Яны доўга пасля гэтага сядзелі ў маўчанні. Думалі пра адно. Але, магчыма, па-рознаму. Маці магла задаць тысячу пытанняў сабе, мужу, усяму свету, але ў такім стане ёй было не да пошукаў адказаў на іх, на гэтыя трывожныя пытанні. Ёй уяўляўся Славік маленькім, добрым, ласкавым, чулым, і яна вінавацiла сябе, што так рана палічыла яго дарослым, і думала, як зоймецца дзецьмі ў будучым, калі няшчасце міне сям'ю.
Кірыла, наадварот, спрабаваў даць адказы на гэтыя «чаму?», жончыны і свае ўласныя. Ён думаў шырока і самакрытычна, што ў яго, таксама як і ў тых, каго ён выкрывае, часам жыве абыякавасць да чалавека, нават блізкага. Валя мае рацыю: здараецца, і, на жаль, нярэдка, што за карыснымі і патрэбнымі справамі, якімі займаешся, за гуманнымі і высакароднымі мэтамі часам

хаваюцца звычайнае сябелюбства, эгаізм, індывідуалізм. Відаць, найлепшае жыццёвае правіла: будзь добры да другіх і бязлітасны да сябе. А мы яшчэ часцей бываем лепшымі ў адносінах да сябе, чым да другіх...
Крокі ў калідоры хуткія, лёгкія, але з цяжкім поступам, аж, здалося, дрыжалі сцены і брынчалі шыбы. Яраш!
Шыковічы адразу абодва падхапіліся. Чакалі, як найвышэйшага суддзю, - са страхам і надзеяй.
Антон Кузьміч у дзвярах звыклым рухам рукі ссунуў на падбародак павязку. Выгляд яго, суровы і велічны ў асляпляльна белым каўпаку і ў жаўтаватым халаце, спалохаў Валянціну Андрэеўну. Яна застыла з нямым пытаннем на твары, у вачах.
- Нічога. Арганізм малады, здаровы. Аперыравалі своечасова. Адужае.
Маці ўзрадаваў яго бадзёры голас, яго лекарская ўпэўненасць, але адначасова непрыемна і ўразіла: лепшы друг сям'і, Яраш гаворыць пра Славіка як пра звычайнага хворага.
- Мяне непакоілі раны на галаве. Але яны дробязь. Рассек, відаць, казырком. А так зламаны ўсяго тры рабрыны...
- Усяго! - жахнулася Валянціна Андрэеўна.
- ...Пералом рукі... Шок. Траўматычны. Гэта нам не вельмі падабаецца, але нічога, цяпер мы ўзброены лекавымі ракетамі. Пусцім у ход усе сродкі. - Яраш плюхнуўся, аж застагналі спружыны, у тое крэсла, дзе толькі што сядзеў Кірыла, закінуў нагу на нагу, дастаў з-пад халата гадзіннік, глянуў: - О-о! З Новым годам, сябры мае!
- З Новым... - горка ўсміхнулася Валянціна Андрэеўна.
- Не вешай носа, Валя. Прыйшоў Новы год - прыйдуць новыя радасці. Трэба нам з табой, Кірыла, хоць спірту па мензурцы цяпнуць за Новы год.
- Трэба, - панура згадзіўся Шыковіч. Валянціна Андрэеўна, не будучы ніколі ханжой, аднак, амаль узненавідзела іх у гэты міг, мужа і доктара, які ўратаваў яе сына і якога яна ўвогуле богатварыла, - за тое, што ў такі момант, калі Славік, можа, на валаску ад смерці, яны збіраюцца піць спірт. Кашчунства!
- Туды можна, Антон Кузьміч?
- Нельга. Зашываюць. Перавязваюць. Навошта маці глядзець на гэта. Хутка яго прывязуць у палату.
- Ты няўмольны.
- Я няўмольны. Папяроска ёсць, Кірыла?
Ведаючы, што Яраш закурвае толькі ў выключных выпадках, Валянціна Андрэеўна раптам зразумела, якой нялёгкай была для яго аперацыя, і ўміг даравала яму і спірт, і абыякава грубы тон.
У калідоры зашоргалі крокі людзей і шыны хірургічнай каляскі. Маці насцярожана прыслухалася, а калі зразумела, што гэта, кінулася да дзвярэй. Людзі ў белым правезлі каляску міма яе. Яна не ўбачыла Славіка - адны бінты. Жахнулася, але не закрычала, не заплакала. Моўчкі, вельмі асцярожна ступаючы, пайшла следам. У дзвярах пасляаперацыйнай палаты яе руку сціснула чыясьці вельмі далікатная, мяккая і халодная рука. Валянціна Андрэеўна павярнула галаву. Знаёмыя залатыя вочы глядзелі на яе з ласкавым спачуваннем, з тым разумным жаночым спачуваннем, якое не паглыбляе болю, не кранае ран, а прыносіць заспакаенне і надзею: побач добрыя людзі, яны адгоняць бяду.
**39**
Апошняя думка была: «Толькі б не загарэлася. І не заклініла дзверцаў».
Праўда, у міліцэйскай машыне Славік апрытомнеў і хвілін колькі мацюкаў міліцыю. Нават спрабаваў выскачыць з машыны, што моцна ўзлавала добрага начальніка. А потым настала другая фаза шоку: паўнейшая абыякавасць да ўсяго на свеце. Лекар раённай бальніцы беспамылкова ўстанавіла дыягназ і сур'ёзна ўсхвалявалася за жыццё пацыента, хоць міліцыя і сказала ёй, што гэта вядомы злодзей-рэцыдывіст і ўмее хітра прытварацца: паўгадзіны назад крычаў і рваўся з машыны, а цяпер, бачыш, ляжыць быццам нежывы.
Нежывым позіркам ён сустрэў маці, якая прыляцела на санітарным самалёце. Гэта яе вельмі напалохала. Такімі ж вачамі ён глядзеў на Яраша, калі яго прывезлі ў бальніцу, не пазнаваў яго. Але Машу, здаецца, пазнаў: спрабаваў усміхацца ёй і нешта гаварыць...
Маці спалохалася яшчэ больш, калі пасярод дня - першага дня новага года - Славік раптам пачаў трызніць і кідацца на ложку. А Яраш зразумеў: найбольш небяспечнае - шок - пераможана. Толькі

ён адзін уяўляў поўную карціну таго, што тварылася ў разбітым целе і ў мазгу хворага. Ён пайшоў адпачываць, здалося Валянціне Андрэеўне, у самы небяспечны момант.
Хлопец гарэў - у машыне. Кідаўся, каб адчыніць дзверцы, іх заклініла. Як жа выбрацца з гэтай палаючай мышалоўкі? Разбіць шкло? Ветравое шкло! Але што з рукой? Ён не можа падняць яе - як бервяно. Няўжо ў яго не хопіць сілы разбіць шкло? Паклікаць на дапамогу? Каго? Міліцыю. Не, ён не пакліча нікога! Але полымя бліжэй, яно паліць, гудзіць у вушах.
- Ма-ма!
- Сына! Сыначка! Я тут, з табой. Супакойся.
І раптам цішыня. Няма спякоты, не гудзіць полымя. Снежная бель перад вачамі. Ага, яго выкінула з машыны! Дык гэта ж добра! Наглытацца снегу і ўстаць на ногі - і бывайце здаровы. Вада сама льецца ў рот. Ах, рэчка! Рэчка, якую яму не ўдалося праскочыць. Але ж ён лепшы плывец.
Так паўтаралася разы тры. А потым ён убачыў вочы маці, яе твар, родны, ласкавы. Радасць у яе вачах, што лілася праз слёзы, дабрата ва ўсмешцы затапілі яго гарачай хваляй невядомай дагэтуль пяшчоты да маці, удзячнасці ёй. Гэта яна, маці, ратавала яго. Яна першая з'явілася, калі ён апынуўся ў бядзе. А можа, яму гэта толькі здаецца? Можа, яму хочацца, каб маці была тут, побач? Ён спрабуе падняць руку, каб дакрануцца да яе. Засмяглыя вусны яго варушацца:
- Ма-ма!
Ён, забінтаваны, не чуе, але па руху яе вуснаў здагадваецца, што маці кажа:
- Дурненькі мой! Хіба можна так?
Не, гэта не трызненне. Маці сапраўды каля яго. Славік адразу ўсё прыгадвае, нават санітарны самалёт, Яраша і Машу. Здагадваецца, што далей была аперацыя. І вось ён зноў жывы. Усведамленне гэтай немалаважнай акалічнасці напаўняе яго такой радасцю, што, каб былі сілы, ён, пэўна, загалёкаў бы, закрычаў на ўсю бальніцу, на ўвесь свет.
Валянціна Андрэеўна была надзвычай удзячна Машы, што яна засталася ў бальніцы ў першы, святочны, дзень новага года і не толькі памагала дзяжурнаму лекару і сёстрам, але бадай што кіравала імі, трымаючы сувязь з Ярашам. Ніхто яе, аперацыйную сястру, не прымушаў сядзець тут. Не выходзячы двое сутак з палаты, яны перагаварылі пра ўсё на свеце. І Маша ўсё расказала ёй. «Чаму ім так не пашанцавала ў каханні, маім дзецям?» - з горыччу думала маці.
Кожная маці ў любых абставінах думае пра будучае сваіх дзяцей, верыць у іх шчасце. Валянціна Андрэеўна падумала, што яна з радасцю назвала б гэтую «залатую дзяўчыну» сваёй дачкой.
На другую ноч Маша прымусіла знясіленую жанчыну прылегчы ў Ярашавым кабінеце. Сама засталася ў палаце. Славік застагнаў ад болю і прачнуўся. Убачыў ноч (гарэў адзін сіні начнічок) - затрывожыўся са сну. Маша запаліла настольную лямпу, схілілася над ім. Ён здзівіўся і ўзрадаваўся.
- Даць піць?
Прагна піў з яе рук. Потым пацягнуўся вуснамі, каб пацалаваць яе руку. Яна пагразіла пальцам:
- Не варушыся, будзе балець.
Балела прыступамі, часам нясцерпна моцна, галава і рука. Боль знімалі сёстры ўколамі. Яму здавалася, што ён сам перамагае яго. Такая ўпэўненасць надавала сілы. Перамогшы чарговы прыступ, ад якога ўсё цела заліў непрыемны ліпучы пот, спачатку гарачы, потым халодны, Славік вачамі паклікаў, каб Маша наблізілася.
Спытаў:
- Ты выйшла эамуж?
- Не.
- Не ідзі ад мяне.
- Я не пайду. Спі.
Другога студзеня, пасля работы, прыйшлі хлопцы - уся брыгада. Іх не пусцілі. Маша выйшла да іх у вестыбюль. І ўбачыла тую дзяўчыну, якую некалі сустрэла са Славікам у кіно. Нічога дзіўнага - разам працуюць. Але чаму яна ўспыхнула і адышла ўбок? Хлопцы сустрэлі Машу прыветліва-ўзрадаваным гоманам. Генрых пажартаваў:
- Добра ўсюды мець сваіх людзей.
- Як там наш аўтааматар?
Яны не ведалі таго, што ведала яна.

- Перадай, мы чакаем яго на завод, у брыгаду. Пра размову, якая была, няхай забудзе. Нічога не было. Абавязкова перадай.
А гэтага не ведала яна. Але зразумела, пра што яны кажуць.
- Вы хацелі выгнаць яго з брыгады? Завошта?
Яна ўбачыла, як сумеўся Тарас, быццам адчуваў нейкую віну. Увогуле ён быў маўклівы, непрыкметны сярод сяброў, больш, чым хто другі, засмучаны. Маша пашкадавала яго. А пасля - сябе. Адчула смутак, нібы ёй трэба было развітацца з нечым вельмі дарагім і паехаць у невядомае.

**40**

Яраш і Маша разам выйшлі з бальніцы. Скончыўся рабочы дзень, даволі напружаны - былі аперацыі, якія заўсёды стамлялі. Славік адчуваў сябе добра, нават маці нарэшце даверыла яго дзяжурным сёстрам і санітаркам.
Да аўтобуснай супынкі ішлі моўчкі. Свяціла марознае сонца, якое, здавалася, прамяніла не цяпло, а холад. Снег пад нагамі ў прахожых звінеў на сотні ладоў.
Маша расчырванелася, узбадзёрылася. Ёй зрабілася весела. Яна сказала:
- Сёння я буду страчаць Новы год. Ох і пагуляю! Як там мая Зося? Учора я забягала на гадзінку, дык яна нейкая кіслая была. Засумавала.
Антон Кузьміч зразумеў яе словы як запрашэнне разам сустрэць Новы год і нічога не адказаў. Ён абяцаў раніцай Віцю і Наташы пайсці з імі на лыжах за горад. Але пад вечар памацнеў мароз. Наўрад ці варта ў такі мароз выводзіць дзяцей у поле. Маці, напэўна, будзе супраць.
У апошнія дні нечакана Галіна Адамаўна прыкметна змянілася. Атмасфера ў доме ачышчалася. Знікала напружанасць. Праўда, жонка ішла на прымірэнне асцярожна, паступова. Раней ён заўсёды стараўся любымі сродкамі прымірыцца як можна хутчэй. Цяпер жа нічым не паспяшаў падзей, але нічым і не запавольваў іх. Няхай усё ідзе сваёй чаргой. Можа, так нават лепей у іх гадах: менш гарачых прызнанняў у любві - менш будзе трагедый, рэўнасці і сварак. Ён проста змарыўся ад усяго гэтага. Колькі энергіі і нерваў прыходзіцца траціць на глупства? Калі гэта людзі стануць такімі, каб разумелі адзін аднаго ва ўсім, - у палітыцы, навуцы, мастацтве, у сям'і, побыце? А можа, і не трэба такое ідэальнае ўзаемаразуменне? Сумна будзе. Барацьба супрацьлегласцей - закон жыцця і руху. Любоў і нянавісць, любоў і рэўнасць, цяпло і холад...
Многа і другіх думак роілася ў галаве, пакуль Антон Кузьміч, ужо адзін, ішоў ад аўтобуса да свайго дома па ціхай вуліцы, дзе снег не ачышчаўся з пачатку зімы.
Жонка сустрэла з большай прыветлівасцю, чым праводзіла раніцай.
- Вось добра, што ты так рана сёння. А я як ведала, у мяне ўжо гатовы абед.
Яшчэ адзін крок. Ну што ж, так лепей: спакой для яго працы ў клініцы і дома, над дысертацыяй, - самае дарагое. Трэба і яму зрабіць нейкі крок насустрач.
Ён распрануўся і, памыўшы ў ваннай рукі, заглянуў на кухню, весела і смешна пацягнуў носам паветра.
- Адгадаць?
Гэта яго даўні жартаўлівы занятак - па пахах адгадаць, што гатуецца на абед. Жонка шчасліва засмяялася:
- Не адгадаеш.
І раптам тэлефонны званок. Ён рушыў у калідор, дзе стаяў тэлефон, узяў слухаўку.
Пачуўся яго ўстрывожаны голас:
- Што здарылася? Што з ёй? Кіньце жарты! Не да жартаў? Добра. Еду.
Галіна Адамаўна з няяснай трывогай у душы, з бояззю выйшла з кухні. Муж спешліва апрануў паліто. Яна спытала асцярожна:
- У аддзяленні што-небудзь?
- Не. Званіла Маша. Просіць зараз жа прыехаць. Відаць, нешта з Савіч. - Ён зашпільваў гузікі, рукі яго дрыжалі.
«Як ён хвалюецца», - пабляднела Галіна і памкнулася да яго.
- Можна, я з табой?
- Навошта? - спытаў ён з суровым здзіўленнем. Яна адступіла, сцялася, быццам Антон Кузьміч замахнуўся на яе.
Дзверы за ім са стукам зачыніліся, калыхнуўшы паветра. А яна працягвала стаяць як анямелая.

Ён вярнуўся неспадзявана для яе хутка, можа, праз гадзіну, якая, аднак, з'явілася бадай што самай пакутлівай у яе жыцці.
Галіна пачула яго цяжкія крокі на лесвіцы. Вельмі цяжкія. Так ён ідзе, калі бывае страшэнна змораны. Гэта яе спалохала яшчэ больш, яна чакала яго там жа, у калідоры, быццам і не саступала з месца. Ён не пазваніў. Ён адчыняў дзверы сваім ключом, адчыняў доўга, шкрабаючы, быццам не мог прасунуць ключ у шчыліну. Яна не кінулася, каб адчыніць хутчэй. Ёй страшна было зрушыць з месца.
Антон увайшоў нарэшце, глянуў на жонку і пачаў павольна распранацца. Зняў сваю баярку. Паклаў яе акуратна на палічку вешалкі. Паволі расшпіліў гузікі, раскручваў чырвоны шалік. І ўсё гэта моўчкі. Галіна баялася спытаць: што там? Што здарылася? Зразумець, здагадацца яна не магла. Каб Савіч было кепска, ён не вярнуўся б так хутка, пакуль бы завёз у клініку, уладзіў, памог... Каб памерла, не так ён паводзіў бы сябе, не, не так. Ён неяк дзіўна, сапраўды зморана заспакоены.
Распрануўся, заглянуў у люстра, правёў далонямі па твары, прыгладзіў валасы. Пайшоў у пакой. Праходзячы міма, ударыў пальцам па клавішы піяніна, бас глуха загудзеў. Пастаяў каля акна. Павярнуўся, убачыў, што Галіна стаіць на парозе і глядзіць на яго, спалоханая, з нямым запытаннем, і адразу стаў звычайным, толькі ўсміхнуўся так, быццам за нешта неўзлюбіў у першую чаргу самога сябе. Ён сказаў проста, спакойна, без злосці, без эфектаў:
- Ты можаш радавацца. Твая дурная рэўнаць выгнала чалавека ў свет... Хворага. Пасля такой аперацыі!..
- Каго?
- Каго! Соф'ю Савіч.
- Я выгнала?! Куды?
- Каб я ведаў куды. У тым і бяда, што не ведае ні Маша, ніхто... Пакуль мы ратавалі маладога Шыковіча, яна з'ехала. Куды? У яе нікога няма з блізкіх. На дварэ - вунь якая лютая зіма...
«Проста так, без прычыны, не знікаюць», - хацела была жорстка кінуць Галіна Адамаўна, бо ў яе ўзнікла падазронасць: ці не хітрасць гэта? Але яна стрымалася. Занадта ўжо незвычайным - ніколі такім не быў! - здаваўся муж. Спытала прыцішаным голасам, мякка, асцярожна:
- Адкуль табе вядома, што яна з'ехала з-за маёй рэўнасці?
Антон Кузьміч моўчкі дастаў з кішэні пінжака сіні канверт, палажыў на стол.
Спакой здрадзіў жанчыне: яна амаль скочыла да стала, схапіла таямнічы канверт, дрыжачымі рукамі выхапіла з яго, як з агню, пісьмо. Спачатку акінула ўвесь тэкст адным ліхаманкавым позіркам, потым, забыўшыся, што муж сочыць за ёй, прачытала скорагаворкай напаўголасу:
«Антон Кузьміч! Як мне звярнуцца да Вас? Дарагі мой таварыш, дарагі чалавек, друг і брат! Вы вярнулі мне жыццё. Якое дзякуй трэба сказаць за адно гэта! Але Вы вярнулі не толькі жыццё. Вы вярнулі мне веру ў людзей, у іх дабрату. У мяне няма слоў, каб выказаць усё тое, што я адчуваю да Вас. Ды і не варта гэта рабіць. Я магла б сказаць, што люблю Вас, а гэта не ўсе могуць зразумець правільна. Дзякуй Вам за ўсё, за ўсё - вось словы, што выходзяць з глыбіні майго сэрца, якое Вы трымалі на далоні. Дзякуй Вам, дарагі Антон Кузьміч!
Нядаўна я даведалася, што з-за мяне ў Вас непрыемнасці ў сям'і. Божа мой! Каб з-за мяне Вы перажывалі, трацілі спакой і цвёрдасць рукі, якая ратуе людзей. Ды лепш я памру! Не, не бойцеся. Я не памру. Цяпер я не памру. Цяпер мне вельмі хочацца жыць, калі я паверыла, убачыла, што навокал многа добрых, сардэчных людзей і свет такі прыгожы. Не турбуйцеся. Не шукайце мяне. Я буду далёка. Можа, пазней я прышлю вестачку. Супакойце Машу. Каб Вы ведалі, як мне цяжка пакідаць усіх вас.
Перадайце прывет Кірылу Васільевічу...
Дзякуй яму за тое, што ён зрабіў для мяне і асабліва для памяці бацькі майго.
Бывайце, добры чалавек. Дазвольце ў думках абняць і пацалаваць Вас.
С.Савіч».
Галіна Адамаўна глытала словы. Яна задыхалася. Спачатку захлынулася шчасцем. Потым у сэрца ўдарыла хваля ўдзячнасці жанчыне, якую, дарэчы, так і не пабачыла. Цяпер яна разумела Зосю і... палюбіла ў адзін міг, як сястру. Безумоўна, тая кахала яе мужа і адчувала, што гэта можа прывесці да няшчасця... А яна сама зведала няшчасце на поўную меру, таму і зрабіла так высакародна. Але, гэта высакароднасць! Сапраўдная. Без фальшу, без позы. Самаахвярная. Так

магла зрабіць толькі жанчына, якая кахае гэтак жа моцна, як і яна, Галіна Адамаўна. Але цяпер у яе няма ні рэўнасці, ні злосці. Цяпер яна ўдзячна той, другой, і па-жаночы шкадуе яе.
«Сапраўды, куды яна магла паехаць у такі час?» -Галіна Адамаўна глянула на акно, на шыбах якога мароз выткаў дзівосныя ўзоры. Адчула холад. Яна не ўбачыла, як Антон сеў каля стала. Пачула яго словы:
- Сорам! Які сорам! - Ён цёр далоняй свой лоб.
Цяпер Галіна Адамаўна і мужа цудоўна разумела і таксама пашкадавала. Падышла нячутна, ціха палажыла рукі на дужыя плечы. Памаўчала. Ён таксама нібы стаіўся, нібы чакаў, што ж будзе далей.
- Табе цяжка?
- Мне сорамна.
- Ты кахаў яе?
Ён перасмыкнуў плячамі, нібы хацеў скінуць яе рукі.
- Зноў ты са сваім глупствам. Ды зразумей ты нарэшце, што гэта недарэчна... - Словы такія, што іх трэба было крычаць, а ён казаў ціха, стомленым абыякавым голасам. У яго бракавала сілы абурыцца. Ды і навошта?
Яна прыціснулася шчакой да яго галавы, удыхнула знаёмы родны пах валасоў, і твар яе заззяў ад шчасця.
- Каб ты ведаў, як я люблю цябе, ты не называў бы гэтага глупствам, ты разумеў бы...
- Я ведаю, як ты любіш мяне. Але пара ўжо, каб твая любоў рабілася разумная.
- Любоў ніколі не бывае разумнай, - адказала яна старой кніжнай ісцінай. А яму гэтая сцёртая ісціна чамусьці здалася амаль адкрыццём. Ён падумаў:
«А праўда, ёсць яна ў каго, разумная любоў?»
Антону Кузьмічу не зрабілася непрыемна ад таго, што жонка лашчыцца. Наадварот, яму раптам чамусьці захацелася ласкі. Ён узяў яе руку і прыціснуў да сваёй шчакі. Галіна Адамаўна ледзь стрымалася, каб не зарыдаць. Вось яна, яе перамога, яе шчасце. Ад такога раптоўнага шчасця бывае, што разрываецца сэрца. Яна баялася павярухнуцца, нібы яно магло выпырхнуць, шчасце, ці выплеснуцца з сэрца. А яна даражыла кожнай кропляй яго.
Яны доўга маўчалі.
Кажуць, мозг выпраменьвае электрычныя імпульсы.
Каб яна мела здольнасць лавіць іх, то ўбачыла б, што яго мозг у той міг быў радыётэлескопам, які шукаў згубленую зорку.
Дзе яна?
Куды знікла?
Галіна Адамаўна спытала нарэшце:
- Будзем абедаць?
- Будзем абедаць.
Яна адарвалася ад яго, адчыніла шуфляду серванта, выхапіла бялюткі абрус, узмахнуўшы, заслала ім стол. Антон Кузьміч адышоў да акна. Жонка кінулася на кухню, уміг вярнулася з талеркамі, прыборамі. Паставіла на стол і з пяшчотай у голасе сказала:
- Мы не сустракалі Новы год.
Антон Кузьміч адказаў абыякава:
- Не сустракалі...
Ён не заўважыў, як яна знікала і з'яўлялася зноў. Некалі ён любаваўся яе спрытнасцю ў дамашняй рабоце: усё гарэла пад яе рукамі. Цяпер ён думаў пра іншае, не задумваючыся, адказваў ёй.
- У нас не крануты ўвесь навагодні запас віна. Што ты будзеш піць?
- Усё адно.
- Шампанскае?
- Не. Лепш каньяк.
- Можа, паклікаць Кірылу?
- Як хочаш.
- Не. Я хачу быць з табой. Каб ніхто не перашкаджаў. Дзеці пайшлі на каток. Яны не паверылі, што ты так рана прыйдзеш.
- На ноч бярэцца мароз.
- Але... Пятнаццаць ужо.

- У полі, напэўна, больш.
- Натка лёгка адзяецца. Баюся, прастудзіцца.
- Наташа не прастудзіцца.
- Прашу вас, доктар, да стала.
Ён здзівіўся, што за такі кароткі час - некалькі хвілін - яна так хораша і прыгожа сервіравала стол. У гэтай жанчыны свой талент: яна добрая маці і гаспадыня.
Антон Кузьміч сеў за стол. Жонка села насупраць. Пільна, з замілаваннем і пяшчотай глядзела на яго. Гэтае замілаванне неяк дзіўна збянтэжыла яго. Зрабілася няёмка глядзець ёй у вочы. Ён заняўся бутэлькамі. Доўга адкаркоўваў бутэльку з каньяком. Яшчэ даўжэй, з асцярожнасцю - не заліць бы абрус! - шампанскае.
Галіна любавалася яго вялікімі і прыгожымі рукамі, павольнымі рухамі.
Ён наліў шампанскае ў высокія келіхі. Стралялі пахучымі пырскамі бурбалачкі, лопаючыся.
- За нашых дзяцей! - першая прапанавала тост Галіна Адамаўна, па-мацярынску шчыра.
- За нашых дзяцей.
Наташа ціха адчыніла дзверы (у кожнага з іх свой ключ, бо выходзілі з дому і прыходзілі яны ў розны час), ціха палажыла канькі, ведаючы, што маці не любіць, калі стукаюць, а ў апошні час маці вельмі нервовая. І раптам паверх занавескі на шкляных дзвярах дзяўчынка ўбачыла, што маці і бацька сядзяць за сталом і... чокаюцца келіхамі. Памірыліся!
Ёй гэта найлепшы навагодні падарунак. Таму не магла яна стрымаць сваёй дзіцячай непасрэднасці. Ускочыла ў пакой, калі яны толькі прыгубілі келіхі, здзівіўшы іх - адкуль узялася? - падбегла да бацькі, абняла, моцна пацалавала.
- Я люблю цябе, тата! Ты добры, ты разумны! - Потым, як вавёрка, пераскочыла да маці, пацалавала яе. - І цябе люблю, мама! - І закружыла па пакоі, як на катку, грацыёзная ў сваіх блакітных штоніках, чырвоным світэры і такой жа чырвонай шапачцы. - Я люблю вас! Я ўсіх люблю! Усіх добрых людзей!
Яраш засмяяўся, шчыра ўзрадаваны, што з'явілася дачка. Прапанаваў жонцы:
- Вып'ем за добрых дзяцей. І за добрых людзей!
Але, п'ючы, ён зноў падумаў пра Зосю. Дзе яна? Куды магла паехаць у такі час?

*1960-1963 гг.*